# ЧАС СЭКАНД-ХЭНД

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ



ГАЛАСЫ УТОПІІ

ДА 70-ГОДДЗЯ
СВЯТЛАНЫ АЛЕКСІЕВІЧ

Выдадзена
пры дапамозе
краўдфандынгу
Ulej.by

Паважаны чытач!

Гэтае унікальнае выданне стала магчымае дзякуючы супольным намаганням грамадскасці Беларусі, краўдфандынгавай платформы Ulej.by, «Белгазпрамбанка» і Цэнтра выяўленчага і медыямастацтва «Новая культурная ініцыятыва».

У найноўшым беларускім перакладзе апублікаваныя разам пяць кніг першай ў беларускай гісторыі лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры Святланы Алексіевіч, аб’яднаных у цыкл «Галасы Утопіі».

З мэтай зрабіць кнігі Алексіевіч даступнымі для чытачоў нашай краіны «Белгазпрамбанк» падбаў, каб гэтае выданне можна было знайсці ва ўсіх беларускіх бібліятэках.

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ

# ЧАС СЭКАНД ХЭНД

Пераклаў з рускай
Сяргей Дубавец

Логвінаў

Дакументальна-мастацкая хроніка «Галасы Утопіі» — пяць кніг, у якіх «маленькі чалавек» сам апавядае пра свой лёс. Гэта адметны жанр — шматгалосыя раманы-споведзі, у якіх з малых падзеяў складваецца вялікая гісторыя.

Перад чытачом — апошняя аўтарская рэдакцыя цыкла ў найноўшым беларускім перакладзе. Пісьменніца паводле свайго творчага метаду дапрацавала хроніку: скасавала цэнзурныя праўкі, далучыла новыя эпізоды, а таксама старонкі з уласнага дзённіка.

«Час сэканд хэнд» — пятая кніга хронікі, якая распавядае не столькі пра падзеі XX стагоддзя, колькі пра іх адлюстраванне ў сэрцы паспалітага чалавека, прадстаўніка «новай гістарычнай супольнасці людзей». Паводле жанру гэта — трагічны эпас савецкага народа, які балюча знікае на нашых вачах разам з распадам імперыі.

ISBN 978-609-8213-34-8

© Святлана Алексіевіч, 2018
© Сяргей Дубавец, пераклад на беларускую мову, 2018
© Logvino literatūros namai, 2018

Ахвяра і кат аднолькава агідныя, і ўрок лагера ў тым, што гэта братэрства ў падзенні.

*Давід Русэ. Дні нашае смерці*

У кожным разе, нам трэба памятаць, што за перамогу зла ў свеце ў першую чаргу адказваюць не яго сляпыя выканаўцы, а духоўна відушчыя служкі дабра.

*Ф. Сцяпун. Былое і што не збылося*

# ЗАНАТОЎКІ САЎДЗЕЛЬНІКА

Мы развітваемся з савецкім часам. З тым нашым жыццём. Я імкнуся сумленна выслухаць усіх удзельнікаў сацыялістычнай драмы…

Камунізм меў шалёны план — перарабіць «старога» чалавека, спрадвечнага Адама. І гэта атрымалася… Можа быць, адзінае, што атрымалася. За семдзесят з лішкам гадоў у лабараторыі марксізму-ленінізму вывелі асобны чалавечы тып — homo soveticus. Адны лічаць, што гэта трагічны персанаж, іншыя называюць яго «саўком». Мне здаецца, я ведаю гэтага чалавека, ён мне добра знаёмы, я побач з ім, плячо ў плячо пражыла шмат гадоў. Ён — гэта я. Гэта мае знаёмыя, сябры, бацькі. Некалькі гадоў я ездзіла па ўсім былым Савецкім Саюзе, бо homo soveticus — гэта не толькі рускія, але і беларусы, туркмены, украінцы, казахі… Цяпер мы жывём у розных дзяржавах, гаворым на розных мовах, але нас ні з кім не пераблытаеш. Пазнаеш

адразу! Усе мы, людзі з сацыялізму, падобныя і не падобныя да іншых людзей — у нас свой слоўнік, свае ўяўленні пра дабро і зло, пра герояў і пакутнікаў. У нас асаблівыя дачыненні са смерцю. Увесь час у расповедах, якія я запісваю, дзяруць вуха словы: «страляць», «расстраляць», «ліквідаваць», «пусціць у расход» ці такія савецкія варыянты гвалту, як: «арышт», «дзесяць гадоў без права перапіскі», «эміграцыя». Колькі можа каштаваць чалавечае жыццё, калі мы памятаем, што нядаўна гінулі мільёны? Мы поўныя нянавісці і забабонаў. Усё гэта адтуль, дзе быў ГУЛАГ і страшная вайна. Калектывізацыя, раскулачванне, перасяленне народаў…

Гэта быў сацыялізм, і гэта было проста наша жыццё. Тады мы мала пра гэта гаварылі. А цяпер, калі свет незваротна змяніўся, усім стала цікавае тое наша жыццё, не важна, якое яно было, гэта было наша жыццё. Пішу, расшукваю па крупінках, па друзачках гісторыю «хатняга»… «унутранага» сацыялізму. Тое, як ён жыў у чалавечай душы. Мяне заўсёды прыцягвае вось гэтая маленькая прастора — чалавек… адзін чалавек. Насамрэч там усё і адбываецца.

Чаму ў кнізе так шмат расповедаў самагубцаў, а не звычайных савецкіх людзей са звычайнымі савецкімі біяграфіямі? Урэшце, сыходзяць з жыцця і праз каханне, старасць, проста так, дзеля цікавасці, жадання разгадаць сакрэт смерці… Я шукала тых, хто намёртва прырос да ідэі, увабраў яе ў сябе так, што не аддзерці — дзяржава стала іх космасам, замяніла ім усё, нават уласнае жыццё. Яны не змаглі сысці з вялікай гісторыі, развітацца з ёю, быць шчаслівымі па-іншаму. Даць нырца… згубіцца ў прыватным існаванні, як гэта адбываецца сёння, калі маленькае стала вялікім. Чалавек хоча проста жыць, без вялікай ідэі. Такога ніколі не было ў рускім жыцці, гэтага не ведае і руская літаратура. Увогуле, мы ваенныя людзі. Або

ваявалі, або рыхтаваліся да вайны. Ніколі не жылі інакш. Адсюль ваенная псіхалогія. І ў мірным жыцці ўсё было па-ваеннаму. Біў барабан, лунаў сцяг… сэрца выскоквала з грудзей… Чалавек не заўважаў свайго рабства, ён нават любіў сваё рабства. Я таксама памятаю: пасля школы мы збіраліся ўсім класам паехаць на цаліну, пагарджалі тымі, хто адмаўляўся, да слёз шкадавалі, што рэвалюцыя, грамадзянская вайна — усё здарылася без нас. Азірнешся: няўжо гэта мы? Я? Я ўспаміналa разам са сваімі героямі. Хтосьці з іх сказаў: «Толькі савецкі чалавек можа зразумець савецкага чалавека». Мы былі людзі з адной камуністычнай памяццю. Суседзі ў адной памяці.

Бацька ўзгадваў, што ён асабіста ў камунізм паверыў пасля палёту Гагарына. Мы — першыя! Мы ўсё можам! Так яны з мамай нас і выхоўвалі. Я была акцябронкам, насіла значок з кучаравым хлопчыкам, піянеркай, камсамолкай. Расчараванне прыйшло пазней.

Пасля перабудовы ўсе чакалі, што адкрыюць архівы. Іх адкрылі. Мы даведаліся пра гісторыю, якую ад нас хавалі…

«Мы павінны павесці за сабой 90 мільёнаў са ста, якія насяляюць Савецкую Расію. З астатнімі нельга размаўляць — іх трэба знішчыць» (Зіноўеў, 1918).

«Павесіць (менавіта павесіць, каб народ бачыў) не менш за 1000 заўзятых кулакоў, багацеяў… адабраць у іх увесь хлеб, прызначыць закладнікаў… Зрабіць так, каб на сотні вёрст вакол народ бачыў, трымцеў…» (Ленін, 1918).

«Масква літаральна памірае з голаду» (прафесар Кузняцоў — Троцкаму). — «Гэта не голад. Калі Ціт браў Ерусалім, габрэйскія маткі елі сваіх дзяцей. Вось калі я прымушу вашых матак есці сваіх дзяцей, тады вы можаце прыйсці і сказаць: "Мы галадаем"» (Троцкі, 1919).

Людзі чыталі газеты, часопісы і маўчалі. На іх абрынуўся непад'ёмны жах! Як з гэтым жыць? Шмат хто сустрэў

праўду як ворага. І свабоду таксама. «Мы не ведаем сваёй краіны. Не ведаем, пра што думае большасць людзей, мы іх бачым, сустракаемся кожны дзень, але пра што яны думаюць, чаго хочуць, мы не ведаем. Але бярэм на сябе смеласць іх вучыць. Хутка пра ўсё даведаемся — і жахнёмся», — казаў адзін мой знаёмы, з якім мы часта сядзелі ў мяне на кухні. Я з ім спрачалася. Было гэта ў дзевяноста першым годзе... Шчаслівы час! Мы верылі, што заўтра, літаральна заўтра пачнецца свабода. Пачнецца з нічога, з нашых жаданняў.

З «Нататнікаў» Шаламава: «Я быў удзельнікам вялікай прайгранай бітвы за сапраўднае абнаўленне жыцця». Напісаў гэта чалавек, які адседзеў сямнаццаць гадоў у сталінскіх лагерах. Туга па ідэале засталася... Савецкіх людзей я б падзяліла на чатыры пакаленні: сталінскае, хрушчоўскае, брэжнеўскае і гарбачоўскае. Я — з апошняга. Нам было лягчэй прыняць крах камуністычнай ідэі, бо мы не жылі ў той час, калі ідэя была маладая, дужая, з нерастрачанай магіяй гібельнага рамантызму і ўтапічных надзей. Мы выраслі пры крамлёўскіх старцах. У посныя вегетарыянскія часы. Вялікая кроў камунізму ўжо была забытая. Пафас лютаваў, але захавалася разуменне, што ўтопію нельга ўвасабляць у жыццё.

Гэта было ў першую чачэнскую вайну... Я пазнаёмілася ў Маскве на вакзале з жанчынай, яна была аднекуль з-пад Тамбова. Ехала ў Чачню, каб забраць сына з вайны: «Я не хачу, каб ён паміраў. Я не хачу, каб ён забіваў». Дзяржава ўжо не валодала яе душой. Гэта быў вольны чалавек. Такіх людзей было няшмат. Больш было тых, каго свабода раздражняла: «Я набыў тры газеты і ў кожнай свая праўда. Дзе ж яна сапраўдная? Раней прачытаеш раніцай газету "Правда" — і ўсё ведаеш. Усё разумееш». З-пад наркозу ідэі выходзілі марудна. Калі я пачынала размову пра пакаянне, у адказ чула: «За што я павінен каяцца?» Кожны

адчуваў сябе ахвярай, але не саўдзельнікам. Адзін казаў: «я таксама сядзеў», другі — «я ваяваў», трэці — «я свой горад з руінаў падымаў, дзень і ноч цэглу цягаў». Гэта было абсалютна нечакана: усе п'яныя ад свабоды, але не гатовыя да свабоды. Дзе ж яна, свабода? Толькі на кухні, дзе працягвалі, як звычайна, ганіць уладу. Ганілі Ельцына і Гарбачова. Ельцына за тое, што змяніў Расію. А Гарбачова? Гарбачова за тое, што змяніў усё. Усё дваццатае стагоддзе. І ў нас цяпер будзе, як у іншых. Як ва ўсіх. Думалі, што на гэты раз атрымаецца.

Расія мянялася і ненавідзела сябе за тое, што мянялася. «Нерухомы Мангол» — пісаў пра Расію Маркс.

Савецкая цывілізацыя... Спяшаюся зберагчы яе сляды. Знаёмыя твары. Распытваю не пра сацыялізм, а пра каханне, рэўнасць, дзяцінства, старасць. Пра музыку, танцы, фрызуры. Пра тысячы падрабязнасцяў зніклага жыцця. Гэта адзіны спосаб загнаць катастрофу ў рамкі звычайнага і паспрабаваць нешта распавесці. Бясконцая колькасць чалавечых праўдаў... Гісторыю цікавяць толькі факты, а эмоцыі застаюцца ў астачы. Іх звычайна не пускаюць у гісторыю. Але я гляджу на свет вачыма гуманітарыя, а не гісторыка. Здзіўленая чалавекам...

Бацькі ўжо няма. І я не магу дагаварыць з ім адну нашу гутарку... Ён сказаў, што ім паміраць на вайне было лягчэй, чым неабстраляным хлопчыкам, якія сёння гінуць у Чачні. У саракавыя — яны з пекла траплялі ў пекла. Перад вайной бацька вучыўся ў Мінску ў Інстытуце журналістыкі. Згадваў, што калі яны вярталіся з вакацый, часта ўжо не сустракалі ніводнага знаёмага выкладчыка, усе былі арыштаваныя. Яны не разумелі, што адбываецца, але было страшна. Страшна, як на вайне.

У мяне з бацькам было мала шчырых гутарак. Ён шкадаваў мяне. Ці шкадавала я яго? Мне цяжка адказаць на гэтае пытанне... Мы былі бязлітасныя да сваіх бацькоў.

Нам здавалася, што свабода — гэта вельмі проста. Мінула няшмат часу, і мы самі сагнуліся пад яе цяжарам, бо ніхто не вучыў нас свабодзе. Вучылі толькі, як паміраць за свабоду.

Вось яна — свабода! Ці такую мы яе чакалі? Мы былі гатовыя памерці за свае ідэалы. Біцца ў сечы. А пачалося «чэхаўскае» жыццё. Без гісторыі. Абрынуліся ўсе каштоўнасці, апроч каштоўнасці жыцця. Жыцця ўвогуле. Новыя мары: збудаваць дом, набыць машыну, пасадзіць агрэст… Свабода аказалася рэабілітацыяй мяшчанства, як звычайна зацкаванага ў рускім жыцці. Свабодай Яго Вялікасці Спажывання. Вялікасці цемры. Цемры жаданняў, інстынктаў — патаемнага чалавечага існавання, пра якое мы мелі прыблізнае ўяўленне. Усю гісторыю мы выжывалі, а не жылі. А цяпер ваенны досвед ужо не патрэбны, яго лепей было забыць. Тысячы новых эмоцый, станаў, рэакцый… Неяк раптам усё навокал стала іншым: шыльды, рэчы, грошы, сцяг… І сам чалавек. Ён зрабіўся больш каляровым, адметным, маналіт узарвалі, і жыццё рассыпалася на выспачкі, атамы, ячэйкі. Як у Даля: свабода-воля… волюшка-раздолюшка… прастор. Вялікае зло ператварылася ў напаўзабытае паданне, у палітычны дэтэктыў. Ніхто ўжо не казаў пра ідэю, казалі пра крэдыты, працэнты, вэксалі, грошы не зараблялі, а «рабілі», «выйгравалі». Ці надоўга гэта? «Няпраўда грошай у рускай душы невытрутная», — пісала Цвятаева. Але быццам ажылі і разгульваюць па нашых вуліцах героі Астроўскага і Салтыкова-Шчадрына.

Ва ўсіх, з кім сустракалася, я пытала: «Што такое — свабода?» Бацькі і дзеці адказвалі па-featureрознаму. Тыя, хто нарадзіўся ў СССР, і тыя, хто нарадзіўся не ў СССР, не маюць агульнага досведу. Яны — людзі з розных планет.

Бацькі: свабода — адсутнасць страху; тры дні ў жніўні, калі мы перамаглі путч; чалавек, які выбірае ў краме са

ста гатункаў каўбасы, вальнейшы за чалавека, які выбірае з дзесяці гатункаў; быць нябітым, але нябітых пакаленняў нам ніколі не дачакацца; рускі чалавек не разумее свабоду, яму патрэбны казак і бізун.

Дзеці: свабода — любоў; унутраная свабода — абсалютная каштоўнасць; калі ты не баішся сваіх жаданняў; мець багата грошай, тады ў цябе будзе ўсё; калі ты можаш жыць так, каб не задумвацца пра свабоду. Свабода — гэта нармальна.

Шукаю мову. Чалавек мае шмат моваў: мова, на якой размаўляюць з дзецьмі, яшчэ адна, гэта тая, на якой гавораць у каханні… А яшчэ ёсць мова, на якой мы размаўляем самі з сабой, вядзем унутраныя гутаркі. На вуліцы, на працы, у падарожжах — паўсюль гучыць нешта іншае, мяняюцца не толькі словы, але і нешта яшчэ. Нават раніцай і ўвечары чалавек гаворыць па-рознаму. А тое, што адбываецца ўначы паміж двума людзьмі, начыста знікае з гісторыі. Мы маем справу толькі з гісторыяй дзённага чалавека. Самагубства — начная тэма, чалавек знаходзіцца на мяжы быцця і нябыту. Сну. Я хачу гэта зразумець з уедлівасцю дзённага чалавека. Пачула: «А вы не баіцеся, што спадабаецца?»

Едзем па Смаленшчыне. У адной вёсцы спыніліся каля крамы. Якія знаёмыя (я ж сама вырасла ў вёсцы), прыгожыя, якія добрыя твары — і якое ганебнае, бядотнае жыццё вакол. Узгаварыліся пра жыццё. «Пра свабоду пытаеце? Зайдзіце ў нашу краму: гарэлка стаіць, якая хочаш: «Стандарт», «Гарбачоў», «Пуцінка», каўбасы навалам, і сыру, і рыбы. Бананы ляжаць. Якая яшчэ свабода патрэбная? Нам гэтай досыць». — «А зямлю вам далі?» — «Хто на ёй будзе гарбаціцца? Хочаш — бяры. У нас адзін Васька Круты ўзяў. Малодшаму хлопцу восем гадоў, а ён побач з бацькам за плугам ідзе. У яго, калі ноймешся на працу — не скрадзеш, не паспіш. Фашыст!»

У Дастаеўскага ў «Легендзе пра Вялікага інквізітара» спрачаюцца пра свабоду. Пра тое, што шлях свабоды цяжкі, пакутніцкі, трагічны… «Навошта спазнаваць гэтае чортава дабро і зло, калі яно столькі каштуе?» Чалавек павінен увесь час выбіраць: свабода ці дабрабыт і ўладкаванне жыцця, свабода з пакутамі ці шчасце без свабоды. І большасць людзей ідзе другім шляхам.

Вялікі інквізітар кажа Хрысту, які вярнуўся на зямлю:

«Нашто ж Ты прыйшоў нам замінаць? Бо Ты прыйшоў нам замінаць і сам гэта ведаеш».

«Гэтак паважаючы яго (чалавека), Ты паводзіш сябе так, як быццам перастаў яму спачуваць, бо занадта шмат ад яго патрабуеш… Паважаючы яго менш, Ты менш ад яго і патрабаваў бы, а гэта было б бліжэй да любові, бо лягчэйшай была б ношка яго. Ён слабы і подлы… Чым вінаватая слабая душа, што не здольная змясціць такія страшныя дары?»

«Няма клопату больш безупыннага і пакутлівага для чалавека, чым, стаўшы вольным, знайсці хутчэй таго, перад кім схіліцца… і каму б перадаць хутчэй той дар свабоды, з якім гэтая няшчасная істота нараджаецца…»

* * *

У дзевяностыя… так, мы былі шчаслівымі, да той нашай наіўнасці ўжо не вярнуцца. Нам здавалася, што выбар зроблены, камунізм безнадзейна прайграў. А ўсё толькі пачыналася…

Мінула дваццаць гадоў… «Не палохайце нас сацыялізмам», — кажуць дзеці бацькам.

З размовы са знаёмым універсітэцкім выкладчыкам: «У канцы дзевяностых студэнты смяяліся, — распавядаў ён, — калі я згадваў пра Савецкі Саюз, яны былі ўпэўненыя, што перад імі адкрываецца новая будучыня. Цяпер

карціна іншая... Сённяшнія студэнты ўжо ўведалі, прачулі, што такое капіталізм — няроўнасць, беднасць, нахабнае багацце, перад вачыма ў іх жыццё бацькоў, якім нічога не перапала ад разрабаванай краіны. І яны радыкальна настроеныя. Мараць пра сваю рэвалюцыю. Носяць чырвоныя футболкі з партрэтамі Леніна і Чэ Гевары».

У грамадстве з'явіўся запыт на Савецкі Саюз. На культ Сталіна. Палова маладых людзей ад 19 да 30 гадоў лічаць Сталіна «найвялікшым палітычным дзеячом». У краіне, дзе Сталін знішчыў людзей не менш за Гітлера, новы культ Сталіна?! Зноў у модзе ўсё савецкае. Напрыклад, «савецкія» кавярні — з савецкімі назвамі і савецкімі стравамі. З'явіліся «савецкія» цукеркі і «савецкая» каўбаса — з пахам і смакам, знаёмымі нам з дзяцінства. І вядома, «савецкая» гарэлка. На тэлебачанні дзясяткі перадач, а ў інтэрнэце дзясяткі «савецкіх» настальгічных сайтаў. У сталінскія лагеры — на Салаўкі, у Магадан — вы можаце трапіць турыстам. Рэклама абяцае, што для паўнаты адчуванняў вам выдадуць лагерную робу, кірку. Пакажуць адрэстаўраваныя баракі. А пад канец арганізуюць рыбалку...

Адраджаюцца старамодныя ідэі: вялікай імперыі, «жалезнай рукі», «адмысловага рускага шляху»... Вярнулі савецкі гімн, ёсць камсамол, толькі ён называецца «Нашы», ёсць партыя ўлады, якая паўтарае камуністычную партыю. Прэзідэнт мае ўладу, як у Генсека. Абсалютную. Замест марксізму-ленінізму — праваслаўе...

Перад рэвалюцыяй сямнаццатага года Аляксандр Грын напісаў: «А будучыня неяк перастала стаяць на сваім месцы». Мінула сто гадоў — і будучыня зноў не на сваім месцы. Настаў час сэканд хэнд.

Барыкада — небяспечнае месца для мастака. Пастка. Там псуецца зрок, звужаюцца зрэнкі, свет губляе колеры. Там чорна-белы свет. Адтуль чалавека ўжо не разгледзіш, а бачыш толькі чорную кропку — мішэнь. Я ўсё

жыццё — на барыкадах, я хацела б сысці адтуль. Навучыцца радавацца жыццю. Вярнуць сабе нармальны зрок. Але дзясяткі тысяч людзей зноў выходзяць на вуліцы. Бяруцца за рукі. У іх белыя стужкі на куртках. Сімвал адраджэння. Святла. І я з імі.

Сустрэла на вуліцы маладых людзей у майках з сярпом і молатам і партрэтам Леніна. Ці ведаюць яны, што такое камунізм?

ЧАСТКА ПЕРШАЯ

# СУЦЯШЭННЕ АПАКАЛІПСІСАМ

# З ВУЛІЧНАЙ ГАМАНЫ І РАЗМОВАЎ НА КУХНІ (1991–2001)

## Пра Іванушку-дурачка і залатую рыбку

«Што я зразумеў? Я зразумеў, што героі аднаго часу рэдка бываюць героямі іншага часу. Апроч Іванушкі-дурачка. І Ямелі. Улюбёных герояў рускіх казак. Нашы казкі — пра выпадковае шчасце, пра момант удачы. Пра чаканне цудоўнай дапамогі, каб усё ў рот само звалілася. Лежачы на печы, мець усё. Каб печка сама бліны пякла, а залатая рыбка ўсе жаданні выконвала. Хачу тое і хачу гэта. Хачу Царэўну Прыўкрасную! І хачу жыць у іншым царстве — з малочнымі рэкамі і кісельнымі берагамі. Мы — летуценнікі, вядома. Душа працуе і пакутуе, а справа мала рухаецца, бо на яе сіл ужо не хапае. Справа стаіць. Загадкавая руская душа… Усе імкнуцца яе зразумець… чытаюць Дастаеўскага… Што там у іх за душой? А за душой у нас толькі душа. Пагаварыць любім на кухні, пачытаць кнігу. Галоўная прафесія — чытач. Глядач. І пры гэтым адчуванне сваёй асаблівасці, выключнасці, хоць падстаў для гэтага ніякіх, апроч нафты і газу. З аднаго боку, вось гэта і замінае перамене жыцця, а з другога боку, дае адчуванне сэнсу, ці што. Заўсёды вісіць у паветры, што Расія павінна стварыць, паказаць свету нешта надзвычайнае. Богам абраны народ. Адмысловы рускі шлях. Спрэс у нас Абломавы, ляжаць на канапе і чакаюць цуду. Але не Штольцы. Дзейнымі, жвавымі Штольцамі пагарджаюць за тое, што ссеклі ўлюбёны бярозавы гай, вішнёвы сад. Заводзікі там будуюць, робяць грошы. Чужыя нам Штольцы…»

«Руская кухня… Убогая “хрушчобная” куханька — дзевяцьдванаццаць (шчасце!) квадратных метраў, за тонкай сценкай

прыбіральня. Савецкая планіроўка. На акне цыбуля ў слоічках з-пад маянэзу, у гаршку альяс ад насмарку. Кухня ў нас — гэта не толькі месца для гатавання, але і сталоўка, і гасцёўня, і кабінет, і трыбуна. Месца для калектыўных псіхатэрапеўтычных сеансаў. У дзевятнаццатым стагоддзі ўся руская культура жыла ў дваранскіх сядзібах, а ў дваццатым — на кухнях. І перабудова таксама. Усё "шасцідзясятніцкае" жыццё — гэта "кухоннае" жыццё. Дзякуй Хрушчову! Гэта пры ім выйшлі з камуналак, займелі ўласныя кухні, дзе можна было лаяць уладу, а галоўнае — не баяцца, бо на кухні ўсе свае. Там нараджаліся ідэі, праджэкты фантастычныя. Рагаталі з анекдотаў... Анекдоты квітнелі! Камуніст — гэта той, хто Маркса чытаў, а антыкамуніст — гэта той, хто яго зразумеў. Мы выраслі на кухнях, і нашы дзеці таксама, яны разам з намі слухалі Галіча і Акуджаву. Круцілі Высоцкага. Лавілі Бі-бі-сі. Размовы пра ўсё: пра тое, як усё хранова, і пра сэнс жыцця, пра шчасце для ўсіх. Згадваю смешны выпадак... Засядзеліся неяк да паўночы, наша дачка, ёй было дванаццаць гадоў, тут, на маленькай канапцы, і заснула. А мы нешта гучна заспрачаліся. І яна скрозь сон як зараве: "Не трэба больш пра палітыку! Зноў Сахараў... Салжаніцын... Сталін..." *(Смяецца.)*

Бясконцая гарбата. Кава. Гарэлачка. А ў сямідзясятыя гады пілі кубінскі ром. Усе былі закаханыя ў Фідэля! У кубінскую рэвалюцыю! Чэ ў барэце. Галівудскі прыгажун! Бясконцая трасканіна. Страх, што нас праслухоўваюць, пэўна ж праслухоўваюць. Пасярод размовы абавязкова нехта гляне са смяшком на разетку: "Вы чуеце, таварыш маёр?" Нібы рызыка... нібы гульня... Атрымлівалі нават нейкае задавальненне ад гэтага ілжывага жыцця. Мізэрная колькасць людзей супрацiўлялася адкрыта, больш было "кухонных дысідэнтаў". З дуляй у кішэні...»

«Цяпер сорамна быць бедным, неспартовым... Не паспяваеш, значыць. А я з пакалення дворнікаў і вартаўнікоў. Быў такі

спосаб унутранай эміграцыі. Ты жывеш і не заўважаеш таго, што вакол, яно як краявід за акном. Мы з жонкай скончылі філасофскі факультэт Пецярбургскага (тады Ленінградскага) універсітэта, яна ўладкавалася дворнікам, а я — апальшчыкам у кацельні. Працуеш суткі, двое дома. Інжынер у той час атрымліваў сто трыццаць рублёў, а я ў кацельні — дзевяноста, значыць, пагаджаешся страціць сорак рублёў, але затое атрымліваеш поўную свабоду. Чыталі кніжкі, шмат чыталі. Размаўлялі. Думалі, што прадукуем ідэі. Марылі пра рэвалюцыю, але баяліся — не дачакаемся. Закрытае, увогуле, вялі жыццё, нічога не ведалі пра тое, што робіцца ў свеце. Былі “пакаёвымі раслінамі”. Усё сабе напрыдумлялі, як пасля высветлілася, і Захад, і капіталізм, і рускі народ — усё было палонам нашай фантазіі. Жылі міражамі. Такой Расіі, як у кніжках і на нашых кухнях, ніколі не было. Толькі ў нас у галаве.

У перабудову ўсё скончылася… Грымнуў капіталізм… Дзевяноста рублёў ператварыліся ў дзесяць долараў. На іх — не пражыць. Выйшлі з кухняў на вуліцу, і тут высветлілася, што ідэй у нас няма, мы проста сядзелі ўвесь гэты час і размаўлялі. Аднекуль з'явіліся зусім іншыя людзі — дзецюкі ў малінавых пінжаках і з залатымі пярсцёнкамі. І з новымі правіламі гульні: грошы ёсць — ты чалавек, грошай няма — ты ніхто. Каму гэта цікава, што ты Гегеля ўсяго прачытаў? “Гуманітарый” гучала як дыягназ. Маўляў, усё, што яны ўмеюць, — гэта трымаць томік Мандэльштама ў руках. Адкрылася шмат незнаёмага. Інтэлігенцыя збяднела да непрыстойнасці. У нашым парку на выхадных крышнаіты ставілі палявую кухню і раздавалі суп і нешта просценькае з другога. Шыхавалася такая чарга акуратненькіх старых, што спазма ў горле. Некаторыя хавалі свае твары. У нас да таго часу было ўжо двое маленькіх дзяцей. Галадалі натуральным чынам. Пачалі з жонкай гандляваць. Бралі на заводзе чатыры-шэсць скрынак марозіва і ехалі на рынак, туды, дзе шмат людзей. Лядоўняў ніякіх, праз некалькі гадзін марозіва ўжо цякло. Тады раздавалі яго галоднай

дзятве. Колькі радасці! Гандлявала жонка, а я то паднясу, то падвязу — усё што заўгодна гатовы быў рабіць, толькі не прадаваць. Доўга адчуваў сябе некамфортна.

Раней я часта згадваў наша "кухоннае жыццё"... Якое было каханне! Якія жанчыны! Гэтыя жанчыны пагарджалі багатымі. Іх нельга было купіць. А цяпер часу на пачуцці ніхто не мае — усе грошы зарабляюць. З'яўленне грошай — як выбух атамнай бомбы...»

## Пра тое, як мы палюбілі і разлюбілі Горбі

«Гарбачоўскі час... Вялізныя натоўпы людзей са шчаслівымі тварамі. Сва-бо-да! Усе гэтым дыхалі. Газеты былі нарасхват. Час вялікіх надзей — вось-вось трапім у рай. Дэмакратыя — невядомы нам звер. Як шалёныя, бегалі на мітынгі: зараз даведаемся ўсю праўду пра Сталіна, пра ГУЛАГ, прачытаем забароненых "Дзяцей Арбата" Рыбакова і іншыя добрыя кнігі — і станем дэмакратамі. Як жа мы памыляліся! З усіх радыёкропак крычала гэтая праўда... Хутчэй-хутчэй! Чытайце! Слухайце! Не ўсе, як выявілася, былі да гэтага гатовыя... Большасць людзей не мела антысавецкіх настрояў, яны хацелі толькі аднаго — добра жыць. Каб можна было купіць джынсы, "відак" і вяршыню мараў — аўтамабіль! Усім хацелася яркага адзення, смачнай ежы. Калі я прынесла дадому салжаніцынскі "Архіпелаг ГУЛАГ", мая мама была ў жаху: "Як ты зараз жа не сыдзеш з гэтай кнігай, я цябе выганю з хаты". У бабулі расстралялі мужа перад вайной, а яна казала: "Ваські не шкада. Арыштавалі правільна. За доўгі язык". — "Бабуля, чаму ты нічога мне не расказвала?" — пыталася я. "Няхай маё жыццё здохне разам са мной, каб вы не пацярпелі". Так жылі нашы бацькі і іхнія бацькі. Усё катком было адпрасаванае. Перабу-

дову зрабіў не народ, гэта зрабіў адзін чалавек — Гарбачоў. Гарбачоў і купка інтэлігентаў…»

«Гарбачоў — сакрэтны амерыканскі агент… Масон… Здрадзіў камунізму. Камуністаў — на сметнік, камсамольцаў — на звалку! Я ненавіджу Гарбачова за тое, што ён скраў у мяне Радзіму. Савецкі пашпарт як самую дарагую рэч захоўваю. Так, мы стаялі ў чарзе па сінюшных курэй і гнілую бульбу, але гэта была Радзіма. Я яе любіў. Вы жылі ў "Верхняй Вольце з ракетамі", а я жыў у вялікай краіне. Расія заўсёды для Захаду — вораг, яе баяцца. Костка ў горле. Нікому не патрэбная моцная Расія — з камуністамі ці без іх. На нас глядзяць як на склад — нафты, газу, лесу і каляровых металаў. Нафту мяняем на майткі. А была цывілізацыя без трантаў і барахла. Савецкая цывілізацыя! Камусьці трэба было, каб яе не стала. Аперацыя ЦРУ. Намі ўжо кіруюць амерыканцы. Гарбачову добра за гэта заплацілі… Рана ці позна яго будуць судзіць. Спадзяюся, Юда дажыве да народнага гневу. Я з задавальненнем прастрэліў бы яму патыліцу на Бутаўскім палігоне. *(Грукае кулаком па стале.)* Настала шчасце, так? З'явіліся каўбаса і бананы. Валяемся ў гаўне і ямо ўсё чужое. Замест Радзімы — вялікі супермаркет. Калі гэта называецца свабода, мне такая свабода не патрэбная. Цьфу! Народ пад плінтус апусцілі, мы рабы. Рабы! Пры камуністах кухарка, як казаў Ленін, кіравала дзяржавай: рабочыя, даяркі, ткачыхі — а цяпер у парламенце сядзяць бандыты. Доларавыя мільянеры. Ім у турме трэба сядзець, а не ў парламенце. Ашукалі нас з перабудовай!

Я нарадзіўся ў СССР, і мне там падабалася. Мой бацька быў камуністам, вучыў чытаць мяне па газеце "Правда". На кожнае свята мы з ім хадзілі на дэманстрацыю. Са слязьмі на вачах… Я быў піянерам, насіў чырвоны гальштук. Прыйшоў Гарбачоў, і я не паспеў стаць камсамольцам, аб чым шкадую. Я — савок, так? Мае бацькі — саўкі, дзед і баба — саўкі? Мой саўковы дзед загінуў пад Масквой у сорак першым… А мая саўковая

бабка была ў партызанах... Спадары лібералы адпрацоўваюць сваю пайку. Хочуць, каб мы сваё мінулае лічылі чорнай дзіркай. Я іх усіх ненавіджу: гарбачова, шэварднадзэ, якаўлева, — напішыце з маленькай літары, гэтак я іх ненавіджу. Я не хачу ў Амерыку, я хачу ў СССР...»

«То былі выдатныя, наіўныя гады... Мы паверылі Гарбачову, цяпер ужо нікому так лёгка не паверым. Многія рускія людзі вярталіся з эміграцыі на Радзіму... Быў такі ўздым! Думалі, што разбурым гэты барак. Пабудуем нешта новае. Я скончыла філалагічны факультэт МДУ і паступіла ў аспірантуру. Марыла займацца навукай. Кумірам у тыя гады быў Аверынцаў, на яго лекцыі сыходзілася ўся адукаваная Масква. Сустракаліся і падтрымлівалі адно ў адным ілюзію, што неўзабаве будзе іншая краіна, і мы за гэта змагаемся. Калі я даведалася, што мая аднакурсніца з'язджае ў Ізраіль, дык вельмі здзівілася: "Няўжо табе не крыўдна з'язджаць? У нас усё толькі пачынаецца".

Чым больш гаварылі і пісалі: "Свабода! Свабода!", тым хутчэй з прылаўкаў знікалі не толькі сыр і мяса, але і соль, і цукар. Пустыя крамы. Страшна. Усё па талонах, як у вайну. Нас выратавала наша бабуля, яна цэлымі днямі бегала па горадзе і атаварвала тыя талоны. Увесь балкон быў забіты пральным парашком, у спальні стаялі мяхі з цукрам і крупамі. Калі выдалі талоны на шкарпэткі, тата заплакаў: "Гэта канец СССР". Ён адчуў... Тата працаваў у канструктарскім бюро на вайсковым заводзе, займаўся ракетамі, і яму гэта шалёна падабалася. У яго былі дзве вышэйшыя адукацыі. Замест ракет завод стаў штампаваць пральныя машыны і пыласосы. Тату скарацілі. Яны з мамай былі заўзятымі перабудоўшчыкамі: пісалі плакаты, разносілі ўлёткі — і вось фінал... Разгубіліся. Не маглі паверыць, што свабода — яна вось такая. Не маглі з гэтым змірыцца. На вуліцах ужо крычалі: "Гарбачову грош цана, беражыце Ельцына!" Неслі партрэты Брэжнева ў ордэнах, а партрэты Гарбачова — у талонах. Пачыналася цараванне Ельцына: гай-

дараўскія рэформы і вось гэтае ненавіснае мне "купі-прадай"... Каб выжыць, я ездзіла ў Польшчу з мяхамі лямпачак і дзіцячых цацак. Поўны вагон: настаўнікі, інжынеры, лекары... Усе з мяхамі і торбамі. Усю ноч сядзім і абмяркоўваем "Доктара Жывага" Пастарнака... п'есы Шатрова... Як у Маскве на кухні.

Згадваю ўніверсітэцкіх сяброў... Мы сталі кім заўгодна, толькі не філолагамі — топ-менеджарамі рэкламных агенцтваў, банкаўскімі работнікамі, "чаўнакамі"... Я працую ў агенцтве нерухомасці ў адной дамы, якая прыехала з правінцыі, былы камсамольскі работнік. У каго сёння фірмы? Вілы на Кіпры і Маямі? У былой партыйнай наменклатуры. Гэта да таго, дзе трэба шукаць грошы партыі... А нашы правадыры... шасцідзясятнікі... Яны крыві на вайне нанюхаліся, але былі наіўныя, як дзеці... Нам трэ было дняваць і начаваць на плошчах. Давесці справу да канца — дамагчыся Нюрнберга для КПСС. Мы занадта хутка разышліся па дамах. Фарцоўшчыкі і мянялы ўзялі ўладу. І насуперак Марксу, пасля сацыялізму будуем капіталізм. *(Маўчыць.)* Але я шчаслівая, што жыла ў гэты час. Камунізм сканаў! Усё, ён ужо не вернецца. Жывём у іншым свеце і глядзім на свет іншымі вачыма. Вольнае дыханне тых дзён я ніколі не забуду...»

## Пра тое, як прыйшло каханне, а пад вокнамі — танкі

«Я была закаханая, ні пра што іншае не магла думаць. Жыла выключна гэтым. І вось мама раніцай будзіць: "Танкі пад вокнамі! Здаецца, пераварот!" Я праз сон: "Мама, гэта вучэнні". Фіг вам! Пад вокнамі стаялі сапраўдныя танкі, я ніколі не бачыла танкі так блізка. У тэлевізары паказвалі балет "Лебядзінае возера"... Прыбегла маміна сяброўка, яна вельмі хвалявалася, што не здала партыйныя ўнёскі за некалькі месяцаў. Казала,

што ў іх у школе стаяў бюст Леніна, яна яго вынесла ў бакоўку, а цяпер — што з ім рабіць? Усё адразу стала на свае месцы: гэтага нельга і таго нельга. Дыктарка зачытвала Заяву аб надзвычайным становішчы... Маміна сяброўка пры кожным слове ўздрыгвала: “Божа мой! Божа мой!” Бацька пляваўся ў тэлевізар...

Патэлефанавала Алегу... “Едзем да Белага дома?” — “Едзем!” Прышпіліла значок з Гарбачовым. Нарэзала бутэрбродаў. У метро людзі былі негаварлівыя, усе чакалі бяды. Паўсюль танкі... танкі... На бране сядзелі не забойцы, а спалоханыя хлопцы з вінаватымі тварамі. Бабулькі кармілі іх варанымі яйкамі і блінамі. На душы стала лягчэй, калі перад Белым домам убачыла дзясяткі тысяч людзей! Настрой ва ўсіх грандыёзны. Адчуванне, што мы ўсё можам. Разам крычалі: “Ельцын, Ельцын! Ельцын!” Ужо фармаваліся атрады самаабароны. Запісвалі толькі маладых, а пажылым адмаўлялі, і яны былі незадаволеныя. Нейкі дзед абураўся: “У мяне камуністы жыццё скралі! Дайце хоць бы памерці прыгожа!” — “Папаша, адыдзіце...” Цяпер кажуць, што мы хацелі абараніць капіталізм... Няпраўда! Я бараніла сацыялізм, але нейкі іншы... не савецкі... І я яго абараніла! Я так думала. Мы ўсе так думалі... Праз тры дні танкі сыходзілі з Масквы, гэта ўжо былі добрыя танкі. Перамога! І мы цалаваліся, цалаваліся...»

*Сяджу на кухні ў маіх маскоўскіх знаёмых. Тут сабралася вялікая кампанія: сябры, сваякі з правінцыі. Успомнілі, што заўтра чарговая гадавіна жнівеньскага путчу.*

— Заўтра — свята...

— А што тут святкаваць? Трагедыя. Народ прайграў.

— Пад музыку Чайкоўскага саўдэпію пахавалі...

— Першае, што я зрабіла, узяла грошы і пабегла ў крамы. Ведала, чым бы яно ні скончылася, а цэны вырастуць.

— Узрадаваўся: Горбі прыбяруць! Надакучыў ужо гэты балбатун.

—Рэвалюцыя была дэкаратыўная. Спектакль для народа. Памятаю поўную абыякавасць, з кім ні загаворыш. Чакалі.

—А я патэлефанаваў на працу — і пайшоў рабіць рэвалюцыю. Выграб з буфета ўсе нажы, якія былі дома. Разумеў, што вайна... зброя патрэбная...

—Я быў за камунізм! У нас у сям'і — усе камуністы. Замест калыханак мама спявала нам рэвалюцыйныя песні. І ўнукам цяпер пяе. «Ты што, звар'яцела?» — кажу. А яна: «Я іншых песень не ведаю». І дзед быў бальшавік... і бабуля...

—Вы яшчэ скажыце, што камунізм — прыгожая казачка. Майго таты бацькі прапалі ў лагерах у Мардовіі.

—Я пайшоў да Белага дома разам з бацькамі. Тата сказаў: «Хадзем. А то каўбасы і добрых кніг не будзе ніколі». Ламалі брук і будавалі барыкады.

—Цяпер народ працверазеў, і стаўленне да камуністаў мяняецца. Можна не хавацца... Я працаваў у райкаме камсамолу. У першы дзень усе камсамольскія білеты, чыстыя бланкі і значкі забраў дадому і схаваў у падвале, потым бульбу не было куды складваць. Я не ведаў, навошта яны мне патрэбныя, але ўявіў, як прыйдуць апячатваць і ўсё гэта знішчаць, а гэта былі дарагія для мяне сімвалы.

—Мы маглі пайсці забіваць адзін аднаго... Бог ратаваў!

—Наша дачка ляжала ў радзільні. Я прыйшла да яе, а яна: «Мама, рэвалюцыя будзе? Грамадзянская вайна пачнецца?»

—А я скончыў вайсковае вучылішча. Служыў у Маскве. Далі б нам загад кагосьці арыштаваць, дык, без усялякіх сумневаў, мы б гэты загад выканалі. Многія б выканалі яго старанна. Надакучыла бязладдзе ў краіне. Усё раней было дакладна і ясна, усё паводле загаду. Быў парадак. Вайскоўцы любяць так жыць. Увогуле людзі любяць так жыць.

—Я баюся свабоды, прыйдзе п'яны мужык і спаліць лецішча.

—Якія, братцы, ідэі? Жыццё кароткае. Давайце вып'ем!

*19 жніўня 2001 года — дзесяцігадовы юбілей жнівеньскага путчу. Я ў Іркуцку — сталіцы Сібіры. Бяру некалькі бліц-інтэрв'ю на вуліцах горада.*

*Пытанне:*

— Што было б, калі б ГКЧП перамог?

*Адказы:*

— Захавалі б вялікую краіну…

— Паглядзіце на Кітай, дзе камуністы ва ўладзе. Кітай стаў другой эканомікай у свеце…

— Гарбачова і Ельцына судзілі б як здраднікаў Радзімы.

— Залілі б краіну крывёй… І запакавалі б людзьмі канцлагеры.

— Не здрадзілі б сацыялізму. Не падзяліліся б на багатых і бедных.

— Не было б ніякай вайны ў Чачні.

— Ніхто не смеў бы казаць, што Гітлера перамаглі амерыканцы.

— Я сам стаяў каля Белага дома. І ў мяне такое адчуванне, што мяне падманулі.

— Што было б, калі б путч перамог? А ён і перамог! Помнік Дзяржынскаму зрынулі, а Лубянка засталася. Будуем капіталізм пад кіраўніцтвам КДБ.

— Маё жыццё не змянілася б…

## Пра тое, як рэчы зраўняліся з ідэямі і словамі

«Свет рассыпаўся на дзясяткі рознакаляровых аскепкаў. Як нам хацелася, каб шэрыя савецкія будні хутчэй ператварыліся ў салодкія карцінкі з амерыканскага кіно! Пра тое, як мы стаялі каля Белага дома, ужо мала хто ўспамінаў… Тыя тры дні страсянулі свет, але не страсянулі нас… Дзве тысячы чалавек мітынгу-

юць, а астатнія едуць міма і глядзяць на іх як на ідыётаў. Шмат пілі, у нас заўсёды шмат п'юць, але тады асабліва шмат пілі. Грамадства стаілася: куды рушым? Ці то будзе капіталізм, ці то будзе добры сацыялізм? Капіталісты тлустыя, страшныя — да гэтага нас прывучылі з дзяцінства... *(Смяецца.)*

Краіна пакрылася банкамі і гандлёвымі палаткамі. З'явіліся зусім іншыя рэчы. Не дапатопныя сукенкі й грубыя боты, а рэчы, пра якія мы заўсёды марылі: джынсы, дублёнкі... жаночая бялізна і добры посуд... Усё каляровае, прыгожае. Нашы савецкія рэчы былі шэрыя, аскетычныя, падобныя на вайсковыя. Бібліятэкі і тэатры апусцелі. Іх замянілі рынкі і камерцыйныя крамы. Усе захацелі быць шчаслівымі, атрымаць шчасце зараз. Як дзеці, адкрывалі для сябе новы свет... Перасталі губляць прытомнасць у супермаркеце... Знаёмы хлопец заняўся бізнэсам. Распавядаў мне: першы раз прывёз тысячу бляшанак распушчальнай кавы — расхапалі за пару дзён, купіў сто пыласосаў — таксама ўмомант расхапалі. Курткі, швэдры, усялякая дробязь — толькі давай! Усе пераапраналіся, пераабуваліся. Мянялі тэхніку і мэблю. Рамантавалі лецішчы... Захацелі рабіць прыгожыя плоцікі і дахі... Як станем іншы раз з сябрамі ўспамінаць, дык паміраем са смеху... Дзікуны! Абсалютная ж былі галота. Усяму трэба было вучыцца... У савецкі час дазвалялася мець шмат кніг, але не дарагую машыну і дом. І мы вучыліся добра апранацца, смачна гатаваць, раніцай піць сок і ёгурт... Я да гэтага грэбавала грашыма, бо не ведала, што гэта такое. У нашай сям'і нельга было гаварыць пра грошы. Сорамна. Мы выраслі ў краіне, у якой грошы, можна сказаць, адсутнічалі. Я, як усе, атрымлівала свае сто дваццаць рублёў — і мне хапала. Грошы прыйшлі з перабудовай. З Гайдарам. Сапраўдныя грошы. Замест "Наша будучыня — камунізм" паўсюль віселі расцяжкі "Купляйце! Купляйце!". Хочаш — падарожнічай. Можаш убачыць Парыж... Ці Іспанію... Фэст... бой быкоў... Я пра гэта чытала ў Хемінгуэя, чытала і разумела, што ніколі гэтага не ўбачу.

Кнігі былі замест жыцця… Так скончыліся нашы ўсяночныя на кухнях і пачаліся заробкі, прыпрацоўкі. Грошы сталі сінонімам свабоды. Гэта хвалявала ўсіх. Найбольш моцныя і агрэсіўныя заняліся бізнэсам. Пра Леніна і Сталіна забылі. Так мы ўратаваліся ад грамадзянскай вайны, а то зноў былі б "белыя" і "чырвоныя". "Нашы" — "не нашы". Замест крыві — рэчы… Жыццё! Выбралі прыгожае жыццё. Ніхто не хацеў прыгожа паміраць, усе хацелі прыгожа жыць. Іншая рэч, што пернікаў на ўсіх не хапіла…»

«Савецкі час… У Слова быў святарны, магічны статус. І па інерцыі на інтэлігенцкіх кухнях яшчэ гаварылі пра Пастарнака, варылі суп, не выпускаючы з рук Астаф'ева і Быкава, але жыццё ўвесь час даводзіла, што гэта ўжо не істотнае. Словы нічога не значаць. У дзевяноста першым… Мы паклалі нашу маму ў бальніцу з цяжкай пнеўманіяй, і яна вярнулася адтуль гераіняй, у яе рот там не закрываўся. Распавядала пра Сталіна, пра забойства Кірава, пра Бухарына… Яе гатовыя былі слухаць дзень і ноч. Людзі тады хацелі, каб ім расплюшчылі вочы. А нядаўна яна зноў трапіла ў бальніцу, і колькі там была, столькі маўчала. Гадоў пяць прамінула ўсяго, а рэальнасць ужо размеркавала ролі інакш. Гераіняй цяпер была жонка буйнога бізнэсмена… Анямелі ўсе ад яе расказаў… Які ў яе дом — трыста квадратных метраў! Колькі прыслугі: кухарка, нянька, кіроўца, садоўнік… Адпачываць з мужам ездзяць у Еўропу… Музеі — зразумела, а буцікі… Буцікі! Адзін пярсцёнак во колькі карат, а другі… А падвескі… залатыя кліпсы… Поўны аншлаг! Пра ГУЛАГ ці пра нешта такое ні слова. Ну было і было. Што цяпер спрачацца са старымі?

Я заходзіла, як звычайна, у букініст — там спакойна стаялі ўсе дзвесце тамоў "Сусветнай літаратуры" і "Бібліятэка прыгод", тая самая — аранжавая, пра якую я мроіла. Глядзела на карэньчыкі і доўга ўдыхала гэты пах. Ляжалі горы кніг! Інтэлігенты распрадавалі свае бібліятэкі. Публіка, вядома, збяд-

нела, але не праз гэта кнігі выносілі з дому, не толькі дзеля грошай — кнігі расчаравалі. Поўнае расчараванне. Стала ўжо няёмка пытацца: "А што ты цяпер чытаеш?" У жыцці надта шмат што змянілася, а ў кнігах гэтага няма. Рускія раманы не вучаць, як дамагчыся поспеху ў жыцці. Як стаць багатым... Абломаў ляжыць на канапе, а героі Чэхава ўвесь час п'юць гарбату і скардзяцца на жыццё... *(Маўчыць.)* Не дай бог жыць у эпоху перамен — кажуць кітайцы. Мала хто з нас захаваўся такім, якім быў. Кудысьці зніклі прыстойныя людзі. Паўсюль локці і зубы...»

«Калі пра дзевяностыя... Я б не сказаў, што гэта быў прыгожы час, ён быў выродлівы. Адбыўся пераварот у мазгах на сто восемдзесят градусаў... Хтосьці не вытрымаў і звар'яцеў, бальніцы для псіхічных хворых былі перапоўненыя. Я наведваў там свайго сябра: адзін крычыць: "Я — Сталін! Я — Сталін!", а другі: "Я — Беразоўскі! Я — Беразоўскі". Іх цэлае аддзяленне — сталіных і беразоўскіх. На вуліцах увесь час стралялі. Забілі вялікую колькасць людзей. Штодзень здараліся разборкі. Урваць. Паспець. Пакуль іншыя не паспелі. Кагосьці абрабавалі, кагосьці пасадзілі. З трона — у цямніцу. А з другога боку, кайф — усё адбываецца на тваіх вачах...

У банках стаялі чэргі людзей, ахвочых пачаць сваю справу: адкрыць пякарню, прадаваць электроніку... Я таксама быў у гэтай чарзе. І мяне здзівіла, як нас шмат. Нейкая цётка ў вязаным барэце, хлопчык у спартовай куртачцы, здаравенны мужык, рыхтык зэк... Семдзесят з лішкам гадоў вучылі: не ў грашах шчасце, усё лепшае ў жыцці чалавек атрымлівае бясплатна. Каханне, напрыклад. Але варта было з трыбуны прамовіць: гандлюйце, багацейце — усё забылі. Усе савецкія кніжкі забылі. Гэтыя людзі зусім не былі падобныя да тых, з кім я да світанку сядзеў і брынькаў на гітары. Тры акорды сяк-так вывучыў. Адзінае, што іх аб'ядноўвала з "кухоннымі" людзьмі, дык гэта тое, што ім таксама надакучылі кумачовыя

сцягі і ўся тая мішура: камсамольскія сходы, палітзаняткі... Сацыялізм лічыў чалавека дурненькім...

Я вельмі добра ведаю, што такое мара. Усё дзяцінства прасіў набыць мне ровар, і мне яго не набылі. Бедна жылі. У школе я фарцаваў джынсамі, у інстытуце — савецкай вайсковай формай плюс сімволікай рознай. Замежнікі набывалі. Звычайная фарца. У савецкі час за гэта саджалі на тэрмін ад трох да пяці гадоў. Бацька бегаў за мной з папругай і крычаў: "Спекулянт! Я пад Масквой кроў праліваў, а выгадаваў такога гаўнюка!" Учора злачынства, сёння — бізнэс. У адным месцы набыў цвікі, у іншым набойкі — спакаваў у поліэтыленавы мяшэчак і прадаў як новы тавар. Прынёс дадому грошы. Накупляў усяго, поўную лядоўню. Бацькі чакалі, што па мяне прыйдуць і арыштуюць. *(Рагоча.)* Гандляваў бытавой тэхнікай. Скараваркамі, параваркамі... Прыганяў з Германіі машыну з прычэпам гэтага дабра. Усё ішло валам... У мяне ў кабінеце стаяла скрынка з-пад камп'ютара, поўная грошай, я толькі так разумеў, што гэта грошы. Бярэш, бярэш з гэтай скрынкі, а там усё не канчаецца. Ужо быццам усё набыў: тачку, кватэру... гадзіннік "Ролекс"... Памятаю гэтае ап'яненне... Ты можаш выканаць усе свае жаданні, таемныя фантазіі. Я шмат даведаўся пра сябе: па-першае, што ў мяне няма густу, а па-другое, што я закамплексаваны. Не ўмею грашам даваць рады. Я не ведаў, што вялікія грошы павінны працаваць, яны не могуць ляжаць. Грошы — такое ж выпрабаванне для чалавека, як улада, як каханне... Марыў... І я паехаў у Манака. У казіно Монтэ-Карла прайграў велізарныя грошы, вельмі шмат. Мяне несла... Я быў рабом сваёй скрынкі. Ці ёсць там грошы ці не? Колькі іх? Іх павінна быць больш і больш. Мяне перастала цікавіць тое, што цікавіла раней. Палітыка... мітынгі... Памёр Сахараў. Я пайшоў з ім развітацца. Сотні тысяч людзей... Усе плакалі, і я плакаў. А тут нядаўна чытаю пра яго ў газеце: "Памёр вялікі юродзівы Расіі". І я падумаў, што ён своечасова памёр. Вярнуўся з Амерыкі Салжаніцын, усе

кінуліся да яго. Але ён не разумеў нас, а мы яго. Замежнік. Ён прыехаў у Расію, а за акном Чыкага...

Кім бы я быў, калі б не перабудова? ІТР з мізэрным заробкам... *(Смяецца.)* А цяпер у мяне свая клініка для вачэй. Некалькі соцень чалавек залежаць ад мяне са сваімі сем'ямі, дзядулямі, бабулямі. Вы корпаецеся ў сабе, рэфлексуеце, а ў мяне гэтай праблемы няма. Я працую дзень і ноч. Закупіў найноўшае абсталяванне, адправіў хірургаў у Францыю на стажыроўку. Але я не альтруіст, я добра зарабляю. Усяго дамогся сам... У мяне было толькі трыста долараў у кішэні... Пачынаў бізнэс з партнёрамі, ад якіх вы самлелі б, калі б яны зараз зайшлі ў пакой. Гарылы! Люты погляд! Цяпер іх ужо няма, яны зніклі, як дыназаўры. Хадзіў у бронекамізэльцы, у мяне стралялі. Калі хтосьці есць каўбасу, горшую за маю, мяне гэта не цікавіць. Вы ж усе хацелі, каб быў капіталізм. Марылі! Не крычыце, што вас падманулі...»

## Пра тое, што мы выраслі сярод катаў і ахвяр

«Ідзём увечары з кіно. У лужыне крыві ляжыць мужчына. На спіне ў плашчы дзірка ад кулі. Каля яго стаіць міліцыянер. Так першы раз я пабачыў забітага чалавека. Неўзабаве прывык да гэтага. Дом наш вялікі, дваццаць пад'ездаў. Кожную раніцу ў двары знаходзілі труп, і ўжо нас не перасмыкала. Пачынаўся сапраўдны капіталізм. З крывёю. Я чакаў ад сябе ўзрушэння, а яго не было. Пасля Сталіна ў нас іншае стаўленне да крыві... Памятаем, як свае забівалі сваіх... І пра масавыя забойствы людзей, якія не ведалі, за што іх забіваюць... Гэта засталося, гэта прысутнічае ў нашым жыцці. Мы выраслі сярод катаў і ахвяр... Для нас нармальна — жыць разам. Няма мяжы паміж мірным і ваенным станам. Заўсёды вайна. Уключыш

тэлевізар — усе ботаюць па фені: і палітыкі, і бізнэсмены, і прэзідэнт: адкаты, хабары, распілы… Чалавечае жыццё — плюнуць і расцерці. Як на зоне…»

«Чаму мы не асудзілі Сталіна? Я вам адкажу… Каб асудзіць Сталіна, трэба асудзіць сваіх родных, знаёмых. Самых блізкіх людзей. Раскажу пра сваю сям'ю… Тату пасадзілі ў трыццаць сёмым, дзякуй богу, ён вярнуўся, але адседзеў дзесяць гадоў. Вярнуўся і вельмі хацеў жыць… Сам дзівіўся, што яму пасля ўсяго, што ён бачыў, хочацца жыць… Так было не з усімі, далёка не з усімі… Маё пакаленне вырасла з татамі, якія вярнуліся або з лагераў, або з вайны. Адзінае, пра што яны маглі нам расказаць, дык гэта пра гвалт. Пра смерць. Яны рэдка смяяліся, шмат маўчалі. І пілі… пілі… Урэшце співаліся. Другі варыянт… Тыя, каго не пасадзілі, баяліся, што пасадзяць. Усё гэта не месяц ці два, а гадамі доўжылася — гадамі! А калі не пасадзілі, пытанне: чаму ўсіх пасадзілі, а мяне не? Што я раблю не так? Маглі арыштаваць, а маглі накіраваць на працу ў НКВД… Партыя просіць, партыя загадвае. Выбар непрыемны, але многія павінны былі яго зрабіць… А цяпер пра катаў… Звычайных, не страшных… Данёс на тату наш сусед… дзядзька Юра… Пра нейкую дробязь, як казала мама. Мне было сем гадоў. Дзядзька Юра браў на рыбалку сваіх дзетак і мяне, вазіў на кані. Папраўляў наш плот. Разумееце, зусім іншы партрэт ката атрымліваецца — звычайны чалавек, нават добры… Нармальны… Арыштавалі тату, і праз некалькі месяцаў забралі татавага брата. Пры Ельцыне мне далі яго справу, там ляжала некалькі даносаў, адзін напісала цётка Вольга… Пляменніца… Прыгожая жанчына, вясёлая… Добра спявала… Яна ўжо была старая, я спытаў: “Цёця Воля, раскажы пра трыццаць сёмы год…” — “Гэта быў самы шчаслівы год у маім жыцці. Я была закаханая”, — адказала яна мне… Татаў брат не вярнуўся дадому. Знік. У турме ці ў лагеры — невядома. Мне было цяжка, але я ўсё ж задаў пытанне, якое мяне мучыла: “Цёця Воля, на-

што ты гэта зрабіла?" — "Дзе ты бачыў сумленнага чалавека ў сталінскі час?" *(Маўчыць.)* А яшчэ быў дзядзька Павел, які служыў у Сібіры ў войсках НКВД... Разумееце, не існуе хімічна чыстага зла... Гэта не толькі Сталін і Берыя... Гэта і дзядзька Юра, і прыгожая цётка Вольга...»

*Першага мая. У гэты дзень камуністы праходзяць па вуліцах Масквы шматтысячным маршам. Сталіца зноў «чырванее»: чырвоныя сцягі, чырвоныя шарыкі, чырвоныя футболкі з сярпом і молатам. Нясуць партрэты Леніна і Сталіна. Партрэтаў Сталіна больш. Плакаты: «У труне мы бачылі ваш капіталізм!», «Чырвоны сцяг — на Крэмль!». Звычайная Масква стаіць на тратуары, «чырвоная» коціць лавінай па праезнай частцы. Паміж імі ўвесь час ідзе сварка, месцамі даходзіць да боек. Паліцыя не ў сілах падзяліць гэтыя дзве Масквы. А я не паспяваю запісваць усё, што чую...*

—Пахавайце Леніна, прычым без аркестра.

—Амерыканскія паслугачы! За што прадалі краіну?

—Дурні вы, братцы...

—Ельцын і яго банда скралі ў нас усё. Піце! Жыруйце! Калісьці гэта скончыцца...

—Баяцца народу проста сказаць, што будуем капіталізм? Зброю гатовыя схапіць усе, нават мая мама—хатняя гаспадыня.

—Штыком шмат чаго можна зрабіць, але сядзець на ім нязручна.

—А я буржуінаў праклятых танкамі душыў бы!

—Камунізм прыдумаў габрэй Маркс...

—Уратаваць нас можа толькі адзін чалавек — таварыш Сталін. Яго б нам на два дні... Расстраляў бы іх усіх — і хай сыходзіць, кладзецца.

—І слава табе, госпадзе! Я ўсім святым пакланюся.

—Сталінскія сцукі! У вас кроў на руках яшчэ не астыла. Царскую сям'ю нашто забілі? Не пашкадавалі нават дзяцей.

—Вялікую Расію не зробіш без вялікага Сталіна.

—Засралі народу мазгі…

—Я просты чалавек. Сталін простых людзей не чапаў. У нашым родзе ніхто не пацярпеў — усе рабочыя. Ляцелі галовы начальнікаў, а просты чалавек жыў спакойна.

—Чырвоная гэбня! Хутка дагаворыцеся да таго, што ніякіх лагераў не было, акрамя піянерскіх. Мой дзед быў дворнікам.

—А мой каморнікам.

—Машыністам…

*Каля Беларускага вакзала пачаўся мітынг. Натоўп выбухаў то воплескамі, то крыкамі: «Ура! Ура! Слава!». Пад канец уся плошча грымнула песню на матыў «Варшавянкі» — рускай «Марсельезы», з новым тэкстам: «Скінем з сябе ліберальныя путы, / Скінем крывавы злачынны рэжым». Пасля гэтага, згарнуўшы чырвоныя сцягі, адны заспяшаліся да метро, іншыя сталі ў чэргі каля шапікаў з піражкамі і півам. Пачаліся народныя гулянні. Скакалі і весяліліся. Старая жанчына ў чырвонай хустцы кружыла з прытопам вакол гарманіста: «Мы весела пляшам / І звонка пяём, / І песеньку нашу / Мы Сталіну шлём…» Каля самага метро мяне дагналі п'яныя прыпеўкі: «Ад'ябіся ўсё благое, прыябіся добрае».*

## Пра тое, што нам трэба выбіраць: вялікую гісторыю ці банальнае жыццё

*Каля піўнога шапіка заўсёды шумна. Народ розны. Тут сустрэнеш прафесара, рабацягу, студэнта, бамжа… П'юць і філасофствуюць. Усё пра тое ж — пра лёс Расіі. Пра камунізм.*

—Я — чалавек пітушчы. Чаму я п'ю? Мне маё жыццё не падабаецца. Хачу зрабіць кульбіт неймаверны з дапамогай алкаголю і нейкім чынам перанесціся ў іншае месца. І там усё будзе прыгожа і добра.

—Для мяне пытанне стаіць больш канкрэтна: дзе я хачу жыць — у вялікай краіне ці ў нармальнай?

—Я любіў імперыю... Мне жыццё пасля імперыі нуднае. Нецікавае.

—Вялікая ідэя патрабуе крыві. Сёння ніхто не хоча паміраць дзесьці. На нейкай вайне. Як у той песні: «Усюды грошы, грошы, грошы. / Усюды грошы, гаспада...». А калі вы настойваеце, што ў нас ёсць мэта, то якая яна? Кожнаму па «мерседэсе» і пуцёўцы ў Маямі?

—Рускаму чалавеку трэба ў штосьці верыць... Верыць у светлае, узнёслае. У нас у падкорцы закладзена імперыя і камунізм. Гераічнае нам бліжэй.

—Сацыялізм прымушаў чалавека жыць у гісторыі... прысутнічаць пры чымсьці вялікім...

—Бляць! Мы такія духоўныя, мы такія спецыяльныя.

—Не было ў нас дэмакратыі. Якія мы з вамі дэмакраты?

—Апошняя вялікая падзея ў нашым жыцці — перабудова.

—Расія можа быць толькі вялікай або не быць зусім. Нам патрэбна моцная армія.

—Ну на храна мне вялікая краіна? Хачу жыць у маленькай, такой, як Данія. Без ядзернай зброі, без нафты і газу. Каб ніхто мяне не біў рэвальверам па галаве. Можа, тады мы таксама навучымся тратуары шампунем мыць...

—Камунізм — непасільная для чалавека задача... У нас заўсёды так: ці то канстытуцыі хочацца, ці то сяўружыны з хрэнам...

—Як я зайздрошчу людзям, якія мелі ідэю! А мы цяпер жывём без ідэі. Хачу вялікую Расію! Я яе не памятаю, але ведаю, што яна была.

—Была вялікая краіна з чаргой па туалетную паперу... Я добра памятаю, як пахлі савецкія сталоўкі і савецкія крамы.

—Расія ўратуе свет! І сама так уратуецца!

—Мой бацька да дзевяноста гадоў дажыў. Казаў, што ў яго жыцці нічога добрага не было, толькі вайна. Гэта ўсё, што мы ўмеем.

—Бог — гэта бясконцае, якое ў нас… Мы створаныя паводле вобразу і падабенства…

## Пра ўсё

«Ува мне савецкага было дзевяноста працэнтаў… Я не разумела, што адбываецца. Помню, як выступаў у тэлебачанні Гайдар: вучыцеся гандляваць… рынак нас уратуе… Купіў на адной вуліцы бутэльку мінеральнай вады і прадаў яе на іншай — гэта бізнэс. Людзі слухалі з неўразуменнем. Я прыходзіла дадому. Зачыняла дзверы і плакала. У мамы інсульт, гэтак яе ўсё напалохала. Можа, яны хацелі нешта добрае зрабіць, але ім не хапіла спагады да ўласнага народу. Ніколі не забуду старых, якія просяць міласціну, яны шнурамі стаялі ўздоўж дарогі. Заношаныя шапачкі, палапленыя пінжачкі… Бягу на працу і з працы — баюся вочы падняць… Працавала я на парфумнай фабрыцы. Замест грошай выдавалі нам парфуму… касметыку…»

«У нас у класе вучылася бедная дзяўчынка, яе бацькі загінулі ў аўтамабільнай катастрофе. Яна засталася з бабуляй. Увесь год хадзіла ў адной і той самай сукенцы. Дык вось яе нікому не было шкада. Неяк хутка стала сорамна быць бедным…»

«Пра дзевяностыя не шкадую… Бурлівы светлы час. Я, якая раней не цікавілася палітыкай і не чытала газеты, — пайшла балатавацца ў дэпутаты. Хто былі прарабы перабудовы? Пісьменнікі, мастакі… Паэты… На Першым з’ездзе народных дэпутатаў СССР аўтографы можна было збіраць. Мой муж — эканаміст, ён вар’яцеў ад гэтага: “Запальваць сэрцы людзей — гэта паэты ўмеюць. Рэвалюцыю вы зробіце. А далей, далей — што? Як будзеце будаваць дэмакратыю? Хто? Цяпер

зразумела, што ў вас атрымаецца". Смяяўся з мяне. Мы таму з ім і разышліся... Але ён меў рацыю...»

«Страшна стала, таму народ і пайшоў у храмы. Калі я верыў у камунізм, мне не патрэбная была царква. А жонка мая ходзіць са мной дзеля таго, што ў царкве бацюшка кажа ёй: "Галубка"».

«Мой бацька быў сумленным камуністам. Я камуністаў не вінавачу, я вінавачу камунізм. Да гэтага часу не ведаю, як мне ставіцца да Гарбачова... Да гэтага Ельцына... Чэргі і пустыя прылаўкі забываюцца хутчэй, чым чырвоны сцяг над Рэйхстагам».

«Мы перамаглі. А каго? Навошта? У тэлебачанні на адным канале ідзе фільм, дзе "чырвоныя" б'юць "белых", а на другім — адважныя "белыя" б'юць "чырвоных". Шызафрэнія!»

«Увесь час гаворым пра пакуты... Гэта наш шлях пазнання. Заходнія людзі падаюцца нам наіўнымі, таму што яны не пакутуюць, як мы, у іх ёсць лекі ад кожнай стрэмкі. Затое мы сядзелі ў лагерах, у вайну зямлю трупамі завалілі, голымі рукамі грэблі ядзернае паліва ў Чарнобылі... І цяпер сядзім на абломках сацыялізму. Як пасля вайны. Мы такія цёртыя, мы такія бітыя. У нас свая мова... Мова пакутаў...

Спрабаваў загаварыць пра гэта са сваімі студэнтамі... Смяяліся мне ў твар: "Мы не хочам пакутаваць. Для нас жыццё — гэта нешта іншае". Нічога яшчэ не зразумелі пра наш нядаўні свет, а жывём у новым. Цэлая цывілізацыя — на сметніку...»

# ДЗЕСЯЦЬ ГІСТОРЫЙ У ЧЫРВОНЫМ ІНТЭР’ЕРЫ

## Пра красу дыктатуры і таямніцу матылька ў цэменце

*Алена Юр’еўна С. — трэці сакратар райкама партыі, 49 гадоў*

*Чакалі мяне ўдзвюх — сама Алена Юр’еўна, з якой мы дамаўляліся пра сустрэчу, і яе маскоўская сяброўка Ганна Ільінічна М., якая прыехала пагасцяваць. Яна адразу ўключылася ў размову: «Даўно хачу, каб нехта патлумачыў мне, што з намі адбываецца». Нічога ў іх расповедах не супадала, апрача знакавых іменаў: Гарбачоў, Ельцын... Але ў кожнай быў свой Гарбачоў, і свой Ельцын. І свае 90-я.*

*Алена Юр’еўна:*

—Хіба ўжо час распавядаць пра сацыялізм? Каму? Яшчэ ўсе — сведкі. Шчыра кажучы, я здзіўленая, што вы да мяне прыйшлі. Я — камуністка... наменклатура... Нам жа цяпер не даюць слова... затыкаюць рот. Ленін — бандыт, Сталін... Мы ўсе злачынцы, хоць на маіх руках няма ні кроплі крыві. Але на нас таўро, на ўсіх...

Магчыма, праз пяцьдзясят альбо сто гадоў пра тое наша жыццё, якое называлася сацыялізмам, будуць пісаць аб’ектыўна. Без слёз і праклёнаў. Пачнуць раскопваць, як старажытную Трою. Нядаўна ўвогуле добра сказаць пра сацыялізм было нельга. На Захадзе пасля крушэння СССР зразумелі, што марксісцкія ідэі не скончыліся, іх трэба развіваць. Не маліцца на іх. Маркс не быў там ідалам, як у нас. Святым! Спачатку мы яго абагаўлялі, а затым абвясцілі анафему. Усё перакрэслілі. Навука таксама прынесла чалавецтву незлічоныя беды. Давайце тады вынішчаць вучоных! Праклянём бацькоў атамнай бом-

бы, а яшчэ лепш — пачнём з тых, хто порах вынайшаў! З іх… Хіба я не маю рацыі? *(Я не паспяваю адказаць на яе пытанне.)* Правільна… правільна, што з Масквы выбраліся. У Расію, можна сказаць, прыехалі. Па Маскве калі ходзіш, здаецца, што і мы Еўропа: раскошныя машыны, рэстараны… Залатыя купалы ззяюць! А вы паслухайце, пра што ў нас людзі гавораць у правінцыі… Расія — гэта не Масква, Расія — гэта Самара, Тальяці, Чалябінск… жопінск які-небудзь… Што на маскоўскіх кухнях можна даведацца пра Расію? На тусоўках? Бла-бла-бла… Масква — сталіца нейкай іншай дзяржавы, а не той, што за кальцавой дарогай. Турыстычны рай. Маскве не верце…

Да нас прыязджаюць і адразу: ну, гэта савок. Людзі жывуць вельмі бедна нават па расійскіх мерках. Лаюць багатых, злуюцца на ўсіх. Ганяць дзяржаву. Лічаць, што іх падманулі, ніхто ім не казаў, што будзе капіталізм, яны думалі, што сацыялізм пачнуць выпраўляць. Той, які ўсе ведалі. Савецкі. Пакуль яны на мітынгах дзерлі горла: «Ельцын! Ельцын!» — іх абабралі. Без іх падзялілі заводы і фабрыкі. І нафту, і газ — тое, што, як кажуць, ад Бога. Але гэта толькі цяпер зразумелі. А ў дзевяноста першым усе ў рэвалюцыю пайшлі. На барыкады. Хацелі свабоды, а што атрымалі? Ельцынскую… бандыцкую рэвалюцыю… Сына маёй сяброўкі ледзь не забілі за сацыялістычныя ідэі. Слова «камуніст» было абразай. Свае хлопцы ў двары ледзь яго не забілі. Знаёмыя. Сядзелі ў альтанцы з гітарамі і размаўлялі: вось, маўляў, пойдзем сценкай на камуністаў, вешаць будзем іх на ліхтарах. Мішка Слуцар — тата яго ў нас у райкаме працаваў — ён хлопчык начытаны, працытаваў ім англійскага пісьменніка Чэстэртана: «Чалавек без утопіі нашмат страшнейшы за чалавека без носа…». І яго за гэта — чаравікамі… ботамі… «А, жыдзёныш! Хто рэвалюцыю ў сямнаццатым годзе рабіў?» Я помню гэты бляск у вачах людзей на пачатку перабудовы, ніколі яго не забуду. Камуністаў гатовыя былі лінчаваць, адпраўляць на этап… У кантэйнерах для смецця валяліся кнігі Маякоўскага, Горкага… Здавалі на

макулатуру творы Леніна. Я падбірала… так! Вось! Я ні ад чаго не адракаюся! Ні за што мне не сорамна! Не мяняла масць і не перафарбоўвалася з чырвонага колеру ў шэры. Ёсць такія людзі: «чырвоныя» прыйдуць — яны радасна сустракаюць «чырвоных», «белыя» прыйдуць — яны радасна сустракаюць «белых». Выкрунтасы робяць неверагодныя: учора — камуніст, сёння — ультрадэмакрат. На маіх вачах «сумленныя» камуністы ператвараліся ў вернікаў і ліберагаў. А я люблю і ніколі не разлюблю слова «таварыш». Харошае слова! Савок? Укусіце сябе за язык! Савецкі чалавек быў вельмі добры чалавек, ён мог паехаць за Урал, у пустыню — дзеля ідэі, а не за долары. Не за чужыя зялёныя паперкі. ДнепраГЭС, Сталінградская бітва, выхад у адкрыты космас — гэта ўсё ён. Вялікі Савок! Мне да гэтага часу прыемна пісаць — СССР. Гэта была мая краіна, а цяпер я жыву не ў сваёй краіне. У чужой краіне я жыву.

Савецкай я нарадзілася… Наша бабуля не верыла ў Бога, але верыла ў камунізм. А наш тата да самай смерці чакаў, што сацыялізм вернецца. Ужо абрынулі Берлінскую сцяну, развалііўся Савецкі Саюз, а ён усё адно чакаў. Назаўжды рассварыўся са сваім найлепшым сябрам, калі той назваў сцяг чырвонай анучай. Наш чырвоны сцяг! Кумачовы! Тата быў на фінскай вайне, за што яны ваявалі, ён так і не зразумеў, але трэба было ісці, і ён пайшоў. Пра тую вайну маўчалі, называлі яе не вайной, а фінскай кампаніяй. Але тата нам распавядаў… Ціха. Дома. Рэдка, але ўспамінаў. Калі вып'е… Пейзаж ягонай вайны — зімовы: лес і метровай глыбіні снег. Фіны ваявалі на лыжах, у белых маскхалатах, з'яўляліся паўсюль нечакана, як анёлы. «Як анёлы» — гэта татавы словы… Маглі за ноч выразаць заставу, цэлую роту. Мёртвыя… У татавых успамінах мёртвыя заўсёды ляжалі ў лужынах крыві, з соннага чалавека крыві выцякае вельмі шмат. Крыві было столькі, што яна праядала метровы снег. Пасля вайны тата не мог зарэзаць нават курыцу. Труса. Моцна журыўся ад выгляду кожнай забітай жывёлы і цёплага паху крыві. Ён баяўся вялікіх дрэваў

з густой каронай, на такіх дрэвах звычайна хаваліся фінскія снайперы, іх называлі «зязюлямі». *(Маўчыць.)* Хачу дадаць… Ад сябе… Пасля Перамогі наш гарадок патанаў у кветцені, гэта буйства нейкае было. Самая галоўная кветка — вяргіня, яе клубні трэба было зімою захоўваць, каб не змерзлі. Крый Божа! Іх захіналі, укладвалі, як быццам гэта маленькае дзіця. Кветкі раслі каля дамоў, за дамамі, каля студняў і ўздоўж платоў. Пасля страху асабліва хочацца жыць, радавацца. А потым кветкі зніклі, цяпер гэтага ўжо няма. А я памятаю… Успомніла цяпер… *(Маўчыць.)* Тата… праваяваў наш тата ўсяго паўгода і трапіў у палон. Як ён трапіў у палон? Яны наступалі па замёрзлым возеры, а артылерыя біла па лёдзе. Мала хто даплываў да берага, а тыя, хто даплываў, яны ўжо былі без сілаў і без зброі. Паўголыя. Фіны ім тады працягвалі рукі. Ратавалі. Хтосьці хапаўся за гэтую руку, а хтосьці… Было шмат такіх, хто не прымаў дапамогі ад ворага. Іх так вучылі. А тата ўхапіўся за чыюсьці руку, яго выцягнулі. Я добра памятаю татава здзіўленне: «Яны далі мне шнапсу, каб я сагрэўся. Адзелі ў сухое. Смяяліся і пляскалі па плячы: “Жывы, Іван!”». Тата раней ніколі не бачыў ворагаў зблізку. Не разумеў, з якой прычыны яны радуюцца…

У саракавым годзе скончылася фінская кампанія… Савецкіх ваеннапалонных абмянялі на фінаў, якія знаходзіліся ў нас у палоне. Насустрач адны адным яны ішлі калонамі. Фінаў, калі яны параўняліся са сваімі, сталі абдымаць, ціснуць ім рукі… Нашых сустрэлі не так, іх сустрэлі як ворагаў. «Братцы! Родненькія!» — кінуліся яны да сваіх. — «Стаяць! Крок у бок — страляем!» Калону ачапілі салдаты з аўчаркамі і павялі ў адмыслова падрыхтаваныя баракі. Вакол баракаў — калючы дрот. Пачаліся допыты… «Як ты трапіў у палон?» — спытаў следчы ў таты. «Мяне фіны выцягнулі з возера». — «Ты — здраднік! Ты ратаваў сваю шкуру, а не Радзіму». Тата таксама лічыў, што ён вінаваты. Іх так вучылі… Не было ніякага суда. Вывелі ўсіх на пляц і зачыталі перад строем загад: шэсць гадоў лагераў за

здраду Радзіме. Адправілі ў Варкуту. Там яны будавалі чыгунку ў вечнай мерзлаце. Бог мой! Сорак першы год... Немцы пад Масквой ужо... А ім не казалі, што вайна пачалася, — яны ж ворагі, будуць радавацца. Ужо ўся Беларусь пад немцамі. Узяты Смаленск. Калі яны даведаліся пра гэта, адразу ўсе захацелі на фронт, пісалі лісты начальніку лагера... Сталіну... Ім адказвалі: вы, маўляў, свалата, працуйце на перамогу ў тыле, на фронце нам здраднікі не патрэбныя. І яны... тата... я ад таты гэта чула... Яны ўсе плакалі... *(Маўчыць.)* Вось з кім бы вам сустрэцца... Але таты ўжо няма. Лагер яму жыццё падкараціў. І перабудова. Ён вельмі пакутаваў. Не разумеў, што здарылася. З краінай, з партыяй. Наш тата... У лагеры за шэсць гадоў ён забыўся, што такое яблык і качан капусты... прасціна і падушка... Тры разы на дзень ім давалі баланду, бохан хлеба — на дваццаць пяць чалавек. А спалі — пад галаву палена, замест матраца — дошкі на падлозе. Наш тата... Дзіўны ён быў, не такі тата, як у іншых... Не мог ударыць каня ці карову, паддаць нагой сабаку. Мне заўсёды было таты шкада. А іншыя мужчыны з яго смяяліся: «Ну, які ты мужык? Баба!» Мама плакала, што ён... ну што ён не такі, як усе. Возьме ў рукі качан капусты й разглядвае... Памідор... Першым часам наогул маўчаў, нічым з намі не дзяліўся. Гадоў праз дзесяць загаварыў. Не раней... так... Пэўны час у лагеры ён вазіў мёртвых. За дзень збіралася дзесяць-пятнаццаць трупаў. Жывыя вярталіся ў баракі пешшу, а мёртвыя — на санях. З мерцвякоў ім загадвалі здымаць адзенне, і мерцвякі ляжалі на санях голыя, як тушканчыкі. Гэта я кажу татавымі словамі... Блытана ў мяне атрымліваецца... Ад пачуццяў... хвалююся, так... Першыя два гады ў лагеры ніхто з іх не верыў, што выжыве; пра дом успаміналі тыя, у каго быў тэрмін пяць-шэсць гадоў, а ў каго тэрмін дзесяць-пятнаццаць гадоў, пра дом маўчалі. Ніколі яны не ўспаміналі: ні жонак, ні дзяцей. Ні бацькоў. «Калі пачнеш успамінаць, не выжывеш», — татавы словы. А мы яго чакалі... «Вось тата вернецца... і мяне не пазнае...», «Наш та-

тачка…» Хацелася лішні раз вымавіць гэтае слова «тата». І ён вярнуўся. Бабуля ўбачыла каля весніц чалавека ў салдацкім шынялі: «Салдацік, каго вы шукаеце?» — «Мама, ты мяне не пазнала?» Бабуля дзе стаяла, там і ўпала. Так тата вярнуўся… Увесь быў абмарожаны, ногі й рукі ён ніколі не мог сагрэць. Мама? Мама казала, што тата вярнуўся пасля лагера добрым, а яна баялася… яе палохалі… што адтуль вяртаюцца злымі. А наш тата хацеў радавацца жыццю. На ўсе выпадкі ў яго была прымаўка: «Трымайся — горшае яшчэ наперадзе».

Забыла… Забыла, дзе гэта адбывалася… у якім месцы? У перасылачным лагеры ці што? На карачках па вялікім двары поўзалі й елі траву. Дыстрофікі, пелагрыкі. Пры тату нельга было ні на што паскардзіцца, ён ведаў: «Каб выжыць, чалавеку патрэбныя тры рэчы — хлеб, цыбуля і мыла». Усяго тры рэчы… усяго… Гэтых людзей ужо няма, нашых бацькоў… Калі хто застаўся, то іх трэба ў музей, пад шкло, рукамі не чапаць. Колькі яны ўсяго ператрывалі! Калі тату рэабілітавалі, яму выдалі дзве салдацкія зарплаты за ўсе пакуты. Але ў нас у доме вельмі доўга вісеў вялікі партрэт Сталіна. Вельмі доўга… я гэта добра памятаю… Жыў тата без крыўды, ён лічыў, што гэта час быў такі. Жорсткі час. Будавалі моцную краіну. І пабудавалі, і перамаглі Гітлера! Татавы словы…

Я расла сур'ёзнай дзяўчынкай, сапраўднай піянеркай. Цяпер ва ўсіх такое меркаванне, што раней у піянерскую арганізацыю заганялі. Нікуды не заганялі. Усе дзеці марылі быць піянерамі. Хадзіць разам. З барабанам, з горнам. Спяваць піянерскія песні: «Родны край, навек любімы, / Ты не знойдзеш больш такі», «Ва ўлады арлінай арлянят мільёны, / мы гонар краіны сваёй…». На нашай сям'і ўсё ж была гэтая пляма, што тата сядзеў, мама баялася, што мяне не прымуць у піянеры ці не адразу прымуць. А мне хацелася быць з усімі. Абавязкова, так… «Ты за каго: за месяц ці за сонца?» — ладзілі мне допыт хлопчыкі ў класе. Тут трэба быць напагатове! «За месяц». — «Правільна! За краіну савецкую». А скажаш

«За сонца» — «За праклятага японца». Засмяюць, зацвеляць. Кляліся мы адно аднаму так: «чэснае піянерскае» або «чэснае ленінскае». Найбольшая клятва — «чэснае сталінскае слова». Бацькі ведалі: калі я сказала «чэснае сталінскае», я не падманваю. Бог мой! Успамінаю не Сталіна, а ўспамінаю наша жыццё… Я запісалася ў гурток і вучылася граць на акардэоне. Маму за ўдарную працу ўзнагародзілі медалём. Не адны толькі паскудствы былі… і казарменнае жыццё… У лагеры тата часта бачыў адукаваных людзей. Больш нідзе ён такіх цікавых людзей не сустракаў. Некаторыя з іх пісалі вершы, і яны часцей выжывалі. Як і святары, тыя маліліся… І тата хацеў, каб усе яго дзеці атрымалі вышэйшую адукацыю. Мара яго. Мы ўсе — нас чацвёра дзяцей — закончылі інстытуты. Але ён навучыў нас і хадзіць за плугам, і касіць траву. Я ўмею падаваць на воз сена, складаць стог. «Усё можа спатрэбіцца», — меркаваў тата. Ён меў рацыю.

Мне цяпер хочацца ўспамінаць… Я хачу зразумець тое, што пражылі. Не толькі сваё жыццё, а наша… савецкае… Я не ў захапленні ад уласнага народа. І ад камуністаў таксама, і ад нашых камуністычных лідараў. Сёння асабліва. Усе здрабнелі, абуржуазіліся, усе хочуць добра, салодка хочуць жыць. Спажываць і спажываць. Ухапіць! Камуністы таксама ўжо не тыя. У нас ёсць камуністы з гадавым даходам у сотні тысяч долараў. Мільянеры! Кватэра ў Лондане… палац на Кіпры… Што гэта за камуністы? У чым жа іх вера? Спытаеш — як на дурніцу паглядзяць. «Не расказвайце нам савецкія казкі. Вось гэтага не трэба». Разбурылі такую краіну! Распрадалі за нікчэмную цану. Нашу Радзіму… Каб нехта мог ганіць Маркса і ездзіць па яўропах. Час такі самы страшны, як і пры Сталіне… Я адказваю за свае словы! Напішаце гэта? Не веру… *(І я бачу — не верыць.)* Ужо няма ні райкамаў, ні абкамаў. Развіталіся з савецкай уладай. А што атрымалі? Рынг, джунглі… Уладу злодзеяў… Хапалі — хто хутчэй, пірог вялікі. Бог мой! Чубайс… «прараб перабудовы»… цяпер ён выхваляецца, лекцыі па ўсім

свеце чытае. Маўляў, у іншых краінах капіталізм складваўся стагоддзямі, а ў нас за тры гады. Дзейнічалі хірургічным метадам… А калі нехта накраў, то і дзякуй богу, можа, іх унукі будуць прыстойнымі людзьмі. Бррр! І гэта дэмакраты… *(Маўчыць.)* Амерыканскі гарнітурчык прымяралі, слухалі дзядзьку Сэма. А амерыканскі гарнітурчык не налазіць. Крыва сядзіць. Вось! Не па свабоду пабеглі, а па джынсы… у супермаркеты… купіліся на яркія абгорткі… Цяпер і ў нас у крамах поўна ўсяго. Сыць. Але горы каўбасы ніяк не звязаныя са шчасцем. Са славай. Быў вялікі народ! Зрабілі з яго гандляроў і марадзёраў… перакупшчыкаў і менеджараў…

Прыйшоў Гарбачоў… Загаварылі пра вяртанне ленінскіх прынцыпаў. Усеагульная радасць. Узбуджэнне. Народ даўно чакаў перамен. У свой час паверылі Андропаву… Ну кагэбіст, так… Як вам растлумачыць? КПСС ужо не баяліся. Каля піўнога шапіка мужыкі маглі партыю абмацюкаць, а кагэбэ — ніколі… Вы што! У памяці сядзела… Ведалі, што жалезнай рукой, жыгалам, яжовай рукавіцай… гэтыя дзецюкі навядуць парадак. Не хочацца паўтараць банальныя рэчы, але Чынгісхан гены нам сапсаваў… і прыгон… Прывыклі, што біць усіх трэба, без біцця нічога не атрымаецца. Андропаў з гэтага і пачаў — з закручвання гаек. Усе рассупоніліся: у працоўны час хадзілі ў кіно, у лазню, бегалі па крамах. Гарбату распівалі. Міліцыя стала рэйды праводзіць, аблавы. Правяралі дакументы і хапалі прагульшчыкаў проста на вуліцах, у кавярнях, у крамах і паведамлялі на працу. Штрафавалі, звальнялі. Але Андропаў цяжка хварэў. Хутка памёр. Мы іх хавалі, хавалі. Брэжнеў, Андропаў, Чарненка… Самы папулярны анекдот да Гарбачова: «Перадаём паведамленне ТАСС. Вы будзеце моцна смяяцца, але памёр чарговы Генеральны сакратар ЦК КПСС…» Ха-ха-ха… Народ на сваіх кухнях смяяўся, а мы на сваіх. У закутку свабоды. Кухонная балбатня… *(Смяецца.)* Выдатна памятаю, як падчас размоваў уключалі гучна тэлевізар ці радыё. Цэлая навука. Вучылі адно аднаго, як схітрыцца, каб гэбістам, што

праслухоўвалі тэлефонныя размовы, нічога не было чуваць: пракручваеш дыск — старыя тэлефоны былі з дзірачкамі для лічбаў — устаўляеш у адну з іх аловак і фіксуеш… можна пальцам трымаць, але палец стамляецца… Напэўна, вас таксама вучылі? Памятаеце? Трэба нешта «сакрэтнае» сказаць, адыходзілі на два-тры метры ад тэлефона, ад слухаўкі. Стукацтва, праслухоўванне — гэта было паўсюль, ва ўсім грамадстве зверху і да нізу, і мы ў райкаме прыкідвалі: хто ў нас стукач? Як потым высветлілася, падазравала я невінаватага чалавека, а даносчык быў не адзін, іх было некалькі. Вось на гэтых я ніколі б не падумала… Адна з іх — наша прыбіральшчыца. Прыветная, добрая жанчына. Няшчасная. Муж — п'яніца. Бог мой! Сам Гарбачоў… Генеральны сакратар ЦК КПСС… Чытала ў адным яго інтэрв'ю, як падчас канфідэнцыйных гутарак у сябе ў кабінеце ён рабіў тое самае — уключаў тэлевізар на ўвесь гук, ці радыё. Наогул, азбука. Запрашаў для сур'ёзных размоваў на сваю дачу за горад. І яны там… Там яны выходзілі ў лес, хадзілі і размаўлялі. Птушкі не перакажуць… Усе чагосьці баяліся, баяліся і тыя, каго баяліся. Я баялася.

Апошнія савецкія гады… Што я памятаю? Пачуццё сораму не пакідала. За абвешанага ордэнамі і «зоркамі» Брэжнева і за тое, што Крэмль у народзе празвалі камфартабельным домам састарэлых. За пустыя паліцы ў крамах. Планы выконваем і перавыконваем, а ў крамах нічога няма. Дзе наша малако? Мяса? Я і цяпер не разумею, куды гэта ўсё знікала. Малако скончалася праз гадзіну пасля таго, як адкрываліся крамы. З абеду прадаўцы стаялі каля чыста вымытых латкоў. На паліцах — трохлітровыя слоікі бярозавага соку і пачкі солі, чамусьці заўсёды мокрыя. Кілька ў бляшанках. Усё! Выкінуць у продаж каўбасу — яе расхапаюць умомант. Сасіскі і пельмені — далікатэс. У райкаме ўвесь час нешта дзялілі: гэтаму заводу — дзесяць халадзільнікаў і пяць футраў, а гэтаму калгасу — два югаслаўскія мэблевыя гарнітуры і дзесяць польскіх жаночых сумачак. Рандэлі і жаночую бялізну дзялілі… калгот-

кі... Такое грамадства магло трымацца толькі на страху. На ЧК — чым болей страляць і чым болей саджаць. Але сацыялізм з Салаўкамі і Беламорканалам скончыўся. Патрэбны быў нейкі іншы сацыялізм.

Перабудова... Быў момант, калі людзі зноў пацягнуліся да нас. Уступалі ў партыю. Вялікія ва ўсіх чаканні. Усе тады былі наіўныя — левыя і правыя, камуністы і антысаветчыкі. Усе — рамантыкі. Сёння за гэта сорамна, за тую сваю наіўнасць. Моляцца на Салжаніцына. Вялікі старац з Вермонта! Не адзін Салжаніцын, многія ўжо разумелі, што так, як мы жывём, жыць нельга. Залгаліся. І камуністы — верыце вы мне ці не? — таксама гэта разумелі. Сярод камуністаў было нямала разумных і сумленных людзей. Шчырых. Я асабіста ведала такіх людзей, асабліва часта яны сустракаліся ў правінцыі. Як мой бацька... Бацьку не прынялі ў партыю, ён пацярпеў ад партыі, але ён ёй верыў. Верыў партыі і краіне. Кожная раніца ў яго пачыналася з таго, што ён разгортваў газету «Правда» і прачытваў яе да апошняй літары. Камуністаў без партбілета было больш, чым з партбілетамі, яны ў душы былі камуністы. *(Маўчыць.)* На ўсіх дэманстрацыях неслі лозунг «Народ і партыя — адзіныя!». Гэтыя словы — не выдумка, гэта была праўда. Я нікога не агітую, я расказваю, як яно было. Ужо ўсе забыліся... Многія ўступалі ў партыю на покліч сумлення, а не толькі дзеля кар'еры або з прагматычных меркаванняў: калі я беспартыйны і ўкраду — мяне пасадзяць, калі я ўступлю ў партыю і ўкраду — мяне выганяць з партыі, але не пасадзяць. Ува мне ўсё закіпае, калі пра марксізм кажуць пагардліва, з насмешкай. Давай яго — у сметніцу. На звалку! Гэта вялікае вучэнне, яно пераўжыве ўсе звягі. І нашу савецкую няўдачу — таксама. Таму што... ёсць шмат прычынаў... Сацыялізм — гэта не толькі лагеры, стукацтва і жалезная заслона, гэта і справядлівы, ясны свет: з усімі дзяліцца, слабых шкадаваць, спачуваць ім, а не падграбаць усё пад сябе. Мне кажуць: нельга было набыць машыну, але ніхто не меў машыны. Ніхто не насіў гарнітуры

ад Версачэ і не купляў дом у Маямі. Бог мой! Правадыры СССР жылі на ўзроўні бізнэсменаў сярэдняй рукі, да алігархаў ім не дацягнуць. Слабо! Не будавалі яны сабе яхты з ваннамі шампанскага. Вы толькі падумайце! У тэлевізары перадаюць рэкламу: купляйце медныя ванны — коштам з двухпакаёвую кватэру. Для каго яны, скажыце? Пазалочаныя дзвярныя ручкі… Гэта — свабода? Маленькі, шараговы чалавек — ніхто, ён — нуль. На дне жыцця. А тады ён мог напісаць у газету, пайсці і паскардзіцца ў райкам: на начальніка ці на дрэннае абслугоўванне… на нявернага мужа… Былі глупствы, не адмаўляю, але хто сёння гэтага простага чалавека наогул слухае? Каму ён патрэбны? Памятаеце савецкія назвы — вуліца Металургаў, Энтузіястаў… Заводская, Пралетарская… Маленькі чалавек… ён быў галоўны… Дэкларацыя, шырма, як вы кажаце, а цяпер і хавацца нікому не трэба. Няма грошай — пайшоў прэч! Пад лаўку! Вуліцы пераймяноўваюць: Мяшчанская, Купецкая, Дваранская… Нават каўбасу я бачыла «Княскую», а віно «Генеральскае». Культ грошай і поспеху. Выжывае дужэйшы, з жалезнымі біцэпсамі. Але не ўсе здольныя ісці па галовах, вырываць кавалак у іншага. У адных прырода такая, што яны не могуць, а іншым брыдка.

З ёй… *(Ківае ў бок сяброўкі.)* Спрачаемся, вядома… Яна мне даказвае, што для сапраўднага сацыялізму патрабуюцца ідэальныя людзі, а іх няма. Ідэя — гэта лухта… казка… Наш чалавек ужо ні за што не памяняе сваю патрыманую іншамарку і пашпарт з шэнгенскай візай на савецкі сацыялізм. А я веру ў іншае: чалавецтва ідзе ў бок сацыялізму. Да справядлівасці. Іншага шляху няма. Паглядзіце на Германію… Францыю… Ёсць шведскі варыянт. А якія каштоўнасці ў рускага капіталізму? Пагарда да «людзішак»… Да тых, у каго няма мільёна, няма «мерседэса». Замест чырвонага сцяга — Хрыстос уваскрос! І культ спажывання… Чалавек засынае з думкай не пра штосьці высокае, а пра тое, што ён сёння чагосьці не купіў. Вы думаеце, што краіна развалілася таму, што даведаліся праў-

ду пра ГУЛАГ? Так думаюць тыя, хто кнігі піша. А чалавек… нармальны чалавек гісторыяй не жыве, ён жыве працай: закахаўся, ажаніўся, дзеці нарадзіліся. Дом збудаваў. Краіна развалілася праз дэфіцыт жаночых ботаў і туалетнай паперы, праз тое, што апельсінаў не было. Гэтых джынсаў праклятых! Цяпер нашы крамы падобныя да музеяў. Да тэатраў. І мяне хочуць пераканаць, што анучы ад Версачэ і Армані — гэта ўсё, што неабходна чалавеку. Яму гэтага дастаткова. Жыццё — гэта фінансавыя піраміды і вэксалі. Свабода — гэта грошы, а грошы — свабода. А наша жыццё капейкі не вартае. Ну, гэта… ну, гэта… разумееце… Я нават словаў не знаходжу, як назваць… Мне шкада маіх маленькіх унучак. Шкада. Ім гэта ў тэлевізары кожны дзень убіваюць у галаву. Я не згодная. Я была і застаюся камуністкай.

*Перапыняемся надоўга. Нязменная гарбата, на гэты раз з вішнёвым сочывам, звараным паводле ўласнага рэцэпту гаспадыні.*

Восемдзесят дзявяты год… Я да гэтага часу ўжо была трэцім сакратаром райкама партыі. На партработу мяне ўзялі са школы, я выкладала рускую мову і літаратуру. Маіх улюбёных пісьменнікаў — Талстога, Чэхава… Калі прапанавалі — спалохалася. Такая адказнасць! Але ні хвіліны не вагалася, быў шчыры парыў — служыць партыі. Тым летам я прыехала дадому ў адпачынак. Звычайна ўпрыгожанняў не нашу, а тут набыла сабе нейкія пацеркі танненькія, мама мяне ўбачыла: «Ты — як царыца». Была ад мяне ў захапленні… ну не ад пацеркаў жа! Тата сказаў: «Ніхто з нас цябе ні пра што прасіць не прыйдзе. Ты павінна быць чыстай перад людзьмі». Бацькі ганарыліся! Былі шчаслівыя! А я… я… што перажывала я? Ці верыла я партыі? Шчыра адкажу — верыла. І цяпер веру. З партыйным білетам не расстануся, што б ні здарылася. Ці верыла я ў камунізм? Шчыра скажу, не буду хлусіць: я верыла ў магчымасць справядлівага ўладкавання жыцця. І цяпер… я ўжо казала… веру. Мне надакучыла слухаць распаведы пра тое,

як нам дрэнна жылося за сацыялізмам. Ганаруся савецкім часам! Шыкоўнага жыцця не было, але нармальнае жыццё было. Было каханне і сяброўства… сукенкі і туфлі… Прагна слухалі пісьменнікаў і артыстаў, а цяпер перасталі. Месца паэтаў на стадыёнах занялі ведзьмакі і экстрасэнсы. Ведзьмакам вераць, як у Афрыцы. Наша… савецкае жыццё… гэта была спроба альтэрнатыўнай цывілізацыі, калі хочаце. Калі з пафасам… Улада народа! Ну не магу супакоіцца! Дзе вы сёння ўбачыце даярак, токараў ці машыністаў метро? Няма іх — ні на старонках газет, ні на экранах тэлевізараў, ні ў Крамлі, калі ўручаюць ордэны і медалі. Нідзе іх няма. Паўсюль новыя героі: банкіры і бізнэсмены, мадэлі і інтэрдзяўчаткі… менеджары… Маладыя яшчэ могуць прыстасавацца, а старыя паміраюць моўчкі, пры зачыненых дзвярах. У галечы паміраюць, у забыцці. У мяне пенсія — пяцьдзясят долараў… *(Смяецца.)* І ў Гарбачова, я чытала, пяцьдзясят долараў… Пра нас кажуць: «Камуністы жылі ў палацах, елі чорную ікру лыжкамі. Сабе яны пабудавалі камунізм». Бог мой! Я вас вадзіла па сваіх «палацах» — звычайная двухпакаёвая кватэра, агульная плошча — пяцьдзясят сем метраў. Нічога не схавала: савецкі крышталь, савецкае золата…

—А спецпаліклінікі і спецпайкі, «свае» чэргі на атрыманне кватэраў і казённыя лецішчы… партыйныя санаторыі?

—Шчыра? Было гэта… ну было… але больш там… *(Падымае руку ўгору.)* А я заўсёды ўнізе, найніжэйшае звяно ўлады. Унізе, каля людзей. Заўсёды на вачах. Калі недзе і было… не спрачаюся… Не адмаўляю! Чытала, як і вы, у перабудовачных газетах… што дзеці сакратароў ЦК лёталі на паляванне ў Афрыку. Брыльянты скуплялі… Усё адно не параўнаць гэта з тым, як жывуць цяпер «новыя рускія». З іх замкамі ды яхтамі. Паглядзіце, што панабудоўвалі яны вакол Масквы. Палацы! Двухметровыя каменныя платы, дрот з электрычным токам, відэаназіранне. Узброеныя ахоўнікі. Як у зоне або на сакрэтным вайсковым аб’екце. Што, там Біл Гейтс жыве, камп’ю-

тарны геній? Ці Гары Каспараў, чэмпіён свету ў шахматах? Там жывуць пераможцы. Грамадзянскай вайны быццам бы не было, а пераможцы ёсць. Там яны — за каменным плотам. Ад каго яны хаваюцца? Ад народа? Народ думаў, што прагоніць камуністаў, і наступяць цудоўныя часы. Райскае жыццё. Замест вольных людзей з'явіліся гэтыя... з мільёнамі і мільярдамі... Гангстэры! Страляюць сярод белага дня... Нават у нас аднаму бізнэсмену балкон разнеслі. Нікога не баяцца. Лётаюць у асабістых самалётах з пазалочанымі ўнітазамі, яшчэ і выхваляюцца. Сама бачыла ў тэлевізары... адзін паказваў свой гадзіннік коштам з бамбардзіроўшчык. А другі — мабільнік з дыяментамі. І ніхто! ніхто не крыкне на ўсю Расію, што гэта сорамна. Мярзотна. Калісьці былі Успенскі і Караленка. Шолахаў напісаў Сталіну ліст у абарону сялян. Цяпер я хачу... Вы ў мяне пытаецеся, а я хачу ў вас запытацца: дзе наша эліта? Чаму я чытаю штодзень у газетах меркаванне з любой нагоды Беразоўскага і Патаніна, а не Акуджавы... Іскандэра... Як так здарылася, што вы саступілі свае месца? Сваю кафедру... І першымі пабеглі да аб'едкаў са стала алігархаў. У прыслужніцтва. Руская інтэлігенцыя раней не бегала і не прыслугоўвала. А цяпер нікога не засталося — няма нікога, хто скажа пра дух, апрача папа. А дзе перабудоўшчыкі?

У камуністаў майго пакалення мала было агульнага з Паўкам Карчагіным. З першымі бальшавікамі з партфелямі і рэвальверамі. Ад іх засталася толькі ваенная лексіка: «салдаты партыі», «працоўны фронт», «бітва за ўраджай». Мы ўжо не адчувалі сябе салдатамі партыі, мы былі службоўцамі партыі. Клеркі. Існаваў такі абрад — светлая будучыня: у актавай зале вісеў партрэт Леніна, у кутку стаяў чырвоны сцяг. Абрад... рытуал... Салдаты былі ўжо непатрэбныя, патрабаваліся выканаўцы: «давай-давай», а не — дык «партбілет на стол». Загадалі — зрабіў. Здаў справу. Партыя не вайсковы штаб, а апарат. Машына. Бюракратычная машына. Гуманітарыяў на службу бралі рэдка, партыя ім не давала веры з часоў Леніна, які пісаў

пра інтэлігенцыю: «не мазгі, а гаўно нацыі». Такіх, як я, было мала. Філолагаў. Кадры кавалі з інжынераў, заатэхнікаў, з тых, чыя спецыяльнасць — машыны, мяса і збожжа, а не чалавек. Кузні партыйных кадраў — сельскагаспадарчыя інстытуты. Патрэбныя былі дзеці рабочых і сялян. З народу. Даходзіла да смешнага: ветэрынара, напрыклад, маглі ўзяць на партыйную працу, а лекара-тэрапеўта — не. Не сустракала там ні лірыкаў, ні фізікаў. Што яшчэ? Субардынацыя, як у войску... Пад'ём наверх павольны, з прыступкі на прыступку: лектар райкама партыі, затым — загадчык парткабінета... інструктар... Трэці сакратар... другі сакратар... Я ўсе прыступкі за дзесяць гадоў прайшла. Гэта цяпер малодшыя навуковыя супрацоўнікі і загадчыкі лабараторый кіруюць краінай, старшыня калгаса або электрык становіцца прэзідэнтам. Замест калгаса — адразу краіна! Такое здараецца толькі ў рэвалюцыю... *(Пытанне — ці то да мяне, ці то да сябе.)* Не ведаю, як назваць тое, што адбылося ў дзевяноста першым...

Рэвалюцыя ці контррэвалюцыя? Ніхто не спрабуе нават растлумачыць, у якой краіне мы жывём. Якая ў нас ідэя, акрамя каўбасы? Што будуем... Ідзём наперад — да перамогі капіталізму. Так? Сто гадоў ганілі капіталізм: пачвара... монстр... А цяпер ганарымся, што ў нас будзе як ва ўсіх. Калі станем як усе, каму мы будзем цікавыя? Народ-баганосец... надзея ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва... *(Іранічна.)* Пра капіталізм ва ўсіх такое ж уяўленне, як нядаўна пра камунізм. Мары! Судзяць Маркса... вінавацяць ідэю... Ідэя-забойца! А я вінавачу выканаўцаў. У нас быў сталінізм, а не камунізм. А цяпер ні сацыялізму, ні капіталізму. Ні ўсходняй мадэлі, ні заходняй. Ні імперыі, ні рэспублікі. Боўтаемся, як... Памаўчу... Сталін! Сталін! Хаваюць яго... хаваюць... А закапаць ніяк не выходзіць. Не ведаю, як у Маскве, а ў нас яго партрэты ставяць пад ветравое шкло ў аўтамабілях. У аўтобусах. Дальнабойшчыкі асабліва яго любяць. У мундзіры генералісімуса... Народ! Народ! А што народ? Народ сам пра сябе сказаў: з яго

і дубіна, і абраз. Як з дрэва… Што зробіш, тое і будзе… Гайдаецца наша жыццё паміж баракам і бардаком. Цяпер маятнік пасярэдзіне… Паўкраіны чакае новага Сталіна. Вось прыйдзе ён і будзе парадак… *(Зноў маўчыць.)* У нас… вядома… у райкаме таксама было шмат размоваў пра Сталіна. Партыйная міфалогія. Яе перадавалі з пакалення ў пакаленне. Усе любілі размовы пра тое, як жылі пры Гаспадары… Сталінскія парадкі былі такія: напрыклад, загадчыкам сектараў ЦК разносілі гарбату з бутэрбродамі, а лектарам — проста гарбату. Увялі пасаду намесніка загадчыка сектара. Як быць? Ім вырашылі падаваць гарбату без бутэрбродаў, але на белай сурвэтцы. Ужо яны адзначаныя… ускараскаліся на Алімп да багоў, да герояў. Цяпер трэба праціснуцца да месца каля карыта… Так было і за Цэзарам, і за Пятром Першым. І так будзе заўсёды. Палюбуйцеся на сваіх дэмакратаў… Узялі ўладу і адразу бегма — куды? Да кармушкі. Да рогу дабрабыту. Кармушка знішчожыла не адну рэвалюцыю. На нашых вачах… Ельцын змагаўся з прывілеямі і называў сябе дэмакратам, а цяпер любіць, калі яго велічаюць царом Барысам. Стаў хросным бацькам…

Перачытала «Акаянныя дні» Івана Буніна. *(Дастае з паліцы кнігу. Знаходзіць закладку і чытае.)* «Памятаю старога рабочага каля брамы дома, дзе раней былі “Одесские новости”», у першы дзень усталявання бальшавікоў. Раптам выскачыла з-пад дзвярэй плойма хлопчыкаў са стосамі толькі што аддрукаваных «Известий» і з крыкамі: «На адэскіх буржуяў накладзеная кантрыбуцыя 500 мільёнаў!» — Рабочы захрыпеў, захлынуўся ад раз’юшанасці і зларадства: “Мала! Мала!”». Вам гэта нічога не нагадвае? Мне… так… Нагадвае… Гарбачоўскія гады… першыя бунты… Калі народ стаў вывальваць на плошчы і патрабаваць — то хлеба, то свабоды… то гарэлкі і курыва… Страх! Інсульты і інфаркты ў многіх партработнікаў. «У варожым атачэнні», як партыя вучыла, жылі, у «аблозе». Да сусветнай вайны рыхтаваліся… Больш за ўсё баяліся ядзернай вайны, а развалу не чакалі. Не чакалі… ніяк… Прывыклі да

майскіх і кастрычніцкіх калонаў, да плакатаў: «Справа Леніна пераЖыве вякі», «Партыя — наш рулявы». А тут не калоны, а стыхія. Не савецкі народ, а нейкі іншы, не знаёмы нам. І плакаты іншыя: «Камуністаў пад суд!», «Раздушым камуністычную гадзіну!». Адразу ўспомніўся Новачаркаск... Інфармацыя была закрытая, але мы ведалі... як за Хрушчовам галодныя рабочыя выйшлі на вуліцы... іх расстралялі... Тых, хто застаўся жывы, распіхалі па лагерах, дагэтуль іх родныя не ведаюць, дзе яны... А тут... тут ужо перабудова... Страляць нельга, саджаць таксама. Трэба размаўляць. А хто з нас мог выйсці да натоўпу і сказаць слова? Пачаць дыялог... агітаваць... Мы былі апаратчыкі, а не прамоўцы. Я, напрыклад, чытала лекцыі і капіталістаў кляйміла, неграў у Амерыцы бараніла. У маім кабінеце стаяў поўны збор твораў Леніна... пяцьдзясят пяць тамоў... Але хто яго па-сапраўднаму чытаў? Прагортвалі ў інстытутах перад экзаменамі: «Рэлігія — опіум народа» і «ўсякі боЖанька ёсць трупалоЖства».

Панічны быў страх... Лектары, інструктары, сакратары райкамаў і абкамаў — усе мы баяліся ехаць да рабочых на завод, да студэнтаў у інтэрнат. Палохаліся тэлефонных званкоў. А раптам спытаюць пра Сахарава ці пра Букоўскага... што адказваць? Ці ворагі яны савецкай улады ці ўжо не ворагі? Як ацэньваць «Дзеці Арбата» Рыбакова і п’есы Шатрова? Ніякай каманды зверху... Раней табе сказалі — ты выканаў даручэнне, правёў лінію партыі ў жыццё. А тут: страйкуюць настаўнікі, патрабуюць падвышэння заробку, малады рэжысёр у нейкім заводскім клубе рэпетуе забароненую п’есу... Бог мой! На кардоннай фабрыцы рабочыя на тачцы вывезлі за вароты свайго дырэктара. Гарлапанілі. Білі шкло. Ноччу зачапілі жалезным тросам і звалілі помнік Леніну. Паказвалі яму дулю. Партыя разгубілася... Я памятаю разгубленую партыю... Сядзелі ў сваіх кабінетах за шчыльнымі шторамі. Каля ўваходу ў будынак райкама дзень і ноч дзяжурыў узмоцнены нарад міліцыі. Баяліся народа, а народ яшчэ па інерцыі баяўся

нас. Потым баяцца перасталі… Збіраліся на плошчы тысячы людзей… Плакат запомніла: «Даеш 1917 год! Рэвалюцыю!». Мяне ашаламіла. Пэтэвэшнікі нейкія з ім стаялі… маладыя хлопцы… Птушаняты! Адзін раз прыйшлі ў райкам парламентары: «Пакажыце сваю спецкраму! У вас там усяго поўна, а нашы дзеці ад голаду губляюць прытомнасць на ўроках». Ніякіх норкавых футраў і чорнай ікры ў нашым буфеце яны не знайшлі, але ўсё адно не паверылі: «Падманваеце просты народ». Усё зрушыла з месца. Загайдалася. Гарбачоў быў слабы. Лавіраваў. Быццам ён за сацыялізм… і капіталізму хочацца… Больш думаў пра тое, як спадабацца ў Еўропе. У Амерыцы. Там яму пляскалі: «Горбі! Горбі! Вось дык Горбі!» Забалбатаў перабудову…» *(Маўчыць.)*

Сацыялізм паміраў на нашых вачах. І прыйшлі гэтыя хлопчыкі жалезныя.

*Ганна Іллінічна:*

— Гэта было нядаўна, але гэта было ў іншую эпоху… У іншай краіне… Там засталася наша наіўнасць, наш рамантызм. Даверлівасць. Хтосьці не хоча пра гэта ўспамінаць, бо непрыемна, столькі было расчаравання. Ну хто сказаў, што нічога не змянілася? Біблію нельга было перавезці праз мяжу. Пра гэта забыліся? У падарунак з Масквы я вазіла сваякам у Калугу муку і макароны. І яны былі шчаслівыя. Забыліся? Ніхто ўжо не стаіць у чарзе па цукар і мыла. І няма талонаў на паліто.

Я палюбіла Гарбачова адразу! Цяпер яго праклінаюць: «Здрадзіў СССР!», «Гарбачоў прадаў краіну за піцу!». А я памятаю наша здзіўленне. Ашаламленне! Нарэшце ў нас нармальны лідар. Не сорамна за яго! Адно аднаму пераказвалі, як у Ленінградзе ён спыніў картэж і выйшаў да народа, а на нейкім заводзе адмовіўся ад дарагога падарунку. Падчас традыцыйнага застолля выпіў толькі шклянку гарбаты. Усміхаецца. Выступае без паперкі. Малады. Ніхто з нас не верыў, што савецкая ўлада калі-небудзь скончыцца і ў крамах з’явіцца

каўбаса, а па імпартныя станікі не будуць стаяць кіламетровыя чэргі. Прывыклі ўсё праз знаёмых даставаць: падпіску на «Сусветную літаратуру», шакаладныя цукеркі і гэдээраўскія спартовыя касцюмы. Сябраваць з мяснікам, каб набыць кавалак мяса. Савецкая ўлада здавалася вечнай. Хопіць яшчэ на дзяцей і ўнукаў! А яна нечакана для ўсіх скончылася. Цяпер ясна, што і сам Гарбачоў гэтага не чакаў, ён хацеў нешта змяніць, але не ведаў — як. Ніхто не быў гатовы. Ніхто! Нават тыя, хто дзёўб гэтую сцяну. Я — шараговы тэхнолаг. Не герой, не… і не камуністка… Дзякуючы свайму мужу — ён мастак, — я рана трапіла ў багемнае асяроддзе. Паэты, мастакі… Сярод нас не было герояў, нікому не хапіла адвагі стаць дысідэнтам, адседзець у турме ці ў вар'ятні за свае перакананні. Жылі з дуляй у кішэні.

Сядзелі на кухнях, лаялі савецкую ўладу і баялі анекдоты. Чыталі самвыдат. Калі нехта даставаў новую кнігу, ён мог прыйсці ў дом да сяброў у любы час сутак — нават а другой-трэцяй ночы, усё адно гэта быў жаданы госць. Я добра памятаю тое начное маскоўскае жыццё… асаблівае… Там былі свае героі… свае баязліўцы і здраднікі… Сваё захапленне! Растлумачыць гэта чалавеку звонку немагчыма. Перш за ўсё наша захапленне я не магу растлумачыць. І не магу растлумачыць іншае… Вось гэта… Начное нашае жыццё… ну зусім яно не было падобнае да дзённага. Ні кропелькі! Раніцай мы ўсе ішлі на працу і станавіліся звычайнымі савецкімі людзьмі. Як і ўсе астатнія. Гарбаціліся на рэжым. Альбо ты канфарміст, альбо табе трэба ісці ў дворнікі і вартаўнікі, іншага спосабу захаваць сябе не было. Вярталіся з працы дамоў… І зноў пілі гарэлку на кухнях, слухалі забароненага Высоцкага. Лавілі праз трэск глушылак «Голас Амерыкі». Я дагэтуль памятаю той адмысловы трэск. Круцілі бясконцыя раманы. Кахаліся, разводзіліся. І многія пры гэтым адчувалі сябе сумленнем нацыі, лічылі, што маюць права павучаць свой народ. А што мы пра яго ведалі? Тое, што прачыталі ў «Запісках паляўнічага»

Тургенева і ў нашай вясковай прозе. У Распуціна... Бялова... Я нават свайго бацьку не разумела. Крычала яму: «Тата, калі ты не вернеш ім свой партбілет, то я з табой размаўляць не буду». Тата плакаў.

У Гарбачова было ўлады больш, чым у цара. Неабмежаваная ўлада. А ён прыйшоў і сказаў: «Так болей жыць нельга». Яго знакамітая фраза. І краіна ператварылася ў дыскусійны клуб. Спрачаліся дома, на працы, у транспарце. Праз розныя погляды сем'і распадаліся, дзеці сварыліся з бацькамі. Адна мая знаёмая так палаялася з сынам і нявесткай за Леніна, што выгнала іх на вуліцу, яны жылі зімой за горадам на халодным лецішчы. Тэатры апусцелі, усе сядзелі дома перад тэлевізарам. Ішлі жывыя рэпартажы з першага З'езда народных дэпутатаў СССР. Перад гэтым была цэлая гісторыя, як мы выбіралі гэтых дэпутатаў. Першыя вольныя выбары! Сапраўдныя! Па нашай акрузе праходзілі дзве кандыдатуры: нейкі партыйны чыноўнік і малады дэмакрат, выкладчык універсітэта. Памятаю і цяпер яго прозвішча — Малышаў... Юра Малышаў. Цяпер ён, я выпадкова даведалася, займаецца аграбізнэсам — памідорамі і гурочкамі гандлюе. А тады — рэвалюцыянер! Выступаў і казаў такую крамолу! Нечуваную! Марксісцка-ленінскую літаратуру называў малалітражнай... нафталінавай... Шосты артыкул Канстытуцыі патрабаваў скасаваць, а гэта артыкул пра кіроўную ролю КПСС. Нарожны камень марксізму-ленінізму... Я слухала і не магла сабе гэта ўявіць. Ахінея! Хто дасць... дазволіць чапаць? Усё разваліцца... Гэта ж скрэпы... Настолькі мы былі ўсе замбаваныя. Я савецкага чалавека выціскала з сябе гадамі, вёдрамі вычэрпвала. *(Маўчыць.)* Наша каманда... Нас набралася чалавек дваццаць добраахвотных памочнікаў, пасля працы мы абходзілі кватэры ў сваім раёне і агітавалі. Пісалі плакаты: «Галасуй за Малышава!». І ўявіце сабе — ён перамог! З вялікай перавагай. Першая наша перамога! Потым мы ўсе дурэлі ад жывых рэпартажаў са з'езда — дэпутаты выказваліся яшчэ больш адкрыта, чым мы на кухнях.

Альбо не далей за два метры ад кухні. Усе тырчалі каля тэлевізараў, як наркаманы. Не маглі адарвацца. Вось зараз Траўкін ім дасць! Да-а-аў! А Болдыраў? Зараз ён… Во малайчына!

Не апісаць жарсць да газет і часопісаў, да перыёдыкі больш, чым да кніг. Тыражы «тоўстых часопісаў» ірванулі да мільёнаў асобнікаў. Раніцай у метро дзень пры дні перад вачыма адна і тая самая карціна: увесь вагон сядзіць і чытае. Тыя, хто стаіць, таксама чытаюць. Абменьваюцца адно з адным газетамі. Незнаёмыя людзі. Мы з мужам выпісвалі дваццаць найменняў, адну зарплату цалкам трацілі на падпіску. З працы я бегла хутчэй дамоў, каб залезці ў халат і чытаць. Нядаўна памерла мая мама, яна казала: «Я паміраю, як пацук на сметніку». Яе аднапакаёвая кватэра нагадвала чытальную залу: часопісы, газеты — стосамі на кніжных паліцах, у шафе. На падлозе і ў вітальні. Бясцэнны «Новый мир» і «Знамя»… «Даугава»… Паўсюль — скрыні выразак. Вялікія скрыні. Я адвезла ўсё на лецішча. Выкінуць шкада, аддаць — каму? Макулатура цяпер! А ўсё чытанае-перачытанае. Шмат падкрэсліванняў — чырвоным алоўкам, жоўтым. Чырвоным — найважнейшае. Паўтоны, я думаю, у мяне ляжыць. Усё лецішча завваленае.

Вера была шчырая… наіўная вера… Паверылі, што вось зараз… ужо стаяць на вуліцы аўтобусы, якія павязуць нас у дэмакратыю. Будзем жыць у прыгожых дамах, а не ў шэрых «хрушчобах», пабудуем аўтабаны замест раздзяўбаных дарог, станем усе добрымі. Рацыянальных доказаў гэтаму ніхто не шукаў. Іх і не было. А навошта? Верылі сэрцам, а не розумам. І галасавалі на выбарчых участках сэрцам. Ніхто канкрэтна не казаў, што трэба рабіць: свабода — і ўсё. Калі ты сядзіш у зачыненым ліфце, то марыш пра адно — каб ліфт адчыніўся. Ты шчаслівы, калі яго адчынілі. Эйфарыя! Ты не думаеш пра тое, што ты зараз павінен нешта рабіць… ты нарэшце дыхаеш на поўныя грудзі… Ты ўжо шчаслівы! Мая сяброўка выйшла замуж за француза, ён працаваў у маскоўскім пасольстве. І вось ён увесь час ад яе чуў: паглядзі, маўляў,

якая ў нас, у рускіх, энергія. «Ты мне растлумач, для чаго гэтая энергія?» — пытаўся ён у яе. Ні яна, ні я не маглі нічога яму растлумачыць. Я яму так і адказвала: б'е энергія — і ўсё. Я бачыла вакол сябе жывых людзей, жывыя твары. Якія ўсе былі ў той час прыгожыя! Адкуль узяліся гэтыя людзі? Учора ж іх яшчэ не было!

Тэлевізар у нас у доме не выключаўся... Выпуск навін глядзелі кожную гадзіну. У мяне толькі нарадзіўся сын, я выходзіла з ім у двор і абавязкова брала з сабой прыёмнік. Людзі сабак выгульвалі з прыёмнікамі. Смяёмся цяпер з сына: ты ў нас з дзяцінства — у палітыцы, а яму гэта нецікава. Слухае музыку, вучыць мовы. Хоча ўбачыць свет. Іншым жыве. Нашы дзеці не падобныя да нас. Да каго яны падобныя? Да свайго часу, адно да аднаго. А мы тады... Ой-ой! Зараз Сабчак на з'ездзе выступае... Усе кідаюць справы і бягуць да экрана. Мне падабалася, што Сабчак у нейкім прыгожым, здаецца, вельветавым пінжаку, гальштук завязаны «па-еўрапейску». Сахараў на трыбуне... Значыць, у сацыялізму можа быць «чалавечы твар»? Вось яно... Для мяне гэта быў твар акадэміка Ліхачова, а не генерала Ярузэльскага. Калі я казала «Гарбачоў», мой муж дадаваў «Гарбачоў... і Раіса Максімаўна таксама». Першы раз мы ўбачылі жонку генеральнага сакратара, за якую было не сорамна. Прыгожая пастава, добра апранутая. Кахаюць адно аднаго. Нехта прынёс нам польскі часопіс, дзе пісалася, што Раіса — шык! Як мы ганарыліся!.. Бясконцыя мітынгі. Вуліцы патаналі ва ўлётках. Скончаўся адзін мітынг, пачынаўся іншы. Людзі ішлі й ішлі, кожны думаў, што ён прыйдзе туды і пачуе нейкае адкрыццё. Вось зараз правільныя людзі знойдуць правільныя адказы... Наперадзе чакала невядомае жыццё, яно ўсіх вабіла. Здавалася, што царства свабоды ўжо на парозе...

Але жыццё станавілася ўсё горшым. Неўзабаве, акрамя кніг, нічога ўжо нельга было набыць. На крамных паліцах толькі кнігі...

*Алена Юр'еўна:*

—Дзевятнаццатага жніўня дзевяноста першага... Прыязджаю ў райкам. Іду па калідоры і чую: ва ўсіх кабінетах, на ўсіх паверхах уключана радыё. Сакратарка перадае просьбу «першага» зайсці да яго. Заходжу. У «першага» гучна працуе тэлевізар, сам ён, змрочны, сядзіць каля прыёмніка, ловіць то «Свабоду», то «Нямецкую хвалю»... «Бі-бі-сі»... Усё, што даступнае. На стале спіс членаў Дзяржаўнага камітэта па надзвычайным становішчы... ГКЧП... як яго потым назавуць. «Адзін Варэннікаў, — кажа ён мне, — выклікае павагу. Усё ж баявы генерал. Ваяваў у Афганістане». Заходзяць другі сакратар... загадчык аргаддзела... Пачынаецца ў нас размова: «Які жах! Будзе кроў. Зальемся крывёю». — «Усіх не зальюць, а зальюць каго трэба». — «Даўно пара ратаваць Савецкі Саюз». — «Наваляць горы трупаў». — «Ну ўсё, Гарбач даскакаўся. Нарэшце нармальныя людзі, генералы, прыйдуць да ўлады. Бардак скончыцца». «Першы» абвясціў, што ранішнюю планёрку вырашыў не праводзіць — пра што дакладваць? Ніякіх указанняў не паступіла. Пры нас ён патэлефанаваў у міліцыю: «Што ў вас чуваць?» — «Нічога». Яшчэ пагаварылі пра Гарбачова — ці то хворы, ці то арыштаваны. Усе больш схіляліся да трэцяга варыянту — уцёк з сям'ёй у Амерыку. А куды ж яшчэ?

Так цэлы дзень і праседзелі каля тэлевізараў і тэлефонаў. Трывожна: чыя там, наверсе, возьме? Чакалі. Я вам шчыра скажу, чакалі. Усё гэта трохі нагадвала час, калі скідалі Хрушчова. Ужо ж мемуараў начыталіся... Размовы, зразумела, пра адно... Якая свабода? Свабода нашаму чалавеку — як малпе акуляры. Ніхто не ведае, што з ёй рабіць. Усе шапікі гэтыя, манапалькі... ну не ляжыць да іх душа. Я ўспомніла, як пару дзён таму сустрэла свайго былога кіроўцу. Такая гісторыя... Да нас у райкам хлопец трапіў адразу пасля войска. Меў нейкі буйны блат. Быў страшэнна задаволены. Але пачаліся перамены, дазволілі кааператывы, і ён ад нас сышоў. Заняўся бізнэсам. Я з цяжкасцю яго пазнала: стрыжаны нагала,

скураная куртка, спартовы касцюм. Гэта ў іх, як я зразумела, уніформа такая. Пахваліўся, што за адзін дзень зарабляе больш, чым першы сакратар райкама партыі за месяц. Бізнэс бяспройгрышны — джынсы. Арандавалі з сябрам звычайную пральню і там робяць «варонкі». Тэхналогія немудрагелістая (хітра, проста і нядорага): звычайныя, банальныя джынсы кідаюць у раствор адбельвальніка ці хлёркі, дадаюць туды бітай цэглы. Пару гадзін «вараць» — на штанах палосы, разводы, малюнкі… Абстракцыянізм! Прасушваюць і прыклейваюць лэйбл «Мантана». Да мяне раптам дайшло: калі нічога не зменіцца, яны, гэтыя прадаўцы джынсаў, будуць неўзабаве намі камандаваць. Нэпманы! І накормяць усіх, і адзенуць, як гэта ні смешна. У сутарэннях заводы збудуюць… Так яно і выйшла. Вось! Цяпер гэты хлопец — мільянер або мільярдэр (для мяне мільён і мільярд аднолькава шалёная сума), дэпутат Дзярждумы. Адзін дом на Канарах… другі — у Лондане… Пры цары ў Лондане жылі Герцэн і Агароў, цяпер яны… нашы «новыя рускія»… Джынсавыя, мэблевыя, шакаладныя каралі. Нафтавыя.

А дзявятай увечары «першы» яшчэ раз сабраў усіх да сябе. Дакладваў начальнік раённага КДБ. Распавёў пра настроі сярод людзей. Паводле яго, народ падтрымліваў ГКЧП. Не абураўся. Гарбачоў усім надакучыў… Талоны на ўсё, акрамя солі… гарэлкі няма… Хлопцы з КДБ пабегалі па горадзе і запісалі размовы. Перапалкі ў чэргах: «Пераварот! Што будзе з краінай?» — «А што ў цябе перавярнулася? Ложак на месцы стаіць. Гарэлка — тая самая». — «Вось і скончылася свабода». — «Ага! Свабода ліквідацыі каўбасы». — «Камусьці захацелася жуйкі. “Мальбара” курыць». — «Даўно пара! Краіна на мяжы краху!» — «Юда Гарбачоў! Хацеў прадаць Радзіму за долары». — «Крывішча пацячэ…» — «А без крыві ў нас нельга…» — «Каб выратаваць краіну… партыю… патрэбныя джынсы. Прыгожая жаночая бялізна і каўбаса, а не танкі». — «Добрага жыцця захацелі? Хрэн вам! Забудзьце!» *(Маўчыць.)*

Адным словам, народ чакаў... як і мы... У партбібліятэцы дэтэктываў да канца дня ўжо не было, усё разабралі. *(Смяецца.)* Леніна б нам усім чытаць, а не дэтэктывы. Леніна і Маркса. Нашых апосталаў.

Запомніла прэс-канферэнцыю ГКЧП... У Янаева дрыжалі рукі. Стаяў і апраўдваўся: «Гарбачоў заслугоўвае поўнай пашаны... ён — мой сябар...» Вочы бегаюць... спалоханыя вочы... У мяне ёкнула сэрца. Не тыя гэта людзі, якія б маглі... якіх чакалі... Пігмеі... звычайныя партапаратчыкі... Ратаваць краіну! Ратаваць камунізм! Няма каму ратаваць... На экране: маскоўскія вуліцы — мора людзей. Мора! На цягніках, прыгарадных электрычках народірвануў у Маскву. Ельцын на танку. Раздае ўлёткі... «Ельцына! Ельцына!» — скандуе натоўп. Трыумф! *(Нервова торгае край абруса.)* Абрус вось... кітайскі... Увесь свет запоўнены кітайскімі таварамі. Кітай — краіна, дзе ГКЧП перамог... А дзе мы? Краіна трэцяга свету. Дзе тыя, хто крычаў: «Ельцын! Ельцын!»? Яны думалі, што будуць жыць, як у Амерыцы і Германіі, а жывуць — як у Калумбіі. Мы прайгралі... прайгралі краіну... А нас, камуністаў, у той час налічвалася пятнаццаць мільёнаў! Партыя магла... ёй здрадзілі... На пятнаццаць мільёнаў не знайшлося ніводнага лідара. Ніводнага! А на тым баку лідар быў. Быў — Ельцын! Бяздарна ўсё прайгралі! Палова краіны чакала, што мы пераможам. Адной краіны ўжо не было. Ужо было — дзве.

Тыя, хто называў сябе камуністамі, раптам сталі прызнавацца, што яны ненавідзелі камунізм з пялюшак. Здавалі свае партбілеты... Адны прыносілі і пакідалі партбілеты моўчкі, іншыя бразгалі дзвярыма. Падкідалі ноччу пад будынак райкама... Як злодзеі. Развітайцеся з камунізмам сумленна. Не — употай. Раніцай дворнікі хадзілі і збіралі па двары — партбілеты, камсамольскія пасведчанні — і прыносілі нам. Прыносілі ў пакетах, у вялікіх цэлафанавых мяшках... Што з гэтым рабіць? Куды здаваць? Каманды няма. Зверху — ніякіх сігналаў. Мёртвая цішыня. *(Задумалася.)* Такі гэта быў

час… людзі пачалі мяняць усё… Абсалютна ўсё. Начыста. Адны з'язджалі — мянялі радзіму. Іншыя мянялі перакананні і прынцыпы. Трэція мянялі рэчы ў доме, рэчы мянялі спрэс. Старое савецкае выкідалі, куплялі ўсё імпартнае… «Чаўнакі» цяпер усяго навезлі: імбрыкі, тэлефоны, мэблю… лядоўні… Аднекуль усяго з'явілася навалам. «У мяне пральная машына "Бош"». — «А я набыў тэлевізар "Сіменс"». У кожнай размове гучала: «Панасонік», «Соні»… «Філіпс»… Сустрэла суседку: «Сорамна радавацца нямецкай кавамолцы… А я шчаслівая!» Яна ж толькі… вось толькі… ноч стаяла ў чарзе па томік Ахматавай, цяпер вар'яцее ад кавамолкі. Ад нейкай лухты… І з партбілетам расставаліся — як з непатрэбнай рэччу. Цяжка было паверыць… Але за некалькі дзён усё памянялася. Царская Расія, як чытаеш у мемуарах, зліняла за тры дні, і камунізм таксама. За пару дзён. У галаве не ўкладвалася… Знаходзіліся, праўда, і такія, хто хаваў свае чырвоныя кніжачкі, пакідаў на ўсялякі выпадак. Нядаўна ў адной сям'і мне дасталі з антрэсоляў бюст Леніна. Захоўваюць… раптам яшчэ спатрэбіцца… Вернуцца камуністы, яны першыя начэпяць пунсовы бант. *(Маўчыць доўга.)* У мяне на стале ляжалі сотні заяваў аб выхадзе з партыі… Усё гэта ў хуткім часе згрэблі і вынеслі як смецце. Згніло на звалцы. *(Штосьці шукае ў тэчках на стале.)* Я пару аркушыкаў захавала… Калі-небудзь іх папросяць у мяне для музея. Будуць шукаць… *(Зачытвае.)*

«…Я была адданай камсамолкай… са шчырым сэрцам уступіла ў партыю. Цяпер хачу сказаць, што партыя больш не мае ніякай улады нада мной…»

«…Час увёў мяне ў зман… Я верыла ў Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю. Прачытаўшы Салжаніцына, я зразумела, што "прыўкрасныя ідэалы камунізму" ўсе ў крыві. Гэта падман…»

«…Мяне прымусіў уступіць у партыю страх… Ленінскія бальшавікі расстралялі майго дзядулю, а сталінскія камуністы знішчылі ў мардоўскіх лагерах маіх бацькоў…»

«…Ад свайго імя і ад імя майго нябожчыка мужа заяўляю аб сваім выхадзе з партыі…»

Гэта трэба было пераҗыць… не здохнуць ад вусцішы… У райкаме стаялі чэргі, як у краме. Чэргі ахвочых вярнуць партбілеты. Да мяне прабілася простая жанчына. Даярка. Яна плакала: «Што мне рабіць? Як паводзіцца? У газетах пішуць, што партбілеты трэба выкідаць». Апраўдвалася тым, што ў яе трое дзяцей, яна за іх баіцца. Хтосьці распускаў чуткі, што камуністаў будуць судзіць. Высылаць. Ужо рамантуюць у Сібіры старыя баракі… у міліцыю паступілі кайданкі… нехта бачыў, як іх згружаюць з грузавікоў, крытых брызентам. Жахлівыя рэчы, так! Але я запомніла і сапраўдных камуністаў. Адданых ідэі. Маладога настаўніка… Незадоўга да ГКЧП яго прынялі ў партыю, але білет не паспелі ўручыць, ён прасіў: «Вас хутка апячатаюць. Выпішыце мне партбілет, а то я яго ніколі не атрымаю». У гэты момант людзі асабліва ярка праявіліся. Прыйшоў франтавік… Увесь у баявых ордэнах. Іканастас на грудзях! Вярнуў ён партбілет, які яму ўручылі на фронце, са словамі: «Не хачу быць у адной партыі з гэтым здраднікам Гарбачовым!» Напоўніцу… людзі паказвалі сябе. І чужыя, і знаёмыя. І нават сваякі. Раней сустрэнуць: «Ах, Алена Юр'еўна!», «Як вашае здароўе, Алена Юр'еўна?» А тут убачаць здалёк і пераходзяць на другі бок вуліцы, каб не вітацца. Дырэктар найлепшай школы ў раёне… Незадоўга да ўсіх гэтых падзеяў мы праводзілі ў яго школе навуковую партканферэнцыю па кнігах Брэжнева «Малая зямля» і «Адраджэнне». Тады ён выступіў з бліскучым дакладам аб кіроўнай ролі камуністычнай партыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны… і асабіста таварыша Брэжнева… Я яму ўручыла грамату райкама партыі. Верны камуніст! Ленінец! Бог мой! Месяца не прамінула… Сустрэў мяне на вуліцы і пачаў абражаць: «Скончыўся ваш час! За ўсё адкажаце! Найперш — за Сталіна!» Я задыхнулася ад крыўды… Гэта ён — мне! Мне? Мне, у якой бацька ў лагеры сядзеў… *(Некалькі хвілінаў супакойваецца.)* Сталіна я ніколі не

любіла. Бацька дараваў, а я не. Я не даравала… *(Маўчыць.)* Рэабілітацыю «палітычных» пачалі пасля дваццатага з'езда. Пасля даклада Хрушчова… А гэта… А гэта ўжо было пры Гарбачове… Мяне прызначылі старшынёй раённай камісіі па рэабілітацыі ахвяраў палітычных рэпрэсій. Я ведаю, што спачатку прапаноўвалі іншым: нашаму пракурору і другому сакратару райкама партыі. Адмовіліся. Чаму? Можа, пабаяліся. У нас дагэтуль баяцца ўсяго, што звязана з КДБ. А я ні хвіліны не вагалася — так, я згодная. У мяне бацька пацярпеў. Чаго мне баяцца? Першы раз павялі кудысьці ў сутарэнне… Дзясяткі тысяч папак… Адна «справа» — два аркушыкі, а другая — том. Як у трыццаць сёмым годзе быў план… развёрстка… на «выяўленне і выкарчоўку ворагаў народа», так у васьмідзясятыя гады па раёнах і абласцях спускалі лічбы на рэабілітацыю. План трэба было выканаць і перавыканаць. Стыль сталінскі: нарады, разносы, вымовы. Давай-давай… *(Круціць галавою.)* Начамі сядзела і чытала, перагортвала тамы. Шчыра… шчыра скажу… Валасы станавіліся дыбарам… Брат пісаў на брата, сусед на суседа… Пасварыліся за агарод ці пакой у камуналцы. Праспяваў на вяселлі прыпеўку: «Дзякуй Сталіну-грузіну, што абуў нас у рызіну». Гэтага было дастаткова. З аднаго боку, сістэма раструшчвала чалавека, а з другога — людзі не шкадавалі адзін аднаго. Чалавек быў гатовы…

Звычайная камуналка… Жывуць разам пяць сем'яў — дваццаць сем чалавек. Адна кухня і адзін сарцір. Дзве суседкі сябруюць: у адной дзяўчынцы пяць гадоў, а другая — адзінокая. У камуналках, звычайная справа, сачылі адзін за адным. Падслухоўвалі. Тыя, у каго пакой дзесяць метраў, зайздросцілі тым, у каго ён дваццаць пяць метраў. Жыццё… яно такое… І вось ноччу прыязджае «чорны воран»… Жанчыну, у якой маленькая дзяўчынка, арыштоўваюць. Перад тым, як яе павялі, яна паспела крыкнуць сяброўцы: «Калі не вярнуся, вазьмі маю дачку да сябе. Не аддавай у дзіцячы дом». І тая забрала дзіця. Перапісалі ёй другі пакой… Дзяўчынка стала клікаць яе

мамай... «мамай Аняй»... Мінула сямнаццаць гадоў... Праз сямнаццаць гадоў вярнулася сапраўдная мама. Яна цалавала рукі і ногі сваёй сяброўцы. Казкі звычайна сканчаюцца на гэтым месцы, а ў жыцці была іншая канцоўка. Без хэпі-энду. Пры Гарбачове, калі адкрылі архівы, у былой лагерніцы спыталі: «Вы хочаце паглядзець сваю справу?» — «Хачу». Узяла яна, разгарнула... Зверху ляжаў данос... знаёмы почырк... Суседка... «мама Аня»... напісала данос... Ці вы што-небудзь разумееце? Я — не. І тая жанчына — яна таксама не змагла зразумець. Прыйшла дадому і павесілася. *(Маўчыць.)* Я — атэістка. У мяне да Бога шмат пытанняў... Я памятаю... Я ўспамінаю татавы словы: «Лагер перажыць можна, а людзей не». Яшчэ ён казаў: «Памры ты сёння, а я заўтра — гэтыя словы я не ў лагеры першы раз пачуў, а ад нашага суседа. Ад Карпушы...». Карпуша ўсё жыццё сварыўся з бацькамі за нашых курэй, якія хадзілі па ягоных градах. Бегаў пад нашымі вокнамі з паляўнічай стрэльбай... *(Маўчыць.)*

Дваццаць трэцяга жніўня... Арыштавалі членаў ГКЧП. Застрэліўся міністр унутраных спраў Пуга... перад гэтым ён застрэліў сваю жонку... Людзі радаваліся: «Пуга застрэліўся!» Павесіўся ў сваім крамлёўскім кабінеце маршал Ахрамееў. Яшчэ было некалькі дзіўных смерцяў... Кіраўнік спраў ЦК Мікалай Кручына выпаў з акна пятага паверха... Самагубствы ці забойствы? Гадаюць дагэтуль... *(Маўчыць.)* Як жыць? Як выйсці на вуліцу? Вось проста выйсці на вуліцу і каго-небудзь сустрэць. Я тады... Ужо некалькі гадоў я жыла адна. Дачка выйшла замуж за афіцэра, з'ехала ва Уладзівасток. Муж памёр ад раку. Увечары вярталася ў пустую кватэру. Я не слабы чалавек... Але думкі ўсякія... страшныя... яны прыходзілі... Шчыра скажу... Былі, так... *(Маўчыць.)* Яшчэ нейкі час мы хадзілі на працу ў райкам. Зачыняліся там у сваіх кабінетах. Глядзелі навіны ў тэлевізары. Чакалі. На нешта спадзяваліся. Дзе наша партыя? Наша непераможная ленінская партыя! Свет абрынуўся... Званок з аднаго калгаса: мужыкі з косамі і віламі, з па-

ляўнічымі стрэльбамі — у каго што было, сабраліся каля канторы бараніць савецкую ўладу. «Першы» загадаў: «Адпраўце людзей па дамах». Спалохаліся… мы ўсе спалохаліся… А людзі былі настроеныя рашуча. Я некалькі такіх фактаў ведаю. А мы спалохаліся…

І вось… гэты дзень… Патэлефанавалі з райвыканкама: «Мы абавязаны апячатаць вашы кабінеты. У вас дзве гадзіны, каб сабраць свае рэчы». *(Не можа ад хвалявання гаварыць.)* Дзве гадзіны… дзве… Кабінеты апячатвала адмысловая камісія… Дэмакраты! Нейкі слесар, малады журналіст, маці пяцярых дзяцей… Я яе ўжо ведала па мітынгах. Па лістах у райкам… у нашу газету… Жыла яна з вялікай сям'ёй у бараку. Паўсюль выступала і патрабавала кватэру. Праклінала камуністаў. Я запомніла яе твар… Яна ў гэты момант трыумфавала… Калі яны прыйшлі да «першага», ён запусціў у іх крэслам. У мяне ў кабінеце адна з членаў камісіі падышла да акна і дэманстратыўна разарвала штору. Каб я дадому яе не забрала, ці што? Бог мой! Прымусілі паказаць сумачку… Праз некалькі гадоў я сустрэла на вуліцы гэтую маці пяцярых дзяцей. Нават імя яе зараз успомніла — Галіна Аўдзей. Я ў яе спытала: «Ці атрымалі вы кватэру?» Яна пагразіла кулаком у бок будынка абласной адміністрацыі: «І гэтыя падлюгі мяне падманулі». Далей… Далей — што? На выхадзе з будынка райкама нас чакаў натоўп: «Камуністаў — пад суд! Цяпер іх — у Сібір!», «Узяць бы зараз кулямёты і прайсціся па вокнах». Азіраюся — за спінай у мяне два мужыкі нападпітку — гэта яны… пра кулямёт… Адказваю: «Толькі майце на ўвазе, я буду адстрэльвацца». Побач стаяў міліцыянер і рабіў выгляд, што ён нічога не чуе. Знаёмы міліцыянер.

Увесь час было адчуванне… як быццам чую за спінай: у-у-у… Не я адна так жыла… У школе да дачкі нашага інструктара падышлі дзве дзяўчынкі з яе класа: «Мы з табой сябраваць не будзем. Твой тата ў райкаме партыі працаваў». — «Мой тата добры». — «Добры тата не мог там працаваць. Мы ўчора

на мітынгу былі…» Пяты клас… дзеці… Ужо яны — гаўрошы, гатовыя падносіць патроны. Інфаркт у «першага». Ён памёр у машыне «хуткай дапамогі», да бальніцы не давезлі. Я думала, што, як раней, будзе шмат вянкоў, аркестр, а тут — нікога і нічога. Ішлі за труной некалькі чалавек… група таварышаў… Яго жонка замовіла, каб на помніку выбілі серп і молат і першыя радкі савецкага гімна: «Саюз непарушны рэспублік свабодных…». З яе смяяліся. Я ўвесь час чула гэты шэпт: у-у-у… Думала, што звар'яцею… Незнаёмая жанчына ў краме: «Ну што, камунякі, прасралі краіну!» — мне ў твар.

Што ратавала? Ратавалі званкі… Званок ад сяброўкі: «Калі вышлюць у Сібір, ты не бойся. Там прыгожа». *(Смяецца.)* Была яна там у турпаездцы. Ёй спадабалася. Званок ад стрыечнай сястры з Кіева: «Прыязджай да нас. Я дам табе ключы. Зможаш схавацца ў нас на лецішчы. Цябе там ніхто не знойдзе». — «Я — не злачынца. Не буду хавацца». Бацькі тэлефанавалі кожны дзень: «Што ты робіш?» — «Кансервую агуркі». Цэлымі днямі слоікі кіпяціла. Закручвала. Не чытала газеты і не глядзела тэлевізар. Чытала дэтэктывы, адну кніжку скончала і тут жа пачынала другую. Тэлевізар спараджаў вусціш. Газеты таксама.

Доўга не магла ўладкавацца на працу… Усе лічылі, што мы падзялілі грошы партыі, і ў кожнага з нас — кавалак нафтавай трубы або, найгорш, маленькая аўтазапраўка. Няма ў мяне ні аўтазапраўкі, ні крамкі, ні шапіка. Іх цяпер «камкамі» называюць. «Камкі», «чаўнакі»… Вялікую рускую мову не пазнаць: ваўчар, валютны калідор… транш МВФ… На замежнай мове размаўляем. Я вярнулася ў школу. Перачытваю з вучнямі ўлюбёнага Талстога і Чэхава. Як у іншых? Лёс маіх таварышаў склаўся па-рознаму… Адзін наш інструктар скончыў самагубствам… Загадчык парткабінета меў нервовую хваробу, ляжаў доўга ў бальніцы. Хтосьці стаў бізнэсменам… Другі сакратар — дырэктар кінатэатра. А адзін інструктар райкама — святар. Я з ім сустракалася. Размаўляла. Жыве чалавек другое

жыццё. Пазайздросціла яму. Прыгадалася… Я была ў мастацкай галерэі… На адной карціне, памятаю, шмат-шмат святла — і жанчына стаіць на мосце. Глядзіць кудысьці далёка… шмат-шмат святла… Не хацелася ад гэтай карціны сыходзіць. Пайду — і зноў вярнуся, мяне да яе цягне. У мяне таксама магло быць іншае жыццё. Не ведаю толькі — якое?

*Ганна Іллінічна:*

—Я прачнулася ад гулу… Адчыняю акно… Па Маскве! Па сталіцы паўзуць танкі і бэтээры. Радыё! Хутчэй уключыць радыё! Перадавалі зварот да савецкага народа: «Над Радзімай навісла смяротная небяспека… Краіна абрынаецца ў бездань гвалту і беззаконня… Ачысцім вуліцы ад злачынных элементаў… Пакладзем канец смутнаму часу…». Было незразумела — ці то Гарбачоў сышоў у адстаўку па стане здароўя, ці то яго арыштавалі. Тэлефаную мужу, ён на лецішчы: «У краіне дзяржаўны пераварот. Улада ў руках…» — «Дурніца! Пакладзі слухаўку, цябе зараз забяруць». Уключаю тэлевізар. Па ўсіх каналах — балет «Лебядзінае возера». А ў мяне перад вачыма іншыя кадры, усе мы дзеці савецкай прапаганды: Сант'яга ў Чылі… гарыць прэзідэнцкі палац… Голас Сальвадора Альендэ… Пачаліся тэлефонныя званкі: у горадзе поўна вайсковай тэхнікі, танкі стаяць на Пушкінскай плошчы, на Тэатральнай… У нас у гэты час гасцявала свякруха, яна страшэнна спалохалася: «Не выходзь на вуліцу. Я жыла пры дыктатуры, я ведаю, што гэта такое». А я не хачу жыць пры дыктатуры!

Пасля абеду муж вярнуўся з лецішча. Сядзелі на кухні. Шмат курылі. Баяліся праслушкі тэлефона… паклалі на тэлефон падушку… *(Смяецца.)* Начыталіся дысідэнцкай літаратуры. Наслухаліся. Цяпер вось яно прыдалося… Далі трохі падыхаць, а зараз усё зашморгнецца. Заганяць назад у клетку, закатаюць зноў у асфальт… будзем, як матылькі ў цэменце… Успаміналі нядаўнія падзеі на плошчы Цянь-ань-мэнь, згадвалі як сапёрнымі рыдлёўкамі ў Тбілісі разганялі дэманстрацыю.

Штурм тэлецэнтра ў Вільні… «Пакуль мы чыталі Шаламава і Платонава, — сказаў муж, — пачалася грамадзянская вайна. Раней спрачаліся на кухнях, хадзілі на мітынгі, а цяпер будзем страляць адно ў аднаго». Настрой быў такі… нешта катастрафічнае блізка… Радыё ні на хвіліну не выключалі, круцілі-круцілі — паўсюль перадавалі музыку, класічную музыку. І раптам — цуд! Запрацавала «Радыё Расіі»: «адхілены ад улады законна абраны Прэзідэнт… цынічная спроба перавароту…» Так мы даведаліся, што тысячы людзей ужо выйшлі на вуліцу. Гарбачоў у небяспецы… Ісці ці не ісці — гэта нават не абмяркоўвалася. Ісці! Свякруха спачатку мяне адгаворвала: падумай, маўляў, пра дзіця, ты звар'яцела, куды ты папрэшся? Я маўчала. Ну, яна бачыць, што мы збіраемся: «Калі вы такія ідыёты, вазьміце з сабой хоць бы содавы раствор, будзеце змочваць марлю і прыкладваць да твару ў выпадку газавай атакі». Я прыгатавала трохлітровы слоік гэтага раствору, парвала адну прасціну на кавалкі. Яшчэ мы ўзялі з сабой усё, што ў нас было з ежы, я выграбла з буфета ўсе кансервы.

Шмат людзей, як і мы, ішлі да метро… А нехта стаяў у чарзе па марозіва… Набываў кветкі. Мінаем вясёлую кампанію… Лаўлю словы: «Калі заўтра праз танкі не траплю на канцэрт, я ім гэтага ніколі не дарую». Бяжыць насустрач мужчына ў майтках і з сеткай, а ў сетцы — пустыя пляшкі. Параўняўся з намі: «Вуліцу Будаўнічую — не падкажаце?» Я паказала яму, дзе трэба павярнуць направа, і далей — проста. Ён: дзякуй. Яму ўсё да фені, абы пляшкі здаць. А што, у 1917 годзе было інакш? Адны стралялі, а іншыя на балях танцавалі. Ленін на браневіку…

*Алена Юр'еўна:*

— Фарс! Разыгралі фарс! Калі б перамог ГКЧП, сёння жылі б у іншай краіне. Калі б Гарбачоў не збаяўся… Не выдавалі б заробак шынамі і лялькамі. Шампунем. Выпускае завод цвікі — цвікамі. Мыла — мылам. Усім кажу: паглядзіце на кітайцаў…

У іх свой шлях. Ні ад каго не залежаць, нікога не пераймаюць. І ўвесь свет сёння баіцца кітайцаў… *(Зноў да мяне з пытаннем.)* Я ўпэўненая — вы мае словы выкрасліце.

*Я абяцаю — аповедаў будзе два. Хачу застацца стрыманым гісторыкам, а не гісторыкам з запаленай паходняй. Няхай суддзёй будзе час. Час — справядлівы, але далёкі час, а не блізкі. Час, які ўжо будзе без нас. Без нашых прыхільнасцяў.*

*Ганна Іллінічна:*

—Можна з гэтых дзён пасмяяцца, назваць аперэтай. Сцёб у модзе. А тады ўсё адбывалася па-сур'ёзнаму. Сумленна. Усё было сапраўднае, і ўсе мы былі сапраўднымі. Бяззбройныя людзі стаялі перад танкамі і гатовыя былі памерці. Я сядзела на гэтых барыкадах і бачыла гэтых людзей, яны прыехалі з усёй краіны. Нейкія бабулькі маскоўскія, дзьмухаўцы божыя, катлеткі прыносілі, цёплую бульбу, загорнутую ў ручнік. Падкармлівалі ўсіх… І танкістаў таксама: «Ешце, хлопчыкі. Толькі не страляйце. Няўжо будзеце?» Салдаты нічога не разумелі… Калі яны адкрылі люкі і вылезлі з танкаў, яны абалдзелі. На вуліцах — уся Масква! Дзяўчаты ўзбіраліся да іх на браню, абдымалі, цалавалі. Частавалі булачкамі. Салдацкія маці, у якіх сыны загінулі ў Афганістане, плакалі: «Нашы дзеці загінулі на чужой зямлі, а вы што — прыехалі на сваёй зямлі паміраць?» Нейкі маёр… Калі яго атачылі жанчыны, у яго здалі нервы, ён крычаў: «Ды я сам — бацька. Я не буду страляць! Клянуся вам — не буду! Супраць народа — не пойдзем!» Там было мноства смешных рэчаў і кранальных да слёз. Раптам крыкі ў натоўпе: «Ці мае хто-небудзь валідол, чалавеку тут кепска». Тут жа знайшоўся валідол. Стаяла жанчына з дзіцём у вазочку (бачыла б гэта мая свякруха!), яна дастала пялюшку, каб намаляваць на ёй чырвоны крыж. Чым? «Ці мае хто-небудзь памаду?» Ёй сталі кідаць танную памаду і «ланкомаўскую»… «Крыстыян Дыёр»… «Шанэль»… Ніхто гэтага не зняў, не зафіксаваў у падрабязнасцях. Шкада. Вельмі. Логіка падзеі, яе

прыгажосць… яны з'яўляюцца потым, вось гэтыя сцягі і музыка… і ўсё адліваецца ў бронзу… А ў жыцці ўсё раздробленае, бруднае і грубае: людзі сядзелі ўсю ноч каля вогнішча проста на зямлі. На газетах і ўлётках. Галодныя, злыя. Мацюкаліся і выпівалі, але п'яных не было. Хтосьці прывозіў каўбасу, сыр, хлеб. Каву. Казалі, што гэта кааператары… бізнэсмены… Адзін раз я нават бачыла некалькі бляшанак чырвонай ікры. Ікра знікла ў кагосьці ў кішэні. Цыгарэты раздавалі таксама бясплатна. Побач са мной сядзеў хлопец у зэкаўскіх наколках. Тыгр! Рокеры, панкі, студэнты з гітарамі. І прафесары. Усе былі разам. Народ! Гэта быў мой народ! Я сустрэла там сваіх сяброў з інстытута, якіх не бачыла гадоў так пятнаццаць, калі не больш. Хтосьці жыў у Волагдзе… хтосьці ў Яраслаўлі… Але яны селі ў цягнік і прыехалі ў Маскву! Бараніць нешта важнае для ўсіх нас. Раніцай мы забралі іх да сябе дадому. Памыліся, паснедалі і вярнуліся назад. На выхадзе з метро кожнаму ўжо давалі кавалак арматуры ці камень. «Глыж — зброя пралетарыяту», — смяяліся мы. Будавалі барыкады. Перакульвалі тралейбусы, пілавалі дрэвы.

Ужо стаяла трыбуна. Над трыбунай павесілі плакаты: «Хунце — не!», «Народ — не гразь пад нагамі». Выступоўцы прамаўлялі ў мегафон. Пачыналі яны свае выступы нармальнымі словамі — і простыя людзі, і вядомыя палітыкі. Праз пару хвілінаў нармальных словаў ужо нікому не хапала, і тады пачыналі крыць матам. «Ды мы гэтых мудакоў…» І мат! Харошы рускі мат! «Скончыўся іхны час…» І — вялікая, магутная руская мова! Мат як баявы кліч. І гэта было зразумела ўсім. Адпавядала моманту. Хвіліны такога ўздыму! Такой сілы! Старых словаў не хапала, а новыя яшчэ не нарадзіліся… Увесь час чакалі штурму. Цішыня, асабліва ўначы, стаяла неймаверная. Усе жудасна напружаныя. Тысячы людзей — і цішыня. Памятаю пах бензіну, які разлівалі ў пляшкі. Гэта быў пах вайны…

Там стаялі сапраўдныя! Там стаялі выдатныя людзі! Цяпер шмат пра гарэлку пішуць і наркотыкі. Маўляў, якая гэта рэ-

валюцыя? П'яныя і наркаманы пайшлі на барыкады. Хлусня! Усе шчыра прыйшлі паміраць. Мы ведалі, што гэтая машына перамолвала людзей у пясок семдзесят гадоў... ніхто не думаў, што яна так лёгка зламаецца... Без вялікай крыві... Чуткі: мост замінавалі, хутка пусцяць газ. Хтосьці са студэнтаў медычнага інстытута тлумачыць, як паводзіць сябе пры газавай атацы. Абстаноўка мянялася кожныя паўгадзіны. Страшная навіна: трое хлопцаў загінулі пад танкам... Але ніхто не пахіснуўся, не сышоў з плошчы. Так важна гэта для твайго жыцця, як бы потым усё ні склалася. Колькі б ні было расчаравання. Але гэта мы перажылі... Мы такія — былі! *(Плача.)* Пад раніцу над плошчай: «Ур-ра! Ура!» Зноў мат... слёзы... крыкі... Па ланцужку перадалі: армія перайшла на бок народа, спецназаўцы з атрада «Альфа» адмовіліся ўдзельнічаць у штурме. Танкі сыходзяць са сталіцы... А калі аб'явілі, што путчыстаў арыштавалі, людзі кінуліся абдымаць адно аднаго — гэта было такое шчасце! Наша перамога! Мы адстаялі сваю свабоду. Разам мы гэта змаглі! Значыць, можам! Брудныя, прамоклыя пад дажджом, доўга яшчэ не хацелі разыходзіцца па дамах. Запісвалі адрасы адно аднаго. Кляліся памятаць. Сябраваць. Міліцыянеры ў метро былі вельмі ветлівымі, ніколі ні да таго, ні пасля таго я не бачыла такіх ветлівых міліцыянераў.

Мы перамаглі... Гарбачоў вярнуўся з Фароса ў зусім іншую краіну. Людзі хадзілі па горадзе і ўсміхаліся адно аднаму. Мы перамаглі! Доўга мяне не пакідала гэтае пачуццё... Я таксама хадзіла і згадвала... перад вачыма сцэны... Як нехта крыкнуў: «Танкі! Танкі ідуць!» Усе ўзяліся за рукі і сталі ў ачапленне. Гадзіны дзве ці тры ночы. Мужчына побач са мной дастаў пачак печыва: «Хочаце печыва?» — І ўсе бяруць у яго гэтае печыва. Чамусьці рагочам. Хочацца печыва... хочацца жыць! Але я... дагэтуль... Я шчаслівая, што была там. З мужам, з сябрамі. Тады ўсе былі яшчэ вельмі шчырыя. Шкада нас тых... што мы ўжо не такія... Асабліва раней было шкада.

*На развітанне пытаюся ў іх: як ім удалося захаваць сваё, як я даведалася, яшчэ ўніверсітэцкае сяброўства?*

—У нас умова — не закранаць гэтыя тэмы. Не рабіць адна адной балюча. А калісьці мы спрачаліся, разыходзіліся. Гадамі не размаўлялі адна з адной. Але гэта мінула.

—Сёння мы гаворым толькі пра дзяцей і ўнукаў. Што ў каго на лецішчы расце.

—Збяруцца нашы сябры… Таксама ні слова пра палітыку. Кожны сваім шляхам прыйшоў да гэтага. Жывём разам: спадары і таварышы. «Белыя» і «чырвоныя». Але ніхто ўжо не хоча страляць. Досыць крыві.

## Пра братоў і сясцёр, катаў і ахвяраў… і электарат

*Аляксандр Парфіравіч Шарпіла — пенсіянер, 63 гады*

*З аповеду суседкі Марыны Ціханаўны Ісайчык*

—Чужыя людзі, што вам трэба? Ходзяць і ходзяць. Ну… смерць без прычыны не бывае, прычына заўсёды ёсць. Смерць знойдзе прычыну.

Гарэў чалавек на сваёйградцы з гуркамі… Абліў галаву ацэтонам і падпаліў запалкай. Сяджу, тэлевізар уключыла, чую — крыкі. Старэчы голас… знаёмы… Сашкаў, быццам, голас, і нейкі малады. Ішоў міма студэнт, тэхнікум у нас тут побач, і бачыць — чалавек гарыць. Ну, што ты скажаш! Прыбег, стаў гасіць. Сам абгарэў. Калі я падляцела, Сашка ўжо на зямлі ляжаў, стагнаў… галава жоўтая… Чужыя людзі, ну што вам… Што вам чужая бяда?

Усім на смерць паглядзець ахвота. О-ой! Карацей… карацей… У нашай вёсцы, дзе я ў дзеўках у бацькоў жыла, быў стары, ён любіў прыходзіць і глядзець, як паміраюць. Бабы

сароміл і, гналі яго з хаты: «Ідзі, чорт!», а ён сядзіць. Жыў доўга. Можа, і праўда чорт! Што глядзець? Куды… у які бок? Пасля смерці нічога няма. Памёр — і ўсё, закапалі. А жывы, хай і нешчаслівы, і па ветрыку паходзіць, і па садку. А калі дух выйшаў, няма чалавека, ёсць зямля. Дух — гэта дух, а ўсё астатняе — зямля. Зямля — і ўсё. Адзін у калысцы памірае, іншы да сівізны жыве. Шчаслівыя людзі не хочуць паміраць… і тыя… тыя, каго любяць, таксама не хочуць. Адпрошваюцца. А дзе яны, шчаслівыя людзі? Калісьці казалі, што пасля вайны ўсе шчаслівыя будзем, і Хрушчоў, памятаю, абяцаў… што хутка камунізм надыдзе. Гарбачоў кляўся, так прыгожа казаў… складна. Цяпер Ельцын клянецца, на рэйкі пагражаў легчы… Чакала і чакала я добрага жыцця. Малая чакала… і калі вырасла… Цяпер ужо старая… Калі коратка, усе падманулі, жыццё яшчэ горшае стала. Пачакай-пацярпі ды пачакай-пацярпі. Пачакай-пацярпі… Муж сканаў. Выйшаў на вуліцу, упаў і ўсё — сэрца спынілася. Ні метрам не перамераць, ні на вагах не пераважыць, колькі мы ўсяго перажылі. А вось — жыву. Жыву. Дзеці раз'ехаліся: сын — у Новасібірску, а дачка ў Рызе з сям'ёй засталася, цяпер, лічы, за мяжой. На чужыне. Там па-руску ўжо не гавораць.

Абразок у куце ў мяне, і сабачку трымаю, каб было з кім пагаварыць. Адна галавешка і ўночы не гарыць, а я стараюся. Во-о-о… Добра, што Бог даў чалавеку і сабаку, і ката… і дрэва, і птушку… Даў для таго Ён гэта ўсё, каб чалавек радаваўся і жыццё не здалося яму доўгім. Не надакучыла. А мне адно, што не апрыкрала, — глядзець, як пшаніца спее. Нагаладалася я за сваё жыццё так, што больш за ўсё люблю, як збажына каласуе, калышацца. Мне гэта — як вам карціна ў музеі… І цяпер не ганюся за белай булкай, а смачней за ўсё чорны пасолены хлеб з салодкай гарбатай. Пачакай-пацярпі… ды пачакай-пацярпі… Ад усякага болю адзіны ў нас сродак — цярпенне. Так і жыццё прайшло. Вось і Сашка… наш Парфіравіч… Цярпеў, цярпеў, ды не выцерпеў. Прытаміўся чалавек. Гэта целу

ў зямлі ляжаць, а душы адказваць ісці. *(Выцірае слёзы.)* Во як! Тут плачам… і калі сыходзім, таксама плачам…

Зноў людзі сталі ў Бога верыць, бо няма іншай надзеі. А калісьці мы ў школе вучылі, што Ленін — бог, і Карл Маркс — бог… Збожжа ў храмы ссыпалі, буракі звозілі. Так было, пакуль вайна не пачалася. Пачалася вайна… Сталін цэрквы адкрыў, каб малітвы спраўлялі за перамогу рускай брані, і звярнуўся да народа: «Браты і сёстры… сябры мае…» А да таго — хто мы былі? Ворагі народа… кулакі і падкулачнікі… У нас у вёсцы ўсе заможныя сем'і раскулачылі; калі два кані і дзве каровы ў двары — гэта ўжо кулакі. У Сібір іх вывозілі, кідалі там у голы таёжны лес… Бабы душылі сваіх дзяцей, каб тыя не мучыліся. Ой, гора… слёз чалавечых… было больш, чым на зямлі вады. А тут Сталін папрасіў: «Браты і сёстры…» Паверылі яму. Даравалі. І Гітлера перамаглі! А Гітлер у брані да нас прыйшоў… у жалезе… Усё адно перамаглі! А цяпер — хто я? Мы? Электарат… Я тэлевізар гляджу. Навіны не прапускаю… Цяпер мы — электарат. Наша справа — пайсці прагаласаваць правільна — і канец. Я раз хварэла, не пайшла на ўчастак, дык яны самі да мяне прыехалі на машыне. З чырвонай скрыначкай. У гэты дзень пра нас успамінаюць… Та-а-ак…

Як жывём, так і паміраем… Я і ў царкву хаджу, і крыжык нашу, а шчасця як не было, так і няма. Не сабрала я шчасця. І ўжо не дапросішся. Хутчэй бы памерці… Хутчэй бы царства нябеснае, надакучыла цярпець. Так і Сашка… Ляжыць цяпер на могілках… адпачывае… *(Перахрысцілася.)* З музыкай пахавалі, са слязамі. Усе плакалі. У гэты дзень шмат плачуць. Шкадуюць. А чаго каяцца? Пасля смерці хто пачуе? Засталося: два пакойчыкі ў бараку, адна градка, чырвоныя граматы і медаль «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва». У мяне такі ж медалёк у шафе ляжыць. І стаханаўкай была, і дэпутатам. Паесці не заўсёды хапала, а чырвоную грамату дадуць. Сфатаграфуюць. Нас тут тры сям'і ў гэтым бараку. Пасяліліся маладымі, думалі — на год-два, а пражылі ўсё жыццё. У бараку і памром.

Хто дваццаць, хто трыццаць гадоў… стаялі ў чарзе на кватэру, чакалі… Цяпер аб'явіўся Гайдар і смяецца: ідзіце — купляйце. За якія шышы? Грошы нашы прапалі… адна рэформа, другая… абабралі нас! Такую краіну спусцілі ва ўнітаз! У кожнай сям'і — два пакойчыкі, пунька і градка. Аднолькавыя мы. Во зарабілі! Багацеі! Усё жыццё верылі, што калі-небудзь будзем добра жыць. Падман! Вялікі падман! А жыццё… лепш і не ўспамінаць… цярпелі, працавалі і пакутавалі. А цяпер ужо не жывём, а дні праводзім.

Мы з Сашкам з адной вёскі… Тут… пад Брэстам… Бывала, сядзем з ім увечары на лавачцы і ўспамінаем. А пра што яшчэ размаўляць? Добры ён быў чалавек. Не піў, не п'яніца… не-е-е… хоць адзін жыў. Што рабіць адзінокаму мужчыну? Выпіў — паспаў… выпіў… Хаджу па двары. Таўкуся. Хаджу і думаю: зямное жыццё — не ўсяму канец. Смерць — душы прастор… Дзе ён там? Пад канец пра суседзяў падумаў. Не забыўся. Барак стары, адразу пасля вайны збудавалі, дрэва высахла і, як папера, загарэлася б, запалала. У адзін момант! За секунду! Згарэлі б да травы… да пяску… Напісаў цыдулку дзецям: «Гадуйце ўнукаў. Бывайце» — і паклаў на бачнае месца. Пайшоў у гарод… на сваю градку…

Ой-ой! Карацей… карацей… Прыехала «хуткая», на насілкі яго кладуць, а ён гарачыцца, падымаецца, хоча сам ісці. «Ты што, Сашка, учыніў?» — праводзіла я яго да самай машыны. «Стаміўся жыць. Сыну пазвані, няхай у бальніцу прыедзе». Ён яшчэ са мной размаўляў… Пінжак абгарэлы, а плячо белае, чыстае. Пяць тысяч рублёў пакінуў… Некалі вялікія грошы! Зняў з ашчаднай кніжкі і на стол паклаў побач з цыдулкай. Усё жыццё збіраў. Да перабудовы за такія грошы можна было купіць машыну «Волгу». Самую дарагую! А цяпер? Хапіла на новыя чаравікі і вянок. Во як! Ляжаў на насілках і чарнеў… чарнеў на маіх вачах… Забралі дактары і таго хлопца, які яго ратаваў, хапаў з вяроўкі мокрыя мае прасціны (я днём памыла) і кідаў на яго. Чужы хлопец… студэнт… праходзіў

міма і бачыць — чалавек гарыць! Сядзіць на градцы, згорбіўся і гарыць. Дым ідзе. Маўчыць! Так потым ён нам і расказваў: «Маўчыць і гарыць». Жывы чалавек… Раніцай яго сын да мяне пагрукаўся ў дзверы: «Тата памёр». У труне ляжаў… галава ўся спаленая і рукі… Чорны… чорны… Рукі ў яго былі залатыя! Усё ўмеў. І за сталяра, і за муляра. Тут у кожнага пра яго памяць засталася — у каго стол, у каго кніжныя паліцы… этажэрачкі… Да ночы, бывала, стаіць у двары і габлюе, як цяпер бачу — стаіць і габлюе. Любіў дрэва. Пазнаваў дрэва на пах, з габлюшкі. Кожнае дрэва, казаў, па-свойму пахне, самы моцны пах у хвоі: «Сасна — як добрая гарбата пахне, а ў клёна вясёлы пах». Да апошняга дня працаваў. Слушная прымаўка: пакуль цэп у руках, дык і хлеб у зубах. На пенсію ніяк цяпер не пражыць. Я сама ў нянькі нанялася, чужых дзяцей няньчу. Капейку дадуць, дык і цукрыку набуду, і доктарскай каўбаскі. А што наша пенсія? Купіш хлеб і малако, а тапачкі на лета ўжо не купіш. Не хопіць. Старыя раней сядзелі на лавачцы ў двары бесклапотна. Гаманілі. А цяпер не… Хто пустыя пляшкі па горадзе збірае, хто каля царквы стаіць… у людзей просіць… Хто семкамі або цыгарэтамі на аўтобусным прыпынку гандлюе. Талонамі на гарэлку. У нас затапталі ў вінным аддзеле чалавека. Да смерці. Гарэлка цяпер даражэй за гэты… як яго? Ну гэты — амерыканскі долар. За гарэлку ў нас усё купіш. І сантэхнік прыйдзе, і электрык. А так — не дагукаешся. Карацей… карацей… Жыццё прайшло… Адно што час ні за якія грошы не купіш. Плач перад Богам ці не плач, не дакупішся. Так задумана.

А Сашка сам не захацеў жыць. Адмовіўся. Сам вярнуў Богу білецік… Ой, Бо-о-жа! Ездзіць і ездзіць цяпер міліцыя. Распытваюць… *(Прыслухалася.)* Во-о-о… Цягнік гудзе… Гэта маскоўскі — Брэст–Масква. Мне і гадзінніка не трэба. Падымаюся, калі варшаўскі крыкне — а шостай раніцы. А там мінскі, першы маскоўскі… Раніцай і ноччу яны рознымі галасамі крычаць. Бывае, усю ноч слухаю. Пад старасць сон адлятае…

З кім мне цяпер размаўляць? Цяпер адна на лавачцы сяджу... Я яго суцяшала: «Сашка, знайдзі добрую жанчыну. Жаніся». — «Лізка вернецца. Буду чакаць». Я сем гадоў яе не бачыла, як яна ад яго сышла. З афіцэрам нейкім звязалася. Маладая... на шмат гадоў за яго маладзейшая была. Кахаў ён яе моцна. Білася аб труну галавой: «Гэта я Сашку жыццё паламала». Ой-ой! Карацей... Любоў — не валасіна, хутка не вырвеш. І крыжам каханне не звяжаш. Чаго потым плакаць? Хто цябе пачуе з-пад зямлі... *(Маўчыць.)* Ой, Бо-о-жа! Да сарака гадоў можна ўсё рабіць, і грашыць можна. А пасля сарака трэба каяцца. Тады Бог даруе.

*(Смяецца.)* Усё пішаш? Ну, пішы-пішы. Я яшчэ раскажу... У мяне гора не адзін мех... *(Паглядзела ўгору.)* В-о-о... Ластаўкі прыляцелі... Цёпла будзе. Праўду кажучы, да мяне адзін раз ужо прыходзіў карэспандэнт... Пра вайну распытваў... Я апошняе з двара вынесу, толькі б вайны не было. Страшнейшага за вайну нічога няма! Пад нямецкімі кулямётамі стаім, а нашы хаты трашчаць ад агню. Гараць і садочкі. Ой-ой! З Сашкам мы вайну кожны дзень успаміналі... У яго бацька знік без вестак, а брат у партызанах загінуў. Сагналі ў Брэст палонных — мора людзей! Іх гналі па дарогах, як коней, трымалі ў загародках, паміралі яны і валяліся, як смецце. Усё лета Сашка хадзіў і шукаў там з мамай свайго бацьку... Пачне мне распавядаць... і не можа спыніцца... Шукалі яны сярод мёртвых, шукалі сярод жывых. Ніхто ўжо смерці не баяўся, смерць звычайная стала рэч. Да вайны спявалі: «Ад тайгі да турэцкай бахчы / Чырвоную армію не перамагчы...». З гонарам мы спявалі! Увесну лёд растаў... скрануўся... Уся рака за нашай вёскай была забітая трупамі: голыя, счарнелыя, толькі рамяні на поясе блішчаць. Рамяні з чырвонымі зорачкамі. Няма мора без вады, а вайны — без крыві. Бог дае жыццё, а ў вайну яго забірае хто хочаш... *(Плача.)* Хаджу-хаджу па двары. Таўкуся. І падасца, што Сашка за спінай стаіць. І голас яго пачую. Азірнуся — нікога. Карацей... карацей... Што ты, Сашка, учыніў?

Такую пакуту выбраў! Ну, можа, адно: на зямлі гарэў, дык на небе не будзе. Адпакутаваў. Недзе ж захоўваюцца ўсе нашы слёзы... Як там яго сустрэнуць? Калекі па зямлі поўзаюць, спаралізаваныя ляжаць, нямыя жывуць. Не нам вырашаць... не наша воля... *(Хрысціцца.)*

Давеку я вайну не забуду... Немцы ўвайшлі ў вёску... Маладыя, вясёлыя. І такі быў гул! Яны заехалі на вялікіх-вялікіх машынах, і матацыклы ў іх былі на трох колах. А я датуль ні разу не бачыла матацыкла. Машыны ў калгасе былі палутаркі, з драўлянымі бартамі, нізенькія машыны. А гэтыя! Як дом! Я ўбачыла іх коней, не конь, а гара. На школе яны напісалі фарбай: «Чырвоная армія вас кінула!». Пачаўся нямецкі парадак... У нас жыло шмат габрэяў: Абрам, Янкель, Мордух... Іх сабралі і павезлі ў мястэчка. Яны былі з падушкамі, коўдрамі, а іх адразу ўсіх пабілі. Сабралі з усяго раёна і пастралялі за адзін дзень. Звалілі ў яму... Тысячы... тысячы людзей... Расказвалі, што трое сутак кроў ішла наверх... Зямля дыхала... жывая была зямля... На тым месцы цяпер парк. Зона адпачынку. З магілы голасу няма. Ніхто не крыкне... Та-а-ак... Я думаю так... *(Плача.)*

Не ведаю... як яно было? Самі яны прыбіліся да яе, ці яна іх у лесе знайшла? Суседка наша хавала ў пуні двух габрэйскіх хлопчыкаў, прыгожых-прыгожых. Анёлкі! Усіх расстралялі, а яны схаваліся. Уцяклі. Аднаму — восем, а другому — дзесяць гадоў. І наша мама ім малако насіла... «Дзеці, ні-ні... — прасіла яна нас. — Нікому ні слова». А ў той сям'і быў стары-стары дзед, яшчэ тую вайну з немцамі памятаў... Першую... Ён іх корміць і плача: «Ой, дзеткі, зловяць вас і будуць мучыць. Змог бы, дык лепей я сам вас забіў бы». Такія словы... А чорт усё чуе... *(Хрысціцца.)* Прыехалі тры немцы на чорным матацыкле з вялікім чорным сабакам. Хтосьці данёс... Заўсёды ёсць такія людзі, у іх душа чорная. Жывуць яны... як без душы... і сэрца ў іх медыцынскае, а не чалавечае. Нікога ім не шкада. Хлопчыкі пабеглі ў поле... у жыта... Нем-

цы нацкавалі на іх сабаку… Збіралі людзі іх потым па шматку… па анучцы… Не было чаго хаваць, і ніхто не ведаў, пад якім прозвішчам? Суседку немцы прывязалі да матацыкла, яна бегла, пакуль сэрца не разарвалася… *(Ужо й не выцірае слёзы.)* У вайну чалавек чалавека баяўся. І свайго, і чужога. Скажаш удзень — птушкі пачуюць, скажаш ноччу — мышы пачуюць. Мама вучыла нас малітвам. Без Бога цябе і чарвяк праглыне.

На Дзявятага мая… у наша свята… Вып'ем з Сашкам па шкляначцы… паплачам… Цяжка слёзы глытаць… Карацей… карацей… У дзесяць гадоў застаўся ён у сям'і і за бацьку, і за брата. А мне, калі скончылася вайна, споўнілася шаснаццаць гадоў. Пайшла працаваць на цэментавы завод. Трэба маме дапамагаць. Цягалі мяхі з цэментам па пяцьдзясят кіляў, грузілі на бартавую машыну пясок, друз, арматуру. А я хацела вучыцца… Баранавалі і аралі на карове… карова раўла ад такой работы… А што елі? Што елі? Жалуды таўклі, шышкі ў лесе збіралі. Усё адно марыла… Усю вайну марыла: скончу школу, буду настаўніцай. Апошні дзень вайны… Было цёпла-цёпла… мы з мамай пайшлі ў поле… Прыскакаў на кавалерыйскім кані міліцыянер: «Перамога! Немцы падпісалі капітуляцыю!» Скакаў па палях і ўсім крычаў: «Перамога! Перамога!» Людзі беглі ў вёску. Крычалі, плакалі, мацюкаліся. Больш за ўсё плакалі. А назаўтра сталі думаць: як далей жыць? У хатах — пуста, у адрынах — вецер. Конаўкі, зробленыя з кансерваных бляшанак… бляшанкі пасля нямецкіх салдат засталіся… Свечкі са страляных гільзаў. Пра соль за вайну забыліся, хадзілі, і ва ўсіх косткі гнуліся. Немцы, калі адступалі, парсюка ў нас забралі, апошніх курэй палавілі. А перад тым партызаны ноччу кароўку звялі… Кароўку мама не аддавала, дык адзін партызан стрэліў угору. У страху. Склалі ў мех яны і швейную машынку, і маміны сукенкі. Ці партызаны то былі, ці бандыты? Са зброяй… Карацей… карацей… Чалавек жыць заўсёды хоча, і ў вайну таксама. У вайну шмат чаго спазнаеш… Няма

звера горшага за чалавека. Гэта чалавек чалавека забівае, а не куля. Чалавек чалавека… Мі-і-лая ты мая!

Паклікала мама варажбітку… Варажбітка наваражыла: «Усё будзе добра». А нам няма чаго ёй даць. Мама знайшла два буракі ў склепе і была радая. І варажбітка радая. Паехала я паступаць, як марыла, у педвучылішча. Там трэба было запоўніць анкету… Усё я напісала і дайшла да пытання: ці былі вы ці вашы сваякі ў палоне або пад акупацыяй? Я адказала — так, вядома, былі. Дырэктар вучылішча паклікаў мяне ў кабінет: «Дзяўчынка, забяры свае дакументы». Быў ён франтавік, без адной рукі. З пустым рукавом. Так я даведалася, што мы… усе, хто быў пад акупацыяй… нядобранадзейныя. Пад падазрэннем. Ужо ніхто не казаў нам «браты і сёстры»… Праз сорак гадоў толькі гэтую анкету адмянілі. Сорак гадоў! Жыццё маё скончылася, пакуль адмянілі. «А хто нас пад немцамі пакінуў?» — «Ціха, дзяўчынка, ціха…» — дырэктар зачыніў дзверы, каб ніхто не чуў. «Ціха… ціха…» Як ты лёс аб'едзеш? Сярпом ваду рэзаць… А Сашка паступаў у вайсковае вучылішча… Напісаў у анкеце, што сям'я іх была пад акупацыяй, а бацька прапаў без вестак. Яго адразу адлічылі… *(Маўчыць.)* Нічога, што я вам і пра сябе, і сваё жыццё апісваю? Мы ўсе аднолькава жылі. Каб мяне толькі не пасадзілі за гэтую размову. Ці ёсць яшчэ савецкая ўлада ці ўжо зусім яе няма?

За горам і дабро забылася… Як маладыя мы былі і кахаліся. Я на Сашкавым вяселлі гуляла… Любіў ён Лізку, доўга заляцаўся. Прападаў за ёй! Белы вэлюм на вяселле з Мінска прывёз. Занёс нявесту ў барак на руках… Старыя нашы звычаі… Жаніх нясе нявесту на руках, як дзіця, каб дамавік не ўсачыў. Не прыкмеціў. Дамавік чужых не любіць, праганяе. Ён жа ў доме гаспадар, трэба яму спадабацца. А-а-а… *(Махнула рукою.)* Цяпер ужо ні ў што не вераць. Ні ў дамавіка, ні ў камунізм. Жывуць людзі без усялякай веры! Ну можа, у каханне яшчэ вераць… «Горка! Горка!» — крычалі мы ў Сашкі за сталом. А як тады пілі? Адна пляшка на ўвесь

стол, на дзесяць чалавек... Цяпер на кожнага пляшку стаў. Кароўку трэба прадаць, каб сыну ці дачцэ вяселле справіць. Кахаў ён Лізку... Але сэрцам не завабіш, і за вушы не прыцягнеш. Карацей... карацей... Гуляла яна, як котка. Дзеці выраслі, зусім ад яго сышла. Не азірнулася. Я яму раіла: «Сашка, знайдзі добрую жанчыну. Сап'ешся». — «Шкляначку налью. Фігурнае катанне пагляджу і спаць кладуся». Аднаму спаць — і коўдра не грэе. І ў раі моташна аднаму. Піў, але не запіваў. Не... не запіваў, як іншыя. О! Тут у нас адзін сусед... ён і адэкалон «Гваздзіка» п'е, і ласьён, і дэнатурат, і мыйныя сродкі... І трэба ж — жывы! Цяпер пляшка гарэлкі каштуе, як раней паліто. А закуска? Паўкілі каўбасы — палова маёй пенсіі. Піце свабоду! Ешце свабоду! Такую краіну здалі! Дзяржаву! Без адзінага стрэлу... Я аднаго не разумею, чаму ў нас ніхто не спытаўся? Я ўсё жыццё вялікую краіну будавала. Так нам казалі. Абяцалі.

Я і лес валіла, і шпалы на сабе цягала... Ездзілі мы з мужам у Сібір. На камуністычную будоўлю. Памятаю рэкі: Енісей, Біруса, Мана... Будавалі чыгунку Абакан—Тайшэт. Везлі нас туды ў таварных вагонах: два ярусы пазбіваных нараў, ні матрацаў, ні бялізны, пад галаву — кулак. У падлозе — дзірка... Для вялікай патрэбы вядро (завешвалі яго прасцінай). Стане цягнік у полі, награбем сена: наша пасцель! Святла ў вагонах не было. Але ўсю дарогу спявалі камсамольскія песні! Дзерлі горла. Сем дзён ехалі... Прыбылі! Глухая тайга, снегу — у чалавечы рост. Хутка пачалася цынга, кожны зуб хістаўся. Вошы. А норма — ого! Мужчыны, хто паляўнічыя, хадзілі на мядзведзя. Тады ў нас з'яўлялася мяса ў катлах, а то — каша і каша. Я запомніла, што мядзведзя б'юць толькі ў вока. Жылі ў бараках — ні душа, ні лазні. Улетку ездзілі ў горад і ў фантане мыліся. *(Смяецца.)* Хочаш слухаць, дадам яшчэ...

Забылася расказаць, як я замуж выйшла... Мне васямнаццаць гадоў. Ужо гэта я працавала на цагельні. Цэментавы завод закрылі, і я пайшла на цагельню. Спачатку была

гліншчыцай. У той час гліну капалі ўручную, рыдлёўкамі... Мы разгружалі машыны і складалі гліну ў двары роўным пластом, каб яна «даспявала». Праз паўгода ўжо катала нагружаныя ваганеткі ад прэса да печы: туды — з сырымі цаглінамі, а назад — з абпаленымі, гарачымі. Цэглу мы самі даставалі з печы... Шалёная тэмпература! За змену — чатыры-шэсць тысяч цаглін выцягнеш. Да дваццаці тон. Працавалі адны жанчыны... і дзяўчаты... Былі і хлопцы, але хлопцы, у асноўным, на машынах. За рулём. Стаў адзін да мяне заляцацца... Падыдзе, засмяецца... і пакладзе руку мне на плячо... Аднойчы кажа: «Паедзеш са мной?» — «Паеду». Нават не спытала — куды. Так мы завербаваліся ў Сібір. Камунізм будаваць! *(Маўчыць.)* А цяпер... ох! Карацей... карацей... Усё дарэмна... дарэмна пакутавалі... Гэта цяжка прызнаць і цяжка з гэтым жыць. Столькі працавалі! Будавалі. Усё рукамі. Час суровы! Я на цагельні працавала... Адзін раз праспала. Пасля вайны за спазненне на працу... на дзесяць хвілін спазніўся — турма. Уратаваў брыгадзір: «Скажаш, што я цябе ў кар'ер пасылаў...» Калі б хто данёс, дык і яго судзілі б. Пасля пяцьдзясят трэцяга ўжо за спазненне не каралі. Пасля смерці Сталіна людзі сталі ўсміхацца, а да таго асцярожна жылі. Без усмешкі.

А... што цяпер успамінаць? Цвікі на пажарышчы збіраць. Усё згарэла! Усё наша жыццё... усё наша прапала... Будавалі... будавалі... Сашка на цаліну ездзіў. Там камунізм будаваў! Светлую будучыню. Казаў, што ў намётах зімой спалі, без спальных мяхоў. У сваёй вопратцы. Рукі там сабе адмарозіў... Але ўсё адно ганарыўся! «Уецца дарога глінная, / Вось і зямля цалінная!» Быў у яго партбілет, чырвоная кніжачка з Леніным, дарагая яму. Дэпутат і стаханавец, як і я. Прайшло жыццё, праляцела. Следу няма, ужо не знойдзеш... Учора тры гадзіны стаяла ў чарзе па малако — і мне не хапіла. Нямецкую пасылку ў дом прынеслі з падарункамі: крупы, шакалад, мыла... Пераможцам — ад пераможаных. Мне

нямецкай пасылкі не трэба. Не-е-е… не ўзяла. *(Перахрысцілася.)* Немцы з сабакамі… на сабаках поўсць бліскае… Ідуць па лесе, а мы — у балоце. У вадзе па горла. Бабы, дзеткі. І каровы стаяць разам з людзьмі. Маўчаць. Каровы, як людзі, маўчаць. Усё разумеюць. Не хачу я нямецкіх цукерак і нямецкага печыва! Дзе — маё? Мая праца? Мы так верылі! Верылі, што калі-небудзь будзе добрае жыццё. Пачакай-пацярпі… так, пачакай-пацярпі… Усё жыццё па казармах, па інтэрнатах, па бараках.

Ну што ты зробіш? Так і быць… Усё можна перажыць, акрамя смерці. Смерць не перажывеш… Трыццаць гадоў Сашка на мэблевай фабрыцы адбарабаніў. Нагарбаціўся. Год таму праводзілі яго на пенсію. Гадзіннік падаравалі. Але без працы ён не застаўся. Людзі ішлі й ішлі з замовамі. Та-а-ак… А ўсё адно быў невясёлы. Сумны. Галіцца перастаў. Трыццаць гадоў на адной фабрыцы, лічы, паўжыцця! Там ужо дом родны. З фабрыкі яму і труну прывезлі. Багатую труну! Уся блішчала, а знутры ў аксаміце. У такіх цяпер толькі бандытаў хаваюць і генералаў. Усе рукамі мацалі — дзіва! Калі з барака труну выносілі, пасыпалі зерне на парог. Так трэба, каб жывым было лягчэй заставацца. Нашы старыя звычаі… Паставілі труну ў двары… Хтосьці са сваякоў папрасіў: «Людзі добрыя, даруйце». — «Бог даруе», — адказвалі ўсе. А што дараваць? Жылі дружна, адной сям'ёй. У цябе няма — я дам, у мяне скончылася — ты прынясеш. Любілі нашы святы. Будавалі сацыялізм, а цяпер перадаюць, што сацыялізм скончыўся. А мы… а мы засталіся…

Цягнікі грукочуць… грукочуць… Чужыя людзі, што вам трэба? Што? Аднолькавай смерці няма… Я першага сына ў Сібіры нарадзіла, дыфтэрыт хоп — і задушыў. Усё адно жыву. Учора да Сашкі на магілку збегала, пасядзела з ім. Распавяла, як Лізка плакала. Білася аб труну галавою. Каханне гадкоў не лічыць…

Памром… і ўсё добра будзе…

## Пра шэпт і крык… і экстаз

*Маргарыта Паграбіцкая — доктар, 57 гадоў*

—Маё свята… Сёмага лістапада… Вялікае, яркае… Найярчэйшае ўражанне майго дзяцінства — вайсковы парад на Чырвонай плошчы…

Я ў таты на плячах, а да рукі ў мяне прывязаны чырвоны шарык. У небе над калонамі аграмадныя партрэты Леніна і Сталіна… Маркса… гірлянды і букеты з чырвоных, блакітных, жоўтых шарыкаў. Чырвоны колер. Улюбёны, найлюбімы. Колер рэвалюцыі, колер пралітай у імя яе крыві… Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя! Гэта цяпер: ваенны пераварот… бальшавіцкая змова… руская катастрофа… Ленін — нямецкі агент, а рэвалюцыю зрабілі дэзерціры і абпітая матрасня. Я затыкаю вушы, не хачу чуць! Не маю сілы… Усё жыццё я пражыла з верай: мы самыя шчаслівыя, нарадзіліся ў небывалай і цудоўнай краіне. Іншай такой краіны няма! Мы маем Чырвоную плошчу, там на Спаскай вежы б'юць куранты, па якіх звяраюць час ва ўсім свеце. Так казаў мне тата… і мама, і бабуля… «Дзень сёмага лістапада — чырвоны дзень календара…» Перад гэтым мы доўга не клаліся спаць, усёй сям'ёй рабілі кветкі з жамканай паперы, вырэзвалі з кардону сэрцайкі. Размалёўвалі. Раніцай мама і бабуля заставаліся дома, гатавалі святочны абед. Госці ў гэты дзень прыходзілі абавязкова. Яны прыносілі ў сетцы кардонку з тортам і віно… цэлафанавых пакетаў тады яшчэ не было… Бабуля пякла свае знакамітыя піражкі з капустай і грыбамі, а мама чаравала над салатай «аліўе» і варыла неадменнае халоднае. А я — з татам!

На вуліцы шмат людзей, на паліто і пінжаках ва ўсіх чырвоныя стужачкі. Лунаюць чырвоныя палотнішчы, грае вайсковы духавы аркестр. Трыбуна з нашымі правадырамі… І песня: «Сталіца свету, родная сталіца, / Ты ззяеш зоркамі Крамля, / Увесь сусвет табою ганарыцца, / Прыгожая гранітная Маск-

ва...» Хацелася ўвесь час крычаць «Ура!». З рэпрадуктара: «Слава працаўнікам Маскоўскага двойчы ордэна Леніна і Чырвонага Сцяга завода імя Ліхачова! Ура, таварышы!» — «Ура! Ура!» — «Слава нашаму гераічнаму Ленінскаму камсамолу... Камуністычнай партыі... Нашым слаўным ветэранам...» — «Ур-ра! Ура!» Прыгажосць! Экстаз! Людзі плакалі, радасць перапаўняла... Духавы аркестр іграў маршы і рэвалюцыйныя песні: «Ёсць загад яму на захад, / Ёй ва ўсходню старану. / Ад'язджалі камсамольцы / На цывільную вайну». Я памятаю словы ўсіх песень напамяць, я нічога не забыла, часта іх спяваю. Спяваю сама сабе. *(Ціха напявае.)* «Ты шырокая, мая Радзіма, / Маеш шмат лясоў, палёў і рэк. / Іншай я не ведаю краіны, / Дзе б так вольна дыхаў чалавек». Нядаўна знайшла ў шафе старыя кружэлкі, зняла з антрэсоляў патэфон, увесь вечар прамінуў ва ўспамінах. Песні Дунаеўскага і Лебедзева-Кумача — як мы іх любілі! *(Маўчыць.)* І вось я высока-высока. Гэта тата падымае мяне на руках... вышэй, яшчэ вышэй... Надыходзіць самы важны момант — зараз з'явяцца і загрымяць па бруку магутныя цягачы з зачахлёнымі ракетамі, танкі, і рушыць артылерыя. «Запомні гэта на ўсё жыццё!» — імкнецца перакрычаць грукат тата. І я ведаю, што запомню! А па дарозе дадому мы зойдзем у краму, і я атрымаю сваё ўлюбёнае сітро «Бураціна». У гэты дзень мне дазвалялася ўсё: свістулькі, цукровыя пеўнікі на палачках...

Я любіла начную Маскву... гэтыя агні... Калі мне было ўжо васямнаццаць гадоў... васямнаццаць гадоў! — я закахалася. Калі зразумела, што закаханая, я паехала, ні за што не здагадаецеся, куды я паехала. Я паехала на Чырвоную плошчу, першае, што я захацела, — быць у гэтыя хвіліны на Чырвонай плошчы. Крамлёўская сцяна, чорныя елкі ў снезе і засыпаны гурбамі Аляксандраўскі сад. Я глядзела на ўсё гэта і ведала, што буду шчаслівая. Абавязкова буду!

А нядаўна мы з мужам былі ў Маскве. І ўпершыню... Упершыню не пайшлі на Чырвоную плошчу. Не пакланіліся.

Упершыню... *(На вачах слёзы.)* Муж у мяне армянін, ажаніліся мы студэнтамі. У яго коўдра, а ў мяне раскладушка — так мы пачыналі жыць. Пасля заканчэння Маскоўскага медінстытута атрымалі размеркаванне ў Мінск. Усе мае сяброўкі раз'ехаліся хто куды: адна — у Малдавію, другая — на Украіну, хтосьці ў Іркуцк. Тых, хто паехаў у Іркуцк, мы звалі «дзекабрысткамі». Краіна адна — едзь куды хочаш! Ніякіх межаў тады не было, як віз і мытняў. Муж хацеў вярнуцца на Радзіму. У Арменію. «Паедзем на Севан, убачыш Арарат. Пакаштуеш сапраўдны армянскі лаваш», — абяцаў ён мне. Але прапанавалі — Мінск. І мы: «Давай у Беларусь!» — «Давай!» Гэта ж маладосць, наперадзе яшчэ столькі часу — здаецца, яго на ўсё хопіць. Прыехалі ў Мінск, і тут нам спадабалася. Едзеш і едзеш: азёры і лясы, партызанскія лясы, балоты і пушчы, рэдкія палі сярод гэтых лясоў. Нашы дзеці тут выраслі, у іх улюбёныя стравы — дранікі, беларуская мачанка. «Бульбу смажаць, бульбу вараць...» Армянскі хаш на другім месцы... Але кожны год усёй сям'ёй мы ездзілі ў Маскву. Як жа! Без гэтага я не магла жыць, я павінна была пахадзіць па Маскве. Падыхаць яе паветрам. Чакала... Заўсёды нецярпліва чакала гэтых першых хвілін, калі цягнік падыходзіў да Беларускага вакзала, гучаў марш, і сэрца падскоквала ад слоў: «Таварышы пасажыры, наш цягнік прыбыў у сталіцу нашай Радзімы — горад-герой Маскву!» «Кіпучая, магутная, нікім не пакананая, Масква мая, зямля мая, ты самая каханая...» Выходзіш з вагона пад гэтую музыку.

Што... Дзе мы? Нас сустрэў чужы, незнаёмы горад... Вецер насіў па вуліцах брудныя абгорткі, абрыўкі газет, пад нагамі грымелі бляшанкі з-пад піва. На вакзале... і ў метро... Паўсюль шэрыя шнуры людзей, усе нешта прадавалі: жаночую бялізну і прасціны, стары абутак і дзіцячыя цацкі, цыгарэты можна было купіць ураздроб. Як у фільмах пра вайну. Я толькі там гэта бачыла. На нейкіх ірваных паперах, кардонных скрынках проста на зямлі ляжалі каўбаса, мяса, рыба. У адным месцы прыкрытае рваным цэлафанам, а ў іншым — не. І масквічы

гэта куплялі. Таргаваліся. Вязаныя шкарпэткі, сурвэткі. Тут цвікі, і тутсама ежа, адзенне. Гаворка ўкраінская, беларуская, малдаўская… «Мы з Вінніцы прыехалі…» — «А мы — з Брэста…» Шмат жабракоў… Адкуль іх столькі? Калекі… Як у кіно… У мяне адно параўнанне — як у старым савецкім кіно. Нібыта я фільм глядзела…

На Старым Арбаце, улюбёным маім Арбаце, я ўбачыла гандлёвыя шэрагі — з матрошкамі, самаварамі, абразамі, фотаздымкамі цара і яго сям'і. Партрэты белагвардзейскіх генералаў — Калчака, Дзянікіна і бюст Леніна… Матрошкі ўсякіх відаў — «горбіматрошкі» і «ельцынаматрошкі». Я не пазнавала сваю Маскву. Што гэта за горад? Проста на асфальце, на нейкіх цаглінах сядзеў стары і граў на акардэоне. З ордэнамі на грудзях. Спяваў ён ваенныя песні, каля ног — шапка з манеткамі. Песні нашы ўлюбёныя: «Б'ецца ў цеснай пячурцы агонь, / На паленах смала, як сляза…». Захацелася падысці… але яго ўжо атачылі замежнікі… сталі фатаграфавацца. Нешта яму крычалі па-італьянску, па-французску і па-нямецку. Пляскалі па плячы: «Давай! Давай!» Ім было весела, яны былі задаволеныя. Як жа! Так нас баяліся… а цяпер… Вось! Купа хлуду… Імперыя — пшык! Побач з матрошкамі і самаварамі гарой наваленыя чырвоныя сцягі і вымпелы, партыйныя і камсамольскія білеты. І баявыя савецкія ўзнагароды! Ордэны Леніна і Чырвонага Сцяга. Медалі! «За адвагу» і «За баявыя заслугі». Кранаю іх… гладжу… Не веру! Не веру! «За абарону Севастопаля» і «За абарону Каўказа». Усё сапраўднае. Роднае. Савецкая вайсковая форма: мундзіры, шынялі… фуражкі з зорачкамі… А цэны — у доларах… «Колькі?» — спытаў муж і паказаў на медаль «За адвагу». — «За дваццаць долараў прадам. А, ладна, давай "штуку" — тысячу рублёў». — «А ордэн Леніна?» — «Сто долараў…» — «А сумленне?!» — Мой муж гатовы быў у бойку кінуцца. — «Ты што, ненармальны? З якой дзіры вылез? Прадметы эпохі таталітарызму». Так і сказаў… Маўляў, гэта ўжо «жалезкі», але замежнікам падабаюцца, у іх цяпер мода

на савецкую сімволіку. Ходкі тавар. Я закрычала… Паклікала міліцыянера… Я крычала: «Глядзіце! Глядзіце… А-а-а…» Міліцыянер нам пацвердзіў: «Прадметы эпохі таталітарызму… Да адказнасці прыцягваем за наркотыкі і парнаграфію…» А партбілет за дзесяць долараў — не парнаграфія? Ордэн Славы… Ці гэта — чырвоны сцяг з партрэтам Леніна — за долары? Было такое адчуванне, што мы стаім сярод нейкіх дэкарацыяў. З нас вырашылі павесяліцца. Мы кудысьці не туды прыехалі. Я стаяла і плакала. Італьянцы побач прымяралі вайсковыя шынялі і фуражкі з чырвонымі зорачкамі. «Карашо! Карашо!» А-ля рус…

Першы раз я была ў маўзалеі з мамай. Памятаю, што ішоў дождж, халодны восеньскі дождж. Мы прастаялі ў чарзе шэсць гадзін. Прыступкі… паўзмрок… вянкі… Шэпт: «Праходзьце. Не затрымлівайцеся». Праз слёзы я нічога не разгледзела. Але Ленін… мне здалося, што ён свеціцца… Маленькая, я маму пераконвала: «Мама, я ніколі не памру». — «Чаму ты так думаеш? — пыталася мама. — Усе паміраюць. Нават Ленін памёр». Нават Ленін… Я не ведаю, як мне пра ўсё расказаць… А мне трэба… я хачу. Я хацела б гаварыць… гаварыць, але не ведаю з кім. Пра што? Пра тое, якія мы былі неймаверна шчаслівыя! Цяпер я ў гэтым абсалютна ўпэўненая. Раслі беднымі і наіўнымі, але пра тое не здагадваліся і нікому не зайздросцілі. У школу мы хадзілі з таннымі пеналамі і асадкамі за сорак капеек. Улетку абуеш парусінавыя тапачкі, начысціш іх зубным парашком — прыгожа! Узімку — у гумовых боціках, мароз — падэшвы пячэ. Весела! Верылі, што заўтра будзе лепш, чым сёння, а паслязаўтра лепш, чым учора. У нас была будучыня. І мінуўшчына. Усё ў нас было!

Любілі, бязмежна любілі Радзіму — самую-самую! Першы савецкі аўтамабіль — ура! Непісьменны рабочы вынайшаў сакрэт савецкай нержавейкі — перамога! А пра тое, што гэты сакрэт ужо даўно вядомы ўсяму свету, мы потым даведаліся. А тады: першымі паляцім праз полюс, навучымся кіраваць

паўночным ззяннем... павернем назад гіганцкія рэкі... абводнім вечныя пустыні... Вера! Вера! Вера! Нешта вышэйшае за розум. Я прачыналася пад гукі гімна замест будзільніка: «Саюз непарушны рэспублік свабодных / З'яднала навекі Вялікая Русь...» У школе мы шмат спявалі... Я памятаю нашы песні... *(Напявае.)* «Бацькі летуцелі пра сьветлыя далі. / Ішлі на змаганне не раз. / У бітвах стваралі і Ленін і Сталін / Краіну Саветаў для нас...» Дома ўспаміналі... На наступны дзень, як мяне прынялі ў піянеры, уранку зайграў гімн, я падхапілася і стаяла на ложку, пакуль гімн не скончыўся. Піянерская клятва: «Я... уступаючы ў шэрагі... перад абліччам сваіх таварышаў... урачыста абяцаю: горача любіць сваю Радзіму...» Дома было свята, пахла пірагамі ў мой гонар. З чырвоным гальштукам я не расставалася, мыла і прасавала яго кожнае раніцы, каб ніводнае складачкі. І нават у інстытуце завязвала шалік піянерскім вузлом. Мой камсамольскі білет... ляжыць ён у мяне і цяпер... Дадала сабе лішні год, каб хутчэй уступіць у камсамол. Я любіла вуліцу, там заўсёды працавала радыё... Радыё — гэта было наша жыццё, гэта ўсё. Адчыніш акно — музыка льецца, і такая музыка, што ўстанеш і крокам марш па кватэры. Як на пляцы... Можа, гэта была турма, але мне было ўтульна ў гэтай турме. Так мы прывыклі... Нават у чарзе дагэтуль стаім адно каля аднаго, ушчыльную, каб разам. Вы заўважылі? *(І зноў ціха напявае.)* «Сталін — наша слава баявая, / Сталін — нашых юных мар палёт, / З песнямі заўжды перамагае, / Крочыць наш за Сталіным народ...» І — так! Так! Так! Найвялікшая мара — памерці! Ахвяраваць сабою. Аддаць. Камсамольская клятва: «Гатовая аддаць сваё жыццё, калі яно спатрэбіцца майму народу». І гэта былі не словы, нас так выхавалі насамрэч. Калі па вуліцы ішла калона салдат, усе спыняліся... Пасля Перамогі салдат быў незвычайны чалавек... Калі я ўступала ў партыю, я напісала ў заяве: «З праграмай і статутам азнаёмленая і прызнаю. Гатовая аддаць усе сілы, а калі спатрэбіцца, і жыццё сваёй Радзіме». *(Глядзіць на*

*мяне ўважліва.)* А вы што пра мяне думаеце? Ідыётка, так? Інфантыльная... Мае некаторыя знаёмыя... дык яны адкрыта смяюцца: эмацыйны сацыялізм, папяровыя ідэалы... Так я ў іх вачах выглядаю. Тупая! Даўн! Вы — інжынер чалавечых душ. Хочаце мяне суцешыць? Пісьменнік у нас больш, чым пісьменнік. Настаўнік. Духоўнік. Гэта раней, а цяпер ужо не так. Шмат людзей у цэрквах на службе стаіць. Глыбокіх вернікаў мала, большасць — пакутнікі. Як вось і я... з траўмай... Я не паводле канону веру, а паводле сэрца. Малітваў не ведаю, а малюся... Бацюшка ў нас — былы афіцэр, усё пра армію казанні чытае, пра атамную бомбу. Пра ворагаў Расіі і масонскія змовы. А я іншых слоў хачу, зусім іншых слоў... не гэтых. А вакол толькі гэтыя... Шмат нянавісці... Няма месца, дзе можна душой прытуліцца. Уключу тэлевізар, і там тое самае... Адны праклёны... Усе адмаўляюцца ад таго, што было. Праклінаюць. Мой улюбёны рэжысёр Марк Захараў, цяпер я яго не так люблю і не веру яму так, як раней... ён спаліў, гэта ў тэлевізары паказвалі, свой партбілет... Прынародна. Гэта ж не тэатр! Гэта — жыццё! Маё жыццё. Хіба так можна з ім? З маім жыццём... Не трэба гэтых шоў... *(Плача.)*

Я не паспяваю... З тых я, хто не паспявае... З цягніка, які ляцеў у сацыялізм, усе хутка перасаджваюцца ў цягнік, які імчыць у капіталізм. Я спазняюся... Смяюцца з «саўка»: ён і быдла, ён і лох. З мяне смяюцца... «Чырвоныя» — ужо звяр'ё, а «белыя» — рыцары. Сэрца маё і розум — супраць, на фізіялагічным узроўні не прымаю. Не пускаю ў сябе. Не магу, не здольная... Гарбачова я вітала, хоць крытыкавала... ён быў... цяпер гэта зразумела, як і ўсе мы, ён быў летуценнікам. Пражэкцёрам. Можна сказаць так. Але да Ельцына я была не гатовая... Да рэформаў Гайдара. Грошы зніклі за адзін дзень. Грошы... і наша жыццё... Усё ўмомант абясцэнілася. Замест светлай будучыні пачалі гаварыць: узбагачайцеся, любіце грошы... Пакланяйцеся зверу гэтаму! Увесь народ быў да гэтага не гатовы. Ніхто не марыў пра капіталізм, пра сябе даклад-

на скажу, што я не марыла… Мне падабаўся сацыялізм. Гэта былі ўжо брэжнеўскія гады… вегетарыянскія… Людажэрскіх гадоў я не заспела. Спявала песні Пахмутавай: «Пад крылом самалёта пра штосьці пяе зялёнае мора тайгі…» Рыхтавалася моцна сябраваць і будаваць «блакітныя гарады». Марыць! «Я знаю — горад будзе…», «тут будзе горад-сад…» Любіла Маякоўскага. Патрыятычныя вершы, песні. Гэта такім важным было тады. Так шмат для нас значыла. Ніхто не перакакнае мяне, што жыццё дадзенае толькі на тое, каб смачна есці і спаць. А герой той, хто купіў нешта ў адным месцы, а прадаў у іншым на тры капейкі даражэй. Нас цяпер намаўляюць на гэта… Выходзіць, дурнямі былі ўсе тыя, хто аддаў сваё жыццё за іншых. За высокія ідэалы. Не! Не! Стаю ўчора ў краме ў касу… Бабулька спераду лічыць капейкі ў кашальку, пералічвае, і ўрэшце купляе сто грамаў самай таннай каўбасы… «сабачай»… і два яйкі. А я яе ведаю… яна ўсё жыццё адпрацавала настаўніцай…

Не магу я радавацца гэтаму новаму жыццю! Мне не будзе ў ім добра, мне ніколі не будзе добра адной. Самой-адной… А жыццё сцягвае, сцягвае мяне ў гэты глей. На зямлю. Маім дзецям ужо жыць паводле гэтых законаў. Я ім не патрэбная, я ўся смешная. Усё маё жыццё… Перабірала нядаўна паперы і натрапіла на свой юнацкі дзённік: першае каханне, першы пацалунак і цэлыя старонкі пра тое, як я люблю Сталіна і гатовая памерці, каб яго ўбачыць. Нататкі вар'яткі… Хацела выкінуць — не змагла. Схавала. Страх: толькі б яны нікому на вочы не трапілі. Будуць жартаваць, смяяцца. Нікому не паказала… *(Маўчыць.)* Я памятаю шмат рэчаў, якія не патлумачыш здаровым розумам. Рэдкі экземпляр, так! Кожны псіхатэрапеўт радаваўся б… Праўда?! Вам са мной пашанцавала… *(І плача, і смяецца.)*

Спытаеце… Вы мусіце спытаць, як гэта спалучалася: наша шчасце і тое, што па кагосьці прыходзілі ўначы, кагосьці забіралі? Нехта знікаў, нехта рыдаў за дзвярыма. Я гэтага

чамусьці не памятаю. Не памятаю! А памятаю, як буяў увесну бэз, і масавыя гулянні, драўляныя ходнікі, нагрэтыя сонцам. Пах сонца. Неверагодныя парады фізкультурнікаў і сплеценыя з жывых чалавечых целаў і кветак імёны на Чырвонай плошчы: Ленін — Сталін. Я і маме задавала гэтае пытанне...

Што памятаем мы пра Берыю? Пра Лубянку? Мама маўчала... Аднойчы прыгадала, як улетку пасля адпачынку яны з татам вярталіся з Крыму. Ехалі па Украіне. Гэта трыццатыя гады... калектывізацыя... На Украіне быў вялікі голад, па-ўкраінску — галадамор. Мільёны памерлі... цэлымі сёламі выміралі... Хаваць не было каму... Украінцаў забівалі за тое, што яны не хацелі ісці ў калгасы. Забівалі голадам. Цяпер жа я гэта ведаю... Калісьці ў іх была Запарожская Сеч, народ помніў свабоду... Там такая зямля — кол уваткнеш, і дрэва вырасце. А яны паміралі... падыхалі як быдла. У іх усё забралі, да макавінкі вывезлі. Атачылі войскамі, як у канцлагеры. Цяпер жа я гэта ведаю... Я сябрую на працы з адной украінкай, яна ад бабулі сваёй чула... Як у іх вёсцы матка сама адно дзіця засекла сякерай, каб варыць і карміць ім астатніх. Сваё дзіця... Гэта ўсё было... Дзяцей з двара баяліся выпускаць. Як катоў і сабак, вылоўлівалі дзяцей. Чарвякоў на гародах капалі і елі. Хто мог, поўз у горад, да цягнікоў. Чакалі, што нехта ім кіне скарыначку хлеба... Салдаты таўклі іх ботамі, білі прыкладамі... Цягнікі імчалі міма, імчалі на ўсёй хуткасці. Праваднікі зачынялі вокны, «задрайвалі» шторы. І ніхто ні пра што ні ў каго не пытаўся. Прыязджалі ў Маскву. Прывозілі віно, садавіну, ганарыліся загарам і ўспаміналі мора. *(Маўчыць.)* Я любіла Сталіна... Доўга яго любіла. Нават тады любіла, калі сталі пра яго пісаць, што ён быў маленькі, руды, з усохлаю рукой. Застрэліў сваю жонку. Развянчалі. Выкінулі з маўзалея. А я ўсё адно яго любіла.

Я доўга была сталінскай дзяўчынкай. Вельмі доўга. Вельмі... Так, гэта было! Са мною... з намі... і без таго жыцця я застануся з пустымі рукамі. Без нічога... жабрачкай буду!

Я ганарылася нашым суседам, дзядзькам Ванем — герой! Ён вярнуўся з вайны без абедзвюх ног. Ездзіў па двары на драўляным самаробным вазку. Называў мяне «мая Маргарытка», рамантаваў усім валёнкі і боты. П'яны спяваў: «Дарагія браточкі-сястрычкі… / Па-геройску я біўся ў баі…» Праз некалькі дзён пасля смерці Сталіна прыходжу да яго: «Ну што, Маргарытка, здох гэты…» Гэта ён — пра майго Сталіна! Я выхапіла свае валёнкі: «Што вы кажаце? Вы — герой! З ордэнам». Два дні вырашала: я — піянерка, значыць, павінна пайсці ў НКВД і расказаць пра дзядзьку Ваню. Зрабіць заяву. І гэта абсалютна сур'ёзна… так! Як Паўлік Марозаў… Я магла данесці і на свайго бацьку… на маці… Я магла… Так! Я была гатовая! Вяртаюся са школы, а дзядзька Ваня п'яны валяецца ў пад'ездзе. Перакуліўся са сваім вазком і не можа ўстаць. І мне стала яго шкада.

Я сядзела, прытуліўшыся вухам да рэпрадуктара, і слухала, як кожную гадзіну перадавалі бюлетэнь пра здароўе таварыша Сталіна. І плакала. Усім сэрцам. Было! Гэта было! Быў сталінскі час… і былі мы, сталінскія людзі… Мая мама — з дваранскай сям'і. За некалькі месяцаў да рэвалюцыі яна выйшла замуж за афіцэра, пасля ён ваяваў у белай гвардыі. У Адэсе яны рассталіся — ён эміграваў з рэшткамі разбітых дзянікінскіх частак, а яна не магла пакінуць спаралізаваную маці. Яе забралі ў ЧК як жонку белагвардзейца. Следчы, які вёў справу, закахаўся ў маму. Уратаваў нейкім чынам… Але прымусіў выйсці за яго замуж. Пасля службы ён вяртаўся дадому п'яны і біў яе рэвальверам па галаве. Потым кудысьці знік. І вось гэтая мая мама… прыгажуня… якая захаплялася музыкай, ведала некалькі моваў, яна да самазабыцця любіла Сталіна. Пагражала тату, калі ён нечым быў незадаволены: «Я пайду ў райкам і скажу, які ты камуніст». А тата… Тата ўдзельнічаў у рэвалюцыі… у 37-м быў рэпрэсаваны… Але яго хутка вызвалілі, бо за яго папрасіў нейкі паважаны бальшавік, які ведаў яго асабіста. Даў заруку. Але ў партыі тату не

аднавілі. Удар, які ён не мог пераэкыць. У турме яму выбілі зубы, праламілі галаву. Усё адно тата не змяніўся, застаўся камуністам. Растлумачце мне гэта… Думаеце, дурні? Наіўняк? Не, гэта былі разумныя і адукаваныя людзі. Мама чытала ў арыгінале Шэкспіра і Гётэ, а тата скончыў Ціміразеўскую акадэмію. А Блок… Маякоўскі… Інэса Арманд? Мае куміры… мае ідэалы… З імі я вырасла… *(Задумалася.)*

Калісьці я вучылася лётаць у аэраклубе. На чым мы лёталі, цяпер здзіўляешся: як мы жывыя засталіся?! Не планеры, а самаробкі — драўляныя рэечкі, абабітыя марляй. Кіраванне — ручка і педаль. Але затое, калі ты ляціш, ты бачыш птушак, ты бачыш зямлю з вышыні. Ты адчуваеш крылы! Неба змяняе чалавека… вышыня змяняе… Разумееце, пра што я? Я пра тое наша жыццё… Мне шкада не сябе, мне шкада ўсяго таго, што мы любілі…

Усё сумленна ўспомніла… і не ведаю нават… Чамусьці цяпер сорамна пра ўсё гэта камусьці распавядаць…

Паляцеў Гагарын… Людзі выйшлі на вуліцу, смяяліся, абдымаліся, плакалі. Незнаёмыя людзі. Рабочыя ў спяцоўках проста з заводаў, медыкі ў белых шапачках, кідалі іх у неба: «Мы — першыя! Наш чалавек у космасе!» Гэта нельга забыць! Гэта было як нагбом, такое здзіўленне. Я дагэтуль не магу спакойна слухаць песню: «І сніцца нам не рокат касмадрома, / Не тая ледзяная сінява, / А сніцца нам трава, трава ля дома. / Зялёная, зялёная трава…» Кубінская рэвалюцыя… Маладыя Кастра… Я крычала: «Мама! Тата! Яны перамаглі! Віва Куба!» *(Напявае.)* «Куба, любоў мая! / Востраў зары пунсовай, / Звонкую песьню пачуюць здаля, / Куба — любоў мая!» У школу да нас прыходзілі ветэраны баёў у Іспаніі… Разам мы спявалі песню «Грэнада»: «Я хату пакінуў, пайшоў ваяваць, / Сялянам з Грэнады зямлю каб аддаць…» У мяне над сталом вісеў фотаздымак Далорэс Ібаруры. Так… мы марылі пра Грэнаду… потым пра Кубу… Праз некалькі дзясяткаў гадоў іншыя хлопчыкі гэтак жа трызнілі Афганістанам. Нас лёгка

было падмануць. Але ўсё адно… Усё адно! Я гэта не забуду! Я не забуду, як сыходзіў на цаліну наш дзясяты клас. Яны ішлі калонай, з заплечнікамі, над імі калыхаўся сцяг. У некаторых за спінай гітары. «Вось гэта — героі!» — думала я. Многія з іх пасля вярнуліся хворымі: на цаліну яны не трапілі, а будавалі дзесьці ў тайзе чыгунку, цягалі на сабе рэйкі па пояс у ледзяной вадзе. Не ставала тэхнікі… Елі гнілую бульбу, усе перахварэлі на цынгу. Але яны былі, гэтая моладзь! І была дзяўчынка, якая іх праводзіла ў экстазе. Гэта — я! Мая памяць… Я яе нікому не аддам — ні камуністам, ні дэмакратам, ні брокерам. Яна — мая! Толькі мая! Я без усяго магу абысціся: мне не трэба шмат грошай, дарагой ежы і моднага адзення… шыкоўнай машыны… Мы на сваіх «жыгулях» аб'ехалі ўвесь Саюз: я ўбачыла Карэлію… возера Севан… і Памір. Гэта ўсё была мая Радзіма. Мая Радзіма — СССР. Я шмат без чаго магу пражыць. Не магу толькі без таго, што было. *(Доўга маўчыць. Так доўга, што я гукаю яе.)*

Не бойцеся… Са мной усё нармальна… ужо нармальна… Сяджу пакуль дома… котку гладжу, рукавіцы вяжу. Такое простае дзеянне, як вязанне, дапамагае лепш за ўсё… Што ўтрымала? Да канца я не дайшла… не… Як доктар я ўсё ўяўляла… з усімі падрабязнасцямі… Смерць агідная, яна не бывае прыгожай. Я бачыла тых, хто павесіўся… У апошнія хвіліны ў іх наступае аргазм, ці яны ў мачы, у кале. Ад газу чалавек сіні… фіялетавы… Адна гэтая думка для жанчыны жахлівая. Ніякіх ілюзій аб прыгожай смерці ў мяне не магло быць. Але… Цябе нешта штурханула, прышпорыла, прымусіла адважыцца. Ты ў адчайным рыўку… ёсць дыханне і рытм… і ёсць рывок… А там ужо цяжка ўтрымацца. Сарваць стоп-кран! Стоп! Я неяк утрымалася. Адкінула вяроўку для бялізны. Выбегла на вуліцу. Прамокла пад дажджом, якая радасць пасля ўсяго прамокнуць пад дажджом! Як прыемна! *(Маўчыць.)* Я доўга не размаўляла… Восем месяцаў ляжала ў дэпрэсіі. Развучылася хадзіць. Устала ўрэшце. Навучылася хадзіць зноў. Я ёсць…

зноў я на цвёрдым... Але мне было дрэнна... Мяне праткнулі як шарык... Пра што гэта я? Досыць! Ну, досыць... *(Сядзіць і плача.)* Досыць...

Дзевяносты год... У нашай мінскай трохпакаёвай кватэры жыло пятнаццаць чалавек, і немаўля яшчэ. Першымі прыехалі з Баку сваякі мужа — сястра з сям'ёй і яго стрыечныя браты. Яны не ў госці прыехалі, яны прывезлі з сабой слова «вайна». З крыкам увайшлі ў дом, з пагаслымі вачыма... Гэта недзе ўвосені ці ўзімку... было ўжо халодна. Так, увосені яны прыехалі, таму што ўзімку нас было больш. Узімку з Таджыкістана... З горада Душанбэ прыехала мая сястра са сваёй сям'ёй і бацькамі мужа. Менавіта так і было... Так... Спалі паўсюль, улетку спалі нават на балконе. І... не гаварылі, а крычалі... Як яны беглі, а вайна выспяткам даганяла. Пяткі прыпякала. А яны... усе яны, як і я, савецкія... абсалютна савецкія. Стопрацэнтова! Гэтым ганарыліся. І раптам — нічога гэтага няма. Ну няма! Прачнуліся раніцай, зірнулі ў акно — ужо яны пад іншым сцягам. У іншай краіне. Ужо — чужыя.

Я слухала. Слухала. Яны гаварылі...

«...а які быў час! Прыйшоў Гарбачоў... І раптам пад вокнамі — страляніна. Госпадзе! У сталіцы... у Душанбэ... Усе сядзелі пры тэлевізары і баяліся прапусціць апошнія навіны. У нас на фабрыцы жаночы калектыў быў, пераважна рускія. Я пытаюся: "Дзяўчаты, што будзе?" — "Вайна пачынаецца, ужо рускіх рэжуць". Праз некалькі дзён адну краму пасярод дня разрабавалі... другую...»

«...першыя месяцы я плакала, а тады перастала. Слёзы хутка сканчаюцца. Больш за ўсё баялася мужчын, і знаёмых, і незнаёмых. Зацягнуць у дом, у машыну... "Красівайа! Дэвушка, давай паябёмся..." Суседскую дзяўчынку аднакласнікі згвалцілі. Таджыкскія хлопчыкі, якіх мы ведалі. Яе маці пайшла ў сям'ю да аднаго. "Навошта сюды прыехала? — крычалі на яе. — Валі ў сваю Расію. Хутка вас, рускіх, тут наогул не застанецца. У адных майтках пабежыцё"».

«...навошта мы туды паехалі? Па камсамольскай пуцёўцы. Будавалі Нурэкскую ГЭС, алюмініевы завод... Я вучыла таджыкскую мову: чайхана, піяла, арык, арча, чынара... “Шураві” называлі нас. Рускія браты».

«...мне сняцца ружовыя горы — міндаль буяе. А прачынаюся ўся ў слязах...»

«...у Баку... Жылі мы ў дзевяціпавярховым доме. Раніцай вывелі армянскія сем’і ў двор... Усе вакол іх сабраліся, і колькі было людзей, столькі падышло да іх, кожны чымсьці ўдарыў. Маленькі хлопчык... гадоў пяць... ён падышоў і ўдарыў дзіцячай рыдлёўкай. Старая азербайджанка яго пагладзіла па галаве...»

«...а нашы сябры, яны таксама былі азербайджанцы, але яны нас хавалі ў сябе ў падвале. Завалілі хлудам, скрынкамі. Прыносілі ноччу ежу...»

«...раніцай бягу на працу — на вуліцах трупы ляжаць. Валяюцца, ці сядзяць каля сцяны, сядзяць, быццам жывыя. Кагосьці накрылі дастарханам (абрусам), а кагосьці не. Не паспелі. Большасць ляжалі раздзетыя... і мужчыны, і жанчыны... Тых, што сядзелі, тых не раздзявалі, іх жа не разагнуць...»

«...раней я думаў, што таджыкі — як дзеці, нікога не пакрыўдзяць. За паўгода, можа, нават менш часу прайшло, Душанбэ было не пазнаць, і людзей не пазнаць. Моргі перапоўненыя. Раніцай на асфальце, пакуль не затопчуць, згусткі застылай крыві... як халоднае...»

«...цэлымі днямі яны ішлі міма нашага дома з плакатамі: “Смерць армянам! Смерць!” Мужчыны і жанчыны. Старыя і маладыя. Раз’юшаны натоўп, ніводнага людскага твару. Газеты былі забітыя аб’явамі: “Мяняю трохпакаёвую кватэру ў Баку на любую кватэру ў любым горадзе Расіі...” Сваю кватэру мы прадалі за трыста долараў. Як лядоўню. А не прадалі б за гэтыя грошы, маглі забіць...»

«...а мы за сваю кватэру купілі: мне — кітайскі пухавік, а мужу — цёплыя чаравікі. Мэблю, посуд... дываны... усё пакінулі...»

«...жылі без святла і газу... без вады... На рынку цэны жахлівыя. Каля нашага дома адкрыўся шапік. Там прадавалі кветкі і пахавальныя вянкі. Толькі кветкі і вянкі...»

«...уначы на сцяне суседняга дома нехта напісаў фарбай: "Бойся, руская сволач! Твае танкісты табе не дапамогуць". Рускіх здымалі з кіраўнічых пасад... стралялі з завугольля... Горад хутка стаў брудным, як кішлак. Чужы горад. Не савецкі...»

«...забівалі за ўсё... Не там нарадзіўся, не на той мове размаўляеш. Не спадабаўся камусьці з аўтаматам... А да таго як мы жылі? У святы першы тост у нас быў "за дружбу": "ес кес сірум эм" (па-армянску — я цябе люблю). — "Ман сані севірам" (па-азербайджанску — я цябе люблю). Жылі разам...»

«...простыя людзі... Нашы знаёмыя таджыкі закрывалі сваіх сыноў на ключ, не выпускалі з дому, каб іх не навучылі... не прымусілі забіваць».

«...ад'язджаем... Селі ўжо ў цягнік, пара ўжо з-пад колаў. Апошнія хвіліны. Хтосьці даў па колах чаргу з аўтамата. Салдаты стаялі калідорам, закрывалі нас. Калі б не салдаты, дык мы жывымі б нават да вагонаў не дабеглі. І калі цяпер я бачу, што паказваюць вайну ў тэлевізары, я адразу чую... Гэты пах... пах падсмажанага чалавечага мяса... моташны... цукеркавы пах...»

Праз паўгода ў мужа першы інфаркт... яшчэ праз паўгода — другі... У яго сястры інсульт. Ад усяго гэтага... Я вар'яцела... А вы ведаеце, як вар'яцеюць валасы? Яны робяцца цвёрдымі, як лёска. Валасы вар'яцеюць першымі... Ну хто ж вытрымае? Маленькая Карына... Удзень нармальнае дзіця, а стане цямнець за акном, яна дрыжыць. Крычыць: «Мама, не сыходзь! Я засну, а вас з татам заб'юць!» Я бегла раніцай на працу і прасіла, каб мяне збіла машынай. Ніколі не хадзіла ў царкву, а тут гадзінамі на каленях стаяла: «Прасвятая Багародзіца! Ці ты мяне чуеш?» Перастала спаць, не магла есці. Я — не палітык, я ў палітыцы нічога не разумею. Мне проста страшна. Што вы яшчэ хочаце ў мяне спытаць? Я ўсё расказала... Усё!

## Пра самотнага чырвонага маршала і тры дні забытай рэвалюцыі

*Сяргей Фёдаравіч Ахрамееў (1923—1991), маршал Савецкага Саюза, Герой Савецкага Саюза (1982). Начальнік Генштаба Узброеных сіл СССР (1984—1988). Лаўрэат Ленінскай прэміі (1980). З 1990 года вайсковы дарадца Прэзідэнта СССР.*

*З інтэрв'ю на Чырвонай плошчы (снежань 91-га года)*

«Я была студэнткай…

Усё адбылося вельмі хутка… Праз тры дні рэвалюцыя скончылася… У тэлевізары ў аглядзе навін перадалі: члены ГКЧП арыштаваныя… міністр унутраных спраў Пуга застрэліўся, маршал Ахрамееў павесіўся… У нашай сям'і гэта доўга абмяркоўвалася. Помню, тата сказаў: "Гэта — ваенныя злачынцы. Іх мусіў напаткаць лёс нямецкіх генералаў Шпэера і Геса". Усе чакалі Нюрнберга…

Мы былі маладыя… Рэвалюцыя! Я пачала ганарыцца сваёй краінай, калі людзі выйшлі на вуліцы супраць танкаў. Да гэтага ўжо былі падзеі ў Вільні, Рызе, Тбілісі. У Вільні літоўцы адстаялі свой тэлецэнтр, нам усё гэта паказвалі, а мы што — быдла ці што? На вуліцу выйшлі людзі, якія раней нікуды не хадзілі — сядзелі на кухнях і абураліся. А тут яны выйшлі… Мы з сяброўкай узялі з сабой парасоны — і ад дажджу, і каб біцца. *(Смяецца.)* Я адчувала гонар за Ельцына, калі ён стаяў на танку, я зразумела: гэта — мой прэзідэнт! Мой! Сапраўдны! Там было шмат моладзі. Студэнтаў. Усе мы выраслі на "Огоньке" Кароціча, на "шасцідзясятніках". Абстаноўка ваенная… У мегафон нехта крычаў, упрошваў, мужчынскі голас: "Дзяўчаты, сыходзьце. Будзе страляніна і шмат трупаў". Побач са мною дзяцюк выпраўляў дадому сваю цяжарную жонку, яна плакала: "Чаму ты застаешся?" — "Так трэба".

Я прапусціла вельмі важнае… Як пачаўся гэты дзень… Раніцай я прачнулася ад таго, што мама гучна плакала. Рыдала. Мама пыталася ў таты: "Што такое надзвычайнае становішча? Як ты думаеш, што яны зрабілі з Гарбачовым?" А бабуля бегала ад тэлевізара да радыё на кухні: "Нікога не арыштавалі? Не расстралялі?" Нарадзілася бабуля ў дваццаць другім годзе, праз усё яе жыццё стралялі і кагосьці расстрэльвалі. Арыштоўвалі. Так жыццё прайшло… Калі бабулі не стала, мама адкрыла сямейную таямніцу. Падняла заслону… У пяцьдзясят шостым прывезлі бабулі і маме з лагера бацьку, гэта быў мех костак. З Казахстана. Прыехаў ён з праважатым, такі быў хворы. І яны нікому не прызнаваліся, што гэта бацька… гэта муж… Баяліся… Казалі, што ён ім ніхто, нейкі далёкі сваяк. Пражыў ён з імі некалькі месяцаў, і яго паклалі ў бальніцу. Там ён засіліўся. Мне трэба… Цяпер мне трэба неяк з гэтым жыць, з гэтым веданнем. Мне трэба гэта зразумець… *(Паўтарае.)* Неяк з гэтым жыць… Больш за ўсё наша бабуля баялася новага Сталіна і вайны, усё жыццё яна чакала арышту і голаду. Вырошчвала на акне цыбулю ў скрыначках, квасіла ў вялікіх рандэлях капусту. Купляла ў запас цукар і алей. Антрэсолі ў нас былі забітыя рознымі крупамі. Груцай. Заўсёды яна мяне вучыла: "Ты маўчы! Маўчы!" У школе маўчы… ва ўніверсітэце… Так я расла, сярод такіх людзей. Нам не было за што любіць савецкую ўладу. Мы ўсе — за Ельцына! А маю сяброўку мама не выпускала з хаты: "Толькі праз мой труп! Ты хіба не разумееш, што ўсё вярнулася?" Мы вучыліся ва Універсітэце дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы. Там вучыліся студэнты з усяго свету, многія з іх прыязджалі з уяўленнем, што СССР — гэта краіна балалаек і атамных бомбаў. Нам было крыўдна. Мы хацелі жыць у іншай краіне…»

«Я працаваў слесарам на заводзе…

Пра путч даведаўся ў Варонежскай вобласці… гасцяваў у цёткі. Усе гэтыя енкі пра веліч Расіі — жопень поўная. Пат-

рыёты сраныя! Сядзяць пры зомбаскрыні. Ад'ехалі б на пяцьдзясят кіламетраў ад Масквы... Паглядзелі б на дамы, на тое, як людзі жывуць. Якія ў іх сьвяты хмяльныя... У вёсцы мужыкоў амаль няма. Вымерлі. Свядомасць на ўзроўні рагатага быдла — п'юць смяротна. Пакуль не паваляцца. П'юць усё, што гарыць: ад гурковага ласьёну да аўтабензіну. П'юць, а потым б'юцца. У кожнай сям'і хтосьці ў турме сядзеў ці сядзіць. Міліцыя не спраўляецца. Толькі бабы не здаюцца, корпаюцца на гародах. Калі засталося пару мужыкоў непітушчых, дык яны з'ехалі на заробкі ў Маскву. А адзінаму фермеру (у той вёсцы, куды я езджу) тры разы пускалі "чырвонага пеўня", пакуль не з'ехаў к чортавай матары! З вачэй! Натуральна ненавідзелі... фізічна...

Танкі ў Маскве... барыкады... У вёсцы ніхто асабліва з гэтай нагоды не напружваўся. Не дурыў сабе галавы. Усіх больш хваляваў каларадскі жук і капусная моль. Ён жывучы, гэты каларадскі... А ў маладых хлапцоў семкі і дзеўкі ў галаве. Дзе пляшку ўвечары цісхануць? Але народ усё ж больш выказваўся за ГКЧП. Я так зразумеў... Яны не ўсе былі камуністамі, але ўсе за вялікую краіну. Баяліся перамен, бо пасля ўсіх перамен мужык у дурнях заставаўся. Памятаю, як наш дзед казаў: "Раней мы жылі ху...ва-ху...ва, а потым усё горш і горш". Да вайны і пасля вайны жылі без пашпартоў. Вяскоўцам пашпарт не давалі, не выпускалі ў горад. Рабы. Арыштанты. Вярнуліся з вайны ў ордэнах. Паў-Еўропы заваявалі! А жылі без пашпартоў.

У Маскве даведаўся, што мае сябры ўсе былі на барыкадах. Удзельнічалі ў заварушцы. *(Смяецца.)* І я медалёк мог атрымаць...»

«Я — інжынер...

Хто ён, маршал Ахрамееў? Фанатык "саўка". Я жыў у "саўку", мне зноў у "савок" не хочацца. А гэта быў фанатык, чалавек, шчыра адданы камуністычнай ідэі. Гэта быў мой вораг. Ён выклікаў ува мне нянавісць, калі я слухаў яго

выступленні. Я разумеў: гэты чалавек будзе біцца да канца. Яго самагубства? Ясна, што ўчынак неардынарны, і ён выклікае павагу. Смерць трэба паважаць. Але я задаю сабе пытанне: а калі б яны перамаглі? Вазьміце хоць які падручнік… Ніводзін пераварот у гісторыі не абышоўся без тэрору, абавязкова ўсё скончалася крывёю. Выдзіраннем языкоў і выколваннем вачэй. Сярэднявеччам. Тут не трэба быць гісторыкам…

Пачуў раніцай у тэлевізары пра "няздольнасць Гарбачова кіраваць краінай з прычыны цяжкай хваробы"… убачыў пад вокнамі танкі… Тэлефаную сябрам — усе за Ельцына. Супраць хунты. Будзем Ельцына бараніць! Адчыняю лядоўню — паклаў кавалак сыру сабе ў кішэню. Абаранкі ляжалі на стале — згроб абаранкі. А зброю? Нешта трэба з сабой узяць… На стале ляжаў кухонны нож… патрымаў яго ў руках і паклаў на месца. *(Задумаўся.)* А калі б… а калі б яны перамаглі?

Цяпер паказваюць у тэлевізары карцінкі: маэстра Растраповіч прыляцеў з Парыжа і сядзіць з аўтаматам, дзяўчаты частуюць салдат марозівам… Букет кветак на танку… Мае карцінкі іншыя… Маскоўскія бабулі раздаюць салдатам бутэрброды і водзяць да сябе дадому пасікаць. Увялі танкавую дывізію ў сталіцу — ні сухпайкоў, ні прыбіральняў. Тырчаць з люкаў тоненькія шыйкі хлапцоў, і — вось такія! — у іх перапалоханыя зіркачы. Яны нічога не разумеюць. На трэці дзень ужо сядзяць на бранi — злыя, галодныя. Нявыспаныя. Жанчыны бяруць іх у аблогу: "Сыночкі, і вы будзеце ў нас страляць?" Салдаты маўчаць, а афіцэр як гыркне: "Дадуць загад — будзем страляць!" Салдатаў як ветрам знесла, пахаваліся ў люках. Во як! Мае карцінкі з вашымі не супадаюць… Стаім у ачапленні, чакаем атакі. Чуткі: зараз газ пусцяць, снайперы на дахах… Падыходзіць да нас жанчына, у яе ордэнскія калодкі на кофце: "Каго бароніце? Капіталістаў?" — "Ды ты што, бабуля? Мы за свабоду тут стаім". — "А я за савецкую ўладу ваявала — за рабочых і сялян. А не за шапікі і кааператывы. Далі б мне зараз аўтамат…"

Усё вісела на валаску. Крывёю пахла. Свята я не памятаю…»

«Я — патрыёт…

Дайце мне выказацца. — *Падыходзіць мужчына ў расхрыстаным кажуху з масіўным крыжам на грудзях.* — Мы жывём у самы ганебны час нашай гісторыі. Мы — пакаленне баязліўцаў, здраднікаў. Такі прысуд нам вынесуць нашы дзеці. "Вялікую краіну нашы бацькі прадалі за джынсы, 'Мальбара' і жуйку", — скажуць яны. Мы не змаглі адстаяць СССР — нашу Радзіму. Страшнае злачынства. Прадалі ўсё! Ніколі не прывыкну да расійскага трыкалору, у мяне перад вачыма заўсёды будзе чырвоны сцяг. Сцяг вялікай краіны! Вялікай перамогі! Што ж гэта трэба было зрабіць з намі… з савецкімі людзьмі… каб мы заплюшчылі вочы і пабеглі ў гэты грэбаны капіталістычны рай? Купілі нас фанцікамі, каўбаснымі вітрынамі, яркімі абгорткамі. Асляпілі, забалбаталі. Мы прамянялі ўсё на тачкі і шмоткі. І не трэба казак… што гэта ЦРУ разваліла Савецкі Саюз, інтрыгі Бжэзінскага… А чаму КДБ не развαліла Амерыку? Не тупыя бальшавікі прасралі краіну, і не інтэлігентныя сволачы яе знішчылі, каб ездзіць па замежжах і чытаць "Архіпелаг ГУЛАГ"… І не шукайце жыда-масонскай змовы. Усё мы знішчалі самі. Сваімі рукамі. Марылі, каб у нас адкрылі "Макдональдсы" з гарачымі гамбургерамі і кожны мог набыць сабе "Мерседэс", пластмасавы відзік. І каб у шапіках прадаваліся порнафільмы…

Расіі патрэбна моцная рука. Жалезная. Цівун з бізуном. Назіральнік з палкай. Так што — вялікі Сталін! Ура! Ура! Ахрамееў мог стаць нашым Піначэтам… генералам Ярузэльскім… Вялікая страта…»

«Я — камуніст…

Я быў за ГКЧП, дакладней, за СССР. Я быў заўзяты гэкачэпіст, таму што мне падабалася жыць у імперыі. "Ты шырокая, мая радзіма…" У восемдзесят дзявятым годзе паслалі мяне

ў камандзіроўку ў Вільнюс. Перад ад'ездам выклікаў да сябе галоўны інжынер завода (ён там ужо быў) і папярэдзіў: "Ты па-руску з імі не гавары. Запалак у краме не прададуць, калі папросіш па-руску. Ці ты сваю ўкраінскую не забыў? Размаўляй па-ўкраінску". Я не паверыў — што за лухта? А ён: "Асцярожна ў сталоўцы — могуць атруціць ці падсыпаць тоўчанае шкло. Ты там цяпер акупант, разумееш?" А ў мяне ў галаве дружба народаў і ўсё такое. Савецкае братэрства. Не паверыў, пакуль не прыехаў на віленскі вакзал. Выйшаў на перон… З першай хвіліны мне далі зразумець, пачуўшы рускую гаворку, што я прыехаў у чужую краіну. Я быў акупант. З бруднай, адсталай Расіі. Рускі Іван. Варвар.

І вось гэты танец лебедзянят… Адным словам, пра ГКЧП я пачуў раніцай у краме. Пабег дадому, уключыў тэлевізар: ці забілі Ельцына ці не? У чыіх руках тэлецэнтр? Хто камандуе арміяй? Патэлефанаваў знаёмы: "Ну, сукі, зараз зноў гайкі закруцяць. Станем шрубкамі і цвічкамі". Мяне злосць узяла: "А я абедзвюма рукамі — за. Я — за СССР!" Умомант ён павяртаецца на сто восемдзесят градусаў: "Канец Міхаілу Мечанаму! Дарога яму ў Сібір!" Разумееце? З людзьмі трэба было гутарыць. Намаўляць. Апрацоўваць. Перш за ўсё браць "Астанкіна" і кругласутачна вяшчаць: уратуем краіну! Савецкая Радзіма ў небяспецы! Хутка разабрацца з сабчакамі, афанасьевымі ды астатнімі здраднікамі. А народ быў — за!

У самагубства Ахрамеева не веру. Не мог баявы афіцэр павесіцца на шпагаце… на стужцы з кардонкі ад торта… Як зэк. У турэмнай камеры так вешаюцца — седзячы і падкурчыўшы ногі. У адзіночцы. Не ў вайсковай гэта традыцыі. Афіцэры грэбуюць пятлёй. Не самагубства гэта, а забойства. Яго забілі тыя, хто забіў Савецкі Саюз. Яны яго баяліся — Ахрамееў меў высокі аўтарытэт у арміі, ён мог арганізаваць супраціў. Народ яшчэ не быў дэзарыентаваны, раз'яднаны, як цяпер. Яшчэ ўсе жылі аднолькава і адны газеты чыталі. Не так, як цяпер: адным чорт і ў кашу валіць, а другім і ў поліўку недадае.

А вось гэта… я сам гэта бачыў… Маладыя хлопцы прыставілі лесвіцы да будынка ЦК КПСС на Старой плошчы, яго ўжо ніхто не ахоўваў. Высокія пажарныя лесвіцы. Залезлі наверх… малаткамі і зубіламі пачалі збіваць залатыя літары ЦК КПСС. А іншыя ўнізе іх распілоўвалі і раздавалі кавалачкі на памяць. Разбіралі барыкады. Калючы дрот таксама ішоў на сувеніры.

Так я запомніў падзенне камунізму…»

*З матэрыялаў следства*

«24 жніўня 1991 года ў 21 гадзіну 51 хв. у службовым кабінеце № 19а ў корпусе 1 Маскоўскага Крамля дзяжурным афіцэрам аховы Карацеевым быў знойдзены труп Маршала Савецкага Саюза Ахрамеева Сяргея Фёдаравіча (1923 года нараджэння), які працаваў дарадцам Прэзідэнта СССР.

Труп знаходзіўся ў сядзячым становішчы пад падаконнем акна кабінета. Спінай труп абапіраўся на драўляную рашотку, якая закрывае батарэю паравога ацяплення. На трупе была форма Маршала Савецкага Саюза. Пашкоджанняў на адзенні не было. На шыі трупа знаходзілася выробленая з сінтэтычнага шпагату, складзенага ўдвая, пятля, якая ахоплівала шыю па ўсёй акружнасці. Верхні канец пятлі быў замацаваны на ручцы аконнай рамы клейкай стужкай тыпу "скотч". Якіх-небудзь цялесных пашкоджанняў на трупе, акрамя звязаных з павешаннем, не выяўлена…»

«Пры аглядзе змесціва пісьмовага стала наверсе, на бачным месцы, былі знойдзеныя пяць лістоў. Усе лісты рукапісныя. Ляжалі акуратным стосам. Вопіс зроблены ў той паслядоўнасці, у якой лісты размяшчаліся…

Першы ліст Ахрамееў просіць перадаць яго сям'і, у ёй ён паведамляе, што прыняў рашэнне пра самагубства: "Заўсёды для мяне галоўным быў абавязак воіна і грамадзяніна. Вы былі на другім месцы. Сёння я ўпершыню стаўлю на першае месца

вас. Прашу мужна пераажыць гэтыя дні. Падтрымлівайце адно аднаго. Не давайце падставы для зларадства непрыяцелям...”

Другі ліст адрасаваны Маршалу Савецкага Саюза С. Сакалову. У ім утрымліваецца просьба да Сакалова і генерала арміі Лобава дапамагчы ў пахаванні і не пакінуць членаў сям’і ў цяжкія для іх дні.

У трэцім лісце ўтрымліваецца просьба аб вяртанні доўгу ў крамлёўскую сталоўку і прымацаваная грашовая купюра вартасцю 50 рублёў.

Чацвёрты ліст бязадрасны: “Не магу жыць, калі гіне мая Айчына і знішчаецца ўсё, што я лічыў сэнсам у маім жыцці. Узрост і маё мінулае даюць мне права сысці з жыцця. Я змагаўся да канца”.

Апошняя цыдулка ляжала асобна: “Я дрэнны майстар рыхтаваць начынне для самагубства. Першая спроба (у 9.40) не ўдалася — парваўся тросік. Збіраюся з сіламі ўсё паўтарыць зноў...”

Графалагічная экспертыза ўстанавіла: усе лісты напісаныя рукой Ахрамеева...»

«...малодшая дачка Наталля, з сям’ёй якой Ахрамееў правёў апошнюю ноч, распавяла: “Яшчэ да жніўня мы не раз пыталіся ў бацькі: ‘Ці ў нас магчымы дзяржаўны пераварот?’ Многія былі незадаволеныя тым, як пайшла гарбачоўская перабудова — яго балбатнёй, слабасцю, аднабаковымі саступкамі ў савецка-амерыканскіх перамовах аб раззбраенні, эканамічным становішчам краіны, якое пагаршалася. Але бацька гэтыя размовы не любіў, ён быў упэўнены: ‘Ніякага дзяржаўнага перавароту не будзе. Калі б армія захацела зрабіць пераварот, дык яна зрабіла б гэта за дзве гадзіны. Але ў Расіі нічога сілай не даб’ешся. Прыбраць непажаданага кіраўніка — не самая вялікая праблема. А вось што рабіць далей?’”

23 жніўня Ахрамееў вярнуўся з працы не позна. Вячэрала сям’я разам. Набылі вялікі кавун і доўга сядзелі за сталом.

Бацька, са словаў дачкі, быў шчыры. Прызнаўся, што чакае арышту. Ніхто ў Крамлі да яго не падыходзіць і не размаўляе. "Я разумею, — казаў ён, — вам будзе цяжка, цяпер на нашу сям'ю абрынецца столькі бруду. Але інакш зрабіць я не мог". Дачка задала яму пытанне: "Ты не шкадуеш, што прыляцеў у Маскву?" Ахрамееў адказаў: "Калі б я гэтага не зрабіў, дык праклінаў бы сябе ўсё жыццё".

Перад сном Ахрамееў паабяцаў унучцы, што заўтра павядзе яе ў парк на арэлі. Турбаваўся, хто сустрэне жонку, якая раніцай павінна была прыляцець з Сочы. Прасіў, каб яму адразу паведамілі аб яе прылёце. Замовіў для яе ў крамлёўскім гаражы машыну...

Дачка патэлефанавала бацьку раніцай у 9.35. Голас у яго быў звычайны... Ведаючы характар бацькі, у самагубства дачка не верыць...»

*З апошніх запісаў*

«...Я прысягаў Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік... і ўсё жыццё яму праслужыў. Дык што цяпер я павінен рабіць? Каму я павінен служыць? Так, пакуль я жывы, пакуль я дыхаю, я і буду змагацца за Савецкі Саюз...»

*Тэлепраграма «Взгляд». 1990 г.*

«Усё цяпер ператвараюць у чарнату... Адмаўляецца ўсё, што адбывалася ў краіне пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі... Так, тады быў Сталін, быў сталінізм. Так, тады былі рэпрэсіі, гвалт над народам, я гэтага не адмаўляю. Усё гэта было. І тым не менш, гэта трэба даследаваць і ацаніць аб'ектыўна і справядліва. Мяне, напрыклад, у гэтым пераконваць няма чаго, я сам родам адтуль, з гэтых гадоў. Я сам бачыў, як людзі працавалі, з якой верай... Задача не ў тым, каб нешта злагодзіць ці схаваць. Хаваць, утойваць няма чаго. На фоне таго,

што адбылося ў краіне і пра што ўсе ўжо ведаюць, якія могуць быць гульні ў хованкі? Але вайну з фашызмам мы выйгралі, а не прайгралі. У нас ёсць Перамога.

Я памятаю трыццатыя гады… Выраслі такія, як я. Дзясяткі мільёнаў. І мы будавалі сацыялізм свядома. Мы гатовыя былі на любыя ахвяры. Я не згодны, што ў перадваенныя гады існаваў толькі сталінізм, як піша генерал Валкагонаў. Ён — антыкамуніст. Але сёння ў нас слова "антыкамуніст" ужо не лаянкавае. Я — камуніст, ён — антыкамуніст. Я — антыкапіталіст, а ён — не ведаю хто: абаронца капіталізму ці не? Гэта не больш за звычайную канстатацыю факта. І ідэйную спрэчку. Мяне не толькі крытыкуюць, але адкрыта ганяць за тое, што я называю яго "пярэваратнем"… Да нядаўняга часу Валкагонаў бараніў савецкі лад, камуністычныя ідэалы разам са мной. І раптам рэзкі паварот. Хай скажа, чаму ён здрадзіў вайсковай прысязе…

Многія страцілі сёння веру. Першым сярод іх я назваў бы Барыса Мікалаевіча Ельцына. Расійскі прэзідэнт быў сакратаром ЦК КПСС, кандыдатам у члены Палітбюро. А цяпер вось адкрыта кажа, што не верыць у сацыялізм і камунізм, лічыць няправільным усё, што рабілі камуністы. Стаў ваяўнічы антыкамуніст. Ёсць і іншыя. Іх, дарэчы, не так ужо й мала. Але вы ж звяртаецеся да мяне… Я ў прынцыпе не згодны… Я бачу пагрозу існаванню нашай краіны, яна — відавочная. Яна сёння такая самая, як у сорак першым годзе…»

*Н. Зянковіч. XX стагоддзе. Вышэйшы генералітэт у гады ўзрушэнняў. Масква: Олма-прэс, 2005.*

«СССР у 70-я гады вырабляў у 20 разоў больш танкаў, чым ЗША.

Пытанне Г. Шахназарава, памочніка генеральнага сакратара КПСС М. Гарбачова (1980-я гады): "Навошта вырабляць столькі зброі?"

Адказ начальніка Генштаба С. Ахрамеева: "Таму што цаной вялікіх ахвяр мы стварылі першакласныя заводы, не горшыя,

чым у амерыканцаў. Вы што, загадаеце ім спыніць працу і вырабляць палонікі?”»

*Ягор Гайдар. Гібель імперыі. Масква: Расійская палітычная энцыклапедыя, 2007.*

«На дзявяты дзень працы Першага З'езда народных дэпутатаў СССР у зале з'явіліся ўлёткі, дзе паведамлялася, што Сахараў у інтэрв'ю адной з канадскіх газет заявіў: “У часе афганскай вайны з савецкіх верталётаў расстрэльвалі сваіх жа салдат, якія трапілі ў аблогу, каб тыя не маглі здацца ў палон”...

На трыбуне першы сакратар Чаркаскага гаркама камсамола, ветэран афганскай вайны С. Чырвонапіскі, у яго няма ног, яму дапамагаюць дайсці да трыбуны. Ён зачытвае зварот ветэранаў-афганцаў: “Спадар Сахараў сцвярджае, што ёсць звесткі аб расстрэле савецкімі верталётамі савецкіх жа салдат... Нас сур'ёзна непакоіць беспрэцэдэнтнае цкаванне Савецкай Арміі ў сродках масавай інфармацыі. Мы да глыбіні душы абураныя гэтай безадказнай, правакацыйнай выхадкай вядомага навукоўца. Гэта зламысны выпад супраць нашай арміі, прыніжэнне яе гонару і годнасці, чарговая спроба разарваць святарнае адзінства арміі, народа і партыі... (Авацыі.) У зале больш за 80 адсоткаў камуністаў. Толькі ні ад каго, у тым ліку і ў дакладзе таварыша Гарбачова, не прагучала слова — камунізм. Але тры словы, за якія, я лічу, усім светам нам трэба змагацца, я сёння назаву — гэта: Дзяржава, Радзіма, Камунізм...”

Апладысменты. Усе дэпутаты ўстаюць — акрамя дэмакратаў і мітрапаліта Алексія.

Настаўніца з Узбекістана:

“Таварыш акадэмік! Вы адным сваім учынкам перакрэслілі ўсю сваю дзейнасць. Вы нанеслі абразу ўсёй арміі, усім нашым палеглым. І я выказваю ўсеагульную ганьбу вам...”

Маршал Ахрамееў:

“Тое, што сказаў акадэмік Сахараў, — гэта хлусня. Нічога падобнага ў Афганістане не было. Заяўляю гэта з поўнай

адказнасцю. Па-першае, я два з паловай гады праслужыў у Афганістане, па-другое, будучы першым намеснікам начальніка Генштаба, а потым начальнікам Генштаба, кожны дзень займаўся Афганістанам, ведаю кожную дырэктыву, кожны дзень баявых дзеянняў. Не было!"»

*В. Колесаў. Перабудова, летапіс. 1985–1991 // Lib.ru. Сучасная літаратура*

«— Таварыш маршал, якія пачуцці вы перажываеце, ведаючы, што званне Героя Савецкага Саюза атрымалі за Афганістан? Акадэмік Сахараў агучыў лічбу: страты афганскага народа — адзін мільён чалавек…

—Вы думаеце, я шчаслівы, што атрымаў Зорку Героя? Загад я выконваў, але там адна кроў… бруд… Я не раз казаў, што вайсковае кіраўніцтва было супраць гэтай вайны, разумеючы, што нас уцягнуць у баявыя дзеянні ў цяжкіх, незнаёмых умовах. Супраць СССР падымецца ўвесь усходні ісламізм. Мы згубім твар у Еўропе. Нам было жорстка сказана: "З якога гэта часу генералы ў нашай краіне сталі лезці ў палітыку?" Мы прайгралі барацьбу за афганскі народ… Але ў гэтым няма віны нашай арміі…»

*Інтэрв'ю для тэленавін. 1990 г.*

«…Дакладваю аб ступені майго ўдзелу ў злачынных дзеяннях так званага "Дзяржаўнага камітэта па надзвычайным становішчы…" (ГКЧП).

6 жніўня г. г. на Ваша распараджэнне я адбыў у адпачынак у вайсковы санаторый г. Сочы, дзе знаходзіўся па 19 жніўня. Да ад'езду ў санаторый і ў санаторыі да раніцы 19 жніўня мне нічога не было вядома пра падрыхтоўку змовы. Ніхто, нават намёкам, мне не казаў пра яе арганізацыю і арганізатараў, гэта значыць, у яе падрыхтоўцы і ажыццяўленні я ніяк не ўдзельнічаў. Раніцай 19 жніўня, пачуўшы ў тэлебачанні пра дакументы названага "Камітэта", самастойна прыняў рашэнне ляцець у Маскву. А 8-й гадзіне вечара сустрэўся з Янаевым Г. І. Сказаў

яму, што згодны з праграмай, выкладзенай "Камітэтам" у яго Звароце да народа, і прапанаваў пачаць працу з ім у якасці дарадцы в. а. Прэзідэнта СССР. Янаеў Г. І. пагадзіўся з гэтым, але, спаслаўшыся на занятасць, вызначыў час наступнай сустрэчы прыкладна ў 12 гадзін 20 жніўня. Ён сказаў, што ў "Камітэта" не арганізаваная інфармацыя пра абстаноўку і добра, калі б я заняўся гэтым…

Раніцай 20 жніўня я сустрэўся з Бакланавым А. Д., які атрымаў такое самае даручэнне. Вырашылі працаваць у гэтай справе сумесна… Сабралі працоўную групу з прадстаўнікоў ведамстваў і арганізавалі збор і аналіз абстаноўкі. Практычна гэтая працоўная група падрыхтавала два даклады: да 9 вечара 20 жніўня і да раніцы 21 жніўня, якія былі разгледжаныя на пасяджэнні "Камітэта".

Акрамя таго, 21 жніўня я працаваў над падрыхтоўкай даклада Янаева Г. І. на Прэзідыуме Вярхоўнага Савета СССР. Увечары 20 жніўня і раніцай 21 жніўня я ўдзельнічаў у пасяджэннях "Камітэта", дакладней, той яго часткі, якая адбывалася ў прысутнасці запрошаных. Гэта праца, у якой я ўдзельнічаў 20 і 21 жніўня г. г. Акрамя таго, 20 жніўня, прыкладна а 3-й гадзіне дня, я сустракаўся ў міністэрстве абароны з Язавым Д. Ц. на ягоную просьбу. Ён сказаў, што абстаноўка ўскладняецца, і выказаў сумнеў у поспеху задуманага. Пасля размовы ён папрасіў прайсці з ім разам да намесніка міністра абароны генерала Ачалава В. А., дзе ішла работа над планам захопу будынка Вярхоўнага Савета РСФСР. Ён заслухаў Ачалава В. А. на працягу трох хвілін толькі пра склад войскаў і тэрміны дзеянняў. Я нікому ніякіх пытанняў не задаваў…

Чаму я прыехаў у Маскву з уласнай ініцыятывы — ніхто мяне з Сочы не выклікаў — і пачаў працаваць у "Камітэце"? Я ж быў упэўнены, што гэтая авантура пацерпіць паразу, а прыехаўшы ў Маскву, яшчэ раз пераканаўся ў гэтым. Справа ў тым, што, пачынаючы з 1990 года, я быў перакананы, як перакананы і сёння, што наша краіна ідзе да пагібелі. Неўзабаве

яна будзе падзеленая на кавалкі. Я шукаў спосаб гучна заявіць пра гэта. Палічыў, што мой удзел у забеспячэнні працы "Камітэта" і наступнае звязанае з гэтым разбіральніцтва дасць мне магчымасць наўпрост сказаць пра гэта. Гучыць, напэўна, непераканаўча і наіўна, але гэта так. Ніякіх карыслівых матываў у гэтым маім рашэнні не было...»

*Ліст Прэзідэнту СССР М. С. Гарбачову. 22 жніўня 1991 г.*

«...Гарбачоў дарагі, але Айчына даражэйшая! Хай у гісторыі хоць застанецца след — супраць гібелі такой вялікай дзяржавы пратэставалі. А ўжо гісторыя ацэніць, хто меў рацыю, а хто вінаваты...»

*З нататніка. Жнівень 1991 г.*

### *З аповеду N.*

*(Прозвішча і сваю пасаду ў апараце Крамля прасіў не называць)*

*Гэта быў асаблівы сведка. Са святая святых — з Крамля, галоўнай цытадэлі камунізму. Сведка з таго жыцця, якое было ад нас схаванае. Ахоўвалася, як жыццё кітайскіх імператараў. Зямных багоў. Угаворвала я яго доўга.*

*З нашых тэлефонных размоваў*

...Пры чым тут гісторыя? «Смажаныя» факты вам падавай, што-небудзь востранькае, з душком? На кроў, на мяса ўсе бягуць. Смерць — ужо тавар. Усё на рынак нясуць. Абывацель будзе ў захапленні... упырсне сабе адрэналінчыку... Не кожны дзень імперыя валіцца. Ляжыць мордай у гразь! У кроў! І не кожны дзень маршал імперыі сканчае жыццё самагубствам... вешаецца ў Крамлі на батарэі паравога ацяплення...

...чаму ён сышоў? Ягоная краіна сышла, і ён сышоў разам з ёй, ён больш сябе тут не бачыў. Ён... я так думаю... ужо ўявіў,

як усё будзе. Як разгромяць сацыялізм. Балбатня скончыцца крывёю. Рабункам. Як势 стануць валіць помнікі. Савецкія багі пойдуць на металалом. Ва ўтыльсыравіну. Пачнуць пагражаць камуністам Нюрнбергам… А суддзі — хто? Адны камуністы судзілі б іншых камуністаў — тыя, хто выйшаў з партыі ў сераду, судзілі б тых, хто выйшаў з партыі ў чацвер. Як пераймянуюць Ленінград… калыску рэвалюцыі… Як стане модным мацярыць КПСС, і ўсе пачнуць яе мацярыць. Як будуць хадзіць па вуліцах з плакатамі: «КПСС — капут!», «Кіруй, Барыс!». Шматтысячныя дэманстрацыі… Якое захапленне на тварах! Краіна гінула, а яны былі шчаслівыя. Крышыць! Валіць! Для нас гэта заўсёды свята… Свяцейка! Далі б толькі каманду «фас!». Пачаліся б пагромы… «Жыдоў і камісараў да сценкі!» Народ гэтага чакаў. Быў бы рады. Зладзілі б паляванне на старых-пенсіянераў. Я сам знаходзіў на вуліцы ўлёткі з адрасамі кіраўнікоў ЦК — прозвішча, дом, кватэра, а іх партрэты расклейвалі паўсюль, дзе толькі можна. Каб у выпадку чаго — пазналі. Са сваіх кабінетаў партнаменклатура бегла з поліэтыленавымі пакетамі. З авоськамі. Многія баяліся начаваць дома, хаваліся ў сваякоў. Інфармацыя ў нас была… Ведалі, як усё адбывалася ў Румыніі… Расстралялі Чаўшэску з жонкай, і пачкамі вывозілі і ставілі да сценкі чэкістаў, партыйную эліту. Засыпалі ў равах… *(Доўгая паўза.)* А ён… ён быў ідэалістычны, рамантычны камуніст. Верыў у «зіхоткія вяршыні камунізму». У літаральным сэнсе. У тое, што камунізм прыйшоў назаўжды. Недарэчнае сёння гэта прызнанне… ідыёцкае… *(Паўза.)* Тое, што пачыналася, ён не прымаў. Бачыў, як заварушыліся маладыя драпежнікі… піянеры капіталізму… Не з Марксам і не з Леніным у галаве, а з доларам…

…Што гэта за путч, калі не страляюць? Войска баязліва ўцякло з Масквы. Пасля арышту членаў ГКЧП ён чакаў, што неўзабаве прыйдуць і па яго, павядуць у кайданках. З усіх памочнікаў і дарадцаў прэзідэнта ён адзін падтрымаў «путчыстаў». Падтрымаў адкрыта. Астатнія выседжвалі ў чаканні.

Пераседжвалі. Бюракратычны апарат — гэта машына з вялікай здольнасцю да манеўравання... Да выжывання. Прынцыпы? У бюракратыі няма перакананняў, прынцыпаў, усёй гэтай мутнай метафізікі. Галоўнае — уседзець у крэсле, каб як насілі, так і неслі, барашка ў паперчыне, шчанюкоў завадовых. Бюракратыя — наш канёк. Яшчэ Ленін казаў, што бюракратыя страшнейшая за Дзянікіна. Цэніцца толькі адно — асабістая адданасць, і не забывай, хто твой гаспадар, з чыёй рукі кормішся. *(Паўза.)* Ніхто пра ГКЧП праўды не ведае. Усе хлусяць. Так... вось... Насамрэч, была задуманая вялікая гульня, таемных спружынаў і ўсіх яе ўдзельнікаў мы не ведаем. Туманная роля Гарбачова... Што ён сказаў журналістам, калі вярнуўся з Фароса? «Усяго я вам усё адно ніколі не скажу». Дык і не скажа! *(Паўза.)* І, можа быць, гэта таксама адна з прычынаў, чаму ён сышоў. *(Паўза.)* Статысячныя дэманстрацыі... гэта моцна дзейнічала... Цяжка было захаваць нармальны стан... Не за сябе ён баяўся... Не мог змірыцца з тым, што хутка ўсё будзе затаптана, заліта бетонам: савецкі лад, вялікая індустрыялізацыя... вялікая Перамога... І акажацца, што і «Аўрора» не страляла, і штурму Зімняга не было...

...Ганяць эпоху... Час наш подлы. Пусты. Усё завалена анучамі і відзікамі. Дзе вялікая краіна? Як што якое, нікога мы сёння не пераможам. І Гагарын не паляціць.

*Зусім нечакана пад канец адной нашай размовы я, нарэшце, пачула: «Добра, прыходзьце». Мы сустрэліся на наступны дзень у яго дома. Ён быў у чорным строі і гальштуку, нягледзячы на спякоту. Крамлёўская ўніформа.*

— А ці былі вы ў... *(Называе некалькі вядомых прозвішчаў.)*? А... *(Яшчэ адно імя, якое даўно ва ўсіх на слыху.)* Іх версія — забілі! — я ў гэта не веру. Быццам бы ходзяць чуткі пра нейкіх сведкаў... факты... Шпагат, маўляў, не той, тонкі ён, ім можна толькі задушыць, і ключ у кабінеце звонку быў пакінуты...

Усякае кажуць… Людзі любяць палацавыя таямніцы. Я вам скажу іншае: сведкамі таксама кіруюць. Гэта не робаты. Імі тэлебачанне кіруе. Газеты. Сябры… карпаратыўныя інтарэсы… У каго праўда? Я так разумею, што праўду шукаюць спецыяльна навучаныя людзі: суддзі, навукоўцы, святары. Астатнія ўсе ва ўладзе сваіх амбіцый… эмоцый… *(Паўза.)* Я чытаў вашы кнігі… Дарэмна вы так давяраеце чалавеку… чалавечай праўдзе… Гісторыя — гэта жыццё ідэй. Не людзі пішуць, а час піша. А чалавечая праўда — гэта цвік, на які кожны вешае свой капялюш.

…Пачаць трэба з Гарбачова… Без яго жылі б мы дагэтуль у СССР. Ельцын быў бы першым сакратаром абкама партыі ў Свярдлоўску, Ягор Гайдар рэдагаваў бы артыкулы па эканоміцы ў газеце «Правда» і верыў у сацыялізм. А Сабчак чытаў бы лекцыі ў Ленінградскім універсітэце… *(Паўза.)* СССР яшчэ надоўга б хапіла. Калос на гліняных нагах? Лухта поўная! Мы былі магутнай звышдзяржавай, дыктавалі сваю волю многім краінам. Тая ж Амерыка нас баялася. Жаночых калготак бракавала і джынсаў? Каб перамагчы ў атамнай вайне, патрэбныя не калготкі, а сучасныя ракеты і бамбавікі. Мы іх мелі. Першакласныя. У любой вайне мы б перамаглі. Рускі салдат не баіцца паміраць. Тут мы азіяты… *(Паўза.)* Сталін стварыў дзяржаву, якую немагчыма было прабіць знізу, яна была непрабівальная. А зверху — уразлівая, безабаронная. Ніхто не думаў, што руйнаваць яе пачнуць зверху, на шлях здрады ўстане вышэйшае кіраўніцтва краіны. Перараджэнцы! Генеральны сакратар акажацца галоўным рэвалюцыянерам, які засеў у Крамлі. Зверху гэтую дзяржаву разбурыць было лёгка. Жорсткая дысцыпліна і іерархія ў партыі спрацавалі супраць яе. Выпадак унікальны ў гісторыі… Як… калі б Рымскую імперыю пачаў разбураць сам Цэзар… Не, Гарбачоў не пігмей, і не цацка ў руках абставін, і не агент ЦРУ… Хто ж ён?

«Магільшчык камунізму» і «здраднік Радзімы», «нобелеўскі трыумфатар» і «савецкі банкрут», «галоўны шасцідзясятнік»

і «найлепшы немец», «прарок» і «Юдушка», «вялікі рэфарматар» і «вялікі артыст», «вялікі Горбі» і «Гарбач», «чалавек стагоддзя» і «Герастрат»... Усё пра аднаго чалавека.

...Да самагубства Ахрамееў рыхтаваўся некалькі дзён: дзве перадсмяротныя запіскі напісаныя 22-га, адна — 23-га і апошнія — 24 жніўня. А што адбылося ў гэты дзень? Менавіта 24 жніўня радыё і тэлебачанне перадалі заяву Гарбачова пра складанне з сябе паўнамоцтваў Генеральнага сакратара ЦК КПСС і яго заклік да самароспуску партыі: «Трэба прыняць цяжкае, але сумленнае рашэнне». Генеральны сакратар сышоў без барацьбы. Не звярнуўся да народа і мільёнаў камуністаў... Здрадзіў. Здаў усіх. Магу здагадацца, што перажыў у гэтыя хвіліны Ахрамееў. Не выключана, цалкам імаверна, што па дарозе на працу ён убачыў, як спускалі сцягі з дзяржаўных устаноў. З вежаў Крамля. Якія маглі быць у яго пачуцці? Камуніста... франтавіка... Усё яго жыццё страціла сэнс... Я не магу ўявіць яго ў сённяшнім нашым жыцці. Не савецкім. Каб сядзеў у прэзідыуме пад расійскім трыкалорам, а не пад чырвоным сцягам. Не пад партрэтам Леніна, а пад царскім арлом. Не ўпісваецца ён ніяк у новы інтэр'ер. Гэта быў савецкі Маршал... разумееце... Са-ве-цкі!! Толькі так, і не іначай. Толькі...

У Крамлі яму было няўтульна. «Белая варона»... «салдафон»... Так ён і не прыжыўся, казаў, што «шчырае бескарыслівае таварыства бывае толькі ў войску». Усё... вось... усё сваё жыццё ён пражыў з арміяй. З вайсковымі людзьмі. Паўстагоддзя. Вайсковую форму надзеў у сямнаццаць гадоў. Гэта — тэрмін! Жыццё! У крамлёўскі кабінет пераехаў пасля адстаўкі з пасады начальніка Генштаба. Рапарт напісаў сам. З аднаго боку, ён лічыў, што трэба своечасова сыходзіць (нагледзеліся катафалкаў), даваць дарогу маладым, а з другога — у яго пачаліся канфлікты з Гарбачовым. Той армію не любіў, як і Хрушчоў, які генералаў і наогул вайскоўцаў інакш як дармаедамі не называў. Краіна ў нас была вайсковая, адсоткаў семдзесят эканомікі так ці інакш абслугоўвала армію. І найлепшыя галовы

таксама… фізікі, матэматыкі… Усе працавалі на танкі і бомбы. Ідэалогія таксама вайсковая. А Гарбачоў быў чыста цывільны чалавек. У ранейшых генсекаў за спінаю вайна, а ў яго філасофскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. «Вы збіраецеся ваяваць? — пытаўся ён у вайскоўцаў. — Я не збіраюся. А генералаў і адміралаў у нас толькі ў адной Маскве больш, чым ва ўсім свеце». Раней ніхто так з вайскоўцамі не размаўляў, яны былі галоўныя людзі. Не міністр эканомікі першым дакладваў на Палітбюро, а міністр абароны: колькі выпусцілі вайсковага ўзбраення, а не відэамагнітафонаў. Таму відэамагнітафон у нас каштаваў, як кватэра. А тут усё мяняецца… І вядома, вайскоўцы паўсталі. Нам патрэбная вялікая і моцная армія, у нас тэрыторыя вунь якая! — мяжа з паловаю свету. З намі лічацца, пакуль мы моцныя, а станем слабымі, ніякае «новае мысленне» нікога ні ў чым не пераканае. Асабіста Ахрамееў шмат разоў яму дакладваў… Тут галоўнае разыходжанне паміж імі… Пра дробныя канфлікты, ні пра што такое я цяпер успамінаць не буду. З выступаў Гарбачова зніклі знаёмыя кожнаму савецкаму чалавеку словы: «падкопы міжнароднага імперыялізму», «удар у адказ», «заакіянскія варацілы»… Усё гэта ён выкрэсліваў. Былі ў яго толькі «ворагі галоснасці» і «ворагі перабудовы». У сябе ў кабінеце мацюкаўся (мастак быў!) і называў іх мудакамі. *(Паўза.)* «Дылетант», «рускі Гандзі»… Не самае крыўднае з таго, што чуваць было ў крамлёўскіх калідорах. «Старыя зубры», ясная рэч, у шоку, прадчувалі бяду: сам патоне і ўсіх патопіць. Для Амерыкі мы — «імперыя зла», нам пагражаюць крыжовым паходам… «зорнымі войнамі»… А наш галоўнакамандуючы кшталту будысцкага манаха: «свет як агульны дом», «перамены без гвалту і крыві», «вайна больш не ёсць працягам палітыкі» і г. д. Ахрамееў доўга змагаўся, але стаміўся. Спачатку ён думаў, што гэта няправільна дакладваюць наверх, падманваюць, потым зразумеў, што гэта — здрада. І падаў рапарт. Гарбачоў адстаўку прыняў, але ад сябе не адпусціў. Прызначыў вайсковым дарадцам.

…Небяспечна было кранаць гэтую канструкцыю. Сталінскую… савецкую… называйце як заўгодна… Наша дзяржава заўсёды існавала ў мабілізацыйным рэжыме. З першых дзён. На мірнае жыццё яна не разлічаная. Зноў жа… Думаеце, мы не маглі наштампаваць модных жаночых боцікаў і прыгожых станікаў? Пластмасавых «відзікаў». Адным скокам. Але ў нас мэта была іншая… А народ? *(Паўза.)* Народ простых рэчаў чакае. Каб пернікаў было да схочу. І — цара! Гарбачоў не захацеў быць царом. Адмовіўся. А ўзяць Ельцына… Калі ён адчуў у 93-м годзе, што прэзідэнцкае крэсла пад ім захісталася, ён не разгубіўся і даў каманду страляць па Парламенце. Камуністы ў 91-м пабаяліся страляць… Гарбачоў аддаў уладу без крыві… А Ельцын смаліў з танкаў. Учыніў бойню. Дык… вось… І яго падтрымалі. Краіна ў нас царская ў менталітэце, падсвядома. У генах. Усім цар патрэбны. Івана Грознага (у Еўропе яго празвалі «жахлівым»), які заліў рускія гарады крывёю і прайграў Лівонскую вайну, успамінаюць са страхам і захапленнем. Як і Пятра Першага, і Сталіна. А Аляксандра Другога Вызваліцеля… цара, які падараваў Расіі свабоду… забілі… Гэта ў чэхаў можа быць Вацлаў Гавэл, а нам патрэбны не Сахараў, а цар. Цар-бацюшка! Генеральны сакратар ці прэзідэнт — у нас усё адно гэта цар. *(Доўгая паўза.)*

*Паказвае мне свой нататнік з цытатамі з твораў марксісцкіх класікаў. Запісваю сабе адну ленінскую цытату: «Я згодны жыць у свіным хляве — толькі была б у ім савецкая ўлада». Прызнаюся, што і я Леніна не чытала.*

…Ну, а гэта іншы… іншы бок… Дзеля разрадкі… У нас гутарка, як кажуць, у вузкім коле, за столікам. У Крамлі быў свой кухар. Усе члены Палітбюро замаўлялі яму селядца, сала, чорную ікру, а Гарбачоў усё больш націскаў на кашы. Салацікі. Чорную ікру прасіў яму не падаваць: «Ікра пад гарэлачку добра ідзе, а я не п’ю». Дыеты ў іх з Раісай Максімаўнай, разгрузачныя дні. Ні на каго з ранейшых генсекаў ён не быў падобны. Зусім не па-савецку, пяшчотна кахаў сваю жон-

ку. Гулялі яны, трымаючыся за рукі. А Ельцын, да прыкладу, з раніцы просіць чарку і гурочак. Вось гэта — па-руску. *(Паўза.)* Крэмль — тэрарыум. Я раскажу… Толькі друкуйце без майго прозвішча… ананімна дайце інфармацыю… Ужо я на пенсіі… Ельцын набраў сваю каманду, «гарбачоўцаў» вымелі, так ці інакш усіх прыбралі. Таму і сяджу з вамі, што пенсіянер, а так бы маўчаў як партызан. Дыктафона не баюся, але ён мне замінае. Звычка, ведаеце. Нас прасвечвалі, як на рэнтгене… *(Паўза.)* Здавалася б, дробязь, аднак гэта характарызуе чалавека… Ахрамееў пераехаў у Крэмль і адразу ж адмовіўся ад павышанага ў некалькі разоў акладу. Папрасіў пакінуць яму той, які ў яго быў: «Мне хапае». Хто з нас донкіхот? І хто, скажыце, лічыць донкіхота нармальным? Калі была выдадзеная пастанова ЦК КПСС і ўрада (пачалася барацьба з прывілеямі) пра абавязковую здачу замежных падарункаў, даражэйшых за 500 рублёў, у даход дзяржавы, ён аказаўся першым і адным з нямногіх, хто гэтую пастанову выконваў. Крамлёўскія норавы… Служыць, прагінацца, ведаць, на каго данесці, а каму своечасова падгігікнуць. З кім павітацца, а каму злёгку кіўнуць. Усё наперад пралічваць… Дзе вам далі кабінет? Побач з прэзідэнтам — на адным паверсе? Калі не — вы не чалавек… Так… дробная казурка… Якія ў вас стаяць тэлефоны? «Вяртушка» ёсць? А тэлефон з надпісам «Прэзідэнт» для наўпроставай сувязі з «самім»? Ці даюць вам машыну з гаража асобага прызначэння…

…чытаю Троцкага «Маё жыццё». Там добра адлюстраваная кухня рэвалюцыі… Усе цяпер заселі за Бухарына. Яго лозунг «Узбагачайцеся, назапашвайце» — прыйшоўся дарэчы. Самы раз. Бухарчык (як ахрысціў яго Сталін) прапаноўваў «урастаць у сацыялізм», Сталіна называў Чынгісханам. Але таксама постаць неадназначная… Гатовы быў, як усе, кідаць людзей у печку сусветнай рэвалюцыі, не лічачы. Выхоўваць расстрэламі. Гэта не Сталін першы прыдумаў… Усе яны вайсковыя людзі — пасля рэвалюцыі, пасля грамадзянскай вайны. Пасля

крыві... *(Паўза.)* У Леніна ёсць заўвага, што рэвалюцыі прыходзяць тады, калі яны самі гэтага хочуць, а не калі хтосьці хоча. Так... вось... так... Перабудова... галоснасць... Усё мы выпусцілі з рук... Чаму? У вышэйшых эшалонах улады было нямала разумных людзей. Чыталі Бжэзінскага... Але ўяўленне было такое: падрамантуем, падмажам і далей паедзем. Не ведалі, да якой ступені нашым людзям надакучыла ўсё савецкае. Самі мала верылі ў «светлую будучыню», але верылі, што народ верыць... *(Паўза.)* Не... Ахрамеева не забілі... Адкінем канспіралагічныя тэорыі... Самагубства — гэта быў ягоны апошні аргумент. Сыходзячы, ён усё ж сказаў пра галоўнае: ляцім у бездань. Была вялізная краіна, гэтая краіна выйграла страшную вайну — і вось яна рушыцца. Кітай не рухнуў. І Паўночная Карэя, дзе людзі мруць з голаду. І маленькая сацыялістычная Куба стаіць, а мы знікаем. Нас узялі не танкамі і ракетамі, а разбурылі тое, чым мы былі найбольш моцныя. Наш дух. Згніла сістэма, згніла партыя. І можа быць, менавіта таму... гэта таксама адна з прычын ягонага сыходу...

...Нарадзіўся ён у глухой мардоўскай вёсцы, рана страціў бацькоў. Пайшоў на вайну курсантам вайсковага марскога вучылішча. Добраахвотнікам. Дзень Перамогі сустрэў у шпіталі — поўнае нервовае знясіленне, важыў трыццаць восем кілаграмаў. *(Паўза.)* Перамагла змучаная, хворая армія. Знямоглая, прастуджаная. З радыкулітамі, артрытамі... язвай страўніка... Я такой яе памятаю... Мы з ім з аднаго пакалення — людзі вайны. *(Паўза.)* Ад курсанта ён падняўся да самых вяршыняў вайсковай піраміды. Савецкая ўлада дала яму ўсё: вышэйшае воінскае званне Маршала, Зорку Героя, Ленінскую прэмію... Не спадкаемнаму прынцу, а хлопчыку з простай сялянскай сям'і. З глухой ускраіны. І тысячам такіх, як ён, дала яна шанц. Бедным... маленькім людзям... І ён любіў савецкую ўладу.

*Званок у дзверы. Заходзіць хтосьці са знаёмых. Штосьці доўга абмяркоўваюць у вітальні. Калі N. вяртаецца, я бачу: ён*

*крыху засмучаны і гаворыць ужо не так ахвотна, але потым, на шчасце, зноў ажывае.*

—Мы разам працавалі... клікаў да нас... Адмовіўся: гэта партыйная таямніца, і разгалошваць яе нельга. Нашто падпускаць да яе чужых. *(Паўза.)* Я не быў сябрам Ахрамеева, але я ведаў яго шмат гадоў. Ніхто не пайшоў на крыж дзеля ўратавання краіны. Адзін ён. А мы сталі рупіцца пра персанальныя пенсіі і захаванне за намі дзяржаўных лецішчаў. Не магу змаўчаць...

...Да Гарбачова нашых лідараў народ бачыў толькі на трыбуне маўзалея: андатравыя шапкі і каменныя твары. Анекдот: «Чаму зніклі андатравыя шапкі?» — «Таму што наменклатура размнажаецца хутчэй за андатру». *(Смяецца.)* Нідзе гэтулькі не распавядалі анекдотаў, як у Крамлі. Палітычных анекдотаў... антысавецкіх... *(Паўза.)* Перабудова... Дакладна не памятаю, але мне здаецца, што першы раз я пачуў гэтае слова за мяжой ад тамтэйшых журналістаў. У нас часцей казалі: «паскарэнне» і «ленінскі шлях». А за мяжой пачаўся гарбачоўскі шал, увесь свет захварэў на «горбіманію». Там перабудовай называлі ўсё, што ў нас адбывалася. Усе перамены. Калі па вуліцы ехаў картэж з Гарбачовым, стаялі тысячы людзей уздоўж дарогі. Слёзы, усмешкі. Гэта ўсё я памятаю... Нас палюбілі! Знік страх перад КДБ, а галоўнае — абвешчаны канец ядзернаму шаленству... І за гэта свет быў нам удзячны. Дзясяткі гадоў атамнай вайны баяліся ўсе, нават дзеці. Прывыклі глядзець адно на аднаго з акопа. Праз прыцэл... *(Паўза.)* У еўрапейскіх краінах сталі вучыць рускую мову... у рэстаранах падавалі рускія стравы: боршч, пельмені... *(Паўза.)* Я дзесяць гадоў адпрацаваў у ЗША і Канадзе. Вярнуўся дадому ў гарбачоўскі час... Убачыў шмат шчырых, сумленных людзей, якія жадаюць ва ўсім удзельнічаць. Я бачыў такіх людзей... калі паляцеў у космас Гагарын... Такія твары... У Гарбачова было шмат аднадумцаў, але менш за ўсё іх было сярод наменклатуры. Цэкоўскай... абкамаўскай... «Курортны сакратар» — гэта за тое, што ўзялі яго

ў Маскву са Стаўрапаля, дзе любілі адпачываць генеральныя сакратары, члены Палітбюро. «Мінеральны сакратар» і «сокін сын» за антыалкагольную кампанію. Кампрамат назапашваўся: будучы ў Лондане, не наведаў магілу Маркса… Выпадак небывалы! Вярнуўся з Канады, нахвальваў усім, як там добра. І тое добра, і гэта… а ў нас… Зразумела, што ў нас… Хтосьці не вытрымаў: «Міхаіл Сяргеевіч, і ў нас так будзе гадоў праз сто». — «Ну, ты аптыміст». Дарэчы, тыкаў ён усім… *(Паўза.)* Прачытаў у аднаго «дэмакратычнага» публіцыста, што ваеннае пакаленне… гэта значыць — мы… лішне затрымалася ва ўладзе. Перамаглі, адбудавалі краіну і трэба было сыходзіць, бо іншага ўяўлення пра жыццё, акрамя як жыць па ваенных мерках, не мелі. Праз гэта так адсталі ад усяго свету… *(Агрэсіўна.)* «Чыкагскія хлопчыкі»… «рэфарматары ў ружовых штоніках»… Дзе вялікая краіна? Калі б гэта была вайна, мы б перамаглі. Калі б вайна… *(Доўга супакойваецца.)*

…Але чым далей, тым больш Гарбачоў нагадваў прапаведніка, а не генсека. Стаў тэлезоркай. Хутка ўсім надакучыла слухаць яго казанні: «назад да Леніна»… «скачок у развіты сацыялізм»… Узнікала пытанне: а што тады ў нас пабудаванае — «недаразвіты сацыялізм»? Што ў нас… *(Паўза.)* Я памятаю, за мяжой мы бачылі іншага Гарбачова, там ён мала нагадваў таго Гарбачова, якога ведалі дома. Там ён адчуваў сябе вольным. Удала жартаваў, дакладна фармуляваў свае думкі. А дома інтрыгаваў, лавіраваў. І праз гэта здаваўся слабым. Балбатуном. Але слабым ён не быў. І баязліўцам таксама. Усё гэта — няпраўда. Халодны і спрактыкаваны палітык. Чаму два Гарбачовы? Калі б ён быў дома шчырым, як «за бугром», яго б «старцы» імгненна раскусілі і з'елі. Ёсць яшчэ адна прычына… Ён… я так думаю… даўно перастаў быць камуністам… ужо не верыў у камунізм… Таемна або падсвядома ён быў сацыял-дэмакратам. Асабліва не афішавалася, але ўсе ведалі, што ў маладосці ён вучыўся ў Маскоўскім універсітэце (МДУ) разам з лідарам Пражскай вясны Аляксандрам Дубчакам і яго

паплечнікам Здэнекам Млынаржам. Яны сябравалі. Млынарж напісаў у сваіх успамінах, што, калі ім прачыталі на закрытым партсходзе ва ўніверсітэце даклад Хрушчова на XX з'ездзе, яны перажылі такое ўзрушэнне, што ўсю ноч блукалі па Маскве. А раніцай на Ленінскіх гарах, як калісьці Герцэн і Агароў, пакляліся ўсё жыццё змагацца са сталінізмам. *(Паўза.)* Уся перабудова адтуль… З хрушчоўскай адлігі…

…Мы ўжо пачыналі гэтую тэму… Ад Сталіна і да Брэжнева на чале краіны стаялі кіраўнікі, якія ваявалі. Перажылі час тэрору. Іх псіхалогія склалася ва ўмовах гвалту. Пастаяннага страху. Не маглі яны забыць і сорак першы год… Ганебнае адступленне Савецкай арміі да Масквы. Як у бой салдат выпраўлялі са словамі: зброю здабудзеце ў баі. Людзей не лічылі, а патроны лічылі. Нармальна… Лагічна, што людзі з такой памяццю верылі ў тое, што для перамогі над ворагам трэба рабіць танкі і самалёты. Чым больш, тым лепш. Узбраення ў свеце назапасілася столькі, што СССР і Амерыка маглі забіць адно аднаго тысячу разоў. А зброю працягвалі штампаваць. І вось прыйшло новае пакаленне… Уся гарбачоўская каманда — гэта дзеці ваенных гадоў… У іх свядомасці адбілася радасць міру… Маршал Жукаў, які прымае парад Перамогі на белым кані… Ужо іншае пакаленне… і іншы свет… Першыя не давалі веры Захаду, бачылі ў ім ворага, а другія хацелі жыць, як на Захадзе. Ясная рэч, «старцаў» Гарбачоў палохаў… Палохалі ягоныя размовы пра «пабудову бяз'ядзернага свету» — бывай, пасляваенная дактрына «раўнавагі страху», пра тое, што «ў ядзернай вайне не можа быць пераможцаў», — значыць, згортваем «абаронку», скарачаем армію. Першакласныя вайсковыя заводы стануць чарпакі выпускаць і шаткаўніцы… Сапраўды? Быў момант, калі вышэйшы генералітэт знаходзіўся амаль у стане вайны супраць палітычнага кіраўніцтва. Супраць Генсека. Яму не маглі дараваць страты Усходняга блоку, нашы ўцёкі з Еўропы. Асабліва з ГДР. Нават канцлер Коль быў здзіўлены марнатраўствам Гарбачова: нам прапаноўвалі

велізарныя грошы за сыход з Еўропы, ён адмовіўся. Здзіўляла ягоная наіўнасць. Руская прастата. Так хацелася яму, каб яго любілі... каб французскія хіпі насілі майкі з ягоным партрэтам... Інтарэсы краіны здаваліся бяздарна і ганебна. Армію выводзілі ў лес, у рускае поле. Афіцэры і салдаты жылі ў намётах. У зямлянках. Перабудова... як вайна... гэта не было падобна да адраджэння...

На савецка-амерыканскіх перамовах па раззбраенні амерыканцы заўсёды атрымлівалі тое, чаго хацелі менавіта яны. Ахрамееў апісвае ў кнізе «Вачыма маршала і дыпламата», як ішлі дэбаты наконт ракеты «Ака» (на Захадзе яе менавалі СС-23). Ракета новая, ніхто больш такой не меў, і амерыканскі бок ставіў мэту яе знішчыць. Але пад пункты дамовы яна не трапляла: знішчэнню падлягалі ракеты сярэдняй дальнасці ад 1000 да 5500 км і менш — ад 500 да 1000 км. Баявы радыус «Акі» — 400 км. Савецкі Генштаб прапаноўваў амерыканцам: вось жа, давайце сумленна — забаронім усе ракеты ў дыяпазоне не ад 500, а ад 400 да 1000 км. Але тады амерыканцам давялося б ахвяраваць сваёй мадэрнізаванай ракетай «Лэнс-2» з дальнасцю 450–470 км. Доўгая закулісная барацьба... Таемна ад вайскоўцаў Гарбачоў асабіста прыняў рашэнне пра знішчэнне «Акі». Менавіта тады Ахрамееў сказаў сваю знакамітую фразу: «Можа быць, нам адразу папрасіць палітычнага прытулку ў нейтральнай Швейцарыі і не вяртацца дадому?» Не мог ён удзельнічаць у развале таго, чаму аддаў усё сваё жыццё... *(Паўза.)* Свет стаў аднапалярным, цяпер ён належыць Амерыцы. Мы сталі слабымі, нас адразу ж засунулі на перыферыю. Ператварылі ў другарадную, пераможаную краіну. У Другой сусветнай вайне мы перамаглі... Трэцюю сусветную прайгралі... *(Паўза.)* Вось ён... яму гэта было невыносна...

...14 снежня 1989 года... Пахаванне Сахарава. На вуліцах Масквы тысячы людзей. Паводле міліцэйскіх зводак, ад сямідзесяці да ста тысяч. Каля труны стаяць Ельцын, Сабчак, Старавойтава... Амерыканскі пасол Джэк Мэтлак напісаў у сваіх

мемуарах, што прысутнасць гэтых людзей на пахаванні «сімвала рускай рэвалюцыі», «галоўнага дысідэнта краіны» для яго была заканамернай, а здзівіўся ён, калі «ўбачыў крыху ўбаку самотную постаць маршала С. Ахрамеева». Пры жыцці Сахарава яны былі ворагі, непрымірымыя апаненты. *(Паўза.)* Але Ахрамееў прыйшоў развітацца. З Крамля нікога, акрамя яго, там не было... і з Генштаба...

...Далі трохі свабоды, і адусюль адразу вылезла мяшчанскае мурло. Для Ахрамеева, аскета і бяссрэбніка, гэта быў удар. У самае сэрца. Ён не мог паверыць, што ў нас можа быць капіталізм. З нашымі савецкімі людзьмі, з нашай савецкай гісторыяй... *(Паўза.)* У мяне да гэтага часу перад вачыма кадры: як па дзяржаўным лецішчы, дзе Ахрамееў жыў з сям'ёй з васьмі чалавек, бегае бялявая дзеўка і крычыць: «Паглядзіце — дзве лядоўні і два тэлевізары! А хто ён такі, гэты маршал Ахрамееў, каб у яго было два тэлевізары і дзве лядоўні?» Сёння маўчаць... ані гуку... А ўсе ранейшыя рэкорды, што да лецішчаў, кватэр, машын і іншых прывілеяў даўно пабітыя. Раскошныя аўтамабілі, заходняя мэбля ў кабінетах, адпачынак не ў Крыме, а ў Італіі... У нас у кабінетах стаяла савецкая мэбля і ездзілі мы на савецкіх машынах. Насілі савецкія строі і чаравікі. Хрушчоў з шахцёрскай сям'і... Касыгін з сялян... Усе, як я ўжо казаў, з вайны. Досвед жыцця, вядома, абмежаваны. Не толькі народ, але і лідары жылі за «жалезнай заслонай». Усе жылі, як у акварыуме... *(Паўза.)* Зноў жа... можа, гэта прыватная рэч, але пасляваенная няміласць да маршала Жукава была звязаная не толькі з рэўнасцю Сталіна да ягонай славы, але і з колькасцю вывезеных з Германіі дываноў, мэблі, паляўнічых стрэльбаў, якія захоўваліся ў яго на лецішчы. Хоць усё гэтае дабро ўлезла б у дзве легкавушкі. Але бальшавік не можа мець столькі барахла... Па цяперашніх часах смешна... *(Паўза.)* Гарбачоў любіў раскошу... У Фаросе яму збудавалі лецішча... Мармур з Італіі, плітка з Германіі... пясок для пляжа з Балгарыі... Ні адзін заходні лідар не меў у сябе нічога падобнага. Крымскае

лецішча Сталіна, калі параўнаць яго з гарбачоўскім, нагадвала інтэрнат. Генсекі мяняліся… асабліва іх жонкі…

Хто абараняў камунізм? Не прафесары і не сакратары ЦК… а ленінградскі выкладчык хіміі Ніна Андрэева кінулася абараняць камунізм… Вялікі розгалас нарабіў яе артыкул «Не магу паступіцца прынцыпамі». Ахрамееў таксама пісаў… выступаў… Казаў мне: «Трэба даваць здачы». Яму тэлефанавалі, пагражалі: «ваенны злачынец» — гэта за Афганістан. Мала хто ведаў, што ён быў супраць афганскай вайны. І не вывозіў з Кабула алмазы і іншыя каштоўныя камяні, карціны з нацыянальнага музея, як іншыя генералы. Яго пастаянна цкавалі ў друку… За тое, што перашкаджаў «новым гісторыкам», якім трэба было даказаць, што ў нас нічога не было, за спінай — пустыня. І Перамогі — не было. А былі заградатрады і штрафбаты. Вайну выйгралі зэкі, гэта яны пад кулямётамі дайшлі да Берліна. Якая Перамога? Закідалі Еўропу трупамі… *(Паўза.)* Армію прыніжалі і зневажалі. Хіба магла такая армія перамагчы ў дзевяноста першым? *(Паўза.)* І хіба мог яе маршал гэта перажыць?..

Пахаванне Ахрамеева… Каля магілы стаялі родныя і некалькі сяброў. Не было вайсковага салюту. Газета «Праўда» не ўшанавала некралогам былога начальніка Генштаба чатырохмільённай арміі. Новы міністр абароны Шапашнікаў (былы міністр Язаў сядзеў у турме разам з іншымі «путчыстамі»), здаецца, у гэты час быў заклапочаны тым, як засяліцца ў кватэру Язава, з якой тэрмінова выганялі ягоную жонку. Інтарэсы шкурныя… Але… я скажу… гэта важна… Членаў ГКЧП можна абвінаваціць у чым заўгодна, толькі не ў пагоні за асабістай нажывай. У карыслівасці… *(Паўза.)* Па крамлёўскіх калідорах пра Ахрамеева пошапак: «Не на таго коніка паставіў». Чыноўнікі перабягалі да Ельцына… *(Перапытвае.)* Паняцце гонару? Не задавайце наіўных пытанняў… Нармальныя людзі выходзяць з моды… Артыкул-некралог з'явіўся ў амерыканскім часопісе «Тайм». Напісаў яго адмірал Уільям Кроў, які займаў у часы Рэйгана пасаду старшыні Камітэта начальнікаў

штабоў ЗША (адпавядае нашаму начальніку Генштаба). Яны шмат разоў сустракаліся на перамовах у вайсковых пытаннях. І ён паважаў Ахрамеева за яго веру, хоць яна яму была чужая. Вораг пакланіўся… *(Паўза.)*

Толькі савецкі чалавек можа зразумець савецкага чалавека. Іншаму б я распавядаць не стаў…

*З жыцця пасля жыцця*

«1 верасня ў Маскве на Траякураўскіх спецмогілках для высокапастаўленых асобаў (філіял маскоўскіх Новадзявочых могілак) быў пахаваны Маршал Савецкага Саюза С. Ф. Ахрамееў.

У ноч з першага на другога верасня невядомыя раскапалі магілу Ахрамеева і яго суседа па могілках — генерал-палкоўніка Срэднева, пахаванага тыдзень таму. Следства мяркуе, што магіла Срэднева была раскапаная першай, відаць, памылкова… Марадзёры знеслі маршальскую форму Ахрамеева з залатымі галунамі… і маршальскую фуражку, якую, згодна з вайсковай традыцыяй, прыбіваюць да труны. А таксама шматлікія ордэны і медалі.

Следчыя ўпэўнена заяўляюць, што магілу Маршала Ахрамеева апаганілі не з палітычных, а з камерцыйных матываў. Мундзіры вышэйшых военачальнікаў карыстаюцца асаблівым попытам у перакупшчыкаў антыкварыяту. А ўжо маршальскую форму ў іх з рукамі адарвуць…»

*Газета «Коммерсант». 9 верасня 1991 г.*

*З інтэрв'ю на Чырвонай плошчы (снежань 1997 года)*

«Я — канструктар…

Да жніўня дзевяноста першага года мы жылі ў адной краіне, пасля жніўня ў іншай. Да жніўня маю краіну звалі СССР…

Хто я? Я адзін з тых ідыётаў, хто абараняў Ельцына. Стаяў каля Белага дома і гатовы быў легчы пад танк. Людзі выйшлі на вуліцу на хвалі, на ўздыме. Але памерці яны гатовыя былі за свабоду, а не за капіталізм. Я лічу сябе чалавекам падманутым. Мне не патрэбны капіталізм, да якога нас прыцягнулі… падсунулі… ні ў якой форме — ні ў амерыканскай, ні ў шведскай. Я не дзеля чыіхсьці "бабак" рэвалюцыю рабіў. Мы крычалі "Расія" замест таго, каб крычаць "СССР". Мне шкада, што нас тады не разагналі брандспойтамі і не выкацілі на плошчу пару кулямётаў. Трэба было арыштаваць дзвесце-трыста чалавек, астатнія б зашыліся па кутах. *(Паўза.)* Дзе сёння тыя, хто клікаў нас на плошчу: "Далоў крамлёўскую мафію!", "Заўтра — свабода!"? Сказаць ім няма чаго. Звалілі на Захад, цяпер там лаюць сацыялізм. Сядзяць у чыкагскіх лабараторыях… А мы… тут…

Расія… Аб яе выцерлі ногі. Кожны можа даць ёй па мордзе. Ператварылі ў заходні сметнік ношанага рыззя, пратэрмінаваных лекаў. Хлуду! *(Мат.)* Сыравінны прыдатак, газавы кранік… Савецкая ўлада? Яна была не ідэальная, але яна была лепшай за тое, што цяпер. Больш годнай. Увогуле, сацыялізм мяне задавальняў: не было ні празмерна багатых, ні бедных… бамжоў і беспрытульнікаў… Старыя маглі пражыць на свае пенсіі, пляшкі на вуліцах не збіралі. Аб'едкі. У вочы не зазіралі, не стаялі з працягнутай рукою… Колькі людзей забіла перабудова — яшчэ трэба палічыць. *(Паўза.)* Жыццё наша ранейшае дарэшты зруйнаванае, не засталося каменя на камені. Хутка з сынам не будзе пра што пагаварыць. "Тата, Паўлік Марозаў — адмарозак, а Марат Казей — дзівак, — кажа мне мой сын, прыйшоўшы са школы. — А ты мяне вучыў…" Я вучыў яго, як вучылі мяне. Правільна вучыў. "Гэтае жахлівае савецкае выхаванне…" А "гэтае жахлівае савецкае выхаванне" навучыла мяне думаць не толькі пра сябе, але і пра іншых. Пра тых, хто слабейшы, пра тых, каму кепска. Для мяне героем быў Гастэла, а не гэтыя… у малінавых пінжаках… з філасофіяй,

што свая кашуля бліжэй да цела, свой тлушч цяплейшы, свае грошыкі званчэйшыя. "Не гані, тата, 'духоўку'"... "гуманістычная баланда"... Дзе яго гэтаму вучаць? Людзі цяпер іншыя... капіталістычныя... Разумееце! Ён гэта ўбірае, яму дванаццаць гадоў. Я для яго ўжо не прыклад.

Чаму я абараняў Ельцына? Адно толькі яго выступленне, што трэба забраць прывілеі ў наменклатуры, дало яму мільёны прыхільнікаў. Я гатовы быў узяць аўтамат і страляць камуністаў. Мяне пераканалі... Мы не разумелі, што нам рыхтуюць наўзамен. Падсоўваюць. Грандыёзны падман! Ельцын выступіў супраць "чырвоных" і запісаў сябе ў "белыя". Гэта катастрофа... Пытанне: чаго мы хацелі? Мяккага сацыялізму... людскага... Што маем? На вуліцы — люты капіталізм. Страляніна. Разборкі. Разбіраюцца — хто гандляр, а хто ўладальнік завода. Наверх вылезлі бандыты... фарцоўшчыкі і мянялы ўзялі ўладу... Вакол ворагі і драпежнікі. Шакалы! *(Паўза.)* Не магу забыць... я не магу забыць, як мы стаялі каля Белага дома... Каму мы цягалі каштаны з агню? *(Мат.)* Бацька мой быў шчыры камуніст. Праўдзівы. Працаваў парторгам на вялікім заводзе. Удзельнік вайны. Я яму: "Свабода! Станем нармальнай... цывілізаванай краінай..." А ён мне: "Твае дзеці будуць служыць у пана. Ты гэтага хочаш?" Я малады быў... дурань... Смяяўся з яго... Дзіка наіўныя мы былі. Я не ведаю, чаму ўсё так атрымалася? Не ведаю. Не так, як мы хацелі. У нас было іншае ў галаве. Перабудова... у гэтым было нешта вялікае... *(Паўза.)* Праз год зачынілі наша праектнае бюро, мы з жонкай апынуліся на вуліцы. Як жылі? Вынеслі на рынак усе каштоўныя рэчы. Крышталь, савецкае золата і самае каштоўнае, што ў нас было — кнігі. Тыднямі елі адну бульбяную кашу. Я заняўся "бізнэсам". Прадаваў на рынку "бычкі" — недакураныя цыгарэты. Літровы слоік "бычкоў"... трохлітровы... Бацькі жонкі (выкладчыкі ВНУ) збіралі іх на вуліцы, а я прадаваў. І людзі куплялі. Курылі. Я сам курыў. Жонка офісы прыбірала. Адзін час у нейкага таджыка пельменямі гандлявалі. За сваю

наіўнасць мы ўсе дорага заплацілі. Мы ўсе… Цяпер з жонкай курэй разводзім, яна плача без канца. Вярнуць бы ўсё назад… І не трэба кідаць у мяне чаравікам… Гэта не настальгія па шэрай каўбасе за два рублі дваццаць капеек…»

«Я — бізнэсмен…

Камуністы праклятыя і гэбня… Я ненавіджу камуністаў. Савецкая гісторыя — гэта НКВД, ГУЛАГ, СМЕРШ. Мне моташна ад чырвонага колеру. Чырвоных гваздзікоў… Жонка набыла чырвоную блузку: "Ты што, з глузду з'ехала!" Я раўную Сталіна да Гітлера. І патрабую Нюрнберга для чырвоных сук. Усім чырвоным сабакам — смерць!

Паўсюль нас атачаюць пяціканцовыя зоркі. Бальшавіцкія ідалы як стаялі, так і стаяць на плошчах. Я іду па вуліцы з дзіцём, яно пытаецца: "Хто гэта?" А гэта помнік Розе Землячцы, якая крывёю заліла Крым. Асабіста любіла расстрэльваць маладых белых афіцэраў… І я не ведаю, што мне дзіцяці адказваць.

Пакуль мумія… савецкі фараон… будзе ляжаць на Чырвонай плошчы пад капішчам, будзем пакутаваць. Будзем праклятыя…»

«Я — кандытар…

Мой муж мог бы распавесці… Дзе ён? — *(Азіраецца па баках.)* — А я — што? Піроўжныя штукую…

Дзевяноста першы год? Харошыя мы тады былі… Прыгожыя… Не былі натоўпам. Я бачыла, як чалавек скакаў. Скакаў і крычаў: "Хунце — п…ц! Хунце — п…ц!" *(Закрывае твар рукамі.)* Ой, не запісвайце! Ой-ой! З песні слова не выкінеш, але слова ж нехарошае. Немалады гэта быў мужчына… скакаў… Мы іх перамаглі і радаваліся. А ў іх, кажуць, ужо расстрэльныя спісы ляжалі напагатове. Ельцын першы… Нядаўна я іх усіх у тэлевізары бачыла… хунту гэтую… Старыя і неразумныя. А тады тры дні быў жудасны адчай: няўжо ка-

нец? Фізічны страх. Вось гэты дух свабоды… яго ўсе адчулі… І страх — гэта страціць. Гарбачоў — вялікі чалавек… адкрыў шлюзы… Яго любілі, але нядоўга, хутка ў ім стала раздражняць усё: як ён кажа, што ён кажа, яго манеры, яго жонка. *(Смяецца.)* Па Расіі мчыцца тройка: Райка, Мішка, перастройка. Узяць вось Наіну Ельцыну… Яе любяць больш, яна заўсёды за спінай мужа. А Раіса імкнулася стаць побач, а то і паперадзе. А ў нас так: альбо ты сама царыца, альбо ты цару не замінай.

Камунізм — як сухі закон: ідэя добрая, але не працуе. Так мой муж кажа… Чырвоныя святыя… яны былі… узяць Мікалая Астроўскага… Святы! Але крывішчы колькі пусцілі. Расія вычарпала свой ліміт на кроў, на войны і рэвалюцыі… Для новай крыві няма ні сілаў, ні якогась шаленства. Людзі ўдосталь напакутаваліся. Цяпер ходзяць па рынках — гардзіны і цюль выбіраюць, шпалеры, патэленкі там усялякія. Падабаецца ўсё яркае. Таму што раней усё ў нас было шэрае, непрыгожае. Радуемся, як дзеці, пральнай машыне з сямнаццаццю рэжымамі. Маіх бацькоў ужо няма: мамы — сем, а таты — восем гадоў, але я дагэтуль карыстаюся запалкамі, якія мама назапасіла, і крупы ляжаць. І соль. Мама ўсё набывала (тады казалі не “набывала”, а “даставала”) і складвала на чорны дзень… Цяпер мы ходзім па рынках і крамах, як па выставах, — усяго навалам. Хочацца сябе пацешыць, пашкадаваць. Гэта псіхатэрапія… мы ўсе хворыя… *(Задумалася.)* Як жа трэба было намучыцца, каб запалкі так назапасіць. У мяне язык не паварочваецца назваць гэта мяшчанствам. Рэчавізмам. Гэта лекаванне… *(Маўчыць.)* Чым далей, тым менш пра путч успамінаюць. Сталі саромецца. Адчування перамогі ўжо няма. Таму што… я не хацела, каб знішчалася савецкая дзяржава. Як мы яе разбуралі! З радасцю! А я палову свайго жыцця пражыла там… Гэта нельга ўзяць і выкрасліць… Пагадзіцеся! У мяне ў галаве ўсё збудавана па-савецку. Да чагосьці іншага яшчэ дапаўзці трэба. Людзі дрэннае мала цяпер успамінаюць,

а ганарацца Перамогай, тым, што мы першыя паляцелі ў космас. Тое, што крамы пустыя былі… Гэта забылася… і ўжо не верыцца…

Адразу пасля путчу я паехала да дзеда ў вёску… Прыёмнік з рук не выпускала. Раніцай пайшлі градкі капаць. Пяць-дзесяць хвілін пройдзе, і я кідаю рыдлёўку: дзед, ты паслухай… Ельцын выступае… І зноў: дзед… хадзі ты сюды… Дзед цярпеў-цярпеў і не вытрываў: "Ты капай глыбей і не слухай, што яны там балбочуць. Наш паратунак у зямлі — уродзіць бульба ці не ўродзіць". Мудры быў дзед. Увечары прыйшоў сусед. Я ім падкінула тэму пра Сталіна. Сусед: "Добры быў чалавек, але доўга жыў". Мой дзед: "А я яго, падлюгу, перажыў". А я ўсё з прыёмнікам хадзіла. Мяне трэсла ад захаплення. Найвялікшае гора — дэпутаты сыходзяць на абед. Дзейства перапынялася.

…Што я маю? З чым я засталася? Я маю велізарную бібліятэку і фанатэку — усё! І ў маёй мамы, яна кандыдат хімічных навук, таксама кнігі і рэдкая калекцыя мінералаў. Да яе залез злодзей… Уначы яна прачынаецца, а пасярод кватэры (кватэра аднапакаёвая) стаіць малады бугай. Адчыніў шафу і вышпурвае ўсё адтуль. Кідае рэчы на падлогу са словамі: "Інтэлігенцыя праклятая… нават футра прыстойнага няма…" Потым ён проста бразнуў дзвярыма і пайшоў. Браць жа яму не было чаго. Вось такая ў нас інтэлігенцыя. З гэтым мы засталіся. А вакол хтосьці будуе катэджы, купляе дарагія машыны. Я зроду не бачыла брыльянта…

Жыццё ў Расіі — гэта белетрыстыка. Але я хачу жыць тут… з савецкімі людзьмі… І глядзець савецкія фільмы. Хай гэта хлусня, хай рабіліся яны на замову, але я іх люблю. *(Смяецца.)* Не дай Бог, муж убачыць мяне ў тэлевізары…»

«Я — афіцэр…

Цяпер я… Прашу слова. *(Малады дзяцюк — гадоў дваццаці пяці.)* Запісвайце: я — праваслаўны рускі патрыёт. Служу

Госпаду нашаму. Служу старанна… з дапамогай малітваў… Хто прадаў Расію? Габрэі. Бязродныя. Ад жыда і Бог шмат разоў плакаў.

Сусветная змова… Мы маем справу са змовай супраць Расіі. План ЦРУ… І не хачу слухаць… Не кажыце мне, што гэта фальшыўка! Маўчаць! План дырэктара ЦРУ Алена Далеса… “Пасеяўшы хаос, мы непрыкметна падменім іх каштоўнасці на фальшывыя. Мы знойдзем сваіх аднадумцаў, сваіх саюзнікаў у самой Расіі… Мы зробім з маладых людзей цынікаў, пашлякоў, касмапалітаў. Вось так мы зробім…” Зразумела? Габрэі і амерыкосы — нашы ворагі. Тупыя янкі. Прамова прэзідэнта Клінтана на закрытай нарадзе амерыканскіх палітычных вярхоў: “Мы дабіліся таго, што збіраўся зрабіць прэзідэнт Трумэн з дапамогай ядзернай бомбы… Мы здолелі бяскроўна вывесці з вайны за сусветнае панаванне дзяржаву, якая складае асноўную канкурэнцыю Амерыцы…” Дакуль ворагам нашым узносіцца па-над намі? Ісус сказаў: не бойцеся і не жахайцеся, будзьце цвёрдымі і мужнымі. Гасподзь памілуе Расію і прывядзе яе шляхам пакут да вялікай славы…

*Спыніць яго я не магу.*

…У дзевяноста першым я скончыў вайсковае вучылішча, атрымаў дзве зорачкі. Малодшага лейтэнанта. Ганарыўся і форму не здымаў. Савецкі афіцэр! Абаронца! А пасля правалу ГКЧП ездзіў на службу ў цывільным, а там пераапранаўся. Нейкі дзед мог падысці на аўтобусным прыпынку і спытаць: “Што ж ты Радзіму не абараніў, сынок? Сукін сын! Ты ж прысягаў”. Афіцэры галоднымі служылі. За афіцэрскі заробак можна было купіць кілаграм таннай каўбасы. Звольніўся з арміі. Быў час — па начах прастытутак ахоўваў. Цяпер ахоўнікам служу ў адной фірме. Жыды! Усе беды ад іх… А рускаму чалавеку праходу няма. Хрыста яны ўкрыжавалі… *(Тыцкае мне нейкую ўлётку.)* Чытайце… Ні міліцыя, ні армія сабчакоў і чубайсаў… і нямцовых… не абароніць ад справядлівага народнага гневу. “Хаім, ты чуў, што хутка будзе пагром?” — “А я не баюся. Я па

пашпарце рускі". — "Дурань, біць будуць па мордзе, а не па пашпарце". *(Хрысціцца.)*

Рускай зямлі — рускі парадак! Імя Ахрамеева, Макашова… і іншых герояў… на нашых сцягах! Гасподзь нас не пакіне…»

«Я — студэнт…

Ахрамееў? А хто гэта? Што за персанаж?

—ГКЧП… жнівеньская рэвалюцыя…

—Прабачце… Не ў курсе…

—Колькі вам гадоў?

—Дзевятнаццаць. Я палітыкай не цікаўлюся. Далёкі ад гэтых шоў. Але Сталін мне падабаецца. Гэта цікава. Параўнайце сённяшніх правіцеляў з правадыром у салдацкім шынялі. На чыю карысць параўнанне? Во-во… Мне не патрэбная вялікая Расія. Я не надзену дурныя боты і не павешу на шыю аўтамат. Я паміраць не хачу! *(Памаўчаў.)* Руская мара: чамадан у рукі і на х…й з Расіі! У Амерыку! Але з'ехаць і працаваць там усё жыццё афіцыянтам не хачу. Думаю».

## Пра міласціну ўспамінаў і пажаднасць сэнсу

*Ігар Паглазаў — вучань 8 класа, 14 гадоў*

### *З аповеду мамы*

—Мне здаецца, што гэта здрада… Я здраджваю сваім пачуццям, здраджваю нашаму жыццю. Нашым словам здраджваю… Яны былі сказаныя толькі камусьці з нас, а я ўпускаю ў наш свет чужога чалавека. Ці добры гэты чалавек ці дрэнны? — гэта ўжо не важна. Зразумее ці не зразумее ён мяне… Памятаю, як на рынку стаяла жанчына і прадавала яблыкі, і ўсім расказвала, як яна сына пахавала. Тады я сабе паклялася: «Са

мной гэтага ніколі не будзе». З мужам мы ўвогуле маўчым на гэтую тэму, плачам, але кожны паасобку, каб іншы не бачыў. Адно толькі слова, і я пачынаю выць. Першы год наогул ніяк не магла супакоіцца: навошта? Чаму ён гэта зрабіў? Хачу думаць… Суцяшаю сябе: ён не збіраўся сыходзіць ад нас… хацеў паспрабаваць… зазірнуць… У юнацтве іх хвалюе: што там? Асабліва хлопчыкаў гэта хвалюе… Пасля смерці корпалася ў ягоных сшытках, у ягоных вершах. Як найда шнырыла. *(Плача.)* За тыдзень да той нядзелі… стаяла перад люстэркам, расчэсвала валасы… Ён падышоў да мяне, абняў за плечы: мы стаялі ўдваіх, глядзеліся ў люстэрка і ўсміхаліся. «Ігарок, — прыхінулася я да яго, — які ты ў мяне прыгожы. А прыгожы ты таму, што ад любові нарадзіўся. Ад вялікай любові». Ён яшчэ мацней абняў мяне: «Мама, ты, як заўсёды, цудоўная». Мяне б'юць дрыжыкі ад думкі: ці тады, перад люстэркам, ён ужо думаў пра гэта ці не… ён ужо думаў?

Любоў… Мне дзіўна вымаўляць гэтае слова. Успомніць, чым ёсць любоў. А калісьці я думала, што любоў большая за смерць… яна мацнейшая за ўсё… Мы з мужам пазнаёміліся ў дзясятым класе. Хлопцы з суседняй школы прыйшлі да нас на танцы. Наш першы вечар я не памятаю, бо Валіка, так завуць майго мужа, я не бачыла, а ён мяне заўважыў, але не падышоў. Ён нават твару майго не пабачыў, толькі сілуэт. І як быццам голас аднекуль пачуў: «Гэта твая будучая жонка». Так ён мне потым прызнаваўся… *(Усміхнулася.)* А можа, прыдумаў? Ён — фантазёр. Але цуд заўсёды быў з намі, і цуд насіў мяне па зямлі. Я была вясёлая, па-вар'яцку вясёлая, нястрымная — вось такая была. Я кахала свайго мужа, і мне падабалася баламуціць іншых мужчын, гэта як гульня: ты ідзеш, а на цябе глядзяць, і табе падабаецца, што глядзяць, і хай нават трошкі закахана. «І нашто так многа мне адной?» — часта спявала я следам за сваёй улюбёнай Маяй Крысталінскай. Я імчалася па жыцці, і цяпер мне бывае шкада, што я не ўсё запомніла, ніколі ўжо цяпер я не буду такая радасная. Каб любіць, трэба

шмат сілаў, а я цяпер іншая. Я стала звычайная. *(Маўчыць.)* Часам хочацца... а часцей непрыемна ўспамінаць сябе ранейшую...

Ігарку тры-чатыры гады... Купаю яго: «Мама, я люблю цябе, як Цалеўну Плыўкласную». З «р» мы доўга змагаліся... *(Усміхаецца.)* Гэтым можна жыць, цяпер я гэтым жыву. Міласцінай успамінаў... усе крыхі падбіраю... Я — настаўніца рускай мовы і літаратуры ў школе. Звычайная карціна дома: я — за кнігамі, ён — у кухоннай шафцы. Пакуль павыграбае з яе рандэлі, патэльні, лыжкі, відэльцы, я і падрыхтуюся да заўтрашніх заняткаў. Падрос. Я сяджу і пішу, і ён таксама сядзіць за сваім столікам і піша. Рана навучыўся чытаць. Пісаць. У тры гады мы вучылі напамяць Міхаіла Святлова: «Кахоўка, Кахоўка — мая ты вінтоўка... / Гарачая куля, ляці!» Тут трэба спыніцца і распавесці больш падрабязна... Я хацела, каб ён рос мужным, дужым, і падбірала яму вершы пра герояў, пра вайну. Пра Радзіму. І аднойчы мая мама мяне агаломшыла: «Вера, перастань чытаць яму ваенныя вершы. Ён гуляе толькі ў вайну». — «Усе хлопчыкі любяць гуляць у вайну». — «Так, але Ігар любіць, каб у яго стралялі, а ён падаў. Паміраў! Ён з такой прагай, з асалодаю падае, што мне бывае страшна. Крычыць іншым хлопчыкам: "Вы страляеце, а я падаю". Ніколі — наадварот». *(Пасля доўгай паўзы.)* Чаму я не паслухала маму?

Дарыла яму ваенныя цацкі: танк, алавяных салдацікаў, снайперскую вінтоўку... Ён жа хлопчык, павінен стаць воінам. Інструкцыя да снайперскай вінтоўкі: «снайпер павінен забіваць спакойна і выбарачна... спачатку добра "пазнаёміцца" з цэллю...» Чамусьці гэта лічылася нармальным, нікога не палохала. Чаму? Псіхіка ў нас была ваенная. «Калі заўтра вайна, калі заўтра ў паход...» Іншага тлумачэння не знаходжу. Няма ў мяне іншага тлумачэння... Цяпер ужо радзей дораць дзецям шабелькі... пісталецікі... піф-паф! А мы... Памятаю, як я здзівілася, калі нехта з настаўнікаў у школе расказаў, што ў Шве-

цыі, здаецца, забароненыя вайсковыя цацкі. А як выхаваць мужчыну? Абаронцу? *(Перарывістым голасам.)* «На смерць, на смерць раўняйся, / спявак і вершнік бедны…» З якой нагоды ні збяромся… заўсёды… праз пяць хвілін успомнім вайну. Часта песні ваенныя спявалі. Ці ёсць яшчэ дзе такія людзі, як мы? Палякі жылі пры сацыялізме, і чэхі, і румыны, але яны ўсё адно іншыя… *(Маўчыць.)* Не ведаю цяпер, як выжыць. За што ўчапіцца? За што…

*Зрываецца на шэпт. А мне здаецца, што яна крычыць.*

…Заплюшчу вочы: бачу, як ён ляжыць у труне… мы ж былі шчаслівыя… чаму ён вырашыў, што ў смерці шмат прыгожага…

…Сяброўка павяла мяне да краўчыхі: «Ты павінна пашыць сабе новую сукенку. Калі ў мяне дэпрэсія, я шыю сабе новую сукенку…»

…У сне хтосьці гладзіць, гладзіць мяне па галаве… Першы год уцякала з дому ў парк, там крычала… птушкі палохаліся…

Яму дзесяць гадоў, не, напэўна, адзінаццаць… З дзвюма торбамі ледзь дабіраюся дадому. Пасля цэлага дня ў школе. Уваходжу. Абодва на канапе: адзін — з газетай, другі — з кніжкай. У кватэры вэрхал, чорт ведае што! Гара нямытага посуду! Мяне сустракаюць з захапленнем! Я бяру ў рукі венік. Барыкадуюцца крэсламі. «Выходзьце!» — «Ніколі!» — «Кіньце на пальцах — каму першаму ўсыпаць?» — «Мамачка-дзяўчынка, не сярдуй», — вылазіць першым Ігарок, ён ужо ростам з бацьку. «Мамачка-дзяўчынка» — маё хатняе імя. Гэта ён прыдумаў… Улетку звычайна ездзілі на поўдзень, «да пальмаў, якія жывуць бліжэй за ўсіх да сонца». *(Радасна.)* Словы ўспамінаюцца… нашы словы… Грэлі ягоны гаймарытны нос. Да сакавіка потым не вылазілі з даўгоў, эканомілі: на першае — пельмені, на другое — пельмені і да гарбаты — пельмені. *(Маўчыць.)* Успамінаецца нейкая яркая афіша… Спякотны Гурзуф. І мора… камяні і пясок, белыя ад хваляў і сонца… Засталося шмат фотаздымкаў, цяпер я хаваю іх ад сябе. Баюся… адразу ўнутры ўсё

выбухае... Адразу — выбух! Адзін раз паехалі без яго. Вярнуліся з паўдарогі. «Ігарок! — урываемся ў дом. — Ты едзеш з намі. Мы без цябе не можам!» З крыкам «Ур-ра!!!» ён вісне ў мяне на шыі. *(Пасля доўгай паўзы.)* Мы без яго не можам.

Чаму яго не ўтрымала наша любоў? Я калісьці верыла, што любоў можа ўсё. Зноў я... зноў...

Гэта ўжо здарылася... яго ўжо з намі няма... Я доўга была ў ступары. «Вера, — кліча муж. Я не чую. — Вера...» Не чую. І раптам істэрыка! Я як зараўла, як затупала нагамі — на сваю маму, маю дарагую маму: «Ты — пачвара, пачвара — талстоўка! Такіх жа пачвараў, сабе падобных, ты й выхавала! Што мы ўсё жыццё ад цябе чулі? Трэба жыць для іншых... для высокай мэты... Упасці пад танк, згарэць за радзіму ў самалёце. Грымотная рэвалюцыя... гераічная смерць... Смерць заўсёды была прыгажэйшай за жыццё. Мы выраслі пачварамі і вырадкамі. І Ігарка я так выхавала. Гэта ты вінаватая ва ўсім! Ты!» Мама скукобілася і стала раптам — маленькая-маленькая. Маленькая бабулька. У мяне закалола сэрца. Упершыню за шмат дзён я адчула боль, да гэтага ў тралейбусе паставілі на ногі цяжкую валізу — нічога не адчула. Уначы распухлі ўсе пальцы, і толькі тады я ўспомніла пра валізу. *(У слязах.)* Тут трэба спыніцца і распавесці пра маю маму... Мая мама з пакалення даваеннай інтэлігенцыі. З тых людзей, у якіх блішчэлі слёзы на вачах, калі гралі «Інтэрнацыянал». Яна перажыла вайну і заўсёды памятала, што савецкі салдат павесіў чырвоны сцяг над Рэйхстагам: «Наша краіна такую вайну выйграла!» Дзесяць... дваццаць... сорак гадоў... паўтарала яна нам гэта як заклён. Як малітву... Гэта была ейная малітва... «Мы нічога не мелі, але былі шчаслівыя», — маміна перакананасць у гэтым была абсалютнай. Спрачацца бессэнсоўна. Льва Талстога — «люстэрка рускай рэвалюцыі» — яна любіла за «Вайну і мір», а яшчэ за тое, што граф хацеў усё раздаць бедным, каб выратаваць душу. Такой была не толькі мая мама, але і ўсе яе сябры — першыя савецкія інтэлігенты, што выраслі

на Чарнышэўскім, Дабралюбаве, Някрасаве... на марксізме... Уявіць карціну, каб мама сядзела і вышывала на пяльцах або неяк асабліва ўпрыгожвала наш дом: парцалянавыя вазачкі, слонікі там усякія... вы што! Гэта пустое марнаванне часу. Мяшчанства! Самае важнае — духоўная работа... кнігі... Адзін гарнітур можна насіць дваццаць гадоў, а два паліто хапала на ўсё жыццё, але без Пушкіна ці без поўнага збору твораў Горкага жыць нельга. Ты ўдзельнічаеш у вялікай задуме, і вялікая задума ёсць... Так яны жылі...

...У цэнтры горада ў нас — старыя могілкі. Шмат дрэваў. Кусты бэзу. Там гуляюць, як у батанічным садзе. Старых мала, а маладыя смяюцца, цалуюцца. Магнітафон уключаць... Вяртаецца ён неяк позна: «Дзе быў?» — «Хадзіў на могілкі». — «З чаго ты гэта раптам заблукаў на могілкі?» — «Там цікава. Глядзіш у вочы людзей, якіх ужо няма».

...Адчыняю дзверы ў ягоны пакой... На ўвесь рост ён стаіць на карнізе акна, карніз у нас нетрывалы, няроўны. Шосты паверх! Замёрла. Немагчыма крыкнуць, як у дзяцінстве, калі ён залазіў на самую тонкую верхавіну дрэва ці на высокую старую сцяну разбуранай царквы: «Калі адчуеш, што не ўтрымаешся, разлічвай сваё падзенне на мяне». Не закрычала, не заплакала, каб не спалохаўся. Па сценцы адпаўзла назад. Праз пяць хвілін, якія вечнасцю мне здаліся, зноў заходжу — ён ужо саскочыў з карніза і ходзіць па пакоі. Тут я на яго накінулася: і цалавала, і калаціла, і трэсла: «Навошта? Скажы мне, навошта?» — «Не ведаю. Паспрабаваў».

...Адзін раз каля суседняга пад'езда з раніцы ўбачыла жалобныя вянкі. Хтосьці памёр. Ну памёр — і памёр. Вярнулася з працы і даведваюся ад бацькі, што ён хадзіў туды. Пытаюся: «Навошта? Там жа незнаёмыя нам людзі». — «Гэта была маладая дзяўчына. Яна ляжала такая прыгожая. А я думаў, што смерць страшная». *(Маўчыць.)* Кружляў... кудысьці за край яго цягнула... *(Маўчыць.)* Але дзверы тыя зачыненыя... туды нам няма доступу.

...Уткнецца ў калені: «Мама, а які я быў маленькі?» І я пачынаю... Як ён пільнаваў каля дзвярэй дзеда Мароза. Пытаўся, на якім аўтобусе можна паехаць у трыдзявятае царства ў трыдзясятае гаспадарства. Убачыў у вёсцы рускую печ, усю ноч чакаў, калі яна пойдзе-паедзе, як у казцы. Быў вельмі даверлівы...

...На вуліцы ўжо, памятаю, снег... Прыбягае: «Мама! Я сёння цалаваўся!» — «Цалаваўся?!» — «Так. У мяне сёння было першае спатканне». — «І ты мне нічога не сказаў?» — «Не паспеў. Сказаў Дзімку і Андрэю, і мы выправіліся ўтрох». — «Хіба на спатканне ходзяць утрох?» — «Ай, я адзін неяк не рашыўся». — «Ну і як вы ўтрох былі на спатканні?» — «Вельмі добра. Мы з ёй хадзілі вакол горкі пад ручку і цалаваліся. А Дзімка і Андрэй стаялі на варце». О Божа! «Мама, а ці можа пяцікласнік ажаніцца з дзевяцікласніцай? Калі, вядома, гэта каханне...»

...А вось гэта... гэта... *(Доўга плача.)* Пра гэта не магу...

...Улюбёны наш месяц — жнівень. Едзем за горад і любуемся павуціннем. Смяёмся... смяёмся... смяёмся... *(Маўчыць.)* Што я ўсё плачу? У нас жа было ажно чатырнаццаць гадоў... *(Плача.)*

Скравару-пару на кухні. Акно адчыненае. Чую, як яны з бацькам размаўляюць на балконе. Ігар: «Тата, што такое — цуд? Здаецца, я зразумеў. Вось паслухай... Жылі былі дзед і баба, і была ў іх курка Раба. Знесла курка яечка, ды не простае, а залатое. Дзед біў, біў — не разбіў. Баба біла, біла — не разбіла. Мышка бегла, хвосцікам махнула, яечка ўпала і разбілася. Плача дзед, плача баба...» Бацька: «З пункту гледжання логікі — поўны абсурд. Білі, білі — не разбілі, а потым раптам — у плач! Але колькі гадоў, ды што там гадоў — стагоддзяў — казку гэтую дзеці слухаюць, як верш». Ігар: «А я, тата, раней думаў, што ўсё можна ўцяміць розумам». Бацька: «Шмат рэчаў нельга ўцяміць розумам. Напрыклад, любоў». Ігар: «І смерць».

З дзяцінства пісаў вершы... На стале, у ягоных кішэнях, пад канапай я знаходзіла спісаныя лісточкі. Губляў, кідаў іх, забываў. Я нават не заўсёды верыла, што яны ягоныя: «Няўжо гэта ты напісаў?» — «А што там?» Чытаю: «Ходзяць у госці адны да адных людзі, / Ходзяць у госці адны да адных звяры...» — «Ну-у-у, гэта старое. Я ўжо забыўся». — «А гэтыя радкі?» — «Якія?» Чытаю: «Толькі на галінцы абшарпанай / Кроплі зорныя накапаныя...» У дванаццаць гадоў напісаў, што яму хочацца памерці. Хочацца кахання і хочацца памерці — два жаданні. «Мы з табою павянчаныя / Блакітнай вадою...» Яшчэ?! Вось: «Я не ваш, аблокі серабрыстыя. / Я не ваш, блакітныя снягі...» Ён жа мне гэта чытаў. Чытаў! Але ў юнацтве часта пішуць пра смерць...

У нашым доме вершы гучалі пастаянна, як гутарка: Маякоўскі, Святлоў... Мой любімы Сямён Гудзенка: «Калі на смерць ідуць — пяюць, а перад гэтым можна плакаць. Бо самы страшны момант у баі — момант чакання атакі». Вы заўважалі? Ну так, вядома... Навошта пытацца? Мы ўсе ў гэтым выраслі... Мастацтва любіць смерць, а наша асабліва яе любіць. Культ ахвяры і гібелі ў нас у крыві. Жыццё на разрыў аорты. «Эх, рускі народзец, не любіць паміраць сваёй смерцю!» — пісаў Гогаль. І Высоцкі спяваў: «Хоць крыху яшчэ пастаю на краі...» На краі! Мастацтва любіць смерць, але ёсць і французская камедыя. Чаму ж у нас амаль няма камедый? «Наперад за Радзіму!», «Радзіма альбо смерць!». Я вучыла сваіх вучняў: свецячы іншым, згараю сам. Вучыла подзвігу Данка, які вырваў з грудзей сваё сэрца і асвятляў ім шлях іншым людзям. Пра жыццё мы не размаўлялі... мала размаўлялі... Герой! Герой! Герой! Жыццё складалася з герояў... ахвяр і катаў... Іншых людзей не было. *(Крычыць. Плача.)* Для мяне катаванне цяпер — ісці ў школу. Дзеці чакаюць... яны хочуць слоў і пачуццяў... Што сказаць... што я магу ім сказаць?

Усё было... і было менавіта так... Позні вечар, я ўжо ў ложку, чытаю раман «Майстар і Маргарыта» (ён яшчэ лічыўся

«дысідэнцкім», мне яго прынеслі перадрукаваным на машынцы). Даходжу да апошніх старонак... Памятаеце, Маргарыта просіць адпусціць Майстра, а Воланд, дух Сатаны, кажа: «Не трэба крычаць у гарах, ён усё адно прывык да абвалаў, і гэта яго не ўстрывожыць. Вам не трэба прасіць за яго, Маргарыта, таму што за яго ўжо прасіў той, з кім ён так імкнуўся размаўляць...» Якаясь незразумелая сіла штурхнула мяне ў іншы пакой, да канапы, на якой спаў сын. Я стала на калені і шаптала, як малітву: «Ігарок, не трэба. Міленькі мой, не трэба. Не трэба!» — Пачала рабіць тое, што мне ўжо было забаронена, як толькі ён падрос: цалаваць яго рукі, ногі. Ён расплюшчыў вочы: «Мама, ты чаго?» Я тут жа дала рады: «З цябе спаўзла коўдра. Я паправіла». Заснуў. А я... Што адбылося са мной, я не зразумела. Вясёлы, ён дражніў мяне «агнявушка-паскакушка». Я лёгка бегла па жыцці.

Набліжаўся ягоны дзень нараджэння... і Новы год... Нехта з сяброў паабяцаў дастаць нам пляшку шампанскага, тады ж мы мала што маглі набыць у крамах, усё даставалі. Хто меў блат. Праз знаёмых, праз знаёмых знаёмых. Даставалі вэнджаную каўбасу, шакаладныя цукеркі... Здабыць кілаграм мандарынаў да Новага года — вялікая ўдача! Мандарын быў не проста садавіна, а нешта такое дзіўнае, толькі Новы год пах мандарынамі. Далікатэсы да навагодняга стала збіралі месяцамі. На гэты раз я прыхавала бляшанку печані траскі і кавалачак чырвонай рыбы. Усё потым падалі на памінальны стол... *(Маўчыць.)* Не, я не хачу скончаць свой аповед так хутка. У нас было ажно чатырнаццаць гадоў. Чатырнаццаць гадоў без дзесяці дзён...

Неяк чысціла антрэсолі і знайшла тэчку з лістамі. Калі ляжала ў радзільні, мы з мужам кожны дзень пісалі адно аднаму лісты, цыдулачкі, а то і некалькі разоў на дзень. Чытала, смялася... Ігару ўжо было сем гадоў... І ён не мог зразумець, як гэта яго не было, а мы з бацькам былі? Насамрэч ён як бы быў, мы ў лістах увесь час казалі пра яго: вось дзіцятка павярнулася,

вось яно мяне штурхнула… варушыцца… «Я адзін раз памёр, а потым зноў да вас прыйшоў, так?» Я самлела ад гэтага пытання. Але дзеці… яны часам так кажуць… як філосафы, як паэты… Трэба было мне запісваць за ім… «Мама, дзядуля памёр… гэта значыць, што яго закапалі, і ён расце…»

У сёмым класе ў яго ўжо з'явілася дзяўчынка… Закахаўся сур'ёзна. «Ты ў мяне не ажэнішся ні з першым каханнем, ні з прадаўшчыцай!» — пагражала я. Я ўжо прывыкала да думкі, што мне трэба будзе яго з кімсьці дзяліць. Рыхтавала сябе. У маёй сяброўкі таксама сын, яны з Ігарам былі аднагодкі, і сяброўка неяк мне прызналася: «Я яшчэ не знаёмая са сваёй нявесткай, а ўжо яе ненавіджу». Так яна любіць свайго сына. Не можа сабе нават уявіць, што давядзецца аддаць яго іншай жанчыне. Што было б у нас? Са мною? Не ведаю… Я ўтрапёна… утрапёна яго любіла… Які б ні быў цяжкі дзень, адчыняю дзверы ў дом — і аднекуль святло. Не аднекуль, а ад любові.

У мяне два страшныя сны. Першы — мы з ім тонем. Ён жа добра плаваў, аднойчы я рызыкнула паплысці разам з ім далёка ў мора. Павярнула назад, адчуваю, сіл не стае — ухапілася за яго, ды мёртвай хваткай. Крычыць: «Пусці!» — «Не магу!» Учапілася, на дно яго цягну. Усё ж такі ён адарваўся і пачаў мяне падштурхоўваць да берага. Падтрымлівае і падштурхоўвае. Так мы з ім выплылі. У сне ўсё паўтараецца, але я яго не пускаю. Мы і не тонем і не выплываем. Ідзе такое змаганне ў вадзе… Другі сон — пачынаецца дождж, але я адчуваю, што гэта не дождж, а зямля сыплецца. Пясок. Пачынае ісці снег, але я па шоргаце ўжо чую, што гэта не снег, а зямля. Рыдлёўка стукае, як сэрца, шох-шох, шох-шох…

Вада… вада яго заварожвала… Любіў возера, рэчку, студні. Асабліва — мора. У яго шмат вершаў пра ваду. «Толькі ціхая зорка збялела, як вада. Цемень». Яшчэ: «І вада цячэ адна… Цішыня». *(Паўза.)* Мы цяпер на мора не ездзім.

Апошні год… Часта збіраліся за вячэрай разам. Гаварылі, вядома, пра кнігі. Чыталі разам самвыдат… «Доктар Жывага»,

вершы Мандэльштама… Памятаю, як спрачаліся пра тое, хто ёсць паэт? Які ў яго лёс у Расіі? Думка Ігара: «Паэт мусіць рана памерці, інакш ён не паэт. Стары паэт — гэта проста смешна». Вось… і гэта я прапусціла… Не надала ўвагі… З мяне звычайна, як з каляднага меха, сыпалася і сыпалася… Амаль у кожнага рускага паэта ёсць вершы пра Радзіму. Я шмат ведаю напамяць. Чытала ўлюбёнага Лермантава: «Люблю Айчыну я, ды дзіўнаю любоўю». І Ясеніна: «Я люблю цябе, радзіма пакорная…» Была шчаслівая, калі купіла лісты Блока… Цэлы томік! Ягоны ліст да маці па вяртанні з-за мяжы… ён пісаў, што Радзіма адразу паказала яму свой свіны лыч і боскае аблічча… Націск, вядома, я рабіла на боскае… *(Заходзіць у пакой муж. Абдымае і сядае побач.)* Што яшчэ? Ігар ездзіў у Маскву на магілу Высоцкага. Узяў і пастрыгся нагала, стаў вельмі падобны да Маякоўскага. *(Пытанне — мужу.)* Помніш? Як я на яго сварылася? У яго былі незвычайныя валасы.

Апошняе лета… Загарэлы. Вялікі, дужы. Яму давалі на від васямнаццаць гадоў. Паехалі на вакацыях з ім у Талін. Ён быў там другі раз, вадзіў мяне паўсюль, па розных закутках. За тры дні мы жахнулі мора грошай. Начавалі ў нейкім інтэрнаце. Вяртаемся з начнога паходу па горадзе — узяліся за рукі, смяёмся, адчыняем дзверы. Падышлі да вахцёркі, яна не пускае: «Жанчына, пасля адзінаццатай уваходзіць з мужчынам нельга». І тут я Ігару на вуха: «Падымайся, я — зараз». Пайшоў, а я шэптам: «Як вам не сорамна! Гэта ж мой сын!» Так усё радасна… добра! Раптам там жа… уначы… мне страшна. Страх, што я больш яго ніколі не ўбачу. Страх перад чымсьці новым. Яшчэ нічога не здарылася.

Апошні месяц… У мяне памёр брат. У нашай сям'і мала мужчын, і я брала Ігара з сабой, каб ён дапамагаў. Каб жа я ведала… Ён жа глядзеў, глядзеў на смерць… «Ігар, перастаў кветкі. Прынясі крэслы. Схадзі па хлеб». Вось гэтая звычайнасць заняткаў побач са смерцю… яна небяспечная… Смерць мож-

на пераблытаць з жыццём. Гэта я цяпер разумею... Прыехаў аўтобус. Усе сваякі селі, майго сына няма. «Ігар, дзе ты? Хадзі сюды». Уваходзіць — усе месцы занятыя. Усё нейкія знакі... Ці то ад штуршка, ці то... Аўтобус крануўся, і брат на імгненне расплюшчыў вочы. Дрэнная прыкмета — у сям'і яшчэ будзе адна смерць. Адразу спалохаліся за нашу маму — за яе хворае сэрца. Калі апускалі труну ў яму, нешта ўпала туды... Таксама нядобра...

Апошні дзень... Раніца. Я ўмываюся, адчуваю: стаіць у праёме дзвярэй, трымаецца абедзвюма рукамі за вушак і глядзіць, глядзіць на мяне. Глядзіць. «Што з табой? Сядай за ўрокі. Я хутка вярнуся». Моўчкі павярнуўся і пайшоў у свой пакой. Пасля працы я сустрэлася з сяброўкай. Яна звязала для яго модны пуловер, гэта быў мой падарунак яму на дзень нараджэння. Прынесла дадому, муж яшчэ насварыўся: «Няўжо ты не разумееш, што яшчэ рана яму насіць такія шыкоўныя рэчы?» На абед падала яго любімыя курыныя катлеты. Звычайна дабаўкі просіць, а тут паторкаў відэльцам і кінуў. «Штосьці ў школе здарылася?» Маўчыць. Тут я заплакала, у мяне нешта градам пакаціліся слёзы. Я плакала так гучна ўпершыню за шмат гадоў, на пахаванні брата са мной такога не было. І ён спалохаўся. Спалохаўся так, што тут я пачала яго суцяшаць: «Прымер пуловер. — Надзеў. — Падабаецца?» — «Вельмі». Зазірнула праз некаторы час да яго ў пакой — ляжаў і чытаў. У іншым пакоі бацька друкаваў на машынцы. У мяне балела галава, і я заснула. Калі пажар, людзі спяць мацней, чым звычайна... Я пакінула яго... ён чытаў Пушкіна... Цімка, наш сабачка, ляжаў у вітальні. Не забрахаў, не заскуголіў. Не памятаю, колькі часу мінула, расплюшчваю вочы: каля мяне сядзіць муж. «А Ігар дзе?» — «У прыбіральні замкнуўся. Напэўна, вершы мармыча». Дзікі, немы страх падкінуў мяне ўгору. Падбягаю, стукаю, грукаю ў дзверы. Б'ю рукамі, нагамі. Цішыня. Клічу, крычу, малю. Цішыня. Муж шукае малаток, сякеру. Зрывае дзверы... У старэнькіх штанах, швэдры,

хатніх тапках… На нейкім рамяні… Схапіла, панесла. Мяккі, цёплы. Сталі рабіць штучнае дыханне. Выклікалі «хуткую дапамогу»…

Як жа я спала? Чаму Цімка не ўчуў? Сабакі такія чуйныя, яны ж вычуваюць у дзясяткі разоў лепш за нас, людзей. Чаму… Я сядзела і глядзела ў адну кропку. Мне зрабілі ўкол, і я кудысьці правалілася. Раніцай пабудзілі: «Вера, уставай. Пасля сабе не даруеш». «Ну, зараз я табе ўсыплю за такія жартачкі. Ты ў мяне атрымаеш», — падумала я. І тут да мяне даходзіць, што ўсыпаць няма каму.

Ён ляжыць у труне… На ім той швэдар, які я яму падрыхтавала да дня нараджэння…

Крычаць пачала не адразу… праз некалькі месяцаў… Але слёз не было. Крычаць крычала, але не плакала. І толькі калі адзін раз выпіла шклянку гарэлкі — заплакала. Пачала піць, каб плакаць… чапляцца за людзей… У адных нашых сяброў мы праседзелі, не выходзячы з кватэры, два дні. Цяпер разумею, як ім было цяжка, як мы іх мучылі. Мы ўцякалі са свайго дому… Зламалася крэсла на кухні, на якім ён звычайна сядзеў, — я не чапала, так гэтае крэсла і стаяла, а раптам яму не спадабаецца, што я выкіну ягоную ўлюбёную рэч. Дзверы ў ягоны пакой ні я, ні муж не маглі адчыніць. Два разы хацелі памяняць кватэру, ужо дакументы падрыхтуем, людзей абнадзеім, спакуем рэчы. І не магу з кватэры выйсці, мне здаецца, што ён дзесьці тут, я проста не бачу яго… але ён дзесьці тут… Я блукала па крамах, падбірала яму рэчы: вось штаны — ягоны колер, і гэтая кашуля. Якаясь па ліку вясна… якая — не памятаю… Прыходжу дадому, кажу мужу: «Ведаеш, сёння я спадабалася аднаму мужчыну. Ён хацеў прызначыць мне спатканне». І мой муж адказвае: «Як я рады за цябе, Верачка. Ты вяртаешся…» Бязмежна я была ўдзячная яму за гэтыя словы. Тут я хачу распавесці пра свайго мужа… Ён — фізік, нашы сябры жартуюць: «Пашанцавала вам — у адным флаконе фізік і лірык». Я кахала… Чаму кахала, а не кахаю? Таму што сябе

новую, якая выжыла, яшчэ не ведаю. Баюся… я не гатовая… я не змагу болей быць шчаслівай…

Уначы ляжу з расплюшчанымі вачыма. Званок. Ясна чую званок у дзверы. Раніцай распавядаю мужу. Ён: «А я нічога не чуў». Ноччу зноў званок. Я не сплю, гляджу на мужа — ён таксама прачнуўся. «Ты чуў?» — «Чуў». У нас у абодвух адчуванне, што мы не адны ў кватэры. І Цімка наўкол ложка бегае, кругамі, як за кімсьці. Я кудысьці падаю, у нейкае цяпло. І бачу такі сон… Незразумела дзе, выходзіць да мяне Ігар у тым швэдры, у якім мы яго пахавалі. «Мама, ты мяне клічаш і не разумееш, як мне цяжка да цябе прыйсці. Перастань плакаць». Дакранаюся да яго, ён мяккі. «Табе было добра дома?» — «Вельмі». — «А там?» Ён не паспявае адказаць, знікае. З тае ночы я перастала плакаць. І ён стаў сніцца мне маленькім, толькі маленькім. А я чакаю яго большага, каб пагаварыць з ім…

Гэта быў не сон. Я толькі заплюшчыла вочы… Дзверы ў пакой расчыніліся, дарослым, якім я яго ніколі не бачыла, ён увайшоў на імгненне. У яго быў такі твар, што я зразумела: яму ўжо абыякава ўсё, што тут адбываецца. Нашы размовы пра яго, успаміны. Ён ужо зусім ад нас далёка. А я не магу, каб наша сувязь парвалася. Я не магу… Я доўга думала… і вырашыла нарадзіць… Мне нельга было, ужо позна, дактары баяліся, але я нарадзіла. Нарадзіла — дзяўчынку. Мы да яе ставімся, як быццам яна не наша дзяўчынка, а дачка Ігара. Я баюся яе так любіць, як любіла яго… І я не магу яе так любіць. Ну вар'ятка я! Вар'ятка! Шмат плачу, хаджу і хаджу на могілкі. Дзяўчынка заўсёды са мной, а я не перастаю думаць пра смерць. Так нельга. Муж лічыць, што нам трэба з'ехаць. У іншую краіну. Каб усё памяняць: пейзаж, людзей, алфавіт. Сябрыклічуць у Ізраіль. Часта тэлефануюць нам: «Што вас там трымае?» *(Амаль крычыць.)* Што? Што?

Ёсць у мяне адна страшная думка: а раптам бы ён сам распавёў вам зусім іншую гісторыю? Зусім іншую…

## *З размоваў з сябрамі*

### *«...на гэтым неверагодным клеі ўсё трымалася»*

Мы былі тады зусім юныя... Юнацтва — кашмарны час, не ведаю, хто прыдумаў, што гэта прыўкрасны ўзрост. Ты няскладная, ты нязграбная, ты з усяго выломліваешся, ты не абароненая з усіх бакоў. А для бацькоў ты яшчэ маленькая, яны цябе лепяць. Ты ўвесь час пад нейкім каўпаком, і ніхто да цябе прабіцца не можа. Адчуванне... добра памятаю гэтае адчуванне... Як у бальніцы, калі я ляжала ў боксе за шклом. З нейкай інфекцыяй. Бацькі робяць выгляд (ты так думаеш), што хочуць быць з табою, насамрэч яны жывуць зусім у іншым свеце. Яны дзесьці далёка... быццам бы побач, але яны далёка... Бацькі не здагадваюцца, наколькі ў іх дзяцей усё сур'ёзнае. Першае каханне — гэта страшна. Смяротна небяспечна. Мая сяброўка лічыла, што Ігар наклаў на сябе рукі праз каханне да яе. Глупства! Глупства дзяўчачае... У яго былі закаханыя ўсе нашы дзяўчаты. О-о! Вельмі прыгожы, пры гэтым паводзіў сябе так, як быццам старэйшы за ўсіх нас, але было адчуванне, што ён вельмі самотны. Пісаў вершы. А паэт павінен быць азяблым і самотным. Загінуць на дуэлі. Ва ўсіх у нас было шмат юначае лухты ў галаве.

Гэта былі савецкія гады... камуністычныя... Нас выхоўвалі на Леніне, на палымяных рэвалюцыянерах, вельмі палымяных, мы не лічылі рэвалюцыю памылкай і злачынствам, але і не захапляліся марксісцка-ленінскімі мудрагельствамі. Рэвалюцыя была ўжо абстракцыяй... Больш за ўсё памятаю святы, і чаканне гэтых святаў. Усё вельмі яскрава памятаю... На вуліцах шмат людзей. Гучаць нейкія словы з дынамікаў, хтосьці верыць гэтым словам цалкам, а хтосьці часткова верыць, а хтосьці не верыць зусім. Але здаецца, што ўсе шчаслівыя. Шмат музыкі. Мама маладая, прыгожая. Усё разам... усё гэта разам успамінаецца як шчасце... Тыя пахі, тыя гукі... Стук

клавішаў пішучай машынкі, ранішнія крыкі малочніц, што прыязджалі з вёсак: «Малако! Малако!» Лядоўні былі яшчэ не ва ўсіх, і слоікі з малаком захоўваліся на балконах. А авоські з курамі матляліся на фортках. У вокны паміж падвойнымі рамамі закладалі вату з блёсткамі для прыгажосці і антонаўскія яблыкі. Каціны пах з падвалаў... А непараўнальны анучнахлёркавы пах савецкай сталоўкі? Усё гэта быццам бы не звязанае было адно з адным, але цяпер яно ў мяне злілося ў адно адчуванне. У адно пачуццё. А ў свабоды іншыя пахі... і карцінкі... Усё іншае... Пасля першай паездкі за мяжу... гэта ўжо пры Гарбачове... мой сябар вярнуўся адтуль са словамі: «Свабода пахне добрым соўсам». Я сама выдатна памятаю свой першы супермаркет у Берліне — сто гатункаў каўбасы і сто гатункаў сыру. Гэта было незразумела. Пасля перабудовы нас чакала шмат адкрыццяў, шмат новых эмоцый і новых думак. Яны яшчэ не апісаныя, іх яшчэ не ўклалі ў гісторыю. Формулаў яшчэ няма... Але я спяшаюся... пераскокваю з аднаго часу ў іншы... Вялікі свет нам адкрыецца потым. А тады мы толькі марылі пра яго... пра тое, чаго няма, чаго б хацелася... Добра было марыць пра свет, якога мы не ведалі. Марылі... А жылі савецкім жыццём, у якім існавалі адзіныя правілы гульні, і ўсе паводле іх гулялі. Вось нехта стаіць на трыбуне. Ён хлусіць, усе пляскаюць, але ўсе ведаюць, што ён хлусіць, і ён ведае, што яны ведаюць, што ён хлусіць. Але ён кажа ўсё гэта і радуецца апладысментам. Не было сумневаў, што і мы будзем так жыць і трэба шукаць сабе схоў. Мая мама слухала забароненага Галіча... і я слухала Галіча...

Яшчэ ўзгадала... Як хацелі паехаць у Маскву на пахаванне Высоцкага, міліцыя нас здымала з электрычкі... А мы раўлі: «Ратуйце нашы душы! / Мы трызнім ад удушша...», «Недалёт. Пералёт. Недалёт. Па сваіх артылерыя б'е...» Скандал! Дырэктар загадала з'явіцца ў школу разам з бацькамі. Са мной пайшла мая мама, і паводзіла яна сябе там выдатна... *(Задумалася.)* Жылі на кухні... краіна жыла на кухнях... Сядзім

у кагосьці, п'ём віно, слухаем песні, размаўляем пра вершы. Адкрытая бляшанка кансерваў і нарэзаны чорны хлеб. Нам усім добра. У нас былі свае рытуалы: байдаркі, намёты і вандроўкі. Песні каля вогнішча. І былі агульныя знакі, па якіх мы пазнавалі адно аднаго. Была свая мода, свае прыколы. Даўно няма гэтых таемных кухонных супольнасцяў. І няма таго нашага сяброўства, пра якое мы думалі, што яно вечнае. Так... была настройка на вечнасць... Нічога не было вышэй за сяброўства. На гэтым неверагодным клеі ўсё трымалася...

Насамрэч, ніхто з нас не жыў у СССР, кожны жыў у сваім коле. Кола турыстаў, кола альпіністаў... Мы пасля ўрокаў збіраліся ў нейкім ЖЭКу, там нам далі пакой. Арганізавалі тэатр, я грала ў гэтым тэатры. Быў літгурток. Памятаю, як Ігар чытаў там свае вершы, ён моцна пераймаў Маякоўскага і быў чароўны. Мянушка ў яго была — Студэнт. Да нас прыходзілі дарослыя паэты, і яны размаўлялі з намі шчыра. Ад іх мы даведаліся праўду аб пражскіх падзеях. Пра вайну ў Афганістане. Што... што яшчэ? Вучыліся граць на гітары. Ну, гэта абавязкова! У тыя гады гітара ўваходзіла ў спіс прадметаў першай неабходнасці. На каленях былі гатовыя слухаць улюбёных паэтаў і бардаў. Паэты збіралі цэлыя стадыёны. Конная міліцыя дзяжурыла. Слова было ўчынкам. Устаць на сходзе і сказаць праўду — учынак, таму што небяспечна. Выйсці на плошчу... Гэта такі драйв, такі адрэналін, такое адхланне. У слова ўсё вылівалася... Сёння гэта ўжо неверагодна, сёння трэба нешта зрабіць, а не сказаць. Казаць ты можаш абсалютна ўсё, але слова ніякай ужо ўлады не мае. Хацелі б верыць, але не можам. Усім на ўсё напляваць, а будучыня — дзярмо. З намі было не так... О-о! Вершы, вершы... словы, словы...

*(Смяецца.)* У дзясятым класе ў мяне быў раман. Хлопец жыў у Маскве. Я прыехала да яго толькі на тры дні. Раніцай на вакзале мы забралі ў ягоных сяброў ратапрынтавае выданне мемуараў Надзеі Мандэльштам, тады ўсе ёю зачытваліся. І на наступны дзень а чацвёртай раніцы кнігу трэба было вярнуць.

Прынесці да цягніка. Суткі мы без перапынку чыталі, адзін раз толькі збегалі па малако і батон. Нават забыліся цалавацца, перадавалі адно аднаму гэтыя аркушыкі. У нейкім трызненні, у нейкай ліхаманцы ўсё адбывалася… ад таго, што ты трымаеш гэтую кнігу ў руках… што ты яе чытаеш… Праз суткі спяшаліся скрозь пусты горад на вакзал, транспарт яшчэ не хадзіў. Я добра памятаю гэты начны горад, як мы ідзём, і кніга ляжыць у мяне ў торбачцы. Мы неслі яе, як нейкую сакрэтную зброю… Так мы верылі, што слова можа скалануць свет.

Гарбачоўскія гады… Свабода і купоны. Талоны… купоны… На ўсё: ад хлеба да круп і шкарпэтак. Стаялі ў чарзе па пяць-шэсць гадзін… Але стаіш з кнігай, якую раней ты не магла набыць, і ведаеш, што ўвечары пакажуць фільм, які раней быў забаронены, дзесяць гадоў праляжаў на паліцы. Кайф! Ці ўвесь дзень у цябе ў галаве, што ў дзесяць гадзін праграма «Взгляд»… Яе вядоўцы Аляксандр Любімаў і Уладзіслаў Ліцеў сталі народнымі героямі. Мы даведваліся праўду… што быў не толькі Гагарын, але і Берыя… Насамрэч мне, дурніцы, хапіла б свабоды слова, таму што я, як хутка высветлілася, была савецкая дзяўчынка, усё савецкае мы ўвабралі глыбей, чым нам здавалася. Мне толькі б далі пачытаць Даўлатава і Віктара Някрасава, далі б Галіча паслухаць. І мне гэтага б хапіла. Я і не марыла паехаць у Парыж, прайсціся па Манмартры… ці ўбачыць «Святое сямейства» Гаўдзі… Толькі дайце нам пачытаць і пагаварыць. Пачытаць! Захварэла наша Волечка, ёй было ўсяго чатыры месяцы, а ў яе цяжкая бранхіяльная абструкцыя. Я вар'яцела ад страху. Забралі мяне з ёй у бальніцу, але яе нельга было ні на хвіліну пакласці, толькі стаячком, у мяне на руках, яна заціхала. Стаячком так. Хаджу і хаджу з ёй па калідорах. Калі яна на паўгадзіны засне, як вы думаеце, чым я займалася? Я… не выспаная, змучаная… Чым? У мяне заўсёды быў пад пахай «Архіпелаг ГУЛАГ» — я яго ў тую ж хвіліну разгортвала. На адной руцэ памірае дзіця, а ў другой — Салжаніцын. Кнігі замянялі нам жыццё. Гэта быў наш свет.

Потым штосьці адбылося... Мы апусціліся на зямлю. Адчуванне шчасця і эйфарыі раптам надламілася. Усё і цалкам. Я зразумела, што гэты новы свет не мой, не для мяне. Яму патрэбныя нейкія іншыя людзі. Слабых бі ботамі па вачах! Наверх паднялі ніз... увогуле так, яшчэ адна рэвалюцыя... Але мэты ў гэтай рэвалюцыі зямныя: кожнаму па катэджу і машыне. Ці не драбнавата для чалавека? Вуліцы запоўнілі нейкія «качкі́» ў трэніках. Ваўкі! Затапталі ўсіх. Мая мама працавала майстрам на швейнай фабрыцы. Хутка... вельмі хутка закрылі фабрыку... мама сядзела дома і шыла майткі. Усе яе сяброўкі таксама шылі майткі, у якую кватэру ні зойдзеш. А жылі мы ў доме, які пабудавала фабрыка для сваіх работнікаў, вось усе і шылі майткі і станікі. Купальнікі. У масавым парадку з усіх старых рэчаў — са сваіх... прасілі знаёмых — адразалі цэтлікі, этыкеткі, пажадана імпартныя, і прышывалі да гэтых купальнікаў. Потым жанчыны збіраліся групамі і ехалі з мяхамі па Расіі, гэта называлася «трусоўка». Я ў гэты час ужо вучылася ў аспірантуры. *(Весела.)* Памятаю... камедыя... ва ўніверсітэцкай бібліятэцы і ў кабінеце дэкана стаялі бочкі з салёнымі гуркамі і памідорамі, з грыбамі і капустай. Саленні прадавалі, і гэтымі грашыма плацілі выкладчыкам заробак. А то раптам — увесь факультэт завалены апельсінамі. Ці ляжаць пачкі мужчынскіх кашуляў... Вялікая руская інтэлігенцыя выжывала як магла. Узгадалі старыя рэцэпты... тое, што елі ў вайну... У аддаленых закутках паркаў... на чыгуначных адхонах садзілі бульбу... Есці тыднямі адну бульбу — гэта голад ці не голад? А адну кіслую капусту? Мяне да канца жыцця ад яе адвярнула. Навучыліся рабіць чыпсы з бульбянога лушпіння, перадавалі адзін аднаму гэты цудоўны рэцэпт: кінуць лушпінне ў алейны вар і не шкадаваць солі. Малака не было, але прадавалася марозіва, манную кашу варылі на марозіве. Ці ела б я гэта цяпер?

Першым зніякавела наша сяброўства... Ва ўсіх з'явіліся нейкія справы — трэба было грошы зарабляць. Раней здавалася, што нам тыя грошы... яны ніякай улады над намі не

маюць... А тут усе аценілі хараство зялёных паперак, гэта не савецкія рублі, не «рэзаная папера». Кніжныя дзяўчаткі і хлопчыкі... хатнія расліны... Мы аказаліся не прыстасаваныя да новага жыцця, якога чакалі. Штосьці іншае мы чакалі, не гэта. Прачыталі вагон рамантычных кніг, а жыццё пагнала штурхалямі ў карак ды ў іншы бок. Замест Высоцкага — Кіркораў. Папса! І гэтым усё сказана... Нядаўна сабраліся ў мяне на кухні, што ўжо рэдка бывае, і спрачаліся: ці спяваў бы Высоцкі для Абрамовіча? Думкі падзяліліся. Болей было тых, хто ўпэўнены: ясна, спяваў бы. Іншае пытанне — за колькі?

Ігар? Ён застаўся ў маёй памяці падобным да Маякоўскага. Прыгожым і самотным. *(Маўчыць.)* Ці я вам нешта патлумачыла? Ці атрымалася ў мяне?..

*«...і кірмаш стаў нашым універсітэтам»*

Шмат гадоў прамінула... Для мяне дагэтуль пытанне: чаму? Чаму ён так вырашыў? Мы сябравалі, але ён усё вырашыў сам... адзін... Ну што вы скажаце чалавеку на даху? Ну што? У юнацтве я сам думаў пра самагубства, а чаму — незразумела. Люблю маму, тату... брата... усё дома добра... А кудысьці нясе. Недзе там... там штосьці ёсць... Што? Штосьці... яно вось там... Там цэлы свет, больш яркі, больш значны за той, у якім ты жывеш, там штосьці больш важнае адбываецца. І там ты можаш дакрануцца да нейкай таямніцы, іншым шляхам спасцігнуць яе нельга, рацыянальна ты да яе не падключышся. Вось хочацца... дай паспрабую... Устаць на карніз... скочыць з балкона... Але ты не збіраешся паміраць, ты хочаш узняцца ўверх, ты хочаш паляцець, табе здаецца, што ты ўзляціш. Дзейнічаеш як у сне... у непрытомнасці... Калі апрытомнееш, успамінаецца нейкае святло, нейкі гук... і пачуццё, што ў тым стане табе было добра... табе было нашмат лепей, чым тут...

Наша кампанія... З намі быў яшчэ Лёшка... Нядаўна памёр ад перадозу. Вадзім у дзевяностыя знік. Заняўся кніжным

бізнэсам. Пачалося як жарт… дурная ідэя… А як толькі на грошы ўзбіўся — адразу ж на яго наехаў рэкет, хлопцы з наганамі. Ён то адкупляўся, то бегаў ад іх — спаў у лесе на дрэвах. У тыя гады біцца перасталі, больш забівалі. Дзе ён? Слядоў няма… дагэтуль міліцыя не знайшла… Закапалі дзе-небудзь. Аркадзь зваліў у Амерыку: «Я лепей буду жыць у Нью-Ёрку пад мостам». Засталіся я і Ілюша… Ілюша ажаніўся з вялікім каханнем. Жонка цярпела яго дзівацтвы, пакуль была мода на паэтаў і мастакоў, але потым у моду ўвайшлі брокеры і бухгалтары. Жонка сышла. У яго пачалася цяжкая дэпрэсія, ён выйдзе на вуліцу — і тут жа панічная атака. Яго трасе ад страху. Сядзіць дома. Вялікае дзіця ў бацькоў. Піша вершы — крык душы… А ў юнацтве мы слухалі адны і тыя ж касеты і чыталі адны і тыя ж савецкія кніжкі. Ездзілі на аднолькавых роварах… У тым жыцці ўсё ў нас было проста: адны чаравікі на ўсе поры года, адна куртка, адны штаны. Нас выхоўвалі, як маладых воінаў у старажытнай Спарце: калі Радзіма загадае, на агонь руку пакладзем.

…Нейкае ваеннае свята… Наш дзіцячы садок прывялі да помніка піянеру-герою Марату Казею: «Вось, дзеці, — сказала выхавальніца, — гэта юны герой, ён падарваў сябе гранатай і знішчыў шмат фашыстаў. Калі вы вырасцеце, вы павінны стаць такімі ж». Таксама падарваць сябе гранатай? Сам я гэтага не памятаю… з маміных слоў… Уначы я моцна плакаў: мне трэба памерці, буду ляжаць недзе адзін, без мамы і таты… калі я плачу, значыць, я ні кропелькі не герой… Я захварэў.

…А калі вучыўся ў школе, у мяне ўжо была мара — трапіць у атрад, які нёс варту каля Вечнага агню ў цэнтры горада. Туды бралі найлепшых вучняў. Ім шылі вайсковыя шынялі, шапкі-аблавухі і выдавалі вайсковыя пальчаткі. Гэта не нейкая там абавязалаўка, а вялікі гонар — трапіць туды. Слухалі заходнюю музыку, ганяліся за джынсамі, яны ўжо з'явіліся і ў нас… сімвал дваццатага стагоддзя, як і аўтамат Калашнікава… Мае першыя джынсы былі з лэйблам «Мантана» — як жа

гэта было крута! А ўначы мне снілася, як я кідаюся з гранатай на ворага…

…Памерла бабуля, да нас пераехаў жыць дзед. Кадравы афіцэр, падпалкоўнік. У яго было шмат ордэнаў і медалёў, я ўвесь час чапляўся да яго: «Дзед, за што табе далі гэты ордэн?» — «За абарону Адэсы». — «А які ты подзвіг здзейсніў?» — «Абараняў Адэсу». І кропка. Я на яго за гэта крыўдаваў. «Дзед, а ты штонебудзь высакароднае, гераічнае ўспомні». — «З гэтым не да мяне, а ў бібліятэку. Вазьмі кнігу і пачытай». Дзед у мяне быў класны, мы проста хімічна з ім прыцягваліся адзін да аднаго. Памёр у красавіку, а хацеў дажыць да траўня. Да Дня Перамогі.

…У шаснаццаць гадоў мяне, як належыць, выклікалі ў ваенкамат: «У якія войскі жадаеш?» Я заявіў ваенкому, што закончу школу і буду прасіцца ў Афганістан. «Дурань», — сказаў ваенком. Але я доўга рыхтаваўся: скакаў з парашутам, вывучыў аўтамат… Мы — апошнія піянеры Краіны Саветаў. Будзь гатовы!

…З нашага класа ад'язджаў у Ізраіль адзін хлопчык… Склікалі агульнашкольны сход, яго пераконвалі: калі тvае бацькі хочуць з'ехаць, няхай з'язджаюць, але ў нас ёсць добрыя дзіцячыя дамы, ты там давучышся і застанешся жыць у СССР. Для нас ён быў здраднікам. Яго выключылі з камсамола. Назаўтра ўвесь клас ехаў у калгас на «бульбу», ён таксама прыйшоў, яго вывелі з аўтобуса. Дырэктар школы ўсіх на лінейцы папярэдзіла: хто, маўляў, пачне з ім ліставацца, таму будзе цяжка закончыць школу. Калі ён з'ехаў, мы ўсе сталі дружна яму пісаць…

…У перабудову… Тыя ж настаўнікі нам сказалі: забыць усё, што мы раней вучылі, і чытаць газеты. Вучыліся па газетах. Выпускны экзамен па гісторыі наогул адмянілі, не прыйшлося зубрыць з'езды КПСС усялякія. На апошняй кастрычніцкай дэманстрацыі нам яшчэ раздалі плакаты і партрэты правадыроў, але для нас гэта ўжо было, як карнавал для бразільцаў.

…Памятаю, як людзі хадзілі з мяхамі савецкіх грошай па пустых крамах…

Паступіў ва ўніверсітэт... Чубайс у гэты час агітаваў за ваўчары, ён абяцаў, што адзін ваўчар будзе каштаваць дзве «Волгі», тады як цяпер ён каштуе дзве капейкі. Драйвовы час! Я раздаваў улёткі ў метро... Усе марылі пра новае жыццё... Марылі... Марылі, што каўбасы на прылаўках стане навалам, па савецкім кошце, і члены Палітбюро будуць стаяць па яе ў агульнай чарзе. Каўбаса — пункт адліку. У нас экзістэнцыйная любоў да каўбасы... Гібель багоў! Фабрыкі — рабочым! Зямлю — сялянам! Рэкі — бабрам! Берлагі — мядзведзям! Шэсці на вуліцах і трансляцыя З'езду народных дэпутатаў цудоўна замянялі мексіканскія серыялы... Правучыўся я два курсы... І кінуў універсітэт. Шкада было бацькоў, ім проста сказалі: вы — нікчэмныя саўкі, ваша жыццё прапала не за понюх табакі, вы вінаватыя ва ўсім, пачынаючы ад Ноевага каўчэга, вы цяпер нікому не патрэбныя. Усё жыццё гарбаціцца, і ў выніку — нічога. Усё гэта іх падкасіла, разбурыла іх свет, яны так і не аднавіліся, не ўпісаліся ў круты паварот. Малодшы брат пасля ўрокаў мыў машыны, гандляваў у метро жуйкамі і ўсякай фігнёй, і ён зарабляў больш за бацьку... Бацька быў вучоны. Доктар навук! Савецкая эліта! У камерцыйных крамах з'явілася каўбаса, усе пабеглі глядзець. Убачылі цэны! Так у нашае жыццё ўвайшоў капіталізм...

Я стаў грузчыкам. Гэта было шчасце! Разгрузім з сябрам фуру з цукрам — нам дадуць грошы і па меху цукру. А што такое ў дзевяностыя мех цукру? Цэлы скарб! Грошы! Грошы! Пачатак капіталізму... За адзін дзень ты мог стаць мільянерам ці атрымаць кулю ў лоб. Цяпер успамінаюць... Палохаюць: магла быць грамадзянская вайна... Стаялі над прорвай! Я гэтага не адчуў. Помню, што вуліцы спусцелі, на барыкадах — нікога. Газеты перасталі выпісваць і чытаць. Мужыкі ў двары спачатку ганілі Гарбачова, а за ім Ельцына за тое, што гарэлка падаражэла. Замахнуліся на святое! Дзікі, невытлумачальны азарт ахапіў усіх. У паветры кружыў пах грошай. Вялікіх грошай. І абсалютная свабода — ні партыі, ні ўраду. Усе хацелі

рабіць «бабло», і тыя, хто рабіць «бабло» не ўмеў, зайздросцілі тым, хто ўмеў. Хтосьці гандляваў, хтосьці набываў… нехта прыкрываў, хтосьці «крышаваў»… Я зарабіў першыя «бабкі»… Пайшоў з сябрамі ў рэстаран. Замовілі «Марціні» і «Раяль» — тады гэта было супер! Хацелася патрымаць у руках келіх. Пакрасавацца. Закурылі «Мальбара». Усё — як чыталі ў Рэмарка. Доўга жылі як на карцінках. Новыя крамы… рэстараны… як дэкарацыі з чужога жыцця…

…Гандляваў смажанымі сасіскамі. Шалёныя «бабкі» намываліся…

…Вазіў гарэлку ў Туркменію… Тыдзень прасядзеў з напарнікам у закрытым таварным вагоне. Сякеры былі напагатове. І лом. Даведаліся б, што мы вязём, — забілі б! Назад загрузіліся махровымі ручнікамі…

…Прадаваў дзіцячыя цацкі… Адзін раз забралі ў мяне оптам цэлую партыю і расплаціліся фурай газаваных напояў, якія я абмяняў на грузавік семак, на маслабойні ў абмен на семкі атрымаў алей, які часткова прадаў, а часткова абмяняў на тэфлонавыя патэльні і прасы…

…Цяпер у мяне кветкавы бізнэс… Навучыўся «саліць» ружы… У кардонную скрынку засыпаеш напаленую соль — пластам не менш за сантыметр, укладваеш туды паўраспушчаныя кветкі і зверху яшчэ раз пасыпаеш соллю. Закрываеш вечкам — і ў вялікі поліэтыленавы пакет. Моцна завязаць. Праз месяц… праз год дастаў, абмыў вадой… Прыходзьце ў любы дзень і гадзіну. Вось візітовачка…

Кірмаш стаў нашым універсітэтам… Гэта гучна сказана — універсітэтам, але пачатковай школай жыцця — дакладна. Сюды прыходзілі, як у музей. Як у бібліятэку. Хлопцы і дзяўчаты як зомбі хадзілі міма шапікаў… з тварамі вар'ятаў… Вось пара спыняецца каля кітайскіх эпілятараў… І яна яму тлумачыць, наколькі важная эпіляцыя: «Ты ж гэтага хочаш, так? Ты хочаш, каб я была як…» Імя актрысы я не памятаю… ну, Марына Уладзі, напрыклад, ці Катрын Дэнёў. Мільёны нейкіх новых

пушачак, слоічкаў. Іх прыносілі дадому як святарныя тэксты, выкарыстаўшы змесціва, слоічкі не выкідалі, выстаўлялі на ганаровае месца на кніжных паліцах або ў серванце за шклом. Першыя глянцавыя часопісы чыталі як класіку, пабожная вера, што за гэтай абгорткай, за гэтым шалупіннем — там прыўкраснае жыццё. У першы «Макдональдс» кіламетровыя чэргі… Рэпартажы ў ТБ. Дарослыя інтэлігентныя людзі берaглі пушачкі і сурвэткі адтуль. З гонарам дэманстравалі гасцям.

Мой добры знаёмы… Жонка на дзвюх працах гарбаціцца, а ў яго пыха: «Я — паэт. Каструлі прадаваць не пайду. Гіджуся». Калісьці мы з ім, як усе, хадзілі па вуліцах і крычалі: «Дэмакратыя! Дэмакратыя!» — і ўяўлення не мелі, што за гэтым будзе. Каструлі прадаваць ніхто не збіраўся. А цяпер… Выбару няма: ці ты корміш сям'ю, ці трымаешся за саўковыя ідэалы. Або-або… без варыянтаў… Пішаш вершы, брынкаеш на гітары, цябе пляскаюць па плячы: «Ну, давай! Давай!», а ў кішэні пуста. Тыя, хто з'ехаў з краіны? Там яны і каструлі прадаюць, і піцу развозяць… на кардоннай фабрыцы скрынкі клеяць… Там не сорамна.

Ці вы мяне зразумелі? Я пра Ігара расказваў… Пра наша страчанае пакаленне — камуністычнае дзяцінства і капіталістычнае жыццё. Ненавіджу гітару! Магу падарыць.

## Пра іншую біблію і іншых вернікаў

*Васіль Пятровіч Н. — член камуністычнай партыі з 1922 года, 87 гадоў*

— Ну так… хацеў… Дактары вярнулі адтуль… Хіба яны ведаюць, адкуль вяртаюць? Я, вядома, атэіст, але ў старасці ўжо ненадзейны атэіст. Ты сам-насам з гэтым… з думкай, што трэба сыходзіць… кудысьці… Ну так… іншы погляд… та-а-ак…

На зямлю… на пясок… Не магу спакойна глядзець на звычайны пясок. Я даўно стары. Сядзім з коткай каля акна. *(Котка на каленях. Гладзіць.)* Тэлевізар уключым…

І ясная рэч… Ніколі я не думаў, што дажыву да часоў, калі пачнуць ставіць помнікі белым генералам. Раней героі — хто? Чырвоныя камандзіры… Фрунзэ, Шчорс… А цяпер — Дзянікін, Калчак… Хоць жывыя яшчэ тыя, хто памятае, як калчакаўцы нас вешалі на ліхтарах. «Белыя» перамаглі… Так атрымліваецца? А я ваяваў, ваяваў, ваяваў. За што? Будаваў, будаваў… Што? Быў бы я пісьменнікам, сам узяўся б за мемуары. Слухаў нядаўна па радыё перадачу пра свой завод. Я быў першым дырэктарам. Пра мяне расказвалі, як быццам мяне ўжо няма — я памёр. А я… я жывы… Яны ўявіць сабе не маглі, што я яшчэ тут… Так! Ну так… *(Смяёмся ўтраіх. З намі сядзіць унук. Слухае.)* Я адчуваю сябе забытым экспанатам у музейным запасніку. Запыленым чарапком. Вялікая была імперыя — ад мора да мора, ад Запаляр'я да субтропікаў. Дзе яна? Пераможаная без бомбы… без Хірасімы… Перамагла Яе Вялікасць каўбаса! Добрая жратва перамагла! «Мерседэс-бэнц». Больш нічога чалавеку не трэба, не прапаноўвайце яму нічога больш. Без сэнсу. Толькі хлеба і відовішчаў! І гэта найвялікшае адкрыццё дваццатага стагоддзя. Адказ усім вялікім гуманістам. І крамлёўскім летуценнікам. А мы… маё пакаленне… у нас былі вялікія планы. Марылі пра сусветную рэвалюцыю: «Мы да жалю ўсіх буржуяў / На ўвесь свет пажар раздуем». Пабудуем новы свет, зробім усіх шчаслівымі. Нам здавалася, што гэта магчыма, я шчыра верыў! Абсалютна шчыра! *(Задыхаецца ад кашлю.)* Дыхавіца замучыла. Пачакайце… *(Паўза.)* Вось, я дажыў… дажыў да будучыні, пра якую марылі. Паміралі дзеля яе, забівалі. Крыві было шмат… і сваёй, і чужой… «Ідзі і гібні безумоўна! / Памрэш не дарма — рэч грунтоўная, / Калі пад ёй струменіць кроў…» «То сэрца не навучыцца любіць, якое перастала ненавідзець…» *(Здзіўлена.)* Помню… не забыўся! Не ўсё вытруціў з памяці склероз. Не канчаткова. Вершы мы

вучылі на ўроках палітграматы... Колькі ж гэта гадоў мінула? Сказаць страшна...

Чым я агаломшаны? Забіты чым? Ідэя растаптаная! Камунізму абвясцілі анафему! Усё разляцелася ў друз! Я — звар'яцелы стары. Крывавы маньяк... серыйны забойца... Так, выходзіць? Я занадта доўга жыву, так доўга жыць не трэба. Нельга... не... нельга... Небяспечна жыць доўга. Мой час скончыўся раней за маё жыццё. Трэба паміраць разам са сваім часам. Як мае таварышы... Яны гінулі рана, у дваццаць-трыццаць гадоў... Шчаслівыя паміралі... З верай! З рэвалюцыяй у сэрцы, як тады казалі. Я ім зайздрошчу. Вы не зразумееце... я ім зайздрошчу... «Памёр наш юны барабаншчык...» Слаўна загінуў! За вялікую справу! *(Задумаўся.)* Я ўвесь час жыў побач са смерцю, але мала думаў пра смерць. А гэтым летам звазілі мяне на лецішча. Я глядзеў і глядзеў на зямлю... яна жывая...

—Смерць і забойства — хіба гэта адно і тое самае? Вы жылі сярод забойстваў.

—*(Раздражнёна.)* За такія пытанні... Быць бы вам лагерным пылам. Поўнач ці расстрэл — выбар маленькі. У мой час такіх пытанняў не задавалі. Не было ў нас такіх пытанняў! Мы... Мы ўяўлялі сабе справядлівае жыццё, без бедных і багатых. Паміралі за рэвалюцыю, паміралі ідэалістамі... бяссрэбнікамі... Маіх сяброў даўно няма, я застаўся адзін. Няма маіх суразмоўцаў... Па начах я гутару з мёртвымі... А вы? Вы нашых пачуццяў і нашых слоў не ведаеце: харчразвёрстка, харчатрад, лішэнец, камбед... паражэнец, паўторнік... Санскрыцкія пісьмёны для вас! Іерогліфы! Старасць — гэта, перш за ўсё, адзінота. Апошні знаёмы стары ў суседнім пад'ездзе памёр пяць гадоў таму, а можа, і больш... ужо сем... Вакол адны незнаёмыя людзі. Прыходзяць: з музея, з архіву... з энцыклапедыі... Я — даведнік... жывы архіў... А суразмоўцаў няма... З кім бы я хацеў пагаварыць? Мог бы з Лазарам Кагановічам... Нас мала ўжо засталося, а тых, хто не ў маразме, яшчэ менш. Ён старэйшы, яму ўжо дзевяноста. Чытаў у газетах... *(Смяецца.)*

У газетах пішуць, што старыя ў двары адмаўляюцца гуляць з ім у даміно. У карты. Гоняць: «Душагуб!» І ён плача ад крыўды. Калісьці жалезны наркам. Расстрэльныя спісы падпісваў, дзясяткі тысяч людзей загубіў. Трыццаць гадоў быў побач са Сталінам. А на старасці гадоў яму няма з кім перакінуцца ў карты… забіць «казла»… Звычайныя рабацягі пагарджаюць… *(Далей кажа ціха. Не магу разабраць. Схопліваю толькі некалькі слоў.)* Страшна… жыць доўга страшна.

…Я не гісторык і нават не гуманітарый. Праўда, пэўны час працаваў дырэктарам тэатра, нашага гарадскога тэатра. На які ўчастак кідала партыя, там і служыў. Адданы быў партыі. Жыццё мала памятаю, памятаю толькі працу. Краіна была будпляцоўкай… домнай… Кузняй! Так цяпер не працуюць. Я спаў па тры гадзіны на суткі. Тры гадзіны… Мы адставалі ад перадавых краін на пяцьдзясят-сто гадоў. На цэлае стагоддзе. Сталінскі план — дагнаць за пятнаццаць-дваццаць гадоў. Знакаміты сталінскі скачок. І мы верылі — дагонім! Цяпер людзі ні ў што не вераць, а тады верылі. Лёгка верылі. Нашы лозунгі: «Ударым рэвалюцыйнымі марамі па індустрыйным рэзруху!», «Бальшавікі павінны авалодаць тэхнікай!», «Дагонім капіталізм!». Я дома не жыў… жыў на заводзе… на будоўлі. Ну так… А другой… а трэцяй гадзіне ночы мог зазваніць тэлефон. Сталін не спаў, клаўся позна, і, адпаведна, мы не спалі. Кіраўнічыя кадры. З верху да нізу. Маю два ордэны і тры інфаркты. Быў дырэктарам шыннага завода, начальнікам будтрэста, адтуль перакінулі на мясакамбінат. Загадваў партархівам. Пасля трэцяга інфаркту далі тэатр… Наш час… мой… Вялікі час! Ніхто для сябе не жыў. Таму крыўдна… Брала ў мяне нядаўна інтэрв'ю адна мілая паненка. Пачала мяне пераконваць, у які страшны час мы жылі. Яна ў кніжках чытала, а я там жыў. Я сам адтуль родам. З тых гадоў. І яна мне расказвае: «Вы былі рабы. Сталінскія рабы». Смаркачка! Не быў я рабом! Не быў! Я цяпер сам не магу выкарабкацца з сумневаў… Але рабом я не быў… У людзей каша ў галаве.

Усё перамяшалася: Калчак і Чапаеў, Дзянікін і Фрунзэ... Ленін і цар... Бела-чырвоная мяшанка. Халаднік. Чачотку на магілах скачуць! Гэта быў вялікі час! Больш ніколі мы не будзем жыць у такой моцнай і вялікай краіне. Я плакаў, калі Савецкі Саюз разваліўся... Нас адразу праклялі. Абылгалі. Перамог абывацель. Вош. Чарвяк.

Мая Радзіма — Кастрычнік. Ленін... сацыялізм... Я любіў рэвалюцыю! Партыя — найдаражэйшае для мяне. Я семдзесят гадоў у партыі. Партбілет — мая біблія. *(Дэкламуе.)* «Увесь свет прыгнёту мы разбурым, / Увесь дарэшты, а затым / Мы наш, мы новы свет збудуем. / Хто быў нікім, той стане ўсім...» Хацелі пабудаваць Царства Божае на зямлі. Прыгожая, але нязбытная мара, чалавек яшчэ да гэтага не гатовы. Недасканалы ён. Ну так... Але ад Пугачова і дзекабрыстаў... да самога Леніна... усе марылі пра роўнасць і братэрства. Без ідэі справядлівасці будзе іншая Расія і іншыя людзі. Зусім іншая будзе краіна. Мы яшчэ не перахварэлі на камунізм. Не спадзявайцеся. І свет не перахварэў. Чалавек заўсёды будзе марыць пра Горад Сонца. Ён яшчэ ў шкуры хадзіў, у пячоры жыў, а ўжо хацеў справядлівасці. Успомніце савецкія песні і савецкія фільмы... Якая там мара! Вера... «Мерседэс» — гэта не мара...

*Унук праз усю размову будзе маўчаць. Раскажа ў адказ на мае пытанні толькі некалькі анекдотаў.*

*З анекдотаў, расказаных унукам*

*Трыццаць сёмы год... Два старыя бальшавікі ў камеры. Адзін кажа: «Не, не дажывём мы да камунізму, але нашы дзеці...» Другі: «Бедныя нашы дзеці!»*

Стары я... даўно... Але старасць — гэта таксама цікава. Разумееш, што чалавек — жывёла... жывёльнага раптам выяўляецца шмат... Гэта час, як казала Ранеўская, калі свечкі на імянінным пірагу каштуюць даражэй за сам пірог, а палова мачы ідзе на аналізы. *(Смяецца.)* Нічога не ратуе ад старас-

ці — ні ордэны, ні медалі… Не-е-е… Гудзе лядоўня, цікае гадзіннік. Больш нічога не адбываецца. *(Загаварылі пра ўнука. Унук на кухні гатуе гарбату.)* Дзеці пайшлі… у іх толькі камп'ютар у галаве… У дзявятым класе гэты мой унук, ён малодшы, сказаў мне: «Пра Івана Грознага чытаць буду, а пра Сталіна не хачу. Абрыд твой Сталін!» Нічога не ведаюць, а ўжо абрыд. Праехалі! Усе праклінаюць сямнаццаты год. «Дурні! — кажуць пра нас. — Навошта яны рэвалюцыю рабілі?» А ў мяне ў памяці… Я памятаю людзей з прамяністымі вачыма. Сэрцы нашы гарэлі! Ніхто мне не верыць! Але я ж не звар'яцеў… Памятаю… Та-а-ак… Гэтыя людзі нічога не хацелі для сябе, не было, як цяпер, на першым месцы — я. Міса баршчу… домік… садок… Было — мы. Мы! Мы! Да мяне часам заходзіць сябар майго сына, прафесар універсітэта. За мяжу ездзіць, лекцыі там чытае. Сварымся з ім да сіпаты. Я яму пра Тухачэўскага, а ён у адказ: чырвоны камандарм тамбоўскіх сялян газам труціў, матросаў у Кранштаце вешаў. Спачатку, кажа, вы пастралялі дваран і папоў… гэта ў сямнаццатым годзе… а ў трыццаць сёмым вас саміх пастралялі… Ужо і да Леніна дабраліся. Леніна я нікому не аддам! З Леніным у сэрцы памру! Зараз… Пачакайце… *(Моцны кашаль. Праз кашаль далей зноў не вельмі разборліва.)* Раней будавалі флот, заваёўвалі космас, а цяпер — палацы, сядзібы, асабнякі, яхты… Шчыра прызнацца, часта ні пра што не думаю. Працуе або не працуе кішэчнік? — вось што з раніцы важна. Так жыццё сканчаецца.

…Нам было па васямнаццаць-дваццаць гадоў… Пра што мы гаварылі? Гаварылі пра рэвалюцыю і пра каханне. Мы былі фанатыкі рэвалюцыі. Але шмат спрачаліся і пра папулярную ў той час кнігу Аляксандры Калантай «Каханне пчол працоўных». Аўтарка абараняла вольнае каханне, гэта значыць, каханне без усяго лішняга… «як выпіць шклянку вады»… Без уздыхаў і без кветак, без рэўнасці і слёз. Каханне з пацалункамі і любоўнымі цыдулкамі лічылася буржуазным перажыткам. Усё гэта сапраўдны рэвалюцыянер павінен быў

у сабе перамагчы. Мы нават праводзілі сходы на гэтую тэму. Нашы погляды дзяліліся: адны — за вольнае каханне, але з «чаромхай», значыць, з пачуццямі, а іншыя — без усялякай «чаромхі». Я быў за тое, каб з «чаромхай», хоць бы цалавацца. Так! Ну так... *(Смяецца.)* Якраз у гэты час я закахаўся, заляцаўся да сваёй будучай жонкі. Як заляцаўся? Чыталі разам Горкага: «Бура! Хутка грымне бура!... Глупы пінгвін баязліва туліць цела між уцёсаў...» Наіўна? Але і прыўкрасна таксама. Прыўкрасна, чорт пабірай! *(Смяецца па-маладому. І я заўважаю, які ён дагэтуль прыгожы.)* Танцы... звычайныя танцы... мы лічылі мяшчанствам. Арганізоўвалі суды над танцамі і каралі тых камсамольцаў, якія танчылі, дарылі сваім дзяўчатам кветкі. Я нейкі час нават быў старшынёй суда над танцамі. Праз гэтае сваё «марксісцкае» перакананне так і не навучыўся танчыць. Пасля каяўся. Ніколі не мог патанчыць з прыгожай жанчынай. Мядзведзь! Ладзілі камсамольскія вяселлі. Без свечак, без вянкоў. Без папоў. Замест абразоў — партрэты Леніна і Маркса. Мая нявеста мела доўгія валасы, дык да вяселля яна іх абрэзала. Прыгажосцю мы грэбавалі. Ну ясна, гэта было няправільна. Як той казаў, перагіб... *(Зноў кашаль. Махае рукой, каб я не выключала дыктафон.)* Нічога нічога... мне няма куды адкладаць... Хутка распадуся на фосфар, кальцый ды іншае. Ад каго вы яшчэ даведаецеся праўду? Засталіся адны архівы. Паперкі. Ну так... Я працаваў у архіве і ведаю: паперкі хлусяць яшчэ горш за людзей.

Пра што я? Пра каханне... пра маю першую жонку... Калі ў нас нарадзіўся сын, мы назвалі яго Акцябром. У гонар дзясятых угодкаў Вялікай Рэвалюцыі. Я хацеў яшчэ дачку. «Калі хочаш ад мяне другое дзіця, значыць, кахаеш, — смяялася жонка. — А як мы назавём нашу дзяўчынку?» Мне падабалася імя Люблена, яно складалася са слоў «люблю Леніна». Жонка выпісала на аркушыку ўсе свае ўлюбёныя жаночыя імёны: Марксана, Сталіна, Энгельсіна... Іскра... Самыя модныя ў той час. Так гэты аркушык і застаўся ляжаць на стале...

Першага бальшавіка я ўбачыў у сваёй вёсцы... Малады студэнт у салдацкім шынялі. Ён выступаў на плошчы каля царквы: «Цяпер адны ходзяць у ботах, а іншыя — у лапцях. А калі будзе бальшавіцкая ўлада, усе стануць аднолькавымі». Мужыкі крычалі: «А як гэта?» — «А гэта настане такі цудоўны час, калі вашы жонкі будуць насіць шаўковыя сукенкі і туфлікі на абцасах. Не будзе багатых і бедных. Усім будзе добра». Мая мама надзене шаўковую сукенку, сястрычка туфлікі на абцасах. Я буду вучыцца... Усе людзі стануць жыць як браты, усе будуць роўныя. Як не палюбіць такую мару! Бальшавікам паверылі бедныя людзі, галота безмаетная. Моладзь за бальшавікамі пайшла. Мы хадзілі па вуліцах і крычалі «Далоў званы — на трактары!» Пра Бога ведалі толькі адно — што Бога няма. Смяяліся з папоў, seклі дома абразы. Замест крыжовых шэсцяў — дэманстрацыі з чырвонымі сцягамі.... *(Спыніўся.)* Здаецца, я гэта ўжо расказваў? Склероз... Я стары... даўно... Ну так... Марксізм стаў нашай рэлігіяй. Я быў шчаслівы, што жыву ў адзін час з Леніным. Збярэмся разам і спяваем «Інтэрнацыянал». У пятнаццаць-шаснаццаць гадоў — ужо камсамолец. Камуніст. Салдат рэвалюцыі. *(Маўчыць.)* Смерці я не баюся... у маім узросце... Толькі непрыемна... Мне непрыемна з аднае прычыны: камусьці давядзецца з маім целам важдацца. Валтузня з целам... Зайшоў я адзін раз у царкву. З бацюшкам пазнаёміўся. Бацюшка: «Трэба паспавядацца». Стары я... А ці ёсць Бог ці не — хутка і так даведаюся. *(Смяецца.)*

Паўгалодныя, паўраздзетыя... Але суботнікі ў нас круглы год, і ўзімку таксама. Мароз! На маёй жонцы лёгкі палітонік, яна цяжарная. Грузім на станцыі вугаль, дровы, цягаем тачкамі. Незнаёмая дзяўчына, якая працавала побач з намі, пытаецца ў жонкі: «У цябе такі палітонік летні. А цяплейшага няма?» — «Не». — «Ведаеш, а ў мяне два. Было добрае паліто, і ад Чырвонага крыжа атрымала новае. Ты скажы мне свой адрас, я ўвечары прынясу». Увечары яна прынесла нам паліто, але не старое сваё паліто, а новае. Яна нас не ведала,

дастаткова было: мы — члены партыі, і яна — член партыі. Мы былі як браты і сёстры. У нашым доме жыла сляпая дзяўчына, з дзяцінства сляпая, і яна плакала, калі яе не бралі на суботнікі. Хай яна мала дапаможа, але яна паспявае з намі песні. Рэвалюцыйныя песні!

Мае таварышы... яны ляжаць пад каменнымі плітамі... На камянях высечана: член партыі бальшавікоў з дваццатага... дваццаць чацвёртага... дваццаць сёмага года... І пасля смерці было важна: якой ты веры? Хавалі партыйных асобна, труна ў чырвоным кумачы. Я памятаю дзень смерці Леніна... Як? Ленін памёр? Не можа быць! Ён жа святы... *(Просіць унука, і той здымае з паліцы і паказвае мне маленькія ленінскія бюсты. З бронзы, чыгуну, парцаляны.)* Калекцыя сабралася. Усё падарункі. А ўчора... Па радыё сказалі: ад помніка Леніну ў цэнтры горада адпілавалі ноччу руку. На металалом... за капейкі... Быў абраз. Бог! Цяпер — каляровы метал. Прадаюць і набываюць на кілаграмы... А я яшчэ жывы... Камунізм праклялі! Сацыялізм ужо дрэнь! Мне кажуць: «Ну хто сёння сур'ёзна прымае марксізм? Яго месца ў падручніках гісторыі». А хто з вас можа сказаць, што чытаў позняга Леніна? Ведае ўсяго Маркса? Ёсць ранні Маркс... і Маркс пад канец жыцця... Тое, што сёння лаюць як сацыялізм, ніякага дачынення да сацыялістычнай ідэі не мае. Ідэя не вінаватая. *(Праз кашаль зноў неразборліва.)* Людзі згубілі сваю гісторыю... засталіся без веры... Пра што ні спытаеш — пустата ў вачах. Начальнікі навучыліся хрысціцца, а свечку, як шклянку з гарэлкай, у правай руцэ трымаюць. Вярнулі пранафталіненага двухгаловага арла... харугвы з абразамі... *(Раптам абсалютна выразна.)* Маё апошняе жаданне — напішыце праўду. Але маю праўду... а не сваю. Каб застаўся мой голас...

*Паказвае свае фотаздымкі. Часам нешта каментуе.*

...Прывялі да камандзіра. «Колькі табе гадоў?» — спытаў камандзір. «Сямнаццаць», — я схлусіў. Мне было няпоўных шаснаццаць. Так я стаў чырвонаармейцам. Нам выдалі

абмоткі і чырвоныя зорачкі для шапак. Будзёнавак не было, а чырвоныя зорачкі выдалі. Што за Чырвоная армія без чырвоных зорачак! Далі вінтоўкі. І мы сябе адчувалі абаронцамі рэвалюцыі. Вакол — голад, эпідэміі. Зваротны тыф... брушны тыф... сыпняк... А мы — шчаслівыя...

...З разбітага памешчыцкага дома нехта выцягнуў піяніна... Стаіць у садзе, мокне пад дажджом. Пастушкі падганяць кароў бліжэй і граюць на ім палкамі. Сядзібу сп'яна спалілі. Разрабавалі. А каму з мужыкоў патрэбнае піяніна?

...Узарвалі царкву... Дагэтуль увушшу крык бабак: «Дзетачкі, не рабіце гэтага!» Умалялі. Чапляліся за ногі. Дзвесце гадоў царква прастаяла. Намоленае месца, як той казаў. Пабудавалі замест царквы гарадскую прыбіральню. Святароў прымусілі там прыбіраць. Гаўно чысціць. Цяпер... вядома... цяпер я разумею... А тады... весела...

...У полі ляжалі нашы таварышы... На лбах і на грудзях у іх былі выразаныя зоркі. Чырвоныя зоркі. Распоратыя жываты, туды насыпана зямля: хацелі зямлі — наце! Нашы пачуцці — смерць або перамога! Хай мы памром, але мы ведаем, за што памром.

...Каля рэчкі ўбачылі праколатых штыкамі белых афіцэраў. Пачарнелі на сонцы «іх благародзія». З жыватоў тырчалі пагоны... жываты набітыя пагонамі... Не шкада! Мёртвых людзей бачыў столькі, колькі і жывых...

— *Сёння шкада ўсіх: і «белых», і «чырвоных». Мне шкада.*

— Вам шкада... Шкада? *(Мне падалося, што на гэтым наша гутарка можа і скончыцца.)* Ну так... вядома... «Агульначалавечыя каштоўнасці»... «абстрактны гуманізм»... Тэлевізар гляджу, газеты чытаю. А ў нас міласэрнасць было папоўскім словам. Бі белага гада! Даеш рэвалюцыйны парадак! Лозунг першых гадоў рэвалюцыі: загонім жалезнай рукой чалавецтва ў шчасце! Калі партыя сказала — я веру партыі! Я веру.

Горад Орск пад Арэнбургам. Дзень і ноч гоняць таварнякі з кулацкімі сем'ямі. У Сібір. Мы ахоўваем станцыю. Адчыняю

адзін вагон: у куце вісіць на папрузе паўголы мужчына. Маці люляе на руках маленькага, а старэйшы хлопчык сядзіць побач. Рукамі есць сваё гаўно, як кашу. «Зачыняй! — крычыць мне камісар. — Гэта — кулацкая сволач! Яны для новага жыцця не надаюцца!» Будучыня… яна ж мусіць быць прыгожай… Потым будзе прыгожа… Ну верыў я! *(Амаль крычыць.)* Мы верылі ў нейкае прыгожае жыццё. Утопія… гэта была ўтопія… А вы? У вас свая ўтопія — рынак. Рынкавы рай. Рынак усіх зробіць шчаслівымі! Хімера! Ходзяць па вуліцах гангстэры ў малінавых пінжаках, залатыя ланцугі да пуза. Капіталізм карыкатурны, як на малюнках у савецкім часопісе «Крокодил». Пародыя! Замест дыктатуры пралетарыяту — закон джунгляў: кусай таго, хто слабейшы за цябе, а таму, хто мацнейшы, — кланяйся. Самы стары закон на зямлі… *(Прыступ кашлю. Перапынак.)* Мой сын насіў будзёнаўку з чырвонай зорачкай… У дзяцінстве гэта быў найлепшы падарунак яму на дзень нараджэння. Я даўно не хаджу ў магазіны. Ці прадаюць там будзёнаўкі? Іх доўга насілі. Пры Хрушчове яшчэ насілі. А якая цяпер мода? *(Спрабуе ўсміхнуцца.)* Я адстаў… вядома… Я ўжо старадаўні… Мой адзіны сын… ён памёр… дажываю з нявесткай і ўнукамі. Сын быў гісторык і пераканаены камуніст. А ўнукі? *(З насмешкай.)* Унукі чытаюць Далай-ламу. Замест «Капіталу» ў іх «Махабхарата». Кабала… Цяпер усе вераць у рознае. Ну так… цяпер так… Чалавек заўсёды хоча ў нешта верыць. У Бога ці ў тэхнічны прагрэс. У хімію, у палімеры, у касмічны розум. Цяпер — у рынак. Ну, дапусцім, наямося, а далей што? Я заходжу ў пакой да сваіх унукаў — там усё чужое: кашулі, джынсы, кнігі, музыка, зубная шчотка — і тая не наша. На паліцах стаяць пустыя бляшанкі з-пад «Пепсі», «Кока-колы»… Папуасы! У супермаркеты ходзяць як у музей. Адсвяткаваць дзень нараджэння ў «Макдональдсе» — крута! «Дзед, мы хадзілі ў “Піца-хат”!» Мека! Пытаюцца ў мяне: «Ты насамрэч верыў у камунізм, а чаму не ў гуманоідаў?» Я марыў: мір — хацінам, вайна — палацам, а яны хочуць стаць мільянерамі.

Прыходзяць іх сябры. Чую размовы: «Я лепей буду жыць у слабой краіне, але з ёгуртам і добрым півам», «Камунізм — адстой!», «Шлях Расіі — манархія. Божа, Цара беражы!» Круцяць песні: «Усё будзе добра, паручык Галіцын, / За ўсё камісары дастануць спаўна...» А я жывы... я яшчэ тут... Насамрэч... Я ж не звар'яцеў... *(Глядзіць на ўнука. Той маўчыць.)* У крамах поўна каўбасы, а людзей шчаслівых няма. Я не бачу людзей з прамяністымі вачыма.

*З анекдотаў, расказаных унукам*

*Спірытычны сеанс. Размаўляюць прафесар і стары бальшавік. Прафесар: «У ідэю камунізму першапачаткова забралася памылка. Памятаеце песню: "Наш паравоз, барзджэй ляці, / Прыпынак у камуне..."» Стары бальшавік: «Вядома, памятаю. А памылка якая?» Прафесар: «Паравозы не лётаюць».*

Спачатку арыштавалі жонку... Пайшла ў тэатр і дадому не вярнулася. Вяртаюся з працы: сын разам з катом спіць на дыванку ў вітальні. Чакаў-чакаў маму і заснуў. Жонка працавала на абутковай фабрыцы. Чырвоны інжынер. «Нешта незразумелае робіцца, — казала яна. — Забралі ўсіх маіх сяброў. Гэта нейкая здрада...» — «Вось мы з табой не вінаватыя, і нас не бяруць». Быў у гэтым перакананы... Абсалютна перакананы... шчыра! Спачатку я быў ленінец, пасля сталінец. Да трыццаць сёмага года я быў сталінец. Верыў усяму, што казаў і рабіў Сталін. Так... найвялікшы... геніяльны... правадыр усіх часоў і народаў. Нават калі ворагамі народа абвясцілі Бухарына, Тухачэўскага, Блюхера, я яму верыў. Ратавала думка... дурная... Я думаў так: Сталіна падманваюць, наверх прабраліся здраднікі. Партыя разбярэцца. І вось арыштавалі маю жонку, сумленнага і адданага байца партыі.

Праз тры дні прыйшлі па мяне... Перш за ўсё панюхалі ў печы: ці не пахне дымам, ці не спаліў я чаго-небудзь. Іх было трое. Адзін хадзіў і выбіраў сабе рэчы: «Гэта вам ужо не

спатрэбіцца». Насценны гадзіннік зняў. Мяне агаломшыла... я не чакаў... І ў той жа час нешта ў гэтым было чалавечае, давала надзею. Вось гэтае чалавечае паскудства... Та-а-ак... Значыць, у гэтых людзей ёсць пачуцці...Ператрус працягваўся з другой гадзіны ночы да ранку. У доме было вельмі шмат кніг, кожную кнігу перагарталі. Прамацалі адзенне. Распаролі падушкі... Часу падумаць у мяне было дастаткова. Успамінаў... ліхаманкава... Пасадкі ўжо йшлі масавыя. Кожны дзень кагосьці бралі. Абстаноўка страшнаватая. Чалавека ўзялі, усе вакол маўчаць. Пытацца — бессэнсоўна. Следчы на першым допыце мне патлумачыў: «Вы вінаватыя ўжо ў тым, што не данеслі на сваю жонку». Але гэта ўжо ў турме... А тады ўсё ў памяці перабраў. Усё... Адно толькі ўспомніў... Успомніў апошнюю гарадскую партканферэнцыю... Зачыталі прывітанне таварышу Сталіну, і ўся зала ўстала. Шквал авацый: «Дзякуй таварышу Сталіну — арганізатару і натхняльніку нашых перамог!», «Сталіну — слава!», «Слава правадыру!» Пятнаццаць хвілін... паўгадзіны... Усе азіраюцца адзін на аднаго, пераглядваюцца, але ніхто першы не сядае. Усе стаяць. Я чамусьці сеў. Машынальна. Падыходзяць да мяне двое ў цывільным: «Таварыш, чаму седзіцё?» Я ўскочыў! Ускочыў як абвараны. Падчас перапынку ўвесь час азіраўся. Чакаў, што цяпер падыдуць і арыштуюць... *(Паўза.)*

Да раніцыператрус скончыўся. Каманда: «Збірайцеся». Няня пабудзіла сына... Перад адыходам я паспеў шапнуць яму: «Нікому не расказвай пра тату і маму». Так ён выжыў. *(Падсоўвае дыктафон бліжэй да сябе.)* Запісвайце, пакуль жывы... «П. ж.»... «пакуль жывы...» пішу на віншавальных паштоўках. Няма каму ўжо, праўда, дасылаць... У мяне часта пытаюцца: «Чаму вы ўсе маўчалі?» — «Час такі быў». Я лічыў, што вінаватыя здраднікі — Ягода, Яжоў, — але не партыя. Праз пяцьдзясят гадоў лёгка судзіць. Гігікаць... са старых дурняў... У той час я крочыў разам з усімі, а цяпер іх нікога няма...

...Месяц праседзеў у адзіночцы. Такая каменная труна: дзе галава — шырэй, дзе ногі — вузей. Крумкача да свайго акна прыручыў, карміў груцай з поліўкі. З таго часу крумкач — мая ўлюбёная птушка. На вайне... Бой скончаны. Цішыня. Параненых падабралі, адны мёртвыя ляжаць. Іншых птушак няма, а крумкач лётае.

...На допыт выклікалі праз два тыдні. Ці ведаў я, што ў жонкі ёсць сястра за мяжой? «Мая жонка — сумленны камуніст». На стале ў следчага ляжаў данос, падпісаны — я не паверыў! — нашым суседам. Я пазнаў почырк. Подпіс. Мой таварыш быў, можна сказаць, з Грамадзянскай вайны. Вайсковец... у высокім званні... Трохі быў нават закаханы ў маю жонку, я раўнаваў. Ну так... раўнаваў... Жонку я моцна кахаў... сваю першую жонку... Следчы падрабязна пераказваў мне нашы размовы. Я зразумеў, што не памыліўся... так, гэта сусед... усе размовы былі пры ім... Гісторыя маёй жонкі такая: яна з-пад Мінска. Беларуска. Пасля Брэсцкага міру частка беларускіх земляў адышла да Польшчы. Там засталіся яе бацькі. Сястра. Бацькі хутка памерлі, а сястра пісала нам: «Я лепш паеду ў Сібір, чым заставацца ў Польшчы». Хацела жыць у Савецкім Саюзе. Тады камунізм быў папулярны ў Еўропе. Ва ўсім свеце. Многія ў яго верылі. Не толькі простыя людзі, але і заходняя эліта. Пісьменнікі: Арагон, Барбюс... Кастрычніцкая рэвалюцыя была «опіумам для інтэлектуалаў». Дзесьці чытаў... цяпер шмат чытаю. *(Перапынак.)* Мая жонка — «вораг»... Значыць, патрэбная «контррэвалюцыйная дзейнасць»... Хацелі сфабрыкаваць «арганізацыю»... «тэрарыстычнае падполле»... «З кім ваша жонка сустракалася? Каму перадавала рысункі?» Якія рысункі! Я ўсё адмаўляў. Білі. Тапталі ботамі. Усе — свае. У мяне партбілет, і ў іх — партбілеты. І ў маёй жонкі — партбілет.

...Агульная камера... У камеры — пяцьдзясят чалавек. Па патрэбе выводзілі два разы на дзень. А ў астатні час? Як даме растлумачыць? Каля ўваходу стаяла вялізная балея... *(Злосна.)* Паспрабуйце сесці і пасраць пры ўсіх! Кармілі селядцамі

і не давалі вады. Пяцьдзясят чалавек… Англійскія… японскія шпіёны… Вясковы дзед, непісьменны… Яго пасадзілі за пажар на стайні. Сядзеў студэнт за анекдот… На сцяне вісіць партрэт Сталіна. Дакладчык чытае рэферат пра Сталіна. Хор спявае песню пра Сталіна. Артыст дэкламуе верш пра Сталіна. Што гэта такое? Вечар, прысвечаны стагоддзю з дня смерці Пушкіна. *(Я смяюся, а ён не смяецца.)* Студэнт атрымаў дзесяць гадоў лагераў без права перапіскі. Быў шафёр, арыштаваны за тое, што падобны да Сталіна. І насамрэч быў падобны. Загадчык пральні, беспартыйны цырульнік, шліфавальшчык… Больш за ўсё простых людзей. Але быў і вучоны-фальклярыст. Уначы ён распавядаў нам казкі… дзіцячыя казкі… І ўсе слухалі. На фальклярыста данесла яго ўласная маці. Старая бальшавічка. Адзін раз толькі яна перадала яму папяросы перад этапам. Та-а-ак… Сядзеў стары эсэр, ён адкрыта радаваўся: «Які я шчаслівы, што і вы, камуністы, тут седзіцё і нічога, як і я, не разумееце». Контрык! Я думаў, што савецкай улады ўжо няма. І Сталіна — няма.

*З анекдотаў, расказаных унукам*

*Чыгуначны вакзал… Сотні людзей. Чалавек у скуранцы роспачна шукае кагосьці. Знайшоў! Падыходзіць да іншага чалавека ў скуранцы: «Таварыш, ты партыйны ці беспартыйны?» — «Партыйны». — «Тады скажы, дзе тут сарцір?»*

Усё адабралі: папругу, шалік, матузкі з чаравікаў вышмаргнулі, а забіць сябе ўсё роўна можна. Была такая думка. Ну так… была… Задушыць сябе штанамі або гумкай ад майткаў. Білі па жываце мехам з пяском. Усё з мяне вылазіла, як з чарвяка. Падвешвалі на крукі. Сярэднявечча! З цябе цячэ, ты свой арганізм ужо не кантралюеш. Адусюль цячэ… Вытрымаць гэты боль… Сорам! Памерці прасцей… *(Перапынак.)* Сустрэў у турме свайго старога таварыша… Мікалай Вярхоўцаў, член партыі з тысяча дзевяцьсот дваццаць чацвёртага года. Ён

выкладаў на рабфаку. Усе знаёмыя… у блізкім коле… Хтосьці чытаў уголас газету «Праўда», і там інфармацыя: на бюро ЦК слухалася пытанне пра апладненне кабыл. Ну ён вазьмі ды пажартуй, што ў ЦК, маўляў, спраў іншых няма, як толькі апладненнем кабыл займацца. Удзень ён гэта сказаў, а ўначы яго ўжо ўзялі. Пальцы рук яму заціскалі дзвярыма, зламалі пальцы, як алоўкі. Трымалі суткамі ў адгазніку. *(Маўчыць.)* Незразумела, як сёння пра гэта распавядаць… Увогуле, варварства. Знявага. Ты — кавалак мяса… ляжыш у мачы… Вярхоўцаву трапіўся следчы-садыст. Яны не ўсе былі садысты… Зверху ім спускалі ліміт, план на ворагаў — месячны і гадавы. Вось яны змяняюцца, п'юць гарбату, тэлефануюць дадому, фліртуюць з медычкамі, якіх выклікаюць, калі чалавек ад катаванняў губляе прытомнасць. У іх дзяжурства… змена… А ў цябе ўсё жыццё перавярнулася. Такія рэчы… Следчы, які вёў маю справу, быў раней дырэктарам школы, ён мяне пераконваў: «Наіўны вы чалавек. Мы вас шпокнем і складзём акт — пры спробе ўцёкаў. Вы ведаеце, што Горкі сказаў: калі вораг не здаецца, яго знішчаюць». — «Я — не вораг». — «Зразумейце: нам не страшны толькі чалавек, які раскаяўся, чалавек, які зламаўся». Мы з ім дыскутавалі на гэтую тэму… Другі следчы быў кадравы афіцэр. Адчувалася, што яму лянота ўсе гэтыя паперкі запаўняць. Яны ўвесь час нешта пісалі. Адзін раз ён даў мне папяросу. Людзі сядзелі падоўгу. Месяцамі. Паміж катамі і ахвярамі завязваліся чалавечыя… ну, чалавечымі іх не назавеш, але нейкія ўсё ж такі дачыненні. Але першае не выключала другога… «Падпішыце». Чытаю пратакол. — «Я гэтага не казаў». Б'юць. Старанна б'юць. Іх усіх потым саміх расстралялі. Адправілі ў лагеры.

Гэта было раніцай… Адчыняецца камера. Каманда: «На выхад!» Я — у адной кашулі. Хачу апранууцца. «Не!» Вядуць у нейкія сутарэнні… Там ужо чакае следчы з паперай: «Падпішаце — так ці не?» Адмаўляюся. «Тады — да сценкі!» Бах! Стрэл — над галавой… «Ну як — падпішаце?» Бах! І так тры

разы. Вядуць назад, па нейкіх лабірынтах… аказваецца, у турме столькі сутарэнняў! Я й не падазраваў. Вадзілі так, каб зняволены нічога не ўбачыў. І нікога не пазнаў. Калі нехта ідзе насустрач, канваір дае каманду: «Тварам да сценкі!» Але я ўжо быў дасведчаны. Падглядаў. Так я сустрэўся са сваім начальнікам на курсах чырвоных камандзіраў. І са сваім былым прафесарам у саўпартшколе… *(Маўчыць.)* З Вярхоўцавым мы былі шчырыя: «Злачынцы! Савецкую ўладу губяць. Яны адкажуць за гэта». Некалькі разоў яго дапытвала следчы-жанчына: «Калі мяне катуюць, яна становіцца прыгожай. Ты разумееш, яна тады прыгожая». Уражлівы чалавек. Гэта ад яго я даведаўся, што Сталін у юнацтве пісаў вершы… *(Заплюшчыў вочы.)* Я цяпер, бывае, скаланаюся халодным потам: і мяне маглі накіраваць на працу ў НКВД. І я б пайшоў. У мяне партбілет у кішэні. Чырвоная кніжачка.

*Званок у дзверы. Прыехала медсястра. Змерала ціск. Зрабіла ўкол.*

*Увесь гэты час размова хоць урыўкамі, але працягваецца.*

…Я неяк падумаў: сацыялізм не вырашае праблему смерці. Старасці. Метафізічнага сэнсу жыцця. Праходзіць міма. Толькі ў рэлігіі ёсць адказы на гэта. Та-а-ак… У трыццаць сёмым мяне б за такія размовы…

…Кнігу «Чалавек-амфібія» Аляксандра Бяляева чыталі? Там геніяльны вучоны хоча зрабіць свайго сына шчаслівым і ператварае яго ў чалавека-амфібію. Але сыну неўзабаве становіцца сумна аднаму ў акіяне. Ён хоча быць як усе: жыць на зямлі, пакахаць звычайную дзяўчыну. Гэта ўжо немагчыма. І ён гіне. А бацьку здалося, што ён раскрыў таямніцу… Што ён — бог! Вось ён — адказ усім вялікім утапістам!

…Ідэя была цудоўная! Але што вы з чалавекам зробіце? Чалавек не змяніўся з часоў старога Рыма…

*Медсястра сышла. Заплюшчыў вочы.*

Пачакайце… усё ж я скончу… На гадзіну сілы яшчэ ў мяне хопіць. Працягнем… У турме я праседзеў амаль год. Ужо

рыхтаваўся да суда. Да этапу. Дзівіўся: чаго яны са мной марудзяць? Як я разумею, ніякай логікі ў іх не было. Тысячы спраў… Хаос… Праз год мяне выклікаў новы следчы… Маю справу аддаюць на перагляд. І мяне выпускаюць, знялі ўсе абвінавачанні. Значыць, памылка. Партыя мне верыць! Сталін быў вялікі рэжысёр… Якраз у гэты час ён прыбраў «крывавага карліка», наркама Яжова. Яго судзілі. Расстралялі. Пачалася рэабілітацыя. Народ уздыхнуў: да Сталіна дайшла праўда… А гэта быў усяго толькі перапынак перад новай крывёю… Гульня! Але ўсе паверылі. І я паверыў. Развітваюся з Вярхоўцавым… Ён паказвае свае зламаныя пальцы: «А я тут ужо дзевятнаццаць месяцаў і сем дзён. Ніхто мяне адсюль не выпусціць. Пабаяцца». Мікалай Вярхоўцаў… член партыі з тысяча дзевяцьсот дваццаць чацвёртага года… расстраляны ў сорак першым годзе, калі немцы падыходзілі да горада. Энкавэдысты расстралялі ўсіх зняволеных, якіх не паспелі эвакуяваць. Выпусцілі крымінальную шпану, а ўсе «палітычныя» падлягалі ліквідацыі як здраднікі. Немцы ўвайшлі ў горад і адчынілі браму турмы — там ляжала гара трупаў. Жыхароў горада, пакуль трупы не пачалі гнісці, ганялі да турмы — глядзець на савецкую ўладу.

Сына я знайшоў у чужых людзей, няня звезла яго ў вёску. Ён заікаўся, баяўся цемры. Сталі жыць з ім удвух. Я дамагаўся якіх-небудзь звестак пра жонку. І адначасова — аднаўлення ў партыі. Каб мне вярнулі мой партбілет. Новы год… У доме ўпрыгожылі елку. Чакаем з сынам гасцей. Званок у дзверы. Адчыняю. Стаіць на парозе кепска апранутая жанчына: «Я прыйшла перадаць вам прывет ад вашай жонкі». — «Жывая!» — «Год таму была жывая. Нейкі час я працавала з ёй у свінарніку. Кралі ў свіней маражаную бульбу, дзякуючы гэтаму не здохлі. Ці жывая яна цяпер, не ведаю». Амаль адразу сышла. Я яе не затрымліваў… павінны былі прыйсці госці… *(Маўчыць.)* Бой курантаў. Адкаркавалі шампанскае. Першы тост «За Сталіна!». Та-а-ак… Сорак першы год…

Усе плакалі... А я гарлаў ад шчасця — вайна! Я пайду на вайну! Ужо гэта мне дазволяць. Адправяць. Стаў прасіцца на фронт. Мяне доўга не бралі. Ваенкам быў знаёмы: «Не магу. У мяне на руках інструкцыя — "ворагаў" не браць». — «Гэта хто вораг? Я — вораг?!» — «Твая жонка адбывае пакаранне ў лагеры паводле 58-га артыкула — контррэвалюцыйная дзейнасць». Захоплены Кіеў... бai пад Сталінградам... Я зайздросціў кожнаму чалавеку ў вайсковай форме — ён абараняе Радзіму! Дзяўчаты ішлі на фронт... А я? Пішу ліст у райкам партыі: расстраляйце ці пусціце на фронт! Праз два дні мне ўручылі позву — цягам дваццаці чатырох гадзін прыбыць на зборны пункт. Вайна была паратункам... адзіны шанец вярнуць сабе добрае імя. Я радаваўся.

...Рэвалюцыю добра памятаю. А потым, прабачце, ужо горш. Нават вайну ўжо меней памятаю, хоць у часе яна бліжэй. Памятаю, што нічога не змянілася. Толькі зброя пад канец вайны ў нас была іншая — не шашкі і вінтоўкі, а «кацюшы». А жыццё салдацкае? Як і раней, мы маглі гадамі есці суп з груцы і ячневую кашу, месяцамі насіць брудную бялізну. Не мыцца. Спаць на голай зямлі. А будзь мы іншыя, як бы мы перамаглі?

...Падняліся ў бой... Нас з кулямётаў! Усе леглі на зямлю. Тут яшчэ мінамёт падключыўся, разносіць людзей на шматкі. Побач са мной упаў камісар: «Што ляжыш, контра! Наперад! Прыстрэлю!»

...Пад Курскам сустрэў свайго следчага. Былога дырэктара школы... У мяне была думка: «Ну, цяпер, сволач, ты ў мяне ў руках. У баі прыстрэлю ціха». Было... Ну так... Хацеў. Не паспеў. Мы з ім нават аднойчы размаўлялі. «Радзіма ў нас адна» — ягоныя словы. Смелы быў чалавек. Геройскі. Загінуў пад Кёнігсбергам. Што сказаць... Магу сказаць... я падумаў, што Бог зрабіў маю справу... Хлусіць не буду...

Вярнуўся дадому двойчы паранены. З трыма ордэнамі і медалямі. Мяне выклікалі ў райкам партыі: «На жаль, жонку вам

вярнуць не можам. Жонка загінула. Але гонар мы вам вяртаем...» Мне аддалі мой партбілет. І я быў шчаслівы! Я быў шчаслівы...

*Кажу яму, што мне гэтага не зразумець — ніколі. Выбухае.*

Законамі логікі нас судзіць нельга. Бухгалтары! Зразумейце вы! Нас можна судзіць толькі законамі рэлігіі. Веры! Вы яшчэ нам пазайздросціце! Што ў вас ёсць вялікага? Нічога няма. Адзін камфорт. Усё для страўніка... для кішкі... Набіць трыбух і абставіцца цацкамі... А я... маё пакаленне... Усё, што ў вас ёсць, гэта мы пабудавалі. Заводы, дамбы... электрастанцыі... А дзе ваша? І Гітлера мы перамаглі. Пасля вайны... Нарадзілася ў кагосьці дзіця — радасць! Радасць не такая, як да вайны. Іншая. Я мог і заплакаць... *(Заплюшчыў вочы. Стаміўся.)* А-а-а... Верылі... А цяпер нам вынеслі прысуд: вы верылі ва ўтопію... Верылі! Улюбёны мой раман «Што рабіць?» Чарнышэўскага... Цяпер яго ўжо не чытаюць. Нудна. Чытаюць толькі назву — адвечнае рускае пытанне: што рабіць? Для нас гэта быў катэхізіс. Падручнік рэвалюцыі. Цэлыя старонкі вучылі напамяць. Чацвёрты сон Веры Паўлаўны... *(Чытае, як верш.)* «Будынкі з крышталю і алюмінію... Крышталёвыя палацы! Лімонныя і апельсінавыя сады пасярод гарадоў. Старых амаль няма, людзі вельмі позна старэюць, бо жыццё прыўкраснае. Усё робяць машыны, людзі толькі ездзяць і кіруюць машынамі... Машыны жнуць, вяжуць... Нівы густыя і шчодрыя. Кветкі — як дрэвы. Усе шчаслівыя. Радасныя. Ходзяць у прыгожым адзенні — мужчыны і жанчыны. Вядуць вольнае жыццё працы і асалоды. Усім шмат месца, даволі працы. Няўжо гэта мы?Няўжо гэта наша Зямля? І ўсе так будуць жыць? Будучыня светлая і прыўкрасная...» Вунь... *(Ківае на ўнука.)* Пасмейваецца. Дурында я для яго. Так і жывём.

*—У Дастаеўскага ёсць адказ Чарнышэўскаму: «Будуйце, будуйце свой крышталёвы палац, а я вось вазьму і кіну ў яго камень... І не таму, што галодны і жыву ў сутарэнні, а проста так — ад свавольства...»*

— *(Узлаваўся.)* Вы думаеце, што нам камунізм, гэтую заразу, як пішуць у сённяшніх газетах, у запламбаваным вагоне з Германіі прывезлі? Што за лухта! Народ паўстаў. Не было таго «залатога веку» пры цары, пра якога цяпер раптам успомнілі. Казкі! І пра тое, што Амерыку хлебам кармілі, і што лёс Еўропы вырашалі. Паміраў рускі салдат за ўсіх — гэта праўда. А жылі… У нас у сям'і на пяцярых дзяцей былі адны боты. Елі бульбу з хлебам, а зімою — без хлеба. Адну бульбу… А вы пытаецеся: адкуль узяліся камуністы?

Я столькі памятаю… А навошта? Навошта, га? Што цяпер мне з гэтым рабіць? Мы любілі будучыню. Заўтрашніх людзей. Спрачаліся, калі гэтая будучыня настане. Праз сто гадоў — дакладна. Але нам гэта здавалася занадта далёкім… *(Перапынак.)*

*Я выключаю дыктафон.*

Без дыктафона… Добра… Мне трэба камусьці вось гэта расказаць…

Мне было пятнаццаць гадоў. Прыехалі да нас у вёску чырвонаармейцы. На конях. П'яныя. Харчатрад. Спалі яны да вечара, а ўвечары сабралі ўсіх камсамольцаў. Выступіў камандзір: «Чырвоная армія галадае. Ленін галадае. А кулакі хаваюць хлеб. Спальваюць». Я ведаў, што матчын родны брат… дзядзька Сямён… завёз у лес мяхі са збожжам і закапаў. Я — камсамолец. Клятву даваў. Уначы я прыйшоў у атрад і павёў іх да таго месца. Нагрузілі яны цэлы воз. Камандзір руку мне паціснуў: «Расці, брат, хутчэй». Раніцай я прачнуўся ад мамчынага крыку: «Сямёнава хата гарыць!» Дзядзьку Сямёна знайшлі ў лесе… пасеклі яго чырвонаармейцы шашкамі на кавалкі… Мне было пятнаццаць гадоў. Чырвоная армія галадае… Ленін… Баяўся выйсці на вуліцу. Сядзеў у хаце і плакаў. Мамка пра ўсё здагадалася. Ноччу дала мне ў рукі торбачку: «Сыходзь, сынок! Няхай Бог табе даруе, няшчаснаму». *(Закрыў рукою вочы. Але я ўсё адно бачу — плача.)*

Хачу памерці камуністам. Апошняе маё жаданне…

*У 90-я гады я апублікавала толькі частку ягонай споведзі. Мой герой даў гэта камусьці пачытаць, з кімсьці параіўся, і яго пераканалі, што поўная публікацыя «кіне цень на партыю». А гэтага ён баяўся больш за ўсё. Пасля яго смерці знайшлі запавет: сваю вялікую трохпакаёвую кватэру ў цэнтры горада ён адпісаў не ўнукам, а «для патрэбаў любімай камуністычнай партыі, якой я абавязаны ўсім». Пра гэта нават напісалі ў вячэрнай гарадской газеце. Такі ўчынак быў ужо незразумелы. Усе кпілі са звар'яцелага старога. Помнік на яго магіле так ніхто і не паставіў.*

*Цяпер вырашыла надрукаваць споведзь цалкам. Усё гэта ўжо належыць болей часу, чым аднаму чалавеку.*

## Пра жорсткасць полымя і выратаванне вышынёй

*Цімяран Зінатаў — франтавік, 77 гадоў*

*З камуністычных газет*

«Зінатаў Цімяран Хабулавіч — адзін з гераічных абаронцаў Брэсцкай крэпасці, якая першая прыняла на сябе ўдар гітлераўскіх войскаў раніцай 22 чэрвеня 1941 года.

Нацыянальнасць — татарын. Перад вайной — курсант палкавой школы (42-і стралковы полк 44-й стралковай дывізіі). У першыя дні абароны крэпасці быў паранены. Трапіў у палон. Двойчы ўцякаў з нямецкага канцлагера — другі раз паспяхова. Скончыў вайну ў дзейнай арміі, як і пачынаў — радавым салдатам. За абарону Брэсцкай крэпасці быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені. Пасля вайны аб'ехаў усю краіну, працаваў на будоўлях далёкай Поўначы, будаваў БАМ, а калі выйшаў на пенсію, застаўся жыць у Сібіры. У горадзе Усць-Кут.

Нягледзячы на тое, што ад Усць-Кута да Брэста шмат тысяч кіламетраў, Цімяран Зінатаў кожны год прыязджаў

у Брэсцкую крэпасць, дарыў супрацоўнікам музея торты. Яго ўсе ведалі. Чаму ён так часта бываў у крэпасці? Ён, як і яго сябры-аднапалчане, з якімі ён тут сустракаўся, толькі ў крэпасці адчувалі сябе абароненымі. Тут ніхто і ніколі не сумняваўся, што яны былі героямі сапраўднымі, а не прыдуманымі. У крэпасці ніхто не адважваўся кінуць ім у твар: "Калі б вы не перамаглі, мы б цяпер піва баварскае пілі. Жылі ў Еўропе". Перабудоўшчыкі няшчасныя! Хай бы ведалі яны, што калі б іх дзяды не перамаглі, то мы сталі б краінай пакаёвак і свінапасаў. Гітлер пісаў, што славянскіх дзяцей трэба вучыць лічыць толькі да ста...

Апошні раз Зінатаў прыехаў у Брэст у верасні 1992 года, усё было як звычайна: сустрэўся з франтавымі сябрамі, блукаў па крэпасці. Вядома, заўважыў, што плынь наведнікаў прыкметна зменшылася. Былі часы, калі стала модна ачарняць наша савецкае мінулае і яго герояў...

Надышоў час ад'езду... У пятніцу Цімяран Зінатаў з усімі развітаўся, сказаў, што ў выходныя з'язджае дадому. Ніхто не мог падумаць, што на гэты раз ён прыехаў у крэпасць, каб застацца тут назаўсёды.

Калі ў панядзелак супрацоўнікі музея прыйшлі на працу, прагучаў званок з транспартнай пракуратуры: абаронца Брэсцкай крэпасці, які выжыў тут у крывавым катле 41-га года, кінуўся пад цягнік...

Хтосьці потым прыгадае акуратнага старога з валізкай, які доўга стаяў на пероне. Пры ім знайшлі сем тысяч рублёў, якія ён прывёз з дому на ўласнае пахаванне, і перадсмяротны ліст з праклёнамі ельцынска-гайдараўскаму ўраду — за ўсё гэтае ўчыненае імі ганебнае і жабрацкае жыццё. І за здраду Вялікай Перамозе. Пахаваць прасіў у крэпасці.

*З перадсмяротнага ліста:*

"...калі б тады, у вайну, памёр ад ран, я б ведаў: загінуў за Радзіму. А вось цяпер — ад сабачага жыцця. Хай так і напішуць на магіле... Не лічыце мяне вар'ятам..."

“...я хачу памерці стоячы, а не на каленях прасіць жабрацкай дапамогі для сваёй старасці і трымацца да труны з працягнутай рукой! Так што, паважаныя, не судзіце крэпка мяне і зразумейце маё становішча. Сродкі пакідаю, калі не скрадуць, спадзяюся, на закапанне хопіць... труны не трэба... Я ў чым ёсць, гэтага адзення хопіць, толькі не забудзьцеся ў кішэню пакласці пасведчанне абаронцы Брэсцкай крэпасці — для нашчадкаў нашых. Мы былі героямі, а паміраем у галечы! Бывайце здаровы, не бядуйце па адным татарыне, які пратэстуе адзін за ўсіх: ‘Я паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма!’”

Пасля вайны ў сутарэннях Брэсцкай крэпасці быў знойдзены надпіс, надрапаны на сцяне штыком: “Паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма! 22.VII-41 г”. Паводле рашэння ЦК гэты радок стаў сімвалам мужнасці савецкага народа і адданасці справе КПСС. Тыя абаронцы Брэсцкай крэпасці, якія засталіся ў жывых, сцвярджалі, што аўтар гэтага надпісу — курсант палкавой школы, беспартыйны татарын Цімяран Зінатаў, але камуністычных ідэолагаў больш задавальняла, каб ён належаў палегламу Невядомаму салдату.

Выдаткі на пахаванне Брэсцкія гарадскія ўлады ўзялі на сябе. Пахавалі героя за кошт артыкула “бягучае ўтрыманне аб’ектаў добраўпарадкавання”...»

*КПРФ. «Системный взгляд». Выпуск № 5*

«...Чаму кінуўся пад цягнік стары салдат Цімяран Зінатаў? Пачну здалёк... З ліста ў “Праўду” ад Віктара Якаўлевіча Якаўлева са станіцы Ленінградская Краснадарскага краю. Удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, абаронца Масквы ў 41-м і ўдзельніка маскоўскага парада ў гонар 55-годдзя Перамогі. Напісаць у рэдакцыю яго прымусіла вялікая крыўда...

Нядаўна яны з сябрам (былы палкоўнік і таксама ветэран вайны) ездзілі ў Маскву. Надзелі з гэтай нагоды святочныя пінжакі з ордэнскімі калодкамі. За дзень стаміліся ад шумнай сталіцы і, калі прыйшлі на Ленінградскі вакзал, захацелася

дзе-небудзь прысесці да прыходу цягніка. Вольных месцаў не знайшлося, тады яны зайшлі ў пустую залу, дзе былі буфет і мяккія крэслы. Да іх тут жа падскочыла дзяўчына, якая разносіла па зале напоі, і груба паказала на выхад: "Сюды вам нельга. Тут бізнэс-зала!" Далей цытата з ліста: "Я ёй у запале адказаў: 'Значыць, гэта для злодзеяў і спекулянтаў, а нам нельга? Як калісьці ў Амерыцы: уваход неграм і сабакам забараняецца'". Пра што было яшчэ казаць, калі ўсё зразумела. Мы павярнуліся і сышлі. Але я паспеў заўважыць, як некалькі гэтых так званых бізнэсменаў, а папросту — жулікаў, там рагаталі, жэрлі, пілі... Забылі ўжо, што мы тут кроў пралівалі... Усё адабралі ў нас гэтыя сволачы чубайсы, вексельбергі, грэфы... Грошы, гонар. І мінулае, і сучаснасць. Усё! А цяпер забіраюць у салдаты нашых унукаў, каб абараняць іх мільярды. Вось я хачу спытаць: за што мы ваявалі? Сядзелі ў траншэях — увосень па калена ў вадзе, зімой у лютыя маразы — па калена ў снезе, месяцамі не здымалі адзенне і не спалі па-людску. Так было пад Калінінам, Яхрамай, пад Масквой... Там мы не дзяліліся на багатых і бедных..."

Можна, вядома, сказаць, што не мае рацыі ветэран — не ўсе бізнэсмены "злодзеі і спекулянты". Але зірнем ягонымі вачыма на нашу посткамуністычную краіну... На пыхлівасць новых гаспадароў жыцця, на іх грэблівасць да "людзей учорашняга дня", ад якіх, як пішуць у гламурных часопісах, ідзе "пах беднасці". Так, на думку аўтараў гэтых выданняў, пахнуць урачыстыя сходы ў вялікіх залах на дзень Перамогі, куды раз на год запрашаюць ветэранаў і прамаўляюць у іх гонар крывадушныя хваласпевы. А насамрэч яны сёння нікому не патрэбныя. Наіўныя іх думкі пра справядлівасць. І іх адданасць савецкаму ладу жыцця...

У пачатку свайго прэзідэнцтва Ельцын кляўся, што ляжа на рэйкі, калі дапусціць зніжэнне ўзроўню жыцця народа. Узровень гэты не проста знізіўся, а зваліўся, можна сказаць, у прорву. Аднак Ельцын на рэйкі не лёг. А лёг пад цягнік на знак пратэсту ўвосені 1992-га стары салдат Цімяран Зінатаў...»

*Сайт газеты «Правда». 1997 г.*

### *За памінальным сталом*

*Паводле нашага звычаю: мёртвыя ў зямлю — жывыя за стол. Сабралася шмат людзей, некаторыя прыехалі здалёк: з Масквы, Кіева, Смаленска… Усе з ордэнамі і медалямі, як на Дзень Перамогі. Пра смерць казалі — як пра жыццё.*

—За палеглага нашага таварыша! Горкі глыток. *(Усе ўстаюць.)*

—Зямля яму пухам…

—Эх, Цімяран… Цімяран Хабулавіч… Крыўда ў яго была. Усе мы моцна пакрыўджаныя. Прывыклі да сацыялізму. Да савецкай Радзімы — СССР. А жывём цяпер у розных краінах, пры іншым ладзе. Пад іншымі сцягамі. Не пад нашым пераможным чырвоным сцягам… Я ўцёк на фронт у сямнаццаць гадоў…

—Нашы ўнукі Вялікую Айчынную прайгралі б. Няма ў іх ідэі, няма ў іх вялікай мары.

—Яны іншыя кніжкі чытаюць і глядзяць іншыя фільмы.

—Расказваеш… а ім гэта ўжо як казка… Задаюць пытанні: «Навошта байцы гінулі, ратуючы палкавы сцяг? Можна было пашыць новы». Ваявалі, забівалі — а за каго? За Сталіна? Ды за цябе, дурань!

—Трэба было здацца, вылізаць боты немчуры…

—Прынеслі пахавальную на бацьку, і я адразу папрасіўся на фронт.

—Раскрадаюць савецкую нашу Радзіму… прадаюць… Калі б мы ведалі, што так атрымаецца, яшчэ падумалі б…

—Мама памерла ў вайну, а тата яшчэ раней памёр ад сухотаў. З пятнаццаці гадоў я пайшла працаваць. На заводзе давалі паўбохана хлеба на дзень і больш нічога, цэлюлоза, клей у тым хлебе. Адзін раз з голаду страціла прытомнасць… другі… Пайшла ў ваенкамат: «Не дайце памерці. Адпраўце на фронт». Просьбу задаволілі. У тых, хто ад'язджаў, і ў тых, хто праводзіў, вочы былі шалёныя! Набілася поўная цяплушка

дзяўчат. Спявалі: «Вайна дайшла аж да Урала, / Ах, хіба маладосць прапала?» На станцыях буяў бэз... адны дзеўкі смяяліся, а іншыя плакалі...

—Усе мы былі за перабудову. За Гарбачова. Але не за тое, што з гэтага атрымалася...

—Гарбач — агент...

—Я не разумеў, што Гарбачоў казаў... нейкія незразумелыя словы, я ніколі раней іх не чуў... Што за цукерку ён нам абяцаў? Але слухаць мне падабалася... Толькі слабак ён аказаўся, без бою здаў ядзерны чамаданчык. Нашу камуністычную партыю...

—Рускаму чалавеку патрэбная такая ідэя, ад якой мароз па скуры і мурашкі па хрыбетніку.

—Мы былі вялікай краінай...

—За нашу Радзіму! За Перамогу! Да дна! *(Стукаюцца чаркамі.)*

—Цяпер зоркі на помніках... А я ўспамінаю, як мы нашых хлопцаў хавалі... Зверху ў яму чаго папала накідаем, пяском прысыплем, і зараз жа каманда: наперад — наперад! Пабеглі далей. Новы бой. І зноў поўная яма. Адступалі і наступалі ад ямы да ямы. Прывязуць падмацаванне, праз два-тры дні гэта ўжо трупы. Лічаныя людзі заставаліся. Шчасліўчыкі! Да канца сорак трэцяга года мы ўжо навучыліся ваяваць. Ужо правільна ваявалі. Стала менш людзей гінуць... Тады ў мяне з'явіліся сябры...

—Усю вайну на перадавой, і ніводнай драпіны, нічога! А я — атэіст. Да Берліна дайшоў... убачыў логва звера...

—Ішлі ў бой з адной вінтоўкай на чацвярых. Першага заб'юць, другі вінтоўку падхоплівае, другога — наступны... А ў немцаў новенькія аўтаматы.

—Спачатку немцы былі пыхлівыя. Яны ўжо скарылі Еўропу. Увайшлі ў Парыж. За два месяцы планавалі вырашыць пытанне з СССР. Калі яны параненыя траплялі да нас у палон, дык плявалі ў твар нашым сястрычкам. Зрывалі бінты.

Крычалі: «Хайль Гітлер!» А пад канец вайны ўжо: «Рускі, не страляй! Гітлер капут!»

— Больш за ўсё я баяўся ганебна памерці. Калі хто спужаўся, пабег — камандзір на месцы расстрэльваў... Гэта была звычайная справа...

— Ну як сказаць... Выхоўвалі нас па-сталінску: ваяваць будзем на чужой тэрыторыі, і «... ад тайгі да турэцкай бахчы / Чырвоную армію не перамагчы...». Літасці ворагу не будзе! Першыя дні вайны... Успамінаю, як суцэльны кашмар... Трапілі ў акружэнне... Ва ўсіх адно пытанне: у чым справа? Дзе Сталін? Ніводнага нашага самалёта ў небе... Закапалі свае партыйныя і камсамольскія білеты і блукалі па лясных дарогах... Добра, годзе... Вам не варта пра гэта пісаць... *(Адсоўвае ад сябе дыктафон.)* Немцы агітавалі, дынамікі ў іх працавалі круглыя суткі: «Рускі Іван, здавайся! Нямецкая армія гарантуе табе жыццё і хлеб». Я гатовы быў застрэліцца. А калі няма чым! Няма чым! Патронаў няма... Салдацікі... нам па васямнаццаць-дзевятнаццаць гадоў... Камандзіры вешаліся адзін за адным. Хто на папрузе, хто... па-ўсякаму... Віселі на соснах... Канец свету, тваю маць!

— Радзіма альбо смерць!

— У Сталіна быў план — сем'і тых, хто здаўся ў палон, высылаць у Сібір. Тры з паловай мільёны палонных! Усіх не вышлеш! Вусаты людажэр!

— Сорак першы пракляты год...

— Гавары ўсё... цяпер можна...

— Звычкі такой няма...

— Мы і на фронце баяліся адзін з адным шчырымі быць. Людзей саджалі да вайны... і ў вайну саджалі... Мая маці працавала на хлебазаводзе, там была праверка, і ў яе ў пальчатках знайшлі крошкі хлеба, а гэта ўжо было шкодніцтва. Далі дзесяць гадоў турмы. Я на фронце, бацька на фронце, малыя брат і сястра засталіся з бабуляй, яны прасілі яе: «Бабуля, ты

не памірай раней, чым тата і Сашка (гэта я) з вайны вернуцца». Бацька прапаў без вестак.

—Якія мы героі? З намі ніколі не абыходзіліся як з героямі. Дзяцей мы з жонкай гадавалі ў бараку, пасля далі камуналку. Цяпер атрымліваем капейкі… слёзы, а не пенсію… У тэлевізары паказваюць, як немцы жывуць. Добра жывуць! Пераможаныя жывуць у сто разоў лепш за пераможцаў.

—Бог не ведае, што такое быць маленькім чалавекам.

—Я быў, ёсць і застануся камуністам! Без Сталіна і без партыі Сталіна мы б не перамаглі. Дэмакратыя, тваю маць! Баюся баявыя ордэны надзець. «Маразматык стары, дзе служыў? На фронце ці па турмах і лагерах?» — вось што я чую ад маладых. Смокчуць піва і насміхаюцца.

—Прапаную вярнуць помнікі нашаму правадыру, вялікаму Сталіну, на ранейшыя месцы. Хаваюць на задворках, як смецце.

—Пастаў у сябе на лецішчы…

—Хочуць перапісаць вайну. Чакаюць, калі мы ўсе паздыхаем.

—Цяпер мы, карацей, «саветыкус-дэбілус»…

—Выратавала Расію тое, што яна вялізная. Урал… Сібір…

—Самае страшнае — падняцца ў атаку. Першыя дзесяць хвілін… пяць хвілін… У таго, хто падымаўся першым, шанцаў застацца ў жывых не было. Куля дзірачку знойдзе. Камуністы, наперад!

—За вайсковую моц нашай Радзімы! *(Стукаюцца чаркамі.)*

—Карацей… забіваць нікому неахвота. Непрыемна. Але прывыкаеш… вучышся…

—Пад Сталінградам я ўступіў у партыю. Напісаў у заяве: «Хачу быць у першых шэрагах абаронцаў Радзімы… Не пашкадую свайго маладога жыцця…» У пяхоце ўзнагароджвалі рэдка. Маю адзін медаль «За адвагу».

—Ваенныя кантузіі даюцца ў знакі… Я стаў інвалідам, але пакуль трымаюся.

—Памятаю: узялі ў палон двух уласаўцаў… Адзін кажа: «Я помсціў за бацьку…» Бацьку расстраляла НКВД… Другі: «Я не хацеў здохнуць у нямецкім канцлагеры». Маладыя хлопцы, як мы, аднаго з намі ўзросту. Калі ты ўжо паразмаўляў з чалавекам, у вочы паглядзеў… цяжка яго забіць… Назаўтра ўсіх нас дапытвалі ў асобым аддзеле: «Чаму ўступілі ў размовы са здраднікамі? Чаму не расстралялі адразу?» Я стаў апраўдвацца… Асабіст наган на стол: «Ты, б…, яшчэ размаўляеш?! Яшчэ адно слова вякнеш — і…» Уласаўцаў ніхто не шкадаваў. Танкісты прывязвалі іх да танкаў, уключалі матор — і ў розныя бакі… разрывалі на кавалкі… Здраднікі! А ці ўсе яны былі здраднікамі?

—Асабістаў баяліся больш за немцаў. Генералы іх баяліся…

—Страх… усю вайну страх быў…

—А калі б не Сталін… Без «жалезнай рукі» Расія б не выжыла…

—Я не за Сталіна, я за Радзіму ваяваў. Клянуся сваімі дзецьмі і ўнукамі, я ні разу не чуў, каб крычалі: «За Сталіна!»

—Без салдата вайну не выйграць.

—Тваю маць…

—Баяцца трэба толькі Бога. Ён ёсць суд.

—Калі Божанька ёсць…

*(Няроўны хор.)* «І значыць, нам патрэбна перамога! / Адна на ўсіх, мы за цаной не пастаім…»

### *Мужчынская гісторыя*

—Усё жыццё рукі па швах! Не смеў пікнуць. Цяпер раскажу…

У дзяцінстве… як сябе памятаю… я баяўся страціць тату… Татаў забіралі ўначы, і яны знікалі ў нікуды. Так прапаў

матчын родны брат Фелікс... Музыка. Яго ўзялі за глупства... за лухту... У краме ён гучна сказаў жонцы: «Вось ужо дваццаць гадоў савецкай улады, а прыстойных штаноў у продажы няма». Цяпер пішуць, што ўсе былі супраць... А я скажу, што народ падтрымліваў уладу. Вось наша мама... У яе сядзеў брат, а яна казала: «З нашым Феліксам адбылася памылка. Павінны разабрацца. Але саджаць трэба, вунь колькі бязладдзя чыніцца навокал». Народ падтрымліваў... Вайна! Пасля вайны я баяўся ўспамінаць вайну... Сваю вайну... Хацеў у партыю ўступіць — не прынялі: «Які ты камуніст, калі ты быў у гета?» Маўчаў... маўчаў... Была ў нашым партызанскім атрадзе Розачка, прыгожая габрэйская дзяўчына, кніжкі з сабой вазіла. Шаснаццаць гадоў. Камандзіры спалі з ёй па чарзе... «У яе там яшчэ дзіцячыя валосікі... Ха-ха...» Розачка зацяжарала... Адвялі далей у лес і прыстрэлілі, як сабачку. Дзеці нараджаліся, ясная рэч, поўны лес здаровых мужыкоў. Практыка была такая: дзіця народзіцца — яго адразу аддаюць у вёску. На хутар. А хто возьме габрэйскае дзіця? Габрэі нараджаць не мелі права. Я вярнуўся з задання: «Дзе Розачка?» — «А табе што? Гэтай няма — іншую знойдуць». Сотні габрэяў, якія ўцяклі з гета, блукалі па лясах. Сяляне іх лавілі, выдавалі немцам за пуд мукі, за кілаграм цукру. Напішыце... я доўга маўчаў... Габрэй усё жыццё чагосьці баіцца. Куды б камень ні ўпаў, а габрэя закране.

Сысці з ахопленага агнём Мінска мы не паспелі праз бабулю... Бабуля бачыла немцаў у 18-м годзе і ўсіх пераконвала, што немцы — культурная нацыя і мірных людзей яны чапаць не будуць. У іх у доме кватараваў нямецкі афіцэр, кожны вечар ён граў на піяніна. Мама пачала сумнявацца: сыходзіць — не сыходзіць? Дзеля гэтага піяніна, вядома... Так мы страцілі шмат часу. Нямецкія матацыклісты ўехалі ў горад. Нейкія людзі ў вышываных кашулях сустракалі іх з хлебам-соллю. З радасцю. Знайшлося шмат людзей, якія думалі: вось прыйшлі немцы, і пачнецца нармальнае жыццё. Многія ненавідзелі

Сталіна і перасталі гэта хаваць. У першыя дні вайны было столькі новага і незразумелага…

Слова «жыд» я пачуў у першыя дні вайны… Нашы суседзі пачалі грукаць нам у дзверы і крычаць: «Усё, жыды, канец вам! За Хрыста адкажаце!» Я быў савецкі хлопчык. Скончыў пяць класаў, мне дванаццаць гадоў. Я не мог зразумець, што яны кажуць. Чаму яны так кажуць? Я і цяпер гэтага не разумею… У нас сям'я была змяшаная: тата — габрэй, мама — руская. Мы святкавалі Вялікдзень, але асаблівым чынам: мама казала, што сёння дзень нараджэння добрага чалавека. Пякла пірог. А на Пэйсах (калі Гасподзь памілаваў габрэяў) бацька прыносіў ад бабулі мацу. Але час быў такі, што гэта ніяк не афішавалася… трэба было маўчаць…

Мама прышыла нам усім жоўтыя зоркі… Некалькі дзён ніхто не мог выйсці з дому. Было сорамна… Я ўжо стары, але я памятаю гэтае пачуццё… Як было сорамна… Паўсюль у горадзе валяліся ўлёткі: «Ліквідуйце камісараў і жыдоў», «Выратуйце Расію ад улады жыдабальшавікоў». Адну ўлётку падсунулі нам пад дзверы… Неўзабаве… так… Папаўзлі чуткі: амерыканскія габрэі збіраюць золата, каб выкупіць усіх габрэяў і перавезці ў Амерыку. Немцы любяць парадак і не любяць габрэяў, таму габрэям давядзецца перажыць вайну ў гета… Людзі шукалі сэнс у тым, што адбываецца… нейкую падказку… Нават пекла чалавек хоча зразумець. Памятаю… Я добра памятаю, як мы перасяляліся ў гета. Тысячы габрэяў ішлі па горадзе… з дзецьмі, з падушкамі… Я ўзяў з сабой, гэта смешна, сваю калекцыю матылькоў. Гэта смешна цяпер… Мінчукі выбеглі на тратуары: адны глядзелі на нас з цікаўнасцю, другія зларадна, але некаторыя стаялі заплаканыя. Я мала азіраўся па баках, я баяўся ўбачыць кагосьці са знаёмых хлопчыкаў. Было сорамна… пастаяннае пачуццё сораму памятаю…

Мама зняла з рукі заручальны пярсцёнак, загарнула ў насоўку і сказала, куды ісці. Я пралез уначы пад дротам… У прызначаным месцы мяне чакала жанчына, я аддаў ёй пярсцёнак,

а яна насыпала мне мукі. Раніцай мы ўбачылі, што замест мукі я прынёс крэйду. Пабелку. Так сышоў матчын пярсцёнак. Іншых каштоўных рэчаў у нас не было… Сталі пухнуць з голаду… Каля гета дзяжурылі сяляне з вялікімі мяхамі. Дзень і ноч. Чакалі чарговага пагрому. Калі габрэяў вывозілі на расстрэл, сялян запускалі рабаваць пакінутыя дамы. Паліцаі шукалі каштоўныя рэчы, а сяляне складвалі ў мяхі ўсё, што знаходзілі. «Вам ужо нічога не трэба будзе», — казалі яны нам.

Аднойчы гета прыціхла, як перад пагромам. Хоць не чувалі было ніводнага стрэлу. У той дзень не стралялі… Машыны… шмат машын… З машын выгружаліся дзеці ў добрых гарнітурчыках і чаравічках, жанчыны ў белых фартухах, мужчыны з дарагімі валізкамі. Шыкоўныя былі валізкі! Усе гаварылі па-нямецку. Канваіры і ахоўнікі разгубіліся, асабліва паліцаі, яны не крычалі, нікога не білі дубінкамі, не спускалі з павадкоў рыклівых сабак. Спектакль… тэатр… Гэта было падобна да спектакля… У той самы дзень мы даведаліся, што гэта прывезлі габрэяў з Еўропы. Іх сталі зваць «гамбургскія» габрэі, бо большасць з іх прыбыла з Гамбурга. Яны былі дысцыплінаваныя, паслухмяныя. Не хітравалі, не падманвалі ахову, не шукалі схованак… яны былі асуджаныя… На нас яны глядзелі звысоку. Мы бедныя, дрэнна ўбраныя. Мы іншыя… не размаўлялі па-нямецку…

Усіх іх расстралялі. Дзясяткі тысяч «гамбургскіх» габрэяў…

Гэты дзень… усё як у тумане… Як нас выгналі з дому? Як везлі? Памятаю вялікае поле каля лесу… Выбралі дужых мужчын і загадалі ім капаць дзве ямы. Глыбокія. А мы стаялі і чакалі. Першымі маленькіх дзяцей пакідалі ў адну яму… і сталі закопваць… Бацькі не плакалі і не прасілі. Была цішыня. Чаму, спытаеце? Я думаў… Калі на чалавека напаў воўк, чалавек жа не будзе яго прасіць, маліць пакінуць яму жыццё. Ці дзік напаў… Немцы зазіралі ў яму і смяяліся, кідалі туды цукеркі. Паліцаі п'яныя як зямля… у іх поўныя кішэні гадзіннікаў… Закапалі дзяцей… І загадалі ўсім скакаць у іншую яму. Стаім

мама, тата, я і сястрычка. Падышла наша чарга… Немец, які камандаваў, ён зразумеў, што мама руская, і паказаў рукой: «А ты ідзі». Тата крычыць маме: «Уцякай!» А мама чаплялася за тату, за мяне: «Я з вамі». Мы ўсе яе адштурхоўвалі… прасілі сысці… Мама першая скокнула ў яму…

Гэта ўсё, што я памятаю… Апрытомнеў ад таго, што нехта моцна стукнуў мяне па назе чымсьці вострым. Ад болю я ўскрыкнуў. Пачуў шэпт: «А тут адзін жывы». Мужыкі з рыдлёўкамі капаліся ў яме і здымалі з забітых боты, чаравікі… усё, што можна было зняць… Дапамаглі мне вылезці наверх. Я сеў на край ямы і чакаў… чакаў… Ішоў дождж. Зямля была цёплая-цёплая. Мне адрэзалі кавалак хлеба: «Уцякай, жыдзяня. Можа, уратуешся».

Вёска была пустая… Ніводнага чалавека, а дамы цэлыя. Хацелася есці, але папрасіць не было ў каго. Так і хадзіў адзін. На дарозе то гумовы бот валяецца, то галёшы… хустка… За царквой убачыў абгарэлых людзей. Чорныя трупы. Пахла бензінам і смажаным… Уцёк назад у лес. Карміўся грыбамі і ягадамі. Адзін раз сустрэў старога, які нарыхтоўваў дровы. Стары даў мне два яйкі. «У вёску, — папярэдзіў, — не заходзь. Мужыкі скруцяць і здадуць у камендатуру. Нядаўна дзвюх жыдовачак так злавілі».

Аднойчы заснуў і прачнуўся ад стрэлу над галавой. Ускочыў: «Немцы?» На конях сядзелі маладыя хлопцы. Партызаны! Яны пасмяяліся і сталі спрачацца паміж сабою: «А жыдзёныш нам навошта? Давай…» — «Няхай камандзір вырашае». Прывялі мяне ў атрад, пасадзілі ў асобную зямлянку. Паставілі вартавога… Выклікалі на допыт: «Як ты апынуўся ў распалажэнні атрада? Хто паслаў?» — «Ніхто мяне не пасылаў. Я з расстрэльнай ямы вылез». — «А можа, ты шпіён?» Далі два разы ў морду і кінулі назад у зямлянку. Да вечара ўпіхнулі да мяне яшчэ двух маладых мужчын, таксама габрэяў, былі яны ў добрых скуранках. Ад іх я даведаўся, што габрэяў у атрад без зброі не бяруць. Калі няма зброі, дык трэба прынесці золата. Залатую рэч. У іх

былі з сабой залатыя гадзіннік і партабак — нават паказалі мне, — яны патрабавалі сустрэчы з камандзірам. Неўзабаве іх павялі. Больш я іх ніколі не сустракаў... А залаты партабак убачыў потым у нашага камандзіра... і скуранку... Мяне выратаваў татаў знаёмы, дзядзька Яша. Ён быў шавец, а шаўцы цаніліся ў атрадзе, як лекары. Я стаў яму дапамагаць...

Першая парада дзядзькі Яшы: «Змяні прозвішча». Маё прозвішча Фрыдман... Я стаў Ламейка... Другая парада: «Маўчы. А то атрымаеш кулю ў спіну. За габрэя ніхто адказваць не будзе». Так яно і было... Вайна — гэта балота, лёгка ўлезці і цяжка вылезці. Іншая габрэйская прымаўка: калі моцная віхура, вышэй за ўсё падымаецца смецце. Нацысцкая прапаганда заразіла ўсіх, партызаны былі настроеныя па-антысеміцку. Нас, габрэяў, было ў атрадзе адзінаццаць чалавек... потым пяць... Спецыяльна пры нас пачыналіся размовы: «Ну якія вы ваякі? Вас, як авечак, вядуць на забой...», «Жыды баязлівыя...» Я маўчаў. Быў у мяне баявы сябар, адчайны хлопец... Давід Грынберг... ён ім адказваў. Спрачаўся. Яго забілі стрэлам у спіну. Я ведаю, хто забіў. Сёння ён герой — ходзіць з ордэнамі. Геройствуе! Двух габрэяў забілі нібыта за сон на варце... Яшчэ аднаго за новенькі парабэлум... пазайздросцілі... Куды ўцякаць? У гета? Я хацеў абараняць Радзіму... адпомсціць за родных... А Радзіма? У партызанскіх камандзіраў былі сакрэтныя інструкцыі з Масквы: габрэям не давяраць, у атрад не браць, знішчаць. Нас лічылі здраднікамі. Цяпер мы пра гэта даведаліся дзякуючы перабудове.

Чалавека шкада... А як коні паміраюць? Конь не хаваецца, як іншыя жывёлы: сабака там, котка, карова — і тая ўцякае, конь стаіць і чакае, калі яго заб'юць. Цяжкая карціна... У кіно кавалерысты нясуцца з гікам і з шашкай над галавой. Лухта! Фантазія! У нашым атрадзе нейкі час былі кавалерысты, іх хутка расфармавалі. Коні не могуць ісці па сумётах, тым больш скакаць, яны захрасаюць у сумётах, а ў немцаў матацыклы — двухколавыя, трохколавыя, узімку яны ставілі

іх на лыжы. Ездзілі і з рогатам расстрэльвалі і нашых коней, і коннікаў. Прыгожых коней маглі пашкадаваць, пэўна, сярод іх было нямала вясковых хлопцаў…

Загад: спаліць хату паліцая… Разам з сям'ёй… Сям'я вялікая: жонка, трое дзяцей, дзед, баба. Ноччу акружылі іх… забілі дзверы цвікамі… Аблілі газай і падпалілі. Крычалі яны там, галасілі. Хлапчук лезе праз акно… Адзін партызан хацеў яго прыстрэліць, а іншы не даў. Закінулі назад у вогнішча. Мне чатырнаццаць гадоў… Я нічога не разумею… Усё, што я змог, — запомніў гэта. І вось расказаў… Не люблю слова «герой»… герояў на вайне няма… Калі чалавек узяў у рукі зброю, ён ужо не будзе добрым. У яго не атрымаецца.

Памятаю блакаду… Немцы вырашылі ачысціць свае тылы і дывізіі СС кінулі супраць партызан. Навешалі ліхтароў на парашутах і бамбілі нас дзень і ноч. Пасля бамбёжкі — мінамётны абстрэл. Атрад сыходзіў невялікімі групамі, параненых везлі з сабой, але закрывалі ім рот, а коням надзявалі спецыяльныя наморднікі. Кідалі ўсё, кідалі свойскую жывёлу, а яна бегла за людзьмі. Каровы, авечкі… Даводзілася расстрэльваць… Немцы падышлі блізка, так блізка, што ўжо чутныя былі іх галасы: «о мутэр, о мутэр»… пах цыгарэт… У кожнага з нас захоўваўся апошні патрон… Але памерці ніколі не спознішся. Уначы мы… трое нас засталося з групы прыкрыцця… распаролі жываты забітым коням, выкінулі ўсё адтуль і самі туды залезлі. Праседзелі так двое сутак, чулі, як немцы хадзілі туды-сюды. Пастрэльвалі. Нарэшце наступіла поўная цішыня. Тады мы вылезлі: усе ў крыві, у кішках… у гаўне… Адурэлыя. Ноч… месяц свеціць…

Птушкі, я вам скажу, нам таксама дапамагалі… Сарока пачуе чужога чалавека — абавязкова закрычыць. Падасць сігнал. Да нас яны прывыклі, а немцы пахлі па-іншаму: у іх адэкалон, духмянае мыла, цыгарэты, шынялі з выдатнага салдацкага сукна… і добра змазаныя боты… У нас самаробны тытунь, анучы, лапці з валовай скуры, прыкручаныя да ног

раменьчыкамі. У іх ваўняная споднняя бялізна… Мёртвых мы раздзявалі да майтак! Сабакі грызлі іх твары, рукі. Нават жывёлаў уцягнулі ў вайну…

Шмат гадоў прайшло… паўстагоддзя… А я не забыўся… на гэтую жанчыну… У яе было двое дзяцей. Маленькіх. Яна схавала ў склепе параненага партызана. Хтосьці данёс… Сям'ю павесілі пасярод вёскі. Дзяцей першымі… Як яна крычала! Так людзі не крычаць… так звяры крычаць… Ці павінен чалавек ісці на такія ахвяры? Я не ведаю. *(Маўчыць.)* Пішуць цяпер пра вайну тыя, хто там не быў. Я не чытаю… Вы не крыўдуйце, але я не чытаю…

Мінск вызвалілі… Для мяне вайна скончылася, у войска паводле ўзросту не ўзялі. Пятнаццаць гадоў. Дзе жыць? У нашай кватэры пасяліліся чужыя людзі. Гналі мяне: «Жыд пархаты…» Нічога не хацелі аддаваць: ні кватэры, ні рэчаў. Прывыклі да думкі, што габрэі не вернуцца ніколі…

*(Бязладны хор.)* «Б'ецца ў цеснай пячурцы агонь, / І сляза зіхаціць у смале. / І пяе мне ў зямлянцы гармонік / Пра усмешку і вочы твае…»

—Пасля вайны людзі ўжо не тыя былі. Я сам вярнуўся дадому азвярэлы.

—Сталін не любіў наша пакаленне. Ненавідзеў. За тое, што свабоду адчулі. Вайна — гэта была свабода для нас! Мы пабылі ў Еўропе, убачылі, як там людзі жывуць. Я ішоў на працу міма помніка Сталіну, і мяне халодны пот прабіваў: а раптам ён ведае, пра што я думаю?

—«Назад! У стойла!» — сказалі нам. І мы вярнуліся.

—Дзермакраты! Разбурылі ўсё… валяемся ў гаўне…

—Усё забылася… і каханне забылася… А вайну памятаю…

—Два гады ў партызанах. У лесе. Пасля вайны гадоў сем… восем… увогуле не магла на мужчын глядзець. Наглядзелася!

Была такая апатыя. Паехалі з сястрой у санаторый… Да яе заляцаюцца, яна танчыць, а я хацела спакою. Позна замуж выйшла. Муж быў маладзейшы за мяне на пяць гадоў. Як дзяўчынка быў.

—Пайшла на фронт, бо верыла ўсяму, што пісала газета «Правда». Страляла. Моцнае было жаданне — забіваць! Забіваць! Раней хацела ўсё забыць, але не магла, а цяпер яно само забываецца. Адно памятаю, што смерць на вайне па-іншаму пахне… пах забойства асаблівы… Калі не шмат, а адзін чалавек ляжыць, пачынаеш думаць: хто ён? Адкуль? Яго ж хтосьці чакае…

—Пад Варшавай… Старая полька прынесла мне мужава адзенне: «Здымі з сябе ўсё. Я памыю. Чаму вы такія брудныя і худыя? Як вы перамаглі?» Як мы перамаглі?!

—Ты давай… без лірыкі…

—Перамаглі — так. Але наша вялікая перамога не зрабіла нашу краіну вялікай.

—Я памру камуністам… Перабудова — гэта аперацыя ЦРУ па знішчэнні СССР.

—Што засталося ў памяці? Самае крыўднае было тое, што немцы намі пагарджалі. Як мы жылі… наш побыт… Гітлер называў славян трусамі…

—Немцы прыехалі ў нашу вёску. Вясна. На наступны дзень яны сталі рабіць клумбу і будаваць прыбіральню. Старыя дагэтуль успамінаюць, як немцы кветкі садзілі…

—У Германіі… Мы заходзілі ў дамы: у шафах шмат дыхтоўнага адзення, бялізна, забаўкі ўсякія. Горы посуду. А да вайны нам казалі, што яны пакутуюць пры капіталізме. Глядзелі і маўчалі. Паспрабуй пахваліць нямецкую запальнічку ці ровар. Загрыміш з пяцьдзясят восьмым артыкулам за «антысавецкую прапаганду». У адзін момант… Дазволілі адпраўляць пасылкі дадому: генералу — пятнаццаць кілаграмаў, афіцэру — дзесяць, салдату — пяць. Пошту завалілі. Маці піша: «Пасылак не трэба. За твае пасылкі нас заб'юць». Я ім запальнічкі паслаў,

гадзіннікі, шаўковы адрэз... Шакаладныя вялікія цукеркі... яны падумалі, што гэта мыла...

—Нязгвалчаных немак ад дзесяці да васьмідзесяці не было! Так што тыя, хто нарадзіўся там у сорак шостым, — гэта «рускі народ».

—Вайна ўсё спіша... яна і спісала...

—Вось яна — перамога! Перамога! Усю вайну людзі мроілі, як добра яны будуць жыць пасля вайны. Два-тры дні пасвяткавалі. А потым захацелася нешта есці, трэба нешта надзець. Жыць захацелася. А нічога няма. Усе хадзілі ў нямецкай форме. І дарослыя, і дзеці. Шылі-перашывалі. Хлеб давалі па картках, чэргі кіламетровыя. Азлабленне вісела ў паветры. Чалавека маглі забіць проста так.

—Памятаю... увесь дзень грукат... Інваліды ездзілі на саматробных платформах на шарыкападшыпніках. А вуліцы брукаваныя. Жылі яны ў сутарэннях і паўсутарэннях. Пілі, валяліся ў канавах. Жабравалі. Ордэны мянялі на гарэлку. Пад'едуць да чаргі і просяць: «Дайце купіць хлябка». У чарзе адны стомленыя жанчыны: «Ты — жывы. А мой у магіле ляжыць». Гналі іх. Калі крыху лепш зажылі, наогул сталі пагарджаць інвалідамі. Ніхто не хацеў вайну ўспамінаць. Ужо ўсе былі занятыя жыццём, а не вайной. За адзін дзень іх прыбралі з горада. Міліцыя вылоўлівала іх і закідвала ў машыны, як парасят. Мат... віск... піск...

—А ў нас у горадзе быў Дом інвалідаў. Моладзь без рук, без ног. Усе з ордэнамі. Іх дазволілі разабраць па дамах... афіцыйны быў дазвол... Бабы засумавалі па мужчынскай ласцы і кінуліся іх забіраць: хто на тачцы вязе, хто ў дзіцячым вазку. Хацелася, каб у доме мужыком запахла, каб павесіць мужчынскую кашулю на вяроўцы ў двары. Хутка павезлі іх назад... Гэта ж не цацка... і не кіно. Паспрабуй гэты кавалак мужчыны палюбіць. Ён злы, пакрыўджаны, ён ведае, што яму здрадзілі.

—Гэты дзень Перамогі...

*Жаночая гісторыя*

— А я пра сваё каханне раскажу... Немцы прыехалі ў нашу вёску на вялікіх машынах, толькі каскі наверсе бліпічалі. Маладыя, вясёлыя. Мацалі дзевак. Першым часам за ўсё плацілі: за курыцу, за яйкі. Расказваю гэта, і ніхто мне не верыць. Чыстая праўда! Плацілі яны дойчмаркамі... Што мне вайна? У мяне — каханне! Адно ў галаве: калі я яго ўбачу? Прыйдзе, сядзе на лаўцы і глядзіць на мяне, глядзіць. Усміхаецца. «Чаго ты ўсміхаешся?» — «А так...» Да вайны мы разам у школе вучыліся. Бацька ў яго памёр ад сухотаў, а дзеда раскулачылі, выслалі з сям'ёй у Сібір. Успамінаў, як мама пераадзявала яго маленькага «ў дзяўчынку» і вучыла, што, калі па іх прыйдуць, каб ён уцёк на станцыю, сеў на цягнік і з'ехаў. Іван яго звалі... А ён мяне: «Любачка мая...» Толькі так... Не было нам зоркі, не было нам шчасця. Прыкацілі немцы, і хутка вярнуўся ягоны дзед, злосны прыехаў, вядома. Адзін. Усю сям'ю на чужыне пахаваў. Распавядаў, як іх везлі па сібірскіх рэках. Выгрузілі ў цёмнай тайзе. На дваццаць-трыццаць чалавек далі адну пілу і сякеру. Лісце елі... кару грызлі... Камуністаў дзед ненавідзеў! Леніна і Сталіна! З першага дня пачаў помсціць. Паказваў немцам: гэты камуніст... і гэты... Кудысьці гэтых мужчын забіралі... Я доўга вайну не разумела...

Мыем разам каня на рацэ. Сонца! Сушым разам сена, і яно мне так пахне! Я нічога гэтага не ведала, я так раней не адчувала. Без кахання я была простая дзяўчынка, звычайная, пакуль не пакахала. Бачу прарочы сон... Рэчка ў нас невялікая, а я тану ў гэтай рэчцы, мяне зацягвае падводнай плынню, ужо я пад вадой. Не зразумела як, якім чынам, але хтосьці мяне падымае, выштурхоўвае наверх, толькі я чамусьці без адзення. Плыву да берага. Тады была ноч, а то ўжо раніца. На беразе стаяць людзі, уся наша вёска. Выходжу з вады голая... зусім голая...

У адным доме меўся патэфон. Збіралася моладзь. Танчылі. Варажылі на нарачонага, варажылі на Псалтыры, на смале... на

фасолі... Па смалу дзяўчына мусіла сама пайсці ў лес і знайсці старую хвою, маладое дрэва не надавалася, у ім няма памяці. Моцы няма. Усё гэта праўда... Я ў гэта і цяпер веру... А фасолю раскладалі па купках і лічылі: цот-няцот. Мне васямнаццаць гадоў... Зноў жа, вядома... у кніжках пра гэта не пішуць... Пры немцах жыць нам стала лепей, чым пры Саветах. Немцы адкрылі цэрквы. Распусцілі калгасы і раздалі зямлю — на аднаго чалавека два гектары, адзін конік на двух гаспадароў. Усталявалі цвёрды падатак: увосень мы здавалі збожжа, гарох, бульбу і па адным кабанчыку з двара. Здавалі, і нам заставалася. Усе былі задаволеныя. Пры Саветах бедавалі. Брыгадзір ставіў у сшытку «палачкі» — працадні. Увосень за гэтыя працадні — атрымай дулю! А тут у нас і мяса, і масла. Іншае жыццё! У людзей радасць, што волю атрымалі. Надышоў нямецкі парадак... Не накарміў каня — адлупцуюць пугай. Не падмёў каля двара... Памятаю размовы: да камуністаў прывыклі, і да немцаў прывыкнем. Навучымся па-нямецку жыць. Так было... усё ў памяці жывое... Ноччу ўсе баяліся «лясных» людзей, наведваліся яны без запрашэння. Адзін раз і да нас зайшлі: у аднаго — сякера, у другога — вілы: «Сала, матка, давай. Самагону. І не шумі моцна». Я вам распавядаю, як яно ў жыцці было, а не як у кніжках пішуць. Партызанаў па першым часе не любілі...

Прызначылі дзень нашага вяселля... Пасля дажынак. Калі скончацца палявыя работы і апошні сноп бабы кветкамі абкруцяць... *(Маўчыць.)* Памяць слабне, а душа ўсё памятае... Пачаўся дождж пасля абеду. Усе бягуць з поля, і мама вяртаецца. З плачам: «Божа! Божа! Твой Іван запісаўся ў паліцыю. Будзеш жонкай паліцая». — «Не хачу-у-у!» Плачам з мамай удзвюх. Увечары прыходзіць Іван, сеў і вачэй не падымае. «Іван, мой міленькі, што ж ты пра нас не падумаў?» — «Любка... Любачка мая...» Гэта дзед яго прымусіў. Чорт стары! Прыгразіў: «Не запішашся ў паліцыю, адправяць у Германію. Не відаць табе тваёй Любкі! Забудзься!» Дзед марыў... Хацеў, каб нявестка ў яго была немка... Немцы круцілі фільмы пра Германію, якое там

цудоўнае жыццё. Многія дзяўчаты і хлопцы верылі. З'язджалі. Перад адпраўкай ладзілі гулянні. Граў духавы аркестр. Грузіліся ў цягнікі ў туфліках... *(Дастае таблеткі з сумкі.)* Дрэнныя мае справы... Лекары кажуць, што медыцына бяссільная... памру неўзабаве... *(Маўчыць.)* Хачу, каб каханне маё засталося. Мяне не будзе, а людзі хай чытаюць...

Вакол вайна, а мы шчаслівыя. Год пражылі — муж і жонка. Я цяжарная. Ад нас чыгуначная станцыя была зусім блізка. То ехалі на фронт нямецкія цягнікі, салдаты ўсе маладыя, вясёлыя. Песні гарлалі. Убачаць: «Мэдхэн! Кляйнэ мэдхэн!» Смяюцца. А тут стала менш маладых, болей пажылых. То былі ўсе вясёлыя, а гэтыя едуць сумныя. Весялосці няма. Савецкая армія перамагае. «Іван, — пыталася я, — што з намі будзе?» — «На мне крыві няма. Я ні разу ў чалавека не стрэліў». *(Маўчыць.)* Мае дзеці нічога гэтага не ведаюць, я ім не прызналася. Можа, перад самым канцом... перад смерцю... Адно скажу: каханне — атрута...

Праз два дамы ад нас жыў хлопец, якому я таксама падабалася, ён мяне на танцах заўсёды запрашаў. Толькі са мной танчыў. «Я пайду цябе праводзіць». — «У мяне ёсць праважаты». Прыгожы хлопец... Пайшоў у лес. Да партызан. Казалі, хто бачыў, што носіць кубанку з чырвонай стужкай. Ноччу стук у дзверы: «Хто?» — «Партызаны». Уваходзіць гэты хлопец і яшчэ адзін, старэйшы. Кавалер мой пачынае так: «Як жывеш, паліцаечка? Даўно хацеў цябе наведаць. А мужанёк дзе?» — «Адкуль мне ведаць? Сёння не прыехаў. У гарнізоне, відаць, застаўся». Тут ён хапае мяне за руку і кідае да сценкі: нямецкая лялька... і падсцілка... і на б... пасылае і на х... Нямецкага халуя, кулацкага вырадка выбрала, а з ім цэлачку з сябе строіла. І нібы як пісталет з-за пазухі вымае. Мама ўпала перад імі на калені: «Страляйце, хлопчыкі, страляйце. Я з вашымі мамкамі ў дзеўках гуляла. Няхай і яны потым паплачуць». Неяк маміны словы на іх падзейнічалі. Пагаманілі паміж сабой і сышлі. *(Маўчыць.)* Каханне — гэта горка-горка...

Фронт усё бліжэй і бліжэй. Па начах ужо кананаду чуваць. Уначы — госці. «Хто?» — «Партызаны». Уваходзіць мой кавалер… і з ім яшчэ адзін… Мой кавалер паказвае мне пісталет: «Вось гэтым пісталетам я забіў твайго мужа». — «Няпраўда! Няпраўда!» — «Цяпер у цябе мужа няма». Я думала, што я яго заб'ю… што я… вочы яму выдрапаю… *(Маўчыць.)* А раніцай прывезлі майго Івана… На санках… на шынялі… Вочы заплюшчаныя, твар дзіцячы. Ён жа нікога не забіў… Я яму верыла! І цяпер веру! Каталася па падлозе, выла. Мая мама баялася, што я звар'яцею і дзіцятка мёртвым ці ненармальным народзіцца, пабегла да знахаркі. Да бабкі Стасі. «Я ведаю тваю бяду, — сказала яна маме, — але я тут бяссільная. Няхай дачка Бога просіць». І навучыла, як прасіць… Калі Івана павязуць хаваць, я мусіла пайсці не за трунoй, як усе людзі ідуць, а паперадзе. Да самых могілак. А гэта праз усю вёску… Да канца вайны ўжо шмат мужчын сышло ў лес. Партызанілі. У кожнай хаце хтосьці загінуў. *(Плача.)* І я ішла… перад трунoй паліцая… Я спераду, а мама ззаду. Усе людзі павыходзілі з хат, стаялі каля весніц, але ніхто дрэннага слова не кінуў. Глядзелі і плакалі.

Вярнуліся Саветы… Мяне зноў знайшоў гэты хлопец… Прыехаў на кані: «Табой ужо цікавяцца». — «Хто?» — «Хто-хто? Органы». — «А мне ўсё адно, дзе знайду сваю смерць. Няхай гоняць у Сібір». — «Што ты за маці? У цябе дзіця». — «Ты ведаеш, чыё…» — «Я цябе і такую вазьму». І я выйшла за яго замуж. За забойцу свайго мужа. Нарадзіла яму дзяўчынку… *(Плача.)* Ён аднолькава дзяцей любіў: і майго сына, і сваю дачку. Не буду нагаворваць. А я… я… у сінякох, у крывавых падцёках хадзіла. Ноччу б'е, а раніцай на каленях стаіць, прабачэння просіць. Яго з'ядала нейкая жарсць… Раўнаваў да мёртвага… Ранкам людзі ўсе спяць, а я ўжо ўстаю. Мне трэба раней, каб ён не прачнуўся… не абняў… Уначы ніводнае акно ўжо не свеціцца, а я яшчэ на кухні. Рандэлі мае ззялі. Чакаю, калі ён засне. Пражылі мы з ім пятнаццаць гадоў, і ён цяжка захварэў. Памёр за адну восень. *(Плача.)* Я не вінаватая…

я яму смерці не жадала. Прыйшла тая хвіліна… апошняя… То тварам да сцяны ляжаў, а тут павярнуўся да мяне: «Ты мяне кахала?» Прамаўчала. Засмяяўся, як тады ноччу, калі пісталет паказаў… «А я цябе адну ўсё жыццё кахаў. Так кахаў, што хацеў забіць, калі даведаўся, што памру. У Яшкі (наш сусед, ён звярыныя шкуркі вырабляе) атруты прасіў. Не магу вытрываць: я памру, а ў цябе яшчэ нехта будзе. Ты — прыгожая».

Ляжаў у труне… і нібыта смяяўся… Баялася да яго падысці. А трэба было пацалаваць.

*(Хор.)* «Уставай, краіна дужая, / Ідзе смяротны бой… / Хай лютасць непадробная паўстане, як сьцяна. / Ідзе вайна народная, / Святарная вайна…»

—З крыўдаю сыходзім…

—Я дочкам сказала: калі памру, каб была толькі музыка, а людзі няхай маўчаць.

—Пасля вайны палонныя немцы камяні цягалі. Адбудоўвалі горад. Галодныя. Прасілі хлеба. А я не магла даць ім кавалачак хлеба. Часам менавіта гэты момант успамінаю… гэты… Дзіўна, што такія рэчы ў памяці застаюцца…

*На стале стаялі кветкі і вялікі партрэт Цімярана Зінатава. Мне ўвесь час здавалася, што ў гэтым хоры я чую і ягоны голас, ён з намі.*

### *З аповеду жонкі Зінатава*

—Я мала што магу ўспомніць… Дом, сям'я… яго ніколі не цікавілі. Усё крэпасць ды крэпасць. Вайну не забываў… Дзяцей вучыў, што Ленін добры, будуем камунізм. Прыходзіць адзін раз з працы, газетка ў руцэ: «Паедзем на вялікую будоўлю. Радзіма кліча». Дзеці ў нас яшчэ былі маленькія. Паедзем — і ўсё.

Радзіма загадвае... Так мы з ім на БАМ трапілі... на будоўлю камунізму... Будавалі! Верылі: усё ў нас наперадзе! Моцна верылі савецкай уладзе. Ад душы. Цяпер пастарэлі. Галоснасць, перабудова... Сядзім і слухаем радыё. Камунізму ўжо няма... Дзе той камунізм? І камуністаў няма... не зразумець, хто там наверсе... Гайдар зусім абабраў... бамжуе народ... Хто скрадзе што-небудзь на заводзе ці ў калгасе... Хто падмане... Так і выжываюць... А мой... У аблоках жыў... заўсёды дзесьці высока... Дачка працуе ў аптэцы, прынесла яна аднойчы дэфіцытныя лекі, каб прадаць і якую капейку зарабіць. Як ён даведаўся? Разнюхаў? «Ганьба! Якая ганьба!» — крычаў. З дому яе выганяў. Не магла ніяк яго супакоіць. Іншыя ветэраны карыстаюцца прывілеямі... ім належыць... «Схадзі, — папрасіла. — Можа, і табе што-небудзь дадуць». Раскрычаўся: «Я за Радзіму ваяваў, а не за прывілеі». Ляжыць уначы з расплюшчанымі вачыма і маўчыць. Паклічу — не адказвае. Перастаў размаўляць з намі. Моцна перажываў. Не за нас перажываў, не за сям'ю, а за ўсіх. За краіну. Такі быў чалавек. Намучылася я з ім... Прызнаюся вам шчыра — як жанчыне, а не як пісьменніцы... Я яго не разумела...

Выкапаў бульбу, прыбраўся як лепей і паехаў у сваю крэпасць. Хоць бы шматок паперы нам пакінуў. Напісаў дзяржаве, чужым людзям. А нам нічога... ніводнага слова...

## Пра асалоду пакуты і фокус рускага духу

### *Гісторыя аднаго кахання*

*Вольга Карымава, музыка, 49 гадоў*

—Не... не, гэта немагчыма... немагчыма для мяне. Я думала, калі-небудзь... каму-небудзь распавяду... але не цяпер... Не цяпер. Усё ў мяне пад забаронай, замуравала, затынкавала.

Вось... Пад саркафагам... накрыла ўсё саркафагам... там пажару ўжо няма, але нейкая рэакцыя ідзе. Нейкія крышталікі ўтвараюцца. Я баюся крануць. Баюся...

Першае каханне... Ці можна яго так назваць? Мой першы муж... Гэта цудоўная гісторыя. Два гады ён да мяне заляцаўся. Я вельмі хацела за яго замуж, бо мне патрэбны быў ён цалкам, каб нікуды не падзеўся. Увесь мой! Нават не ведаю, навошта ён мне так вось цалкам быў патрэбны. Ніколі не разлучацца, увесь час бачыць і ўчыняць нейкія скандалы, і трахацца, трахацца, бясконца трахацца. Ён быў першым мужчынам у маім жыцці. Першы раз гэта наогул была такая... м-м-м... цікаўнасць проста — што ж такое адбываецца? Яшчэ раз — таксама... і ўвогуле... нейкая тэхніка... Ну, цела... цела, цела... цела і ўсё! І вось так працягвалася паўгода. А яму, увогуле, не абавязкова было, каб я гэта была я, ён мог знайсці і штосьці іншае. Але чамусьці мы жэнімся... Мне дваццаць два гады. Разам вучымся ў музычным вучылішчы, у нас усё разам. А потым гэта здарылася... адкрылася нешта ўва мне... Але я прапусціла той момант... калі я палюбіла мужчынскае цела... Вось яно ўсё табе належыць... Гэта была цудоўная гісторыя... Яна магла працягвацца бясконца, а магла за паўгадзіны скончыцца. Вось... Я сышла. Сышла сама. Ён мяне маліў застацца. Чамусьці я вырашыла, што сыду. Я так стамілася ад яго... Божа, як я ад яго стамілася! Ужо цяжарная, у мяне пуза... Навошта ён? Трахаліся, потым лаяліся, потым я плакала. Я не ўмела яшчэ цярпець. Дараваць не ўмела.

Выйшла з дому, зачыніла дзверы і раптам адчула радасць, што я зараз сыду. Сыду назаўсёды. Паехала да мамы, ён прымчаў зараз жа, уначы, і быў зусім збіты з панталыку: цяжарная, чамусьці ўвесь час незадаволеная, нешта ёй яшчэ трэба. Ну што табе яшчэ патрэбна? А я перагарнула гэтую старонку... Была вельмі радая, што ён у мяне быў, і вельмі радая, што яго больш няма. Маё жыццё — заўсёды як скарбонка. Было — і скончылася, было — і скончылася.

Ой, я так прыгожа нарадзіла Аньку... мне так гэта спадабалася... Па-першае, воды ў мяне адышлі... Я хадзіла па шмат кіламетраў, і, здаецца, на нейкім кіламетры ў лесе ў мяне адышлі воды. Увогуле неяк дрэнна разумела — ну што, мне зараз ужо збірацца ў бальніцу? Пачакала да вечара. Зіма была — цяпер ужо не верыцца — мароз сорак градусаў. Кара на дрэвах трашчала. Усё ж я вырашыла пайсці. Дакторка паглядзела: «Будзеш два дні нараджаць». Тэлефаную дадому: «Мама, прынясі шакалад. Мне яшчэ доўга ляжаць». Перад ранішнім абходам забегла медсястра: «Слухай, ужо галоўка тырчыць. Паклічу доктара». І вось — я ў крэсле... Мне кажуць: «Вось-вось. Зараз-зараз». Не памятаю, колькі часу прайшло. Але хутка... вельмі хутка... Паказваюць мне нейкі камячок: «Дзяўчынка ў цябе». Узважылі — чатыры кілаграмы. «Слухайце, ніводнага разрыву. Пашкадавала маму». Ой, калі яе назаўтра прынеслі: вочы — адны зрэнкі, чорныя, плаваюць. І я ўжо болей нічога не бачу...

У мяне пачалося новае, зусім іншае жыццё. Мне спадабалася, як я стала выглядаць. Увогуле... Я стала прыгажэйшай адразу... Анька зараз жа заняла сваё месца, я абагаўляла яе, але вось неяк яна абсалютна не была ў мяне звязаная з мужчынамі. З тым, што ў яе ёсць тата. З неба ўпала! З неба. Навучылася гаварыць, у яе пытаюцца: «Анечка, ці ў цябе таты няма?» — «У мяне замест таты бабуля». — «А сабакі ў цябе няма?» — «У мяне замест сабакі хамячок». Мы з ёй удзвюх вось такія... Я ўсё жыццё баялася, што я раптам акажуся не я. Нават калі лячылі зуб, прасіла: «Не рабіце ўкол. Не абязбольвайце». Мае пачуцці — гэта мае пачуцці, добрыя і хворыя, не адключайце мяне ад мяне. Мы з Анькай падабаліся адна адной. І вось такія мы сустрэлі яго... Глеба...

Калі б ён не быў ён, я б ніколі яшчэ раз не выйшла замуж. У мяне ўсё было: дзіця, праца, свабода. Раптам ён... Нязграбны, амаль сляпы... з задышкай... Упусціць у свой свет чалавека з такім цяжкім грузам мінулага — дванаццаць гадоў

сталінскіх лагераў... Забралі хлапчуком, у шаснаццаць гадоў. Бацьку... важнага партыйнага работніка... расстралялі, а маці да смерці замарозілі ў бочцы з вадой. Дзесьці далёка, дзесьці ў снягах. Да яго я ніколі ні пра што такое не думала... Піянерка... камсамолка... Жыццё цудоўнае! Дзівоснае! Як я на гэта наважылася? Як? Праходзіць час, і боль становіцца досведам. І досведам таксама. Ужо пяць гадоў, як яго няма... Пяць... І мне нават шкада, што ён мяне такую, якая я цяпер, не ведаў. Цяпер я больш разумею яго, я да яго дарасла, але ўжо без яго. Доўга не магла жыць адна. Зусім не хацела жыць. Я не адзіноты баялася, прычына іншая — я не ўмею жыць без кахання. Мне патрэбны гэты боль... гэтая спагада... Без гэтага... Мне страшна, мне так бывае страшна ў моры. Калі я заплываю далёка-далёка: я адна... там, унізе, цемра... Я не ведаю, што там...

*Сядзім на тэрасе. Зашумела лісце — пачаўся дождж.*

—Ой, гэтыя пляжныя раманы... Ненадоўга. Караценька. Такая маленькая мадэль жыцця. Можна прыгожа пачаць, і можна прыгожа сысці. Гэта тое, што ў нас не атрымліваецца ў жыцці, тое, чаго б мы хацелі. Таму мы так любім куды-небудзь паехаць... каго-небудзь сустрэць... Вось... У мяне дзве коскі, сукенка ў сіні гарошак, набытая за дзень да ад'езду ў «Дзіцячым свеце». Мора... Заплываю далёка-далёка, больш за ўсё на свеце я люблю плаваць. З раніцы раблю зарадку пад белай акацыяй. Ідзе мужчына, мужчына і ўсё, вельмі звычайнай знешнасці, немалады, убачыў мяне, чамусьці ўзрадаваўся. Стаіць і глядзіць: «Хочаце, я ўвечары вам вершы пачытаю?» — «Можа быць, а зараз я паплыву далёка-далёка!» — «А я буду вас чакаць». І чакаў, некалькі гадзін чакаў. Вершы чытаў кепска, увесь час папраўляў акуляры. Але быў кранальны. Я зразумела... Я зразумела, што ён адчувае... Вось гэтыя рухі, гэтыя акуляры, вось гэтая ўсхваляванасць. Але абсалютна не памятаю, што ён чытаў. І чаму гэта павінна быць такім значным? Тады таксама дождж пайшоў. Быў дождж. Я гэта памятаю... нічога

не забылася... Пачуцці... нашы пачуцці — гэта нейкія асобныя істоты — пакута, каханне, пяшчота. Жывуць яны самі сабою, яны не залежаць ад нас. Чамусьці раптам выбіраеш гэтага чалавека, а не таго, хоць той, можа, нават лепшы. Ці робішся часткай чужога жыцця, яшчэ нічога пра гэта не падазраючы. Але цябе ўжо знайшлі... даслалі сігнал... «Я так цябе чакаў», — сустракае ён мяне на наступную раніцу. І кажа гэта такім голасам, што я чамусьці ў гэты момант яму веру, хоць зусім не была гатовая. Нават наадварот. Але нешта мяняецца навокал... Гэта яшчэ не каханне, але такое адчуванне, што я раптам атрымала чагосьці шмат-шмат. Чалавек пачуў чалавека. Дачакаўся. Адплываю далёка-далёка. Вяртаюся. Трывае. Зноў кажа: «У нас з табой усё будзе добра». І чамусьці я зноў у гэта веру. Пілі ўвечары шампанскае: «Гэта чырвонае шампанскае, але за кошт нармальнага шампанскага». Фраза мне падабаецца. Смажыў яечню: «У мяне з гэтымі яечнямі цікава атрымліваецца. Я купляю яйкі дзясяткамі, смажу парамі, і заўсёды застаецца адно яйка». Нейкія такія мілыя рэчы.

Усе глядзяць на нас і пытаюцца: «Гэта твой дзядуля? Гэта твой тата?» Я ў такой кароткай сукенцы... Мне дваццаць восем гадоў... Гэта потым ён стаў прыгожы. Са мной. Мне здаецца, я ведаю сакрэт... Гэтыя дзверы адчыняюцца толькі каханнем... толькі каханнем... «Я цябе ўспамінаў». — «А як ты мяне ўспамінаў?» — «Мне хацелася, каб мы з табою кудысьці ішлі. Далёка-далёка. І нічога мне не трэба, а каб я адчуваў — ты побач. Вось такая пяшчота ў мяне да цябе — проста глядзець і ісці побач». Мы правялі з ім шчаслівыя гадзіны, абсалютна дзіцячыя. «Можа, з'едзем з табой на якую-небудзь выспу, там будзем ляжаць на пяску». Шчаслівыя людзі заўсёды дзеці. Іх трэба ахоўваць, яны далікатныя і смешныя. Безабаронныя. У нас з ім было так, а як наогул павінна быць, я не ведаю. З гэтым так, з іншым інакш. Як створыш... «Няшчасце — найлепшы настаўнік», — казала мая мама. А хочацца шчасця. Уначы прачыналася з думкай: што я раблю? Мне было не па

сабе, і я ад гэтага напружання… Я… у мяне… «У цябе ўвесь час напружаная патыліца», — заўважаў ён. Што я раблю? Куды я падаю? Там прорва.

…Вось хлебніца… Як толькі ён бачыў хлеб, пачынаў яго метадычна з'ядаць. Любую колькасць. Хлеб нельга пакідаць. Гэта пайка. Вось есць і есць, колькі ёсць хлеба, столькі і з'есць. Я не адразу зразумела…

…Распавядаў пра школу… На ўроках гісторыі яны разгортвалі падручнік і на партрэтах маршалаў Тухачэўскага, Блюхера малявалі турэмныя краты. Дырэктар школы камандавала. Пры гэтым нешта спявалі, смяяліся. Як гульня. Пасля ўрокаў яго білі і пісалі на спіне крэйдай «сын ворага народа».

…Крок убок — застрэляць, дабяжыш да лесу — дзікія звяры разарвуць. У бараку ўначы свае маглі зарэзаць. А проста так — узяў і зарэзаў. Ніякіх слоў… нічога… Гэта лагер, кожны жыве сам з сабой. Гэта мне трэба было зразумець…

…Пасля прарыву ленінградскай блакады прыбыў да іх этап блакаднікаў. Шкілеты… косткі… мала падобныя да людзей… Пасадзілі іх за тое, што яны схавалі хлебныя карткі на пяцьдзясят грамаў хлеба (дзённая норма) памерлай маці… дзіцяці… Давалі за гэта па шэсць гадоў. Два дні ў лагеры — страшная цішыня. Вохраўцы… і яны маўчалі…

…Працаваў пэўны час у кацельні… хтосьці ж яго, дахадзягу, ратаваў. Апальшчыкам быў маскоўскі прафесар-філолаг, а ён падвозіў яму дровы на тачцы. Яны спрачаліся: ці можа чалавек, які цытуе Пушкіна, страляць у бяззбройных людзей? Які слухае Баха…

Чаму ўсё ж ён? Менавіта ён? Рускія жанчыны любяць знайсці вось гэткіх няшчасных. Мая бабуля кахала аднаго, бацькі выдалі замуж за іншага. Як ён ёй не падабаўся, як не хацела! Госпадзе! І вырашыла, калі ў царкве бацюшка звернецца да яе: ці ідзеш па сваёй волі? — яна адмовіцца. А бацюшка напіўся і, замест таго, каб спытаць, як мае быць, сказаў: «Ты яго не крыўдзі, ён ногі на вайне адмарозіў». Цяпер, вядома, трэба

ўжо выходзіць замуж. Так бабуля на ўсё жыццё атрымала нашага дзядулю, якога ніколі не кахала. Трапная застаўка да ўсяго нашага жыцця… «Ты яго не крыўдзі, ён ногі на вайне адмарозіў». Ці была шчаслівая мая мама? Мама… Тата вярнуўся з вайны ў сорак пятым… Зніякавелы, стомлены. Хворы ад ран. Пераможцы! Толькі іх жонкі ведаюць, што такое было жыць з пераможцамі. Мама часта плакала, калі бацька вярнуўся. Пераможцы ўваходзілі ў нармальнае жыццё гадамі. Прывыкалі. Памятаю татавы расказы, як па першым часе ён вар'яцеў ад слоў «лазенку напалім», «сходзім на рыбалку». Нашы мужчыны — пакутнікі, яны ўсе з траўмай — ці пасля вайны, ці пасля турмы. Пасля лагера. Вайна і турма — два галоўныя рускія словы. Рускія! У рускай жанчыны ніколі не было нармальнага мужчыны. Яна лекуе, лекуе. Трымае мужчыну трошкі за героя, трошкі за дзіця. Ратуе. Да сённяшняга дня. У яе ўсё тая ж роля. Савецкі Саюз разваліўся… Цяпер у нас — ахвяры развалу імперыі. Краху. Нават Глеб быў смялейшы пасля ГУЛАГу. У яго быў гонар: а вось я выжыў! Вось я перанёс! Я такое бачыў! Але пішу кнігі, цалую жанчын… Ён быў з гонарам. А ў гэтых у вачах страх. Толькі страх… Войска скарачаецца, заводы стаяць… Інжынеры і лекары на рынку гандлююць. Кандыдаты навук. Колькі іх наўкола, скінутых з паравоза. Сядзяць на ўзбочыне, чагосьці чакаюць. У маёй знаёмай муж быў лётчык, камандзір эскадрыллі. Звольнілі ў запас. Калі яна страціла працу, адразу ж перавучылася — была інжынерам, стала цырульнікам. А ён дома сядзіць і п'е ад крыўды, п'е таму, што яму, баявому лётчыку — Афганістан за ім — трэба дзецям кашу варыць. Вось… Крыўда ў яго на ўсіх. Злосць. Хадзіў у ваенкамат, прасіўся куды-небудзь на вайну, на спецзаданне — яму адмовілі. Ахвочых поўна. У нас жа тысячы беспрацоўных вайскоўцаў, тых, хто ведае толькі аўтамат і танк. Непрыдатных для іншага жыцця. Нашым жанчынам даводзіцца быць мацнейшымі за мужчын. Гойсаюць з клятчастымі торбамі па ўсім свеце. Ад Польшчы да Кітая. Набываюць-прадаюць. Цягнуць на сабе дом, дзяцей

і старых бацькоў. І мужоў сваіх. І краіну. Цяжка камусьці іншаму гэта растлумачыць. Немагчыма. Мая дачка выйшла замуж за італьянца… Яго завуць Сэрджа… Ён — журналіст. Калі яны да мяне прыязджаюць, мы з ім усчынаем на кухні дыскусіі. Па-руску… да раніцы… Сэрджа лічыць, што рускія любяць пакуту, гэта фокус рускага духу. Для нас пакута — «уласная бітва», «шлях збавення». А вось яны, італьянцы, — не такія, яны не хочуць пакутаваць, любяць жыццё, якое для радасці дадзенае, а не для пакуты. А ў нас гэтага няма. Пра радасць мы рэдка гаворым… Пра тое, што шчасце — гэта цэлы свет. Неверагодны свет! Там столькі закуткоў, вокнаў, дзвярэй, і столькі трэба да іх ключыкаў. А нас заўсёды цягне ў цёмныя бунінскія прысады. Вось… Ідуць яны з дачкой з супермаркета — ён нясе сумкі. Увечары яна можа граць на піяніна, а ён будзе гатаваць вячэру. У мяне ўсё было інакш: ён возьме сумкі, а я забяру: «Я сама. Табе нельга». Зойдзе на кухню: «Тваё месца не тут. Марш за пісьмовы стол». Я заўсёды свяціла адлюстраваным святлом.

Год прайшоў, а можа, больш… Павінен быў ён ужо прыехаць да мяне дадому… ну, пазнаёміцца з усімі. Я яго папярэдзіла, што мама ў мяне добрая, а вось дзяўчынка не зусім… не такая, як усе… Што яна добра сустрэне — не гарантую. Ой, мая Анька… Усё цягнула да вуха: цацку, камень, лыжку… Дзеці цягнуць у рот, а яна да вуха — як гучыць! Я даволі рана пачала займацца з ёй музыкай, але нейкае дзіўнае дзіця, як толькі стаўлю кружэлку, яна паварочваецца і сыходзіць. Ёй не падабалася нічыя музыка, цікавіла толькі тое, што ўнутры яе самой гучыць. Ну вось, Глеб прыехаў, вельмі збянтэжаны, падстрыгся неяк няўдала, коратка, надта прыгожы не быў. І прывёз кружэлкі. Нешта пачаў расказваць, як ён ішоў… як ён гэтыя кружэлкі набыў… А ў Анькі слых… яна не словы чуе, а інакш… гэтыя інтанацыі… Адразу ўзяла кружэлкі: «Якія плыгозыя клузэлкі». Вось так… Праз нейкі час яна мяне бянтэжыць: «Як бы мне яго татам не назваць!» Ён не стараўся ёй

падабацца, проста яму з ёй было цікава. Любоў у іх атрымалася адразу... Я нават раўнавала, што яны любяць адно аднаго больш за мяне. Потым пераканала сябе, што ў мяне іншая роля... *(Маўчыць.)* Вось ён у яе пытаецца: «Аня, ты заікаешся?» — «Цяпер ужо кепска, а вось раней добра заікалася». Не засумуеш. За ёй можна было запісваць. Значыць: «Як бы мне яго татам не назваць!» Мы сядзім у парку... Глеб адышоў па цыгарэты, вяртаецца: «Пра што, дзяўчаты, гаворка?» Я міргаю ёй — ні ў якім разе, недарэчна ж прынамсі. А яна: «Тады ты скажы». Ну што? Што застаецца? Прызнаюся яму: яна баіцца, як бы цябе выпадкова татам не назваць. Ён: «Справа, вядома, не простая, але калі хочацца вельмі, назаві». — «Ты толькі глядзі, — сур'ёзна кажа мая Анька, — у мяне ёсць яшчэ адзін тата, але ён мне не падабаецца. І мама яго не любіць». Так у нас з ёй заўсёды. Мы спальваем масты. Па дарозе дадому ён ужо быў тата. Яна бегла і крычала: «Тата! Тата!» Назаўтра ў дзіцячым садку ўсім абвясціла: «Мяне вучыць чытаць тата». — «А хто твой тата?» — «Яго завуць Глеб». Яшчэ праз дзень яе сяброўка прынесла з дому навіну: «Анька, ты хлусіш, у цябе няма таты. Гэты твой тата не родны». — «Не, гэта той быў няродны, а гэты родны». З Анькай спрачацца марна, ён стаў «тата», а я? Я — яшчэ не жонка... не...

У мяне адпачынак... Зноў з'язджаю. Ён бяжыць за вагонам і доўга махае-махае. Але ўжо ў цягніку ў мяне пачынаецца раман. Едуць два маладыя інжынеры з Харкава, і таксама ў Сочы, як я. Божа мой! Я такая маладая! Мора. Сонца. Купаемся, цалуемся, танчым. Мне лёгка і проста, таму што свет просты, ча-ча-ча-казачок і ўсё — я ў сваёй стыхіі. Мяне кахаюць... мяне носяць на руках... Дзве гадзіны ў горы мяне падымаюць на руках... Маладыя цяглiцы, малады смех. Вогнішча да раніцы... Сніцца мне сон... Столь расчыняецца. Неба блакітнае... Я бачу Глеба... Мы кудысьці ідзём з ім. Ідзём па марскім беразе, а там не адшліфаваная хвалямі галька, а вострыя-вострыя камяні, як цвікі. Я іду ў абутку, а ён басанож. «Басанож, — тлу-

мачыць мне, — лепей чуваць». Але я ж ведаю — яму балюча. І ад болю ён пачынае падымацца… лунаць над зямлёй… Я бачу, як ён ляціць. Толькі рукі ў яго чамусьці складзеныя, як у мёртвага чалавека… *(Спынілася.)* Божа! Я — вар'ятка… Нікому не павінна прызнавацца… часцей за ўсё ў мяне адчуванне, што я ў гэтым жыцці шчаслівая… Шчаслівая! Прыйшла да яго на магілкі… Вось памятаю, што іду. Адчуваю, што ён недзе тут. І такая вастрыня шчасця, мне плакаць хочацца ад гэтага шчасця. Плакаць. Кажуць, што мёртвыя не прыходзяць да нас. Не верце.

Адпачынак сканчаецца, я вяртаюся. Інжынер праводзіць мяне да самай Масквы. Я абяцаю пра ўсё расказаць Глебу… Прыходжу да яго… У яго на стале ляжыць штотыднёвік, увесь скрэмзаны, шпалеры ў кабінеце спісаныя, нават на газетах, якія ён чытаў, усюды толькі тры літары: з… г… ў… Вялікія, маленькія, друкаваныя, пісьмовыя. Шматкроп'і… шматкроп'і… Я пытаюся: «Што гэта?» Ён расшыфроўвае: здаецца, гэта ўсё? Ну вось, мы расстаёмся, і трэба гэта неяк Аньцы растлумачыць. Заехалі па яе, а ў Анькі — перш чым выйсці з дому — памаляваць! Тут яна не паспела, сядзіць у машыне і рыдае. А ён ужо прывык да таго, што яна такая шалёная, вызначаў, што гэта талент. Гэта была ўжо сямейная сцэна: Анька плача, ён яе суцяшае, а я паміж імі… Так глядзіць, глядзіць на мяне… І я… гэта ўсяго адна хвіліна… секунда… Я разумею: ён страшэнна самотны чалавек. Страшэнна! І… я выйду за яго замуж… Я павінна… *(Заплакала.)* Якое шчасце, што мы не размінуліся. Не прайшла я міма. Якое шчасце! Ён падарыў мне цэлае жыццё! *(Плача.)* Значыць, я выходжу замуж… Яму страшна, ён баіцца, бо быў ужо двойчы жанаты. Жанчыны здраджвалі яму, яны стамляліся… і іх нельга вінаваціць… Каханне — гэта цяжкая праца. Перш за ўсё, для мяне гэта — праца. Без вяселля было ў мяне, без белай сукенкі. Усё прайшло сціпла. А я заўсёды марыла, што будзе вяселле і белая сукенка, і я кіну з моста ў ваду букет белых руж. Такія ў мяне былі мары.

Ён не любіў, калі яго распытвалі... Нейкая заўсёды бравада... каб гэта было смешна... зэкаўскае такое, прыхоўванне за гэтым усяго сур'ёзу. Мерка іншая. Напрыклад, ніколі не казаў «свабода», а заўсёды «свабодка». «І вось я на свабодцы». У рэдкія хвіліны... Тады так смачна, азартна распавядаў... Я проста адчувала яго радасці, вынесеныя адтуль: як дастаў недзе кавалкі шыны, прывязаў іх на валёнкі, і ў іх быў этап, і ён так радаваўся, што ў яго ёсць гэтыя шыны. Аднойчы прынеслі паўмеха бульбы, і дзесьці на «свабодцы», калі працавалі, хтосьці даў вялікі кавалак мяса. Уначы ў кацельні яны зварылі суп: «І ты ведаеш, гэта было так смачна! Так цудоўна!» Калі вызвалілі, ён атрымаў кампенсацыю за бацьку. Яму сказалі: «Мы вам вінныя за дом, за мэблю...» Налічылі вялікія грошы. Ён набыў новы касцюм, новую кашулю, новыя чаравікі, набыў фотаапарат і пайшоў у найлепшы маскоўскі рэстаран «Нацыяналь», замовіў усё самае дарагое, піў каньяк, каву з фірмовым тортам. У канцы, калі наеўся, папрасіў, каб яго хтосьці ў гэты самы шчаслівы момант жыцця сфатаграфаваў. «Вяртаюся ўжо на кватэру, дзе жыў, — успамінаў, — і лаўлю сябе на думцы, што шчасця не адчуваю. У гэтым гарнітуры, з гэтым фотаапаратам... Чаму няма шчасця? Усплылі ў памяці тыя шыны, той суп у кацельні — вось там было шчасце». І мы намагаліся зразумець... Вось... Дзе ж жыве гэтае шчасце? Лагер ён не аддаў бы ні за што... не памяняў бы... Гэта быў яго таемны скарб, яго багацце. З шаснаццаці і амаль да трыццаці гадоў ён быў у лагеры... Вось палічыце... Я ў яго пыталася: «А калі б не пасадзілі?» Аджартоўваўся: «Я быў бы дурнем і ездзіў на чырвонай гоначнай машыне. Наймаднейшай». Толькі ў самым канцы... Ужо ў канцы... калі ляжаў у бальніцы... Першы раз загаварыў са мной сур'ёзна: «Гэта як у тэатры. З залы бачыш прыгожую казку — прыбраную сцэну, бліскучых акцёраў, таямнічае святло, але калі ты трапляеш за кулісы... Адразу за заслонай — абломкі нейкіх дошак, анучы, недамаляваныя і кінутыя карціны... пляшкі з-пад гарэлкі... аб'едкі... Казкі

няма. Цёмна... брудна... Мяне правялі за кулісы... ты разумееш?»

...Яго кінулі да блатных. Хлопчык... Што там было, не даведацца нікому і ніколі...

...Невыказная паўночная краса! Снежная стоенасць... і святло ад яе нават уначы... А ты — працоўная скаціна. Цябе ўганяюць у прыроду, вяртаюць кудысьці назад. «Катаванне красою», — называў ён гэта. Яго ўлюбёная прымаўка: «Кветкі і дрэвы ў Яго атрымаліся лепш, чым людзі».

...Пра каханне... Як было ў яго першы раз... Яны працавалі ў лесе. Міма вялі калону жанчын на працу. Жанчыны ўбачылі мужчын, спыніліся — і ні з месца. Начальнік варты: «Давай наперад! Наперад!» Жанчыны стаяць. «Наперад, вашу маць!» — «Грамадзянін начальнік, пусціце да мужыкоў, не можам больш. Выць будзем!» — «Вы што? Асатанелі! Звар'яцелі!» Стаяць: «Нікуды не пойдзем». Каманда: «Паўгадзіны вам. Разысціся!» Умомант калона рассыпалася. Але вярнуліся ўсе ў час. Дакладна. Вярнуліся шчаслівыя. *(Маўчыць.)* Дзе жыве гэтае шчасце?

...Ён там пісаў вершы. Хтосьці паведаміў начальніку лагера: «Піша». Начальнік паклікаў да сябе: «Складзі мне любоўны ліст вершам». Успамінаў, што той прасіў і саромеўся. Дзесьці на Урале жыло ягонае каханне.

...Дадому вяртаўся на верхняй паліцы. Цягнік сунуўся два тыдні. Па ўсёй Расіі. Ён ляжаў увесь час наверсе, баяўся спусціцца ўніз. Пакурыць выходзіў уначы. Страх: спадарожнікі пачастуюць чым-небудзь — расплачацца. Разгаворыцца. І яны даведаюцца, што ён з лагера... Прынялі яго далёкія бацькавы сваякі. У іх была маленькая дзяўчынка. Ён абняў яе, і яна заплакала. Нешта ў ім такое было... Ён быў страшэнна самотны чалавек... І са мной. Я ведаю: са мной таксама...

Казаў цяпер усім з гонарам: «У мяне сям'я». Кожны дзень дзівіўся нармальнаму сямейнаму жыццю, увогуле неяк вельмі гэтым ганарыўся. Але страх... усё адно страх... не ўмеў

без яго жыць. Страх. Прачынаўся начамі ўзмакрэлы ад жаху: не дапіша кнігу (пісаў кнігу пра бацьку), не атрымае новую замову на пераклад (тэхнічны перакладчык з нямецкай), не пракорміць сям'ю. Раптам я сыду… Спачатку страх, а пасля няёмкасць за гэты страх. «Глеб, я цябе люблю. Калі ты захочаш, каб я дзеля цябе танчыла ў балеце, я буду. Я на ўсё здатная дзеля цябе». У лагеры ён выжыў, а ў звычайным жыцці — шараговы міліцыянер, спыніўшы машыну, мог давесці яго да інфаркту… ці званок з домакіраўніцтва… «Як жа ты застаўся там жывы?» — «Мяне ў дзяцінстве моцна любілі». Нас ратуе колькасць атрыманай любові, гэта наш запас трываласці. Вось… Толькі любоў нас ратуе. Любоў — гэта вітамін, без якога чалавек не здольны жыць, у яго згортваецца кроў, спыняецца сэрца. Я была медсястрой… нянькай… актрысай… Я была ўсім.

Нам пашанцавала, я лічу… Час быў важны… Перабудова! Адчуванне свята, натуральна. Здавалася, што вось-вось кудысьці ўзляцім. Свабода лунала ў паветры. «Глеб, гэта твой час! Можна ўсё напісаць. Надрукаваць». Перш за ўсё, гэта быў іхні час… час шасцідзясятнікаў… Іх трыумфу. Я бачыла яго шчаслівым: «Я дажыў да поўнай перамогі антыкамунізму». Самае галоўнае здарылася, пра што ён марыў: камунізм абрынуўся. Зараз прыбяруць бальшавіцкія помнікі і ленінскі саркафаг на Чырвонай плошчы, вуліцы не будуць насіць імёны забойцаў і катаў… Час надзеяў! Шасцідзясятнікі — няхай цяпер што заўгодна пра іх кажуць, а я іх усіх люблю. Наіўныя? Рамантыкі? Так!!! Цэлымі днямі чытаў газеты. Хадзіў раніцай у шапік «Саюздрук» каля нашага дома. З вялікай гаспадарчай торбай. Слухаў радыё і глядзеў тэлевізар. Безупынку. Тады ўсе былі такімі вар'ятамі. Сва-бо-да! П'янкое само гэтае слова. Усе мы выраслі на «самвыдаце» і «тамвыдаце». На слове мы выраслі. На літаратуры. Як мы гаварылі! Як усе тады добра гаварылі! Я гатую абед ці вячэру, ён сядзіць побач, з газетай, і мне зачытвае: «Сюзан Зонтаг: камунізм — гэта фашызм

з чалавечым абліччам... Яшчэ... яшчэ паслухай...» Прачыталі з ім Бярдзяева... Хаека... Як жа мы раней жылі без гэтых газет і кніг? Калі б мы раней гэта ведалі... Усё было б інакш... У Джэка Лондана ёсць апавяданне на гэтую тэму: жыць можна і ў кашулі вар'ята, трэба толькі скурчыцца, сціснуцца і прывыкнуць. І нават можна бачыць сны. Так мы жылі. Ну, а як цяпер будзем жыць? Я не ведала — як? — але ўяўляла, што мы ўсе будзем жыць добра. Ніякіх сумневаў... А пасля смерці знайшла ў яго дзённіку запіс: «Перачытваю Чэхава... Апавяданне "Шавец і нячыстая сіла". Чалавек прадае душу д'яблу ў абмен на шчасце. А якое шчасце ва ўяўленні шаўца? Яно такое — ехаць у брычцы, у новай паддзёўцы і хромавых ботах, каб побач сядзела тоўстая грудастая баба і каб у адной руцэ быў кумпяк, а ў другой — кварта хлебнага віна. Больш нічога не трэба...» *(Задумалася.)* У яго, відаць, былі сумневы... Але так хацелася новага. Добрага і светлага, вельмі справядлівага. Бегалі шчаслівыя на ўсе дэманстрацыі і мітынгі... Датуль натоўпу я баялася. Таўпізму. У мяне было непрыняцце натоўпу, гэтых святочных шэсцяў. Сцягоў. А тут усё мне падабалася... вакол такія родныя твары... Я гэтыя твары ніколі не забуду! Сумую па тым часе, многія — я ведаю — сумуюць. Першая наша турпаездка з ім за мяжу. У Берлін. Пачуўшы рускую гаворку, да нашай групы падышлі дзве маладыя немкі: «Рускія?» — «Так». — «Перабудова! Горбі!» — сталі яны абдымаць нас. Я вось думаю: дзе тыя твары? Дзе тыя прыгожыя людзі, якіх я бачыла ў дзевяностыя гады на вуліцах? Яны што, усе з'ехалі?

...Калі я даведалася, што ў яго рак, я ўсю ноч ляжала ў слязах, а раніцай памчала да яго ў бальніцу. Сядзеў на падаконні, жоўты і вельмі шчаслівы, ён заўсёды быў шчаслівы, калі нешта мянялася ў жыцці. То быў лагер, то была ссылка, то потым пачалася воля, а вось цяпер яшчэ нешта такое... Смерць як яшчэ адна перамена... «Баішся, што памру?» — «Баюся». — «Ну па-першае, я табе нічога не абяцаў. А па-другое, гэта будзе

не хутка». — «Праўда?» Я, як заўсёды, яму паверыла. Тут жа выцерла слёзы і пераканала сябе, што мне зноў трэба яму дапамагчы. Больш не плакала… да самага канца не плакала… Прыходзіла раніцай у палату, і тут пачыналася наша жыццё, то мы жылі дома, а цяпер жывём у бальніцы. Паўгода яшчэ пражылі ў анкацэнтры…

Мала чытаў. Больш расказваў…

Ён ведаў, хто на яго данёс. Хлопчык адзін… займаўся з ім у гуртку Дома піянераў. Ці то ён сам, ці яго прымусілі напісаць ліст: лаяў таварыша Сталіна, апраўдваў бацьку, «ворага народа». Следчы на допыце гэты ліст яму паказаў. Усё жыццё Глеб баяўся… Баяўся, што даносчык даведаецца, што ён ведае… Калі яму перадалі, што ў таго нарадзілася хворае дзіця, ён спалохаўся — а раптам гэта адплата? Так выйшла, што мы нават пэўны час жылі побач, часта сустракаліся на вуліцы. У краме. Віталіся. Глеб памёр, і я распавяла пра гэта нашай агульнай сяброўцы… Яна не паверыла: «Н.? Не можа быць, ён так добра заўсёды гаворыць пра Глеба, як яны сябравалі ў дзяцінстве». Я зразумела, што мушу маўчаць. Вось… Для чалавека гэткая веда небяспечная… Ён гэта ўсведамляў… Лагернікі да нас у дом прыходзілі рэдка, не шукаў ён іх. Калі яны з'ўляліся ў доме, я адчувала сябе чужой, яны прыходзілі адтуль, дзе мяне яшчэ не было. Ведалі пра яго болей, чым ведала я. Выявілася, што ў яго ёсць яшчэ нейкае жыццё… Я зразумела, што жанчына можа расказаць пра свае прыніжэнні, а мужчына — не, жанчыне лягчэй прызнацца, таму што дзесьці глыбока яна гатовая да гвалту, нават вось сам палавы акт… Кожны месяц жанчына пачынае жыццё нанова… гэтыя цыклы… Сама прырода ёй дапамагае. Сярод жанчын, якія сядзелі ў лагерах, шмат адзінокіх. Я мала бачыла такіх пар, каб абое — ён і яна — адтуль. Іх не яднала, а раз'ядноўвала нейкая таямніца. Мяне яны называлі «дзетачка»…

«Табе цікава з намі?» — пытаўся Глеб, калі госці сыходзілі. «Што за пытанне?» — крыўдавала я. «Ведаеш, чаго я баюся?

Калі гэта было цікава, у нас быў кляп у роце, а цяпер, калі мы можам усё расказаць, ужо позна. Як бы ніхто ўжо не слухае. Не чытае. Выдаўцам прыносяць новыя рукапісы пра лагеры, яны вяртаюць іх, не чытаючы: "Ізноў Сталін і Берыя? Не камерцыйны праект. Чытач ужо аб'еўся"».

...Прывык паміраць... Не баяўся гэтай маленькай смерці... Брыгадзіры-блатныя прадавалі іх пайкі хлеба, прайгравалі ў карты, і яны елі бітум. Чорны бітум. Многія гінулі — склейваўся страўнік. А ён проста перастаў есці, толькі піў.

...Адзін хлопчык пабег... наўмысна пабег, каб яго застрэлілі... Па снезе... пад сонцам... Выдатная бачнасць. Застрэлілі ў галаву, прыцягнулі на вяроўцы і паставілі каля барака — глядзіце! Доўга ён там стаяў... да вясны...

...Дзень выбараў... Канцэрт на выбарчым участку. Выступае лагерны хор. Стаяць палітычныя, уласаўцы, прастытуткі, кішэннікі — і спяваюць песню пра Сталіна: «Сталін — наш сцяг! Сталін — наша шчасце».

...На перасылцы сустрэў дзяўчыну. Яна распавядала, як следчы ўгаворваў яе падпісаць пратакол: «Паедзеш у пекла... Але ты прыгожая, спадабаешся якому-небудзь начальніку. І так уратуешся».

...Увесну было асабліва страшна. Усё ў прыродзе змяняецца... усё пачынае жыць... Нікому лепш не задаваць пытанне, колькі яму засталося сядзець. Увесну любы тэрмін — вечнасць! Птушкі лятуць — ніхто галавы не падымае. У неба вясной не глядзяць...

Азірнулася каля дзвярэй — памахаў рукой. Вяртаюся праз некалькі гадзін — ён ужо трызніць. Кагосьці просіць: «Пачакай. Пачакай». Потым перастаў, проста ляжаў. Яшчэ тры дні. Я і да гэтага прывыкла. Ну вось, ён тут ляжыць, а я тут жыву. Мне паставілі ложак з ім побач. Вось... Трэці дзень... Ужо цяжка калоць унутрывенныя... Тромбы... Я павінна дазволіць дактарам усё спыніць, яму не будзе балюча, ён не пачуе. І мы з ім засталіся зусім удваіх. Ні прыбораў, ні дактароў, да яго

ніхто больш не заходзіць. Я легла побач. Холадна. Забралася пад коўдру да яго і заснула. Прачнулася… на секунду мне здалося: мы спім у сябе дома, расчыніўся балкон… ён яшчэ не прачнуўся… Страшна расплюшчыць вочы… Расплюшчыла — усё ўспомніла… Тут я замітусілася… Устала, паклала рукі яму на твар: «А-а-ах…» — пачуў мяне. Пачалася агонія… і я так сядзела… руку яго трымала, апошні ўдар сэрца паслухала. Яшчэ доўга так сядзела… Паклікала нянечку, яна дапамагла мне надзець яму кашулю, блакітную, яго ўлюбёны колер. Я спытала: «Можна пасядзець?» — «Так, калі ласка. Не баіцёся?» Чаго ж мне баяцца? Я ведала яго… як маці ведае сваё дзіця… Да раніцы ён стаў прыгожы… Знік з твару страх, сышло напружанне, уся жыццёвая мітусня. І я ўбачыла тонкія, выразныя рысы. Твар усходняга прынца. Вось які ён! Вось які ён насамрэч! Такім я яго не ведала.

У яго была адзіная просьба: «Напішы на камені, які будзе ляжаць нада мною, што я быў шчаслівым чалавекам. Мяне любілі. Самая страшная мука, калі цябе не любяць». *(Маўчыць.)* Такое кароткае наша жыццё… Міг! Я бачу, як глядзіць мая старэнькая мама ўвечары ў сад… якімі вачыма…

*Доўга сядзім моўчкі.*

Не магу… не ўмею без яго жыць… А да мяне зноў заляцаюцца. Дораць кветкі.

*Назаўтра — нечаканы званок.*

Усю ноч плакала… ад болю… Я ўвесь час сыходзіла… сыходзіла… уцякала ў іншы бок. Я ледзь выжыла… А ўчора туды зноў вярнулася… мяне вярнулі… Хадзіла ўся забінтаваная, стала раскручваць гэтыя бінты, аказваецца, нічога не загаілася. Я думала, што пад гэтымі бінтамі ў мяне ўжо новая скура, а нічога гэтага няма. Нічога не зарасло. Нікуды яно не сышло… усё, што было… Я баюся гэта камусьці аддаць. Ніхто не ўтрымае. Звычайнымі рукамі гэта не ўтрымаць…

## *Гісторыя аднаго дзяцінства*

*Марыя Вайцяшонак, пісьменніца, 57 гадоў*

— Я — асадніца. Я нарадзілася ў сям'і ссыльнага польскага афіцэра-асадніка (osadnik — па-польску «пасяленец», які атрымаў зямлю на Усходніх Крэсах пасля заканчэння савецка-польскай вайны ў 1921 годзе). А ў 1939 годзе (сакрэтны пратакол пакта Молатава — Рыбентропа) Заходнюю Беларусь далучылі да СССР, і тысячы асаднікаў-каланістаў разам са сваімі сем'ямі былі высланыя ў Сібір як «небяспечны палітычны элемент» (з запіскі Берыі — Сталіну). Але гэта вялікая гісторыя, а ў мяне свая… маленькая…

Не ведаю дня свайго нараджэння… і нават года… Усё ў мяне прыблізнае. Не знайшла ніякіх дакументаў. Я ёсць, і мяне няма. Не памятаю нічога і памятаю ўсё. Я думаю, што мама з'язджала цяжарная мной. Чаму? Мяне заўсёды хвалююць паравозныя гудкі… і пах шпалаў… і плач людзей на станцыях… Магу ехаць добрым, фірмовым цягніком, але прагрукоча побач таварняк, і ў мяне слёзы. Не магу бачыць вагоны для скаціны, чуць, як раве жывёла… Нас звозілі ў гэтых вагонах. Мяне яшчэ не было. І я была. У мяне ў снах няма твараў… сюжэтаў… усе мае відзежы з гукаў… пахаў…

Алтайскі край. Горад Змяінагорск, рака Змееўка… Ссыльных згрузілі за горадам. Каля возера. Жыць сталі ў зямлі. У зямлянках. Я нарадзілася пад зямлёй, вырасла там. Зямля мне з дзяцінства пахне домам. Цячэ са столі, адрываецца камяк зямлі, упаў і скача да мяне. Гэта — жаба. Але я маленькая, я яшчэ не ведаю, каго трэба баяцца. Сплю з дзвюма козачкамі, на цёплай падсцілцы з казінага «гарошку»… Першае слова «ме-е-е»… першыя гукі… а не «ма»… «мама». Старэйшая сястра Уладзя ўспамінала, як я дзівілася, што козачкі не гавораць, як мы. Мая разгубленасць. Яны здаваліся мне роўнымі. Свет быў цэльны, непадзельны. Я і цяпер не адчуваю гэтай розніцы паміж намі, паміж людзьмі і жывёламі. Заўсёды размаўляю

з імі… і яны мяне разумеюць… А жучкі, павучкі… яны таксама былі побач… такія каляровыя, такія расфарбаваныя жучкі. Мае цацкі. Увесну мы разам выбіраліся на сонца, поўзалі па зямлі, шукалі ежу. Грэліся. А ўзімку абміралі, як дрэвы, упадалі ў спячку ад голаду. У мяне свая школа, мяне вучылі не толькі людзі. Я чую і дрэвы, і траву. Больш за ўсё ў жыцці мне цікавыя жывёлы, сапраўды цікавыя. Як мне аддзяліцца ад таго свету… ад тых пахаў… Не магу. Вось нарэшце сонца! Лета! Я — наверсе… вакол краса сляпучая, і ніхто нікому не гатуе ніякай ежы. І яшчэ ўсё гучыць, усё ў фарбах. Я спрабую на смак кожную травінку, лісток… кветку… усе карэньчыкі… блёкату раз наелася, ледзь не памерла. Цэлыя карціны ў памяці… Памятаю гару «Сіняя барада» і сіняе святло на гэтай гары… азарэнне… Святло ішло менавіта з левага боку, са схілу. Ішло яно зверху ўніз… Якія гэта былі відовішчы! Баюся, што ў мяне не хопіць таленту гэта перадаць. Уваскрасіць. Словы — гэта толькі дадатак да стану. Да нашых пачуццяў. Чырвоныя макі, лілеі-саранкі, мар'ін корань… Усё гэта рассцілалася перад вачыма. Пад нагамі. Ці іншая карціна… Я сяджу каля нейкага дома. Па сцяне паўзе сонечная пляма… і яна розных колераў… увесь час змяняецца. Доўга-доўга сяджу на тым месцы. Калі б не гэтыя фарбы, я б, напэўна, памерла. Не выжыла. Не памятаю, што мы елі… ці была ў нас якая-небудзь чалавечая ежа…

Увечары я бачыла, як ішлі чорныя людзі. Чорнае адзенне, чорныя твары. Гэта ссыльныя вярталіся з руднікоў… яны ўсе былі падобныя да майго бацькі. Я не ведаю, ці любіў мяне бацька. Ці любіў мяне хто-небудзь?

У мяне вельмі мала ўспамінаў… Мне іх не хапае. Шукаю ў цемры, імкнуся больш адтуль выцягнуць. Рэдка… вельмі рэдка раптам штосьці ўспомніцца, чаго я не памятала. Мне горка, але я шчаслівая. Я тады страшна шчаслівая.

Нічога не магу ўспомніць пра зіму… Узімку я сядзела ў зямлянцы ўвесь дзень. Дзень быў падобны на вечар. Усё ў прыцемку. Ніводнай каляровай плямы… Ці былі ў нас нейкія рэчы,

акрамя місаў і лыжак? Ніякай вопраткі… каб штосьці з адзення… абгортваліся нейкімі анучамі. Ніводнай каляровай плямы. Абутак… Што з абутку? Галёшы… памятаю галёшы… у мяне таксама галёшы, вялікія і старыя, як у мамы. Напэўна, маміны… Першае паліто мне выдалі ў дзіцячым доме, і першыя рукавіцы. Шапачку. Памятаю: у цемры ледзь-ледзь бялее твар Уладзі… Цэлымі днямі яна ляжыць і кашляе, яна захварэла на рудніках, у яе сухоты. Я ўжо ведаю гэтае слова… Мама не плача… Не памятаю, каб мама плакала, яна мала гаварыла, а потым, мабыць, наогул перастала гаварыць. Калі кашаль адступае, Уладзя кліча мяне: «Паўтарай за мной… Гэта — Пушкін». Я паўтараю: «Мароз і сонца, дзень цудоўны! Яшчэ ты дрэмлеш, друг чароўны!» І ўяўляю сабе зіму. Як у Пушкіна.

Я раба слова… я слову веру абсалютна… Заўсёды чакаю слоў ад чалавека, і ад незнаёмага чалавека таксама, ад незнаёмага нават больш чакаю. На незнаёмага чалавека яшчэ можна спадзявацца. Здаецца, і самой хочацца сказаць… і я рашаюся… Гатовая. Калі я пачынаю камусьці распавядаць, потым на тым месцы, пра якое я казала, я нічога ўжо не знаходжу. Там пустата, я губляю гэтыя ўспаміны. Там імгненна — дзіра. І трэба доўга чакаць, каб яны вярнуліся. Таму я маўчу. Я ўсё апрацоўваю ў сабе. Хады, лабірынты, норкі…

Шматкі… Адкуль у мяне ўзяліся гэтыя шматкі і абрэзкі? Рознакаляровыя, найбольш малінавага колеру. Хтосьці мне іх прынёс. З гэтых шматкоў я шыла маленькіх чалавечкаў, стрыгла сабе валасы, рабіла ім фрызуры. Гэта былі мае сяброўкі… Лялек я не бачыла, нічога не ведала пра лялькі. Жылі мы ўжо ў горадзе, але не ў доме, а ў сутарэнні. Адно сляпое акенца. Але ў нас ужо з'явіўся адрас: вуліца Сталіна, дом сямнаццаць. Як і ў іншых… як і ва ўсіх… у нас ужо быў адрас. Там я гуляла з адной дзяўчынкай… дзяўчынка была не з сутарэння, а з дома. Хадзіла ў сукенках і ў чаравічках. А я — у мамчыных галёшах… Я прынесла ёй паказаць гэтыя шматкі, на вуліцы яны глядзеліся яшчэ прыгажэй, чым у сутарэнні. Дзяўчынка

пачала іх у мяне прасіць, на штосьці хацела выменяць гэтыя шматкі. Я — ні за што! Прыйшоў яе тата: «Не сябруй з гэтай жабрачкай», — сказаў. Я зразумела, што мяне ўзялі і адпрэчылі. Мне трэба ціха сысці, хутчэй сысці з гэтага месца. Вядома, гэта ўжо дарослыя словы, не дзіцячыя. Але пачуццё… тое пачуццё я памятаю… Табе так балюча, што ўжо няма крыўды і няма жалю да сябе, у цябе раптам шмат-шмат свабоды. А жалю да сябе няма… Калі жаль ёсць, то чалавек яшчэ не так глыбока зазірнуў, ён яшчэ не сышоў ад людзей. А калі ён сышоў, людзі яму зусім не патрэбныя, яму хапае таго, што ў ім самім. Я занадта глыбока зазірнула… Мяне цяжка пакрыўдзіць. Я рэдка плачу. Мне смешныя ўсе звычайныя беды, жаночыя крыўды… Для мяне гэта шоў… шоў жыцця… Але калі я пачую, што плача дзіця… ніколі не прайду міма жабрака… Ніколі не прайду міма. Пах гэты я памятаю, пах бяды… Нейкія хвалі ідуць, я дагэтуль да іх падлучаная. Гэта пах майго дзяцінства. Маіх пялюшак.

Я іду з Уладзяй… мы нясём пуховую хусту… Прыгожую рэч для нейкага іншага свету. Хуста на замову. Уладзя ўмела вязаць, на тыя грошы мы жылі. Жанчына разлічылася з намі, а потым кажа: «Давайце я вам нарэжу кветак». Як — нам букет? Стаім дзве жабрачкі, у нейкім рыззі… галодныя, халодныя… І нам — кветкі! Мы заўсёды думалі толькі пра хлеб, а гэты чалавек здагадаўся, што мы здольныя думаць яшчэ пра нешта. Ты быў пад замком, замураваны, а табе адчынілі фортку… акно расчынілі… Аказваецца, акрамя хлеба… акрамя ежы… нам можна даць і букет кветак! Значыць, мы нічым ад іншых не адрозніваемся. Мы… такія самыя… Гэта было парушэннем правілаў: «Давайце я вам нарэжу кветак». Не нарву, не збяру, а нарэжу ў сваім садзе. З гэтага моманту… Магчыма, гэта быў мой ключ… мне далі ключ… Мяне гэта перавярнула… Я памятаю той букет… вялікі букет касмеяў… Заўсёды іх цяпер саджаю ў сябе на лецішчы. *(Мы сядзім якраз у яе на лецішчы. Растуць тут адны кветкі і дрэвы.)* Я нядаўна

ездзіла ў Сібір… Горад Змяінагорск… вярнулася туды… Шукала нашу вуліцу… наш дом… наша сутарэнне… Але дома ўжо няма, дом знеслі. Ва ўсіх пытала: «А вы памятаеце?» Адзін стары ўспомніў: так, у сутарэнні жыла прыгожая дзяўчына, яна хварэла. Людзі больш запамінаюць прыгажосць, чым пакуту. І букет нам падарылі, таму што Уладзя была прыгожая.

Я пайшла на могілкі… Каля самых варот стаяла старожка з забітымі вокнамі. Доўга стукала. Выйшаў вартаўнік, ён быў сляпы… Што за знак? «Не скажаце, дзе хавалі ссыльных?» — «А… та-а-ам…» — і махнуў рукой ці то ўніз, ці то ўгару. Нейкія людзі павялі мяне ў самы далёкі кут… Адна трава там… адна трава… Уначы не спала, бо задыхалася. Спазма… такое адчуванне, што хтосьці мяне душыць… Уцякла з гасцініцы на станцыю. Пешкі праз увесь пусты горад. Станцыя была зачыненая. Села на рэйкі і да раніцы чакала. На адхоне сядзелі хлопец з дзяўчынай. Цалаваліся. Развіднела. Прыйшоў цягнік. Пусты вагон… Уваходзім: я і чацвёра мужчын у скуранках, голеныя, падобныя да крымінальнікаў. Сталі частаваць мяне гуркамі і хлебам. «Бум у карты гуляць?» Мне не было страшна.

Нядаўна ўспомніла… Ехала і ўспомніла… у тралейбусе ехала… Як Уладзя спявала: «Я магілку мілай шукаў, Ды знайсці ніяк не магу…». Аказваецца, улюбёная песня Сталіна… калі яе спявалі, ён плакаў… І я яе адразу разлюбіла, гэтую песню. Да Уладзі прыходзілі сяброўкі, клікалі на танцы. Я ўсё гэта памятаю… Мне было ўжо шэсць ці сем гадоў… Я бачыла, як у майткі замест гумкі яны зашывалі дрот. Каб нельга было сарваць… Там жа адны ссыльныя… зэкі… Забівалі часта. Пра каханне я таксама ўжо ведала. Да Уладзі прыходзіў прыгожы хлопец, калі яна хварэла — ляжала ў нейкіх лахманах, кашляла. А ён так на яе глядзеў…

Мне балюча, але гэта — маё. Я нікуды ад яго не бягу… Не магу сказаць, што я ўсё прыняла, удзячная за боль, тут патрэбнае нейкае іншае слова. Зараз я яго не знайду. Ведаю, што ў гэтым стане я далёка ад усіх. Я адна. Узяць пакуту ў свае рукі,

валодаць ёй цалкам і выйсці з яе, штосьці адтуль вынесці. Гэта такая перамога, толькі ў гэтым ёсць сэнс. Ты не з пустымі рукамі… А інакш навошта было спускацца ў пекла?

Вось нехта падводзіць мяне да акна: «Паглядзі, вунь вязуць твайго бацьку…». Незнаёмая жанчына цягнула штосьці на санках. Кагосьці або штосьці… захутанае ў коўдру і перавязанае вяроўкай… Потым мы з сястрой хавалі нашу маму. Засталіся адны. Уладзя ўжо кепска хадзіла, у яе адымаліся ногі. Скура адслойвалася як папера. Ёй прынеслі бутэлечку… Я думала, што гэта лекі, а гэта была нейкая кіслата. Атрута. «Не бойся…» — паклікала яна мяне і дае гэтую бутэлечку. Яна хацела, каб мы разам атруціліся. Я бяру гэтую бутэлечку… Бягу і кідаю яе ў печку. Шкло разбіваецца… Печка была халодная, там даўно нічога не варылася. Уладзя заплакала: «Ты ўся ў бацьку». Хтосьці нас знайшоў… Можа, яе сяброўкі? Уладзя ляжала ўжо ў непрытомнасці… Яе — у бальніцу, мяне — у дзіцячы дом. Бацька… Я хачу яго ўспомніць, але як ні намагаюся, не бачу ягонага твару, няма ў маёй памяці ягонага твару. Потым я ўбачыла яго, маладога, на фотаздымку ў цёткі. Праўда… я да яго падобная… Гэта наша з ім сувязь. Бацька ажаніўся з прыгожай сялянскай дзяўчынай. З беднай сям'і. Хацеў зрабіць з яе паню, а мама заўсёды насіла хустку, насунуўшы яе нізка-нізка на бровы. Не паня. У Сібіры бацька нядоўга жыў з намі… ён сышоў да іншай жанчыны… А я ўжо нарадзілася… Я была пакараннем! Праклёнам! Ніхто не меў сілаў любіць мяне. І мама таксама не мела гэтых сілаў. Гэта запраграмавалася ў маіх клетках: яе адчай, яе крыўда… і нелюбоў… Мне заўсёды бракуе любові, нават калі мяне любяць, я не веру, мне ўвесь час патрэбныя доказы. Знакі. Яны патрэбныя мне кожны дзень. Кожную хвіліну. Мяне цяжка любіць… я ведаю… *(Доўга маўчыць.)* Я люблю свае ўспаміны… Люблю свае ўспаміны за тое, што там усе жывыя. У мяне там усе ёсць: мама… тата… Уладзя… Мне абавязкова трэба сядзець за доўгім сталом. З белым абрусам. Я жыву адна, але ў мяне на кухні стаіць вялікі

стол. Можа, яны ўсе са мной… Я магу ісці і раптам паўтару нечы жэст. Не мой… Уладзін жэст… ці мамін… Мне здаецца, мы датыкаемся рукамі…

Я — у дзіцячым доме… У дзіцячым доме сіротаў-асаднікаў выхоўвалі да чатырнаццаці гадоў, а потым адпраўлялі на руднікі. І ў васямнаццаць гадоў — сухоты… як ва Уладзі… Гэта лёс. Дзесьці далёка, казала Уладзя, у нас ёсць дом. Але вельмі далёка. Там засталася цётка Марыля, маміна сястра… Непісьменная сялянка. Яна хадзіла, прасіла. Чужыя людзі пісалі лісты. Не разумею і цяпер… ну як? Як яна дамаглася? У дзіцячы дом прыйшло распараджэнне: адправіць мяне разам з сястрою на вось такі і такі адрас. У Беларусь. Першы раз да Мінска мы не даехалі, у Маскве нас высадзілі з цягніка. Усё паўтарылася: Уладзю — у яе пачалася гарачка — у бальніцу, мяне — у ізалятар. З ізалятара — у прыёмнік-размеркавальнік. Сутарэнне, пахла хлёркай. Чужыя людзі… Я ўвесь час жыву сярод чужых людзей… Усё жыццё. А цётка пісала… пісала… Праз паўгода знайшла мяне ў прыёмніку. Ізноў я чую словы «дом», «цётка»… Мяне вядуць да цягніка… Цёмны вагон, толькі асветлены праход. Цені людзей. Са мной — выхавальніца. Даехалі да Мінска і ўзялі квіток у Паставы… я ўсе гэтыя назвы ведаю… Уладзя прасіла: «Ты запамінай. Запомні: наш маёнтак Соўчына». З Пастаў ідзём пешшу ў Грыдзькі… у цётчыну вёску… Селі каля моста перадыхнуць. А тым часам сусед ехаў з начной змены на ровары. Спытаў, хто мы. Адказалі, што прыехалі да цёткі Марылі. «Так, — сказаў ён, — правільна ідзяце». І, відаць, перадаў цётцы, што бачыў нас… яна пабегла насустрач… Я ўбачыла яе і кажу: «А вось гэтая цётка падобная на маю маму». І ўсё!

Стрыжаная «пад нулёўку», сяджу на доўгай лаве ў хаце дзядзькі Стаха, мамінага брата. Дзверы адчыненыя, і праз праём відаць, што людзі ідуць і ідуць… спыняюцца і моўчкі глядзяць на мяне… Жывапіс проста! Ніхто адзін з адным не гаворыць. Стаяць і плачуць. Абсалютная цішыня. Уся вёска прыйшла… І яны перакрылі мой паток слёз, кожны плакаў са

мной. Усе яны ведалі бацьку, хтосьці ў яго працаваў. Не раз я потым пачую: «У калгасе нам «палачкі» налічваюць, а Антэк (бацька) заўсёды разлічвабўся». Вось яна — мая спадчына. Наш дом перавезлі з хутара на цэнтральную сядзібу калгаса, у ім дагэтуль сельсавет. Я ўсё ведаю пра людзей, ведаю больш, чым хацелася б. У той самы дзень, калі чырвонаармейцы пагрузілі нашу сям'ю на калёсы і павезлі на станцыю, гэтыя самыя людзі... цётка Ажбета... Юзэфа... дзядзька Мацей... разнеслі з нашага дому ўсё па сваіх хатах. Дробныя пабудовы разабралі. Раскацілі па бервянцу. І малады сад выкапалі. Яблынькі. Цётка прыбегла... і вынесла толькі вазон з акна на памяць... Не хачу я гэта памятаць. Ганю з памяці. Я памятаю, як вёска мяне няньчыла, насіла на руках. «Хадзем, Манечка, да нас, мы грыбоў наварылі...», «Давай малачка табе налію...». Сёння я прыехала, а назаўтра ў мяне ўвесь твар пакрыўся пухірамі. Пякло вочы. Не магла падняць павекі. Мяне за рукі вадзілі ўмывацца. Ува мне выбольвала ўсё, выпальвалася, каб я паглядзела на свет іншымі вачыма. Гэта быў пераход з таго жыцця да гэтага... Цяпер я ішла па вуліцы, і мяне кожны спыняў: «Якая дзяўчынка! Ай, якая дзяўчынка!» Без гэтых слоў у мяне вочы былі б як у сабакі, якога выцягнулі з палонкі. Я не ведаю, як я глядзела б на людзей...

Жылі цётка з дзядзькам у каморы. Хата ў вайну згарэла. Паставілі камору, думалі, на першы час, і там засталіся. Саламяная страха, маленькае акенца. У адным куце бульбачка (цётчыны словы) — не «бульба», а «бульбачка», а ў другім — парася віскоча. Ніякіх дошак на падлозе — зямля накрытая аерам і саломай. Неўзабаве сюды ж прывезлі Уладзю. Пажыла яна трохі і памерла. Цешылася, што памірае дома. Апошнія яе словы: «А што будзе з Манечкай?»

Усё, што я даведалася пра любоў, я ведаю з цётчынай каморкі...

«Мая ты птушачка... — называла мяне цётка. — Мая жужалка... пчолка...» Я ўвесь час лапатала, торгала яе. Я не

магла паверыць... Мяне любілі! Любілі! Ты расцеш, а табой любуюцца — гэта такая раскоша. У цябе ўсе костачкі распростваюцца, усе цягліцы. Я танчыла ёй «рускага» і «яблычак». Мяне навучылі гэтым танцам у ссылцы... Спявала песні... «Ёсць на Чуйскім на тракце дарога. / Шмат шафёраў кіруе па ёй...», «Памру, у чужой зямельцы лягу, / Заплача мамачка мая, / І жонка іншага прыгляне, / А маці сына — ні ў жыцці...» Набегаешся за дзень так, што ногі ўсе сінія-сінія, абадраныя — абутку ж не было ніякага. Ляжаш увечары спаць, а цётка твае ножкі закруціць у падол сваёй начной кашулі, сагрэе. Яна мяне спавівала. Ляжыш дзесьці каля жывата... як ва ўлонні... Таму я не памятаю злога... Я злое забыла... дзесьці далёка яно ў мяне схавана... Раніцай прачыналася ад цётчынага голасу: «Я дранікі спякла. Паеш». — «Цёця, я спаць хачу». — «А ты паеш і спі». Яна разумела, што ежа... бліны... для мяне як лекі. Бліны і любоў. А дзядзька наш Віталік быў пастух, насіў на плячы пугу і доўгую берасцяную дудку. Хадзіў у вайсковым кіцелі і галіфэ. Прыносіў нам з пашы торбу — там і сыр, і кавалачак сала — усё тое, чым яго частавалі гаспадыні. Святая беднасць! Яна для іх нічога не значыла, не прыгнятала, не абражала. Якое для мяне важнае ўсё гэта... каштоўнае... Адна сяброўка скардзіцца: «Няма грошай на новую машыну...», іншая: «Усё жыццё марыла, а так і не купіла сабе норкавае футра...». Як праз шкло чую... Адзінае, пра што я шкадую, што не магу ўжо насіць кароткую спадніцу... *(Разам смяемся.)*

Цётка мела незвычайны голас... дрыготкі, як у Эдзіт Піяф... Яе клікалі спяваць на вяселлях. І калі хтосьці паміраў. Я заўсёды з ёй... побач бягу... Памятаю... Вось яна стаіць-стаіць каля труны... доўга стаіць... У нейкі момант адлучаецца неяк ад усіх, падыходзіць бліжэй. Павольна падыходзіць... яна бачыць, што ніхто не можа сказаць гэтаму чалавеку апошніх слоў. Людзі хочуць, але не ўсе ўмеюць. І вось яна пачынае: «І куды ты, Анечка, ад нас пайшла... светлы дзень і ночку пакінула... хто цяпер будзе хадзіць па тваім двары... хто дзетак тваіх пацалуе...

хто ўвечары кароўку сустрэне…» Ціха-ціха падбірае словы… Усё звычайнае, простае, і яно ж высокае. Журботнае. Нейкая самая апошняя праўда ў гэтым простым. Канчатковая. Голас дрыжыць… І ўсе за ёй пачынаюць плакаць. Ужо забылі, што карова не падоеная, муж п'яны дома застаўся. Змяняюцца твары, сыходзіць мітусня, на тварах праступае святло. Усе плачуць. Я саромеюся… і шкадую цётку… Вернецца яна дахаты хворая: «Ой, Манечка, галоўка шуміць». Але такое было ў цёткі сэрца… Са школы прыбягу… Маленькае акенца, іголка з палец… Цётка зашывае нашы анучкі і пяе: «Агонь заліеш вадою, / Любоў нічым няможна…» Я асветленая гэтымі ўспамінамі…

Ад нашага маёнтка… Ад нашага дому засталіся адны камяні. Але я чую іх цяпло, мяне цягне да іх. Прыязджаю туды, як на магілу. Я магу там заначаваць у полі. Хаджу асцярожна, баюся ступіць. Чалавека няма, а жыццё ёсць. Гоман жыцця… розных жывых істот… Хаджу і баюся разбурыць чыйсьці дом. Я і сама магу абжыцца дзе заўгодна, як мурашка. У мяне культ дома. Каб раслі кветкі… было прыгожа… Я памятаю, як у дзіцячым доме мяне вядуць у пакой, дзе я буду жыць. Белыя ложкі… Шукаю вачыма: ці не заняты ложак каля акна? Ці будзе ў мяне свая тумбачка? Я шукаю, дзе будзе мой дом.

Цяпер… Колькі гэта мы сядзім і гаворым? За гэты час адгрымела навальніца… суседка прыходзіла… тэлефон званіў… Усё гэта ўплывала на мяне, на ўсё гэта я адгукалася. А на паперы застануцца толькі словы… Іншага нічога не будзе: суседкі не будзе, тэлефонных званкоў… таго, што я не сказала, але яно мільгала ў памяці, прысутнічала. Заўтра ўвогуле я пра ўсё, можа быць, распавяду інакш. Словы засталіся, а я ўстану і пайду далей. Я навучылася з гэтым жыць. Іду і іду.

Хто гэта мне даў? Усё гэта… Бог даў ці людзі? Калі Бог даў, дык ён ведаў, каму даваць. Пакута мяне вырасціла… Гэта мая творчасць… Мая малітва. Колькі разоў я хацела каму-небудзь усё распавесці. Прагаворвалася. Але ніхто ў мяне ні разу не спытаў: «А далей што… далей?» А я ўвесь час чакала добрых

ці дрэнных людзей, не ведаю, але ўвесь час чакала людзей. Усё жыццё чакаю, што мяне хтосьці знойдзе. І я ўсё яму распавяду… і ён спытае: «Ну, а далей што?» Цяпер пачалі казаць: сацыялізм вінаваты… Сталін… Як быццам у Сталіна была ўлада, як у Бога. У кожнага быў свой Бог. Чаму ён маўчаў? Мая цётка… наша вёска… Я памятаю яшчэ Марыю Пятроўну Арыставу, заслужаную настаўніцу, якая наведвала нашу Уладзю ў бальніцы ў Маскве. Чужая жанчына… яна і прывезла яе да нас у вёску, занесла на руках… Уладзя ўжо зусім не хадзіла… Марыя Пятроўна дасылала мне алоўкі, цукеркі. Пісала лісты. А ў дзіцячым прыёмніку-размеркавальніку, дзе мяне мылі, дэзінфікавалі… Я на высокай лаве… уся ў пене… магу саслізнуць, разбіцца аб цэмент. Слізгаю… спаўзаю… Чужая жанчына… нянечка… падхоплівае мяне і прыціскае да сябе: «Маё ты птушанятка».

Я бачыла Бога.

## Пра час, калі ўсякі, хто забівае, думае, што ён служыць Богу

*Вольга В. — тапограф, 24 гады*

—Раніца. Я на каленях… Стаяла і прасіла: «Госпадзе! Я магу зараз! Я хачу зараз памерці!» Нягледзячы на тое, што раніца… і дзень пачынаецца…

Такое моцнае жаданне… Памерці! І я пайшла да мора. Села на пясок. Угаворвала сябе, што не трэба баяцца смерці. Смерць — гэта свабода… Мора білася, білася аб бераг… і настала ноч, а потым зноў раніца. Першы раз я нічога не вырашыла. Хадзіла і хадзіла. Слухала свой голас: «Госпадзе, я люблю цябе! Госпадзе…» Сара бара бзія бзой… Гэта па-абхазску… Вакол столькі колераў, гукаў… А я хачу памерці.

Я — руская. Нарадзілася ў Абхазіі і там доўга жыла. У Сухумі. Жыла там да дваццаці двух гадоў. Да дзевяноста другога года... Пакуль вайна не пачалася. Калі загарыцца вада, як яе пагасіць? — кажуць абхазы. Так яны кажуць пра вайну... Людзі ездзілі ў адных аўтобусах, вучыліся ў адных школах, чыталі адны кнігі, жылі ў адной краіне і мову ўсе вучылі — рускую. І яны цяпер забіваюць адзін аднаго: сусед — суседа, аднакласнік — аднакласніка. Брат забівае сястру! Ваююць тут жа, каля дому... Ну колькі? Ну год таму... два... жылі як браты, усе былі камсамольцамі і камуністамі. Я пісала ў школьным творы: «браты навек...», «саюз непарушны...». Забіць чалавека! Гэта не геройства і нават не злачынства... Гэта такі жах! Я гэта бачыла... Зразумець нельга... не разумею... Раскажу вам пра Абхазію... Я яе моцна любіла... *(Спынілася.)* І цяпер люблю, усё адно... Люблю... На сцяне ў кожным абхазскім доме вісіць кінжал. Калі нараджаецца хлопчык, сваякі дораць яму кінжал і золата. І побач з кінжалам на сцяне вісіць рог для віна. Абхазы п'юць віно з рога, як са шклянкі, рог нельга пакласці на стол, пакуль не вып'еш усё да дна. Паводле абхазскіх звычаяў, час, праведзены з гасцямі за сталом, у тэрмін жыцця не залічваецца, таму што чалавек піў віно і радаваўся. А як лічыць час, калі ён забівае? Страляе ў іншага... Ну як? Я цяпер шмат думаю пра смерць.

*(Пераходзіць на шэпт.)* Другі раз... я ўжо не адступіла... Зачынілася ў ванным пакоі... У мяне ўсе пазногці былі да крыві паздзіраныя. Драпалася, чаплялася за сцяну, за гліну, за крэйду, але ў апошнюю хвіліну зноў захацела жыць. І шнур абарваўся... Урэшце, я жывая, я магу сябе памацаць. Адно толькі... я не магу перастаць думаць пра яе... пра смерць.

Калі мне было шаснаццаць гадоў, памёр мой тата. З таго часу я ненавіджу пахаванне... гэтую музыку... Я не разумею, чаму людзі граюць гэты спектакль? Я сядзела каля труны, я ўжо тады разумела, што гэта не мой тата, майго таты тут няма. Было чыёсьці халоднае цела. Абалонка. Усе дзевяць дзён

мне сніўся сон… Мяне хтосьці клікаў… увесь час клікаў да сябе… А я не разумела: куды ісці? Да каго ісці? Я стала думаць пра блізкіх… многіх з іх я ніколі не бачыла і не ведала, яны памерлі раней, чым я нарадзілася. Але раптам я ўбачыла сваю бабулю… Бабуля даўно-даўно памерла, у нас нават фотаздымка яе не засталося, а я яе пазнала ў сне. У іх там усё па-іншаму… Яны нібыта ёсць, і нібыта іх няма, яны не прыкрытыя нічым, мы прыкрытыя целам, а яны нічым не абароненыя. Потым я ўбачыла тату… Тата яшчэ быў вясёлы, яшчэ зямны, мне ўвесь знаёмы. А ўсе іншыя людзі там нейкія такія… нейкія такія… быццам я іх ведала, але забылася. Смерць — гэта пачатак… пачатак чагосьці… Мы толькі не ведаем чаго… Думаю і думаю. Я хацела б вырвацца з гэтага палону, хацела б схавацца. А нядаўна… Як я танчыла раніцай перад люстэркам: я — прыгожая, я — маладая! Я буду радавацца! Я буду любіць!

Першы… Прыгожы рускі хлопец… Рэдкай прыгажосці! Абхазы пра такіх кажуць: «Мужчына — на семя». Ён быў крыху зямлёй прысыпаны, у красоўках і вайсковай форме. Назаўтра нехта красоўкі зняў. Вось ён забіты… А далей, далей што там? У зямлі — што? Пад нашымі нагамі… падэшвамі… Там, унізе, ці на небе… Што там — на небе? А вакол лета, і мора шуміць. І цыкады. І мама паслала мяне ў краму. А ён забіты. І раз'язджаюць па вуліцах грузавікі са зброяй, і аўтаматы раздаюць, як хлеб. Я ўбачыла ўцекачоў, мне паказалі, што гэта ўцекачы, і я ўспомніла гэтае забытае слова. З кніг — успомніла. Уцекачоў было шмат: хто на машынах, хто на трактары, хто пешшу. *(Маўчыць.)* Давайце пра што іншае пагаворым? Напрыклад, пра кіно… Я люблю кіно, але мне падабаюцца заходнія фільмы. Чаму? Там нічога не нагадвае наша жыццё. Там я магу ўсё што хачу сабе прыдумаць… наўяўляць… Надзець на сябе іншы твар, бо мне надакучыў мой твар. Маё цела… нават рукі… Мяне не задавальняе маё цела, я занадта абмежаваная ва ўсім гэтым. У мяне ўсё тое самае цела, заўсёды адно і тое самае цела, а я розная, я змяняюся… Сама слухаю свае словы

і думаю, што я гэтага сказаць не магла, бо не ведаю гэтых слоў і таму што неразумная і люблю булкі з маслам... Бо яшчэ не кахала. Не нараджала. А я гэта кажу... Не ведаю: чаму? Адкуль яно ўсё ўва мне? Другі... Малады грузін... Ён ляжаў у парку. Там быў у адным месцы пясок, і ён на пяску ляжаў. Ляжаў і глядзеў угору... І ніхто яго не звозіў, ніхто не падбіраў доўга. Я ўбачыла яго... і разумею, што трэба мне кудысьці бегчы... Мне трэба... А куды бегчы? Я прыбегла ў царкву... Там нікога не было. Я ўстала на калені і малілася за ўсіх. Тады я яшчэ не ўмела маліцца, яшчэ не навучылася з Ім размаўляць... *(Корпаецца ў сумачцы.)* Дзе таблеткі... Мне нельга! Нельга хвалявацца... Я пасля ўсяго гэтага захварэла, і мяне паказвалі псіхіятру. Іду-іду па вуліцы... і раптам хачу крычаць...

Дзе я хацела б жыць? Я хацела б жыць у дзяцінстве... Там я была з мамай, як у гняздзечку. Ратуй... Ратуй, Божа, даверлівых і сляпых! У школе я любіла ваенныя кнігі. І кіно пра вайну. Уяўляла сабе, што там прыгожа. Там ярка... яркае жыццё... Я нават шкадавала, што я дзяўчынка, а не хлопчык: калі будзе вайна, то мяне на вайну не возьмуць. Цяпер я ваенныя кнігі не чытаю. Нават самыя лепшыя... Кнігі пра вайну... яны ўсе падманваюць нас. Насамрэч, вайна — гэта брудна і страшна. Я цяпер не ўпэўненая — ці можна пра гэта пісаць? Не напісаць усю праўду, а ўвогуле — пісаць? Казаць пра гэта... Як потым быць шчаслівым? Я не ведаю... я разгубленая... Мама абдыме: «Дачушка, што ты чытаеш?» — «"Яны змагаліся за Радзіму" Шолахава. Пра вайну...» — «Нашто ты чытаеш гэтыя кнігі? Яны не пра жыццё, дачушка. Жыццё — гэта штосьці іншае...» Мама любіла кнігі пра каханне... Мая мама! Я нават не ведаю цяпер: жывая яна ці не? *(Маўчыць.)* Спачатку я думала, што не магу там... у Сухумі не магу жыць... А я ўвогуле ўжо не магу жыць. І кнігі пра каханне мяне не ратуюць. А каханне ёсць, я ведаю, што яно ёсць. Я ведаю... *(Першы раз усміхнулася.)*

Вясна дзевяноста другога года... Нашы суседзі — Вахтанг і Гунала: ён — грузін, яна — абхазка, — яны прадалі свой

дом, мэблю і сабраліся з'язджаць. Прыйшлі — развітацца: «Будзе вайна. З'язджайце ў Расію, калі ў вас там нехта ёсць». Мы не паверылі. Грузіны заўсёды смяяліся з абхазаў, а абхазы не любілі грузінаў. Так… О-о! *(Смяецца.)* «Ці можа грузін паляцець у космас?» — «Не». — «Чаму?» — «Усе грузіны памруць ад гонару, а ўсе абхазы — ад зайздрасці». «Чаму грузіны такія маленькія?» — «Гэта не грузіны такія маленькія, гэта горы ў абхазаў такія высокія». Смяяліся, але жылі разам. Вінаграднікі дагледалі… віно рабілі… Вінаробства ў абхазцаў — як рэлігія. У кожнага гаспадара свой сакрэт… Прайшоў травень… чэрвень… Пачаўся пляжны сезон… Першыя ягады… Якая вайна! Мы з мамай пра вайну не думаем — закручваем кампоты, варым сочыва. Штосуботы ездзілі на рынак. Абхазскі рынак! Гэтыя пахі… гукі… Пахне віннымі бочкамі і кукурузным хлебам, і авечым сырам, і смажанымі каштанамі. Тонкі пах алычы і тытуню, спрасаванага тытунёвага лісця. Вісяць сыры… мой улюбёны сыр мацоні… Пакупнікоў гукаюць па-абхазску, па-грузінску і па-руску. На ўсіх мовах: «Вай-вай, мой мілы. Не хочаш — не бяры, але ж пакаштуй!» Ужо з чэрвеня ў горадзе не прадавалі хлеб. Мама вырашыла назапасіць мукі ў суботу… Едзем у аўтобусе, побач села наша знаёмая з дзіцём. Дзіцё гуляла, а потым стала плакаць, і так гучна, быццам яго хтосьці напалохаў. І знаёмая раптам пытаецца: «Страляюць? Вы чуеце: страляюць?» Вар'яцкае пытанне! Пад'ехалі да рынку, а насустрач — натоўп, бягуць пераляканыя людзі. Ляціць курынае пер'е… Трусы пад нагамі… качкі… Пра жывёлаў ніколі не ўспамінаюць… пра тое, як яны пакутуюць… А я памятаю параненую котку. І як крычаў певень, у яго асколак з-пад крыла тырчаў… Праўда, я ненармальная? Я надта шмат думаю пра смерць… цяпер толькі гэтым занятая… І вось — крык! Гэты крык… Не адзін чалавек, а натоўп крычыць. І нейкія ўзброеныя людзі без формы, але з аўтаматамі даганяюць жанчын, забіраюць у іх сумачкі, рэчы: «Аддай гэта… Здымі з сябе тое…» «Гэта крымінальнікі?» — шэпча мне мая мама.

Выйшлі з аўтобуса і ўбачылі рускіх салдат. «Што гэта?» — спыталася ў іх мама. — «Вы што, не разумееце? — адказаў ёй лейтэнант. — Гэта — вайна». Мая мама — вялікая баязліўка, яна знепрытомнела. Я зацягнула яе ва ўнутраны дворык. З нейкай кватэры нам вынеслі графін вады... Дзесьці бамбяць... гукі выбухаў... «Жанчыны! Жанчыны! Мука патрэбная?» — стаіць малады хлопец з мехам мукі, на ім сіні халат, у якіх у нас грузчыкі ходзяць, але ён увесь белы, увесь мукой абсыпаны. Я пачала смяяцца, а мама кажа: «Давай возьмем. Можа, гэта і напраўду — вайна». Набылі ў яго мукі. Аддалі грошы. Тут да нас дайшло, што мы набылі крадзенае. Набылі ў марадзёра.

Я жыла сярод гэтых людзей... ведаю іх звычкі, мову... Я іх люблю. А адкуль з'явіліся гэтыя? З такой хуткасцю! Нечалавечай! Дзе гэта ляжала? Дзе... хто адкажа? Зняла з сябе залаты крыжык і схавала яго ў муку, і кашалёк з грашыма таксама схавала. Як старая бабуля... я ўсё ўжо ведала... Адкуль? Муку... дзесяць кілаграмаў... я несла на сабе да нашага дому — кіламетраў пяць. Я ішла спакойная... Калі б мяне забілі ў той момант, я не паспела б спалохацца... А людзі... многія з пляжа... прыезджыя... У паніцы і ў слязах. А я спакойная... Напэўна, я была ў шоку? Лепш бы я крычала... крычала, як усе... Я так цяпер думаю... Спыніліся адпачыць каля чыгункі. На рэйках сядзелі маладыя хлопцы: у адных — чорная стужка на галаве, у другіх — белая. І ва ўсіх — зброя. Яны яшчэ мяне падражнілі, пасмяяліся. А непадалёк ад іх дымілася грузавая машына... За стырном сядзеў забіты кіроўца... у белай кашулі... Убачылі! Як пабеглі праз чыйсьці мандарынавы сад... Я ўся ў муцэ... «Кінь ты яе!» — прасіла мама. — «Не, мама, я не кіну. Пачалася вайна, а ў нас дома нічога няма». Вось гэтыя карціны... Рухаюцца нам насустрач «жыгулі»... Галасуем. Машына праходзіць міма, і так павольна, як на пахаванні. На першым сядзенні — хлопец з дзяўчынай, на другім — труп жанчыны. Страшна... Але чамусьці не так страшна, як я раней уяўляла... *(Маўчыць.)* Мне ўвесь час хочацца пра гэта думаць. Думаць і думаць. Каля

самага мора — яшчэ адны «жыгулі»: лабавое шкло разбітае... лужына крыві... Жаночыя туфлі валяюцца... *(Маўчыць.)* Я, вядома, хворая... хворая... Чаму я нічога не забываю? *(Маўчыць.)* Хутчэй! Хутчэй хацелася дадому, кудысьці ў знаёмае месца. Кудысьці бегчы... Раптам гул... І ўгары — вайна! Зялёныя... вайсковыя верталёты... І на зямлі... Я ўбачыла танкі, ішлі яны не калонай, а па адным, на танках сядзелі салдаты з аўтаматамі. Трапяталі грузінскія сцягі. Калона ішла бязладна: адны танкі хутка прасоўваліся наперад, а іншыя спыняліся каля камерцыйных шапікаў. Салдаты саскоквалі з брані і прыкладамі збівалі замкі. Бралі шампанскае, цукеркі, колу, цыгарэты. За танкамі ішоў аўтобус «ікарус», запоўнены матрацамі і крэсламі. А крэслы — навошта?

Дома адразу кінуліся да тэлевізара... Граў сімфанічны аркестр. А дзе вайна? У тэлевізары вайну не паказвалі... Перад тым, як ісці на рынак, я падрыхтавала памідоры, агуркі, каб закансерваваць. Слоікі пракіпяціла. І вось мы вярнуліся, і я стала закручваць гэтыя слоікі. Мне трэба было штосьці рабіць, чымсьці заняць рукі. Увечары глядзелі мексіканскі серыял «Багатыя таксама плачуць». Пра каханне.

Раніцай. Рана-рана прачнуліся ад грукату. Па нашай вуліцы рухалася вайсковая тэхніка. Людзі выходзілі на дарогу і глядзелі. Адна машына затармазіла каля нашага дома. Экіпаж рускі. Я зразумела — найміты. Паклікалі маму: «Маці, дай вады». Мама прынесла вады і яблыкаў. Ваду выпілі, а яблыкі не ўзялі. Сказалі: «У нас учора аднаго атруцілі яблыкамі». На вуліцы сустрэла знаёмую: «Як ты? Дзе твае?» Яна прайшла міма мяне з такім выглядам, быццам мы не знаёмыя. Я пабегла за ёй, схапіла за плечы: «Што з табой?» — «Ты яшчэ нічога не зразумела? Са мной небяспечна размаўляць — у мяне муж... Мой муж — грузін». А я... я ніколі не думала пра тое, хто яе муж — абхаз ці грузін? Якая мне розніца! Сябар ён выдатны. Я абняла яе з усіх сіл! Уначы да яе прыходзіў родны брат. І хацеў яе мужа забіць. «Забівай і мяне», — сказала яму сястра. А мы з ейным

братам у адной школе вучыліся. Сябравалі. Я падумала: як мы цяпер з ім сустрэнемся? Што скажам адно аднаму?

Праз некалькі дзён уся вуліца Ахрыка хавала... Ахрык... Знаёмы абхазскі хлопчык. Яму было дзевятнаццаць гадоў. Ён пайшоў увечары да дзяўчыны — і яго нажом у спіну. Маці ідзе за трунай: то плача, а то абернецца — і смяецца. Звар'яцела. Месяц назад усе былі савецкія, а тут — грузін — абхаз... абхаз — грузін... рускі...

Жыў на суседняй вуліцы яшчэ адзін хлопец... Я яго, ясная рэч, ведала, але не імя, а ў твар. Віталіся. Нармальны з выгляду хлопец. Высокі, прыгожы. Ён забіў свайго старога настаўніка — грузіна, забіў за тое, што той вучыў яго ў школе грузінскай мове. Ставіў «двойкі». Ну як гэта? Вы хіба разумееце? Усіх у савецкай школе вучылі: чалавек чалавеку — сябар... сябар, таварыш і брат... Мая мама, калі такое пачула... у яе вочы сталі маленькія, а потым вялікія-вялікія... Ратуй, Госпадзе, даверлівых і сляпых! Гадзінамі стаю ў царкве на каленях. Там цішыня... хоць там заўсёды цяпер шмат людзей, і ўсе пра адно просяць... *(Маўчыць.)* Думаеце, у вас атрымаецца? Вы спадзяецеся, што можна пра гэта напісаць? Спадзяецеся? Так... ну так... вы спадзяецеся... А я — не.

Прачнуся ўначы... паклічу маму... Мама таксама ляжыць з расплюшчанымі вачыма: «Я ніколі не была такой шчаслівай, як у старасці. І раптам — вайна». Мужчыны заўсёды гавораць пра вайну, любяць зброю — і маладыя, і старыя... А жанчыны ўспамінаюць каханне... Старыя жанчыны распавядаюць, якія яны былі маладыя і прыгожыя. Ніколі жанчыны пра вайну не гавораць... яны толькі моляцца за сваіх мужчын... Мама пойдзе да суседзяў і вяртаецца кожны раз спалоханая: «У Гаграх спалілі цэлы стадыён грузінаў». — «Мама!» — «А яшчэ я чула, што грузіны лягчаюць абхазаў». — «Мама!» — «Разбамбілі малпоўню... Уначы грузіны за некім ганяліся і думалі, што гэта — абхаз. Яны яго паранілі, ён крычаў. А абхазы на яго натрапілі, думалі — грузін. Даганялі, стралялі. А пад раніцу ўсе

ўбачылі, што гэта параненая малпа. І ўсе — і грузіны, і абхазцы — абвясцілі замірэнне і кінуліся яе ратаваць. А чалавека б забілі...» Мне не было чаго адказаць маёй маме. Я за ўсіх малілася, прасіла: «Яны ідуць, як зомбі. Ідуць і вераць, што твораць дабро. Але хіба можна з аўтаматам і нажом тварыць дабро? Заходзяць у дом, і калі не знаходзяць нікога, страляюць у жывёлу, у мэблю. Выйдзеш у горад — ляжыць карова з прастрэленым вымем... расстраляныя слоікі з сочывам... Страляюць — адны па гэты бок, другія — па той. Настаў іх на розум!» *(Маўчыць.)* Тэлевізар ужо не працаваў, адзін гук... без карцінкі... Масква была недзе далёка-далёка.

Я хадзіла ў царкву... і там гаварыла... і гаварыла... На вуліцы каго ўбачу, таго і спыню. Потым пачала сама з сабой размаўляць. Мама сядзе каля мяне, слухае, і бачу — спіць, яна так стамлялася, што засынала на нагах. Мые абрыкосы — і спіць. А я як заведзеная... распавядаю і распавядаю... пра тое, што ад іншых чула і сама бачыла... Як грузін... малады грузін... кінуў аўтамат і крычаў: «Куды мы прыехалі?! Я прыехаў загінуць за Радзіму, а не выкрадаць чужую лядоўню! Навошта вы заходзіце ў чужы дом і хапаеце чужую лядоўню? Я прыехаў памерці за Грузію...». Яго пад рукі кудысьці павялі, па галаве гладзілі. Іншы грузін падняўся на ўвесь рост і пайшоў насустрач тым, хто ў яго страляў: «Браты абхазы! Я не хачу вас забіваць, і вы ў мяне не страляйце». Яго застрэлілі свае ў спіну. А яшчэ... Хто ён — рускі ці грузін — не ведаю, ён з гранатай кінуўся пад вайсковую машыну. Штосьці крычаў. Ніхто не чуў, што ён крычаў. У машыне гарэлі абхазы... яны таксама крычалі... *(Маўчыць.)* Мама... мама... Мама ўсе падаконні ў доме заставіла кветкамі. Ратавала мяне... Прасіла: «Глядзі, дачушка, на кветкі! Глядзі на мора!» У мяне рэдкая мама, у яе такое сэрца... Яна мне прызнавалася: «Я прачнуся рана-рана — сонца прабіваецца праз лістоту... І я думаю: “Вось я зараз пагляджу ў люстэрка — і колькі ж мне гадоў?”». У яе бяссонніца, у яе баляць ногі, яна трыццаць гадоў майстрам

на цэментавым заводзе адпрацавала, але раніцай не ведае, колькі ёй гадоў. Потым яна ўстае, чысціць зубы, бачыць сябе ў люстэрку — на яе глядзіць старая жанчына… Пачынае гатаваць сняданак і забываецца пра гэта. І я чую, як яна спявае… *(Усміхнулася.)* Мая мама… мая сяброўка… Нядаўна мне прысніўся сон: я сыходжу са свайго цела… падымаюся высока-высока… Мне так добра.

Ужо не памятаю, што было раней, а што пазней. Не памятаю… Першыя дні рабаўнікі хадзілі ў масках… чорныя панчохі на твар нацягвалі. Хутка яны маскі знялі. Ідзе: у адной руцэ крыштальная ваза, у другой аўтамат, і на спіне яшчэ дыван. Тэлевізары цягнулі, пральныя машыны… жаночыя футры… посуд… Нічым не грэбавалі, дзіцячыя цацкі ў разбітых дамах падбіралі… *(Пераходзіць на шэпт.)* Я цяпер убачу звычайны нож у краме… мне ніякавата робіцца… Раней я ніколі не думала пра смерць. Вучылася ў школе, потым у медтэхнікуме. Вучылася і захаплялася кімсьці. Прачнуся ноччу — і мару. Калі гэта было? Так даўно… Я ўжо нічога з таго жыцця не памятаю. Я іншае памятаю… Адрэзалі хлопчыку вушы, каб абхазскія песні не слухаў. А маладому хлопцу адрэзалі… ну самі разумееце… гэта… каб ад яго жонка не нараджала… Недзе ядзерныя ракеты стаяць, самалёты і танкі, а чалавека ўсё адно нажом рэзалі. Віламі заколвалі, сякерай секлі… Хай бы я зусім звар'яцела… я нічога б не памятала… Дзяўчынка на нашай вуліцы… яна сама павесілася… Дзяўчынка кахала хлопца, а ён ажаніўся з іншай. Яе хавалі ў белай сукенцы. Ніхто не верыў — як гэта: у такі час дзеля кахання памерці? Вось калі б яе згвалтавалі… Я ўспамінаю цётку Соню, маміну сяброўку… Уначы выразалі ейных суседзяў… сям'ю грузінаў, з якімі яна сябравала. І дваіх дзяцей маленькіх. Цэлымі днямі цётка Соня ляжала на ложку з заплюшчанымі вачыма і не хацела выходзіць на вуліцу: «Дзяўчынка мая, навошта пасля гэтага жыць?» — пыталася яна ў мяне. Я карміла яе супам з лыжачкі, яна не магла глытаць.

У школе нас вучылі любіць чалавека з ружжом... Абаронцу радзімы! А гэтыя... яны не такія... І вайна не такая... Яны ўсе — хлапчукі, хлапчукі з аўтаматамі. Жывыя — яны страшныя, а забітыя ляжаць бездапаможныя — і іх шкада. Як я выжыла? Я... я... Я люблю думаць пра маму. Як яна па вечарах доўга расчэсвала валасы... «Калі-небудзь, — абяцала мне мама, — я раскажу табе пра каханне. Але распавядаць буду так, нібы ўсё гэта было не са мной, а з іншай жанчынай». У іх з татам было каханне. Вялікае каханне. Спачатку ў маёй мамы быў іншы муж, аднойчы яна прасавала яму кашулі, а ён вячэраў. І раптам (гэта толькі з маёй мамай магло такое здарыцца) яна сказала ўголас: «Я нараджаць ад цябе не буду». Забрала рэчы і сышла. А потым з'явіўся мой тата... Ён хадзіў за ёй след у след, чакаў гадзінамі на вуліцы, адмарозіў зімой вушы. Хадзіў і глядзеў. І вось ён яе пацалаваў...

Перад самай вайной тата памёр... Памёр наш тата ад разрыву сэрца. Сеў увечары да тэлевізара — і памёр. Як быццам кудысьці пайшоў... «Вось, доча, калі ты вырасцеш...» — у таты наконт мяне былі вялікія планы. І-і-і... *(Заплакала.)* Мы засталіся з мамай удзвюх. З мамай, якая баіцца мышэй... не можа спаць адна ў доме. Ад вайны яна закрывае галаву падушкай... Прадалі ўсё каштоўнае, што было ў нас: тэлевізар, татаў залаты партабак, які быў бясцэнны, доўга яго берaглі, мой залаты крыжык. Мы вырашылі з'ехаць, а каб выехаць з Сухумі, трэба даць хабар. Бяруць вайскоўцы і міліцыя, патрэбныя вялікія грошы! Цягнікі ўжо не хадзілі. Апошнія караблі даўно сышлі, уцекачоў у трумах і на палубах набілася як селядцоў у бочцы. Грошай нашых хапіла толькі на адзін квіток... на адзін квіток і ў адзін бок... Да Масквы. Я не хацела без мамы з'язджаць. Месяц яна мяне прасіла-маліла: «Едзь, дачушка! Едзь!» А я хацела пайсці ў шпіталь... даглядаць параненых... *(Маўчыць.)* У самалёт мне не дазволілі нічога ўзяць, толькі сумачку з дакументамі. Ні рэчаў, ні маміных піражкоў: «Зразумейце — ваенная абстаноўка». А побач

са мной праходзіў праз мытню мужчына ў цывільным, але салдаты да яго звярталіся «таварыш маёр», грузілі ягоныя валізкі, нешта ў вялікіх кардонных скрынках. Заносілі скрыні з віном, з мандарынамі. Я плакала… я ўсю дарогу плакала… Мяне суцяшала жанчына, з ёй ляцелі два хлопчыкі: адзін — яе, другі — суседскі. Хлопчыкі распухлі ад голаду… Я не хацела… ні за што не хацела з'язджаць… Мама мяне адарвала ад сябе, запхнула сілком у самалёт. «Мама, а куды я еду?» — «Ты едзеш дадому. У Расію».

Масква! Масква… Два тыдні я жыла на вакзале. Такіх, як я… нас — тысячы… На ўсіх маскоўскіх вакзалах — на Беларускім, Савелаўскім, Кіеўскім… З сем'ямі, з дзецьмі і старымі. З Арменіі, Таджыкістана… Баку… Жывуць на лаўках, на падлозе. Есці там жа вараць. Мыюць рэчы. У прыбіральнях ёсць разеткі… і каля эскалатараў ёсць разеткі… Вады ў місу наліў, туды — электракіпяцільнік. Локшыны накідаць, мяса… Суп гатовы! Дзіцячая манная каша! Мне здаецца, што ўсе вакзалы ў Маскве прапахлі кансервамі і супам харчо. Пловам. Дзіцячай мачой і бруднымі пялюшкамі. Іх сушылі на батарэях, на вокнах. «Мама, а куды я еду?» — «Ты едзеш дадому. У Расію». І вось я — дома. Дома нас ніхто не чакаў. Не сустракаў. Ніхто на нас не звяртаў увагі, ніхто не распытваў. Уся Масква сёння — вакзал, адзін вялікі вакзал. Караван-сарай. Хутка скончыліся грошы. Два разы мяне хацелі згвалтаваць: першы раз — нейкі салдат, другі раз — міліцыянер. Міліцыянер ноччу падняў з падлогі: «Дзе твае дакументы?» — Стаў цягнуць у пакой «Міліцыя». Вочы былі шалёныя… Я — як закрычала! І ён, відаць, спалохаўся… Уцёк: «Дур-ра ты!» Удзень я хадзіла па горадзе… пастаяла на Чырвонай плошчы… А ўвечары па крамах прадуктовых. Вельмі хацелася есці, адна жанчына купіла мне піражок з мясам. Я не прасіла… Яна ела, а я глядзела, як яна ела… І яна мяне пашкадавала. Адзін раз… Але я гэты «адзін раз» на ўсё жыццё запомніла. Гэта была старая-старая жанчына. Бедная. Трэба ісці… толькі не сядзець на

вакзале… Не думаць пра ежу, не думаць пра маму. І так — два тыдні. *(Плача.)* На вакзале ў сметніцы можна было знайсці кавалачак хлеба… абгрызеную костачку курыную… Я так жыла, пакуль не прыехала татава сястра, пра якую мы даўно нічога не ведалі — жывая яна ці не? Ёй восемдзесят гадоў. У мяне быў толькі нумар яе тэлефона. Я штодня тэлефанавала, ніхто не адказваў. Цётка ляжала ў бальніцы. А я ўжо вырашыла, што яна памерла.

Здарыўся — цуд! Я так чакала… і ён здарыўся… Цётка прыехала па мяне. «Вольга… вас чакае ў пакоі міліцыі ваша цётка з Варонежа». Усе заварушыліся, зарухалася… Увесь вакзал: хто? Каго? Як прозвішча? Мы прыбеглі ўдзвюх: там знайшлася яшчэ адна дзяўчынка з гэткім жа прозвішчам, але з іншым іменем. Яна прыехала з Душанбэ. Як яна плакала, што гэта не яе цётка… не яе забіраюць…

Цяпер я жыву ў Варонежы… Праца ў мяне ўсялякая, куды возьмуць — пасудамыйкай у рэстаране, вартаўніком на будоўлі, садавіной у аднаго азербайджанца гандлявала, пакуль не стаў чапляцца. Цяпер — тапограф. Часова ўзялі, вядома, а шкада — праца цікавая. Дыплом аб заканчэнні медычнага тэхнікума ў мяне скралі на маскоўскім вакзале. І ўсе маміны фотаздымкі. Ходзім з цёткай у царкву. Я стаю на каленях і прашу: «Госпадзе! Я гатовая зараз! Я хачу зараз памерці!» Пытаюся ў Яго кожны раз: ці жывая мая мама ці не? Дзякуй… Дзякуй, што вы не баіцеся мяне. Не адводзіце вачэй, як іншыя. Слухаеце. У мяне няма тут сяброўак, ніхто мяне не даглядае. Я кажу… і кажу… Як яны ляжалі… маладыя, прыгожыя… *(Вар'яцкая ўсмешка на твары.)* Вочы расплюшчаныя… шырока расплюшчаныя вочы…

*Праз паўгода я атрымала ад яе ліст: «Сыходжу ў манастыр. Хачу жыць. Маліцца за ўсіх буду».*

## Пра маленькі чырвоны сцяжок і ўсмешку сякеры

*Ганна М-ая — архітэктар, 59 гадоў*

### *Маці*

—А-а... я... Я так болей не магу... Апошняе, што памятаю — крык. Чый? Не ведаю. Мой? Ці гэта суседка крычала, яна пачула на лесвічнай пляцоўцы пах газу. Выклікала міліцыю. *(Устае і ідзе да акна.)* Восень. Нядаўна была жоўтая... цяпер ужо чорная ад дажджоў. І святло нават удзень недзе далёка-далёка. З раніцы ўжо цёмна. Запальваю ў доме ўсе лямпачкі, і яны гараць увесь дзень. Мне не хапае святла... *(Вяртаецца і сядае насупраць.)*

Спачатку мне прысніўся сон, што я памерла. У дзяцінстве я шмат разоў бачыла, як паміраюць людзі, а пасля я пра гэта забыла... *(Выцірае слёзы.)* Незразумела, чаму плачу? Я ж усё ведаю... Я ўсё пра сваё жыццё ведаю... У сне нада мной кружляла шмат-шмат птушак. Біліся ў акно. Я прачнулася, і такое адчуванне, што каля маёй галавы хтосьці стаіць. Хтосьці там застаўся. Хачу павярнуцца, каб убачыць — хто гэта? Нейкі страх, нейкае прадчуванне, што гэтага рабіць не трэба. Нельга! *(Маўчыць.)* Я пра іншае... пра іншае хацела... Не адразу пра гэта... Вы спыталі пра дзяцінства... *(Закрывае твар рукамі.)* Вось ужо чую... Чую салодкі пах падбелу... І горы бачу, і драўляную вышку, і салдата на ёй — зімой у кажусе, вясной у шынялі. І жалезныя ложкі, вельмі шмат жалезных ложкаў, яны адзін каля аднаго стаяць. Адзін каля аднаго... Мне раней здавалася: калі я каму-небудзь гэта раскажу, мне захочацца ўцячы ад гэтага чалавека, каб больш ніколі яго не бачыць. Усё такое маё... і глыбока-глыбока схаванае... Я ніколі не жыла адна, я жыла ў лагеры ў Казахстане, ён называўся Карлаг, пасля лагера — у ссылцы. Жыла ў дзіцячым доме, у інтэрнаце... у камуналцы... Заўсёды шмат-шмат іншых цел, іншых вачэй.

Свой дом у мяне з'явіўся, калі мне было ўжо сорак гадоў. Нам далі з мужам двухпакаёвую кватэру, у нас ужо дзеці выраслі. Я бегала да суседзяў звычайна, як у інтэрнаце, пазычала то хлеб, то соль, то запалкі, і мяне за гэта не любілі. А я ніколі не жыла адна... і не магла прывыкнуць... Яшчэ мне заўсёды хацелася лістоў. Чакала канвертаў, канвертаў! І цяпер чакаю... Мне піша адна сяброўка, яна з'ехала да дачкі ў Ізраіль. Пытаецца: што ў вас там? Якое жыццё пасля сацыялізму... А якое ў нас жыццё? Ідзеш па знаёмай вуліцы: французская крама, нямецкая, польская — усе назвы на чужых мовах. Чужыя шкарпэткі, кофтачкі, боты... печыва і каўбаса... Нідзе не знайсці нашага, савецкага. Я толькі і чую з усіх бакоў: жыццё — барацьба, моцны перамагае слабога, і гэта натуральны закон. Трэба нарасціць сабе рогі і капыты, жалезны панцыр, слабыя нікому не патрэбныя. Паўсюль локці, локці, локці. Гэта — фашызм, гэта — свастыка! Я ў шоку... і ў роспачы! Гэта не маё. Не маё гэта! *(Маўчыць.)* Калі б хтосьці побач... хтосьці быў... Мой муж? Ён сышоў ад мяне. А я яго кахаю... *(Раптам усміхнулася.)* Ажаніліся мы з ім вясной, калі чаромха зацвіла і бэз ужо неўзабаве. Сышоў таксама вясной. Але ён прыходзіць... прыходзіць да мяне ў сне і ўсё ніяк не можа развітацца... Штосьці гаворыць, гаворыць. А ўдзень... я глухну ад цішыні. Слепну. З мінулым у мяне адносіны як з чалавекам, як з кімсьці жывым... Памятаю, як у «Новом мире» надрукавалі, і ўсе чыталі «Адзін дзень Івана Дзянісавіча» Салжаніцына. Усе ўзрушаныя! Столькі размоваў! А я не разумела, чаму такая цікавасць і такое здзіўленне? Усё знаёмае, абсалютна для мяне нармальнае: зэкі, лагер, параша... І — зона.

У трыццаць сёмым арыштавалі майго бацьку, ён працаваў на чыгунцы. Мама бегала, старалася, даказвала, што ён не вінаваты і гэта памылка. Пра мяне яна забыла. Забыла пра мяне. Калі ўспомніла, захацела пазбавіцца, было ўжо позна. Яна піла ўсякую гадасць... залазіла ў гарачую ванну. І... нарадзілася неданошанае дзіця... Але я выжыла. Я нештосьці

выжывала шмат разоў. Шмат разоў! Неўзабаве маму таксама арыштавалі і мяне разам з ёй, бо нельга было пакінуць дзіця адно ў кватэры, мне было чатыры месяцы. Дзвюх старэйшых сястрычак мама паспела адправіць да татавай сястры ў вёску, але з НКВД прыйшла папера: прывезці дзяцей назад у Смаленск. Забралі проста на вакзале: «Дзеці будуць у дзіцячым доме. Можа, камсамольцамі вырастуць». Нават адрасу не далі. Дзяўчат мы знайшлі, калі яны ўжо былі замужам, у іх ужо былі свае дзеці. Праз шмат, шмат гадоў... У лагеры да трох гадоў я жыла разам з мамай. Мама ўспаміната, што маленькія дзеці часта памiралі. Узімку памерлых складвалі ў вялікія бочкі, і там яны ляжалі да вясны. Іх абгрызалі пацукі. Увесну хавалі... хавалі тое, што заставалася... З трох гадоў дзяцей у мацярок забіралі і змяшчалі ў дзіцячы барак. З чатырох... не, напэўна, з пяці гадоў — я ўжо штосьці памятаю... Эпізодамі... Раніцай праз дрот мы бачылі нашых мам: іх пералічвалі і адводзілі на працу. Адводзілі за зону, куды нам хадзіць забаранялася. Калі ў мяне пыталіся: «Адкуль ты, дзяўчынка?» — Я адказвала: «З зоны». «Зазона» — гэта быў іншы свет, нешта незразумелае, што палохала, для нас не існавала. Пустыня там, пясок, сухі кавыль. Мне здавалася, што пустыня там да самага краю, і іншага жыцця, акрамя нашага, няма. Нас ахоўвалі нашы салдаты, мы імі ганарыліся. У іх зорачкі на фуражках... Быў у мяне сябрук Рубік Цырынскі... Ён вадзіў мяне да мамаў, быў лаз пад дротам. Усіх пастрояць ісці ў сталоўку, а мы схаваемся за дзвярыма. «Ты ж не любіш кашу?» — пытаўся Рубік. А я заўсёды хацела есці і вельмі любіла кашу, але дзеля таго, каб убачыць маму, я згаджалася на ўсё. І мы паўзлі ў барак да мамаў, а барак быў пусты, мамы ўсе на працы. Мы ведалі, але ўсё адно паўзлі, абнюхвалі там усё. Жалезныя ложкі, жалезны бачок для пітной вады, конаўка на ланцужку — усё гэта пахла мамамі. Зямлёй... і мамамі... пахла... Іншы раз мы там знаходзілі чыіхсьці мам, яны ляжалі на ложку і кашлялі. Чыясьці мама кашляла крывёю... Рубік сказаў, што гэта мама Томачкі, якая

ў нас самая маленькая. Гэтая мама неўзабаве памерла. А потым памерла сама Томачка, і я доўга думала: каму сказаць, што Томачка памерла? Яе ж мама таксама памерла... *(Замаўкае.)* Праз шмат, шмат гадоў я пра гэта ўспаміналда... Мама мне не верыла: «Табе было ўсяго чатыры гадкі». Я ёй тады казала, што яна хадзіла ў брызентавых чаравіках на драўлянай падэшве і з нейкіх маленькіх кавалачкаў шыла вялікія фуфайкі. І яна зноў здзіўлялася і пачынала плакаць. Памятаю... Памятаю водар кавалачка дыні, які мама мне прынесла, памерам з гузік, у нейкай анучцы. І як аднойчы хлопчыкі пазвалі мяне гуляць з коткай, а я не ведала, што такое котка. Котку прынеслі з-за зоны, у зоне котак не было, яны не выжывалі, таму што не заставалася ніякіх недаедкаў, мы ўсё падбіралі. Увесь час глядзелі пад ногі: што б такое знайсці і з'есці. Елі нейкую траву, карэньчыкі, аблізвалі каменьчыкі. Нам вельмі хацелася пачаставаць чым-небудзь котку, але ў нас нічога не было, і мы кармілі яе сваёй слінай пасля абеду і! — яна ела. Яна ела! Памятаю, як мама аднойчы хацела даць мне цукерку. «Анечка, вазьмі цукерку!» — паклікала яна мяне праз дрот. Ахоўнікі яе адганялі... яна ўпала... яе цягнулі па зямлі за доўгія чорныя валасы... Мне было страшна, я ўяўлення не мела, што такое цукерка. Ніхто з дзяцей не ведаў, што такое цукерка. Усе спалохаліся і зразумелі, што мяне трэба схаваць, і запіхнулі ў сярэдзінку. Мяне заўсёды дзеці ставілі ў сярэдзінку: «Таму што Анечка ў нас падае». *(Плача.)* Незразумела чаму... плачу? Я ж усё... Я ўсё пра сваё жыццё ведаю... Ну вось... Забыла, пра што я? Думка не скончаная... Так? Не скончаная?

Страх быў не адзін... Было шмат страхаў, вялікіх і маленькіх. Мы баяліся расці, баяліся, што нам будзе пяць гадоў. У пяць гадоў вывозілі ў дзіцячы дом, мы разумелі, што гэта кудысьці далёка... далёка ад мамаў... Мяне, як цяпер памятаю, вывезлі ў дзіцячы дом нумар восем пасёлка нумар пяць. Усё было пад нумарамі, а замест вуліц — лініі: лінія першая, лінія другая... Нас пагрузілі ў грузавік і павезлі. Мамы беглі,

чапляліся за барты, крычалі, плакалі. Помню, што мамы плакалі заўсёды, а дзеці плакалі рэдка. Не былі мы капрызнымі, не дурэлі. Не смяяліся. Плакаць я навучылася ўжо ў дзіцячым доме. У дзіцячым доме нас вельмі моцна білі. Нам казалі: «Вас можна біць і нават забіць, таму што вашы мамы — ворагі». Татаў мы не ведалі. «Твая мама дрэнная», — не памятаю твару жанчыны, якая мне гэта паўтарала і паўтарала. — «Мая мама — добрая. Мая мама — прыгожая». — «Твая мама — дрэнная. Яна — наш вораг». Я не памятаю, ці вымаўляла яна само гэтае слова «забіць», але нешта такое… нейкія словы былі. Нейкія страшныя словы… Нейкія… так… Я нават баялася іх запомніць. У нас не было выхавальнікаў, настаўнікаў, такіх слоў мы не чулі, у нас былі камандзіры. Камандзіры! У іх у руках заўсёды доўгія лінаркі… Білі за штосьці і проста так… проста білі… Мне хацелася, каб мяне білі так, каб засталіся дзіркі, і тады перастануць біць. Дзірак у мяне не было, затое гнойныя свішчы пакрылі ўсё цела. Я ўзрадавалася… У маёй сяброўкі Волечкі былі металічныя скабкі на хрыбетніку, яе нельга было біць. Усе ёй зайздросцілі… *(Доўга глядзіць у акно.)* Я нікому гэта не расказвала. Я баялася… А чаго я баялася? Не ведаю… *(Задумваецца.)* Мы любілі ноч… Чакалі, каб хутчэй наступіла ноч. Цёмная-цёмная ноч. Уначы да нас прыходзіла цётка Фрося, начны вартаўнік. Яна была добрая, яна нам расказвала казку пра Алёнку і Чырвоны Каптурок, прыносіла ў кішэні пшанічку і давала па некалькі зярнятак таму, хто плакаў. Больш за ўсіх у нас плакала Лілечка, яна плакала раніцай, плакала ўвечары. У нас ва ўсіх была кароста, тоўстыя чырвоныя скулы на жываце, а ў Лілечкі пад пашкамі былі яшчэ пухіры, яны лопаліся гноем. Памятаю, што дзеці даносілі адно на аднаго, гэта заахвочвалася. Больш за ўсіх даносіла Лілечка… Казахскі клімат суровы — узімку сорак градусаў марозу, а ўлетку сорак градусаў спёкі. Лілечка памерла ўзімку. Калі б яна дажыла да травы… Увесну б яна не памерла… Не… *(Змаўкае на паўслове.)*

Нас вучылі… Больш за ўсё нас вучылі любіць таварыша Сталіна. Першы ў сваім жыцці ліст мы пісалі яму — у Крэмль. Гэта было так… Калі мы вывучылі літары, нам раздалі белыя аркушы, і пад дыктоўку мы пісалі ліст самаму добраму, улюбёнаму нашаму правадыру. Мы яго моцна любілі, верылі, што атрымаем адказ і што ён нам дашле падарункі. Шмат падарункаў! Глядзелі на ягоны партрэт, і ён нам здаваўся такім прыгожым. Найпрыгажэйшым на свеце! Мы нават спрачаліся, хто колькі гадоў свайго жыцця аддасць за адзін дзень жыцця таварыша Сталіна. На Першамай нам усім выдавалі чырвоныя сцяжкі, мы ішлі і радасна імі махалі. Ростам я была самая маленькая, стаяла ў канцы і заўсёды перажывала, што мне не дастанецца сцяжок. Раптам не хопіць! Нас увесь час вучылі, нам казалі: «Радзіма — гэта ваша маці! Радзіма — ваша мама!». А мы ва ўсіх дарослых, якіх сустракалі, пыталіся: «Дзе мая мама? Якая мая мама?» Ніхто не ведаў нашых мамаў… Першая мама прыехала да Рыты Мельнікавай. У яе быў цудоўны голас. Яна нам спявала калыханку: «Спі, мая радасць, засні. / У доме пагаслі агні… / Дзверы не рыпнуць нідзе, / Месяц між хмарак брыдзе…» Мы такой песні не ведалі, мы гэтую песню запомнілі. Прасілі: яшчэ, яшчэ. Я не памятаю, калі яна скончыла спяваць, мы заснулі. Яна нам казала, што нашы мамы добрыя, што нашы мамы прыгожыя. Усе мамы прыгожыя. Што нашы мамы ўсе спяваюць гэтую песню. Мы чакалі… Потым перажылі страшнае расчараванне — яна нам сказала няпраўду. Прыязджалі іншыя мамы, яны былі непрыгожыя, хворыя, яны не ўмелі спяваць. І мы плакалі… плакалі, рыдалі проста… Плакалі не ад радасці сустрэчы, а ад засмучэння. З таго часу я не люблю няпраўду… не люблю марыць… Нас нельга было суцяшаць няпраўдай, нельга было падманваць: твая мама жывая, а не памерла. Потым аказвалася… няма прыгожай мамы, ці ўвогуле мамы няма… Няма! Усе мы былі вельмі маўклівыя. Не памятаю нашых размоваў… памятаю дотыкі… Мая сяброўка Валя Кнорына да мяне дакранецца, і я ведаю, пра што

яна думае, таму што ўсе думалі пра адно і тое. Ведалі адно пра аднаго інтымныя рэчы: хто сікаецца ўначы, хто крычыць у сне, хто картавіць. Я ўвесь час лыжкай зуб сабе выпроствала. У адным пакоі — сорак жалезных ложкаў... Увечары — каманда: скласці далонькі — і пад шчаку, і ўсім — на правы бачок. Павінны былі рабіць гэта разам. Усе! Гэта была супольнасць, хай жывёльная, хай прусачыная, але мяне так выхавалі. Я да гэтага часу такая... *(Адварочваецца да акна, каб я не бачыла яе твару ў гэтыя хвіліны.)* Ляжым-ляжым ноччу і пачынаем плакаць... Усе разам: «Добрыя мамы ўжо прыехалі...» Адна дзяўчынка сказала: «Не люблю маму! Чаму яна так доўга да мяне не едзе?» Я таксама крыўдавала на сваю маму. А раніцай мы хорам спявалі... *(Адразу пачынае напяваць.)* «Сонца барвіць мяккім цветам / Мур спрадвечнага Крамля. / Прачынаецца з рассветам / Уся савецкая зямля...» Прыгожая песня. Для мяне яна і цяпер прыгожая.

Першага мая! Болей за ўсе святы на свеце мы любілі Першамай. У гэты дзень нам выдавалі новыя паліто і новыя сукенкі. Усе паліто аднолькавыя і ўсе сукенкі аднолькавыя. Ты пачынаеш іх абжываць, робіш метку, ну хоць бы нейкі вузельчык або складачку, што гэта тваё... частка цябе... Нам казалі, што Радзіма — гэта наша сям'я, яна пра нас думае. Перад першамайскай лінейкай выносілі ў двор вялікі чырвоны сцяг. Біў барабан. Адзін раз — дзіва! — прыязджаў да нас генерал і віншаваў. Усіх мужчын мы дзялілі на салдат і афіцэраў, а гэта быў генерал. Штаны з лампасамі. Лезлі на высокае падаконне, каб убачыць, як ён сядаў у машыну і махаў нам рукой. «Ты не ведаеш, што такое — тата?» — спытала ў мяне ўвечары Валя Кнорына. Я не ведала. І яна таксама. *(Маўчыць.)* Быў у нас Сцёпка... Рукі складзе, быццам ён з кімсьці ўдваіх, і кружыцца па калідоры. Сам з сабой танцуе. Нам смешна, а ён ні на каго не звяртаў увагі. А аднойчы раніцай ён памёр, не хварэў і памёр. Адразу памёр. Доўга яго не забывалі... Казалі, што тата ў яго быў вялікі вайсковы начальнік, вельмі вялікі,

таксама генерал. А потым і ў мяне з'явіліся пухіры пад пахай, яны лопаліся. І было так балюча, што я плакала. Ігар Каралёў пацалаваў мяне ў шафе. Мы вучыліся ў пятым класе. Я пачала папраўляцца. Выжыла… Зноў! *(Зрываецца на крык.)* Хіба гэта каму-небудзь цяпер цікава? Назавіце мне — каму? Нецікава і непатрэбна даўно. Краіны нашай няма і ніколі ўжо не будзе, а мы ёсць… старыя і агідныя… са страшнымі ўспамінамі і зацкаванымі вачыма… Мы ёсць! А што сёння засталося ад нашага мінулага? Толькі тое, што Сталін заліў гэтую зямлю крывёю, Хрушчоў саджаў на ёй кукурузу, а з Брэжнева ўсе смяяліся. А нашы героі? Пра Зою Касмадзям'янскую ў газетах сталі пісаць, што яна хварэла на шызафрэнію пасля перанесенага ў дзяцінстве менінгіту і мела жарсць падпальваць хаты. Псіхічна хворая. А Аляксандр Матросаў п'яны кінуўся на нямецкі кулямёт, а не ратаваў таварышаў. І Паўка Карчагін ужо не герой… Савецкія зомбі! *(Трохі супакоіўшыся.)* А мне дагэтуль сняцца лагерныя сны… Дагэтуль не магу спакойна на аўчарак глядзець… кожнага чалавека баюся ў вайсковай форме… *(Праз слёзы.)* Я так болей не магу… Адкрыла газ… уключыла ўсе чатыры фаеркі… Зачыніла форткі і зашморгнула наглуха шторы. У мяне нічога не засталося такога… каб… калі страшна паміраць… *(Маўчыць.)* Калі яшчэ нешта трымае… Ну… пах галоўкі маленькага дзіцяці… Нават дрэва пад акном у мяне няма… Дахі… дахі… *(Маўчыць.)* Паставіла букет кветак на стол… Уключыла радыё… І апошняе… Ляжу… ужо ляжу на падлозе… а думкі ўсе адтуль… Усё адно… Вось я выходжу за лагерныя вароты… вароты жалезныя, і яны з бразгатам за маёй спінай зачыняюцца. Я — вольная, мяне вызвалілі. Іду і ўгаворваю сябе: толькі не азірацца! Памірала ад страху, што нехта зараз мяне дагоніць і верне. Трэба будзе вяртацца. Прайшла трохі і бачу каля дарогі бярозку… простую бярозку… Падбягаю да яе, абдымаю, прыціскаюся ўсім целам, побач нейкі куст, я і яго абдымаю. Першы год было столькі шчасця… ад усяго! *(Доўга маўчыць.)* Суседка пачула

пах газу... Міліцыя ўзламала дзверы... Ачуняла я ў бальніцы, і першая думка: дзе я? Я зноў — у лагеры? Як быццам у мяне не было іншага жыцця, і нічога больш не было. Спачатку вярнуліся гукі... потым боль... Усё выклікала боль: кожны рух, глынуць паветра, паварушыць рукой, расплюшчыць вочы. Увесь свет — гэта было маё цела. Потым свет рассунуўся ўшыркі і ўвышкі: я ўбачыла медсястру ў белым халаце... белую столь... Я вельмі доўга вярталася. Побач са мной памірала дзяўчына, яна памірала некалькі дзён, ляжала ўся ў гэтых трубках, і ў роце трубка, нават крычаць яна не магла. Чамусьці яе нельга было выратаваць. І я глядзела на гэтыя трубкі і ўяўляла ў падрабязнасцях: вось гэта я ляжу... я памерла... але я не ведаю, што я памерла і мяне больш няма. Я ўжо пабывала там... *(Спынілася.)* Не надакучыла слухаць? Не? Скажыце... я магу змоўкнуць...

Мама... Мама па мяне прыехала, калі я пайшла ў шосты клас. Дванаццаць гадоў яна адседзела ў лагеры, тры гады мы былі разам, а дзевяць паасобку. Цяпер нас выпраўлялі на пасяленне і дазвалялі ехаць удзвюх. Гэта была раніца... Я ішла па двары... Хтосьці мяне паклікаў: «Анечка! Анютачка!» Ніхто мяне так не зваў, ніхто не зваў мяне па імені. Я ўбачыла жанчыну з чорнымі валасамі і закрычала: «Мама!» Яна абняла мяне з такім самым жахлівым крыкам: «Татачка!» — у юнацтве я была вельмі падобная да бацькі. Шчасце! Колькі розных пачуццяў, колькі радасці! Некалькі дзён я захлыналася ад шчасця, я ніколі больш не перажывала такога шчасця. Столькі розных пачуццяў... Але хутка... вельмі хутка выявілася, што мы з мамай не разумеем адна адну. Мы — чужыя людзі. Я хацела ўступіць у камсамол, каб змагацца з нейкімі нябачнымі ворагамі, якія хочуць зруйнаваць наша самае лепшае жыццё. А мама глядзела на мяне і плакала... і маўчала... Увесь час чагосьці баялася. У Карагандзе нам выдалі дакументы і накіравалі ў ссылку ў горад Бялова. Гэта далёка за Омскам. У самую глыбокую Сібір... Месяц мы туды ехалі. Ехалі і ехалі, чакалі

і перасядалі. Па дарозе адзначаліся ў НКВД, і нам увесь час загадвалі рухацца далей. Нельга пасяліцца ў памежнай паласе, нельга паблізу абаронных прадпрыемстваў, вялікіх гарадоў — такі доўгі-доўгі спіс, куды нам нельга. Дагэтуль я не магу бачыць вечаровыя агні ў дамах. Нас выганялі ўначы з вакзалаў, мы ішлі на вуліцу. Завея, мароз. Гарэлі агні ў вокнах, там былі людзі, яны жылі ў цяпле, яны грэлі гарбату. Нам трэба было пагрукаць у дзверы… гэта самае страшнае… Ніхто не хацеў пускаць начаваць… «Мы пахнем зэкамі…» — казала мама. *(Плача. І не заўважае, што плача.)* У Бялове сталі жыць «на кватэры» — у зямлянцы. Потым зноў жылі ў зямлянцы, і яна ўжо была наша. Я захварэла на сухоты, не магла ад слабасці стаяць на нагах, страшна кашляла. Верасень… Усе дзеці збіраюцца ў школу, а я не магу хадзіць. Мяне забралі ў бальніцу. Памятаю, што ў бальніцы ўвесь час нехта паміраў. Памерла Сонечка… Ванечка… памёр Славік… Мёртвых я не баялася, але я не хацела паміраць. Я вельмі прыгожа вышывала, малявала, усе хвалілі: «Якая таленавітая дзяўчынка. Табе трэба вучыцца». І я думала: тады чаму я мушу памерці? І нейкім дзівам я выжыла… Аднойчы расплюшчыла вочы: на тумбачцы стаяў букет чаромхі. Ад каго? Але зразумела, што буду жыць… Буду жыць! Вярнулася дадому — у зямлянку. Мама за гэты час перажыла чарговы інсульт. Я яе не пазнала… Убачыла старую жанчыну. У гэты ж дзень яе павезлі ў бальніцу. У доме я не знайшла ніякай ежы, нават паху. Сказаць каму-небудзь пра гэта пасаромелася… Знайшлі мяне на падлозе, я ледзь дыхала. Хтосьці прынёс конаўку цёплага казінага малака… Усё, усё… усё… Усё, што я памятаю пра сябе… як памірала і выжывала… памірала… *(Зноў адвярнулася да акна.)* Крыху паздаравела… Чырвоны Крыж купіў квіток, і мяне пасадзілі на цягнік. Адправілі ў родны Смаленск — у дзіцячы дом. Так я вярнулася дадому… *(Плача.)* Я не ведаю, чаму… чаму я плачу? Я ж усё… Усё… пра сваё жыццё ведаю… І там мне споўнілася шаснаццаць гадоў… У мяне з'явіліся сябры, да мяне пачалі заляцацца…

*(Усміхнулася.)* Прыгожыя хлопцы да мяне заляцаліся. Дарослыя. Але была ў мяне такая асаблівасць: калі я камусьці падабалася, я палохалася. Страшна, што нехта звярнуў на цябе ўвагу. Цябе заўважыў. Да мяне немагчыма было заляцацца, бо на спатканне я брала з сабой сяброўку. Калі мяне запрашалі ў кіно, я таксама ішла не адна. На першае спатканне да свайго будучага мужа я прыйшла з дзвюма сяброўкамі. Ён доўга пасля гэта ўспамінаў…

Дзень смерці Сталіна… Увесь дзіцячы дом вывелі на лінейку, вынеслі чырвоны сцяг. Колькі доўжылася пахаванне, столькі мы стаялі ў паставе «смірна», гадзін шэсць ці восем. Нехта губляў прытомнасць… Я плакала… Як жыць без мамы, я ўжо ведала. Але як жыць без Сталіна? Як жыць… Чамусьці я баялася, што пачнецца вайна. *(Плача.)* Мама… Праз чатыры гады… я ўжо вучылася ў архітэктурным тэхнікуме… вярнулася з ссылкі мама. Вярнулася назаўсёды. Прыехала яна з драўлянай валізкай, у ёй — цынкавая гусятніца (яна і цяпер у мяне захоўваецца, не магу выкінуць), дзве алюмініевыя лыжкі і куча падзертых панчох. «Ты — кепская гаспадыня, — сварылася на мяне мама, — не ўмееш цыраваць». Цыраваць я ўмела, але я разумела, што гэтыя дзіры на панчохах, якія яна прывезла, ніколі не зацыраваць. Ніякай рукадзельніцы! У мяне стыпендыя — васямнаццаць рублёў, у мамы пенсія — чатырнаццаць рублёў. Гэта быў для нас рай — хлеба еш, колькі хочаш, яшчэ хапала на гарбату. У мяне быў адзін спартовы касцюм і адна паркалёвая сукенка, якую сама пашыла. У тэхнікум узімку і ўвосені я хадзіла ў спартовым касцюме. І мне здавалася… такое ў мяне было ўяўленне… што ў нас усё ёсць. Калі я заходзіла ў нармальны дом, у нармальную сям'ю, сядзела ваўчком — навошта столькі рэчаў? Столькі лыжак, відэльцаў, кубкаў… Мяне бянтэжылі самыя простыя рэчы… найпрацейшыя… Навошта, напрыклад, дзве пары туфляў? Я дагэтуль да рэчаў абыякавая, да побыту. Нявестка ўчора тэлефануе: «Шукаю брунатную газавую пліту». Пасля рамонту яна падбірае

на кухню ўсё брунатнае: мэблю, фіранкі, посуд, каб як у імпартным часопісе. Гадзінамі вісіць на тэлефоне. Кватэра ў рэкламках і газетах, чытае ўсё, дзе «прадам-куплю». «І гэта хачу! І гэта...»! Раней ва ўсіх была простая абстаноўка, тады наогул жылі проста. А цяпер? Чалавек ператварыўся ў страўнік... У чэрава... Хачу! Хачу! Хачу! *(Махнула рукой.)* Я ў сына рэдка бываю... У іх там усё новае, дарагое. Як у офісе. *(Маўчыць.)* Чужыя мы... чужыя родныя... *(Маўчыць.)* Хачу ўспомніць маладую маму. Але маладую яе не памятаю... памятаю толькі хворую. Ні разу мы не абнялі адна адну, не пацалавалі, не было паміж намі пяшчотных слоў. Не памятаю... Нашы маці гублялі нас двойчы: першы раз — калі нас забіралі ў іх малымі, і другі раз — калі яны, старыя, вярталіся да нас, ужо дарослых. Дзеці былі чужыя... дзяцей ім падмянілі... Іх выхавала іншая маці: «Радзіма — ваша маці... Ваша мама...» «Хлопчык, дзе твой тата?» — «Яшчэ ў турме». — «А дзе твая мама?» — «Ужо ў турме». Сваіх бацькоў мы ўяўлялі толькі ў турме. Недзе далёка-далёка... ніколі побач... Адзін час я хацела ўцячы ад мамы назад у дзіцячы дом. Як гэта! Як гэта... Яна не чытала газет і не хадзіла на дэманстрацыі, не слухала радыё. Не любіла песні, ад якіх у мяне сэрца з грудзей выскоквала... *(Ціха напявае.)* «І варожай сіле не дабіцца, / Каб панікла твая галава. / Дарагая мая сталіца, / Залатая мая Масква...» А мяне цягнула на вуліцу. Я хадзіла на вайсковыя парады, любіла спартовыя святы. Дагэтуль памятаю гэты палёт! Ты крочыш разам з усімі, ты ўжо частка чагосьці вялікага... вялізнага... Там я была шчаслівая, а з мамай — не. І я гэта ніколі не папраўлю. Мама неўзабаве памерла. Я абдымала, гладзіла яе толькі мёртвую. Яна ўжо ляжала ў труне, і ўва мне прачнулася такая пяшчота! Такая любоў! Ляжала яна ў старых валёнках... Ні туфляў, ні басаножак у яе не было, а мае не налезлі на яе апухлыя ногі. Я ёй сказала столькі пяшчотных слоў, столькі прызнанняў — чула яна іх ці не чула? Цалавала і цалавала яе. Казала, як я яе люблю... *(Плача.)* Я адчувала, што яна яшчэ тут... Я верыла...

*Сыходзіць на кухню. Хутка кліча мяне: «Абед на стале. Я заўсёды адна,* а *хочацца хаця б паабедаць з кім-небудзь».*

Ніколі не трэба вяртацца… таму што… так… А як я бегла туды! Як хацела! Пяцьдзясят гадоў… пяцьдзясят гадоў я вярталася на тое месца… у думках днём і ноччу я там была…

Зіма… часцей зіма снілася… На двары такі мароз, што сабак не відаць і птушак. Паветра шкляное, і дым з трубы — слупом да неба. Ці канец лета — трава ўжо спынілася ў росце, пакрылася цяжкім пылам. І я… я надумала туды паехаць. Ужо — перабудова. Гарбачоў… мітынгі… Усе хадзілі па вуліцах. Радаваліся. Пішы, што хочаш, крычы, што хочаш і дзе хочаш. Сва-бо-да! Сва-бо-да! Што б нас ні чакала наперадзе, але мінулае скончылася. Чаканне чагосьці іншага… і нецярплівасць… І зноў страх. Доўгі час я баялася ўключаць раніцай радыё: а раптам усё скончылася? Адмянілі. Доўга не верыла. Прыйдуць ноччу і павязуць на стадыён. Як было ў Чылі… Аднаго стадыёна для «разумнікаў» хопіць, а астатнія самі змоўкнуць. Але не прыходзілі… не везлі… У газетах пачалі друкаваць успаміны гулагаўцаў. Іх фатаграфіі. Вочы! Якія там у людзей вочы! Глядзяць, нібы з таго свету… *(Маўчыць.)* І я вырашыла: хачу… я мушу туды паехаць! Навошта? Сама не ведаю… але я мушу… Узяла адпачынак… Першы тыдзень… другі… ніяк не наважуся, знаходжу ўсякія прычыны: то да зубнога мне трэба, то на балконе дзверы не дафарбавала. Лухта нейкая. Раніцай… гэта было раніцай… Фарбую балконныя дзверы і сама сабе кажу: «Заўтра еду ў Караганду». Вось так, уголас, памятаю, сказала — і зразумела, што паеду. Еду — усё! Што такое Караганда? Чысты, голы стэп на сотні кіламетраў, выгараў улетку. За Сталінам пабудавалі ў гэтым стэпе дзясяткі лагераў: Стэплаг, Карлаг, Алжыр… Пясчанлаг… Прывезлі сотні тысяч зэкаў… Савецкіх рабоў. А памёр Сталін, зруйнавалі баракі, знялі дрот — і атрымаўся горад. Горад Караганда… Я еду… Еду! Дарога доўгая… Пазнаёмілася ў цягніку з жанчынай… настаўніцай з Украіны. Яна шукала магілу свайго

бацькі і ехала ў Караганду другі раз: «Не бойся, — вучыла мяне. — Там ужо прывыклі, што нейкія дзіўныя людзі прыязджаюць з усяго свету і размаўляюць з камянямі». У яе быў з сабою ліст ад бацькі, адзіны ягоны ліст з лагера: «...лепш за чырвоны сцяг усё адно нічога няма...» Так ён заканчваўся... гэтымі словамі... *(Задумваецца.)* Гэтая жанчына... Яна расказвала, як бацька падпісаў паперу, што ён польскі шпіён. Следчы пераварочваў табурэтку, у адну з ножак забіваў цвік, саджаў на яго бацьку і круціў вакол восі. І так дамогся свайго: «Добра — шпіён». Следчы: «А чый шпіён?» Бацька, у сваю чаргу, спытаў: «А чые бываюць шпіёны?» Далі на выбар — нямецкі ці польскі. «Пішыце — польскі». Ведаў ён па-польску два словы: «дзенькуе бардзо» і «ўшыстко едно». Два словы... А я... Я нічога пра свайго бацьку не ведаю... Адзін раз мама прагаварылася... што быццам бы ён звар'яцеў ад катаванняў у турме. Увесь час там спяваў... У купэ з намі ехаў малады хлопец. Мы ўсю ноч гаварылі. Плакалі... А раніцай гэты хлопец паглядзеў на нас: «Жах! Трылер нейкі!» Гадоў яму васямнаццаць-дваццаць. Госпадзе! Столькі ўсяго перажылі, а расказаць няма каму. Расказваем адно аднаму...

Вось і Караганда... Нехта стаў жартаваць: «Вы-ыходзь! На выхад з рэчамі!» Хто смяецца, хто плача. На вакзале... першае, што пачула: «Шалава... курва... лягавыя...» Знаёмая мова зэкаў. Зараз жа я ўсе гэтыя словы ўспомніла... Зараз жа! У мяне — ліхаманка. Ніяк не магла суняць дрыготку ўнутры, колькі я там была, столькі ўнутры мяне ўсё дрыжэла. Сам горад, ясная рэч, чужы, але адразу за ім, за апошнімі дамамі, пачынаўся знаёмы пейзаж. Усё пазнала... Той самы сухі кавыль і белы пыл... і арол высока-высока ў небе... І назвы пасёлкаў на слыху — Вольны, Сангарадок... Усё былыя лагерныя паселішчы. Думала, не памятаю, а памятала. У аўтобусе сеў побач стары, зразумеў, што я не мясцовая: «Каго шукаеце?» — «Ды вось... — пачала. — Тут лагер быў...» — «А, баракі? Апошнія — два гады назад разабралі. З той барачнай

цэглы пабудавалі людзі сабе пунькі, лазні. Зямлю раздалі пад лецішчы. Агароды абгарадзілі лагерным дротам. У сына майго там участак... Так, ведаеце, непрыемна... На бульбяных градках увесну ад снегу і ад дажджоў вылазяць косткі. Ніхто не гідзіцца, бо прывыклі, уся зямля тут у костках, як у камянях. Скідаюць на мяжу, топчуць ботамі. Прытоптваюць. Прывыклі ўжо. Крані толькі чарназём... паварушы...» У мяне перахапіла дыханне. Як непрытомная. А стары павярнуўся да акна — паказвае: «Вунь там, за гэтай крамай, могілкі засыпалі. І за лазняй». Сяджу — не дыхаю. А чаго я чакала? Што тут піраміды будуць стаяць! Курганы Славы насыплюць?! «Лінія першая... цяпер вуліца імя... Другая лінія...» Гляджу ў акно — і не бачу, сляпая ад слёз. На прыпынках казашкі прадавалі гуркі, памідоры... парэчкі вёдрамі... «Толькі з градкі. Са сваіх агародаў». Госпадзе! Божа мой... трэба сказаць... што... Мне фізічна цяжка было дыхаць, нешта са мной там адбывалася. За некалькі дзён высахла ўся скура, сталі ламацца пазногці. Нешта рабілася з усім арганізмам. Упасці б на зямлю і ляжаць. Не падымацца. Стэп... ён — як мора... Ішла, ішла і нарэшце ўпала... Упала каля нейкага маленькага жалезнага крыжыка, які да самай перакладзіны ўрос у зямлю. Я крычала, у мяне была істэрыка. Вакол нікога... толькі птушкі... *(Пасля кароткага перапынку.)* Жыла ў гасцініцы. Увечары ў рэстаране дым карамыслам... гарэлка... Адзін раз я там вячэрала... За маім сталом заспрачаліся два мужчыны, спрачаліся да хрыпу... Першы: «Я дагэтуль застаюся камуністам. Мы павінны былі пабудаваць сацыялізм. Хто б Гітлеру хрыбет зламаў без Магніткі і Варкуты?» Другі: «А я з тутэйшымі старымі размаўляю... Яны ўсе ў лагеры служылі ці працавалі... не ведаю, як гэта назваць... кухары, вертухаі, асабісты. Іншай працы тут не было, а гэтая — сытая: заробак, паёк і абмундзіраванне. Так і кажуць — «работа». Лагер для іх — праца! Служба! А вы пра нейкія злачынствы. Пра душу і грэх. Не хто-небудзь сядзеў, а народ. І саджаў, і ахоўваў — таксама народ, не прышлы, не пакліканы аднекуль,

а гэты самы. Свой. Родны. Гэта цяпер усе надзелі паласатыя кашулькі. Усе — ахвяры. Вінаваты адзін Сталін. А вы падумайце... простая арыфметыка... Мільёны зэкаў трэба было высочваць, арыштоўваць, дапытваць, ганяць па этапе, страляць за крок убок. Хтосьці ж гэта рабіў... знайшліся мільёны выканаўцаў...» Афіцыянт прынёс ім адну пляшку, неўзабаве другую... Я слухала... слухала я! А яны пілі і не п'янелі. Я... як спаралізаваная сядзела і не магла сысці... Першы: «А мне распавядалі, што ўжо баракі стаялі пустыя. Зачыненыя. Але па начах вецер прыносіў адтуль крыкі і стогны...» Другі: «Містыка. Пачынаецца міфалогія. А ўся наша бяда ў тым, што ў нас каты і ахвяры — гэта тыя самыя людзі». І зноў: «Сталін прыняў Расію з сахой, а пакінуў з атамнай бомбай...» Я там не злажыла вачэй тры дні і тры ночы. Удзень хадзіла і хадзіла па стэпе. Поўзала. Да прыцемку, да агнёў.

Адзін раз падвёз у горад мужчына, гадоў пяцьдзясят яму, а можа, і больш, як і мне. Выпіўшы быў. Гаманкі. «Магілы шукаеце? Разумею, жывём на могілках, можна сказаць. А мы... Адным словам, у нас мінулае не любяць згадваць. Табу! Старыя памерлі, гэта нашы бацькі, а тыя, хто яшчэ жывы, маўчаць. У іх выхаванне, ведаеце, сталінскае. Гарбачоў, Ельцын... гэта сёння... А хто ведае, што будзе заўтра? Куды паверне...» Слова за слова, і я даведалася, што бацька ягоны быў афіцэр, «пры пагонах». Пры Хрушчове хацеў адсюль з'ехаць, але яму не дазволілі. Усе давалі падпіску аб неразгалашэнні дзяржаўнай таямніцы: і тыя, хто сядзеў, і тыя, хто саджаў. Ахоўваў. Нікога нельга было выпускаць, занадта яны ўсе шмат ведалі. Не выпускалі нават, чуў ён, тых, хто суправаджаў эшалоны з вязнямі. Быццам бы тут яны ўратаваліся ад вайны, але з вайны яны маглі вярнуцца, а адсюль ужо ніяк. Зона... сістэма... засоўвала іх у сябе незваротна. Адбыўшы тэрмін, з'ехаць з гэтых праклятых месцаў маглі толькі блатары і крымінальнікі. Бандыты. Астатнія жылі потым разам, бывала, што ў адным доме, у адным двары. «Эх, жыццё наша, бляшаначка!» — паўтараў.

Успомніў выпадак са свайго дзяцінства… Як «сядзельцы» змовіліся і задушылі былога вертухая… за тое, што звер быў… Нап'юцца, бойкі ўчынялі, ішлі адны на адных сценкай. Бацька піў па-чорнаму. Напіваўся і плакаў: «Маць вашу! Усё жыццё язык на прышчэпцы. Мы — пясочак дробненькі…» Ноч. Стэп. Удваіх едзем — дачка ахвяры і сын… як назваць… ката, ці што? Маленькага ката… Вялікія каты без маленькіх ніколі не абыходзяцца. Іх патрабуецца шмат, тых, хто брудную працу будзе рабіць… Ну, вось мы сустрэліся… І пра што размаўляем? Пра тое, што нічога пра сваіх бацькоў не ведаем, маўчалі яны да самай смерці. Знеслі свае таямніцы з сабой. Але, відаць, зачапіла я мужыка, развярэдзіла чымсьці моцна. Распавёў, што бацька ніколі не еў рыбу, бо рыба, казаў, чалавекам можа карміцца. Кінь голага чалавека ў моры, праз некалькі месяцаў толькі чысценькія косткі застануцца. Беленькія. Ведаў ён гэта… адкуль? Калі быў цвярозы, маўчаў, а п'яны кляўся, што паўсюль працаваў на папяровай пасадзе. Рукі ў яго чыстыя… Хацелася б сыну ў гэта верыць. А чаго рыбу тады не еў? Млосна яму было ад рыбы… Пасля смерці бацькі знайшоў ён дакументы, што некалькі гадоў служыў той каля Ахоцкага мора. Там таксама былі лагеры… *(Маўчыць.)* П'яны… разбалбатаўся… І глядзіць — глядзіць так на мяне, нават працверазеў. Працверазеў і спалохаўся. Я зразумела — спалохаўся. Штосьці раптам злоснае крыкнуў… у такім духу, што хопіць, маўляў, выкопваць мерцвякоў! Хопіць! Я зразумела… У іх… у дзяцей… ніхто падпіску не браў, але яны самі разумелі, што трэба трымаць язык за зубамі. На развітанне працягнуў руку. А я рукі не падала… *(Заплакала.)*

Я шукала да апошняга дня, шукала… І ў апошні дзень мне падказалі: «Схадзіце да Кацярыны Дзямчук. Старой хутка дзевяноста, а ўсё памятае». Правялі, паказалі. Я ўбачыла цагляны дом з высокім плотам. Пастукала ў весніцы… Выйшла яна… старая-старая… паўсляпая. «Мне сказалі, што вы ў дзіцячым доме працавалі?» — «Я была настаўніца». — «У нас

настаўнікаў не было, а былі камандзіры». Нічога не адказала. Адышла і палівае са шланга градкі. А я стаю... не сыходжу... не сыходжу я! Тады яна неахвотна правяла мяне ў дом: у святліцы — крыж з распятым Хрыстом, у куце абразок. Я ўспомніла голас... твар не ўзгадала, а голас... «Твая мама — вораг. Вас можна біць і нават забіць». Я пазнала яе! Ці вельмі хацела пазнаць? Магла не пытацца, але я спытала: «Можа, памятаеце мяне? Можа...» — «Не-не... нікога не памятаю. Маленькія вы былі, усе дрэнна раслі. А мы дзейнічалі паводле інструкцыі». Паставіла гарбату, прынесла коржыкі... Я сядзела і слухала яе скаргі: сын алкаголік, і ўнукі п'юць. Муж даўно памёр, пенсія маленькая. Спіна баліць. Жыць у старасці сумна. Ну вось! Я падумала: ну вось... вось... І вось! Праз пяцьдзясят гадоў сустрэліся... Я ўявіла, што гэта яна... уявіла сабе... Сустрэліся — і што? І ў мяне — мужа няма, пенсія маленькая. Спіна баліць. Старасць і больш нічога. *(Доўга маўчыць.)*

Назаўтра я з'ехала... Што засталося? Неўразуменне... і крыўда... Толькі не ведаю — на каго? А стэп сніцца і сніцца, то ён сніцца мне ў снезе, то ў чырвоных маках. У адным месцы, дзе стаялі баракі — кавярня, у іншым — лецішчы. Каровы пасвяцца. Не трэба было вяртацца. Не! Так горка плачам, так пакутуем — а навошта? Навошта ўсё было? Ну яшчэ дваццаць... пяцьдзясят гадоў пройдзе... і затопчуць усё ў прах, як быццам нас і не было. Застануцца два радкі ў падручніку гісторыі. Абзац. Ужо мода на Салжаніцына мінае і на гісторыю паводле Салжаніцына. Раней за «Архіпелаг ГУЛАГ» саджалі ў турму. Чыталі ўпотай, перадрукоўвалі на машынцы, перапісвалі ад рукі. Я верыла... верыла, што калі тысячы людзей прачытаюць, то ўсё пераменіцца. Прыйдзе пакаянне, будуць слёзы. А што выйшла? Усё, што пісалі ў стол, надрукавалі, усё, што таемна думалі, сказалі. І?! Ляжаць гэтыя кнігі на кніжных развалах пад пылам. А людзі бягуць міма... *(Маўчыць.)* Мы ёсць... і нас няма... Нават вуліцы, на якой я раней жыла, ужо няма. Была вуліца Леніна. Ужо ўсё іншае: рэчы, людзі, грошы.

Новыя словы. Былі «таварышы», цяпер «спадары», але нешта «спадары» ў нас дрэнна прыжываюцца. Усе шукаюць у сябе дваранскія карані. Модна! Аднекуль зноў узяліся князі і графы. А раней ганарыліся, што з рабочых і сялян. Хрысцяцца ўсе і посцяць. Абмяркоўваюць сур'ёзна — уратуе Расію манархія ці не ўратуе? Любяць цара, з якога ў сямнаццатым годзе кожная курсістка смяялася. Чужая мне краіна. Чужая! Раней, калі госці збіраліся, мы абмяркоўвалі кнігі, спектаклі... А цяпер: хто што купіў? Курс валюты? І анекдоты. Нічога не шкада, з усяго можна пасмяяцца. Усё смешна. «Тата, а хто такі Сталін?» — «Сталін быў наш правадыр». — «А я думаў, што правадыры бываюць толькі ў дзікуноў». У армянскага радыё пытаюцца: «Што засталося ад Сталіна?» Армянскае радыё адказвае: «Ад Сталіна засталіся дзве змены споднягa, пара ботаў, некалькі кіцеляў, адзін з іх святочны, чатыры рублі і сорак капеек савецкіх грошай. І гіганцкая імперыя». Другое пытанне: «Як рускі салдат да Берліна дайшоў?» — «А рускі салдат не такі смелы, каб адступаць». Я перастала хадзіць у госці. І на вуліцу рэдка выходжу. Што я там убачу? Свята Мамоны! Не засталося ніякіх каштоўнасцяў, акрамя каліты. А я? Я — бедная, мы ўсе — жабракі. Усё маё пакаленне... былыя савецкія людзі... Ні рахункаў, ні нерухомасці. Рэчы ў нас таксама савецкія — капейкі ніхто не дасць. Дзе наш капітал? Усё, што ў нас ёсць, гэта — нашы пакуты, тое, што мы перажылі. У мяне — дзве даведкі на звычайных лісточках з вучнёўскага сшытка: «...рэабілітаваны...» і «...рэабілітаваная... у сувязі з адсутнасцю складу злачынства...» На тату і на маму. Калісьці... калісьці я ганарылася сынам... Вайсковы лётчык, служыў у Афганістане. Цяпер... ён на рынку гандлюе... Маёр. Два баявыя ордэны! Крамнік! Раней гэта называлася спекуляцыяй, а сёння бізнэсам. У Польшчу — гарэлку і цыгарэты, лыжы, а назад — анучы. Барахло! У Італію — бурштын, адтуль — сантэхніку: унітазы, краны, вантузы. Цьфу! У нашай сям'і зроду не было спекулянтаў гандляроў! Імі пагарджалі! Няхай я абломак «саўка»... але гэта лепш, чым купі-прадай...

Вось… я вам прызнаюся… Раней людзі мне падабаліся больш… Тыя людзі… яны былі свае… З той краінай я пражыла ўсю яе гісторыю. А да гэтай, што цяпер, я абыякавая, яна не мая. *(Бачу — стамілася. Выключаю дыктафон. Аддае мне лісток з тэлефонам сына.)* Вы прасілі… Сын раскажа… у яго сваё… свая гісторыя… Я ведаю, паміж намі бездань… Я ведаю… *(Праз слёзы.)* А цяпер пакіньце мяне. Я хачу быць адна.

### *Сын*

*Ён доўга не дазваляў уключыць дыктафон. Потым нечакана сам прапанаваў: «А вось гэта запішыце… Тут ужо — гісторыя, а не сямейныя канфлікты — бацькі і дзеці. Прозвішча не называйце. Я не баюся, але мне непрыемна».*

…Вам усё вядома… Але… што мы можам сказаць пра смерць? Нічога ўцямнага… І-і… а-а… о-о! Абсалютна незнаёмае пачуццё…

…Дагэтуль мне падабаюцца савецкія фільмы, ёсць у іх штосьці такое, чаго не знойдзеш у сучасных фільмах. Я гэтае «штосьці» таксама любіў. Любіў з дзяцінства. А што — не сфармулюю. Захапляўся гісторыяй, шмат чытаў, усе тады шмат чыталі, я чытаў пра чалюскінцаў і Чкалава… пра Гагарына і Каралёва… але я доўга нічога не ведаў пра 37-ы год. Аднойчы спытаў у маці: «Дзе памёр наш дзядуля?» — яна страціла прытомнасць. Бацька сказаў: «Ніколі больш маму пра гэта не пытай». Я быў акцябронкам, піянерам, не важна, верыў я ў гэта ці не. Можа, і верыў? Хутчэй не задумваўся… Камсамол. Песні каля вогнішча: «Калі друг твой, глядзіш, не друг / І не вораг табе, а так…» І далей… *(Закурвае.)* Мара? Марыў быць вайскоўцам. Лётаць! Прэстыжна, прыгожа. Усе дзяўчаты марылі выйсці замуж за вайскоўца. Улюбёны пісьменнік — Купрын. Афіцэр! Прыгожая форма… Геройская смерць! Мужчынскія

п'янкі. Сяброўства. Гэта было прывабна, прымалася з юначым захапленнем. І бацькі падтрымлівалі. Мяне выхоўвалі на савецкіх кніжках: «чалавек найперш», «чалавека немагчыма», «чалавек — гэта гучыць годна». Расказвалі пра чалавека, якога няма… у прыродзе яго няма… Я дагэтуль не разумею, чаму ў той час было столькі ідэалістаў? А цяпер яны зніклі. Які ідэалізм у пакалення пэпсі? Прагматыкі. Скончыў вайсковае вучылішча і служыў на Камчатцы. Каля мяжы. Там, дзе толькі снег і сопкі. Адзінае, што мне заўсёды падабалася ў маёй краіне — гэта прырода. Краявід. Гэта — так! Праз два гады паслалі ў вайсковую акадэмію — скончыў з адзнакай. Чарговыя зорачкі! Кар'ера! Пахавалі б на лафеце з салютам… *(З выклікам.)* А цяпер? Перамена дэкарацый… З савецкага маёра атрымаўся бізнэсмен. Гандлюю італьянскай сантэхнікай… Напрарочыў бы мне гэта хтосьці дзесяць гадоў таму, я б гэтага настрадамуса нават біць не стаў — пасмяяўся б з жарту. Я быў абсалютна савецкі — любіць грошы сорамна, любіць трэба мару. *(Закурвае і маўчыць.)* Шкада… забываецца многае… забываецца, таму што занадта хутка ўсё адбываецца. Калейдаскоп. Спачатку я палюбіў Гарбачова, потым у ім расчараваўся. Хадзіў на дэманстрацыі і гарлаў разам з усімі: «Ельцын — так! Гарбачоў — не!» Крычаў: «Шосты артыкул — дало-о-оў!» І нават расклейваў нейкія ўлёткі. Гаварылі і чыталі, чыталі і гаварылі. Чаго мы хацелі? Нашы бацькі хацелі ўсё выказаць і ўсё прачытаць. Яны марылі жыць пры гуманным сацыялізме… з чалавечым тварам… А маладыя? Мы… Мы таксама марылі пра свабоду. Але што гэта такое? Адны тэорыі… Хацелі жыць як на Захадзе. Слухаць іх музыку, гэтаксама апранацца, ездзіць па свеце. «Перамен патрабуюць нашыя сэрцы…» — спяваў Віктар Цой. Куды несліся — не разумелі. Усе марылі… А ў прадуктовых крамах стаялі адны трохлітровыя слоікі з бярозавым сокам і марынаванай капустай. Пачкі лаўровага ліста. Талоны на макарону, алей, крупы… на тытунь… У чарзе па гарэлку маглі забіць! Але надрукавалі забароненага

Платонава... Гросмана... Вывелі войскі з Афганістана. Я застаўся жывы, я думаў, што мы ўсе, хто там быў, — героі. Вярнуліся на Радзіму, а Радзімы няма! Замест Радзімы — новая краіна, пляваць ёй на нас! Армія развальвалася, вайскоўцаў сталі ачарняць, ганіць. Забойцы! З абаронцаў ператварыліся ў забойцаў. На нас павесілі ўсё: і Афганістан, і Вільню, і Баку. Усю кроў. Увечары хадзіць па горадзе ў вайсковай форме было небяспечна, маглі пабіць. Людзі злыя, бо — ні ежы, ні рэчаў. Ніхто нічога не разумее. У палку ў нас самалёты не лёталі — не было паліва. Экіпажы сядзелі на зямлі — і ў карты рэзаліся, гарэлку жэрлі. На афіцэрскі заробак можна было купіць дзесяць боханаў хлеба. Адзін сябар застрэліўся... другі... Сыходзілі з войска, разбягаліся хто куды. Ва ўсіх — сем'і... у мяне — двое дзяцей, сабака і кот... Як жыць? Сабаку перавялі з мяса на тварог, самі тыднямі елі адну кашу. Усё гэта з памяці сціраецца... Так, трэба запісваць, пакуль нехта яшчэ нешта памятае. Афіцэры... Мы па начах разгружалі вагоны, працавалі вартаўнікамі. Асфальт залівалі. Разам са мной гарбаціліся кандыдаты навук, лекары, хірургі. Нават піяніста з філармоніі памятаю. Я навучыўся класці керамічную плітку і ўсталёўваць браняваныя дзверы. І гэтак далей... далей... Пачаўся бізнэс... хто вёз камп'ютары... хто джынсы «варыў»... *(Смяецца.)* Двое дамаўляюцца: адзін купляе цыстэрну віна, другі прадае. Па руках! Адзін ідзе шукаць грошы, а другі думае, дзе знайсці цыстэрну віна? І анекдот, і праўда. Да мяне таксама такія прыходзілі: красоўкі драныя, а прадавалі верталёт... *(Паўза.)*

Але мы выжылі! Выжылі... І краіна выжыла! А што мы ведаем пра душу? Толькі тое, што яна ёсць. Я... мае сябры... у нас усё нармальна... У аднаго — будаўнічая фірма, у другога — прадуктовая крамка — сыр, мяса, каўбасы, трэці мэбляй гандлюе. У кагосьці капітал за мяжой, у кагосьці дом на Кіпры. Адзін — былы кандыдат навук, другі — інжынер. Разумныя, адукаваныя людзі. Гэта ў газетах малююць «новага рускага» з залатым ланцугом кілаграмаў на дзесяць, у машыне

ў яго бампер залаты, а колы срэбныя. Фальклор! У паспяховым бізнэсе ёсць усе хто заўгодна, толькі не дурні. Ну вось, мы збяромся... Прыносім дарагі каньяк, але п'ём гарэлку. П'ём гарэлку і пад раніцу п'яныя абдымаемся і гарлаем камсамольскія песні: «Камсамольцы — дабравольцы... / Мы патужныя нашым сяброўствам...». Успамінаем, як студэнтамі ездзілі «на бульбу» і смешныя выпадкі з армейскага жыцця. Успамінаем, карацей, савецкі час. Разумееце? А сканчаюцца размовы заўсёды так: «Бясчынства сёння. Сталін нам патрэбны». Хоць у нас, кажу вам, усё добра. Што гэта? Узяць мяне... Для мяне сёмага лістапада — свята. Я святкую нешта вялікае. Мне яго шкада, нават вельмі шкада. Калі шчыра... З аднаго боку, настальгія, а з другога боку, страх. Усе хочуць з'ехаць, зваліць з краіны. Зарабіць «бабкі» — і зваліць. А нашы дзеці? Усе мараць вывучыцца на бухгалтараў. А спытайце ў іх пра Сталіна... Начыста адсекла! Прыблізнае ўяўленне... Я даў сыну пачытаць Салжаніцына — ён увесь час смяяўся. Чую — смяецца! Для яго абвінавачанне, што чалавек быў агентам трох разведак, ужо смешна. «Тата... Ніводнага пісьменнага следчага, у кожным слове — арфаграфічная памылка. Нават слова расстраляць яны пішуць няправільна...» Ён ніколі не зразумее мяне і маю маці, таму што ён ні дня не жыў у савецкай краіне. Я... і мой сын... і мая маці... Мы ўсе жывём у розных краінах, хаця ўсё гэта — Расія. Але мы неверагодна адзін з адным звязаныя. Неверагодна! Усе адчуваюць сябе падманутымі...

...Сацыялізм — гэта алхімія. Алхімічная ідэя. Ляцелі наперад, а прыехалі невядома куды. «Да каго звярнуцца, каб уступіць у камуністычную партыю?» — «Да псіхіятра». А ім... нашым бацькам... маёй маці... хочацца пачуць, што яны пражылі вялікае і не бяздарнае жыццё і верылі ў тое, у што варта верыць. А што яны чуюць? Яны чуюць з усіх бакоў, што іх жыццё поўнае гаўно, і ў іх нічога не было, акрамя іх жахлівых ракет і танкаў. Гатовыя былі адбіцца ад любога ворага. І адбіліся б! Але без усялякай вайны ўсё абрынулася. Ніхто

не можа зразумець — чаму? Тут трэба думаць… А думаць не вучылі. Усе памятаюць толькі страх… і гавораць пра страх… Я недзе чытаў, што страх — гэта таксама форма любові. Здаецца, гэтыя словы належаць Сталіну… Сёння ў музеях пуста… А цэрквы поўныя, бо ўсім нам патрэбныя псіхатэрапеўты. Псіхатэрапеўтычныя сеансы. Вы думаеце, Чумак і Кашпіроўскі лечаць цела? Яны лечаць душу. Сотні тысяч людзей сядзяць каля тэлевізара і слухаюць іх, як загіпнатызаваныя. Гэта — наркотык! Страшэннае пачуццё адзіноты… пакінутасці… Ва ўсіх — ад таксіста і клерка ў офісе да народнага артыста і акадэміка. Усе ўтрапёна самотныя. І гэтак далей… так… Жыццё цалкам змянілася. Свет цяпер падзяліўся па-іншаму: не на «белых» і «чырвоных», не на тых, хто сядзеў і хто саджаў, хто чытаў Салжаніцына і хто яго не чытаў, а на тых, хто можа купіць і хто не можа. Вам гэта не падабаецца? Не падабаецца… ясная рэч… І мне… не падабаецца… Вы і нават я… мы былі рамантыкамі… А наіўныя шасцідзясятнікі? Секта сумленных людзей… Верылі, што камунізм лясне і рускі чалавек адразу ж кінецца вучыцца свабодзе, а ён кінуўся вучыцца жыць. Жыць! Усё пакаштаваць, лізнуць, адкусіць. Вось смачная ежа, вось моднае адзенне… падарожжы… Ён захацеў убачыць пальмы і пустыню. Вярблюдаў… А не гарэць і згараць, не бегчы ўвесь час кудысьці з паходняй і сякерай. Не, проста жыць, як іншыя жывуць… У Францыі і Манака… Бо можна ж і не паспець! Далі зямлю, але могуць забраць, дазволілі гандляваць, але могуць пасадзіць. І фабрыку адбяруць, і крамку. Свідруе гэты страх у мазжачку. Дзіравіць. Якая гісторыя?! Трэба хутчэй грошы зарабляць. Ніхто не думае ні пра што такое вялікае… грандыёзнае… Аб'еліся вялікім! Хочацца чалавечага. Нармальнага. Звычайнага… ну звычайнага, разумееце! А пра вялікае можна ўспомніць так… пад гарэлачку… Першыя ў космас паляцелі… І танкі кляпалі найлепшыя ў свеце, але не было пральнага парашку і туалетнай паперы. Гэтыя праклятыя ўнітазы заўсёды цяклі! Поліэтыленавыя пакеты мылі

і сушылі на балконе. А відэамагнітафон у хаце быў чымсьці накшталт персанальнага верталёта. Хлопец у джынсах — не зайздрасць да яго, а дэкаратыўная цікавасць... Экзотыка! Вось яна — плата! Гэта была плата за ракеты і касмічныя караблі. За вялікую гісторыю! *(Паўза.)* Я вам тут нагаварыў... Усе сёння хочуць гаварыць, але ніхто адно аднаго не чуе...

...У бальніцы... побач з маці ляжала жанчына... Калі я заходзіў у палату, то спачатку бачыў гэтую жанчыну. Адзін раз я назіраў, як яна хацела нешта сказаць сваёй дачцэ — не змагла: м-ма... м-му... Прыйшоў муж, яна паспрабавала гаварыць з ім — не атрымалася. Павярнулася да мяне: м-ма... І тады яна дацягваецца да сваёй мыліцы і, разумееце, пачынае біць ёю па кропельніцы. Па ложку... Яна не адчувала, што яна б'е... рве... Яна хацела гаварыць... Ну а з кім сёння можна пагаварыць? Скажыце мне — з кім? А чалавек у пустаце жыць не можа...

...Я ўсё жыццё любіў свайго бацьку... Ён старэйшы за маці на пятнаццаць гадоў, быў на вайне. Але вайна яго не раздушыла, як іншых, не прывязала да сябе, як да самай значнай падзеі жыцця. Дагэтуль ходзіць на паляванне, рыбалку. Танцор. Два разы быў жанаты, і абодва разы з прыгожымі жанчынамі. Дзіцячы ўспамін... Ідзём у кіно, бацька мяне спыняе: «Паглядзі, якая ў нас мама прыгожая!» У яго ніколі не было жывёльнага гонару вайны, які ёсць у мужчын, што ваявалі: «Стрэліў. Завaліў. Мяса з яго палезла, як з мясарэзкі». Успамінае нейкія бясскрыўдныя рэчы. Глупствы. Як у Дзень Перамогі яны з сябрам пайшлі ў вёску да дзевак і ўзялі ў палон двух немцаў. Тыя ў вясковы сарцір залезлі, у яму па горла. Расстраляць шкада! — вайна ж скончылася. Настраляліся. А падысці блізка немагчыма... Бацьку пашанцавала: на вайне маглі забіць — не забілі, да вайны маглі пасадзіць — не пасадзілі. У яго быў старэйшы брат — дзядзька Ваня. У таго інакш усё склалася — у яжоўскія... трыццатыя... саслалі на руднікі пад Варкуту. Дзесяць гадоў без права перапіскі. Жонка, зацкаваная калегамі на працы, выкінулася з пятага паверха. Сын рос з бабуляй. Але дзядзька

Ваня вярнуўся… Вярнуўся з усохлай рукою, без зубоў і з раздзьмутай пячонкай. Стаў зноў працаваць на сваім заводзе, на той самай пасадзе, і сядзеў ён у тым самым кабінеце, за тым самым сталом… *(Зноў закурвае.)* А насупраць яго сядзеў той, хто на яго данёс. Усе ведалі… і дзядзька Ваня ведаў, што той данёс… Як і раней, яны хадзілі на сходы і дэманстрацыі. Чыталі газету «Правда», ухвалялі палітыку партыі і ўрада. На святы пілі гарэлку за адным сталом. І гэтак далей… Гэта — мы! Наша жыццё! Мы такія… Уявіце сабе ката і ахвяру Асвенціма, якія сядзяць у адным кабінеце і ў адным акенцы бухгалтэрыі атрымліваюць заробак. З аднолькавымі ордэнамі пасля вайны. А цяпер і з аднолькавымі пенсіямі… *(Маўчыць.)* Я сяброую з сынам дзядзькі Вані. Ён не чытае Салжаніцына, і ніводнай кнігі пра лагер у ягоным доме няма. Сын чакаў бацьку, але вярнуўся хтосьці іншы… вярнуўся чалавечы абломак… Скамечаны, сагнуты. Неўзабаве згас. «Ты не ведаеш, як можна баяцца, — казаў ён сыну. — Ты не ведаеш…» У яго на вачах следчы… здаравенны мужык… сунуў у парашу галаву чалавека і трымаў там, пакуль той не захлынуўся. А дзядзьку Ваню… яго голага падвешвалі да столі, а ў нос, у рот — ва ўсе дзіркі, якія ў нас ёсць, залівалі нашатырны спірт. Следчы мачыўся яму ў вуха і крычаў: «Ты разумных… разумных успамінай!» І дзядзька Ваня ўспамінаў… Усё падпісаў. А не ўспомніў бы і не падпісаў — і яго б галавой у парашу. Потым ён некаторых з тых, каго ўспомніў, там, у бараках, сустрэў… «Хто данёс?» — гадалі яны. Хто данёс? Хто… Я — не суддзя. І вы не суддзя. Дзядзьку Ваню прыносілі ў камеру на насілках, мокрых ад крыві і мачы. Ва ўласным гаўне. Я не ведаю, дзе чалавек канчаецца… А вы ведаеце?

…Старых нашых шкада, вядома… Пустыя пляшкі на стадыёнах збіраюць, ноччу ў метро цыгарэтамі гандлююць. На сметніках корпаюцца. Але старыя нашы не бязвінныя… Страшная думка! Крамольная. Самому страшна. *(Маўчыць.)* Але я пра гэта ніколі не змагу паразмаўляць са сваёй маці… Я спрабаваў… Істэрыка!

*Хоча скончыць размову, але чамусьці перадумвае.*

...Калі б я дзесьці гэта прачытаў або ад кагосьці пачуў — не паверыў бы. А ў жыцці бывае... бывае, як у дрэнным дэтэктыве... Сустрэча з Іванам Д... Патрэбнае прозвішча? Навошта? Яго ўжо няма. А дзеці? Сын за бацьку не адказвае — старая прымаўка... Дый сыны, яны таксама цяпер старыя. Унукі, праўнукі? Пра ўнукаў не скажу, а праўнукі... яны ўжо не ведаюць, хто такі Ленін... Дзядуля Ленін забыты. Ён ужо помнік. *(Паўза.)* Дык вось, пра сустрэчу... Я толькі атрымаў лейтэнанта, збіраўся ажаніцца... З ягонай унучкай. Ужо мы заручальныя пярсцёнкі набылі і сукенку для нявесты. Ганна... так яе звалі... прыгожае імя, праўда? *(Чарговая цыгарэта.)* Яна была ўнучкай... абажанай унучкай... Усе ў доме яе жартаўліва звалі «Абажаба». Яго выдумка... Ну гэта значыць што абажаная... І падобная яна была да яго, знешне — дык нават вельмі. Я з нармальнай савецкай сям'і, дзе ўсё жыццё цягнулі ад заробку да заробку, а ў іх — крышталёвыя жырандолі, кітайскі фарфор, дываны, навюткія «Жыгулі». Усё — шык! Была і старая «Волга», якую ён не хацеў прадаваць. І гэтак далей... Я ўжо жыў у іх, раніцай у сталовым пакоі пілі гарбату ў срэбных падшклянках. Сям'я вялікая — зяці, нявесткі... Адзін зяць — прафесар. Калі стары на яго злаваўся, заўсёды прамаўляў адну і тую ж фразу: «Ды я такіх... Яны сваё гаўно ў мяне елі...» Ну так... штрых... Але я тады не разумеў... Не разумеў! Потым успомніў... пасля... Да яго прыходзілі піянеры, запісвалі ўспаміны, узялі ягоныя фатаграфіі для музея. Пры мне ён ужо хварэў, сядзеў дома, а раней выступаў у школах, чырвоныя гальштукі выдатнікам завязваў. Ганаровы ветэран. Кожнае свята ў паштовай скрынцы — вялікая віншавальная паштоўка, кожны месяц — прадуктовы спецпаёк. Адзін раз я паехаў з ім па гэты паёк... У нейкім сутарэнні нам выдалі: палку сервелату, слоік марынаваных балгарскіх гуркоў і таматаў, імпартныя рыбныя кансервы, венгерскую вяндліну ў бляшанцы, зялёны гарошак, печань траскі... Па тых часах

усё — дэфіцыт! Прывілей! Мяне ён прыняў адразу: «Люблю вайскоўцаў і пагарджаю “пінжакамі”». Паказаў сваю дарагую паляўнічую стрэльбу: «Табе пакіну». На сценах па ўсёй велізарнай кватэры віселі аленевыя рогі, на кніжных паліцах сталі пудзілы. Паляўнічыя трафеі. Быў заўзяты паляўнічы, гадоў дзесяць узначальваў гарадское таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Што яшчэ? Распавядаў шмат пра вайну… «У баі па далёкай цэлі страляць — гэта адно… Усе страляюць… А вось так… вывесці чалавека на расстрэл. Чалавек стаіць за тры метры…» Заўсёды што-небудзь такое вычварыць… Сумна з ім не было, стары мне падабаўся.

Я прыехаў у адпачынак… Вяселле вось-вось. Сярэдзіна лета. Жылі ўсе на вялікім лецішчы. Лецішчы са старых… Не казённыя чатыры соткі зямлі, я ўжо дакладна не памятаю, колькі, але там і кавалак лесу быў. Старыя сосны. Вялікім чынам такія лецішчы давалі. За асаблівыя заслугі. Акадэмікам і пісьменнікам. І вось яму… Прачнуся — стары ўжо на гародзе: «Душа ў мяне сялянская. Я ў Маскву з Цверы ў лапцях прыйшоў». Увечары часта сядзеў адзін на тэрасе і курыў. Сакрэту ад мяне не было: яго выпісалі з бальніцы паміраць — неаперабельны рак лёгкіх. Курыць не кінуў. З бальніцы вярнуўся з Біблiяй: «Усё жыццё быў матэрыялістам, а перад смерцю вось да Бога прыйшоў». Біблію падаравалі манашкі, якія даглядалі ў лякарні цяжкахворых. Чытаў з лупай. Да абеду чытаў газеты, пасля абедзеннага сну ваенныя мемуары. Сабраў цэлую бібліятэку мемуараў: Жукаў, Ракасоўскі… Сам любіў успамінаць… Як бачыў жывога Горкага і Маякоўскага… чалюскінцаў… Часта паўтараў: «Народ хоча любіць Сталіна і святкаваць Дзявятага мая». Я спрачаўся з ім: пачалася перабудова… вясна рускай дэмакратыі… Зялёны я быў! Засталіся неяк з ім удвох — усе з’ехалі ў горад. Два мужчыны на пустым лецішчы. Графін гарэлкі. «Пляваць мне на дактароў! Я ўжо пажыў». — «Наліць?» — «Налівай». І паехала… Да мяне не адразу дайшло… Не адразу я зразумеў, што тут патрэбны святар. Чалавек думае

пра смерць... Не адразу... Спачатку ішла звычайная для тых гадоў размова: сацыялізм, Сталін, Бухарын... палітычны запавет Леніна, які Сталін схаваў ад партыі... Пра ўсё, што было на слыху, у газетах. Выпілі. До-обра выпілі! Чагосьці ён завёўся: «Смаркач! Молада-зелена... Ты мяне паслухай! Нельга нашаму чалавеку даваць свабоду. Усё прасера! Зразумеў?!» — І мат. Рускі чалавек не можа пераканаць іншага рускага чалавека без мату. Мат я прыбіраю. — «Ты слухай...» Я... вядома... я... У мяне шок! Шок! А ён разгаварыўся: «У кайданкі і на лесапавал гэтых гарлапанаў. Кайло — у рукі. Страх патрэбны. Без страху ў нас усё ўмомант развaліцца». *(Доўгая паўза.)* Мы думаем, што пачвара павінна быць з рагамі і капытамі. А тут быццам бы чалавек перад табой сядзіць... нармальны чалавек... Смаркаецца... хварэе... гарэлку п'е... Я вось думаю... Я тады першы раз пра гэта падумаў... Заўсёды застаюцца і даюць сведчанні ахвяры, а каты маўчаць. Кудысьці правальваюцца, у нейкую нябачную дзірку. У іх няма прозвішчаў, няма галасоў. Яны без следу знікаюць, мы нічога пра іх не ведаем.

У дзевяностыя... То быў час, калі каты яшчэ былі жывыя... яны спалохаліся... У газетах прамільгнула прозвішча следчага, які катаваў акадэміка Вавілава. Я запомніў — Аляксандр Хват. Надрукавалі яшчэ некалькі імёнаў. І яны запанікавалі, што адкрыюць архівы, здымуць грыф «сакрэтна». Замітусіліся. Ніхто гэта не адсочваў, адмысловай статыстыкі няма, але былі дзясяткі самагубстваў. Па ўсёй краіне. Спісалі ўсё на крушэнне імперыі... на збядненне... але мне распавядалі пра самагубствы цалкам забяспечаных і заслужаных старых. Без відочнай прычыны. Адно ў іх было агульнае — усе работнікі органаў. У кагосьці сумленне загаварыла, хтосьці ад страху, што сям'я даведаецца. Здрэйфілі. Быў у іх момант панікі. Не маглі зразумець, што вакол адбываецца... і чаму вакуум вакол іх утварыўся... Верныя псы! Служакі! Не ўсе, вядома, спалохаліся... У «Правде» ці ў «Огоньке», тут мяне памяць можа падвесці, надрукавалі ліст аднаго вохраўца. Гэты не пабаяўся! Апісаў букет

сваіх хвароб, набытых на службе ў Сібіры, дзе пятнаццаць гадоў ахоўваў «ворагаў народа». Здароўя не шкадаваў… Служба, скардзіўся, была цяжкая: улетку камары заядалі і мучыла спякота, а ўзімку — маразы. Шынялькі, я памятаю, так і пісаў «шынялькі», выдавалі салдатам слабыя, а вялікае начальства хадзіла ў кажухах і валёнках. А цяпер, маўляў, ворагі, якіх не дабілі, галовы падымаюць… Контррэвалюцыя! Ліст злосны… *(Паўза.)* Зараз жа былыя зэкі яму адказалі… Яны ўжо не баяліся. Не маўчалі. Напісалі, як у лагеры маглі зняволенага раздзець дагала і прывязаць да дрэва, мошка яго за суткі так аб'ядала, што адзін шкілет заставаўся. Узімку ў саракаградусны мароз дахадзягу, які не выканаў дзённую норму, аблівалі вадой. Дзясяткі ледзяных статуй стаялі для застрашвання да вясны… *(Паўза.)* Нікога не судзілі! Нікога! Каты дажылі свае дні ганаровымі пенсіянерамі… Што скажу? Не заклікайце да пакаяння. Не прыдумляйце сабе народ: які ён, наш народ, добры. Пакаяцца ніхто не гатовы. Гэта вялікая праца — пакаяцца. Я вось сам заходжу ў царкву, а на споведзь — не наважуся. Мне цяжка… А насамрэч, дык чалавеку толькі сябе шкада. Больш нікога. Вось так… Стары бегаў па тэрасе… крычаў… У мяне валасы дыбарам… дыбарам! Ад ягоных слоў. Я ўжо шмат чаго да таго часу ведаў… Прачытаў Шаламава… А тут — на стале ваза з цукеркамі, букет кветак… Абсалютна мірная абстаноўка. Вось гэты кантраст, ён усё ўзмацняў. Страшна было і цікаўна. Цікаўнасці, шчыра скажу, было больш, чым страху. Хочацца… Заўсёды хочацца зазірнуць у яму. Чаму? Мы так зробленыя.

«…Калі мяне ўзялі на працу ў НКВД, я страшэнна ганарыўся. З першага заробку набыў сабе добры гарнітур…

…Работа такая… З чым параўнаць? Параўнаць можна з вайной. Але на вайне я адпачываў. Расстрэльваеш немца — ён крычыць па-нямецку. А гэтыя… гэтыя крычалі па-руску… Быццам свае… У літоўцаў і палякаў было лягчэй страляць. А гэтыя — па-руску: "Балваны! Ідыёты! Канчайце хутчэй!"

Ё…! Мы ўсе ў крыві… выцíралі далоні аб уласныя валасы… Часам нам выдавалі скураныя фартухі… Работа была такая. Служба. Малады ты… Перабудова! Перабудова! Верыш балбатунам… Хай пакрычаць: свабода! свабода! Пабегаюць па плошчах… Сякера ляжыць… сякера гаспадара перажыве… Запомніў?! Ё..! Я — салдат! Мне сказалі — я пайшоў. Страляў. Табе скажуць — ты пойдзеш. По-ойдзеш! Я забіваў ворагаў. Шкоднікаў! Быў дакумент: прысуджаны “да вышэйшай меры сацыяльнай абароны”… Дзяржаўны прысуд… Работа — не дай Бог! Недабіты, ён упадзе і верашчыць, як свіння… харкае крывёй… Асабліва непрыемна страляць у чалавека, які смяецца. Ён ці звар’яцеў, ці табой пагарджае. Роў і мат стаялі з абодвух бакоў. Есці перад такой работай нельга… Я не мог… Увесь час хочацца піць. Вады! Вады! Як пасля перапою… Ё..! Да канца змены нам прыносілі два вядры: вядро гарэлкі і вядро адэкалону. Гарэлку прыносілі пасля працы, а не перад працай. Чытаў дзе-небудзь? То ж бо… Пішуць цяпер усякае… шмат прыдумляюць… Адэкалонам мыліся да пояса. Пах крыві едкі, асаблівы пах… на пах спермы крыху падобны… У мяне была аўчарка, дык пасля працы яна да мяне не падыходзіла. Ё..! Што маўчыш? Зялёны яшчэ… Неабстраляны… Слухай! Рэдка… але трапляўся баец, якому падабалася забіваць…. яго з расстрэльнай каманды пераводзілі ў іншае месца. Такіх недалюблівалі. Шмат было вясковых, як я, вясковыя дужэйшыя за гарадскіх. Больш цягавітыя. Да смерці больш прывычныя: хто калоў дома кабана, хто цяля рэзаў, а курыцу — дык кожны. Да смерці… да яе прывучаць трэба… Першыя дні вадзілі паглядзець… Байцы толькі прысутнічалі пры пакаранні ці канваявалі асуджаных. Былі выпадкі, што адразу вар’яцелі. Не вытрымлівалі. Справа тонкая… Зайца забіць, і то звычка патрэбная, не кожны можа. Ё..! Ставіш чалавека на калені — стрэл з нагана амаль ва ўпор у левую патылічную частку галавы… каля левага вуха… Рука да канца змены вісела, як бізун. Асабліва цярпеў указальны палец. У нас таксама быў план, як

і ў кожным іншым месцы. Як на заводзе. З планам першы час не спраўляліся. Фізічна — не маглі выканаць. Тады склікалі дактароў. Кансіліум. Рашэнне было такое: два разы на тыдзень усім байцам рабіць масаж. Масаж правай рукі і ўказальнага пальца. Указальны палец масажаваць абавязкова, на яго самая вялікая нагрузка пры стральбе. У мяне засталася толькі глухата на правае вуха, таму што страляеш з правай рукі…

…Уручалі нам граматы “за выкананне спецыяльнага задання партыі і ўрада”, “справе Леніна–Сталіна адданыя”. Гэтых грамат на выдатнай паперы ў мяне — поўная шафа. Адзін раз на год — выпраўлялі з сям'ёй у добры санаторый. Выдатнае харчаванне… шмат мяса… лячэнне… Жонка нічога не ведала пра маю працу. Сакрэтная, адказная праца — і ўсё. Ажаніўся я з любові.

…У вайну эканомілі патроны. Калі мора побач… набівалі баржу, як бочку селядцамі. З трума не крык, а звярыны рык: «У баі не здаецца наш горды “Вараг”, Ратунку ніхто не жадае…» Рукі кожнаму звязвалі дротам, ну а да ног — камень. Калі надвор'е ціхае… гладзь… доўга відаць было, як яны апускаліся на дно… Што глядзіш? Малакасос! Што глядзіш?! Ё..! Налівай! Работа такая… служба… Я табе расказваю, каб ты зразумеў: дорага нам каштавала савецкая ўлада. Берагчы яе трэба. Захоўваць! Увечары вяртаемся — баржы пустыя. Цішыня мёртвая. Ва ўсіх адна думка: выйдзем на бераг — і нас там… Ё..! Пад ложкам у мяне гадамі стаяў напагатове драўляны чамаданчык: змена бялізны, зубная шчотка, брытва. Пісталет пад падушкай… Гатовы быў пусціць сабе кулю ў лоб. Усе ў той час так жылі! І салдат, і маршал. Тут была роўнасць.

…Пачалася вайна… Я адразу папрасіўся на фронт. У баі памерці не так страшна. Ты ведаеш, што паміраеш за Радзіму. Усё проста і зразумела. Вызваляў Польшчу, Чэхаславакію… Ё..! Скончыў свой баявы шлях пад Берлінам. Маю два ордэны і медалі. Перамога! А… далей было так… Пасля Перамогі мяне арыштавалі. Спісы ў асабістаў былі напагатове… У чэкіста

толькі два шляхі — загінуць ад рукі ворага ці ад рукі НКВД. Далі сем гадоў. Усе сем гадоў я адседзеў. Дагэтуль... разумееш... прачынаюся па-лагернаму — а шостай. За што сядзеў? За што сядзеў — не сказалі. За што?! Ё..!»

*Нервова скамячыў пусты пачак з-пад цыгарэт.*

Можа, хлусіў. Не... не хлусіў... не падобна... Думаю, не хлусіў... Раніцай я знайшоў прычыну, лухту нейкую. Я з'ехаў. Уцёк! Вяселле разладзілася. Ну так... та-а-ак... Якое вяселле? Я ўжо не мог вярнуцца ў гэты дом. Не мог! З'ехаў у гарнізон. Нявеста... яна не магла зразумець, пісала лісты... пакутавала... Ды і я... Але я не пра гэта цяпер... не пра каханне... Гэта асобная гісторыя. Я хачу зразумець... і вы хочаце зразумець, што гэта былі за людзі? Правільна? Усё ж такі... Забойца — гэта цікава, што б там ні казалі, забойца не можа быць звычайным. Да яго цягне... цікава... Зло гіпнатызуе... Сотні кніг пра Гітлера і Сталіна. Якімі яны былі ў дзяцінстве, у сям'і, іх жанчыны... віно і цыгарэты... Нам цікавая кожная дробязь. Хочацца зразумець... Тамерлан, Чынгісхан — хто яны? Хто? І мільёны іх копій... маленькіх копій... яны таксама тварылі жахлівыя рэчы, і толькі адзінкі страчвалі розум. А ўсе астатнія нармальна жылі: цалаваліся з жанчынамі і ў шахматы гулялі... цацкі сваім дзецям куплялі... Кожны думаў: гэта не я. Гэта не я яго падвешваў «на дыбу» і біў «мазгі ў столь», і не я — завостраным алоўкам у жаночыя смочкі. Гэта не я, а сістэма. Сам Сталін... нават ён казаў: не я вырашаю, а партыя... Вучыў сына: ты думаеш, што гэта я — Сталін. Не! Сталін — гэта ён! І паказваў на свой партрэт на сцяне. Не на сябе, а на свой партрэт! Машына смерці... Машына працавала безупынна... дзясяткі гадоў... Логіка была геніяльная: ахвяра — кат, і пад канец кат — таксама ахвяра. Быццам бы не чалавек гэта прыдумаў... Так дасканала ўсё бывае толькі ў прыродзе. Махавік круціцца, а вінаватых няма. Няма! Усе хочуць, каб іх пашкадавалі. Усе — ахвяры. У канцы ланцужка — усе! Во-о-сь! Я тады па маладосці спалохаўся, анямеў, сёння я больш бы

распытаў… Мне гэта трэба ведаць… Навошта? Я баюся… Пасля ўсяго, што я пра людзей ведаю, я баюся сябе. Баюся. Я — чалавек звычайны… слабы… Я — і чорны, і белы, і жоўты… усякі… У савецкай школе нас вучылі, што сам па сабе чалавек добры, ён цудоўны, і мая маці дагэтуль верыць, што гэта жахлівыя абставіны робяць яго пачварным. А чалавек добры! А гэта… не так… не так! Во-о-ось… Усё жыццё чалавек боўтаецца паміж дабром і злом. Ці ты вострым алоўкам у смочкі… ці табе… Выбірай! Выбірай! Колькі гадоў прайшло… не магу забыць… Як ён крычаў: «Я гляджу тэлевізар, слухаю радыё. Зноў — багатыя і бедныя. Адны ікру жаруць, купляюць астравы і самалёты, а іншым на белы батон не хапае. Доўга ў нас так не будзе! Сталіна яшчэ назавуць вялікім… Сякера ляжыць… сякера гаспадара перажыве… Успомніш мае словы… Ты спытаў… (а я пытаўся) ці хутка канчаецца чалавек, наколькі яго хапае? Я табе адкажу: ножку венскага крэсла ў задні праход альбо шылам у машонку — і няма чалавека. Ха-ха… няма чалавека… Адна фігня! Ха-ха…»

*(Ужо на развітанне.)* Ну ператрэслі ўсю гісторыю… Тысячы выкрытых, горы праўды. Мінулае для адных — куфар мяса і бочка крыві, для іншых — вялікая эпоха. На кухнях кожны дзень ваюем. Але неўзабаве падрастуць маладыя… ваўчаняты, як называў іх Сталін… Хутка яны падрастуць…

*Яшчэ раз развітваецца, але зноў пачынае гаварыць.*

Нядаўна ў інтэрнэце ўбачыў аматарскія фотаздымкі… Звычайныя ваенныя фотаздымкі, калі б не ведаць — хто на іх. Каманда СС з Асвенціма… Афіцэры і салдаты. Шмат дзяўчат. Фатаграфаваліся на вечарынках, на шпацырах. Маладыя, вясёлыя. *(Паўза.)* А фотаздымкі нашых чэкістаў у музеях? Калі-небудзь уважліва прыгледзьцеся: трапляюцца прыгожыя… і ўзнёслыя твары… Нас доўга вучылі, што гэта святыя…

Я хацеў бы з'ехаць з гэтай краіны ці хаця б дзяцей адсюль выштурхнуць. Мы з'едзем. Сякера гаспадара перажыве… Я запомніў…

*Праз некалькі дзён ён патэлефануе і не дазволіць друкаваць свой тэкст. Чаму? Тлумачыць адмовіцца. Потым я даведаюся, што ён эміграваў з сям'ёй у Канаду. Другі раз знайду яго праз дзесяць гадоў, і ён пагодзіцца на публікацыю. Скажа: «Я рады, што своечасова з'ехаў. Пэўны час рускіх паўсюль любілі, а цяпер зноў баяцца. А вам не страшна?»*

ЧАСТКА ДРУГАЯ

# ПРЫВАБНАСЦЬ ПУСТАТЫ

# З ВУЛІЧНАЙ ГАМАНЫ І РАЗМОВАЎ НА КУХНІ (2002–2012)

## Пра мінулае

—Ельцынскія дзевяностыя... Як мы іх успамінаем? Гэта: шчаслівы час... шалёнае дзесяцігоддзе... страшныя гады... час летуценнай дэмакратыі... згубныя дзевяностыя... час проста залаты... час самавыкрыцця... злыя і подлыя часы... яркі час... агрэсіўны... бурлівы... мой гэта быў час... не мой!!!

—Прафукалі мы дзевяностыя! Такі шанец, які ў нас быў тады, не хутка паўторыцца. І гэта ж як усё добра пачыналася ў дзевяноста першым! Ніколі не забуду твары людзей, з якімі я стаяў каля Белага дома. Мы перамаглі, мы былі дужымі. Нам хацелася жыць. Мы атрымлівалі асалоду ад свабоды. Але цяпер... цяпер я інакш пра гэта думаю... Якія мы былі да агіды наіўныя. Адважныя, сумленныя і наіўныя. Мы думалі, што каўбаса вырастае са свабоды. Ва ўсім, што здарылася потым, і мы вінаватыя... Ельцын, вядома, нясе адказнасць, але мы таксама...

Я думаю, што ўсё пачалося з кастрычніка. З кастрычніка дзевяноста трэцяга... «Крывавы кастрычнік», «чорны кастрычнік», «ГКЧП-2»... Так яго называюць... Паў-Расіі рвалася наперад, а паў-Расіі цягнула назад. У шэры сацыялізм. У праклятый савок. Савецкая ўлада не здавалася. «Чырвоны» парламент адмовіўся падпарадкоўвацца прэзідэнту. Я так гэта тады разумеў... Наша дворнічыха, яна прыехала аднекуль з-пад Цверы, мы з жонкай не раз дапамагалі ёй грашыма, аддалі ўсю мэблю, калі рабілі ў кватэры рамонт — у тую раніцу, калі ўсё пачалося, убачыла ў мяне значок з Ельцыным і замест «Добрай раніцы!» зларадна сказала: «Хутка вам, буржуям, канец будзе», — і адвярнулася. Я не чакаў. Адкуль у яе да мяне такая

нянавісць? За што? Абстаноўка — як у дзевяноста першым... У тэлевізары ўбачыў: гарыць Белы дом, страляюць танкі... Трасірныя кулі ў небе... Штурм тэлевізійнага цэнтра «Астанкіна»... Генерал Макашоў у чорным барэце крычаў: «Больш не будзе ні мэраў, ні сэраў, ні хераў». І нянавісць... нянавісць... Запахла грамадзянскай вайной. Крывёю. З Белага дома генерал Руцкі адкрыта заклікаў да вайны: «Лётчыкі! Браты! Падымайце самалёты! Бамбіце Крэмль! Там банда!» Неяк імгненна горад напоўніўся вайсковай тэхнікай. Незразумелымі людзьмі ў камуфляжнай форме. І тады Ягор Гайдар звярнуўся да «масквічоў, усіх расіян, якім дарагія дэмакратыя і свабода»... Усё як у дзевяноста першым... Мы прыйшлі... я прыйшоў... Там былі тысячы людзей... Памятаю, што я кудысьці бег разам з усімі. Спатыкнуўся. Упаў на плакат «За Расію — без буржуяў!». Адразу ўявіў сабе, што нас чакае, калі генерал Макашоў пераможа... Убачыў параненага маладога хлопца, ён не мог ісці, пацягнуў яго на сабе. «Ты за каго, — спытаў ён, — за Ельцына ці за Макашова?» Ён быў за Макашова... Значыць, вораг. «Ды пайшоў ты!» — паслаў яго матам. А што яшчэ? Хутка мы падзяліліся зноў на «белых» і «чырвоных». Каля «хуткай» ляжалі дзясяткі параненых... Ва ўсіх у іх — гэта чамусьці мне выразна запомнілася — былі стаптаныя чаравікі, усё гэта былі простыя людзі. Бедныя людзі. У мяне там нехта яшчэ раз спытаў: «Каго ты прыцягнуў — ён наш ці не наш?» «Не нашых» бралі ў апошнюю чаргу, яны ляжалі на асфальце і сплывалі крывёй... «Вы што? Вар'яты!» — «Дык гэта ж нашы ворагі!» Нешта адбылося за гэтыя два дні з людзьмі... наогул, нешта ў паветры змянілася. Побач са мной былі зусім іншыя людзі, мала падобныя да тых, з кім я стаяў каля Белага дома два гады таму. У руках заточкі з арматуры... сапраўдныя аўтаматы, іх раздавалі з грузавіка... Вайна! Усё сур'ёзна. Каля тэлефоннай будкі складвалі забітых... І тут стаптаныя чаравікі... А непадалёк ад Белага дома — працавалі кавярні, там, як звычайна, пілі піва. Цікаўныя віселі на балконах і назіралі за тым, што

адбываецца, як у тэатры. І тут жа… На маіх вачах з Белага дома два мужчыны выносілі на руках тэлевізар, з кішэняў куртак тырчалі тэлефонныя слухаўкі… Марадзёраў хтосьці весела адстрэльваў зверху. Напэўна, снайперы. Ці ў чалавека трапяць, ці ў тэлевізар… На вуліцах увесь час чуліся стрэлы… *(Змаўкае.)* Калі ўсё скончылася і я вярнуўся дадому, даведаўся: забілі сына нашай суседкі. Хлопцу дваццаць гадоў. Ён быў па другі бок барыкадаў… Адна рэч, калі мы спрачаліся з імі на кухні, а іншая — страляць… Як гэта атрымалася? Я гэтага не хацеў… Таму што ў натоўпе… Натоўп — гэта пачвара, чалавек у натоўпе — гэта зусім не той чалавек, з якім ты сядзеў на кухні і размаўляў. Піў гарэлку, піў гарбату. Я ўжо больш нікуды не пайду і сыноў не пушчу… *(Маўчыць.)* Я не ведаю, што гэта было: мы абаранялі свабоду ці ўдзельнічалі ў вайсковым пераваpоце? Цяпер у мяне сумневы… Сотні людзей загінулі… Іх ніхто не ўспамінае, акрамя родных. «Гора таму, хто стаіць на крыві…». *(Маўчыць.)* А калі б перамог генерал Макашоў? Крыві было б яшчэ болей. Расія абрынулася б. Адказаў у мяне няма… Я верыў Ельцыну да дзевяноста трэцяга года…

Тады мае сыны былі маленькія, але яны ўжо даўно выраслі. Адзін нават жанаты. Я некалькі разоў… так… спрабаваў… Хацеў ім расказаць пра дзевяноста першы… пра дзевяноста трэці… Ім гэта ўжо нецікава. Пустыя вочы. У іх толькі адно пытанне: «Тата, чаму ты не разбагацеў у дзевяностыя, калі гэта было лёгка?» Маўляў, толькі бязрукія і дурныя не разбагацелі. Дэбільныя продкі… кухонныя імпатэнты… Бегалі па мітынгах. Нюхалі паветра свабоды, калі разумныя людзі нафту і газ дзялілі…

—Рускі чалавек — ён ідэаліст. Калісьці ён быў захоплены ідэямі камунізму, шалёна, з рэлігійным фанатызмам увасабляў іх у жыццё, потым стаміўся, расчараваўся. І вырашыў адрачыся ад старога свету, абтрэсці яго прах са сваіх ног. Так гэта па-руску — пачынаць з разбітага карыта. І зноў нас дурманяць новыя, як нам здаецца, ідэі. Наперад — да перамогі капіталізму! Хутка будзем жыць, як на Захадзе! Ружовыя мары…

—Жыць стала лепей.

—Ага, некаторым у тысячу разоў стала лепей.

—Мне пяцьдзясят гадоў… Я спрабую не быць саўком. Гэта ў мяне дрэнна атрымліваецца. Працую ў прыватнага прадпрымальніка і ненавіджу яго. Не згодная з дзяльбой тлустага пірага — СССР, з «прыхватызацыяй». Не люблю багатых. Выстаўляюцца ў тэлевізары сваімі палацамі, віннымі склепамі… Хай хоць у залатых ваннах, напоўненых грудным малаком, купаюцца. Мне гэта навошта паказваць? Я не ўмею побач з імі жыць. Крыўдна. Сорамна. І я ўжо не змянюся. Я занадта доўга жыла пры сацыялізме. Сёння жыць стала лепей, але больш гідка.

—Дзіўлюся, як шмат яшчэ тужліўцаў па савецкай уладзе.

—А чаго дыскутаваць з саўкамі? Трэба пачакаць, пакуль яны перамруць, і зрабіць усё па-свойму. Перш за ўсё выкінуць мумію Леніна з маўзалея. Што за азіятчына! Мумія ляжыць, як праклён над намі… Насланнё…

—Спакойна, таварыш. Вы ведаеце, цяпер нашмат лепей кажуць пра СССР, чым дваццаць гадоў таму. Я нядаўна была на магіле Сталіна, там горы кветак. Чырвоных гваздзікоў.

—Забілі чорт ведае колькі людзей, але ў нас была вялікая эпоха.

—Мне не падабаецца тое, што цяпер, я не ў захапленні. Але і ў «савок» не хачу. Не рвуся ў мінулае. На жаль, добрага нічога не магу ўспомніць.

—А я хачу назад. Мне не патрэбная савецкая каўбаса, мне патрэбная краіна, у якой чалавек быў чалавекам. Раней казалі «простыя людзі», а цяпер «простанароддзе». Адчуваеце розніцу?

—Я вырас у дысідэнцкай сям'і… На дысідэнцкай кухні… Мае бацькі былі знаёмыя з Сахаравым, распаўсюджвалі самвыдат. Разам з імі я прачытаў Васіля Гросмана, Яўгенію Гінзбург, Даўлатава… Слухаў «Свабоду». І ў дзевяноста першым я, натуральна, стаяў у ланцугу вакол Белага дома, гатовы быў ахвяраваць жыццём, каб не вярнуўся камунізм. Сярод маіх сяброў не было камуністаў. Камунізм у нас быў звязаны з тэрорам, з ГУ-

ЛАГам. З клеткай. Мы думалі, што ён мёртвы. Назаўжды мёртвы. Прайшло дваццаць гадоў… Заходжу ў пакой сына — і бачу: у яго на стале ляжыць «Капітал» Маркса, на кніжнай паліцы — «Маё жыццё» Троцкага… Не веру сваім вачам! Маркс вяртаецца? Гэта што — жах? Сон ці ява? Сын вучыцца ва ўніверсітэце, у яго шмат сяброў, я стаў прыслухоўвацца да іх гутарак. П'юць гарбату на кухні і спрачаюцца аб «Маніфесце камуністычнай партыі»… Марксізм зноў у законе, у трэндзе, у брэндзе. Яны носяць футболкі з партрэтамі Чэ Гевары і Леніна. *(У роспачы.)* Нічога не прарасло. Усё было дарэмна.

—Вось вам анекдот… Рэвалюцыя. У адным кутку царквы п'юць, балююць чырвонаармейцы, а ў другім — іхнія коні ядуць авёс і мочацца. Дзячок бяжыць да настаяцеля: «Бацюшка, што яны робяць у святым храме?» — «Гэта не страшна. Пастаяць і пойдуць. Страшна будзе, калі іх унукі вырастуць». Вось яны выраслі…

—У нас адно выйсце — вярнуцца да сацыялізму, але толькі да праваслаўнага сацыялізму. Расія не можа жыць без Хрыста. У рускага чалавека шчасце ніколі не было звязана з вялікімі грашыма. Гэтым і адрозніваецца «руская ідэя» ад «амерыканскай мары».

—Расіі патрэбная не дэмакратыя, а манархія. Моцны і справядлівы цар. І першым законным прэтэндэнтам на трон з'яўляецца Галава Расійскага Імператарскага Дома Вялікая княгіня Марыя Уладзіміраўна, а затым — яе нашчадкі.

—Беразоўскі прынца Гары прапаноўваў…

—Манархія — трызненне! Спарахнелая даўніна!

—Сэрца, якое не верыць, слабое і нетрывалае перад грахом. Рускі народ абновіцца шуканнем праўды Божай.

—Перабудова мне падабалася адно калі яна пачыналася. Калі б хто-небудзь нам сказаў тады, што прэзідэнтам краіны стане падпалкоўнік КДБ…

—Мы былі не гатовыя да свабоды…

—Свабода, роўнасць, братэрства… Крывішчы гэтыя словы пралілі — акіян.

—Дэмакратыя! — смешнае слова ў Расіі. Пуцін-дэмакрат — самы кароткі анекдот.

—За гэтыя дваццаць гадоў мы шмат чаго пра сябе даведаліся. Адкрылі. Даведаліся пра тое, што Сталін — наш таемны герой. Выйшлі дзясяткі кніг і фільмаў пра Сталіна. Людзі чытаюць, глядзяць. Спрачаюцца. Палова краіны марыць пра Сталіна… Калі паўкраіны марыць пра Сталіна, дык ён абавязкова з'явіцца, можаце не сумнявацца. Выцягнулі з пекла ўсіх зласлаўных мерцвякоў: Берыю, Яжова… Пра Берыю сталі пісаць, што ён быў таленавіты адміністратар, хочуць рэабілітаваць, таму што пад яго кіраўніцтвам стварылі рускую атамную бомбу…

—Далоў чэкістаў!

—Хто наступны — новы Гарбачоў ці новы Сталін? Ці свастыка пачнецца? «Зіг Хайль!» Расія паднялася з каленяў. Небяспечны момант, таму што Расію нельга было так доўга прыніжаць.

## Пра сучаснасць

—Пуцінскія нулявыя… Якія яны? Сытыя… шэрыя… брутальныя… чэкісцкія… гламурныя… стабільныя… самадзяржаўныя… праваслаўныя…

—Расія заўсёды была, ёсць і будзе імперыяй. Мы не проста вялікая краіна, мы асобная руская цывілізацыя. У нас свой шлях.

—Захад і цяпер баіцца Расіі…

—Вось нашы прыродныя скарбы патрэбныя ўсім, і асабліва — Еўропе. Разгарніце энцыклапедыю: паводле запасаў нафты сёмае, а газу — у нас першае месца ў Еўропе. Адно з першых месцаў паводле запасаў жалезнай руды, уранавай

сыравіны, волава, медзі, нікелю, кобальту… І алмазаў, і золата, і срэбра, і плаціны… Валодаем усёй табліцай Мендзялеева. Мне адзін француз так і заявіў: а чаму гэта ўсё вам належыць, зямля ж агульная?

—Усё ж я імперыяліст, так. Я хачу жыць у імперыі. Пуцін — мой прэзідэнт! Ліբералам цяпер сорамна называцца, як нядаўна сорамна было называцца камуністам. Мужыкі каля піўнога шапіка могуць морду набіць.

—Ненавіджу Ельцына! Мы яму верылі, а ён павёў нас зусім у невядомым кірунку. Ні ў які дэмакратычны рай мы не трапілі. А трапілі туды, дзе яшчэ страшней, чым было.

—Рэч не ў Ельцыне і не ў Пуціне, а ў тым, што мы — рабы. Рабская душонка! Рабская кроў! Паглядзіш на «новага рускага»… Ён з «бэнтлі» вылазіць, у яго грошы з кішэняў сыплюцца, а ён раб. Наверсе сядзіць пахан: «Пайшлі ўсе ў стойла!» І ўсе пойдуць.

—Я чуў у тэлевізары… «Ці маеш мільярд? — спытаў спадар Палонскі. — Не?! Тады пайшоў у жопу!» Я з тых, каго спадар алігарх паслаў у жопу. Звычайная сям'я: бацька спіўся, маці ў дзіцячым садку за капейкі гарбаціцца. Мы для іх гаўно, угнаенне. Я хаджу на розныя тусоўкі. Да патрыётаў, нацыяналістаў… Слухаю. Прыйдзе час, і хтосьці абавязкова дасць мне ў рукі вінтоўку. І я вазьму.

—Капіталізм у нас не прыжываецца. Чужы нам дух капіталізму. Далей за Маскву ён не распаўсюдзіўся. Клімат не той. І чалавек не той. Рускі чалавек не рацыянальны, не меркантыльны, можа кашулю апошнюю аддаць, але часам украдзе. Ён стыхійны і больш сузіральнік, чым дзяяч, здольны здавольвацца малым. Назапашванне — не ягоны ідэал, яму сумна назапашваць. У ім вельмі абвостранае пачуццё справядлівасці. Народ — бальшавік. А яшчэ рускі чалавек не хоча проста жыць, ён хоча жыць для чагосьці. Ён хоча ўдзельнічаць у вялікай справе. У нас хутчэй знойдзеш святога, чым сумленнага і паспяховага. Чытайце рускую класіку…

—Чаму, калі нашы людзі з'язджаюць за мяжу, яны там нармальна ўпісваюцца ў капіталістычнае жыццё? А дома ўсе любяць пагаварыць пра «суверэнную дэмакратыю», пра асобную рускую цывілізацыю і пра тое, што «ў рускім жыцці няма падставы для капіталізму».

—У нас капіталізм няправільны…

—Пакіньце спадзяванні на іншы капіталізм…

—У Расіі капіталізм быццам бы ёсць, а капіталістаў няма. Няма новых Дзямідавых, Марозавых… Рускія алігархі — гэта не капіталісты, а проста злодзеі. Ну якія могуць быць капіталісты з былых камуністаў і камсамольцаў? Мне Хадаркоўскага не шкада. Хай сядзіць на нарах. Шкада толькі, што ён адзін там сядзіць. Павінен жа хтосьці адказаць за тое, што я перажыў у дзевяностыя. Абабралі да ніткі. Зрабілі беспрацоўным. Капіталістычныя рэвалюцыянеры: Гайдар, жалезны Віні-Пух… рыжы Чубайс… Ставілі эксперыменты на жывых людзях, як натуралісты…

—Ездзіў у вёску да маці. Суседзі расказалі, як нехта падпаліў ноччу сядзібу фермера. Людзі ўратаваліся, згарэла жывёла. Вёска піла ад радасці два дні. А вы кажаце: капіталізм… У нас пры капіталізме жывуць сацыялістычныя людзі…

—Пры сацыялізме мне абяцалі, што месца пад сонцам хопіць усім. Цяпер кажуць іншае: жыць трэба паводле законаў Дарвіна, тады ў нас будзе багацце. Багацце для дужых. А я — са слабых. Я — не змагар… У мяне была схема, я прывыкла жыць са схемай: школа, інстытут, сям'я. Збіраем з мужам на кааператыўную кватэру, пасля кватэры — на машыну… Схему зламалі. Нас кінулі ў капіталізм… Паводле адукацыі я інжынер, працавала ў праектным інстытуце, яго яшчэ называлі «жаночы інстытут», бо там былі адны жанчыны. Сядзіш і складваеш цэлы дзень паперкі, я любіла, каб акуратна, стосікам. Так бы і праседзела ўсё жыццё. А тут пачаліся скарачэнні… Не чапалі мужчын, іх было мала, і маці-адзіночак, і тых, каму да пенсіі застаўся год ці два. Вывесілі спісы, я ўбачыла сваё

прозвішча... Як жыць далей? Разгубілася. Мяне жыць паводле Дарвіна не вучылі.

Доўгі час спадзявалася, што знайду працу па спецыяльнасці. Я была ідэалістка ў тым сэнсе, што не ведала свайго месца ў жыцці, сваёй цаны. Мне дагэтуль не хапае дзяўчат з майго аддзела, менавіта дзяўчат, нашай балбатні. Праца ў нас была на другім плане, а на першым — пагаварыць, гэты задушэўны трындзёж. Разы тры на дзень мы пілі гарбату, ну і кожная распавядала пра сваё. Адзначалі ўсе святы, усе дні нараджэння... А цяпер... Хаджу на біржу працы. Дарэмна. Патрабуюцца маляры, тынкоўшчыкі... Мая сяброўка, мы разам у інстытуце вучыліся, прыбірае дом у адной бізнэсвумен, сабаку выгульваць выводзіць... Прыслуга. Першы час яна плакала ад прыніжэння, а цяпер прывыкла. А я не магу.

—Галасуй за камуністаў — гэта крута.

—Усё ж нармальнаму чалавеку сталіністаў не зразумець. Сто гадоў Расіі кату пад хвост, а яны: слава савецкім людажэрам!

—Рускія камуністы ўжо даўно не камуністы. Прыватная ўласнасць, якую яны прызналі, і камуністычная ідэя несумяшчальныя. Я магу сказаць пра іх, як Маркс казаў пра сваіх паслядоўнікаў: «Я ведаю толькі адно, што я не марксіст». А яшчэ лепш выказаўся Гейнэ: «Я сеяў драконаў, а збіраю вошай».

—Камунізм — будучыня чалавецтва. Альтэрнатывы няма.

—На варотах Салавецкага лагера вісеў бальшавіцкі лозунг: «Жалезнай рукой загонім чалавецтва ў шчасце». Адзін з рэцэптаў выратавання чалавецтва.

—Ніякага жадання ісці на вуліцу і рабіць нешта. Лепш нічога не рабіць. Ні дабра, ні зла. Тое, што сёння — дабро, заўтра акажацца злом.

—Самыя страшныя людзі — гэта ідэалісты...

—Я люблю Радзіму, але жыць тут не буду. Я не змагу тут быць такой шчаслівай, як я хачу.

—Можа, я дурніца... Але я не хачу з'язджаць, хоць магу.

—І я не з'еду. У Расіі весялей жыць. Гэтага драйву няма ў Еўропе.

—Лепш любіць нашу Радзіму здалёк…

—Сёння сорамна быць рускім…

—Нашы бацькі жылі ў краіне пераможцаў, а мы ў краіне, якая прайграла халодную вайну. Ганарыцца няма чым!

—Валіць не збіраюся… У мяне тут бізнэс. Я магу дакладна сказаць, што нармальна жыць у Расіі можна, не трэба толькі лезці ў палітыку. Усе гэтыя мітынгі за свабоду слова, супраць гамафобаў — мне па барабану…

—Усе гавораць пра рэвалюцыю… Вунь Рублёўка апусцела… Багатыя бягуць, капіталы выводзяць за мяжу. Замыкаюць свае палацы на ключ, поўна аб'яваў: «Прадаю…». Адчуваюць, што народ рашуча настроены. А ніхто нічога добраахвотна не аддасць. Тады загавораць «калашнікавы»…

—Адны гарлаюць «Расія — за Пуціна!», а іншыя — «Расія без Пуціна!».

—А што будзе, калі нафта патаннее ці стане зусім непатрэбнай?

—7 мая 2012 года. У тэлевізары паказваюць: урачысты картэж Пуціна едзе ў Крэмль на інаўгурацыю па абсалютна пустым горадзе. Ні людзей, ні машын. Узорная зачыстка. Тысячы паліцэйскіх, вайскоўцаў і байцоў АМАПу дзяжураць каля выхадаў з метро і каля пад'ездаў. Ачышчаная ад масквічоў і вечных маскоўскіх затораў сталіца. Мёртвы горад.

А цар у нас — несапраўдны!

## Пра будучыню

*Сто дваццаць гадоў таму Дастаеўскі скончыў «Братоў Карамазавых». Там ён пісаў аб вечных «рускіх хлопчыках», якія заўсёды разважаюць «пра ўсясветныя пытанні, не інакш як: ці*

*ёсць Бог, ці ёсць неўміручасць? А тыя, хто ў Бога не вераць, ну тыя пра сацыялізм і анархізм загавораць, пра пераробку ўсяго чалавецтва пад новы штат, дык у выніку гэта ж адзін чорт выйдзе, усё тыя ж пытанні, толькі з другога канца».*

*Прывід рэвалюцыі зноў блукае па Расіі. 10 снежня 2011 года — статысячны мітынг на Балотнай плошчы. З таго часу выступы-пратэсты не спыняюцца. Пра што ж разважаюць «рускія хлопчыкі» сёння? Што абяруць на гэты раз?*

—Я хаджу на мітынгі, таму што досыць трымаць нас за лохаў. Вярніце выбары, гады! Першы раз на Балотнай плошчы сабралася сто тысяч, ніхто не чакаў, што прыйдзе столькі людзей. Цярпелі, цярпелі, але ў нейкі момант хлусня і нахабства зашкалілі: усё — досыць! Усе глядзяць выпускі навін або чытаюць навіны ў інтэрнэце. Гавораць пра палітыку. Быць у апазіцыі стала модна. Толькі я баюся… Я баюся, што мы ўсе балбатуны… Пастаім на плошчы, пакрычым і вернемся да сваіх кампоў і будзем сядзець у інтэрнэце. Застанецца толькі адно: «Як мы класна патусілі!» Ужо я з гэтым сутыкнуўся: трэба было да чарговага мітынгу намаляваць плакаты, разнесці ўлёткі — усе хуценька развеяліся…

—Я раней была далёкая ад палітыкі. Мне хапала працы і сям'і, я лічыла, што па вуліцах хадзіць бессэнсоўна. Мяне больш прыцягвала тэорыя малых спраў: я працавала ў хоспісе, улетку, калі гарэлі лясы пад Масквой, вазіла прадукты і рэчы пагарэльцам. Розны досвед быў… А мама ўвесь час сядзела каля тэлевізара. І яе, відаць, дастала гэтая хлусня і злодзеі з чэкісцкім мінулым, яна ўсё мне пераказвала. Мы пайшлі на першы мітынг разам, а маме маёй семдзесят пяць гадоў. Яна — актрыса. Купілі на ўсялякі выпадак кветкі. Не будуць жа страляць у людзей з кветкамі!

—Я нарадзіўся ўжо не ў СССР. Калі мне штосьці не падабаецца, я выходжу на вуліцу і пратэстую. А не балабоню пра гэта на кухні перад сном.

—Я баюся рэвалюцыі… Ведаю: будзе рускі бунт, бязлітасны і бессэнсоўны. Але адседжвацца дома ўжо сорамна. Мне не патрэбны «новы СССР», «абноўлены СССР», «праўдзівы СССР». Са мной нельга так, што мы, маўляў, тут селі ўдвух і вырашылі: сёння — ён прэзідэнт, а заўтра — я. Піпл праглыне. Мы — не быдла, мы — народ. На мітынгах я бачу тых, каго ніколі раней там не бачыў: загартаваныя ў барацьбе шасцідзясятнікі-сямідзясятнікі і шмат студэнтаў, а нядаўна ім было напляваць на тое, што там, у зомбаскрыні, нам упіхваюць… І дамы ў норкавых футрах, і маладыя хлопцы, якія прыехалі на мітынг на «мерседэсах». Нядаўна іх вабілі грошы, рэчы, камфорт, але аказалася, што гэтага мала. Ім гэтага ўжо не хапае. Як і мне. Ідуць не галодныя, а сытыя. Плакаты… народная творчасць… «Пуцін, сыдзі сам!», «Я не галасаваў за гэтую свалату, я галасаваў за іншую свалату!». Мне спадабаўся плакат «Вы нас нават не прадстаўляеце». Мы не збіраліся штурмам браць Крэмль, мы хацелі сказаць, хто мы. Сыходзілі і скандавалі: «Мы яшчэ вернемся».

—Я — чалавек савецкі, я ўсяго баюся. Яшчэ дзесяць гадоў таму я ні за што б не выйшла на плошчу. А цяпер ніводнага мітынгу не прапускаю. Была на праспекце Сахарава і на новым Арбаце. І на Белым кальцы. Вучуся быць свабоднай. Я не хачу памерці такой, якая я цяпер, — савецкай. Вычэрпваю з сябе сваю савецкасць вёдрамі…

—Я хаджу на мітынгі, таму што туды ходзіць мой муж…

—Я — чалавек немалады. Хачу яшчэ пажыць у Расіі без Пуціна.

—Дасталі габрэі, чэкісты, гомасэксуалісты…

—Я — левы. Я перакананы: мірным шляхам нічога нельга дамагчыся. Я прагну крыві! Без крыві ў нас вялікія справы не робяцца. Навошта мы выходзім? Я стаю і чакаю, калі мы пойдзем на Крэмль. Гэта ўжо не гульні. Крэмль даўно трэба было браць, а не хадзіць і гарлаць. Дайце каманду ўзяць вілы і лом! Я чакаю.

—Я разам з сябрамі… Мне сямнаццаць гадоў. Што я ведаю пра Пуціна? Я ведаю, што ён дзюдаіст, атрымаў восьмы дан у дзюдо. І, здаецца, гэта ўсё, што я пра яго ведаю…

—Я не Чэ Гевара, я баязліўка, але я ніводнага мітынгу не прапусціла. Хачу жыць у краіне, за якую мне не сорамна.

—У мяне характар такі, што я павінна быць на барыкадах. Мяне так выхавалі. Мой бацька добраахвотнікам паехаў на ліквідацыю наступстваў землятрусу ў Спітаку. Праз гэта рана памёр. Інфаркт. З дзяцінства я жыву не з татам, а з фотаздымкам таты. Ісці ці не ісці — кожны сам павінен вырашыць. Мой бацька сам паехаў… а мог не ехаць… Сяброўка таксама хацела пайсці са мной на Балотную плошчу, потым патэлефанавала: «Разумееш, у мяне малое дзіця». А ў мяне старэнькая мама. Я сыходжу, яна смокча валідол. Але я ўсё адно іду…

—Хачу, каб дзеці мною ганарыліся…

—Мне гэта трэба для самапавагі…

—Трэба паспрабаваць нешта зрабіць…

—Я веру ў рэвалюцыю… Рэвалюцыя — гэта доўгая і ўпартая праца. У 1905 годзе першая руская рэвалюцыя скончылася правалам і разгромам. А праз дванаццаць гадоў, у 1917 годзе, рванула так, што разнесла царскі рэжым ушчэнт. Будзе і ў нас свая рэвалюцыя!

—Я іду на мітынг, а ты?

—Я асабіста стаміўся ад дзевяноста першага… ад дзевяноста трэцяга… Не хачу больш рэвалюцый! Па-першае, рэвалюцыі рэдка бываюць аксамітнымі, а па-другое, у мяне ёсць досвед: нават калі мы пераможам, будзе як у дзевяноста першым. Эйфарыя хутка скончыцца. Поле бою дастанецца марадзёрам. Прыйдуць гусінскія, беразоўскія, абрамовічы…

—Я супраць антыпуцінскіх мітынгаў. Дзвіжуха пераважна ў сталіцы. Масква і Пецярбург за апазіцыю, а правінцыя за Пуціна. Мы што, дрэнна жывём? Хіба мы жывём не лепш, чым раней? Страшна гэта страціць. Усе памятаюць, як

напакутаваліся ў дзевяностыя. Нікому неахвота зноў зламаць усё нахер і крывёю заліць.

—Я не фанат пуцінскага рэжыму. Надакучыў «царок», хочам зменных кіраўнікоў. Перамены, вядома, патрэбныя, але не рэвалюцыя. І калі шпурляюць асфальтам у паліцыю, мне таксама не падабаецца…

—Усё праплаціў Дзярждэп. Заходнія лялькаводы. Адзін раз з іхнімі рэцэптамі мы зрабілі перабудову, і што з гэтага атрымалася? Нас пагрузілі ў такую яму! Я хаджу не на гэтыя мітынгі, а на мітынгі за Пуціна! За моцную Расію!

—За апошнія дваццаць гадоў карцінка некалькі разоў цалкам змянялася. А вынік? «Пуцін, сыходзь! Пуцін, сыходзь!» — чарговая мантра. Я не хаджу на гэтыя спектаклі. Ну сыдзе Пуцін. І сядзе на трон новы самадзержац. Як кралі, гэтак і будуць красці. Застануцца запляваныя пад'езды, кінутыя старыя, цынічныя чыноўнікі і нахабныя даішнікі… і даць хабар будзе лічыцца нармальным… Які сэнс мяняць урад, калі мы самі не змяняемся? Ні ў якую дэмакратыю ў нас я не веру. Усходняя краіна… Феадалізм… Папы замест інтэлектуалаў…

—Не люблю натоўп… Статак… Натоўп ніколі нічога не вырашае, вырашаюць асобы. Улада пастаралася, каб наверсе не было яркіх асобаў. У апазіцыі няма ні Сахарава, ні Ельцына. Не нарадзіла «снежная» рэвалюцыя сваіх герояў. Дзе праграма? Што рабіць збіраюцца? Паходзяць, пакрычаць… І той жа Нямцоў… Навальны… пішуць у твітары, што паехалі на вакацыі на Мальдывы або ў Тайланд. Любуюцца Парыжам. Уявіце сабе, што Ленін у сямнаццатым годзе паехаў пасля чарговай дэманстрацыі ў Італію або пакатацца на лыжах у Альпы…

—Я не хаджу на мітынгі і не хаджу галасаваць. Я не маю ілюзіяў…

—А вы ў курсе, што акрамя вас ёсць яшчэ Расія? Да Сахаліна… Дык вось яна не жадае ніякіх рэвалюцый — ні «аранжавай», ні «ружовай», ні «снежнай». Досыць рэвалюцый! Пакіньце Радзіму ў спакоі!

—Мне пляваць на тое, што будзе заўтра...

—Я не хачу ісці ў адной калоне з камуністамі і нацыяналістамі... з нацыкамі... Вы б пайшлі на марш з Ку-клукс-кланам у балахонах і з крыжамі? Якую б выдатную мэту гэты марш ні меў. Мы пра розную Расію марым.

—Не хаджу... Баюся, што дадуць дубінкай па галаве...

—Трэба маліцца, а не на мітынгі хадзіць. Гасподзь паслаў нам Пуціна...

—Мне не падабаюцца рэвалюцыйныя сцягі за акном. Я за эвалюцыю... за будаўніцтва...

—Не хаджу... І не буду апраўдвацца, што не хаджу на палітычныя шоў. Дзяшовыя панты — гэтыя мітынгі. Трэба самому жыць, як вучыў Салжаніцын, без ілжы. Без гэтага мы ні на міліметр не прасунемся. Будзем хадзіць па коле.

—Люблю Радзіму і так...

—Я выключыў дзяржаву з зоны сваіх інтарэсаў. Мае прыярытэты — сям'я, сябры і мой бізнэс. Ясна растлумачыў?

—А ты ці не вораг народа, грамадзянін?

—Нешта абавязкова адбудзецца. І хутка. Пакуль яшчэ не рэвалюцыя, але пах азону адчуваецца. Усе чакаюць: хто, дзе, калі?

—Я толькі жыць нармальна пачаў. Дайце пажыць!

—Спіць Расія. Не спадзявайцеся.

# ДЗЕСЯЦЬ ГІСТОРЫЙ БЕЗ ІНТЭР'ЕРУ

## Пра Рамэа і Джульету... толькі звалі іх Маргарыта і Абульфаз

*Маргарыта К. — армянская бежанка, 41 год*

—Ой! Я не пра гэта... Не пра гэта хачу... Я ведаю іншае...

Я дагэтуль сплю, закінуўшы рукі за галаву, звычка тых гадоў, калі было шчасце. Я так любіла жыць! Я — армянка, але нарадзілася і вырасла ў Баку. На беразе мора. Мора... маё мора! Я з'ехала, але я люблю мора, людзі і ўсё астатняе мяне расчаравалі, я люблю толькі мора. Мне яно часта сніцца — шэрае, чорнае, фіялетавае. І маланкі! Маланкі скачуць разам з хвалямі. Любіла глядзець удалечыню, глядзець, як увечары сядае сонца, яно ўвечары такое чырвонае, што, здаецца, шкварчыць, калі апускаецца ў ваду. Камяні, нагрэтыя за дзень, цёплыя камяні, быццам жывыя. Я любіла глядзець на мора раніцай і ўдзень, увечары і ўначы. Уначы з'яўляліся кажаны, і я іх моцна палохалася. Спявалі цыкады. Поўнае неба зорак... нідзе няма столькі зорак... Баку — мой самы любімы горад... Самы любімы, нягледзячы ні на што! У сне я часта гуляю па Губернатарскім садзе і Нагорным парку... падымаюся на замкавы мур... І адусюль відаць мора — караблі і нафтавыя вышкі... З мамай мы любілі заходзіць у чайхану і піць чырвоную гарбату. *(На вачах слёзы.)* Мама — у Амерыцы. Плача і сумуе. Я — у Маскве...

У Баку мы жылі ў вялікім доме... Быў вялікі двор, у двары шаўкоўніца расла, жоўтая шаўкоўніца. Смачная! Жылі ўсе разам, адной сям'ёй: азербайджанцы, рускія, армяне, украінцы, татары... Цётка Клара, цётка Сара... Абдула, Рубэн... Самая прыгожая — Сільва, яна працавала сцюардэсай на міжнарод-

ных лініях, лётала ў Стамбул, яе муж Эльмір быў таксістам. Яна — армянка, ён — азербайджанец, але ніхто над гэтым не задумваўся, такіх размоваў я не памятаю. Свет дзяліўся па-іншаму: добры чалавек ці дрэнны, сквапны ці шчодры. Сусед і госць. З адной вёскі… горада… Ва ўсіх адна нацыянальнасць — усе савецкія, усе ведалі рускую мову.

Самае прыгожае, самае ўлюбёнае свята ва ўсіх — Наўруз. Наўруз Байрам — дзень надыходу вясны. Чакалі свята ўвесь год, святкавалі сем дзён. Сем дзён не замыкаліся брамы і дзверы… удзень і ўначы ніякіх замкоў і ключоў… Палілі вогнішчы… Вогнішчы гарэлі на дахах і ў дварах. Увесь горад у вогнішчах! У агонь кідалі духмяную руту і прасілі шчасця, прыгаворвалі: «Сарылыгін сене, гырмызылыгін мене» — «Усе мае нягоды — табе, а маю радасць мне». «Гырмызылыгін мене…» Кожны зойдзе да кожнага — паўсюль прымуць як госця, пачастуюць малочным пловам і чырвонаю гарбатай з карыцай ці кардамонам. А на сёмы дзень, галоўны дзень свята, усе збіраліся разам… за адным сталом… Кожны выносіў у двор свой стол, і састаўлялі адзін доўгі-доўгі стол. На гэтым стале: грузінскія хінкалі, армянскія баракі і бастурма, рускія бліны, татарскі эчпачмак, украінскія варэнікі, мяса з каштанамі па-азербайджанску… Цётка Клава прыносіла свой фірмовы селядзец пад бураком, а цётка Сара фаршаваную рыбу. Пілі віно, армянскі каньяк. Азербайджанскі. Спявалі армянскія і азербайджанскія песні. І рускую «Кацюшу»: «Расцвіталі яблыні і грушы… Паплылі туманы над ракой…». Нарэшце час слодычаў: пахлава, шэкер-чурэк… Для мяне дагэтуль смачнейшага нічога ў свеце няма! Лепш за ўсіх слодычы атрымліваліся ў маёй мамы. «Што ў цябе за рукі, Кнарык! Якое лёгкае цеста!» — Заўсёды яе пахваляць суседкі.

Мама сябравала з Зейнаб, а ў Зейнаб было дзве дзяўчынкі і сын Анар, з якім мы вучыліся ў адным класе. «Аддасі дачку за майго Анара, — смяялася Зейнаб, — станем сваякамі». *(Угаворвае сябе.)* Плакаць не буду… Плакаць не трэба… Пачнуцца

армянскія пагромы… І цётка Зейнаб, добрая наша цётка Зейнаб, разам са сваім Анарам… мы ўцяклі, хаваліся ў добрых людзей… яны выцягнуць ноччу з нашага дома халадзільнік і тэлевізар… газавую пліту і новенькую югаслаўскую сценку… А адзін раз Анар сустрэне са сваімі сябрамі майго мужа, і яны будуць біць яго жалезнымі прэнтамі: «Які ты азербайджанец? Ты — здраднік! Ты жывеш з армянкай — нашым ворагам!» Мяне павяла да сябе сяброўка, я жыла ў іх на паддашку… Кожную ноч паддашак адчынялі, кармілі мяне — і я зноў сыходзіла наверх, уваход забівалі цвікамі. Намёртва забівалі цвікамі. Знойдуць — зарэжуць! Я выйшла адтуль з сівой грыўкай… *(Зусім ціха.)* Іншым кажу: не трэба па мне плакаць… А ў самой слёзы… Анар мне ў школе падабаўся, ён быў прыгожы хлопчык. Адзін раз мы з ім нават цалаваліся… «Прывет, каралева!» — чакаў ён мяне каля школьнае брамы. Прывет, каралева!

Я памятаю тую вясну… вядома, яна ўспамінаецца, але цяпер ужо рэдка… не часта… Вясна-а-а-а! Я скончыла вучылішча і ўладкавалася сувязісткай на тэлеграфе. На Цэнтральным тэлеграфе. Людзі стаяць каля акенца: адна плача — маці памерла, другая смяецца — у яе вяселле. З днём нараджэння! З залатым юбілеем! Тэлеграмы, тэлеграмы. Выклікаю Уладзівасток, Усць-Кут, Ашхабад… Работа вясёлая. Не сумная. А каханне чакаеш… у васямнаццаць гадоў заўсёды чакаеш кахання… Я думала, што каханне прыходзіць толькі раз, і тое, што гэта каханне, ты разумееш адразу. А было смешна, атрымалася вельмі смешна. Мне не спадабалася, як мы з ім пазнаёміліся. Раніцай я іду міма аховы, усе мяне ўжо ведалі, ніхто пропуска не патрабаваў: прывет-прывет — без пытанняў. А тут — «Прад'явіце пропуск». Я аслупянела. Стаіць перада мной высокі прыгожы хлопец і не прапускае. — «Вы штодзень мяне бачыце…» — «Прад'явіце пропуск». А я ў гэты дзень забылася пропуск, корпаюся ў сумцы — у мяне ніякіх дакументаў. Выклікалі майго начальніка… я атрымала вымову… І так узлавалася на гэтага хлопца! А ён…

У мяне была начная змена, і ён прыходзіць з сябрам піць гарбату. Гэта ж трэба! Прыносяць піражкі з павідлам, цяпер ужо няма такіх піражкоў, смачныя, але адкусваць страшна — ніколі не ведаеш, з якога боку вылезе павідла. Рагаталі! Але я з ім не размаўляла, крыўдавала. Яшчэ праз некалькі дзён знайшоў мяне пасля працы: «Я купіў квіткі ў кіно — пойдзеш?» Квіткі на маю ўлюбёную кінакамедыю «Міміно» з Вахтангам Кікабідзэ ў галоўнай ролі, я глядзела яе дзесяць разоў, ведала ўвесь тэкст напамяць. Як аказалася, ён таксама. Ідзём і пераклікаемся, правяраем адно аднаго: «Я табе адын разумны рэч скажу, толькі ты не крыўдуй». «Як я гэтую карову прадам, калі яе тут усе ведаюць?» І... пачалося каханне... У ягонага стрыечнага брата былі вялікія парнікі, ён гандляваў кветкамі. На сустрэчу Абульфаз заўсёды прыходзіў з ружамі — чырвонымі і белымі... Ружы бываюць нават бэзавыя, як быццам падфарбаваныя, а яны — сапраўдныя. Я марыла... Я часта марыла пра каханне, але я не ведала, як можа тахкаць маё сэрца, з грудзей ірвацца. На мокрым пляжы заставаліся нашы пасланні... на пяску... вялікімі літарамі «Я цябе люблю!!!». Праз дзесяць метраў яшчэ раз: «Я цябе люблю!!!». Тады ў горадзе паўсюль стаялі жалезныя аўтаматы з газаванай вадой, і ў аўтамаце адна шклянка на ўсіх. Памыеш — і п'еш. Падыходзім — няма шклянкі, і другі аўтамат без шклянкі. Я хачу піць! Мы столькі спявалі, гарлалі, смяяліся на моры — я хачу піць! З намі доўга здараліся чароўныя рэчы, неверагодныя, а потым перасталі. О, я ведаю гэта... Праўда! «Абульфаз, я хачу піць! Прыдумай што-небудзь!» Ён глядзіць на мяне і падымае рукі да неба, нешта доўга-доўга кажа-кажа. І аднекуль... з-за зарослых травой платоў і зачыненых шапікаў з'яўляецца п'яны чалавек і аддае шклянку: «Пры-ы-ыгожай дзяўчыне — не шкада».

А гэты світанак... Нідзе ні душы, толькі мы. І туман з мора. Я іду басанож, з-пад асфальту туман паўзе, як пара. Ізноў — цуд! З'яўляецца раптам — сонца! Святло... святлыня... як пасярод летняга дня... На мне імгненна высыхае мая летняя

сукенка, вільготная ад расы. «Ты такая прыгожая цяпер!» А ты… ты… *(На вачах слёзы.)* Іншым кажу: не трэба плакаць… А сама… Усё прыгадваецца… прыгадваецца… Але кожны раз усё меней галасоў, і сноў усё меней. Я марыла тады… я лётала! Толькі… Не было! Не было ў нас хэпі-энду: белай сукенкі, маршу Мендэльсона, вясельнага падарожжа… Хутка, вельмі хутка… *(Спыняецца.)* Нешта хацела сказаць… Нешта… Забываю самыя звычайныя словы… стала забываць… Я хацела сказаць, што неўзабаве, вельмі хутка… Мяне хавалі ў сутарэннях, я жыла на паддашках, я ператварылася ў котку… у кажана… Калі б вы маглі зразумець… калі б маглі… калі б вы ведалі, як страшна, калі ўначы нехта крычыць. Самотны крык. Закрычыць ноччу самотная птушка, і ўсім жудасна. А калі гэта чалавек? Я жыла з адной думкай: я кахаю… кахаю і яшчэ раз кахаю. Па-іншаму б не змагла, не вынесла. Як жа — такі жах! З паддашка спускалася толькі ўначы… шторы тоўстыя, як коўдра… Аднойчы паддашак адчынілі раніцай: «Вылазь! Уратавалася!» У горад увайшлі рускія войскі…

Думаю пра гэта… Я думаю пра гэта нават у сне — калі ўсё пачалося? Восемдзесят восьмы год… На плошчы збіраюцца нейкія людзі, яны ўсе ў чорным, танчаць і спяваюць. Танчаць з нажамі і кінжаламі. Будынак тэлеграфа побач з плошчай, усё на нашых вачах. Аблепім балкон — і глядзім. «Што яны крычаць?» — пытаюся. «Смерць няверным! Смерць!» Гэта працягвалася доўга, вельмі доўга… шмат месяцаў… Нас сталі адганяць ад вокнаў: «Дзяўчаты, гэта небяспечна. Сядзіце на сваіх месцах і не падымайцеся. Працуйце». Падчас абеду звычайна пілі гарбату разам, і раптам у адзін дзень: азербайджанкі селі за адзін столік, армянкі — за іншы. Імгненна, разумееце? А я ніяк не магла зразумець, ніяк. Да мяне яшчэ нічога не даходзіла. У мяне каханне… я занятая сваімі пачуццямі… «Дзяўчаты! Што здарылася?» — «Ты не чула? Начальнік сказаў, што неўзабаве ў яго будуць працаваць толькі чыстакроўныя мусульманкі». Мая бабуля перажыла армянскі

пагром у пятнаццатым годзе. Я памятаю… Яна мне ў дзяцінстве распавядала: «Калі я была такая маленькая, як ты, майго тату зарэзалі. І маму, і цётку. Усіх нашых авечак… — Вочы ў бабулі заўсёды былі журботныя. — Рэзалі суседзі… Да гэтага нармальныя людзі, можна нават сказаць, добрыя. За сталом у святы разам сядзелі…» Я думала, што гэта было даўно… хіба гэта можа быць цяпер? Пытаюся ў мамы: «Мама, ты бачыла — хлопчыкі ў двары гуляюць не ў вайну, а ў разню армян? Хто іх навучыў?» — «Маўчы, дачка. Суседзі пачуюць». Мама ўвесь час плакала. Сядзела і плакала. Дзеці цягалі па двары нейкае пудзіла і тыркалі ў яго палкамі, дзіцячымі кінжальчыкамі. «Хто гэта?» — я паклікала маленькага Архана, унука мамінай сяброўкі Зейнаб. — «Гэта армянская бабка. Мы яе забіваем. Цётка Рыта, а хто ты? Чаму ў цябе рускае імя?» Імя мне мама прыдумала… Мама любіла рускія імёны і ўсё жыццё марыла ўбачыць Маскву… Тата кінуў нас, тата жыў з іншай жанчынай, але ўсё адно гэта быў тата. Я выправілася да яго з навіной: «Тата, я выходжу замуж!» — «А добры хлопец?» — «Вельмі. Але завуць яго Абульфаз…» Тата маўчыць, ён хоча мне шчасця. А я пакахала мусульманіна… у яго іншы Бог… Тата маўчыць. І вось… Абульфаз прыйшоў да нас у дом: «Хачу прасіць тваёй рукі». — «А чаму ты адзін, без сватоў? Без сваякоў?» — «Яны ўсе супраць, а мне ніхто акрамя цябе не патрэбны». І мне… Мне таксама не патрэбны. Што рабіць нам з нашым каханнем?

Вакол тварылася не тое, што ўнутры… Не тое… зусім не тое… Уначы страшна і ціха ў горадзе… Ну як жа так, я не магу так. Ну што ж такое — жах! Удзень людзі не смяюцца, не жартуюць, перасталі купляць кветкі. Раней абавязкова хтосьці ідзе па вуліцы з кветкамі. Там цалуюцца і тут цалуюцца. А цяпер… Тыя ж людзі ідуць… і не глядзяць адзін на аднаго… Нешта павісла над усім і над усімі… нейкае чаканне…

Цяпер ужо не магу ўсё дакладна ўспомніць… Усё змянялася дзень пры дні… Цяпер усе ведаюць пра Сумгаіт… ад Баку

да Сумгаіта трыццаць кіламетраў… Там быў першы пагром… У нас працавала дзяўчына з Сумгаіта, і вось — усе пасля змены дадому, а яна застаецца на тэлеграфе. Начуе ў бакоўцы. Ходзіць заплаканая, на вуліцу нават не выглядвае, ні з кім не размаўляе. Пытаемся — маўчыць. Але калі яна загаварыла… стала яна гаварыць… Я хацела яе не чуць… Не чуць! Нічога не чуць! Ну што ж гэта такое! Ну што ж такое — як жа так! «Што з тваім домам?» — «Дом разрабавалі». — «А з тваімі бацькамі?» — «Маму вывелі ў двор, раздзелі дагала і — на вогнішча! А сястру цяжарную прымусілі танчыць вакол вогнішча… А калі забілі, жалезнымі прэнтамі выкалупвалі з яе дзіця…» — «Змоўкні! Змоўкні!» — «Тату пасеклі… сякерай… Сваякі пазналі яго толькі па ботах…» — «Змоўкні! Прашу цябе!» — «Збіраліся мужчыны, маладыя і старыя, па дваццаць-трыццаць чалавек, і ўрываліся ў дамы, дзе жылі армянскія сем'і. Забівалі і гвалтавалі — дачку пры бацьку, жонку пры мужу…» — «Змоўкні! Лепей заплач». А яна не плакала… так ёй было страшна… «Палілі аўтамабілі. На могілках валілі пліты з армянскімі прозвішчамі… мёртвых ненавідзелі…» — «Змоўкні! Хіба такое можа быць з людзьмі?!» Пачалі мы ўсе яе баяцца… А тэлебачанне, радыё і газеты… ніводнага слова пра Сумгаіт… Толькі чуткі… У мяне потым пыталіся: «Як вы жылі? Як вы жылі пасля ўсяго?» Прыйшла вясна. Жанчыны надзелі лёгкія сукенкі… Такі жах — і так вакол прыгожа! Разумееце? І мора.

Я збіраюся замуж… Мама просіць: «Дачушка, падумай». Тата маўчыць. Ідзём з Абульфазам па вуліцы, сустракаем ягоных сясцёр: «Чаму ты сказала, што яна пачвара? Паглядзі, якая прыгожанькая дзяўчынка». — Гэта яны так паміж сабой шэпчуцца. Абульфаз! Абульфаз! Прашу: «Давай распішамся без вяселля, вяселле рабіць не будзем». — «Ты што? У нас лічыцца, што жыццё чалавека складаецца з трох дзён: дня, калі ты нарадзіўся, дня, калі ты ажаніўся, і дня, калі ты памрэш». Ён не мог без вяселля, без вяселля шчасця не будзе. Яго бацькі катэгарычна супраць… катэгарычна! Не далі яму грошай на

вяселле і нават не вярнулі тых грошай, што ён сам зарабіў. А ўсё павінна быць паводле абраду… паводле старых звычаяў… Азербайджанскія звычаі прыгожыя, я іх люблю… Першы раз у дом нявесты прыходзяць сваты, іх толькі выслухоўваюць, а на другі дзень яны ўжо атрымліваюць згоду або адмову. Тады п'юць віно. Купіць белую сукенку і пярсцёнкі — справа жаніха, ён прыносіць іх у дом нявесты абавязкова раніцай… і каб быў сонечны дзень… бо шчасце трэба ўгаварыць, а цёмныя сілы аднадзіць. Нявеста прымае дар і дзякуе жаніху, пры ўсіх цалуе. На плячах у яе белая хустка, знак чысціні. Дзень Вяселля… З абодвух бакоў на вяселле прыносяць шмат падарункаў, гару падарункаў, іх кладуць на вялікія падносы, абвязаныя чырвонымі стужкамі. Яшчэ надзімаюць сотні рознакаляровых шароў, яны некалькі дзён лётаюць па-над домам нявесты, чым даўжэй яны лётаюць, тым лепей, значыць, каханне моцнае і ўзаемнае.

Маё вяселле… наша… Усе падарункі ад дома жаніха і ад дома нявесты… набывала мая мама… І белую сукенку, і залаты пярсцёнак… За сталом сваякі нявесты павінны перад першым тостам устаць і расхвальваць дзяўчыну, а родныя жаніха хваляць хлопца. За мяне трымаў слова мой дзядуля, ён скончыў і пытаецца ў Абульфаза: «А хто за цябе нам слова закіне?» — «Я сам за сябе скажу. Я кахаю вашу дачку. Кахаю больш за жыццё». Так ён гэта сказаў, што ўсім спадабаўся. Сыпалі нам на парог дробныя манеты, рыс — для шчасця і багацця. І там… Ёсць адзін момант… Ёсць падчас вяселля такі момант, калі сваякі з аднаго боку павінны ўстаць і пакланіцца сваякам з другога боку, а тыя — таксама. Абульфаз устаў адзін… як бязродны… «Я нараджу табе дзіцятка, ты не будзеш адзін», — падумала я. Паклялася. А ён ведаў, я даўно яму прызналася, што ў юнацтве цяжка хварэла і лекары вынеслі прысуд: нараджаць мне нельга. Ён і на гэта быў згодны, толькі б нам быць разам. Але я… Я вырашыла — нараджу. Хай нават сама памру, але дзіцятка ж застанецца.

Мой Баку...

...мора... мора... мора...

...сонца... сонца... сонца... Не мой Баку...

...Дзвярэй у пад'ездзе няма, вялікія дзіры ад дзвярэй завешаныя кавалкамі цэлафану...

...Мужчыны ці падлеткі... ад жаху не запомніла... б'юць — забіваюць каламі (дзе яны іх пазнаходзілі ў горадзе?) жанчыну... яна ляжыць на зямлі без гуку. Людзі ўбачаць — звarочваюць на іншую вуліцу. Дзе міліцыя? Міліцыя знікла... днямі я не бачыла ніводнага міліцыянера... Абульфазу дома моташна. Ён добры, вельмі добры. Але адкуль узяліся тыя... там, на вуліцы? Насустрач нам бег чалавек увесь у крыві... паліто, рукі ў крыві... у руках доўгі кухонны нож, якім зеляніну крышаць... У яго быў урачысты... можа, нават шчаслівы твар... «Я яго ведаю», — сказала знаёмая дзяўчынка, з якой мы стаялі на прыпынку і чакалі аўтобуса.

...Штосьці ўва мне тады знікла... чагосьці ўва мне больш няма...

...Мама звольнілася з працы... Ужо небяспечна было хадзіць па вуліцах, яе пазнавалі адразу. А мяне не. Пры адной умове — ніякіх дакументаў з сабой не браць. Ніякіх! Абульфаз сустракаў мяне пасля працы, мы ішлі разам, ніхто не падазраваў, што я — армянка. Але кожны мог падысці і запатрабаваць: «Пакажы пашпарт!» «Хавайцеся. Сыходзьце», — папярэдзілі суседзі, рускія бабулі. Маладыя рускія з'ехалі, кінулі кватэры, добрую мэблю. Засталіся бабулі... добрыя рускія бабулі...

...А я ўжо цяжарная... Я нашу пад сэрцам дзіця...

Разня ў Баку працягвалася некалькі тыдняў... адны кажуць так, а іншыя кажуць, што больш... Забівалі не толькі армян, забівалі і тых, хто хаваў армян. Мяне хавала мая азербайджанская сяброўка, у яе сям'я — муж і двое дзяцей. Калі-небудзь... Клянуся! Я прыеду ў Баку, прыеду са сваёй дачкой і прыйду ў гэты дом: «Гэта — твая другая маці, дачушка». Шторы тоўстыя... як паліто... такія шторы... гэта спецыяльна пашылі,

дзеля мяне. Уначы я спускалася з паддашка… на гадзіну-дзве… Размаўлялі шэптам, са мной трэба было размаўляць. Усе разумелі: са мной трэба гаварыць, каб я не здранцвела, не звар'яцела. Не страціла дзіця і не завыла ўначы. Як звер.

Я памятаю нашы размовы, добра памятаю. Увесь дзень сядзела на паддашку і перабірала іх у памяці. Я — адна… Палоска неба вузенькая… праз шчыліну…

«…Спынілі старога Лазара на вуліцы і пачалі біць… "Я — габрэй", — даводзіў ён. Пакуль знайшлі пашпарт, скалечылі…»

«…Забіваюць за грошы і проста так… Асабліва шукаюць дамы, дзе жывуць багатыя армяне…»

«…У адным доме забілі ўсіх… А наймешная дзяўчынка залезла на дрэва… Яны яе, як птушачку… Уначы дрэнна відаць, доўга не патраплялі. Злаваліся… цалялі. Упала ім пад ногі…»

Муж сяброўкі быў мастак. Я любіла ягоныя карціны, ён маляваў жаночыя партрэты і нацюрморты. І я памятаю, як ён падыходзіў да кніжных паліц і стукаў па карэньчыках: «Трэба ўсё спаліць! Спаліць! Я болей кнігам не веру! Мы думалі, што дабро пераможа — нічога падобнага! Спрачаліся пра Дастаеўскага… Так, гэтыя героі заўсёды тут! Сярод нас. Побач!» Я не разумела, пра што ён гаворыць, я — дзяўчына простая, звычайная. Ва ўніверсітэце не вучылася. Умела толькі плакаць… выціраць слёзы… Я доўга верыла, што жыву ў найлепшай краіне, сярод найлепшых людзей. Так нас у школе вучылі. А ён перажываў страшэнна, перажываў гэта вельмі цяжка. І ў яго здарыўся інсульт, яго паралізавала… *(Спынілася.)* Памаўчу… Нешта дрыжу ўся… *(Праз некалькі хвілінаў працягвае.)* Увайшлі ў горад рускія войскі. Я магла ўжо вярнуцца дадому… Ён ляжаў, толькі адной рукой мог трохі варушыць. І ён мяне абняў гэтай рукой. «Усю ноч я думаў пра цябе, Рыта, і пра сваё жыццё. Шмат гадоў… Усё жыццё я змагаўся з камуністамі. А цяпер у мяне сумневы: няхай бы намі кіравалі гэтыя старыя муміі, чаплялі адзін аднаму чарговыя Зоркі Герояў, а мы не ездзілі б за мяжу, не чыталі забароненыя

кнігі і не елі піцу — ежу багоў. Але тая маленькая дзяўчынка… яна засталася б жывая, ніхто б яе не падстрэліў… Як птушачку… І ты не сядзела б на паддашку, як мыш…» Неўзабаве ён памёр… праз кароткі час… Тады многія паміралі, паміралі добрыя людзі. Не маглі ўсё гэта перажыць.

На вуліцах паўсюль рускія салдаты. Вайсковая тэхніка. Рускія салдаты… яны ж былі хлопчыкі… прытомнасць гублялі ад таго, што бачылі…

У мяне восьмы месяц цяжарнасці… Неўзабаве нараджаць. Уначы мне кепска, тэлефануем у «хуткую дапамогу» — там пачуюць армянскае прозвішча і кладуць слухаўку. У радзільню таксама не ўзялі, ні па месцы жыхарства… нідзе… Разгортваюць пашпарт і адразу — месцаў няма. Месцаў няма! Нікуды і ніяк, ніяк. Мама знайшла старую акушэрку, рускую жанчыну, якая калісьці ў яе роды прымала… даўным-даўно… Знайшла яна яе дзесьці ў пасёлку на ўскраіне горада. Звалі яе Ганна… імя па бацьку не памятаю. Раз на тыдзень яна прыходзіла да нас дадому, назірала за мной і казала, што роды будуць цяжкія. Схваткі пачаліся ўначы… Абульфаз пабег лавіць таксі, датэлефанавацца не змог. Таксіст прыехаў і ўбачыў мяне: «Што — армянка?» — «Яна — мая жонка». — «Не, я не паеду». Муж заплакаў. Дастаў кашалёк і паказвае грошы, увесь свой заробак: «На… Я табе ўсё аддам… Ратуй мне жонку і дзіця». Мы паехалі… паехалі ўсе… І мама з намі таксама. Паехалі ў пасёлак, дзе жыла Ганна, у шпіталь, дзе яна працавала на паўстаўкі. Падпрацоўвала да пенсіі. Яна ўжо чакала нас, і мяне адразу паклалі на стол. Нараджала я доўга… сем гадзін… Нараджалі мы ўдзвюх: я і азербайджанка, там была адна падушка, і гэтую падушку аддалі ёй, я вельмі нізка галавой ляжала. Нязручна, балюча… Мама стаяла каля дзвярэй. Яе гналі, яна не сыходзіла. А раптам скрадуць дзіця… а раптам? Усё магло быць… усё тады магло быць… Нарадзіла я дзяўчынку… Прынеслі мне яе адзін раз, паказалі і болей не нясуць. Іншым маці (азербайджанкам) даюць дзяцей карміць,

а мне — не. Чакала я два дні. А потым… па сценачцы… трымаючыся за сценачку… дапаўзла да пакоя, дзе ляжалі дзеці. Ніводнага дзіцяці няма, толькі мая дзяўчынка ляжыць, а дзверы і вокны — насцеж. Памацала я яе, яна гарыць, уся гарачая. Якраз прыйшла мая мама… «Мама, забіраем дзіця і сыходзім. Дзіця ўжо хворае».

Дачка доўга хварэла. Лячыў яе стары доктар, ён быў даўно на пенсіі. Габрэй. Але ён хадзіў і дапамагаў армянскім сем'ям. «Армян забіваюць за тое, што яны армяне, як калісьці забівалі габрэяў за тое, што яны габрэі», — казаў ён. Быў вельмі-вельмі стары. Дачцэ далі імя Іра… Ірынка… Вырашылі: хай будзе рускае імя, яно абараняе. Абульфаз першы раз узяў дзіця на рукі і заплакаў. Рыдаў… Ад шчасця… яно таксама тады было — шчасце… Наша шчасце! У гэты час захварэла ягоная мама… Ён стаў часта сыходзіць да сваіх сваякоў. Вяртаўся ад іх… я не знайду слоў… якім ён вяртаўся. Вяртаўся да нас чужым, з незнаёмым тварам. Я, вядома, палохалася. У горадзе ўжо было поўна ўцекачоў, гэта тыя азербайджанскія сем'і, якія ўцякалі з Арменіі. Уцяклі яны з пустымі рукамі, без рэчаў, уцяклі дакладна гэтак, як армяне з Баку. І расказвалі ўсё тое самае. Ой! Ой, усё тое самае. Пра Хаджалу, дзе быў азербайджанскі пагром… Як там армяне забівалі азербайджанцаў — выкідвалі жанчын з вокнаў… адразалі галовы… мачыліся на мёртвых… Мне ніводны фільм жахаў цяпер не страшны! Я столькі ўсяго бачыла і чула… столькі ўсяго! Я не спала па начах, думала-перадумала — трэба з'язджаць. З'язджаць трэба! Ну так жа нельга, я не магу так. Уцякаць… уцякаць, каб забыць… А калі б сцярпела — памерла… я ведаю, што памерла б…

Першай з'ехала мама… За ёй — тата са сваёй другой сям'ёй. За імі — мы з дачкой. З'язджалі з падробленымі дакументамі… з пашпартамі на азербайджанскія прозвішчы… Тры месяцы не маглі купіць квіткі. Такія былі чэргі! А зайшлі ў самалёт — скрыняў з садавінай і кардонак з кветкамі там было больш за пасажыраў. Бізнэс! Бізнэс квітнеў. Папeрадзе

нас сядзелі маладыя азербайджанцы, яны ўсю дарогу пілі віно і казалі, што з'язджаюць, бо не хочуць забіваць. Не хочуць ісці на вайну і паміраць. Дзевяноста першы год... На ўсю моц ішла вайна ў Нагорным Карабаху... Гэтыя хлопцы адкрыта прызнаваліся: «Мы не хочам класціся пад танк. Мы не гатовыя». У Маскве нас сустрэў стрыечны брат... «А дзе Абульфаз?» — «Прыляціць праз месяц». Сабраліся ўвечары сваякі... Усе мяне прасілі: «Ты кажы, кажы — не бойся. Тыя, хто маўчаць, пачынаюць хварэць». Праз месяц я пачала размаўляць, а думала, што ўжо не буду. Змоўкну — і ўсё.

Я чакала... і чакала... і чакала... Абульфаз прыехаў да нас не праз месяц... і не праз паўгода, а праз сем гадоў. Праз сем гадоў... Сем... А-а-а-а... Калі б не дачка... я не выжыла б... Дачка мяне выратавала. Дзеля яе я трымалася з усяе моцы. Каб выжыць, трэба хоць бы танюткую нітачку знайсці... Каб выжыць... і чакаць... Проста раніца... яшчэ адна раніца... Ён увайшоў у кватэру, абняў нас з дачкой. Стаіць. Ён стаіць... яшчэ стаіць у вітальні... і я бачу, як ён павольна-павольна, на маіх вачах падае. Праз нейкую хвіліну ён ужо ляжаў на падлозе, у паліто і шапцы. Дацягнулі яго да канапы, паклалі. Перапалохаліся: трэба выклікаць доктара — а як? У нас няма маскоўскай прапіскі, няма медычнай страхоўкі. Мы — уцекачы. Пакуль мы так узважвалі, мама плакала... дачка з вось такімі вачыма сядзела ў куце... Чакалі тату — а тата прыехаў і памірае. У гэты час ён расплюшчыў вочы: «Не трэба доктара. Не бойцеся. Усё! Я — дома». Тут буду плакаць... Тут буду... *(Першы раз за ўвесь час нашай размовы заплакала.)* Як тут без слёз... Месяц ён хадзіў за мной па кватэры на каленях, цалаваў і цалаваў рукі: «Што ты хочаш сказаць?» — «Я люблю цябе». — «Дзе ты быў столькі гадоў?»

...У яго выкралі адзін пашпарт... Другі... Усё гэта ягоныя сваякі...

...Прыехалі ў Баку яго стрыечныя браты... Іх выгналі з Ерэвана, дзе жылі яшчэ іх дзяды і бацькі. Кожны вечар аповеды...

абавязкова, каб ён чуў… Як злупілі скуру з хлопчыка і павесілі на дрэве. А суседу таўро на лбе паставілі гарачай падковай… Як… Як… «А ты куды сабраўся?» — «Да жонкі». — «Ты едзеш да ворага нашага. Ты нам не брат. Не сын».

…Я яму тэлефанавала… Мне адказвалі: «Дома няма». А яму перадавалі, быццам я тэлефаную і кажу, што выходжу замуж. Я тэлефанавала і тэлефанавала. Трубку брала яго родная сястра: «Забудзь нумар гэтага тэлефона. У яго іншая жанчына. Мусульманка».

…Мой тата… Хацеў мне шчасця… Забраў мой пашпарт і аддаў яго нейкім хлопцам, каб мне паставілі пячатку аб разводзе. Фальшывую. Нешта яны фарбавалі, мылі і выпраўлялі, і там цяпер — дзірка. «Тата! Навошта ты гэта зрабіў? Ты ж ведаеш — я люблю!» — «Ты любіш нашага ворага». Пашпарт у мяне сапсаваны… цяпер несапраўдны…

…Чытала Шэкспіра «Рамэа і Джульета»… Пра варажнечу двух сямейных кланаў — Мантэкі і Капулецці. Гэта ўсё пра мяне… я кожнае слова там разумела…

Я не пазнавала дачку. Яна стала ўсміхацца… З першай хвіліны, калі яго ўбачыла: «Тата! Та-тачка!» Маленькая… яна даставала з валізкі яго фотаздымкі і цалавала. Але так, каб я не бачыла… І не плакала…

І гэта не канец… Вы думаеце гэта ўсё? Канец? Ой, канца яшчэ няма…

…І тут жывём як на вайне… Усюды чужыя. Мяне вылечыла б мора. Маё мора! А мора побач няма…

…Я метро мыла, прыбіральні чысціла. На будоўлі цэглу цягала і мяхі з цэментам. Цяпер у рэстаране прыбіраю. Абульфаз еўрарамонты робіць у багатых кватэрах. Добрыя людзі плацяць, дрэнныя падманваюць: «Валі адсюль, чучмек! Зараз у міліцыю патэлефануем». У нас няма прапіскі… няма ніякіх правоў… Такіх, як мы, тут як пяску ў пустыні. Сотні тысяч людзей уцяклі з дому: таджыкі, армяне, азербайджанцы, грузіны, чачэнцы… Уцяклі ў Маскву — у сталіцу СССР, а гэта ўжо

сталіца іншай дзяржавы. А нашай дзяржавы ўжо на карце не знайсці…

…Дачка год таму скончыла школу… «Мама… тата… Я вучыцца хачу!» Пашпарта ў яе няма… Жывём транзітам. Жывём у адной бабулі, яна пераехала да сына, а нам здала сваю аднапакаёвую кватэру. Міліцыя стукае з праверкай дакументаў… Мы — як мышы, стаіўшыся. Зноў як мышы. Выкінуць назад… А куды назад? Куды нам ехаць? Выкінуць за дваццаць чатыры гадзіны! Грошай, каб адкупіцца, у нас няма… І іншую кватэру ўжо не знайсці. Паўсюль вісяць аб'явы: «Здамо кватэру славянскай сям'і…», «Здамо… праваслаўнай рускай сям'і. Іншых просім не турбаваць…»

…З дому ўвечары — нікуды! Муж ці дачка затрымаюцца дзе-небудзь — я валяр'янку п'ю. Прашу дачку: не фарбуй бровы, не насі яркія сукенкі. Там забілі армянскага хлопчыка, там зарэзалі таджыкскую дзяўчынку… азербайджанца скалолі нажом… Раней мы ўсе савецкія былі, а цяпер у нас новая нацыянальнасць — «асоба каўказскай нацыянальнасці». Я бягу раніцай на працу і ніколі не гляджу маладым хлопцам у твар — у мяне чорныя вочы, чорныя валасы. У нядзелю, калі выйдзем з сям'ёй на вуліцу, дык прагуляемся ў сваім раёне, каля свайго дома: «Мама, я хачу на Арбат. Хачу пахадзіць па Чырвонай плошчы». — «Туды не пойдзем, дачушка. Там — скінхеды. Са свастыкай. Іх Расія — для рускіх. Без нас». *(Маўчыць.)* Ніхто не ведае, колькі разоў я хацела памерці.

…Мая дзяўчынка… яна з дзяцінства чуе: «чучмечка»… «чурка»… Малая нічога не разумела. Вернецца са школы, я яе цалую, цалую, каб яна ўсе гэтыя словы забыла.

Усе армяне з Баку з'ехалі ў Амерыку… чужая краіна іх прыняла… І мама з'ехала, і тата, і шмат нашых сваякоў. Я таксама пайшла ў амерыканскае пасольства. «Раскажыце вашу гісторыю», — папрасілі мяне. Я расказала ім пра сваё каханне… Маўчалі, яны доўга маўчалі. Маладыя амерыканцы, зусім маладыя. Пасля пачалі гаварыць паміж сабой: і пашпарт, маўляў,

у яе сапсаваны, і дзіўна ўсё ж, чаму муж сем гадоў не прыязджаў? Муж гэта ці не муж? Занадта прыгожая і страшная гісторыя, каб паверыць. Так яны казалі. Я трошкі ведаю англійскую... Я зразумела, што яны мне не вераць. А ў мяне няма іншых доказаў, акрамя таго, што я кахаю... Вы мне верыце?

— Я веру... — кажу я. — Я вырасла ў той самай краіне, што і вы. Я веру! *(І мы абедзве плачам.)*

## Пра людзей, якія адразу сталі іншымі пасля камунізму

*Людміла Малікава — тэхнолаг, 47 гадоў*

*З расповеду дачкі*

### *Пра час, калі ўсе жылі аднолькава*

— Вы Маскву добра ведаеце? Кунцаўскі раён... Мы жылі ў пяціпавярховіку, там у нас была кватэра, трохпакаёвая кватэра, яна ў нас з'явілася, калі мы з бабуляй з'ехаліся. Дзядуля памёр, яна доўга жыла адна, але пачала слабець, і мы вырашылі, што нам трэба жыць разам. Я ўзрадавалася, я любіла бабулю. Мы хадзілі з ёй разам на лыжах, гулялі ў шахматы. Неверагодная была бабуля! Тата... Тата быў, але тата жыў з намі нядоўга, ён загуляў, стаў моцна выпіваць з сябрукамі, і мама папрасіла яго сысці... ён працаваў на закрытым вайсковым заводзе... З дзяцінства памятаю, як тата прыходзіў да нас на выходных, прыносіў мне падарункі, цукеркі і садавіну — заўсёды стараўся, каб гэта была самая вялікая груша, самы вялікі яблык. Хацеў мяне здзівіць: «Заплюшчы вочы, Юлечка — вось!» Прыгожа так смяяўся... А потым тата кудысьці знік... Жанчына, з якой ён жыў пасля нас, — гэта маміна сяброўка — таксама яго прагнала, надакучылі ягоныя п'янкі. І я не ведаю, ці жывы, але калі б быў жывы, ён бы мяне шукаў...

Да маіх чатырнаццаці гадоў жылі мы спакойна. Да перабудовы... Нармальна жылі, пакуль не пачаўся капіталізм, тады ў тэлевізары казалі «рынак». Усе мала разумелі, што гэта, і ніхто нічога не тлумачыў. А пачалося ўсё з таго, што стала можна ганіць Леніна і Сталіна. Ганілі маладыя, а старыя людзі маўчалі, яны выходзілі з тралейбуса, калі чулі, што нехта лае камуністаў. У нас у школе малады настаўнік матэматыкі быў супраць камуністаў, а стары настаўнік гісторыі — за камуністаў. Дома бабуля казала: «Замест камуністаў цяпер будуць спекулянты». Мама з ёй спрачалася: не, маўляў, будзе прыгожае, справядлівае жыццё, яна хадзіла на дэманстрацыі, захоплена пераказвала нам прамовы Ельцына. Нашу бабулю пераканаць было немагчыма: «Прамянялі сацыялізм на бананы. На жуйку...» Спрэчкі пачыналіся ўранку, потым мама сыходзіла на працу, увечары яны працягвалі спрачацца. Калі Ельцына паказвалі ў тэлевізары, мама хутчэй сядала ў крэсла: «Вялікі чалавек!», бабуля хрысцілася: «Злачынца, даруй госпадзе». Яна была камуністка да касцей. Галасавала за Зюганава. Усе пайшлі ў царкву, і бабуля пайшла, стала хрысціцца і пасціць, але верыла яна толькі ў камунізм... *(Маўчыць.)* Любіла распавядаць мне пра вайну... У сямнаццаць гадоў яна добраахвотна пайшла на фронт, і там у яе закахаўся наш дзядуля. Марыла быць тэлефаністкай, але ў тым войску, куды яна трапіла, патрабаваліся кухары, і яна стала кухарам. І дзядуля быў кухарам, яны кармілі ў шпіталі параненых. Параненыя трызнілі, крычалі: «Давай! Давай! Наперад!» Шкада, яна так шмат распавядала, а я толькі кавалачкі памятаю... У медсясцёр заўсёды стаяла напагатове вядро з крэйдай, скончаліся таблеткі і парашкі, і яны рабілі пілюлі з гэтай крэйды, каб параненыя не сварыліся і не білі іх мыліцамі... Тады не было тэлевізара, і ніхто не бачыў Сталіна, але ўсе хацелі ўбачыць Сталіна. І мая бабуля таксама, да самай смерці яна яму пакланялася: «Калі б не Сталін, мы б немцам жопу лізалі». Яшчэ й мацюкнецца. А мама Сталіна не любіла, яна называла яго «злыднем» і «ду-

шагубцам»... Будзе няшчыра, калі скажу, што я пра гэта шмат думала... Жыла, радавалася. Першае каханне...

Мама працавала дыспетчарам у навукова-даследчым інстытуце геафізікі. Мы сябравалі. Я дзялілася з ёй усімі сваімі сакрэтамі, нават тым, што звычайна мамам не гавораць. З маёй мамай гэта было можна, яна была зусім не дарослая. Як старэйшая сястра. Любіла кнігі... музыку... Жыла гэтым. А кіравала ў нас бабуля... Мама ўспамінала, што я ў дзяцінстве была залатая, ёй не трэба было мяне прасіць, угаворваць. Праўда, маму я любіла... Мне падабаецца, што я да яе падобная, і чым далей, тым больш. Амаль адзін твар. Мне гэта падабаецца... *(Маўчыць.)* Вельмі небагата мы жылі, але неяк жылі. Усе вакол былі такія самыя, як мы. Было нават весела, да мамы прыходзілі сябры, размаўлялі, спявалі песні. Я памятаю Акуджаву з дзяцінства: «Адзін салдат на свеце жыў, / прыгожы і харобры, / але ж дзіцячай цацкай быў: / бо быў ён папяровы...» Бабуля ставіла на стол місу бліноў, пякла смачныя пірагі. Да маці многія мужчыны заляцаліся, яны ёй дарылі кветкі, а мне куплялі марозіва, і яна адзін раз нават у мяне спытала: «А можна я выйду замуж?» Я не пярэчыла, бо мама была прыгожая, і мне не падабалася, што яна самотная, я хацела шчаслівую маму. На яе заўсёды звярталі ўвагу на вуліцы, то адзін мужчына абернецца, то другі. «Чаго гэта яны?» — пыталася я маленькая. — «Хадзем! Хадзем!» — смяялася мама, неяк па-асабліваму смяялася. Нязвыкла. Праўда, нам было добра. Я потым, калі засталася адна, прыходзіла на нашу вуліцу і глядзела на нашы вокны. Аднойчы не вытрымала і пазваніла ў нашы дзверы — там ужо жыла грузінская сям'я. Напэўна, яны падумалі, што я жабрачка, хацелі даць мне грошай і ежы. Я заплакала і ўцякла...

Неўзабаве бабуля захварэла, у яе была такая хвароба, што яна ўвесь час хацела есці, кожныя пяць хвілінаў, выскоквала на лесвічную пляцоўку і крычала, што мы яе морым голадам. Біла талеркі... Мама магла змясціць яе ў спецыяльную клініку,

але вырашыла, што будзе сама даглядаць, яна таксама моцна любіла бабулю. Часта даставала з серванта яе ваенныя фатаграфіі, глядзела на іх і плакала. На фатаграфіях была маладая дзяўчына, да бабулі не падобная, але гэта была наша бабуля. Як быццам іншы чалавек... Так атрымліваецца... так... Да самай смерці бабуля чытала газеты, цікавілася палітыкай... А калі захварэла, на тумбачцы ў яе ляжала толькі адна кніга... Біблія... Яна клікала мяне і чытала: «І вернецца прах у зямлю, чым ён і быў, а дух вернецца да Бога...» Увесь час думала пра смерць: «Мне ўжо так цяжка, унучка. Так сумна».

Гэта быў выходны... мы ўсе дома... Я зазірнула ў пакой бабулі, яна ўжо дрэнна хадзіла, больш ляжала, я ўбачыла, што яна сядзіць і глядзіць у акно. Папаіла яе вадзічкай. Прайшло трохі часу... Ізноў зайшла да яе, паклікала, яна маўчыць, я ўзяла яе за руку, а рука халодная, вочы былі расплюшчаныя і глядзелі ў тое самае акно. Да гэтага я ні разу не бачыла смерць, спалохалася і закрычала. Прыбегла мама, адразу заплакала, заплюшчыла бабулі вочы. Трэба было тэлефанаваць у «хуткую дапамогу»... Яны зараз жа прыехалі, але доктар запатрабавала ў мамы грошы за даведку пра смерць і за тое, што яны адвязуць бабулю ў морг: «А што вы хочаце? Рынак!» Грошай у нас у доме не было наогул... Якраз у гэты час маму скарацілі на працы, два месяцы яна ўжо была ў пошуку, але куды ні пойдзе па аб'яве, там ужо чарга. Мама скончыла тэхналагічны інстытут з чырвоным дыпломам. Пра тое, каб знайсці працу па спецыяльнасці, не магло быць і гаворкі, з інстытуцкімі дыпломамі ўладкоўваліся прадаўцамі, пасудамыйкамі. Офісы прыбіралі. Усё стала іншае... Я не пазнавала на вуліцах людзей, як быццам усе пераапрануліся ў нешта шэрае. Каляровага нічога не было. Так я гэта запомніла... «Гэта ўсё твой Ельцын... твой Гайдар... — плакала бабуля, калі была жывая. — Што яны з намі зрабілі? Яшчэ трохі, і будзе, як у вайну». Мама маўчала, на маё здзіўленне, мама змоўкла. На кожную рэч у доме мы глядзелі толькі так — ці можна яе прадаць? Прадаць не

было чаго… Жылі на бабуліну пенсію. Сядзелі на адной шэрай макароне… За ўсё жыццё бабуля сабрала пяць тысяч, яны захоўваліся на ашчаднай кніжцы, іх павінна было хапіць, як яна казала, каб дажыць, на «чорны дзень» і на пахаванне. А гэта стаў адзін трамвайны білет… Пушка запалак… Грошы ва ўсіх за адзін дзень прапалі. Абдзіралаўку народу зладзілі… Больш за ўсё бабуля баялася, што мы пахаваем яе ў цэлафанавым пакеце або загорнем у газеты. Труна каштавала шалёныя грошы, і хавалі па-ўсякаму… Бабуліну сяброўку цётку Феню — яна на фронце медсястрой была — дачка пахавала ў газетах… загарнула ў старыя газеты… Медалі проста так у ямку паклалі… Дачка — інвалід, на сметніках корпалася… Гэта ўсё было так несправядліва! З сяброўкамі я хадзіла ў камерцыйную краму, разглядалі там каўбасы. Нейкія бліскучыя абгорткі. У школе тыя, у каго былі легінсы, дражнілі тых, каму бацькі не маглі купіць гэтыя легінсы. Мяне дражнілі… *(Маўчыць.)* Але мама паабяцала бабулі, што пахавае яе ў труне. Паклялася.

Доктар убачыла: грошай у нас няма — яны развярнуліся і з'ехалі. Пакінулі бабулю нам…

Тыдзень мы жылі з бабуляй… Мама некалькі разоў на дзень абцірала яе марганцоўкай і накрывала мокрай прасцінай. Задраіла ўсе вокны і форткі, падаткнула дзверы мокраю коўдрай. Яна адна гэта рабіла, я баялася заходзіць у бабулін пакой, хуценька прабягала на кухню і назад. Пах быў… ужо з'явіўся… Праўда, нам яшчэ, грэх сказаць, пашанцавала: за час хваробы бабуля моцна схуднела, засталіся адны костачкі… Сталі тэлефанаваць сваякам… У нас сваякоў — палова Масквы, і раптам — нікога, яны не адмаўляліся — прыязджалі з трохлітровымі слоікамі марынаваных кабачкоў, агуркоў, з сочывам, але грошай ніхто не прапаноўваў. Пасядзяць, паплачуць і паедуць. Ніхто не меў жывых грошай. Я так думаю… Стрыечнаму мамінаму брату заробак на заводзе выдалі кансервамі, прывёз нам кансервы. Што мог… Тады нармальным лічылася — падараваць на дзень нараджэння кавалачак мыла,

зубную пасту… У нас былі добрыя суседзі, праўда, добрыя. Цётка Аня з мужам… Яны спакоўвалі рэчы — пераязджалі да бацькоў у вёску, дзяцей ужо туды адаслалі — ім не да нас. Цётка Валя… Як яна магла дапамагчы, калі ў яе муж п'е і сын п'е? У мамы было столькі сяброў… Але ў іх таксама ў доме нічога не было, акрамя кніжак. Палова ўжо засталася без працы… Тэлефон памёр. Людзі адразу сталі іншымі пасля камунізму. Усе жылі пры зачыненых дзвярах… *(Маўчыць.)* Я марыла: засну, а раніцай прачнуўся — і бабуля жывая.

### *Пра час, калі бандыты хадзілі па вуліцах і нават не хавалі пісталеты*

Хто такія? З'явіліся нейкія незразумелыя людзі, яны былі ў курсе ўсяго: «Ведаем вашу бяду. Мы вам дапаможам». Патэлефанавалі кудысьці — тут жа прыйшоў доктар і выдаў даведку пра смерць, і міліцыянер прыйшоў. І труну дарагую купілі, і катафалк быў, і шмат кветак, якіх толькі кветак там ні было — усё як мае быць. Бабуля прасіла пахаваць яе на Хаванскіх могілках, але без хабару туды не прабіцца, могілкі старыя, вядомыя, але так і зрабілі, прывезлі бацюшку, ён памаліўся. Так прыгожа ўсё. Мы з мамай толькі стаялі і плакалі. Усім запраўляла цётка Іра, яна была ў гэтай кампаніі галоўная, з ёй увесь час хадзілі накачаныя хлопцы, ейная ахова. Адзін з гэтых дзецюкоў ваяваў у Афганістане, і маму гэта чамусьці супакойвала, яна лічыла, што калі чалавек быў на вайне ці пры Сталіне сядзеў у лагеры, дык гэты чалавек не можа быць кепскім: «Як жа — ён так пацярпеў!» І ўвогуле, у нас чалавека ў бядзе не кінуць — гэта было яе перакананне, мы ўспаміналі бабуліны аповеды пра тое, як людзі ў вайну ратавалі адзін аднаго. Савецкія людзі… *(Маўчыць.)* А ўжо былі нейкія іншыя людзі. Не зусім савецкія… Я кажу, як цяпер гэта ўяўляю, а не як тады… Намі зацікавілася банда, але для мяне тады яны

былі дзядзькі і цёткі — пілі з намі гарбату на кухні, частавалі цукеркамі. Цётка Іра прывозіла прадукты, калі бачыла нашу зусім пустую лядоўню, падарыла мне джынсавую спаднічку — тады ўсе маліліся на джынс! Можа, месяц яны так хадзілі, мы да іх прызвычаіліся, і яны робяць маме прапанову: «Давайце прадамо вашу трохпакаёвую кватэру і набудзем аднапакаёвую. У вас будуць грошы». Мама пагадзілася… Яна ўжо ўладкавалася ў кавярню: мыла посуд, сталы праціраала, але грошай катастрафічна не хапала. Пачалі нават абмяркоўваць, куды мы пераедзем, у які раён. Я не хацела мяняць школу. Шукалі што-небудзь паблізу.

У гэты момант аб'яўляецца іншая банда. Там верхаводам быў мужчына… дзядзька Валодзя… І яны з цёткай Ірай сталі паміж сабой змагацца за нашу кватэру. «Навошта вам аднапакаёвая? — крычаў на маму дзядзька Валодзя. — Я куплю вам дом пад Масквой». Цётка Іра прыязджала на старэнькім «фольксвагене», а дзядзька Валодзя на шыкоўным «мерседэсе». У яго быў сапраўдны пісталет… Дзевяностыя гады… Бандыты хадзілі па вуліцах і нават не хавалі пісталеты. Усе, хто мог, ставілі сабе жалезныя дзверы. У нашым пад'ездзе прыйшлі ўначы да аднаго камерсанта з гранатай… У яго быў шапік — фарбаваныя дошкі, фанера, там усё разам прадавалася: прадукты, касметыка, адзенне, гарэлка. Патрабавалі ў яго долары. Жонка не хацела аддаваць, дык ёй паставілі гарачы прас на жывот, яна была цяжарная… У міліцыю ніхто не звяртаўся, усе ведалі: у бандытаў шмат грошай, і яны кожнага купяць. Чамусьці іх запаважалі. Паскардзіцца не было каму… Дзядзька Валодзя чаі з намі не ганяў, ён маму прыстрашыў: «Калі не аддасі кватэру мне, то я забяру тваю дачку, і ты яе больш ніколі не ўбачыш. Не будзеш ведаць, што з ёй». Мяне схавалі ў сябе нашы знаёмыя, я некалькі дзён у школу не хадзіла. Плакала дзень і ноч, баялася за маму. Суседзі бачылі, як па мяне два разы прыязджалі, шукалі. Лаяліся матам. Скончылася тым, што мама здалася…

Назаўтра нас ужо выселілі. Прыехалі яны ўначы: «Хутчэй! Хутчэй! Пажывяце ў іншым месцы, пакуль мы знойдзем вам дом». Прывезлі з сабой бляшанкі з фарбай, шпалеры, ужо распачыналі рамонт. «Пайшлі! Пайшлі!» Мама з перапуду ўзяла толькі дакументы, свае ўлюбёныя польскія духі «Быць можа», якія ёй падарылі на дзень нараджэння, і некалькі ўлюбёных кніг, а я — падручнікі і яшчэ адну сукенку. Нас запіхнулі ў машыну… Прывезлі, можна сказаць, на пустое месца: у кватэры — два вялікія ложкі, стол і крэслы. Строга загадалі нікуды не выходзіць і не адчыняць вокны, гучна не размаўляць. Не дай бог суседзі пачуюць! У гэтай кватэры, мабыць, увесь час мяняліся людзі… Бруд! Некалькі дзён мылі ўсё, адмывалі. А потым памятаю: стаім з мамай у нейкім афіцыйным месцы, нам паказваюць надрукаваныя паперы… Нібыта ўсё паводле закона… Нам кажуць: «Вось тут вы павінны паставіць свае подпісы». Мама распісалася, а я расплакалася, раней неяк не думала, а тут зразумела — цяпер нас выправяць у вёску. Мне стала шкада сваю школу, сваіх сяброўак, якіх я больш ніколі не ўбачу. Падышоў дзядзька Валодзя: «Хутчэй падпісвай, а то адвязём у дзіцячы дом, а мама ўсё адно паедзе ў вёску. Застанешся адна». Нейкія людзі… я памятаю, што стаялі нейкія людзі, і міліцыянер быў… Усе маўчалі. Дзядзька Валодзя кожнаму даў хабар. Я дзіця… што я магу… *(Маўчыць.)*

Я доўга жыла ў маўчанні… Усё гэта патаемнае, дрэннае, але яно патаемнае. Не хочацца камусьці яго паказваць… Памятаю, як прывезлі мяне ў прытулак — гэта было шмат пазней, калі я засталася ўжо без мамы, — прывезлі і прывялі ў пакой: «Вось твой ложак. Вось твае паліцы ў шафе…» Я аслупянела… Пад вечар звалілася з тэмпературай… Гэта ўсё нагадала мне нашу кватэру… *(Маўчыць.)* Гэта быў Новы год… Ялінка гарыць… усе робяць маскі… Будуць танцы… Танцы? Якія танцы? Я пра ўсё гэта забыла… *(Маўчыць.)* У пакоі, акрамя мяне, жылі яшчэ чатыры дзяўчынкі: дзве сястрычкі, зусім маленькія, восем і дзесяць гадоў, і яшчэ дзве дзяўчынкі

старэйшыя — адна масквічка, яна сур'ёзна хварэла на пранцы, другая аказалася зладзейкай, сцягнула ў мяне туфлі. Гэтая дзяўчынка хацела вярнуцца на вуліцу… Пра што я? Пра тое, што заўсёды мы былі разам, удзень і ўначы, але нічога пра сябе адна адной не распавядалі… Не, не хацелі. Я доўга маўчала… Я загаварыла, калі сустрэла свайго Жэньку… Але гэта ўсё будзе потым… *(Маўчыць.)*

Наша эпапея з мамай толькі пачыналася… Пасля таго, як мы падпісалі паперы, нас завезлі ў Яраслаўскую вобласць: «Нічога, што далёка, затое ў вас будзе добры дом». Нас падманулі… Гэта быў не дом, а старая хата з адным пакоем і вялікай рускай печкай, якую мы з мамай да гэтага ні разу ў жыцці не бачылі. Не ўмелі паліць у печы. Хата развальвалася, куды ні глянь — усюды шчыліны. У мамы — шок. Яна зайшла ў хату і стала перада мной на калені, прасіла прабачэння за тое, што ўчыніла мне такое жыццё. Білася галавой аб сценку… *(Слёзы.)* Было ў нас трохі грошай, яны неўзабаве скончыліся. Працавалі ў людзей на гародах — хто кошык бульбы дасць, хто дзясятак яек. Зведала прыгожае слова «бартар»… Свае ўлюбёныя духі «Быць можа» мама памяняла на добры кавалак масла, калі я моцна застудзілася… Я так яе ўгаворвала гэтага не рабіць, бо ў нас было мала рэчаў, якія нагадвалі нам пра дом. Гэта памятаю… Адзін раз загадчыца фермы, добрая жанчына, пашкадавала мяне, дала вядро малака, я баялася, ішла дадому агародамі, сустрэла адну даярку, яна пасмяялася: «Чаго ты хаваешся? Ідзі па вёсцы. Тут усе цягнуць, а пагатоў, калі табе дазволілі». Цягнулі ўсё, што не прыкручана, а старшыня калгаса — больш за ўсіх. Машынамі да яго вазілі. Ён прыязджаў да нас… Агітаваў: «Гайда да мяне на ферму! А то з голаду прападзяце». Ісці — не ісці? Галадуха прымусіла. На ранішнюю дойку ўставаць трэба было а чацвёртай раніцы. Яшчэ ўсе спяць. Я даіла кароў, мама мыла бакі, кароў яна баялася, а мне яны падабаліся. У кожнай каровы сваё імя… Дымка, Чаромха… У мяне было трыццаць кароў і дзве цялушкі… На

тачках вазілі пілавінне, па калена было гною. Вышэй за боты. Бідоны з малаком на калёсы падымалі... Колькі ж там кілаграмаў? *(Маўчыць.)* Плацілі нам малаком і мясам, калі якаянебудзь карова задушыць сябе ці патоне ў жыжцы. Даяркі пілі не менш за мужыкоў, і мама стала з імі папіваць. Паміж намі ўжо было не так, як раней, то бок, мы сябравалі, але ўсё больш я на яе пакрыквала. Яна крыўдавала. Рэдка, калі ў яе быў добры настрой, яна чытала мне вершы... Сваю ўлюбёную Цвятаеву: «Чырвонаю гронкай / Палала рабіна. / Спадала лістота. / Я нарадзілася...» Тады я пазнавала сваю ранейшую маму. Рэдка.

Ужо зіма. Адразу ўдарылі маразы. У гэтай хаце зіму б мы не перажылі. Сусед пашкадаваў і бясплатна давёз да Масквы...

### *Пра час, калі чалавек — гэта гучыць не горда, а гучыць па-рознаму*

Я разгаварылася з вамі і забылася, што баюся ўспамінаць... *(Маўчыць.)* Як я стаўлюся да людзей? Людзі не дрэнныя і не добрыя, людзі — і ўсё. У школе я вучылася па савецкіх падручніках, іншых яшчэ не было, нам чыталі: чалавек — гэта гучыць горда. А чалавек — гэта гучыць не горда, а гучыць па-рознаму. Я таксама ўсякая, ува мне ўсяго па кавалачку... Але калі я ўбачу таджыка — яны ў нас цяпер як рабы, другі гатунак — і калі ў мяне ёсць час, я спынюся і з ім паразмаўляю. У мяне няма грошай, але я з ім паразмаўляю.Такі чалавек... Гэта мой чалавек, ён у маім становішчы — я ведаю, што гэта такое, калі ты ўсім чужы, ты адзін цалкам. Я таксама жыла ў пад'ездах, спала ў сутарэннях...

Спачатку нас пусціла да сябе маміна сяброўка, прынялі яны нас добра, і мне там падабалася. Знаёмая абстаноўка: кнігі, кружэлкі, на сцяне партрэт Чэ Гевары. Як у нас калісьці... тыя самыя кніжкі, тыя самыя кружэлкі... Сын цёткі Волі

вучыўся ў аспірантуры, удзень не вылазіў з бібліятэк, а ўначы разгружаў вагоны на станцыі. Есці не было чаго. На кухні стаяў мех бульбы — і ўсё. З'елі бульбу — адзін бохан хлеба на дзень. Цэлы дзень пілі гарбату. І больш нічога. Адзін кілаграм мяса каштаваў трыста дваццаць рублёў, а заробак у цёткі Волі быў сто рублёў, яна працавала ў школе настаўніцай пачатковых класаў. Усе мітусіліся як ненармальныя, каб дзесьці падзарабіць. Вымагаліся да знямогі... Сапсаваўся стары кран на кухні, выклікалі сантэхнікаў, а яны аказаліся кандыдатамі навук. Смяяліся ўсе. Як казала наша бабуля, смуткам не пракормішся... Адпачынак — гэта раскоша, мала хто мог сабе дазволіць такую раскошу... Цётка Воля на час адпачынку з'язджала ў Мінск, там жыла яе родная сястра, выкладчыца ўніверсітэта. Яны шылі падушкі са штучнага футра, набівалі іх сінтэпонам, але так, каб яны напалову заставаліся пустымі — і туды перад самым цягнікам засоўвалі шчанюка, рабілі яму ўкол снатворнага. Ездзілі ў Польшчу... Шчанюкоў аўчарак так вазілі... і трусоў... На блышыных рынках — спрэс руская гаворка... У тэрмасы налівалі гарэлку замест гарбаты, у валізках хавалі пад бялізнай цвікі і замкі... Дадому цётка Воля вярталася з торбай смачных польскіх каўбасак. Пахлі яны неверагодна!

У Маскве ўначы стралялі і нават узрывалі. Шапікі, шапікі... паўсюль шапікі... Мама нанялася да аднаго азербайджанца, у яго было два шапікі — адзін з садавінай, другі — з рыбай. «Праца ёсць, выходных няма. Адпачываць нельга». Але вось якая навіна — гандляваць мама цуралася, ёй было сорамна. Ну — ніяк! Першы дзень наогул: расклала садавіну, а сама схавалася за дрэва і адтуль выглядвала. Нацягнула шапку на самыя вушы, каб яе ніхто не пазнаў. На другі дзень цыганятку дала сліву... Гаспадар заўважыў — накрычаў. Грошы не любяць жалю і сораму... Мала яна там была, з гандлем у мамы не атрымалася... Я ўбачыла аб'яву на плоце: «Патрабуецца прыбіральшчыца з вышэйшай адукацыяй». Мама пайшла на ўказаны адрас, і яе ўзялі. Плацілі там нармальна. Гэта быў

нейкі амерыканскі фонд… Ужо мы змаглі неяк самі харчавацца, знялі пакой, у гэтай самай трохпакаёвай кватэры другі пакой здымалі азербайджанцы. Маладыя хлопцы. Нешта ўвесь час куплялі, прадавалі. Адзін замуж мяне клікаў, абяцаў павезці ў Турцыю: «Я цябе скраду. У нас звычай такі, што нявесту трэба скрасці». Страшна было без мамы дома заставацца. А ён мне і садавіну дарыў, і ўрук… Гаспадар кватэры піў тыднямі, так напіваўся, што ў яго зносіла дах: «Ах ты, блядзь! Гэй ты, сука!» Жонку біў нагамі… яе «хуткая» забірала… І тады ён уначы да мамы лез. Дзверы ў наш пакой ламаў…

Зноў мы апынуліся на вуліцы…

На вуліцы і без грошай… Мамін фонд закрылі, яна перабівалася выпадковымі заробкамі. Жылі ў пад'ездах… на лесвіцы… Адны людзі проста праходзілі міма, іншыя крычалі, былі і такія, што выганялі нас на вуліцу. Маглі і ўначы. І ў дождж, і ў снег. Ніхто дапамогі не прапаноўваў, ні пра што не распытваў… *(Маўчыць.)* Людзі не дрэнныя і не добрыя. У кожнага сваё… *(Маўчыць.)* Раніцай ішлі пешшу на вакзал (грошай на метро не было), у прыбіральні там умываліся. І мылі адзенне. Памывачкі ў нас там… Улетку нічога, калі цёпла, паўсюль можна жыць… У парку на лаўках начавалі, увосені награбем лісця, спім на лісці — цёпла. Як у спальным мяху. На Беларускім вакзале… гэта я добра памятаю… мы часта сустракалі старую-прыстарую жанчыну, яна сядзела каля касы і размаўляла сама з сабой. Распавядала адну і тую ж гісторыю… Як у вайну да іх у вёску заходзілі ваўкі, яны адчулі, што мужчын няма. Мужчыны ўсе ваявалі. Калі ў нас з мамай было хоць трохі грошай, мы ёй падавалі. «Беражы вас Гасподзь», — жагнала яна нас. А мне наша бабуля ўспаміналася…

Пакінула маму на лаўцы… Вяртаюся, а яна сядзіць не адна, а з нейкім мужчынам. Прыемны такі мужчына. «Знаёмся, — кажа мама, — гэта Віця. Ён таксама любіць Бродскага». Усё зразумела. Ведаем… Калі хтосьці любіць Бродскага, для мамы гэта гучыць як пароль, значыць, свой чалавек. «Як, ён не чытаў

“Дзеці Арбата”?» Ну гэта дзікі чалавек! З лесу! Гэта чужы, ён не наш. Так яна заўсёды падзяляла людзей, і гэта ў яе засталося. А я моцна змянілася за тыя два гады, што мы з ёй бадзяліся, стала сур'ёзная, можа, нават не па гадах. Я зразумела: мама нічым не можа мне дапамагчы, наадварот, у мяне з'явілася пачуццё, што гэта я павінна ёю апекавацца. Проста я так адчувала... Дзядзька Віця быў разумны, і ён спытаў у мяне, а не ў мамы: «Ну што, дзяўчаты, пойдзем?» Павёў нас да сябе, у яго была двухпакаёвая кватэра. Свае рэчы мы ўсе цягалі з сабой, і вось з гэтымі падранымі клятчастымі сумкамі... мы трапілі ў рай... Музей! На сцяне віселі карціны, шыкоўная бібліятэка, пузаты старадаўні камод... Гадзіннік да столі з півачом... Аслупянелі! «Дзяўчаты, смялей. Распранайцеся». Нам сорамна, мы ўжо абнасіліся... Пах вакзалаў... пад'ездаў... «Дзяўчаты, смялей!» Селі піць гарбату. Дзядзька Віця распавёў пра сябе... Калісьці ён працаваў ювелірам, меў сваю майстэрню. Паказаў нам валізку з інструментамі, мяшэчкі з паўкаштоўнымі камянямі, срэбныя нарыхтоўкі... Усё так прыгожа, цікава, дорага. Не верылася, што мы будзем тут жыць. Цуды пасыпаліся...

Атрымалася сям'я як сям'я. Я зноў пайшла ў школу. Дзядзька Віця быў вельмі добры, ён зрабіў мне пярсцёнак з каменьчыкам. Але бяда... ён таксама піў... І курыў як паравоз. Першы час мама на яго сварылася, а неўзабаве яны ўжо пілі разам. Насілі ў букіністычную краму кнігі, я памятаю пах старых скураных пераплётаў... У дзядзькі Віці былі яшчэ рэдкія манеты... Пілі і глядзелі тэлевізар. Палітычныя праграмы. Дзядзька Віця філасофстваваў. Са мной ён размаўляў як з дарослай... Пытаўся: «Чаму вас, Юлечка, вучаць у школе пасля камунізму? Што цяпер рабіць з савецкай літаратурай і з савецкай гісторыяй — забыць?» Праўда, я мала што разумела... Вам цікава? Вось... Я думала, што я ад гэтага далёкая, а вось... успамінаецца...

...Рускае жыццё павінна быць злое, нікчэмнае, тады душа ўздымаецца, яна ўсведамляе, што не належыць гэтаму свету... Чым больш бруду і крыві, тым больш для яе прасторы...

...Мадэрнізацыя ў нас магчымая толькі праз шарашкі і расстрэлы...

...Камуністы... Што яны могуць? Увесці зноў талоны і адрамантаваць баракі ў Магадане...

...Нармальныя людзі выглядаюць сёння вар'ятамі... Гэтае новае жыццё такіх, як я і твая мама, яно нас выбракоўвае...

...На Захадзе стары капіталізм, а ў нас найсвяжэйшы, з маладымі ікламі... А ўлада — чыстая візантыйшчына...

Аднойчы ўначы дзядзьку Віцю стала кепска з сэрцам. Выклікалі «хуткую». Да бальніцы яго не давезлі. Масіўны інфаркт. Прыехалі сваякі: «А вы — хто? Адкуль узяліся такія? Вам тут рабіць няма чаго». Адзін мужчына крычаў: «Ганіце гэтых жабрачак адсюль! Прэч!» Праверыў нашы сумкі, калі мы сыходзілі...

Мы на вуліцы...

Патэлефанавалі мамінаму стрыечнаму брату... Яго жонка ўзяла слухаўку: «Прыходзьце». Жылі яны непадалёк ад рачнога вакзала ў двухпакаёвай «хрушчоўцы», жылі з жанатым сынам. Нявестка хадзіла цяжарная. Вырашылі: «Пажывяце ў нас, пакуль Алена народзіць». Маме ставілі раскладанку ў калідоры, а я спала на кухні на старой канапе. Да дзядзькі Лёшы прыходзілі сябрукі... з яго завода... Засынала я пад іхнія размовы. Усё паўтаралася: пляшка гарэлкі на стале, карты. Праўда, размовы былі іншыя...

...Усё прасралі... Свабода... А дзе свабода, блядзь? Трушчым крупы без алею...

...Жыды... яны цара забілі, і Сталіна, і Андропава... Развялі ліберасцію! Трэба тэрмінова закручваць гайкі. Мы, рускія, павінны веры трымацца...

...Ельцын поўзае перад Амерыкай на пузе... Усё ж такі мы выйгралі вайну...

...У царкву пойдзеш — і там, здаецца, усе хрысцяцца, але стаяць як камяні...

...Хутка будзе горача і весела... Першымі ліберастаў павесім на ліхтарах за тое, што яны нам дзевяностыя гады ўчынілі. Ратаваць трэба Расію...

Праз пару месяцаў нявестка нарадзіла. Нам месца ўжо няма. Зноў мы на вуліцы…

…вакзал

…пад'езд

…вакзал

…пад'езд…

На вакзале… Дзяжурныя міліцыянеры — і пажылыя, і маладыя: або марш на вуліцу, а гэта была зіма, або ідзі з ім у бакоўку… Там у іх за шырмачкай спецыяльны куток ёсць… канапка… Мама з адным міліцыянерам пабілася, калі ён мяне туды пацягнуў… Яе пабілі і арыштавалі на некалькі сутак… *(Маўчыць.)* Я… так выйшла… Я моцна застудзілася. Думалі-думалі… мне ўсё горш… Вырашылі, што я паеду да сваякоў, а мама застанецца на вакзале. Праз некалькі дзён яна мне тэлефануе: «Трэба нам сустрэцца». Я да яе прыехала, і яна кажа: «Я тут пазнаёміліся з жанчынай, яна мне прапаноўвае ў яе пажыць. Месца там хапае. У яе свой дом. Гэта ў Алабіне». — «Давай я з табой паеду». — «Не, ты лячыся. Прыедзеш потым». Я пасадзіла яе на электрычку, яна села каля акна і глядзіць на мяне, як быццам даўно не бачыла. Я не вытрымала і ўскочыла ў вагон: «Што з табой?» — «Не звяртай увагі». Памахала ёй, яна з'ехала. А ўвечары тэлефануюць: «Вы — Малікава Юлія Барысаўна?» — «Я Малікава». — «Вам тэлефануюць з міліцыі. Скажыце, а Людміла Малікава кім вам даводзіцца?» — «Гэта мая мама». — «Вашу маці збіў цягнік. У Алабіне…»

Заўсёды яна была ўважлівая, калі ішоў цягнік… моцна баялася… Трапіць пад цягнік яна баялася больш за ўсё. Сто разоў галаву паверне: ідзе ці не йдзе? І вось… Не, гэта не выпадковасць… не няшчасны выпадак… Набыла пляшку гарэлкі… каб не так было балюча і страшна, і кінулася… Яна стамілася… проста стамілася… Стамілася ад такога жыцця… «ад самой сябе»… Гэта не мае, гэта ейныя словы. Я кожнае слова потым успамінала… *(Плача.)* Цягнік яе доўга валачыў… Прывезлі ў бальніцу, гадзіну яна яшчэ праляжала ў рэанімацыі,

але выратаваць было немагчыма. Мне так і сказалі… Убачыла я яе ўжо ў труне, ужо апранутую. Усё было жахліва… яшчэ Жэнькі ў мяне не было… Калі б я была маленькая, яна б мяне не пакінула. Ніколі… гэтага б не здарылася… Апошнія дні яна мне часта казала: «Ты ўжо вялікая. Ты ўжо вырасла». Навошта я вырасла? *(Плача.)* Я засталася адна… Так і жыла…. *(Пасля доўгага маўчання.)* Калі ў мяне будзе дзіця, я павінна быць шчаслівай… каб яно запомніла шчаслівую маму…

Жэнька… Жэнька мяне выратаваў… Я яго заўсёды чакала… У прытулку мы марылі: жывём тут, але гэта часова, а хутка будзем жыць, як усе, у нас з'явяцца сем'і — мужы, дзеці. Будзем самі набываць сабе кексы, не на свята, а калі захочацца. Вельмі хацелася… Сямнаццаць гадоў… мне споўнілася сямнаццаць гадоў… Выклікаў да сябе дырэктар: «Цябе ўжо знялі з харчавання». І — маўчыць. Пасля сямнаццаці гадоў з прытулку выпраўлялі ў жыццё. Ідзі! А ісці не было куды. Працы няма, і наогул нічога няма. І мамы няма… Я патэлефанавала цётцы Надзі: «Напэўна, я да вас прыйду. З прытулку мяне ўжо адпраўляюць». Цётка Надзя… калі б не яна… анёл-ахоўнік… Гэта была не родная мне цётка, гэта цяпер яна стала радней-шая за родных і свой пакойчык у камуналцы мне адпісала. Цяпер… так… Калісьці яна жыла з маім дзядзькам, але ён даўно памёр, яны не былі мужам і жонкай, жылі ў грамадзянскім шлюбе. Але я ведала, што яны жылі ў каханні. Да такога чалавека можна прыйсці… Калі чалавек спазнаў каханне, да яго можна заўсёды прыйсці…

У цёткі Надзі ніколі не было дзяцей, і яна прывыкла жыць адна, ёй было цяжка жыць з кімсьці. Жах! Пакой — шаснаццаць метраў. Я спала на раскладанцы. Суседка, вядома, стала выказваць прэтэнзіі: «Няхай яна сыдзе». Міліцыю выклікала. Цётка Надзя стаяла сцяной: «А куды яна сыдзе?» Напэўна, ужо год прайшоў… І цётка Надзя сама спытала: «Ты сказала, што прыедзеш на два месяцы, а ўжо год, як жывеш у мяне». Я маўчу… плачу… І яна маўчыць… плача… *(Маўчыць.)* Яшчэ год

мінуў… Неяк усе прывыклі да мяне… Я старалася… І суседка прывыкла… Цётка Марына неблагі чалавек, гэта жыццё ў яе благое. У яе было два мужы, і абодва ад п'янкі, як яна кажа, здохлі. Да яе часта прыязджаў пляменнік, мы з ім віталіся. Прыгожы хлопец. А гэта… Гэта было так: я сядзела ў пакоі, чытала кнігу, цётка Марына зайшла, узяла мяне за руку і павяла на кухню: «Давайце знаёміцца: вось гэта — Юля, а вось гэта — Жэня. А цяпер марш гуляць!» Мы сталі з Жэнькам сустракацца. Цалаваліся. Але нічога сур'ёзнага. Ён працуе кіроўцам, часта ездзіць у камандзіроўкі. Вярнуўся раз — мяне няма. Дзе? Што? А тут… У мяне даўно здараліся прыступы — то задыхаюся, то ўпаду ад слабасці… Цётка Надзя прымусіла пайсці да доктара, праверылі — знайшлі рассеяны склероз. Вы, зразумела, ведаеце, што гэта такое… Невылечная хвароба… Ад суму яна, у мяне яна ад суму. Я моцна сумавала па маме. Вельмі. *(Маўчыць.)* Паставілі дыягназ і паклалі ў бальніцу. Жэнька знайшоў мяне там і стаў наведваць. Прыходзіў кожны дзень. То яблык прыгожы прынясе, то апельсін… Як тата калісьці… Гэта быў ужо травень… З'яўляецца з букетам руж, я ахнула — такі букет каштуе палову ягонай зарплаты. У святочным гарнітуры… «Выходзь за мяне замуж». Я збянтэжылася. «Не хочаш?» Што мне адказаць? Падманваць я не ўмею, і я не хацела яго падманваць. Я ўжо даўно ў яго закахалася… «Я хачу выйсці за цябе замуж, але ты павінен ведаць праўду — у мяне інваліднасць трэцяй групы. Хутка я буду як хамячок, мяне на руках давядзецца насіць». Ён нічога не зразумеў, але засмуціўся. На наступны дзень прыходзіць і кажа: «Нічога. Прарвёмся». Выйшла я з бальніцы, і мы распісаліся. Павёз ён мяне да сваёй мамы. Яго мама — простая сялянка. Усё жыццё ў полі. У хаце ніводнай кнігі. Але мне там у іх было добра. Спакойна. Я ёй таксама ўсё распавяла… «Нічога, дзетка, — абняла яна мяне. — Дзе любоў, там і Бог». *(Маўчыць.)*

Цяпер я з усіх сіл хачу жыць, таму што ў мяне ёсць Жэнька… Нават мару пра дзіцятка… Лекары супраць, а я мару…

Хачу, каб у нас быў дом, я ўсё жыццё мару пра дом. Дазналася, што нядаўна выйшаў закон... Паводле гэтага закона можна вярнуць нашу кватэру. Я падала заяву... Мне сказалі, што такіх людзей, як я, тысячы, шмат каму дапамагаюць, але ў мяне вельмі складаны выпадак, нашу кватэру тры разы ўжо перапрадавалі. А тыя бандыты, якія нас абрабавалі, даўно ўжо ляжаць на могілках, перастралялі адны адных...

...Прыйшлі мы да маёй мамы. Там на помніку ейны партрэт, яна як жывая. Прыбралі ўсё. Пачысцілі. Доўга стаялі, я ніяк не магла сысці, і ў нейкі момант мне здалося, што яна ўсміхнулася... яна шчаслівая... Ці гэта сонца так клалася...

## Пра адзіноту, якая вельмі падобная да шчасця

*Аліса З-лер — рэкламны менеджар, 35 гадоў*

*Ездзіла ў Пецярбург па іншую гісторыю, а вярнулася з гэтай. Разгаварыліся ў цягніку са спадарожніцай...*

—У мяне сяброўка пакончыла з сабой... Моцная, паспяховая. Шмат кавалераў, сяброў. Усе мы былі ў шоку. Самагубства — што гэта? Баязлівасць ці мужны крок? Радыкальны план, крык аб дапамозе ці самаахвяраванне? Выйсце... пастка... пакаранне... Я хачу... Я магу расказаць вам, чаму я гэтага не зраблю...

Любоў? Гэты варыянт я нават не абмяркоўваю... Я не супраць усяго такога прыгожага, бліскучага і звонкага, але вы першая за дзесяць гадоў, мусіць, хто пры мне вымавіў гэтае слова. Дваццаць першае стагоддзе — грошы, сэкс і два ствалы, а вы пра нейкія пачуцці... Усе ўпершыню дарваліся да грошай... Не было ў мяне жадання хутчэй выйсці замуж, панараджаць дзяцей, я заўсёды хацела зрабіць кар'еру, гэта на першым месцы. Я цаню сябе, свой час і сваё жыццё. І адкуль вы

ўзялі, што мужчыны шукаюць любоў? Любофф… Мужчыны лічаць, што жанчына — дзічына, баявы трафей, ахвяра, а яны — паляўнічыя. Правілы адпрацаваныя стагоддзямі. А жанчыны шукаюць прынца не на белым кані, а на залатым мяху. Прынца няпэўнага ўзросту… Хай будзе «папік»… Ну і што? Светам кіруе бабло! Але я не ахвяра, я сама паляўнічая…

Дзесяць гадоў таму прыехала ў Маскву… Я была шалёная, я была актыўная, я сказала сабе: я народжаная для таго, каб быць шчаслівай, пакутуюць слабыя, сціпласць — гонар слабых. Прыехала я з Растова… Мае бацькі працуюць у школе: тата — хімік, мама — настаўніца рускай мовы і літаратуры. Пабраліся яны студэнтамі, у таты меўся адзін прыстойны гарнітур, але куча ідэй у запасе, і тады гэтага было дастаткова, каб збаламуціць дзяўчыне галаву. Дагэтуль яны любяць прыгадваць, што доўга абыходзіліся адным камплектам пасцельнай бялізны, адной падушкай і аднымі хатнімі тэпцямі. Ночы напралёт чыталі адно аднаму Пастэрнака. Напамяць! З мілым рай і ў будане! «Да першых прымаразкаў», — смяялася я. «У цябе няма фантазіі», — крыўдавала мама. У нас была нармальная савецкая сям'я: раніцай — грэчка ці макарона з маслам, апельсіны адзін раз на год — на Новы год. Я нават памятаю іх пах. Не цяпер, а тады… гэта быў пах нейкага іншага… прыгожага жыцця… Адпачынак улетку — на Чорным моры. Ездзілі ў Сочы «дзікунамі», жылі ўсе ў адным пакоі — дзевяць метраў. Але нечым жа ганарыліся… нечым моцна ганарыліся… Ганарыліся добрымі кніжкамі, якія даставалі з-пад крыса, па вялікім блаце, а яшчэ радасць! — кантрамаркі (маміна сяброўка працавала ў тэатры) на прэм'еры. Тэатр! Вечная тэма для размоваў у прыстойнай кампаніі… Цяпер пішуць: савецкі лагер, камуністычнае гета. Людажэрны свет. Страшнага я не памятаю… Я памятаю, што ён быў наіўны, той свет, вельмі наіўны і недарэчны. Я заўсёды ведала, што я так жыць не буду! Не жадаю! Мяне за гэта ледзь са школы не выперлі. Ой! Ну так… народжаныя ў СССР — гэта

дыягназ... Таўро! У нас былі ўрокі дамаводства, хлопчыкаў чамусьці вучылі кіраваць аўтамабілем, а дзяўчатак смажыць катлеты, і гэтыя праклятыя катлеты ў мяне заўсёды падгаралі. Настаўніца, яна ж наша «класная», стала мяне выхоўваць: «Ты нічога не ўмееш! Выйдзеш замуж, і як ты будзеш карміць свайго мужа?» Я адрэагавала імгненна: «Я не збіраюся смажыць катлеты. У мяне будзе прыслуга». Восемдзесят сёмы год... мне трынаццаць гадоў... Які капіталізм, якая прыслуга?! Яшчэ сацыялізм на ўсю моц! Бацькоў выклікалі да дырэктара школы, мяне прапясочылі на агульным сходзе ў класе, на радзе школьнай дружыны. Хацелі з піянераў выключыць. Піянерыя, камсамол — гэта было сур'ёзна. Я нават плакала... Хоць у мяне ніколі не было рыфмаў у галаве, адны формулы... ніякіх рыфмаў... Калі я заставалася дома адна, я надзявала маміну сукенку, туфлі і сядала на канапу. Чытала «Ганну Карэніну». Свецкія балі, слугі, аксельбанты... любоўныя сустрэчы... Усё падабалася да таго моманту, як Ганна кінулася пад цягнік: навошта? Прыгожая, багатая... Праз каханне? Нават Талстой мяне не пераконваў... Заходнія раманы падабаліся больш, там мне падабаліся сцервы, прыгожыя сцервы, дзеля якіх мужчыны страляліся, пакутавалі. Валяліся ў нагах. У сямнаццаць гадоў я апошні раз плакала ад кахання без узаемнасці — усю ноч у ванным пакоі з адкрытым кранам. Мама суцяшала вершамі Пастэрнака... Запомніла: «Жанчынай быць — вялікі крок, / Бо зводзіць з розуму — геройства». Не люблю сваё дзяцінства, і юнацтва не люблю, увесь час чакала, калі яны скончацца. Грызла граніт навукі, займалася ў трэнажорнай зале. За ўсіх хутчэй, за ўсіх вышэй, за ўсіх мацней! У доме круцілі касеты з песнямі Акуджавы: «За рукі возьмемся, браты...» Не! Не мой ідэал.

У Маскву... Масква! Я яе заўсёды адчуваю як суперніцу, з першай хвіліны яна выклікала ўва мне спартовую злосць. Мой горад! Шалёны рытм — кайф! Размах — на мае крылы! У кішэні было дзвесце «зялёных» і трохі «драўляных». Усё! Лiхiя

дзевяностыя... Бацькам даўно не плацілі заробак. Галеча! Тата кожны дзень угаворваў сябе і нас з мамай: «Трэба пацярпець. Пачакаць. Я веру Гайдару». Да свядомасці такіх людзей, як мае бацькі, яшчэ не даходзіла, што пачаўся капіталізм. Рускі капіталізм... малады і таўстаскуры, той самы, які абрынуўся ў 1917 годзе... *(Задумалася.)* Ці разумеюць яны гэта цяпер? Цяжка адказаць... У адным я ўпэўненая: капіталізм мае бацькі не замаўлялі. Без варыянтаў. Мая гэта замова, такіх, як я, тых, хто не захацеў заставацца ў клетцы. Маладых, дужых. Для нас капіталізм — гэта цікава... авантурная прыгода, рызыка... Гэта не толькі грошы. Спадар долар! Зараз я вам выдам свой сакрэт! Мне пра капіталізм, сучасны капіталізм — не раманы Драйзера — больш падабаецца чытаць, чым пра ГУЛАГ і савецкі дэфіцыт. Пра стукачоў. Ой! Ой! Ах, святое закранула. З бацькамі я пра гэта і заікнуцца не магу. Ні слова. Што вы! Мой тата застаўся савецкім рамантыкам. У жніўні дзевяноста першага... Путч! У тэлевізары з раніцы — балет «Лебядзінае возера»... і танкі ў Маскве, як у Афрыцы... І тата, а з ім яшчэ чалавек сем, усе ягоныя сябры, яны проста з працы рванулі ў сталіцу. Рэвалюцыю падтрымаць! Я сядзела каля тэлевізара... Запомніла Ельцына на танку. Руйнавалася імперыя... Хай руйнуецца... Чакалі тату, як з вайны, — вярнуўся героем! Я думаю, што ён дагэтуль гэтым жыве. Праз энную колькасць гадоў я разумею, што гэта — самае галоўнае, што было ў ягоным жыцці. Як у нашага дзядулі... Той усё жыццё распавядаў, як яны білі немцаў пад Сталінградам. Пасля імперыі тату жыць сумна і нецікава, яму няма чым жыць. У асноўным, яны расчараваныя... Ягонае пакаленне... У іх пачуццё падвойнай паразы: сама камуністычная ідэя пацярпела крах, і тое, што пасля яе атрымалася, ім таксама незразумелае, яны гэтага не прымаюць. Іншага яны хацелі, калі капіталізму, дык з чалавечым тварам і мілай усмешкай. Не іх гэта свет. Чужы. Але гэта мой свет! Мой! Я шчаслівая, што савецкіх людзей бачу толькі на Дзявятага мая... *(Маўчыць.)*

Ехала я ў сталіцу аўтаспынам — так танней, і чым больш глядзела ў акно, тым больш злоснай станавілася, я ўжо ведала, што з Масквы не вярнуся. Ні за якія пернікі! Па абодва бакі кірмаш… Гандлявалі чайнымі сервізамі, цвікамі, лялькамі — людзям плацілі таварам. Можна было прасы або патэльні памяняць на каўбасу (на мясакамбінатах разлічваліся каўбасой), на цукеркі, цукар. Каля адной аўтобуснай будкі сядзела тоўстая цётка, абвешаная, як кулямётнымі стужкамі, дзіцячымі цацкамі. Мульцік! У Маскве ліў дождж, але я ўсё адно пайшла на Чырвоную плошчу, каб убачыць купалы Васілія Блажэннага і крамлёўскую сцяну — гэтая моц, сіла, і я тут! У самым сэрцы! Я ішла і кульгала, перад ад'ездам зламала ў трэнажорнай зале мезенец на назе, але я была на высокіх абцасах і ў сваёй найлепшай сукенцы. Вядома, лёс — гэта шацунак, карта, але ў мяне ёсць нюх, і я ведаю, чаго хачу. Сусвет нічога не дае проста так… задарма… На — табе! І — табе! Трэба моцна хацець. Я хацела! Мама прывозіла толькі хатнія піражкі і расказвала, як яны з татам ходзяць на мітынгі дэмакратаў. А за талоны ў месяц на чалавека давалі: два кілаграмы крупаў, па адным кілаграме мяса і дзвесце грамаў масла. Чэргі, чэргі, чэргі і нумары на далонях. Мне не падабаецца слова «савок»! Мае бацькі — не «саўкі», яны — рамантыкі! Дашкаляты ў нармальным жыцці. Я іх не разумею, але я іх люблю! Ішла па жыцці адна… сама-адна… у шакаладзе не была… І мне ёсць за што сябе любіць! Без рэпетытараў, без грошай і пратэкцыі я паступіла ў МДУ. На факультэт журналістыкі… На першым курсе закахаўся ў мяне аднакурснік і спытаў: «А ты закаханая?» — На што я адказала: «Я закаханая ў сябе». Я ўсяго дамаглася сама. Сама! З аднакурснікамі было нецікава, на лекцыях сумна. Вучылі савецкія выкладчыкі па савецкіх падручніках. А вакол вiравала ўжо несавецкае жыццё — дзіўнае, шалёнае! З'явіліся першыя патрыманыя іншамаркі — захапленне! Першы «Макдональдс» на Пушкінскай… Польская касметыка… і жудасныя чуткі, што яна — для нябожчыкаў… Першая

рэклама на тэлебачанні — рэкламавалася турэцкая гарбата. Усё раней было шэрае, а тут — яркія колеры, кідкія шыльды. Усяго хацелася! Усё можна было атрымаць! Ты мог быць кім хочаш: брокерам, кілерам, геем... Дзевяностыя гады... для мяне блаславёныя... незабыўныя... Часы загадчыкаў лабараторый, бандытаў і авантурыстаў! Савецкімі заставаліся толькі рэчы, а людзі ўжо з іншай праграмай у галаве... Будзеш круціцца і шустрыць — і ты атрымаеш усё. Які Ленін? Які Сталін? Гэта ўжо ззаду, перад табой адкрываецца афігеннае жыццё: ты можаш убачыць увесь свет, жыць у цудоўнай кватэры, катацца на шыкоўнай машыне, есці на абед сланяціну... У Расіі разбегліся вочы... Вуліца і тусоўкі вучылі хутчэй, і я перавялася на завочнае аддзяленне. Знайшла працу ў газеце. Жыццё падабалася мне з самай раніцы.

Я глядзела ўгору... на высокую лесвіцу жыцця... Я не марыла, каб мяне трахалі ў пад'ездах або ў саўнах і за гэта вадзілі па дарагіх рэстаранах. Да мяне шмат хто заляцаўся... На раўналеткаў я не звяртала ўвагі, з імі я магла сябраваць, хадзіць разам у бібліятэку. Несур'ёзна і бяспечна. А падабаліся мне мужчыны старэйшыя і паспяховыя, якія ўжо зрабілі сябе. З імі было цікава, смешна і карысна. А на мне... *(Смяецца.)* На мне доўга стаяла таўро — дзяўчынкі з добрай сям'і, з дома, дзе шмат кніг, галоўная ў доме — кніжная шафа, і на мяне звярталі ўвагу пісьменнікі і мастакі. Непрызнаныя геніі. Але я не збіралася прысвяціць сваё жыццё генію, якога прызнаюць пасля ягонай смерці і будуць пяшчотна любіць нашчадкі. А потым усе гэтыя размовы, што надакучылі яшчэ дома: пра камунізм, пра сэнс жыцця, пра шчасце для іншых... пра Салжаніцына і Сахарава... Не, гэта былі героі не майго рамана, а героі маёй мамы. Тых, хто чытаў і марыў лётаць, як чэхаўская чайка, змянілі тыя, хто не чытаў, але мог лётаць. Увесь ранейшы джэнтльменскі набор выпаў у асадак: самвыдат, размовы шэптам на кухні. Якая ганьба — нашы танкі былі ў Празе! Ды яны ўжо былі ў Маскве! Каго гэтым здзівіш?

Замест вершаў самвыдату — пярсцёнак з дыяментам, дарагія лэйблы... Рэвалюцыя жаданняў! Хаценняў! Мне падабаліся... я люблю чыноўнікаў і бізнэсменаў... Мяне натхняў іх слоўнік: афшор, адкаты, бартар. Сеткавы маркетынг, крэатыўны падыход... У рэдакцыі на планёрках рэдактар казаў: «Патрэбныя капіталісты. Дапамагаем Ельцыну і гайдараўскаму ўраду рабіць капіталістаў. Тэрмінова!» Я была маладая... прыгожая... Мяне пасылалі браць інтэрв'ю ў гэтых капіталістаў: як яны сталі багатымі? Як зарабілі першы мільён? Сацыялістычныя людзі ператвараліся ў капіталістычных? Трэба было гэта апісаць... Чамусьці менавіта мільён найбольш уражваў. Зарабіць мільён! Мы прывыклі, што рускі чалавек быццам бы і не хоча быць багатым, нават баіцца. Чаго ж ён хоча? А ён заўсёды хоча аднаго: каб нехта іншы не стаў багатым. Багацейшым за яго. Малінавыя пінжакі, залатыя ланцугі... Гэта з кіно... з тэлесерыялаў... Тыя, каго я сустракала: з жалезнай логікай і жалезнай рукой. Сістэмнае мысленне. Усе вучылі англійскую. Менеджмент. Акадэмікі і аспіранты з'язджалі з краіны... фізікі і лірыкі... А гэтыя... новыя героі... яны нікуды не хацелі з'язджаць, ім падабалася жыць у Расіі. Гэта быў іх час! Іх шанц! Яны хацелі быць багатымі, яны ўсяго хацелі. Усяго!

І тут я сустрэла яго... Я думаю, што я кахала гэтага чалавека. Гучыць як адкрыццё... Так? *(Смяецца.)* Ён быў старэйшы за мяне на дваццаць гадоў, у яго сям'я і двое сыноў. Раўнівая жонка. Жыццё пад мікраскопам... Але мы вар'яцелі адно ад аднаго, такі парыў і ўзвод, што ён прызнаваўся: раніцай, каб не заплакаць на працы, прымаў дзве таблеткі тазепаму. Я таксама рабіла вар'яцкія ўчынкі, толькі што з парашутам не скакала. Гэта ўсё было... так бывае... перыяд цукерак-букетаў... Яшчэ не важна, хто каго падманвае, хто на каго палюе і хто чаго хоча. Я была маленькая, дваццаць два гады... Я закахалася... закахалася... Цяпер я разумею, што каханне — гэта свайго роду бізнэс, у кожнага свая рызыка. Будзь гатовая да новай камбінацыі... Заўсёды! Цяпер ад кахання мала хто млее.

Усе сілы — на скачок! На кар'еру! Маладыя дзяўчаты ў нас у курылцы мянцяць языкамі, і калі ў кагосьці сапраўднае пачуццё — шкадуюць: дурніца, маўляў, уцюрылася. *(Смяецца.)* Дурніца! Я была такая шчаслівая дурніца! Ён адпускаў кіроўцу, лавіў машыну, і мы каталіся па начным горадзе на нейкім прапахлым бензінам «масквічы». Бясконца цалаваліся. «Дзякуй табе, — казаў ён, — ты вярнула мяне на сто гадоў назад». Флэш-эпізоды... флэш... Мяне ашаламляў ягоны рытм... імпэт... Званок увечары: «Раніцай ляцім у Парыж» ці: «Маханём на Канары. У мяне ёсць тры дні». У самалёце ляцім першым класам, нумар у самым дарагім гатэлі — пад нагамі шкляная падлога, там жывыя рыбы плаваюць. Жывая акула! Але запомнілася на ўсё жыццё іншае... Запомніўся прапахлы бензінам «масквіч» на маскоўскай вуліцы. І... як мы цалаваліся... звар'яцелыя... ён даставаў мне вясёлку з фантана... Я закахалася... *(Маўчыць.)* А ён рабіў сабе свята жыцця. Для сябе... сабе — так! Калі мне стукне сорак, магчыма, я яго зразумею... калі-небудзь зразумею... Вось, напрыклад, ён не любіў гадзіннік, калі той ішоў, ён любіў яго толькі тады, калі той стаяў. У яго былі свае адносіны з часам... Во-о-сь! Та-а-ак... Абажаю котак. Я люблю іх за тое, што яны не плачуць, ніхто не бачыў іх слёз. Калі нехта сустрэне мяне на вуліцы, падумае — багатая і шчаслівая! У мяне ёсць усё: вялікі дом, дарагая машына, італьянская мэбля. І дачка, ад якой я ў захапленні. У мяне ёсць прыслуга, я не смажу сама катлеты і не мыю бялізну, магу купіць усё, што захачу... мора забавак... Але я жыву адна. І хачу жыць адна! Мне ні з кім так не бывае добра, як з сабой, я люблю гаварыць сама з сабой... у першую чаргу пра сябе... Выдатная кампанія! Што я думаю... адчуваю... Як учора на гэта глядзела і як сёння? То мне падабаўся сіні колер, а цяпер ліловы... У кожным з нас столькі ўсяго адбываецца. У сабе. З сабой. Там, усярэдзіне, цэлы космас. Але мы на яго амаль не звяртаем увагі. Усе занятыя знешнім, вонкавым... *(Смяецца.)* Адзінота — гэта свабода... Я кожны дзень цяпер радуюся,

што я вольная: затэлефануе — не затэлефануе, прыедзе — не прыедзе? кіне — не кіне? — прабачце! Не мае праблемы! Ну не… не баюся я адзіноты… Я баюся… каго я баюся? Стаматолага я баюся… *(Нечакана зрываецца.)* Людзі заўсёды хлусяць, калі кажуць пра каханне… і пра грошы… хлусяць заўсёды і па-рознаму. Мне хлусіць неахвота… Ну неахвота! *(Супакойваецца.)* Прабачце… Ну прабачце… Я даўно не ўспаміналa…

Сюжэт? Вечны сюжэт… Я хацела ад яго дзіця, я зацяжарала… Можа, ён спалохаўся? Мужчыны — яны баязліўцы! Бомж ці алігарх — няма ніякай розніцы. На вайну пойдуць, рэвалюцыю зробяць, а ў каханні здрадзяць. Жанчына мацнейшая: «Каня на бягу перапыніць, пагасіць у хаце пажар». І паводле законаў жанру… «А коні ўсё скачуць і скачуць, а хаты гараць і гараць»… «Мужчына не бывае старэйшы за чатырнаццаць гадоў», — упершыню дала мне разумную параду мая мама. Памятаю, што… было так… Падала гэтую навіну яму перад сваёй камандзіроўкай, мяне паслалі на Данбас. А я любіла камандзіроўкі, любіла пах вакзалаў і аэрапортаў. Было цікава, калі вярталася, расказаць яму, разам абмеркаваць. Я цяпер разумею, што ён не толькі адкрываў мне свет, здзіўляў і вадзіў па шыкоўных буціках, адорваў, ён яшчэ вучыў мяне думаць. Не тое каб у яго была такая задача, гэта само сабой атрымлівалася. Глядзела на яго, слухала. Нават калі я думала пра тое, што мы будзем разам, я не збіралася назаўсёды пасяліцца за чыёйсьці шырокай спінай і там бяздумна гламурыць. Балдзець! У мяне меўся свой жыццёвы план. Любіла сваю працу, хутка рабіла кар'еру. Шмат ездзіла… І тым разам… Я ляцела ў шахцёрскі пасёлак — гісторыя страшная, але, можна сказаць, тыповая для таго часу: перадавых шахцёраў узнагародзілі на свята магнітафонамі, і ўначы адну сям'ю ўсю выразалі. Нічога не ўзялі — толькі магнітафон. Пластмасавы «панасонік»! Каробку! У Маскве — шыкоўныя машыны, супермаркеты, а за Садовым кальцом — магнітафон быў цудам. Мясцовыя «капіталісты», пра якіх марыў мой рэдактар, хадзілі па вуліцах

у атачэнні аўтаматчыкаў. У прыбіральню — з ахоўнікам. Але тут казіно, і тут казіно, і яшчэ раз казіно. І ўжо нейкі прыватны рэстаранчык. Усё тыя ж дзевяностыя гады… Яны — так… яны… Тры дні я была ў камандзіроўцы. Вярнулася, і мы сустрэліся. Спачатку ён узрадаваўся — у нас будзе… хутка ў нас будзе дзіця! У яго двое хлопчыкаў, хацеў дзяўчынку. Але словы… словы… яны нічога не азначаюць, за словы хаваюцца, імі абараняюцца. Вочы! Ягоныя вочы… У вачах з'явіўся страх: трэба ж нешта вырашаць, змяняць сваё жыццё. Тут… тут — замінка… Збой. Ах-х-х! Ёсць мужчыны, якія сыходзяць адразу, яны сыходзяць з валізкамі, куды пакладзеныя яшчэ сырыя шкарпэткі і кашулі… А ёсць такія, як ён… Мусі-пусі, тралі-валі… «Што ты хочаш? Скажы, што я мушу зрабіць? — пытаўся ён у мяне. — Адно тваё слова — і я развядуся. Ты толькі скажы». Я глядзела на яго…

Я глядзела на яго, і ў мяне халадзелі кончыкі пальцаў, пачала ўжо разумець, што шчаслівай з ім не буду. Маленькая і дурненькая… Цяпер я б абклала яго сцяжкамі, як ваўка на паляванні, я ўмею быць драпежніцай і пантэрай. Сталёвай ніткай! Тады я толькі пакутавала. Пакута — гэта танец, у ім і жэст, і плач, і пакора. Як у балеце… Але ёсць адзін сакрэт, просты сакрэт — непрыемна быць нешчаслівай… гэта прыніжае… Чарговы раз я ляжала ў бальніцы на захаванні. Тэлефаную яму раніцай, што мяне трэба забраць, да абеду выпішуць, а ён сонным голасам: «Не магу. Сёння не магу». І не перататэлефанаваў. У гэты дзень ён паляцеў з сынамі ў Італію, катацца на лыжах. Трыццаць першага снежня… Заўтра — Новы год. Выклікала таксі… Горад заваліла снегам, я йшла праз сумёты, трымаючыся за пуза. Ішла адна. Няпраўда! Удзвюх, мы ўжо былі ўдзвюх. З маёй дачкой… дачушкай… Маёй! Абагоўленай! Я ўжо любіла яе больш за ўсіх на свеце! Ці кахала я яго? Як у той казцы: жылі яны доўга і шчасліва і памерлі ў адзін дзень. Пакутавала, але не памірала: «Я не магу без яго жыць. Я без яго памру». Я, напэўна, яшчэ не сустрэла такога мужчыну…

для такіх слоў… Вось так! Так-так-так! Але я навучылася прайграваць, я не баюся прайграваць… *(Глядзіць у акно.)* У мяне з тых часоў няма сур'ёзных гісторый… Былі раманчыкі… Я лёгка ўваходжу ў сэкс, але гэта не тое, гэта іншае. Мне не падабаецца пах мужчын, не пах кахання, а пах мужчын. У ванным пакоі я заўсёды чую, што тут быў мужчына… хай у яго самы дарагі парфюм, дарагія цыгарэты… Мяне ахоплівае жах, калі я падумаю, колькі трэба працаваць, каб каля цябе быў іншы чалавек. Як у каменяломні! Забыцца пра сябе, адмовіцца ад сябе, вызваліцца ад сябе. У каханні няма свабоды. Нават калі вы знойдзеце свой ідэал, у яго будзе не тая парфума, ён будзе любіць смажанае мяса і смяяцца з вашых салацікаў, не там пакідаць шкарпэткі і штаны. І заўсёды трэба пакутаваць. Пакутаваць?! Ад кахання… ад гэтай кампазіцыі… Я не хачу больш рабіць гэтую працу, мне лягчэй спадзявацца на сябе. З мужчынамі лепш сябраваць, мець дзелавыя дачыненні. Мне нават баламуціць іх неахвота, лянота надзяваць гэтую маску, уступаць у гульню. Спа-салон, фрэнч-манікюр, італьянскае нарошчванне. Макіяж. Баявая афарбоўка… Божа мой! Божа мой! Дзяўчаткі з Цьмутараканска… З усёй Расіі — у Маскву! У Маскву! Там чакаюць іх багатыя прынцы! Яны мараць, што з папялушак іх ператвораць у прынцэс. Чаканне казкі! Цуду! Я праз гэта… ужо праехала… Разумею папялушак, але мне іх шкада. Раю без пекла не бывае. Каб адзін рай… так не бывае… Але яны яшчэ гэтага не ведаюць… у няведанні…

Прайшло сем гадоў, як мы расталіся… Ён мне тэлефануе, тэлефануе заўсёды чамусьці ўначы. У яго ўсё дрэнна, страціў шмат грошай… кажа, што нешчаслівы… Была адна маладая дзяўчына, цяпер іншая. Прапануе: давай сустрэнемся… Навошта? *(Маўчыць.)* Мне доўга яго не ставала, я выключала святло і гадзінамі сядзела ў цемры. Гублялася ў часе… *(Маўчыць.)* Потым… потым былі толькі раманчыкі… Але я… Я ніколі не змагу закахацца ў мужчыну без грошай, са спальнага раёна. З панэльнага гета, з Гарлема. Я ненавіджу тых,

хто рос у галечы, з «жабрацкім» менталітэтам, грошы значаць для іх так шмат, што ім нельга давяраць. Не люблю бедных, прыніжаных і абражаных. Усіх гэтых Башмачкіных і Апіскіных... герояў вялікай рускай літаратуры... Не давяраю ім! Што? Нешта са мной не так... не ўпісваюся ў фармат? Пачакайце... Ніхто не ведае, як уладкаваны гэты свет... Мужчына мне падабаецца не за грошы, не толькі за грошы. Мне падабаецца ўвесь вобраз паспяховага мужчыны: як ён ходзіць, як ён кіруе машынай, як гаворыць, як заляцаецца — усё ў яго іншае. Усё! Я такіх выбіраю... За гэта... *(Маўчыць.)* Ён тэлефануе... ён нешчаслівы... Чаго ж ён такога не бачыў і не можа купіць? Ён... і ягоныя сябры... Грошы ўжо зароблены. Вялікія грошы. Вар'яцкія! Але за ўсе свае грошы яны не могуць набыць сабе шчасце, гэтае самае каханне. Любоў-маркоў. Бедны студэнт яе мае, а яны не. Вось такая несправядлівасць! А ім здаецца, што яны могуць усё: на прыватных самалётах лётаюць у якую заўгодна краіну на футбольны матч, у Нью-Ёрк — на прэм'еру мюзікла. Усё — па кішэні! Зацягнуць у ложак самую прыгожую мадэль, прывезці іх у Куршавель — цэлы самалёт! Усе мы Горкага ў школе праходзілі, ведаем, што такое купецкі загул — біць люстэркі, ляжаць мордай у чорнай ікры... купаць дзевак у шампанскім... Але ўсё надакучыла — сумна ім. Маскоўскія турагенцтвы прапануюць такім кліентам адмысловыя забавы. Напрыклад, два дні ў турме. У рэкламе так і напісана: «Хочаце пабыць два дні Хадаркоўскім?» У міліцэйскай машыне з кратамі іх вязуць у горад Уладзімір у самую страшную турму — Уладзімірскі цэнтрал, там пераадзяваюць у арыштанцкую робу, ганяюць па двары з сабакамі і б'юць гумовымі дубінкамі. Сапраўднымі! Напіхваюць, як селядцоў, у брудную смярдзючую камеру з парашай. І яны — шчаслівыя. Новыя адчуванні! За тры-пяць тысяч даляраў можна яшчэ пагуляць у «бамжоў»: ахвотнікаў пераадзяваюць, грымiруюць і разводзяць па маскоўскіх вуліцах, яны жабруюць. Праўда, побач за рогам дзяжураць ахоўнікі — уласныя і ад турфірмы. Ёсць прапановы

і больш крутыя, для ўсёй сям'і: жонка — прастытутка, муж — сутэнёр. Ведаю гісторыю... Аднойчы больш за ўсіх за вечар зняла кліентаў сціплая, з савецкай знешнасцю, жонка найбагацейшага маскоўскага кандытара. І муж быў шчаслівы! Ёсць забавы, пра якія не паведамляюць у рэкламных праспектах... Цалкам сакрэтна... Можна зладзіць ноччу паляванне на жывога чалавека. Няшчаснаму бамжу даюць тысячу баксаў — вось яны «зялёныя» — твае! Ён зроду такіх грошай не бачыў! А за гэта — папрацуй зверам! Уратуешся — значыць, лёс, прыстрэляць — не крыўдуй. Усё сумленна! Можна ўзяць дзяўчынку на ноч... Даць волю фантазіям, нізу жывата, ды так, што маркізу дэ Саду не снілася! Кроў, слёзы і сперма! Гэта называецца — шчасцем... Шчасце па-руску — трапіць у турму на два дні, каб потым выйсці адтуль і зразумець, як у цябе ўсё добра. Цудоўна! Купіць не толькі машыну, дом, яхту, дэпутацкае крэсла... але і чалавечае жыццё... Пабыць калі не богам, то бажком... звышчалавекам! Ну так... І ўсё! Усе народжаныя ў СССР, яшчэ ўсе адтуль. З гэтым дыягназам. А такі... Такі наіўны быў свет... марылі добрага чалавека зрабіць... Абяцалі: «жалезнай рукой загонім чалавецтва ў шчасце...» У зямны рай.

У мяне была размова з мамай... Яна хоча сысці са школы: «Уладкуюся гардэробшчыцай. Ці вартаўнікам». Вось яна распавядае дзецям пра кнігі Салжаніцына... пра герояў і праведнікаў... У яе гараць вочы, а ў дзяцей — не. Мама прывыкла, што ў дзяцей раней гарэлі вочы ад ейных слоў, а сённяшнія дзеці ёй адказваюць: «Нам нават цікава, як вы жылі, але мы так жыць не хочам. Мы не марым пра подзвігі, мы хочам жыць нармальна». Чытаюць яны «Мёртвыя душы» Гогаля. Гісторыю нягодніка... Так нас у школе вучылі... А сёння сядзяць у класе іншыя дзеці: «Чаму гэта ён нягоднік? Чычыкаў, як Маўродзі, пабудаваў піраміду з нічога. Гэта класная бізнэс-ідэя!» Чычыкаў для іх станоўчы герой... *(Маўчыць.)* Маю дачку мама выхоўваць не будзе... Я не дам. Калі яе паслухаць, дык дзіця павінна глядзець толькі савецкія мульцікі, таму што яны

«чалавечыя». Але выключаеш мульцік — і выходзіш на вуліцу. У зусім іншы свет. «Як добра, што я ўжо старая, — прызналася мама. — Магу дома сядзець. У сваёй крэпасці». А раней яна заўсёды хацела быць маладой: маска з соку памідораў, валасы паласкаем рамонкам...

Па маладосці я любіла мяняць лёс, дражніць яго. Цяпер не, досыць. У мяне расце дачка, я думаю пра ейную будучыню. А гэта — грошы! Я хачу зарабіць іх сама. Не хачу прасіць, ні ў каго не хачу браць. Не хачу! Сышла з газеты ў рэкламнае агенцтва — там плацяць болей. Добрыя грошы. Людзі хочуць жыць прыгожа, — гэта галоўнае, што сёння з намі адбываецца. І гэта хвалюе ўсіх. Уключыце тэлевізар: на мітынгі збіраюцца... ну хай некалькі дзясяткаў тысяч чалавек, а прыгожую італьянскую сантэхніку набываюць мільёны. Каго ні спытаеш, усе перабудоўваюць, рамантуюць свае кватэры і дамы. Падарожнічаюць. Ніколі так у Расіі не было. Мы рэкламуем не толькі тавары, але й запыты. Вырабляем новыя запыты — як жыць прыгожа! Кіруем часам... Рэклама — люстэрка рускай рэвалюцыі... Маё жыццё запоўненае пад плешку. Замуж не збіраюся... Ёсць сябры, усе яны багатыя людзі. Адзін «растаўсцеў» на нафце, другі — на мінеральных угнаеннях... Сустракаемся, каб пагаварыць. Заўсёды ў дарагім рэстаране: мармуровы хол, антыкварная мэбля, дарагія карціны на сценах... швейцары з паставай рускіх памешчыкаў... Я люблю быць у прыгожых дэкарацыях. Мой блізкі сябар таксама жыве адзін і не хоча жаніцца, яму падабаецца быць аднаму ў сваім трохпавярховым асабняку: «Уначы спаць удваіх, а жыць аднаму». Удзень у яго галава пухне ад каціровак каляровых металаў на Лонданскай біржы. Медзь, свінец, нікель... У руках тры мабільныя тэлефоны, тэлефануюць кожныя трыццаць секунд. Працуе ён па трынаццаць-пятнаццаць гадзін на суткі. Без выходных і адпачынкаў. Шчасце? Што такое шчасце? Свет змяніўся... Цяпер самотныя — гэта паспяховыя, шчаслівыя людзі, а не слабыя ці няўдачнікі. У іх ёсць усё: грошы, кар'ера. Адзінота — гэта

выбар. Я хачу быць у дарозе. Я — паляўнічая, а не пакорлівая дзічына. Я сама выбіраю. Адзінота вельмі падобная да шчасця… Гучыць, як адкрыццё… Так? *(Маўчыць.)* Я нават не вам, а сабе хацела ўсё гэта расказаць…

## Пра жаданне іх усіх забіць, а потым пра страх, што табе гэтага хацелася

*Ксенія Золатава — студэнтка, 22 гады*

*На першую нашу сустрэчу прыйшла яе мама. Прызналася: «А Ксюша не захацела са мной пайсці. Адгаворвала і мяне: "Мама, каму мы патрэбныя? Ім патрэбныя толькі нашы пачуцці, нашы словы, а мы самі ім не патрэбныя, таму што яны гэтага не пераажылі"». Яна вельмі хвалявалася: то падымалася, каб сысці: «Я стараюся не думаць пра гэта. Балюча паўтараць», то пачынала распавядаць, і яе нельга было супыніць, але больш маўчала. Чым я магла яе суцешыць? З аднаго боку, прашу: «Не хвалюйцеся. Супакойцеся», а з другога — хачу, каб яна ўспомніла той страшны дзень: 6 лютага 2004 года — тэракт у Маскве на Замаскварэцкай лініі метро паміж станцыямі «Аўтазаводская» і «Павялецкая». У выніку выбуху загінула 39 чалавек і 122 былі шпіталізаваныя.*

*Хаджу і хаджу па кругах болю. Не магу вырвацца. У болю ёсць усё — і змрок, і ўрачыстасць, часам я веру, што боль — мост паміж людзьмі, прыхаваная сувязь, а іншым разам у роспачы думаю, што гэта — прорва.*

*Ад той двухгадзіннай сустрэчы ў нататніку засталося некалькі абзацаў:*

*«…быць ахвярай — гэта так прыніжае… Проста сорамна. Я ўвогуле не хачу з кімсьці пра гэта размаўляць, я хачу быць як усе, а атрымліваецца — адна і адна. Магу заплакаць паўсюль.*

*Бывае, іду па горадзе і плачу. Мне адзін незнаёмы мужчына сказаў: "Што ты плачаш? Такая прыгожая — і плачаш". Па-першае, прыгажосць ніколі мне ў жыцці не дапамагала, а па-другое, я адчуваю гэтую прыгажосць як здраду, яна не адпавядае таму, што ў мяне ўнутры…*

*…У нас дзве дачкі — Ксюша і Даша. Мы жылі сціпла, але шмат хадзілі ў музеі, у тэатры, шмат чыталі. Калі дзяўчаткі былі маленькія, тата ім казкі прыдумляў. Мы хацелі ўратаваць іх ад грубага жыцця. Я думала, што мастацтва ратуе. А яно не выратавала…*

*…У нашым доме жыве самотная бабулька, ходзіць у царкву. Аднойчы яна спыніла мяне, я вырашыла — паспачувае, а яна злосна: "Задумайцеся, чаму гэта з вамі здарылася? З вашымі дзецьмі?" Нашто… за што мне гэтыя словы? Яна пакаялася, я думаю, яна потым пакаялася… Я нікога не падманула, я нікому не здрадзіла. У мяне было толькі два аборты, гэта два мае грахі… Я ведаю… На вуліцы часта даю міласціну, хай трохі, колькі магу. Птушак узімку кармлю…»*

*Наступны раз яны ўжо прыйшлі ўдзвюх — мама і дачка.*

### *Маці*

— Можа, для кагосьці яны героі? У іх ёсць ідэя, яны адчуваюць сябе шчаслівымі, паміраючы, яны думаюць, што трапляюць у рай. І не баяцца смерці. Я нічога пра іх не ведаю: «Складзены фотаробат меркаванага тэрарыста…» — і ўсё. А для іх мы мішэні, ім ніхто не патлумачыў, што мая дзяўчынка не мішэнь, у яе ёсць мама, якая без яе жыць не можа, ёсць хлопчык, які ў яе закаханы. Хіба можна забіваць чалавека, якога любяць? Па-мойму, гэта падвойнае злачынства. Ідзіце на вайну, у горы, страляйце там адно ў аднаго, але чаму ў мяне? У маю дачку? Нас забіваюць пасярод мірнага жыцця… *(Маўчыць.)* Я цяпер баюся сама сябе, сваіх думак. Часам хочацца іх усіх забіць, а потым страшна, што табе гэтага хацелася.

Калісьці я любіла маскоўскае метро. Найпрыгажэйшае ў свеце! Гэта — музей! *(Маўчыць.)* Пасля выбуху... Я бачыла, як людзі заходзілі ў метро, узяўшыся за рукі. Страх доўга не прытупляўся... Страшна было ў горад выйсці, у мяне адразу ціск падымаўся. Ездзілі і выглядалі падазроных пасажыраў. На працы толькі пра гэта і гаварылі. Што з намі робіцца, а, Госпадзе? Стаю на платформе, і побач са мной маладая жанчына з дзіцячым вазком, у яе чорныя валасы, чорныя вочы — не руская. Не ведаю, якой яна нацыянальнасці — чачэнка, асецінка? Хто? Я не вытрымала і зазірнула ў вазок: а ці дзіця там? Ці не ляжыць там штосьці іншае? У мяне сапсаваўся настрой ад таго, што мы зараз будзем ехаць у адным вагоне: «Не, — думаю, — няхай яна едзе, а я пачакаю наступнага цягніка». Да мяне падыходзіць мужчына: «Чаму вы зазірнулі ў вазок?» Я сказала яму праўду. «Значыць, і вы таксама».

...Бачу няшчасную дзяўчынку, якая скруцілася ў камячок. Гэта мая Ксюша. Чаму яна тут адна? Без нас? Не, гэта немагчыма, гэта не можа быць праўдай. Кроў на падушцы... «Ксюша! Ксюшачка!» — яна мяне не чуе. Нацягнула на галаву нейкую шапачку, каб я нічога не ўбачыла, не спалохалася. Мая дзяўчынка! Яна марыла стаць дзіцячым доктарам, а цяпер у яе няма слыху, яна была самая прыгожая дзяўчынка ў класе... А цяпер... ейны тварык... За што? Нешта вязкае, цягучае ахінае мяне, свядомасць проста расколваецца на дробныя кавалкі. Мае ногі не хочуць рухацца, ватныя, мяне выводзяць з палаты. Доктар сварыцца: «Вазьміце сябе ў рукі, інакш больш да яе не пусцім». Я бяру сябе ў рукі... Вяртаюся ў палату... Глядзіць не на мяне, а кудысьці міма, як быццам мяне не пазнае. Ёсць выраз вачэй параненае жывёлы, гэты погляд нельга вынесці. Далей жыць амаль нельга. Цяпер яна кудысьці схавала гэты погляд, надзела на сябе панцыр, але яна дзесьці трымае гэта ўсё. Гэта ўсё ў ёй адбітае. Увесь час яна там, дзе нас не было...

Цэлае аддзяленне такіх дзяўчатак… як ехалі ў вагоне, так і ляжалі… Шмат студэнтаў, школьнікаў. Я думала, што ўсе мамы выйдуць на вуліцу. Усе мамы са сваімі дзецьмі. Нас будуць тысячы. Цяпер я ведаю, што мая дзяўчынка патрэбная толькі мне, толькі дома, толькі нам. Слухаюць… спачуваюць… але без болю! Без болю!

Вярталася з бальніцы дадому і ляжала без усялякіх пачуццяў. Даша была побач, яна ўзяла адпачынак. Гладзіла мяне па галаве, як маленькую. Тата не крычаў, не панікаваў — і інфаркт. Мы апынуліся ў пекле… Зноў — за што? Я ўсё жыццё сваім дзяўчаткам падсоўвала добрыя кніжкі, пераконвала іх, што дабро мацнейшае за зло, дабро заўсёды перамагае. Але жыццё — гэта не кніжкі. Малітва маці з марскога дна дастане? Няпраўда! Я здрадніца, я не змагла абараніць іх, як у дзяцінстве, а яны спадзяваліся на мяне. Калі б мая любоў абараняла, яны былі б недасягальныя ні для якой бяды, ні для якіх расчараванняў.

Адна аперацыя… другая… Тры! Вось Ксюша стала чуць на адно вушка… пальчыкі ўжо ў нас рухаюцца… Жылі на мяжы жыцця і смерці, паміж верай у цуд і несправядлівасцю, і, хоць я медсястра, я зразумела, што зусім мала ведаю пра смерць. Шмат разоў яе бачыла, яна праміналa побач. Паставіць кропельніцу, паслухаць пульс… Усе думаюць, што медыкі ведаюць пра смерць больш за астатніх, нічога падобнага. Быў у нас адзін паталагаанатам, ён ужо сыходзіў на пенсію. «Што такое смерць?» — спытаў ён у мяне. *(Маўчыць.)* Ранейшае жыццё ператварылася ў белую пляму… Успаміналася адна Ксюша… Усё да нюансаў — як маленькая, смелая, забаўная, яна не баялася вялікіх сабак і хацела, каб заўсёды было лета. Як ззялі яе вочы, калі яна прыйшла дадому і абвясціла нам, што паступіла ў медінстытут. Без хабараў, без рэпетытараў. Плаціць мы не маглі, для нашай сям'і гэта было не пад сілу. Як за дзень ці два да тэракту яна бярэ старую газету і чытае: калі вы трапілі ў нейкую экстрэмальную сітуацыю ў метро, трэба рабіць тое…

тое… Што менавіта, я ўжо забылася, але гэта была інструкцыя. І калі ўсё здарылася, пакуль не страціла прытомнасць, Ксюша гэты артыкул успамінала. А той раніцы было так… Яна якраз забрала свае боцікі з рамонту, апранула паліто і стала іх нацягваць, а яны не налазяць… «Мама, я твае боты надзену?» — «Бяры». У нас з ёй памер аднолькавы. Маё матчына сэрца нічога мне не падказала… Я ж магла яе ўтрымаць… У снах перад гэтым я бачыла вялікія зоркі, нейкае сузор'е. Ніякай трывогі не з'явілася… Гэта мая віна, я раздушаная гэтай віной…

Калі б дазволілі, начавала б у бальніцы, была б мамай для ўсіх. Хтосьці рыдае на лесвіцы… Кагосьці абняць трэба, з кімсьці пасядзець. Дзяўчынка з Пермі плакала — мама далёка. У іншай ножку расціснула… Ножка — гэта даражэй за ўсё! За ўсё даражэй ножка твайго дзіцяці! Хто мяне за гэта папракне?

Першыя дні пра тэракт шмат пісалі ў газетах, паказвалі рэпартажы ў тэлевізары. Калі Ксюша ўбачыла сваю надрукаваную фатаграфію, яна выкінула гэтую газету…

*Дачка*

…Я шмат чаго не памятаю… Не трымаю ў памяці! Не хачу! *(Маці абдымае яе. Супакойвае.)*

…Пад зямлёй усё страшнейшае. Цяпер я заўсёды нашу з сабой ліхтарык у сумачцы…

…Не было чуваць ні плачу, ні крыку. Стаяла цішыня. Усе ляжалі ў агульнай кучы… не, не страшна… Потым сталі варушыцца. У нейкі момант да мяне дайшло, што трэба сыходзіць адсюль, там жа ўсё хімічнае, і яно гарыць. Я яшчэ шукала свой заплечнік, дзе ляжалі мае канспекты, кашалёк… Шок… шок быў… болю не адчувала…

…Жаночы голас клікаў: «Сярожа! Сярожа!» Сярожа не адгукаўся… Некалькі чалавек засталіся сядзець у вагоне ў ненатуральных паставах. Адзін мужчына вісеў на стойцы, як чарвяк. Я баялася глядзець у той бок…

...Ішла, і мяне гайдала... Адусюль было чуваць: «Памажыце! Памажыце!» Нехта перада мною рухаўся як самнамбула, то паволі наперад пройдзе, то назад. Нас з ім усе абганялі.

...Наверсе да мяне падбеглі дзве дзяўчыны, нейкую анучку прыляпілі на лоб. Мне было чамусьці жудасна холадна. Далі крэселка, я села. Бачыла, як яны прасілі ў пасажыраў рамяні і гальштукі, і перацягвалі імі раны. Дзяжурная станцыі камусьці крычала ў тэлефон: «Што вы хочаце? Людзі выходзяць з тунэлю і тут жа паміраюць, падымаюцца на платформу і паміраюць...» *(Маўчыць.)* Навошта вы нас мучыце? Мне маму шкада. *(Маўчыць.)* Усе ўжо да гэтага прызвычаіліся. Уключаць тэлевізар, паслухаюць, і пайшлі піць каву...

*Маці*

—Я вырасла ў глыбока савецкі час. Самы-самы. Родам з СССР. А новая Расія... я яшчэ яе не разумею. Не магу сказаць, што горш — тое, што цяпер, ці гісторыя КПСС? У мяне ў галаве савецкі вобраз, тая матрыца, я палову жыцця правяла пры сацыялізме. Засела гэта ўва мне. Не выбіць. І ці хачу я з гэтым расстацца — не ведаю. У той час жыць было дрэнна, а цяпер страшна. Раніцай разбягаемся: мы на працу, дзяўчаты на вучобу, і цэлы дзень барабанім адно аднаму: «Што там у цябе? А якой паедзеш дамоў? Якім транспартам?» Збіраемся ўсе дома ўвечары, і толькі тады ў мяне настае палёгка або, прынамсі, перадышка. Я ўсяго баюся. Дрыжу. Дзяўчаты сварацца: усё ты, мама, перабольшваеш... Я нармальная, але мне патрэбная гэтая абарона, гэтая абалонка — мой дом. У мяне таты рана не стала, можа, таму мяне так лёгка параніць, пагатоў тата мяне моцна любіў. *(Маўчыць.)* Наш татачка быў на вайне, два разы гарэў у танку... Праз вайну прайшоў — ацалеў. Прыйшоў дадому — забілі. У падваротні.

Вучылася я па савецкіх кнігах, зусім іншаму нас вучылі. Проста вам для параўнання... У гэтых кнігах пра першых

рускіх тэрарыстаў пісалі, што яны героі. Пакутнікі. Соф'я Пяроўская, Кібальчыч... Гінулі яны за народ, за святую справу. Кінулі бомбу ў цара. Гэтыя маладыя людзі часта былі з дваран, з добрых сем'яў... Чаму мы здзіўленыя, што такія людзі сёння ёсць? *(Маўчыць.)* На ўроках гісторыі, калі праходзілі Вялікую Айчынную вайну, настаўнік нам распавядаў пра подзвіг беларускай партызанкі Алены Мазанік, якая забіла гаўляйтара Беларусі Кубэ, прымацаваўшы бомбу да ложка, дзе ён спаў з цяжарнай жонкай. А ў суседнім пакоі, за сценкай, знаходзіліся іх маленькія дзеці... Сталін асабіста ўзнагародзіў яе Зоркай Героя. Да канца жыцця яна хадзіла ў школы і на ўроках мужнасці ўспамінала пра свой подзвіг. Ні настаўнік... ніхто... Ніхто не казаў нам, што за сценкай спалі дзеці... Мазанік была няняй гэтых дзяцей... *(Маўчыць.)* Пасля вайны сумленным людзям сорамна ўспамінаць пра тое, што ім даводзілася рабіць на вайне. Тата наш пакутаваў...

На «Аўтазаводскай» падарваўся хлопчык-смяротнік. Чачэнскі хлопчык. Ад бацькоў даведаліся пра яго, што ён шмат чытаў. Любіў Талстога. Ён вырас на вайне: бамбёжкі, артабстрэлы.... бачыў, як загінулі яго стрыечныя браты — і ў чатырнаццаць гадоў збег у горы да Хатаба. Хацеў адпомсціць. Напэўна, гэта быў чысты хлопчык, з гарачым сэрцам... З яго смяяліся: ха-ха... дурань смаркаты... А ён навучыўся страляць лепш за ўсіх і кідаць гранаты. Мама яго знайшла і прыцягнула назад у вёску, яна хацела, каб ён скончыў школу і стаў плітачнікам. Але праз год ён зноў знік у гарах. Яго навучылі падрываць, і ён прыехаў у Маскву... *(Маўчыць.)* Калі б ён забіваў за грошы, было б усё зразумела, але ён забіваў не за грошы. Гэты хлопчык мог кінуцца пад танк і падарваць радзільню...

Хто я? Мы з натоўпу... заўсёды ў натоўпе... Наша жыццё будзённае, непрыкметнае, хоць мы стараемся жыць. Любім, пакутуем. Толькі нікому гэта не цікава, кніг пра нас не пішуць. Натоўп... маса. Мяне ніхто не распытваў пра маё жыццё, таму я з вамі так разгаварылася. «Мама, хавай душу», — гэта мае

дзяўчаткі. Увесь час вучаць мяне. Маладыя жывуць у больш жорсткім свеце, чым быў савецкі свет… *(Маўчыць.)* Такое адчуванне, што жыццё як быццам ужо не для нас, не для такіх, як мы, яно дзесьці там. Дзесьці… Нешта адбываецца, але не з намі… Я не хаджу ў дарагія крамы, саромеюся: там стаяць ахоўнікі, яны глядзяць на мяне з пагардай, бо апранаюся я на рынку. У кітайскі шырспажыў. Езджу ў метро, смяротна баюся, але езджу. Хто багацейшы, у метро не ездзіць. Метро для бедных, а не для ўсіх, зноў у нас з'явіліся князі і баяры і цяглавы народ. Забылася ўжо, калі ў кавярні сядзела, яна мне не па кішэні. І тэатр ужо раскоша, а калісьці я не прапускала ніводнай прэм'еры. Крыўдна… вельмі крыўдна… Нейкая шэрасць ад таго, што мы не дапушчаныя ў гэты новы свет. Муж прыносіць кнігі з бібліятэкі сумкамі, гэта адзінае, што нам па-ранейшаму даступнае. Можам яшчэ паблукаць па старой Маскве, па нашых улюбёных мясцінах — Якіманка, Кітайгорад, Варварка. Гэта наш панцыр, цяпер кожны нарошчвае сабе панцыр. *(Маўчыць.)* Нас вучылі… У Маркса напісана: «Капітал — гэта крадзеж». І я з ім згодная.

Я ведала каханне… Заўсёды адчуваю: ці кахаў чалавек ці не, з тым, хто кахаў, у мяне інтуітыўная сувязь. Без слоў. Прыгадала цяпер першага мужа… Кахала? Так. Моцна? — Вельмі моцна. Мне было дваццаць гадоў. У галаве адны мары. Жылі з ягонай прыгожай старой мамай, яна мяне раўнавала: «Ты такая ж прыгожая, як я ў маладосці». Кветкі, якія ён дарыў мне, яна забірала ў свой пакой. Я яе потым зразумела, можа, толькі цяпер я яе зразумела, калі ведаю, як люблю сваіх дзяўчатак, якая можа быць шчыльная сувязь з дзіцём. Мяне псіхолаг хоча пераканаць: «У вас гіпертрафаваная любоў да дзяцей. Так нельга любіць». Ды нармальная ў мяне любоў… Любоў! Маё жыццё… вось маё-маё… Ніхто не ведае рэцэпту… *(Маўчыць.)* Муж мяне кахаў, але ў яго была філасофія: немагчыма пражыць жыццё з адной жанчынай, трэба спазнаць іншых. Я шмат думала… плакала… Змагла і адпусціла. Засталася з маленькай

Ксюшай адна. Другі муж… Быў ён мне як брат, а я заўсёды марыла пра старэйшага брата. Разгубілася. Не ведала, як мы будзем з ім жыць, калі ён зрабіў мне прапанову. Каб нараджаць дзяцей, трэба, каб у доме пахла каханнем. Перавёз ён нас з Ксюшай да сябе: «Давай паспрабуем. Не спадабаецца, я адвязу вас назад». І неяк у нас з ім наладзілася. Каханне бывае рознае: бывае шалёнае, а бывае падобнае да сяброўства. Да сяброўскага саюзу. Мне падабаецца так думаць, бо мой муж вельмі добры чалавек. Хай і не жыла я ў шаўках…

Нарадзіла Дашачку… Мы ніколі не расставаліся з нашымі дзецьмі, разам ездзілі ўлетку ў вёску да бабулі ў Калужскую вобласць. Там была рэчка. Луг і лес. Бабуля пякла пірагі з вішнямі, якія дзеці і цяпер успамінаюць. Ніколі мы не ездзілі на мора, гэта была наша мара. Як вядома, сумленнай працай вялікіх грошай не заробіш: я — медсястра, муж — навуковы супрацоўнік у інстытуце радыялагічнай тэхнікі. Але дзяўчаты ведалі, што мы іх любім.

Многія абагаўляюць перабудову… Усе на нешта спадзяваліся. Мне любіць Гарбачова няма за што. Памятаю размовы ў нас у ардынатарскай: «Скончыцца сацыялізм, а што будзе пасля яго?» — «Скончыцца дрэнны сацыялізм, і будзе добры сацыялізм». Чакалі… чыталі газеты… Неўзабаве муж страціў працу, іх інстытут закрылі. Беспрацоўных — мора, усе з вышэйшай адукацыяй. З'явіліся шапікі, затым супермаркеты, у якіх было ўсё, як у казцы, а купіць няма на што. Зайду — выйду. Набывала два яблыкі і адзін апельсін, калі дзеці хварэлі. Як з гэтым зміryцца? Пагадзіцца з тым, што так яно цяпер і будзе — як? Стаю ў чарзе ў касу, перада мной мужчына з вазком, там у яго і ананасы, і бананы… Так гэта прыніжае. Праз гэта людзі сёння нейкія ўсе стомленыя. Не дай Бог нарадзіцца ў СССР, а жыць у Расіі. (*Маўчыць.*) Ні адна мая мара ў жыцці не здзейснілася…

*Калі дачка выйшла ў іншы пакой, гаворыць са мной паўшэптам.*

Колькі гадоў? Тры гады ўжо мінула пасля тэракту... не, больш... Мая таямніца... Уявіць сабе не магу, што лягу з мужам у ложак, і мужчынская рука да мяне дакранецца. У нас з мужам ніякіх адносін усе гэтыя гады, я жонка і не жонка, ён мяне ўгаворвае: «Табе стане лягчэй». Сяброўка, якая ўсё ведае, яна таксама мяне не разумее: «Ты абалдзенная, ты сэксуальная. Паглядзі на сябе ў люстэрка, якая ты прыгожая. Якія валасы...» У мяне такія валасы ад нараджэння, я аб прыгажосці сваёй забылася. Калі чалавек тоне, ён увесь набрыньвае вадой, так я ўся набракнутая болем. Як быццам адрынула сваё цела, і засталася адна душа...

*Дачка*

...Ляжалі забітыя, у іх у кішэнях бясконца званілі мабільнікі... Ніхто не рашаўся падысці і адказаць.

...Сядзела на падлозе скрываўленая дзяўчына, нейкі хлопец прапаноўваў ёй шакаладку...

...Куртка мая не згарэла, але яна была ўся паплаўленая. Доктарка агледзела мяне і адразу сказала: «Кладзіцеся на насілкі». Я яшчэ супраціўлялася: «Сама падымуся і дайду да "хуткай"», яна нават прыкрыкнула на мяне: «Кладзіцеся!» У машыне я страціла прытомнасць, ачомалася ў рэанімацыі...

...Чаму я маўчу? Я сябравала з адным хлопцам, мы нават... ён мне пярсцёнак падарыў... І я яму распавяла, што са мной было... Можа, гэта абсалютна не звязана, але мы рассталіся. У мяне гэта адклалася, я зразумела, што не трэба ніякіх шчырасцяў. Цябе ўзарвалі, ты выжыў, ты стаў яшчэ больш уразлівы і ломкі. На табе таўро пацярпелага, я не хачу, каб на мне было бачнае гэтае таўро...

...Наша мама любіць тэатры, часам ёй удаецца злавіць танны квіток: «Ксюша, мы ідзём у тэатр». Я адмаўляюся, яны ідуць удваіх з татам. На мяне тэатр ужо не ўздзейнічае...

*Маці*

— Чалавек не ведае, чаму гэта менавіта з ім здарылася, таму хочацца быць як усе. Схавацца. Гэта ўсё адразу не адключаецца...

Гэты хлопчык-смяротнік... і іншыя... Яны спусціліся з гор і прыйшлі да нас: «Як нас забіваюць, вы не бачыце. Паспрабуем гэта зрабіць у вас». *(Маўчыць.)*

Я думаю... Хачу ўспомніць, калі я была шчаслівай? Трэба ўспомніць... Я была шчаслівая толькі адзін раз у жыцці, калі дзеці былі маленькія...

Званок у дзверы — Ксюшыны сябры... Пасадзіла іх на кухні. У мяне ад мамы: першае — гэта накарміць гасцей. Пэўны час маладыя перасталі гаварыць пра палітыку, а цяпер зноў гавораць. Сталі спрачацца пра Пуціна... «Пуцін — гэта клон Сталіна...», «Гэта надоўга...», «Гэта жопа ўсёй краіне...», «Гэта — газ, гэта — нафта...» Пытанне: хто Сталіна зрабіў Сталіным? Праблема віны...

Судзіць трэба толькі тых, хто расстрэльваў, катаваў ці:

і таго, хто напісаў данос...

хто забраў у сваякоў дзіця «ворага народа» і здаў яго ў дзіцячы дом...

шафёра, які перавозіў арыштаваных...

прыбіральшчыцу, якая замывала падлогу пасля катаванняў...

начальніка чыгункі, які накіроўваў таварнякі з палітвязнямі на Поўнач...

краўцоў, што шылі паўкажушкі, у якіх хадзілі лагерныя ахоўнікі. Лекараў, якія лячылі ім зубы, здымалі кардыяграму, каб яны лепш неслі сваю службу...

тых, хто маўчаў, калі іншыя на сходах крычалі: «Сабакам — сабачая смерць!»

Са Сталіна перайшлі на Чачню... І зноў усё тое самае: хто забівае, узрывае — так, вінаваты, а той, хто робіць бомбы,

снарады на заводах, шые вайсковую форму, вучыць салдат страляць… прадстаўляе да ўзнагароды… Хіба яны вінаватыя? *(Маўчыць.)* Мне хацелася закрыць сабой Ксюшу, куды-небудзь звесці яе ад гэтых размоваў. Яна сядзела з вялікімі ад жаху вачыма. Глядзела на мяне… *(Паварочваецца да дачкі.)* Ксюшачка, я не вінаватая, і наш тата не вінаваты, ён цяпер выкладае матэматыку. Я — медсястра. Да нас у бальніцу прывозілі параненых нашых афіцэраў з Чачні. Мы іх лячылі, потым, вядома, яны з'язджалі назад. На вайну. Сярод іх мала хто хацеў вяртацца, многія непасрэдна прызнаваліся: «Не хочам ваяваць». Я — медсястра, я ўсіх ратую…

Ёсць таблеткі ад зубнога болю, ад галаўнога, а ад майго няма. Псіхолаг схему надыктаваў: раніцай нашча паўшклянкі святаянніку, дваццаць кропель настойкі глогу, трыццаць — півоні… Увесь дзень распісаны. Піла я ўсё гэта. І да нейкага кітайца хадзіла… Не дапамагло… *(Маўчыць.)* Адцягваюць штодзённыя справы, таму не страчваеш розум. Руціна лекуе: памыць, папрасаваць, зашыць…

У двары нашага дома стаіць старая ліпа… Я іду — гэта, напэўна, праз пару гадоў было — і адчуваю: ліпа цвіце. Пах… А да таго ўсё неяк не востра было… не так… Фарбы пагаслыя, гукі… *(Маўчыць.)*

Пасябравала ў бальніцы з адной жанчынай, яна ехала не ў другім вагоне, як Ксюша, а ў трэцім. Хадзіла ўжо на працу, і здавалася, усё пражыла. Ды нешта здарылася — хацела выкінуцца з балкона, выскоквала з акна. Бацькі закавалі дом у краты, жылі, як у клетцы. Труцілася газам… Муж ад яе сышоў… Не ведаю, дзе яна цяпер? Хтосьці адзін раз бачыў яе на станцыі «Аўтазаводская». Хадзіла па пероне і крычала: «Бяром правай рукой тры жменькі зямлі і кідаем на труну. Бяром… кідаем». Крычала, пакуль санітары па яе не прыехалі…

Думала, што гэта Ксюша мне распавяла… Каля яе стаяў мужчына, і так блізка, што яна нават хацела зрабіць яму заўвагу. Не паспела. Потым атрымалася так, што ён засланіў

яе, шмат Ксюшыных аскепкаў трапіла ў яго. Невядома, ці застаўся ён жывы? Я пра яго часта ўспамінаю... ну проста перад вачыма ён у мяне стаіць... А Ксюша не памятае... Адкуль я гэта ўзяла? Напэўна, я прыдумала яго сабе сама. Але хтосьці ж мне яе выратаваў...

Я ведаю лекі... Ксюшы трэба быць шчаслівай. Яе можна вылечыць толькі шчасцем. Трэба штосьці такое... Былі мы на канцэрце Алы Пугачовай, якую ўсёй сям'ёй любім. Я хацела да яе падысці або запісачку паслаць: «Паспявайце для маёй дзяўчынкі. Скажыце, што гэта толькі для яе адной». Каб яна адчула сябе каралевай... падняць яе высока-высока... Яна ўбачыла пекла і павінна ўбачыць рай. Каб зноў свет для яе набыў раўнавагу. Мае ілюзіі... мары... *(Маўчыць.)* Я нічога не змагла сваёй любоўю зрабіць. Каму мне напісаць ліст? Каго папрасіць? Вы зарабілі на чачэнскай нафце, на рускіх крэдытах, дайце мне куды-небудзь яе звезці. Хай яна пасядзіць пад пальмай, на чарапаху паглядзіць, каб забылася пра пекла. У ейных вачах увесь час пекла. Святла няма, святла я ў іх не бачу.

Стала хадзіць у царкву... Ці веру я? Не ведаю. Але хочацца з кімсьці пагаварыць. Адзін раз бацюшка казанне чытаў, што ў вялікай пакуце чалавек або набліжаецца да Бога, або аддаляецца, і калі ён аддаляецца ад Бога, нельга яго дакараць, гэта ад абурэння, ад болю. Усё пра мяне.

Гляджу на людзей збоку, я не адчуваю з імі блізкай сувязі... Я гляджу так, быццам я ўжо не чалавек... Вы пісьменніца, вы мяне зразумееце: слова мала мае агульнага з тым, што адбываецца ўнутры, раней я рэдка звярталася да таго, што ў мяне ўнутры. Цяпер як на рудніках жыву... Перажываю, думаю... увесь час нешта ў сабе варушу... «Мама, хавай душу!» Не, дарагія дзяўчаткі, я не хачу, каб мае пачуцці, мае слёзы проста так зніклі. Без следу, без знаку. Мяне гэта больш за ўсё турбуе. Усё, што я перажыла — гэта не тое, што хочацца толькі дзецям пакінуць. Я хачу гэта перадаць і іншаму чалавеку, каб яно дзесьці ляжала, і кожны мог узяць сабе.

*3 верасня — Дзень памяці ахвяраў тэрарызму. Масква ў жалобе. На вуліцах шмат інвалідаў, маладыя жанчыны ў чорных хустках. Гараць памінальныя свечкі: на Салянцы, на плошчы перад тэатральным цэнтрам на Дуброўцы, каля метро «Парк культуры», «Лубянка», «Аўтазаводская», «Рыжская»…*

*Я таксама ў гэтым натоўпе. Пытаюся — слухаю. Як мы з гэтым жывём?*

*Тэракты ў Маскве былі ў 2000, 2001, 2002, 2003, 2004, 2006, 2010, 2011 гадах.*

—Ехала на працу, вагон, як заўсёды, быў перапоўнены. Выбуху не чула, але чамусьці ўсё раптам стала ў аранжавым колеры, і цела здранцвела, хацела паварушыць рукой — не змагла. Падумала, што ў мяне здарыўся інсульт, і адразу ж страціла прытомнасць… А калі ачуняла, бачу — па мне ходзяць нейкія людзі, ходзяць спакойна, як быццам я мёртвая. Спалохалася, што расціснуць, і ўзняла рукі. Мяне хтосьці падняў. Кроў і мяса — такая была карціна…

—Сыну чатыры гады. Ну, як яму сказаць, што тата загінуў? Ён жа не разумее, што такое смерць. Баюся, каб не падумаў — тата нас кінуў. Пакуль тата ў нас у камандзіроўцы…

—Часта прыгадваю… Каля бальніцы стаялі цэлыя чэргі ахвочых здаць кроў, з авоськамі апельсінаў. Прасілі змучаных нянечак: «Вазьміце ў мяне садавіну і перадайце каму-небудзь. Скажыце, што яшчэ ім патрэбна?»

—Да мяне прыязджалі дзяўчаты з працы, начальнік машыну ім даваў. А нікога бачыць не хацелася…

—Вайна патрэбная, можа, людзі з'явяцца. Мой дзед казаў, што людзей ён сустракаў толькі ў вайну. Цяпер дабрыні мала.

—Дзве незнаёмыя жанчыны абдымаліся і плакалі каля эскалатара, твары ў крыві, да мяне не даходзіла, што гэта кроў, я думала: фарба ад слёз размазалася. Увечары ўсё гэта яшчэ раз убачыла ў тэлевізары, і вось тады да мяне дайшло. Там, на месцы, не разумела, глядзела на кроў і не верыла.

—Спачатку думаеш, што ты можаш спусціцца ў метро, заходзіш у вагон смела, але праязджаеш адзін-два прыпынкі і выскокваеш у халодным поце. Асабліва страшна, калі цягнік спыніцца на некалькі хвілінаў у тунэлі. Кожная хвіліна расцягваецца, сэрца пачынае матляцца на адной нітачцы…

—У кожным каўказцы мярэсціцца тэрарыст…

—Як вы думаеце: ці рускія салдаты ў Чачні не ўчынялі злачынстваў? У мяне брат там служыў… Такое распавядаў пра слаўную рускую армію… Трымалі чачэнскіх мужчын у ямах, як звяроў, патрабавалі ад сваякоў выкуп. Катавалі… марадзёрылі… Цяпер хлопец співаецца.

—Дзярждэпу прадаўся? Правакатар! Хто ператварыў Чачню ў гета для рускіх? Рускіх выганялі з працы, адбіралі кватэры, машыны. Не аддасі — зарэжуць. Рускіх дзяўчат гвалтавалі толькі за тое, што яны рускія.

—Ненавіджу чачэнаў! Калі б не мы, рускія, яны б дагэтуль сядзелі ў гарах, у пячорах. Журналістаў, якія за чачэнаў, — таксама ненавіджу! Ліберасты! *(Погляд, поўны нянавісці, у мой бок — я запісваю размову.)*

—Хіба судзілі рускіх салдат за забойства нямецкіх салдат у гады Айчыннай вайны? А забівалі па-ўсякаму. Партызаны на кавалачкі палонных паліцаяў рэзалі… Паслухайце ветэранаў…

—Падчас першай чачэнскай вайны, гэта пры Ельцыне, у тэлевізары ўсё сумленна паказвалі. Мы бачылі, як плакалі чачэнскія жанчыны. Як рускія маці хадзілі па сёлах і шукалі зніклых без вестак сваіх хлопчыкаў. Іх ніхто не чапаў. Такой нянавісці, як цяпер, яшчэ не было — ні ў іх, ні ў нас.

—То палала адна Чачня, цяпер увесь паўночны Каўказ. Паўсюль будуюць мячэці.

—Геапалітыка прыйшла да нас у дом. Расія распадаецца… Хутка ад імперыі застанецца адно Маскоўскае княства…

—Ненавіджу!!!

—Каго?

—Усіх!!

—Мой сын быў яшчэ сем гадзін жывы, яго запіхнулі ў цэлафанавы мех і паклалі ў аўтобус з трупамі... Прывезлі нам казённую труну, два вянкі. Труна з нейкага пілавіння, як кардонная, яе паднялі — яна развалілася. Вянкі бедныя, вартыя жалю. Усё набывалі самі. Дзяржаве на нас, смяротных, напляваць, хай і яна прыме мой плявок — хачу з'ехаць з гэтай ё...най краіны. Падалі з мужам дакументы на эміграцыю ў Канаду.

—Раней Сталін забіваў, а цяпер бандыты. Свабода?

—У мяне чорныя валасы, чорныя вочы... Я — руская, праваслаўная. Зайшлі з сяброўкай у метро. Нас спыніла міліцыя, мяне адвялі ўбок: «Здыміце вопратку. Прад'явіце дакументы». На сяброўку — нуль увагі, яна бландынка. Мама кажа: «Пафарбуй валасы». А мне сорамна.

—Рускі чалавек моцны на трох палях — «авось», «нябось» і «як-небудзь». Па першым часе ўсе трэсліся ад страху, а праз месяц я заўважыла ў метро пад лавай падазроны скрутак і ледзь прымусіла дзяжурную патэлефанаваць у міліцыю.

—У аэрапорце Дамадзедава таксісты-сукі пасля тэракту ўзнялі кошты. Завоблачна. На ўсім бабло робяць. Б...дзь, выцягваць з машынаў — і мордай аб капот!

—Адны валяліся ў лужынах крыві, а іншыя іх здымалі на мабілы. Пстрыкалі. Зараз жа вывесілі фота ў ЖЖ. Офіснаму планктону перчыку не стае.

—Сёння — яны, заўтра — мы. І ўсе маўчаць, усе з гэтым пагадзіліся.

—Будзем, колькі можна, дапамагаць нябожчыкам нашымі малітвамі. Прасіць міласці Божай...

*Тут жа на імправізаванай сцэне школьнікі даюць канцэрт. Іх прывезлі аўтобусамі. Падыходжу бліжэй.*

—Мне Бен Ладэн цікавы... Аль-Каіда — глабальны праект...

—Я за індывідуальны тэрор. Кропкавы. Напрыклад, супраць паліцэйскіх, чыноўнікаў...

—Тэрор — гэта дрэнна ці добра?

—Гэта цяпер дабро.

—Надакучыла, блін, стаяць. Калі нас адпусцяць?

—Анекдоцец прыкольны... Тэрарысты аглядаюць славутасці ў Італіі. Дайшлі да Пізанскай вежы. Смяюцца: «Дылетанты!»

—Тэрор — гэта бізнэс...

ахвярапрынашэнне, як у старажытныя часы...

мэйнстрым...

размінка перад рэвалюцыяй...

штосьці ўласнае...

## Пра каргу з касой і прыгожую дзяўчыну

*Аляксандр Ласковіч — салдат, прадпрымальнік, эмігрант — 21–30 гадоў*

### *Смерць падобная да кахання*

—У дзяцінстве ў мяне ў двары было дрэва... Стары клён... Я з ім размаўляў, гэта быў мой сябар. Памёр дзядуля, я доўга плакаў. Увесь дзень. Мне было пяць гадоў, і я зразумеў, што памру, і ўсе памруць. Мяне ахапіў жах: усе памруць раней за мяне, і я застануся адзін. Дзікая адзінота. Мама мяне шкадавала, а тата падышоў і сказаў: «Вытры слёзы. Ты — мужчына. А мужчыны не плачуць». А я не ведаў яшчэ — хто я? Мне ніколі не падабалася быць хлопчыкам, я не любіў гуляць «у вайну». Толькі ў мяне ніхто не пытаўся... усё выбралі без мяне... Мама марыла пра дзяўчынку, тата, як заўсёды, хацеў аборт.

Першы раз я хацеў павесіцца ў сем гадоў... Усё праз кітайскую місу... Мама зварыла сочыва ў кітайскай місе і паставіла на зэдлік, а мы з братам лавілі нашу котку. Муська ценем

праляцела над місай, а мы не... Мама маладая, тата на вайсковых вучэннях. На падлозе лужына сочыва... Мама праклінае лёс афіцэрскай жонкі і тое, што жыць даводзіцца чорт ведама дзе... на Сахаліне... дзе ўзімку снегу насыпае да дзесяці метраў, а ўлетку — лопух аднаго росту з ёй. Яна хапае бацькоўскую папругу і выганяе нас на вуліцу. «Мама, на дварэ дождж, а ў паветцы мурашы кусаюцца». — «Пайшлі! Пайшлі! Прэч!» Брат пабег да суседзяў, а я цалкам сур'ёзна вырашыў павесіцца. Залез у паветку, знайшоў у кошыку вяроўку. Прыйдуць раніцай, а я вішу: вось, сукі, вам! Тут у дзверы шчыміцца Муська... Мяў-мяў... Мілая Муська! Ты прыйшла мяне пашкадаваць. Я абняў яе, прыціснуўся да яе, і так мы з ёй праседзелі да раніцы.

Тата... Што такое быў тата? Ён чытаў газеты і курыў. Зампаліт авіяпалка. Мы перасоўваліся з аднаго вайсковага гарадка ў іншы, жылі ў інтэрнатах. Доўгія цагляныя баракі, паўсюль аднолькавыя. Усе яны пахлі гуталінам і танным адэкалонам «Шыпр». Так заўсёды пахла і ад таты. Мне — восем гадоў, брату — дзевяць, тата вяртаецца са службы. Рыпіць партупея, рыпяць хромавыя боты. У гэтую хвіліну нам з братам стаць бы нябачнымі, знікнуць з ягоных вачэй! Тата бярэ з этажэркі «Аповесць пра сапраўднага чалавека» Барыса Палявога, у нашым доме — гэта «Ойча наш». «Што было далей?» — пачынае ён з брата. — «Ну самалёт упаў. А Аляксей Мярэсьеў папоўз... Паранены. З'еў вожыка... заваліўся ў канаву...» — «У якую яшчэ канаву?» — «У варонку ад пяцітоннай бомбы», — падказваю я. «Што? Гэта было ўчора. — Мы абодва скаланаемся ад камандзірскага голасу таты. — Сёння, значыць, не чыталі?» Карцінка: бегаем вакол стала, як тры клоўны — адзін вялікі, два маленькія, мы са спушчанымі штанамі, тата — з папругай. *(Паўза.)* Усё ж у нас ва ўсіх кіношнае выхаванне, так? Свет у карцінках... Не з кніг, а з фільмаў мы выраслі. І з музыкі... Кнігі, якія прыносіў дадому тата, у мяне дагэтуль выклікаюць алергію. У мяне тэмпература падымаецца, калі я бачу

ў каго-небудзь на паліцы «Аповесць пра сапраўднага чалавека» ці «Маладую гвардыю». О! Тата марыў кінуць нас пад танк... Ён хацеў, каб мы хутчэй сталі дарослымі і папрасіліся добраахвотнікамі на вайну. Свет без вайны тата не ўяўляў. Патрэбныя героі! Героямі становяцца толькі на вайне, і калі б там камусьці з нас адсекла ногі, як Аляксею Мярэсьеву, ён быў бы шчаслівы. Яго жыццё не дарэмнае... Усё выдатна! Жыццё атрымалася! І ён... я думаю, што ён сам бы выканаў прысуд, сваёй рукой, калі б я парушыў прысягу, калі б пахіснуўся ў баі. Тарас Бульба! «Я цябе спарадзіў, я цябе і заб'ю». Тата належаў ідэі, ён не чалавек. Радзіму трэба любіць безаглядна. Безумоўна! Я гэта чуў праз усё дзяцінства. Жыццё дадзена толькі для таго, каб Радзіму абараняць... Але мяне ніяк не ўдавалася запраграмаваць на вайну, на шчанячую гатоўнасць заткнуць сабою дзірку ў плаціне ці легчы пузам на міну. Я не любіў смерць... Я душыў баговак, на Сахаліне ўлетку баговак — як пяску. Душыў іх, як усе. Пакуль аднойчы не спалохаўся: чаго гэта я столькі маленькіх чырвоных трупікаў нарабіў? Муська прынесла неданошаных кацянят... Я іх паіў, выходжваў. З'явілася мама: «Яны што — мёртвыя?» І яны памерлі пасля яе слоў. Ніякіх слёз! «Мужчыны не плачуць». Тата дарыў нам вайсковыя фуражкі, на выходных ставіў кружэлкі з ваеннымі песнямі. Мы з братам сядзелі і слухалі, а па шчацэ ў таты спаўзала «скупая мужчынская сляза». Калі ён быў п'яны, заўсёды расказваў нам адну і тую ж гісторыю: як «героя» атачылі ворагі, і ён адстрэльваўся да апошняга патрона, а апошні патрон выпусціў у сваё сэрца... У гэтым месцы бацька заўсёды па-кіношнаму падаў і заўсёды чапляў нагою зэдлік, і ён таксама падаў. Тут было смешна. Бацька цверазеў і крыўдаваў: «Нічога няма смешнага, калі герой памірае».

Я не хацеў паміраць... У дзяцінстве вельмі страшна думаць пра смерць... «Мужчына павінен быць гатовым», «святарны абавязак перад Радзімай»... «Што? Ты не будзеш ведаць, як разабраць і сабраць аўтамат Калашнікава?» — не, для таты

гэта было немагчыма. Ганьба! О! Як я хацеў малочнымі зубамі ўгрызціся ў татавы хромавыя боты, біцца і кусацца. За што ён мяне — па голай задніцы перад суседскім Віцькам?! І яшчэ «дзяўчом» абзывае… А я не народжаны для танца смерці. У мяне класічны ахіл… я хацеў танцаваць у балеце… Тата служыў вялікай ідэі. Як быццам трэпанацыя чэрапа ва ўсіх была, ганарыліся тым, што жылі без штаноў, але з вінтоўкай… *(Паўза.)* Мы выраслі… мы даўно выраслі… Бедны тата! Жыццё за гэты час змяніла жанр… Там, дзе гралі аптымістычную трагедыю, цяпер разыгрываюць камедыю і баявік. Паўзе, паўзе, шышкі грызе… Адгадайце, хто гэта? — Аляксей Мярэсьеў. Улюбёны татаў герой… «Дзеці ў падвале гулялі ў гестапа, / Па-зверску забіты сантэхнік Патапаў…» Гэта ўсё, што засталося ад татавай ідэі… А сам тата? Гэта ўжо стары чалавек, зусім не гатовы да старасці. Яму б радавацца кожнай хвіліне, на неба глядзець, на дрэвы. Хай бы ў шахматы гуляў або маркі збіраў… пушкі ад запалак… Сядзіць каля тэлевізара: пасяджэнні парламента — левыя, правыя, мітынгі, дэманстрацыі з чырвонымі сцягамі. Тата — там! Ён — за камуністаў. Збяромся за вячэрай… «У нас была вялікая эпоха!» — наносіць ён мне першы ўдар і чакае адказу. Тату патрэбная барацьба, інакш жыццё страчвае сэнс. Толькі — на барыкады і са сцягам! Вось мы глядзім з ім тэлевізар: японскі робат дастае з пяску ржавыя міны… адну… другую… Трыумф навукі і тэхнікі! Чалавечага розуму! Праўда, тату за дзяржаву крыўдна, што гэта не наша тэхніка. Але тут… Нечакана пад канец рэпартажу ў нас на вачах робат робіць памылку і падрываецца. Як кажуць, убачыў — бяжыць сапёр, бяжы за ім. У робата такой праграмы няма. Тата дзівіцца: «Нішчыць імпартную тэхніку? У нас што, асабовага складу не хапае?» У яго свае адносіны са смерцю. Тата жыў для таго, каб выканаць любое заданне партыі і ўраду. Жыццё каштавала менш за жалезкі.

На Сахаліне… Мы жылі каля могілак. Амаль кожны дзень я чуў жалобную музыку: жоўтая труна — памёр нехта ў пасёлку,

ababітая чырвоным кумачом — лётчык загінуў. Чырвоных трунаў было больш. Пасля кожнай чырвонай труны тата прыносіў дадому магнітафонную касету… Прыходзілі лётчыкі… На стале дыміліся пажаваныя папяросныя «бычкі», блішчэлі запацелыя шклянкі з гарэлкай. Круцілася касета: «Я — борт такі й такі… Рухавік стаў…» — «Ідзіце на другім». — «І гэты стаў». — «Спрабуйце запусціць левы рухавік». — «Не запускаецца…» — «Правы…» — «Правы таксама…» — «Катапультуйцеся!» — «Ліхтар кабіны не скідваецца… Тваю маць! Э-э-э… ы-ы-ы…» Я доўга ўяўляў смерць як падзенне з неймавернай вышыні: э-э-э… ы-ы-ы… Хтосьці з маладых лётчыкаў аднойчы спытаў у мяне: «Што ты, малы, ведаеш пра смерць?» Я здзівіўся. Мне здавалася, што я гэта ведаў заўсёды. Хавалі хлопчыка з нашага класа… распаліў вогнішча і накідаў туды патронаў…. Так ірванула! Вось ён… ляжыць у труне і як быццам прыкідваецца, усе глядзяць на яго, а ён недасяжны нікому… Я не мог адвесці вачэй… як быццам я гэта ведаў заўсёды, нарадзіўся ўжо з гэтым веданнем. Можа, я ўжо калісьці паміраў? Ці мама, калі я яшчэ жыў у ёй, сядзела каля акна і глядзела, як везлі на могілкі: чырвоная труна, жоўтая труна… Я быў загіпнатызаваны смерцю, цягам дня думаў пра яе дзясяткі разоў. Шмат разоў думаў. Смерць пахла папяроснымі «бычкамі», недаедзенымі шпротамі і гарэлкай. Гэта не абавязкова бяззубая карга з касой, а можа, гэта прыгожая дзяўчына? І я яе ўбачу.

Васямнаццаць гадоў… Усяго хочацца: жанчын, віна, падарожнічаць… Загадак, таямніц. Я прыдумляў сабе featuresзнае жыццё, уяўляў. І ў гэты момант цябе падпільноўваюць… Ё-маё! Мне дагэтуль хочацца растаць у паветры, знікнуць, каб нідзе мяне не знайшлі. Не пакінуць аніякіх слядоў. Пайсці куды-небудзь лесніком, бяспашпартным бамжом. Пастаянна навальваецца адзін і той самы сон: мяне зноў забіраюць у войска — пераблыталі дакументы, і зноў трэба ісці служыць. Крычу, адбіваюся: «Я ўжо служыў, скаты! Не чапайце мяне!» Губляю розум! Жудасны сон… *(Паўза.)* Я не хацеў быць хлопчыкам… Не

хацеў быць салдатам, вайна мне была нецікавая. Тата сказаў: «Ты павінен, нарэшце, стаць мужчынам. А то дзяўчаты падумаюць, што ты імпатэнт. Войска — школа жыцця». Трэба ісці вучыцца забіваць… У мяне, у маім уяўленні гэта выглядала так: барабанны бой, баявыя шэрагі, добра зробленыя прылады забойства, свіст гарачага свінцу і… разбітыя галовы, вытаўчаныя вочы, адарваныя канечнасці… выццё і стогны параненых… І крыкі пераможцаў… тых, хто ўмее забіваць лепш… Забіць! Забіць! Стралой, куляй, снарадам ці ядзернай бомбай, але ўсё адно забіць… забіць іншага чалавека… Я не хацеў. І я ведаў, што ў войску з мяне будуць рабіць мужчыну іншыя мужчыны. Ці мяне заб'юць, ці я кагосьці заб'ю. Брат пайшоў з ружовай ватай у галаве, рамантыкам, а вярнуўся пасля службы спалоханым чалавекам. Кожную раніцу яго білі нагой у твар. Ён ляжаў на ніжніх нарах, «дзед» — наверсе. Цэлы год табе пяткай у морду! Паспрабуй застацца тым, кім ты быў. А калі раздзець чалавека дагала — колькі можна ўсяго прыдумаць? Шмат чаго… Напрыклад, смактаць уласны чэлес, а ўсе будуць смяяцца. Хто не будзе смяяцца, сам будзе смактаць… А зубной шчоткай або лязом для галення драіць салдацкую прыбіральню? «Павінна блішчэць, як у ката яйцы». Ё-маё! Ёсць тып людзей, якія не могуць быць мясам, а ёсць іншы тып, здольны быць толькі мясам. Чалавечыя праснакі. Я зразумеў, што павінен сабраць усю сваю жарсць, каб выжыць. Запісаўся ў спартовую секцыю — хатха-ёга, каратэ. Вучыўся біць — у твар, паміж ног. Як хрыбетнік пераламаць… Запальваў запалку, клаў на далонь і чакаў, пакуль яна дагарыць. Вядома, я не вытрымліваў… Плакаў. Я помню… помню… *(Паўза.)* Гуляе па лесе цмок. Сустрэў мядзведзя: «Мядзведзь, — кажа цмок, — у мяне а восьмай вячэра. Прыходзь — я цябе з'ем». Ідзе далей. Бяжыць ліса: «Ліса, — кажа цмок, — у мяне а сёмай раніцы сняданак. Прыходзь — я цябе з'ем». Ідзе далей. Скача заяц. «Стой, заяц, — кажа цмок, — у мяне а другой гадзіне абед. Прыходзь — я цябе з'ем». — «У мяне пытанне», — падняў

заяц лапу. «Давай». — «Ці можна не прыходзіць?» — «Можна. Я цябе выкрэсліваю са спісу». Але мала хто здольны задаць такое пытанне… Бляааа!

Праводзіны… Два дні дома смажылі, варылі, парылі, ляпілі, пяклі. Набылі дзве скрыні гарэлкі. Сабраліся ўсе сваякі. «Не пасаром, сынок!» — падняў першую чарку бацька. І пайшло… Ё-маё! Знаёмы тэкст: «прайсці выпрабаванні»… «з гонарам вытрымаць»… «праявіць мужнасць»… Раніцай каля ваенкамата — гармонік, песні і гарэлка ў пластыкоўках. А я не п'ю… «Хворы ці што?» Перад адпраўкай на станцыю — агляд асабістых рэчаў. Прымусілі ўсё выкласці з сумак, нажы-відэльцы і ежу забралі. Дома далі крыху грошай… Мы іх запіхвалі чым глыбей у шкарпэткі і майткі. Ё-маё! Будучыя абаронцы Радзімы… Пасадзілі ў аўтобусы. Дзяўчаты махаюць, мамы плачуць. Паехалі! Поўны вагон мужыкоў.Ніводнага твару не запомніў. Усіх пастрыглі «пад нуль», пераадзелі ў нейкія рызманы. Да зэкаў былі падобныя. Галасы: «Сорак таблетак… Спроба суіцыду… Белы білет. Трэба быць дурнем, каб застацца разумным…» — «Бі мяне! Бі! Ну й няхай я гаўно, мне напляваць. Затое я — дома, трахаюся з дзеўкамі, а ты — з вінтоўкай пайшоў гуляць у вайну». — «Гэх, хлопцы, зменім красоўкі на боты і будзем Радзіму абараняць». — «У каго бабкі ў кішэні, той у армію не ходзіць». Ехалі трое сутак. Усю дарогу пілі. А я не п'ю… «Недалэнга! Што ты будзеш у арміі рабіць?» З пасцельнай бялізны — шкарпэткі і адзенне, што на нас. Знялі ўначы абутак… Ё-маё! Смурод! Сто мужыкоў знялі чаравікі… Шкарпэткі не мянялі хто двое, а хто трое сутак… Хацелася павесіцца ці застрэліцца. У прыбіральню хадзілі з афіцэрамі — тры разы на дзень. Хочаш болей — цярпі. Прыбіральня зачыненая. А мала чаго… толькі з дому… Адзін усё роўна ноччу засіліўся… Ё-маё!

Чалавека можна запраграмаваць… Ён сам гэтага хоча. Раз-два! Раз-два! Роўны крок! У арміі належыць шмат хадзіць і шмат бегаць. Бегаць хутка і далёка, не можаш бегчы — паўзі! Сотня маладых мужчын разам? Звяр'ё! Зграя маладых ваўкоў!

У турме і ў арміі жывуць паводле тых самых законаў. Нечалавечых. Запавет першы: ніколі не дапамагай слабому. Слабога — бі! Слабы выбракоўваецца адразу… Другі: сяброў няма, кожны сам за сябе. Уначы хто рохкае, хто квакае, хто маму кліча, хто пярдзіць… Але правіла для ўсіх адно: «Прагінайся альбо прагінай». Усё проста — двойчы два. І нашто я столькі кніжак чытаў? Верыў Чэхаву… Гэта ён пісаў, што трэба выціскаць з сябе па кроплі раба, і ў чалавеку ўсё павінна быць прыўкраснае: і душонка, і адзяжонка, і думачкі. А бывае наадварот! Наадварот! Часам чалавеку хочацца быць рабом, яму гэта падабаецца. З чалавека па кроплі выціскаюць чалавека. Сяржант у першы дзень табе тлумачыць, што ты — быдла, ты — жывёліна. Каманда: «Легчы! Устаць!» Усе падняліся, адзін ляжыць. «Легчы! Устаць!» Ляжыць. Сяржант зрабіўся жоўты, пасля фіялетавы: «Ты што?» — «Марнасць гэта…» — «Ты што?» — «Гасподзь вучыў: не забівай, нават не гневайся…» Сяржант — да камандзіра роты, той да гэбэшніка. Усчалі справу: баптыст. Як ён у армію трапіў?! Яго адгарадзілі ад усіх, потым кудысьці звезлі. Ён фантастычна небяспечны! Не хоча гуляць у вайну…

Курс маладога байца: маршаванне на пляцы, завучванне Статута напамяць, разборка і зборка аўтамата Калашнікава з заплюшчанымі вачыма… пад вадой… Бога няма! Сяржант — бог, цар і вайсковы начальнік. Сяржант Валерыян: «Дрэсуры паддаюцца нават рыбы. Зразумелі?» «Песню ў страі трэба гарлаць так, каб цяглiцы на срацы дрыжалі». «Чым глыбей вы ў зямлю закапаецеся, тым менш вас заб'юць». Фальклор! Кашмар нумар адзін — кірзавыя боты… Рускую армію толькі нядаўна пераабулі — выдалі чаравікі. Я яшчэ служыў у ботах. Для таго, каб кірза блішчала, яе трэба было змазваць ваксай і расціраць ваўнянай анучкай унацяг. Крос — дзесяць кіламетраў у кірзачах. Спёка трыццаць градусаў… Пекла! Кашмар нумар два — анучы… Яны былі двух відаў — зімовыя і летнія. Руская армія адмовілася ад ануч апошняй… у дваццаць

першым стагоддзі… Я не адзін крывавы мазоль праз іх нацёр. Намотваюць анучу так: ад наска нагі і абавязкова «вонкі», а не ўсярэдзіну. Пашыхталіся. «Радавы… чаму кульгаеце? Вузкіх ботаў не бывае, ёсць няправільныя ногі». Гавораць усе матам, не лаюцца, а гавораць, ад палкоўніка да салдата. Іншай гаворкі не чуў.

Азбука выжывання: салдат — гэта жывёліна, якая можа ўсё… Армія — гэта турма, у якой тэрмін адбываюць паводле канстытуцыі… Мама, мне страшна! Малады салдат — «салага», «дух», «чарвяк». «Гэй, душара! Прынясі чаю». «Гэй… пачысці боты…» Гэй-гэй! «А ты, б…дзь, горды». Пачынаюцца рэпрэсіі… Уначы чацвёра трымаюць, двое б'юць… Напрацаваная тэхніка, калі цябе б'юць без сінякоў. Без слядоў. Напрыклад, мокрым ручніком… лыжкамі… Адзін раз мяне адхерачылі так, што я не мог два дні размаўляць. У шпіталі ад усіх хваробаў адна зялёнка. Надакучыць біць — «паголяць» сухім ручніком або запальнічкай, гэта надакучыць — накормяць фекаліямі, памыямі. «Ручкамі! Ручкамі бяры!» Скаты! Маглі прымусіць бегаць па казарме голым… танцаваць… У маладога салдата ніякіх правоў… Тата: «Савецкая армія — найлепшая ў свеце…»

І… надыходзіць такі момант… З'яўляецца думачка, такая подлая думачка: я ім майкі, анучы памыю, потым сам выб'юся ў скаты, і ўжо мне будуць майткі мыць. Гэта я дома думаў пра сябе, што я такі белы і пухнаты. Мяне не зламаеш і маё «я» не заб'еш. Гэта «да»… *(Паўза.)* Есці хацелася заўсёды, асабліва салодкага. У арміі ўсё крадуць, замест належных сямідзесяці грамаў салдату трапляе трыццаць. Сядзелі адзін раз тыдзень без кашы — вагон груцы хтосьці на станцыі спёр. Снілася пякарня… кексы з разынкамі… Стаў майстрам абірання бульбы. Віртуозам! За гадзіну магу начысціць тры вядры бульбы. Салдатам прывозяць нестандарт, як на ферму. Сядзіш у лушпінні… Бляааа! У нарадзе на кухні падыходзіць сяржант да салдата: «Начысціць тры вядры бульбы». Салдат: «У космас ужо

даўно лётаюць, а машынку для абірання бульбы не вынайшлі». Сяржант: «У войску, радавы… усё ёсць. І машынка для абірання бульбы таксама. Гэта — ты. Найноўшая мадэль». Салдацкая сталоўка — поле цудаў… Два гады: каша, квашаная капуста і макарона, суп з мяса, якое захоўвалі на вайсковых складах на выпадак вайны. Колькі яно там ляжала? Пяць-дзесяць гадоў… Усё запраўлялася камбітлушчам, вялікія пяцілітровыя, такія аранжавыя бляшанкі. На Новы год у макарону ўлівалі згушчонку — ласунак! Сяржант Валерыян: «Печыва дома будзеце есці і частаваць сваіх блядзей…» Ані відэльца, ані чайнай лыжачкі паводле Статуту салдату не паложана. Лыжка — адзіны прыбор. Камусьці даслалі з дому пару чайных лыжачак. Божа мой! З якім задавальненнем мы сядзелі і размешвалі гарбату ў шклянках. Цывільны кайф! Трымаюць за свіней, і раптам — чайная лыжачка. Божа мой! Недзе ж у мяне ёсць дом… Заходзіць дзяжурны капітан… Убачыў: «Што? Што такое! Хто дазволіў? Зараз жа ачысціць памяшканне ад смеццевага хлуду!» Якія лыжачкі! Салдат — не чалавек. А прадмет… прыстасаванне… прылада для забойства… *(Паўза.)* Дэмбель. Нас… чалавек дваццаць… Прывезлі на машыне на чыгуначную станцыю і выгрузілі: «Ну, што — пакуль! Пакуль, хлопцы! Шчасліва на гражданцы». Мы стаім. Паўгадзіны прайшло — стаім. Гадзіна прайшла… Стаім! Азіраемся. Чакаем загаду. Хтосьці павінен нам даць каманду: «Бягом! У касу па квіткі!» Загаду няма. Не памятаю, колькі часу мінула, пакуль мы зразумелі, што каманды не будзе. Самім трэба вырашаць. Ё-маё! За два гады мазгі адбілі…

Пакончыць з сабой я хацеў разоў пяць… А як? Павесіцца? Будзеш у гаўне сваім вісець, языкываліцца… назад у глотку не запіхаюць… Як у таго хлопца ў цягніку, калі нас у гарнізон везлі. Абмацюкаюць… свае ж… Скочыць з вышкі — фарш атрымаецца! Узяць аўтамат і на варце — у галаву… расколецца, як кавун. Маму ўсё ж шкада. Камандзір прасіў: «Толькі не страляйцеся. Людзей спісаць лягчэй, чым патроны». Жыццё

салдата таннейшае за табельную зброю. Ліст ад дзяўчыны… Гэта вельмі шмат значыць у арміі. Рукі трасуцца. Лісты захоўваць нельга. Праверка тумбачак: «Бабы вашы, будуць нашы. А вам яшчэ служыць, як медным чайнікам. Нясі сваю макулатуру ва ўнітаз». Вызначаны табе набор: брытва, аўтаручка і нататнік. Сядзіш на «ачку» і чытаеш апошні раз: «Люблю… Цалую…» Бляааа! Абаронцы Радзімы! Ліст ад бацькі: «Ідзе вайна ў Чачні… Ты мяне разумееш!» Тата героя дадому чакае… А ў нас прапаршчык адзін быў у Афгане, паехаў добраахвотнікам. Вайна прайшлася па ягонай галаве моцна. Нічога не расказваў, толькі «афганскія» анекдоты. Ё-маё! Усе ржалі… Салдат цягне на сабе цяжка параненага сябра, той сплывае крывёй. Памірае. Просіць: «Прыстралі! Больш не магу!» — «У мяне патронаў няма. Скончыліся». — «А ты купі». — «Дзе я іх табе куплю? Вакол горы, няма нікога». — «А ты ў мяне купі». (*Смяецца.*) «Таварыш афіцэр, чаму вы папрасіліся ў Афган?» — «Хачу стаць маёрам». — «А генералам?» — «Не, генералам я не стану — у генерала свой сын ёсць». *(Паўза.)* У Чачню ніхто не прасіўся. Ніводнага добраахвотніка не памятаю… Бацька прыходзіў да мяне ў сне: «Ты прысягу прыняў? Стаяў пад Чырвоным сцягам: “Клянуся свята трымацца… строга выконваць… мужна абараняць… А калі я парушу гэтую маю ўрачыстую прысягу, дык хай мяне спасцігне суровая кара… усеагульная нянавісць і пагарда…”» У сне я ўцякаў кудысьці, ён цэліўся ў мяне… цэліўся…

Стаіш на варце. У руках — зброя. І адна думка: секунда-дзве — і ты вольны. Не бачны нікому. Ужо, сукі, не дастанеце! Ніхто… Ніхто! Калі шукаць прычыну, трэба пачынаць адтуль, калі мама хацела дзяўчынку, а тата, як заўсёды, аборт. Сяржант сказаў, што ты — мех з гаўном… дзірка ў прасторы… *(Паўза.)* Афіцэры былі розныя: адзін — інтэлігент, які спіўся, гаварыў па-англійску, а ў асноўным — тупыя п’яніцы. Напіваліся да глюкаў… Маглі ўначы падняць усю казарму і прымусіць бегаць па пляцы, пакуль салдаты не падалі. Афі-

цэраў называлі шакаламі. Дрэнны шакал... добры шакал... *(Паўза.)* Хто вам раскажа, як дзесяць чалавек гвалтуюць аднаго... *(Злосны смех.)* Гэта не цацкі і не літаратура... *(Паўза.)* На самазвале, як быдла, вазілі на камандзірскае лецішча. Цягалі бетонныя пліты... *(Злосны смех.)* Барабаншчык! Грай гімн Савецкага Саюза!

Я ніколі не хацеў быць героем. Я ненавіджу герояў! Герой мусіць ці шмат забіваць... ці прыгожа памерці... Забіць ворага ты мусіш любым коштам: спачатку расстраляй боекамплект; калі патроны і гранаты скончацца — біся нажом, прыкладам, сапёрнай рыдлёўкай. Ірві хоць зубамі. Сяржант Валерыян: «Вучыся працаваць нажом. Кісць рукі — рэч вельмі добрая, яе лепш не рэзаць, а калоць... зваротным хватам... Так... так... Кантралюй руку, сыход за спіну... не захапляйся складанымі рухамі... Выдатна! Выдатна! Цяпер выверні нож у праціўніка... Так... так... Ты яго забіў. Малайчына! Забіў! Крычы: "Памры, сука!". Чаго ты маўчыш?» *(Спыняецца.)* Увесь час табе дзяўбуць: зброя — гэта прыгожа... страляць — сапраўдная мужчынская справа... Вучыліся забіваць на жывёлах, нам адмыслова завозілі валацужных сабак, катоў, каб потым рука не тарганулася пры выглядзе чалавечай крыві. Мяснікі! Я не вытрымліваў... уначы плакаў... *(Паўза.)* У дзяцінстве мы гулялі ў самураяў. Самурай мусіў па-японску памерці, не меў права ўпасці тварам уніз, закрычаць. Я заўсёды крычаў... Мяне не любілі браць у гэтую гульню... *(Паўза.)* Сяржант Валерыян: «Запомніце... аўтамат працуе так: раз, два, тры — і цябе няма...» А пайшлі вы ўсе! Раз, два...

Смерць падобная да кахання. У апошнія імгненні — цемра... страшныя і непрыгожыя сутаргі... Са смерці нельга вярнуцца, але з кахання мы вяртаемся. І можам успомніць, як было... Вы танулі калі-небудзь? Я тануў... Чым больш супраціўляешся, тым менш сілаў. Змірыся — і дайдзі да дна. І тады... Хочаш жыць — прабівай неба вады, вяртайся. Але спачатку дайдзі да дна.

А там? Там ніякага святла ў канцы тунэлю... І анёлаў я не бачыў. Сядзеў бацька каля чырвонай труны. Труна была пустая.

### *А пра каханне мы ведаем занадта мала*

*Праз некалькі гадоў я зноў апынулася ў горадзе N (не называць горад папрасіў мой герой). Мы з ім стэлефанаваліся — і сустрэліся. Ён быў закаханы, ён быў шчаслівы — і гаварыў пра каханне. Я нават не адразу здагадалася ўключыць дыктафон, каб не выпусціць вось гэты момант пераходу жыцця, проста жыцця — у літаратуру, які заўсёды падпільноўваю, выслухоўваю ў любых размовах — прыватных і агульных, але часам губляю пільнасць, а «кавалачак літаратуры» можа бліснуць усюды, часам у самым нечаканым месцы. Як і гэтым разам. Хацелі пасядзець і выпіць кавы, а жыццё прапанавала развіццё сюжэту. Вось што я паспела запісаць...*

—Я сустрэўся з каханнем... я яго разумею... Да таго я думаў, што каханне — гэта два дурні з падвышанай тэмпературай. Што гэта проста трызненне... Пра каханне мы ведаем занадта мала. І калі гэтую нітку выцягнуць... Вайна і каханне — гэта як бы з аднаго вогнішча, то бок, гэта адна тканіна, тая ж матэрыя. Чалавек з аўтаматам ці той, хто на Эльбрус залез, хто ваяваў да перамогі, будаваў сацыялістычны рай, — усё тая ж гісторыя, той самы магніт і тая ж самая электрычнасць. Ці вам зразумела? Чагосьці чалавек не можа, чагосьці нельга купіць ці выйграць у латарэю... А чалавек ведае, што яно ёсць, і ён гэтага хоча... І не ведае, як шукаць. Дзе?

Гэта амаль нараджэнне... Пачынаецца з удару... *(Паўза.)* А можа, і не трэба гэтыя таямніцы разгадваць? Вы не баіцеся?

Першы дзень...

Прыходжу да свайго знаёмага, у яго кампанія, каля вешака ў вітальні здымаю паліто, нехта ідзе з кухні, і трэба прапусціць, азіраюся — яна! У мяне адбылося кароткае замыканне, як быццам ва ўсім доме выключылі святло. І вось — усё. Я словаў звы-

чайна не пазычаю, а тут проста сеў і сядзеў, нават яе не бачыў, то бок, не тое каб я на яе не глядзеў, я доўга-доўга глядзеў праз яе, як у фільмах Таркоўскага: ліюць з гарлача ваду, і яна ліецца міма кубка, затым паво-о-ольна паварочваецца разам з гэтым кубкам. Распавядаю даўжэй, чым гэта адбылося. Маланка! У гэты дзень нешта такое зведаў, што ўсё астатняе стала няважным, нават асабліва не разбіраўся… А ўласна — навошта? Здарылася — і ўсё. І яно такое трывалае. Яе пайшоў праводзіць жаніх, у іх, як я зразумеў, неўзабаве мелася быць вяселле, але мне было ўсё адно, я сабраўся дадому і ехаў ужо не адзін, ехаў з ёю, яна ўжо пасялілася ўва мне. Каханне пачынаецца… Усё раптам іншага колеру, галасоў больш, гукаў больш… Няма ніякіх шанцаў гэта зразумець… *(Паўза.)* Перадаю прыблізна…

Раніцай прачнуўся з думкай, што мне трэба яе знайсці, а я не ведаю ні імя, ні адраса, ні тэлефона, але ўжо гэта здарылася, нешта галоўнае ў жыцці са мною адбылося. Чалавек аб'явіўся. Як быццам я на нешта забыўся… і вось успомніў… Ці вам зразумела, пра што я? Не? Ніякай формулы мы не выведзем… усё будзе сінтэтыка… Мы звыкліся з думкай: будучыня ад нас схаваная, а тое, што ўжо было, можна растлумачыць. Было ці не было… для мяне — пытанне… А можа, нічога й не было? Проста кінастужка круціцца, вось яна пракруцілася… Ведаю такія моманты ў сваім жыцці, якіх быццам не было. А яны былі. Напрыклад, некалькі разоў я быў закаханы… думаў, што закаханы… Засталося шмат фотаздымкаў. Але ўсё высыпалася з памяці, змылася. Ёсць такія рэчы, якія не высыпаюцца, іх трэба ўзяць з сабой. А астатняе… Ці ўсё чалавек прыгадае, што з ім было?

Другі дзень…

Я набыў ружу. Грошай практычна не было, але паехаў на рынак і набыў самую вялікую ружу, якую там знайшоў. І вось таксама… Як растлумачыць? Падышла да мяне цыганка: «Дай, мілок, паваражу. Па вачах бачу…» Уцёк. Навошта? Я і сам ужо ведаю, што таямніца стаіць у парозе. Таямніца, таемства,

пакроў... Першы раз памыліўся з кватэрай — адчыніў мужык у абвіслай майцы і пад градусам, убачыў мяне з ружай, застыў: «Бля-а-а!» Падымаюся на наступны паверх... Праз ланцужок выглядвае дзіўная бабулька ў вязаным капялюшыку: «Лена, да цябе». Потым яна грала нам на фартэпіяна, распавядала пра тэатр. Старая акторка. У доме жыў вялікі чорны кот, хатні тыран, які чамусьці мяне адразу незалюбіў, а я стараўся яму спадабацца... Вялікі чорны кот... У часе з'яўлення таямніцы ты быццам бы адсутнічаеш. Ці вам зразумела, пра што я? Не трэба быць касманаўтам, алігархам ці героем, ты можаш быць шчаслівым, усё перажыць у звычайнай двухпакаёвай кватэры — пяцьдзясят восем квадратных метраў, сумешчаны санвузел, сярод старых савецкіх рэчаў. Дванаццатая гадзіна ночы, другая гадзіна... Мне трэба сыходзіць, а я не разумею, чаму я мушу сыходзіць з гэтага дома. Больш за ўсё гэта падобнае на ўспамін... шукаю словы... Як быццам усё ўспомнілася, доўга нічога не памятаў, а цяпер усё вярнулася. Я злучыўся. Нешта падобнае... я так думаю... адчувае чалавек, які шмат дзён адбыў у келлі. Свет яму адкрыўся ў бясконцых дэталях. Абрысах. Гэта значыць, таямніца, яна можа быць даступная, як прадметная рэч, як ваза, напрыклад, але каб нешта зразумець, павінна быць балюча. А як зразумець, калі не баліць? Трэба каб балюча, балюча...

...Першы раз нешта пра жанчыну мне растлумачылі ў сем гадоў мае сябры... Ім таксама было па сем гадоў. Запомніў іх радасць, што яны ведаюць, а я не, вось мы зараз табе ўсё растлумачым. І пачалі маляваць палачкамі на пяску...

...Што жанчына штосьці іншае, я зразумеў у сямнаццаць гадоў, не праз кніжкі, а праз скуру адчуў блізка ад сябе штосьці бясконца далёкае, велізарную нейкую розніасць, і перажыў узрушэнне ад таго, што гэта іншае. Нешта там, усярэдзіне, у жаночым пачынні схаванае, мне недаступнае...

...Увявіце салдацкую казарму... Нядзеля. Няма ніякіх заняткаў. Дзвесце мужыкоў, сцяўшы дых, сядзяць і глядзяць

аэробіку: на экране дзяўчаты ў шчыльна нацягнутых касцюмах… Мужыкі, як балваны з выспы Мая, сядзяць. Калі зламаўся тэлевізар, гэта катастрофа, таго, хто быў вінаваты, маглі забіць. Вы разумееце? Гэта ўсё пра каханне…

Трэці дзень…

Устаў раніцай, і не трэба нікуды бегчы, згадваеш, што яна ёсць, яна знайшлася. Цябе адпускае туга… Ты ўжо не самотны… Ты выяўляеш раптам сваё цела… рукі, вусны… выяўляеш за акном неба і дрэвы, чамусьці ўсё блізка-блізка, да цеснаты наблізілася да цябе.Так бывае толькі ў сне… *(Паўза.)* З аб'явы ў вячэрняй газеце мы знайшлі неверагодную кватэру ў неверагодным раёне. На краі горада ў новай забудове. У двары на выходныя мужыкі з раніцы да вечара мацюкаюцца, грукочуць у даміно і гуляюць у карты на пляшку гарэлкі. Праз год у нас нарадзілася дачка… *(Паўза.)* Цяпер пра смерць раскажу… Учора ўвесь горад хаваў майго аднакласніка — лейтэнанта міліцыі… Труну прывезлі з Чачні і нават не раскрылі, маці не паказалі. Што там прывезлі? Салют і ўсё такое. Слава героям! Я быў там. І бацька са мной… У майго бацькі blішчалі вочы… Ці вам зразумела, пра што я? Чалавек да шчасця не гатовы, ён гатовы да вайны, да холаду і голаду. Шчаслівых людзей, акрамя маёй трохмесячнай дачкі, я нікога… нікога не сустракаў… Рускі чалавек да шчасця не рыхтуецца. *(Паўза.)* Усе нармальныя людзі вывозяць дзяцей за мяжу. З'ехала шмат маіх сяброў… тэлефануюць мне з Ізраіля, Канады… Раней я не думаў пра тое, каб з'ехаць. З'ехаць… з'ехаць… У мяне гэтая думка з'явілася, калі нарадзілася дачка. Хачу абараніць тых, каго люблю. Бацька мне гэтага не даруе. Я ведаю.

### *Руская бяседа ў Чыкага*

*Яшчэ раз мы сустрэліся ў Чыкага. Сям'я ўжо трохі абжылася на новым месцы. Сабралася руская кампанія. Рускі стол і руская гутарка, у якой да вечных рускіх пытанняў: «Што рабіць?»*

*і «Хто вінаваты?» — дадалося яшчэ адно — «З'язджаць ці не з'язджаць?».*

«…Я з'ехаў, таму што спалохаўся… У нас кожная рэвалюцыя сканчаецца тым, што пачынаюць рабаваць адзін аднаго пад ператрус і біць жыдам морды. У Маскве ішла сапраўдная вайна, кожны дзень кагосьці падрывалі, забівалі. Увечары на вуліцу без сабакі байцоўскай пароды нельга было выйсці. Я спецыяльна завёў бультэр'ера…»

«…Адчыніў Гарбачоў клетку — мы і ламануліся. Што я там пакінула? Сраную двухпакаёвую хрушчобу. Лепш быць пакаёўкай з добрым акладам, чым доктарам з акладам бамжа. Усе мы выраслі ў СССР: збіралі ў школе металалом і любілі песню "Дзень Перамогі". Нас выхоўвалі на вялікіх казках пра справядлівасць, на савецкіх мульціках, дзе ўсё дакладна прапісанае: тут — дабро, а там — зло. Нейкі правільны свет. Мой дзед загінуў пад Сталінградам за савецкую Радзіму, за камунізм. А я хацела жыць у нармальнай краіне. Каб у доме фіраначкі былі, каб падушачкі былі, каб муж прыйшоў і халат надзеў. У мяне неяк з рускай душой слаба, у мяне яе мала. Я зваліла ў Штаты. Узімку ем трускаўкі. Каўбасы тут навалам, і ніякім сімвалам яна не ёсць…»

«…У дзевяностыя ўсё было казачна і весела… Паглядзіш у акно — на кожным рагу дэманстрацыя. Але хутка стала не казачна і не весела. Хацелі вольны рынак — атрымайце! Мы з мужам — інжынеры, а ў нас паўкраіны было інжынераў. З намі не цырымоніліся: "Ідзіце на сметнік". А гэта мы зрабілі перабудову, пахавалі камунізм. І нікому сталі не патрэбныя. Лепш не ўзгадваць… Дачка маленькая просіць есці, а ў доме нічога няма. Па ўсім горадзе віселі аб'явы: куплю… куплю… "Куплю кілаграм ежы" — не мяса, не сыру, а любой ежы. Кілаграму бульбы былі радыя, на рынку макуху прадавалі, як у вайну. У суседкі мужа ў пад'ездзе застрэлілі. Крамнік. Паўдня ляжаў, прыкрыты газеткай. Лужына крыві. Уключыш

тэлевізар: там банкіра забілі, там бізнэсмена… Скончылася тым, што нейкая шайка злодзеяў завалодала ўсім. Хутка народ рушыць на Рублёўку. З сякерамі…»

«…Не Рублёўку пойдуць трушчыць, а кардонныя скрыні на рынках, у якіх жывуць гастарбайтары. Таджыкаў, малдаван пачнуць забіваць…»

«…А мне ўсё пох…! Няхай усе здохнуць. Я буду жыць для сябе…»

«…Вырашыла з'ехаць, калі Гарбачоў вярнуўся з Фароса і сказаў, што ад сацыялізму мы не адмаўляемся. Тады без мяне! Я не хачу жыць пры сацыялізме! Гэта было сумнае жыццё. З дзяцінства мы ведалі, што будзем акцябратамі, піянерамі, камсамольцамі. Першы заробак шэсцьдзесят рэ, а потым восемдзесят, да канца жыцця — сто дваццаць… *(Смяецца.)* “Класная” ў школе палохала: “Калі будзеце слухаць радыё ‘Свабода’, ніколі не станеце камсамольцамі. А калі пра гэта даведаюцца нашы ворагі?” Самае смешнае, што яна таксама цяпер у Ізраілі жыве…»

«…Калісьці і я палала ідэяй, а не была простым абывацелем. Накіпаюць слёзы… ГКЧП! Танкі ў цэнтры Масквы выглядалі дзіка. Мае бацькі прыехалі з лецішча, каб назапасіць прадуктаў на выпадак грамадзянскай вайны. Гэтая банда! Гэтая хунта! Яны думалі, што ўвядуць танкі і больш нічога рабіць не давядзецца. Што людзі хочуць толькі аднаго, каб з'явілася ежа, і на ўсё згодныя. Народ вынесла на вуліцу… краіна прачнулася… Усяго адзін момант, секунду гэта было… Завязь нейкая… *(Смяецца.)* Мая мама — чалавек легкадумны, ні пра што не задумвалася. Абсалютна далёкая ад палітыкі, зладжаная паводле прынцыпу: жыццё праходзіць, трэба ўсё, што можна, браць зараз. Паглядная маладая жанчына. Нават яна пайшла да Белага дома з парасонам наперавес…»

«…Ха-ха-ха… Замест свабоды нам раздалі ваўчары. Так падзялілі вялікую краіну: нафта, газ… Не ведаю, як сказаць… Каму абаранак, а каму — дзірка ад абаранка. Ваўчары трэба

было ўкладваць у акцыі прадпрыемстваў, але мала хто гэта ўмеў. Пры сацыялізме рабіць грошы не вучылі. Бацька прынасіў дахаты нейкія рэкламкі: "Маскоўскай нерухомасці", "Нафта-Алмаз-Інвесту", "Нарыльскага нікелю"... Спрачаліся з мамай на кухні, і скончылася гэта тым, што яны прадалі ўсё нейкаму тыпусу ў метро. Набылі мне модную скуранку. Увесь навар. У гэтай куртцы я ў Амерыку прыехала...»

«...А ў нас яны дагэтуль ляжаць. Прадам гадоў праз трыццаць у які-небудзь музей...»

«...Вы сабе не ўяўляеце, як я ненавіджу гэтую краіну... Ненавіджу парад Перамогі! Мне моташна ад шэрых панельных дамоў і балконаў, наладаваных слоікамі з памідорамі і гуркамі... і старой мэбляй...»

«...Пачалася чачэнская вайна... Сыну праз год ісці ў войска. Галодныя шахцёры прыйшлі ў Маскву і грукалі каскамі на Чырвонай плошчы. Каля Крамля. Незразумела было, куды ўсё каціцца. Людзі там цудоўныя, залатыя, а жыць нельга. З'ехалі дзеля дзяцей, леглі тут узлётнай паласой для іх. А яны выраслі і страшна далёкія ад нас...»

«...Э-э-э... як гэта па-руску? Забываю... Эміграцыя — гэта нармальна, рускі чалавек ужо можа жыць там, дзе ён хоча, дзе яму цікава. Адны з Іркуцка едуць у Маскву, іншыя з Масквы едуць у Лондан. Увесь свет ператварыўся ў караван-сарай...»

«...Сапраўдны патрыёт можа жадаць для Расеі толькі акупацыі. Каб яе нехта акупаваў...»

«...Папрацавала я за мяжой і вярнулася ў Маскву... Ува мне змагаліся два пачуцці: хацелася жыць у знаёмым свеце, у якім я магу, як у сваёй кватэры, з заплюшчанымі вачыма знайсці кожную кнігу на паліцы, і ў той жа час было жаданне вылецець у бясконцы свет. З'язджаю ці застаюся? — ніяк не магла вырашыць. Гэта быў дзевяноста пяты год... Іду, як цяпер помню, па вуліцы Горкага, і паперадзе мяне гучна размаўляюць дзве жанчыны... і я іх не разумею... А яны па-руску гавораць. Я абалдзела! Толькі так... слупняк... Нейкія новыя

словы і галоўнае — інтанацыі. Шмат паўднёвага дыялекту. І іншы выраз твараў… Усяго некалькі гадоў я адсутнічала, а ўжо стала чужая. Вельмі хутка тады ішоў час, ён імчаў. Масква была брудная, які там сталічны бляск! Паўсюль кучы смецця. Смецце свабоды: бляшанкі з-пад піва, яркія абгорткі, лушпайкі ад апельсінаў… Усе жавалі бананы. Цяпер такога ўжо няма. Наеліся. Я зразумела, што горада, які я раней так любіла і дзе мне было добра і камфортна, — гэтага горада больш няма. Сапраўдныя масквічы ў жаху сядзяць па дамах або з'ехалі. Старая Масква схлынула. Абжывалася новае насельніцтва. Мне захацелася проста зараз спакаваць валізку і бегчы. Нават у дні жнівеньскага путчу я не адчувала такога страху. Тады я была ў захапленні! Удзвюх з сяброўкай на маіх старэнькіх "жыгулях" мы вазілі да Белага дома ўлёткі, друкавалі іх у нашым інстытуце, у нас быў ксеракс. Ездзілі туды і назад міма танкаў, і мяне, памятаю, здзівіла, што на бráні ў іх я ўбачыла латы. Квадратныя латы, прыкручаныя шрубамі…

Усе гэтыя гады, пакуль мяне не было, мае сябры пражылі ў поўнай эйфарыі: рэвалюцыя адбылася! Камунізм ляснуў! Аднекуль ва ўсіх была ўпэўненасць, што ўсё складзецца добра, бо ў Расіі шмат адукаваных людзей. Вельмі багатая краіна. Але Мексіка таксама багатая… За нафту і газ дэмакратыю не купіш, і яе не завязеш, як бананы ці швейцарскі шакалад. Прэзідэнцкім указам не абвесціш… Патрэбныя свабодныя людзі, а іх не было. Іх і цяпер няма. У Еўропе дзвесце гадоў даглядаюць дэмакратыю, як газон. Дома мама плакала: "Вось ты кажаш, што Сталін дрэнны, але мы з ім перамаглі. А ты хочаш здрадзіць Радзіме". Прыйшоў у госці мой старадаўні прыяцель. П'ем на кухні гарбату: "Што будзе? Нічога добрага не будзе, пакуль не расстраляем усіх камунякаў". Зноў кроў? Праз некалькі дзён я падала дакументы на выезд…»

«…З мужам разышліся… Падала на аліменты, ён не плаціць і не плаціць. Дачка паступіла ў камерцыйную ВНУ,

грошай не хапала. У маёй сяброўкі быў знаёмы амерыканец, ён пачаў у Расіі свой бізнэс. Яму патрэбная была сакратарка, але ён хацеў знайсці не мадэль з нагамі ад шыі, а надзейнага чалавека. Сяброўка парэкамендавала мяне. Яго вельмі цікавіла нашае жыццё, ён шмат чаго не разумеў. “Чаму ўсе вашы бізнэсмены носяць лакіркі?”, “А што такое ‘даць на лапу’ і ‘ў нас усё схоплена і ўсё праплачана’?” Такія пытанні. Але планы ён меў вялікія: Расія — велізарны рынак! Растрэслі яго банальна. Простым прыёмам. Для яго вельмі шмат значыла слова — яму сказалі, ён паверыў. Страціў шмат грошай і вырашыў з’ехаць дадому. Запрасіў мяне перад ад’ездам у рэстаран, я думала, што мы развітаемся і ўсё. А ён падняў келіх: “Давай вып’ем — ведаеш за што? Грошай я тут не зарабіў, затое знайшоў добрую рускую жонку”. Ужо сем гадоў разам…»

«…Раней мы жылі ў Брукліне… Спрэс руская гаворка і рускія крамы. У Амерыцы можна нарадзіцца з рускай акушэркай, вучыцца ў рускай школе, працаваць у рускага гаспадара, хадзіць на споведзь да рускага святара… Каўбаса ў крамах: “ельцынская”, “сталінская”, “мікаянаўская”… і сала ў шакаладзе… Старыя на лавачках рэжуцца ў даміно і гуляюць у карты. Вядуць бясконцыя дыскусіі пра Гарбачова і Ельцына. Ёсць сталіністы і антысталіністы. Праходзіш міма і ловіш вухам: “Ці патрэбны быў Сталін?” — “Так, патрэбны”. А я маленькая ўжо ўсё пра Сталіна ведала. Пяць гадоў мне было… Мы стаім з мамай на аўтобусным прыпынку, як я цяпер разумею, непадалёк ад раённага будынка КДБ, я то капрызнічаю, то гучна плачу. “Не плач, — просіць мама, — бо нас пачуюць дрэнныя людзі, якія забралі нашага дзядулю і яшчэ шмат іншых добрых людзей”. І яна пачынае мне распавядаць пра дзядулю… Маме трэба з кімсьці пагаварыць… Калі Сталін памёр, у дзіцячым садку нас усіх пасадзілі плакаць. Адна я не плакала. Дзядуля вярнуўся з лагера і ўстаў перад бабуляй на калені, яна ўвесь час за яго прасіла…»

«...Цяпер і ў Амерыцы з'явілася шмат маладых рускіх хлопцаў, якія носяць футболкі з партрэтам Сталіна. На капотах сваіх машын малююць серп і молат. Ненавідзяць чорных...»

«...А мы з Харкава... Адтуль Амерыка нам здавалася раем. Краінай шчасця. Першае ўражанне, калі прыехалі: мы будавалі камунізм, а пабудавалі яго амерыканцы. Знаёмая дзяўчына павяла нас на распродаж, прыехалі — у мужа адны джынсы і ў мяне, трэба было апрануцца. Гляджу: спаднічка — тры долары, джынсы — пяць... Смешныя кошты! Пах піцы... добрай кавы... Увечары адкаркавалі з мужам бутэльку "Марціні" і закурылі "Мальбара". Мара здзейснілася! Але ўсё давялося пачынаць з нуля ў сорак гадоў. Тут адразу спускаешся на дзве-тры прыступкі ўніз, забудзься пра тое, што ты рэжысёр, акторка або скончыла Маскоўскі ўніверсітэт... Спачатку я ўладкавалася нянечкай у бальніцы: гаршкі выносіла, падлогу падцірала. Не вытрымала. Стала выгульваць сабак у двух старых. Працавала касіркай у супермаркеце... Было Дзявятага мая, самае дарагое для мяне свята. Бацька да Берліна дайшоў. Я ўспомніла пра гэта... Старэйшая касірка кажа: "Мы перамаглі, але вы, рускія, таксама малайцы. Дапамаглі нам". Так іх у школе вучаць. Я ледзь з крэсла не ўпала! Што яны пра Расію ведаюць? Рускія п'юць гарэлку шклянкамі, і ў іх шмат снегу...»

«...Ехалі па каўбасу, а каўбаса аказалася не такой таннай, як уяўлялася...»

«...З Расіі з'язджаюць мазгі, а прыязджаюць рукі... Гастарбайтары... Мама піша, што ў іх дворнік-таджык перавёз у Маскву ўжо ўсю сваю радню. Цяпер яны на яго працуюць, а ён гаспадар. Камандуе. Жонка ходзіць вечна цяжарная. Барана на свае святы рэжуць проста ў двары. Пад вокнамі ў масквічоў. І смажаць шашлыкі...»

«...Я чалавек рацыянальны. Усе гэтыя сантыменты з нагоды мовы дзядуляў і бабуль — толькі эмоцыі. Я забараніў сабе

чытаць рускія кнігі, глядзець рускі інтэрнэт. Хачу выбіць з сябе ўсё рускае. Перастаць быць рускім…»

«…Муж моцна хацеў з'ехаць… Прывезлі з сабой дзесяць скрыняў рускіх кніг, каб дзеці не забывалі родную мову. У Маскве на мытні ўсе скрыні ўспаролі, шукалі антыкварыят, а ў нас: Пушкін, Гогаль… Мытнікі доўга смяяліся… Я і цяпер уключаю радыё "Маяк" і слухаю рускія песні…»

«…Расія, мая Расія… Піцер улюбёны! Як я хачу вярнуцца! Зара заплачу… Няхай жыве камунізм! Дадому! І бульба тут на смак — брыдота несусветная. А шакалад рускі проста выдатны!»

«…А майткі за талоны вам па-ранейшаму падабаюцца? Я ўспамінаю, як здавала і вучыла навуковы камунізм…»

«…Рускія бярозкі… бярозкі потым…»

«…Сын маёй сястры… У яго цудоўная англійская. Праграміст. Пажыў у Амерыцы год і вярнуўся дадому. Кажа, што ў Расіі цяпер цікавей…»

«…Я таксама скажу… Многія ўжо і там добра жывуць: праца, дом, машына — усё ў іх ёсць. Але ўсё адно баяцца і хочуць з'ехаць. Бізнэс могуць адабраць, у турму ні за што пасадзіць… скалечыць увечары ў пад'ездзе… Паводле закона ніхто не жыве — ні наверсе, ні ўнізе…»

«…Расія з Абрамовічам і Дзерыпаскам… з Лужком… Хіба гэта Расія? Гэты карабель тоне…»

«…Людзі, жыць трэба ў Гоа… А грошы зарабляць у Расіі…»

*Выходжу на балкон. Тут кураць і працягваюць тую ж размову: ці разумныя сёння з'язджаюць з Расіі, ці дурныя? Не адразу паверыла, калі пачула, як за сталом нехта заспяваў «Падмаскоўныя вечары», нашу ўлюбёную савецкую песню: «Не чуваць нідзе ані шолаху, / Усё заціхла тут да зары, / Дарагія кожнаму змоладу / Падмаскоўныя вечары…» Вяртаюся ў пакой — ужо ўсе спяваюць. І я таксама.*

## Пра чужое гора, якое Бог паклаў на парог вашага дома

*Раўшан... — гастарбайтар, 27 гадоў*
*Гафхар Джураева — кіраўніца цэнтра «Міграцыя і закон» пры маскоўскім фондзе «Таджыкістан»*

*«...чалавек без Радзімы — салавей без свайго саду»*

—Пра смерць я шмат ведаю. Я калі-небудзь звар'яцею ад усяго, што я ведаю...

Цела — кубак для духу. Ягоны дом. Паводле мусульманскіх звычаяў цела трэба пахаваць як мага хутчэй — пажадана ў той самы дзень, як толькі Алах забраў душу. У доме памерлага вешаюць на цвік кавалачак белай матэрыіі, ён вісіць сорак дзён. Душа прылятае ўначы і сядае на гэты шматок. Слухае родныя галасы. Радуецца. І адлятае назад.

Раўшан... я яго добра памятаю... Звычайная гісторыя... Ім паўгода не выдавалі заробак, а ў яго чацвёра дзяцей засталіся на Паміры, цяжка захварэў бацька. Ён прыйшоў у будаўнічую кантору, папрасіў аванс, а яму адмовілі. Апошняя кропля. Выйшаў на ганак і паласнуў сябе нажом па горле. Мне патэлефанавалі... Я прыехала ў морг... Вось гэты неймаверна прыгожы твар... Немагчыма забыць. Ягоны твар... Сабралі грошы. Для мяне дагэтуль загадка, як спрацоўвае гэты ўнутраны механізм: капейкі ніхто не мае, але калі чалавек памёр, умомант збяруць патрэбную суму, аддадуць апошняе, каб ён быў пахаваны дома, у сваёй зямлі ляжаў. Не застаўся на чужыне. Адзіная сторублёўка ў кішэні — і яе аддадуць. Скажаш, што дадому трэба ехаць, — не дадуць, дзіця хворае — не дадуць, а на смерць — на, бяры. Прынеслі і паклалі мне на стол цэлафанавы пакет гэтых скамечаных сторублёвак. І я пайшла з імі ў касу «Аэрафлоту». Да начальніка. Душа сама паляціць дадому, а труну адправіць самалётам вельмі дорага.

*Бярэ са стала паперы. Чытае.*

...Паліцэйскія ўвайшла ў кватэру, дзе жылі гастарбайтары — цяжарная жанчына і ейны муж, на вачах жонкі яго сталі збіваць за тое, што ў іх няма рэгістрацыі. У яе пачаўся крывацёк — яна памерла, і памерла яе ненароджанае дзіця...

...У Падмаскоўі зніклі тры чалавекі — два браты і сястра... Да нас звярнуліся па дапамогу іх сваякі, што прыехалі з Таджыкістана. Мы патэлефанавалі ў пякарню, дзе яны да гэтага працавалі. Першы раз нам адказалі: «Такіх не ведаем». Другі раз да тэлефона падышоў сам гаспадар: «Так, працавалі ў мяне таджыкі. Я ім заплаціў за тры месяцы, і яны ў той самы дзень сышлі. Не магу ведаць — куды». Тады мы звярнуліся ў паліцыю. Усіх траіх знайшлі забітых рыдлёўкай і закапаных у лесе. Гаспадар пякарні стаў тэлефанаваць у фонд і пагражаць: «У мяне паўсюль свае людзі. Я і вас закапаю».

...Двух маладых таджыкаў з будоўлі павезлі на «хуткай дапамозе» ў бальніцу... Усю ноч яны праляжалі ў халодным прыёмным пакоі, да іх ніхто не падышоў. Дактары не хавалі сваіх пачуццяў: «І чаго вы, чарнажопыя, сюды панаехалі?»

...Амапаўцы вывелі ноччу з сутарэння пятнаццаць дворнікаў-таджыкаў, паклалі на снег і сталі біць. Бегаць па іх у каваных чаравіках... Адзін пятнаццацігадовы хлопчык памёр...

...Атрымала маці мёртвага сына з Расіі. Без унутраных органаў... На маскоўскім чорным рынку можна купіць усё, што ёсць у чалавека: ныркі, лёгкія, печань, зрэнкі, сардэчныя клапаны, скуру...

Гэта — мае браты і сёстры... Я таксама нарадзілася на Паміры. Гаранка. Зямля ў нас на вагу золата, пшаніцу мераюць не мяхамі, а цюбецейкамі. Усюды — гіганцкія горы, побач з якімі любое дзіва, створанае чалавекам, здаецца дзіцячым. Цацачным. Жывеш там — ногі на зямлі, а галава ў аблоках. Ты так высока, што быццам ты ўжо не ў гэтым свеце. Мора — гэта

зусім іншае, мора вабіць да сябе, а горы даюць адчуванне абароны, яны цябе ахоўваюць. Другія сцены дома. Таджыкі не ваяры, калі на іх зямлю прыходзіў вораг, яны падымаліся ў горы… *(Маўчыць.)* Мая ўлюбёная таджыкская песня — гэта песня-галашэнне аб пакінутай роднай зямлі. Заўсёды плачу, калі яе слухаю… Самае страшнае для таджыка — пакінуць Радзіму. Жыць удалечыні ад яе. Чалавек без Радзімы — салавей без свайго саду. Шмат гадоў я ўжо жыву ў Маскве, але ўвесь час атачаю сябе тым, што было ў мяне дома: убачу ў часопісе горы, абавязкова гэты фотаздымак выражу і павешу на сценку, і той, дзе цвіце абрыкос, і белая бавоўна. Я ў сне часта збіраю бавоўну… Адкрываю пушачку, краі вельмі вострыя ў гэтай пушачкі, а ўнутры ляжыць белы камячок, як вата, вагі амаль не мае, трэба так яго выцягнуць, каб не падрапаць рукі. Раніцай прачынаюся стомленая… На маскоўскіх кірмашах я шукаю таджыкскія яблыкі, яны ў нас самыя салодкія, таджыкскі вінаград, ён саладзейшы за рафінад. А ў дзяцінстве я марыла, што ўбачу калі-небудзь рускі лес, грыбы… Паеду і ўбачу гэтых людзей. Гэта другая частка маёй душы: хата, печ, піражкі. *(Маўчыць.)* Я пра наша жыццё распавядаю… І пра сваіх братоў… Для вас яны ўсе на адзін твар: чорнавалосыя, нямытыя, варожыя. З незразумелага свету. Чужое гора, якое Бог паклаў на парог вашага дома. А ў іх няма адчування, што яны прыехалі да чужых людзей, бо іх бацькі жылі ў СССР і Масква была сталіцай для ўсіх. І цяпер ім тут далі працу і прытулак. На Усходзе кажуць: не плюй у калодзеж, з якога бярэш ваду. У школе ўсе таджыкскія хлопчыкі мараць паехаць на заробкі ў Расію… Каб набыць квіток, пазычаюць грошы ва ўсяго кішлака. Рускія мытнікі ў іх пытаюцца на мяжы: «Да каго едзеш?» Яны адказваюць: «Да Ніны»… Усе рускія жанчыны для іх Ніны… Рускую мову ў школе ўжо не вучаць. Кожны вязе з сабой кілім для малітвы…

*Мы размаўляем у фондзе. Тут усяго некалькі маленькіх пакояў. Не змаўкаюць тэлефоны.*

Вось учора я дзяўчыну ыратавала... Яна схітрылася патэлефанаваць мне проста з машыны, калі паліцэйскія везлі яе ў лес, тэлефануе і шэпча: «Схапілі на вуліцы, вязуць за горад. Усе п'яныя». Нумар машыны назвала... П'яныя, яны забыліся яе абшукаць і забраць мабільнік. Дзяўчына толькі прыехала з Душанбэ... прыгожая дзяўчына... Я — усходняя жанчына, я яшчэ маленькая была, а бабуля і мама ўжо вучылі мяне, як трэба з мужчынамі размаўляць. «Агонь не пераможаш агнём, а толькі мудрасцю», — казала бабуля. Тэлефаную ў паліцэйскі ўчастак: «Слухай, мой дарагі, нешта дзіўнае адбываецца: вашы хлопцы кудысьці не туды павезлі нашу дзяўчыну, і яны нападпітку. Патэлефануйце ім, каб да граху не дайшло. Нумар машыны нам вядомы». На тым канцы дроту — суцэльны паток лаянкі: гэтыя «чуркі»... гэтыя «чорныя малпы», якія толькі ўчора з дрэва злезлі, маўляў, якога чорта вы марнуеце на іх час. «Мой дарагі, ты паслухай мяне, я такая ж "чорная малпа"... Я — твая мама...» Маўчанне! Там жа таксама чалавек... Заўсёды на гэта спадзяюся... Слова за слова, і мы сталі размаўляць. Праз пятнаццаць хвілінаў машына развярнулася... Прывезлі дзяўчыну назад... Маглі згвалціць, забіць. Не адзін раз... я ў лесе гэтых дзяўчат па кавалачках збірала... Ведаеце, хто я? Я працую алхімікам... У нас грамадскі фонд — грошай няма, улады няма, ёсць толькі добрыя людзі. Нашы памочнікі. Дапамагаем, ратуем безабаронных. Жаданы вынік атрымліваецца з нічога: з нерваў, з інтуіцыі, з усходняй ліслівасці, з рускай жаласці, з такіх простых слоў, як «мой дарагі», «мой ты добры», «я ведала, што ты сапраўдны мужчына, ты абавязкова дапаможаш жанчыне». Хлопцы, кажу я садыстам у пагонах, я ў вас веру. Веру, што вы людзі. З адным паліцэйскім-генералам доўга вяла гутарку... Гэта быў не ідыёт, не салдафон, а інтэлігентнага віду мужчына. «Вы ведаеце, — сказала я яму, — у вас працуе сапраўдны гестапавец. Майстар катаванняў, яго ўсе баяцца. З бамжоў і гастарбайтараў, якія трапляюць да яго, ён робіць інвалідаў». Я думала, што ён жахнецца ці спалохаецца,

будзе бараніць гонар мундзіра. А ён паглядзеў на мяне з усмешкай: «А дайце мне яго прозвішча. Які малайчына! Мы яго павысім, узнагародзім. Такія кадры берагчы трэба. Я яму прэмію выпішу». Я здранцвела. А ён працягваў: «Шчыра вам прызнаюся... Мы спецыяльна ствараем для вас такія невыносныя ўмовы, каб вы хутчэй з'ехалі. У Маскве два мільёны гастарбайтараў, горад не можа ператравіць такую колькасць людзей, якая раптам звалілася нам на галаву. Вас занадта шмат». *(Маўчыць.)*

Масква прыгожая... Мы йшлі з вамі па Маскве, і вы ўвесь час захапляліся: «Якая Масква стала прыгожая! Гэта ўжо еўрапейская сталіца!» А я гэтай прыгажосці не адчуваю. Я іду, гляджу на новыя будынкі і ўспамінаю: тут двое таджыкаў загінулі, упалі з рыштаванняў... а тут аднаго ўтапілі ў цэменце... Памятаю, за якія капейкі яны тут гарбаціліся. На іх нажываюцца ўсе: чыноўнікі, паліцэйскія, камунальнікі... Дворнік-таджык распісваецца ў ведамасці, што атрымлівае трыццаць тысяч, а на рукі яму выдаюць сем. Астатняе забіраюць, дзеляць паміж сабой розныя начальнікі... начальнікі начальнікаў... Законы не працуюць, замест законаў запраўляюць бабло і сіла. Маленькі чалавек — самы безабаронны, звер у лесе — і той лепш абаронены, чым ён. Звера ў вас лес абараняе, а ў нас горы... *(Маўчыць.)* Я большую частку жыцця пражыла пры сацыялізме, цяпер успамінаю, як мы ідэалізавалі чалавека, я пра чалавека ў той час добра думала. У Душанбэ я працавала ў Акадэміі навук. Займалася гісторыяй мастацтва. Я думала, што кнігі... тое, што чалавек напісаў пра сябе, гэта праўда... Не, гэта нікчэмная доля праўды... Я даўно ўжо не ідэалістка, я занадта шмат цяпер ведаю... Да мяне часта прыходзіць адна дзяўчына, яна хворая... Вядомая наша скрыпачка. З чаго яна страціла розум? Можа, ад таго, што ёй казалі: «Вы граеце на скрыпцы — а навошта гэта вам? Ведаеце дзве мовы — навошта? Ваша работа — прыбіраць, падмятаць. Вы тут — рабы». Гэтая дзяўчына ўжо не грае на скрыпцы. На ўсё забылася.

Яшчэ ў мяне быў малады хлопец… Паліцэйскія злавілі яго недзе ў Падмаскоўі, адабралі грошы, але грошай было мала. Раззлаваліся. Вывезлі ў лес. Збілі. Зіма. Мароз. Яны яго раздзелі да майтак… Ха-ха-ха… Парвалі ўсе ягоныя дакументы… І ён мне ўсё гэта распавядае. Пытаюся: «Як жа ты ўратаваўся?» — «Я думаў, што памру, я бег басанож па снезе. І раптам, як у казцы, бачу хатку. Пастукаў у акенца, выходзіць дзед. І гэты дзед даў мне кажух, каб я сагрэўся, наліў гарбаты і даў сочыва. Даў адзенне. Назаўтра адвёў у вялікае сяло і знайшоў грузавік, які давёз мяне да Масквы».

Гэты дзед… гэта таксама Расія…

*З суседняга пакоя паклікалі: «Гафхар Кандзілаўна, да вас прыйшлі». Я чакаю, калі яна вернецца. У мяне ёсць час — і я ўзгадваю тое, што чула ў маскоўскіх кватэрах.*

### *У маскоўскіх кватэрах*

—Панаехалі тут… Добрая руская душа…

—Рускі народ ані не добры. Гэта глыбокая аблуда. Жаласлівы, сентыментальны, але не добры. Зарэзалі бадзяжнага сабаку — і знялі на відэа. Увесь інтэрнэт падняўся. Суд Лінча гатовыя былі ўчыніць. А згарэлі на рынку сямнаццаць гастарбайтараў — іх гаспадар замыкаў на ноч у жалезным вагончыку на ключ, разам з таварам — за іх заступіліся толькі праваабаронцы. Тыя, каму па вызначэнні належыць усіх абараняць. Агульны ж настрой быў такі: гэтыя загінулі — іншыя прыедуць. Безаблічныя, бязмоўныя… чужыя…

—Гэта рабы. Сучасныя рабы. Уся іх маёмасць — х… і кеды. У іх на Радзіме яшчэ горш, чым у самым гнілым маскоўскім сутарэнні.

—Трапіў мядзведзь у Маскву і перазімаваў. Карміўся гастарбайтарамі. Хто іх лічыць… Ха-ха-ха…

—Да распаду СССР у адзінай сям'і жылі… так нас вучылі на палітзанятках… Тады яны былі «госці сталіцы», а цяпер

«чуркі», «хачы». Мне дзед распавядаў, як ён разам з узбекамі пад Сталінградам ваяваў. Верылі: браты навек!

—Вы мяне здзіўляеце… Яны самі аддзяліліся. Свабоды захацелі. Забылі? Прыгадайце, як у дзевяностыя яны рэзалі рускіх. Рабавалі, гвалтавалі. Гналі адусюль. Сярод ночы грукаюць у дзверы… Увальваюцца — хто з нажом, хто з аўтаматам: «Прэч з нашай зямлі, руская скаціна!» Пяць хвілін на зборы… І бясплатная дастаўка да бліжэйшай станцыі. Людзі выскоквалі з кватэр у тапках… Вось як яно было…

—Мы памятаем прыніжэнне нашых братоў і сясцёр! Смерць чуркам! Рускага Мішку цяжка разбудзіць, але калі ён падымецца, крывішчы пусціць многа.

—Каўказу далі ў рыла рускім прыкладам. Цяпер — хто наступны?

—Ненавіджу брытагаловых! Яны здольныя толькі на адно — бейсбольнымі бітамі ці малаткамі забіць да смерці дворніка-таджыка, які ім нічога не зрабіў. На дэманстрацыях гарлаюць: «Расія — для рускіх, Масква — для масквічоў». Мая мама — украінка, бацька — малдаванін, бабуля па матчынай лініі — руская. А хто я? Якім чынам збіраюцца «чысціць» Расію ад нярускіх?

—Тры таджыкі замяняюць самазвал. Ха-ха-ха…

—А я сумую па Душанбэ. Я там вырасла. Вучыла фарсі. Мова паэтаў.

—Слабо прайсці па горадзе з плакатам «Люблю таджыкаў»? Умомант морду наб'юць.

—У нас побач будоўля. Хачы шныпараць, як пацукі. Праз іх у краму ўвечары страшна выйсці. За танны мабільнік могуць забіць…

—Аха-хах! Два разы мяне рабавалі — рускія, ва ўласным пад'ездзе ледзь не забілі — рускія. Як жа задаўбаў мяне гэты народ-баганосец.

—А вы б хацелі, каб ваша дачка выйшла замуж за мігранта?

—Гэта мой родны горад. Мая сталіца. А яны прыехалі сюды са сваім шарыятам. На Курбан-Байрам рэжуць у мяне пад вокнамі бараноў. А чаго не на Чырвонай плошчы? Крыкі бедных жывёлаў, кроў хвошча... Выйдзеш у горад: там... і там... чырвоныя лужыны на асфальце... Я іду з дзіцём: «Мама, што гэта?» У гэты дзень горад «чарнее». Ужо не наш горад. Іх сотні тысяч з сутарэнняў вывальваюць... Паліцэйскія ў сцены ўціскаюцца, баяцца...

—Я сябрую з таджыкам. Яго завуць Саід. Прыгожы як бог! У сябе дома ён быў лекарам, тут — на будоўлі працуе. Закаханая ў яго па вушы. Што рабіць? Калі сустракаемся, гуляем з ім па парках або выязджаем куды-небудзь за горад, каб нікога з маіх знаёмых не сустрэць. Баюся бацькоў. Бацька папярэдзіў: «Убачу з чарнамазым — прыстрэлю абаіх». Хто мой бацька? Музыкант... скончыў кансерваторыю...

—Калі «чорны» ідзе з дзяўчынай... нашай! Такіх лягчаць трэба.

—За што іх ненавідзяць? За карыя вочы, за форму носа. Іх ненавідзяць проста так. У нас кожны абавязкова кагосьці ненавідзіць: суседзяў, мянтоў, алігархаў... дурных янкі... Ды каго заўгодна! Шмат нянавісці ў паветры... да чалавека нельга дакрануцца...

*«...бунт народа, які я бачыла, напалохаў мяне на ўсё жыццё»*

*Час абеду. П'ём з Гафхар гарбату з таджыкскіх піялаў і працягваем размову.*

—Калі-небудзь я звар'яцею ад таго, што памятаю...

Дзевяноста другі год... Замест свабоды, якую мы ўсе чакалі, пачалася грамадзянская вайна. Кулябцы забівалі памірцаў, а памірцы — кулябцаў... Карацегінцы, гісарцы, гармцы — усе раздзяліліся. На сцены дамоў павесілі плакаты: «Рускія, рукі прэч ад Таджыкістана!», «Камуністы — прэч у сваю Маскву!».

Гэта ўжо быў не мой улюбёны Душанбэ... Па вуліцах горада хадзілі натоўпы з арматурай і з камянямі ў руках... Цалкам мірныя, ціхія людзі ператварыліся ў забойцаў. Яшчэ ўчора яны былі іншыя, спакойна пілі гарбату ў чайхане, а сёння ходзяць і жалезнымі прэнтамі распорваюць жываты жанчынам... Рабуюць крамы, шапікі. Я пайшла на рынак... На акацыях віселі капелюшы і сукенкі, на зямлі ляжалі мёртвыя, усе без разбору: людзі, жывёлы... *(Маўчыць.)* Помню... Прыгожая раніца. На нейкі час я забыла пра вайну. Здалося, што ўсё будзе як раней. Вось яблыня цвіце, і абрыкос... Ніякай вайны няма. Расчыніла акно і зараз жа ўбачыла чорны натоўп. Яны ўсе ішлі моўчкі. Раптам адзін павярнуўся, і мы сустрэліся з ім вачыма... відаць — бядняк, погляд гэтага хлопца мне казаў: зараз я магу зайсці ў твой прыгожы дом і зрабіць усё, што захачу, гэта мой час... Вось пра што мне сказалі ягоныя вочы... я жахнулася... Адхінулася ад акна, зашморгнула шторы, адны, другія, пабегла і зачыніла дзверы на ўсе замкі і схавалася ў самым далёкім пакоі. У ягоных вачах быў азарт... Нешта сатанінскае ёсць у натоўпе. Я баюся гэта ўспамінаць... *(Плача.)*

Я бачыла, як у двары забівалі рускага хлопчыка. Ніхто не выйшаў, усе зачынілі вокны, я выскачыла ў махровым халаце: «Пакіньце яго! Вы яго ўжо забілі!» Ён ляжаў нерухома... Сышлі. Але неўзабаве вярнуліся і сталі яго дабіваць, такія ж хлапчукі, як і ён. Хлопчыкі... гэта былі хлопчыкі... Я патэлефанавала ў міліцыю — яны паглядзелі, каго б'юць, і з'ехалі. *(Маўчыць.)* Нядаўна, калі ў Маскве ў адной кампаніі я пачула: «Я люблю Душанбэ. Які цікавы быў горад! Я сумую па гэтым горадзе», — як я была ўдзячная гэтаму рускаму чалавеку! Нічога, акрамя любові, нас не ўратуе. Таго, хто злосна моліцца, Алах не слухае. Алах вучыць: не трэба адчыняць дзверы, якія потым не зачыніш... *(Паўза.)* Забілі аднаго нашага сябра... Ён быў паэт. Таджыкі любяць вершы, у кожным доме ёсць кнігі з вершамі, хоць бы адна-дзве, у нас паэт — святы чалавек. Яго чапаць нельга. Забілі! Перад тым, як забіць, яму зламалі рукі...

За тое, што ён пісаў… Праз нейкі час забілі другога сябра… На целе ніводнага сіняка, чыстае цела, білі ў рот… За тое, што ён казаў… Вясна. Так сонечна, так цёпла, а людзі забіваюць адзін аднаго… Хацелася сысці ў горы.

Усе кудысьці з'язджалі. Ратаваліся. Нашы сябры жылі ў Амерыцы. У Сан-Францыска. Паклікалі да сябе. Знялі там маленькую кватэру. Так прыгожа! Ціхі акіян… Куды ні пойдзеш — паўсюль ён. Цэлымі днямі я сядзела на беразе і плакала, нічога рабіць не магла. Я прыехала з вайны, дзе чалавека маглі забіць за пакет малака… Ідзе ўздоўж берага стары, закасаныя калашыны, яркая футболка. Спыніўся каля мяне: «Што ў цябе здарылася?» — «У мяне на радзіме — вайна. Брат забівае брата». — «Заставайся тут». Ён казаў, што акіян і прыгажосць лечаць… Доўга мяне суцяшаў. А я плакала. На добрыя словы ў мяне была адна рэакцыя — слёзы ліліся ракой, ад добрых слоў я плакала мацней, чым дома ад стрэлаў. Ад крыві.

Але я не змагла жыць у Амерыцы. Імкнулася ў Душанбэ, а калі дадому вяртацца небяспечна, то хачу бліжэй да дома. Пераехалі ў Маскву… Сяджу ў гасцях у адной паэткі. Слухаю бясконцую нэндзу: Гарбачоў — балбатун… Ельцын — п'яніца… народ — быдла… Колькі разоў я ўжо гэта чула? Тысячу разоў! Гаспадыня хоча ўзяць і памыць маю талерку, а я не даю — я ўсё магу есці з адной талеркі. І рыбу, і пірожнае. Я прыехала з вайны… У іншага пісьменніка поўная лядоўня сыру і каўбасы — а таджыкі ўжо забыліся, што гэта такое, — і зноў увесь вечар слухаю нудотнае бурчанне: улада дрэнная, дэмакраты падобныя да камуністаў… рускі капіталізм людажэрскі… І ніхто нічога не робіць. Усе чакаюць, што вось-вось будзе рэвалюцыя. Не люблю я гэтых расчараваных на кухні. Я не з іх кампаніі. Бунт народа, які я бачыла, напалохаў мяне на ўсё астатняе жыццё, я ведаю, што такое свабода ў няўмелых руках. Балбатня заўсёды сканчаецца крывёю. Вайна — гэта воўк, які можа прыйсці і да вашага дома… *(Маўчыць.)*

Вы бачылі гэтыя кадры ў інтэрнэце? Мяне яны ўшчэнт зняможылі. Я тыдзень праваляласся ў ложку… Вось гэтыя кадры… Забівалі і здымалі. Быў у іх сцэнар, распісалі ролі… Як у сапраўдным кіно… Цяпер патрэбны глядач. І мы глядзім… яны прымусілі нас…. Вось хлопец ідзе па вуліцы, наш хлопец, таджык… Вось яны яго клічуць, ён падыходзіць, яго збіваюць з ног. Б'юць бейсбольнымі бітамі, спачатку ён круціцца на зямлі, а потым аціхае. Яго звязваюць і грузяць у багажнік. У лесе прывязваюць да дрэва. Бачна: той, хто здымае, шукае ракурс, каб была добрая карцінка. Хлопцу адразаюць галаву. Адкуль гэта прыйшло? Адразанне галавы… Гэта ўсходні рытуал. Не рускі. Напэўна, ён з Чачні. Памятаю… Адзін год забівалі проста «адвёрткамі», потым з'явіліся трызубцы, за імі трубы і малаткі… Заўсёды смерць надыходзіла ад удару тупым прадметам. Цяпер новая мода… *(Маўчыць.)* На гэты раз забойцаў знайшлі. Іх будуць судзіць. Усе хлопчыкі з добрых сем'яў. Сёння рэжуць таджыкаў, заўтра будуць рэзаць багатых ці тых, хто іншаму Богу моліцца. Вайна — гэта воўк… Ён ужо прыйшоў…

*У маскоўскіх сутарэннях*

*Абралі дом — «сталінку» ў самым цэнтры Масквы. Будаваліся гэтыя дамы пры Сталіне для бальшавіцкай эліты, таму і называюць іх «сталінкамі», яны і цяпер у цане. Сталінскі ампір: ляпніна на фасадах, барэльефы, калоны, вышыня столі ў кватэрах — тры-чатыры метры. Нашчадкі былых правадыроў збяднелі, сюды пераязджаюць «новыя рускія». У двары стаяць «бэнтлі», «ферары». На першым паверсе гараць агнямі вітрыны дарагіх буцікоў.*

*Наверсе — адно жыццё, пад зямлёй — іншае. Разам са знаёмым журналістам спускаемся ў сутарэнне… Доўга блукаем між іржавых труб і заплеснелых сцен, час ад часу дарогу нам перакрываюць жалезныя фарбаваныя дзверы, на іх вісяць*

*замкі і стаяць пломбы, але ўсё гэта — фікцыя. Умоўны стук — і праходзь. Сутарэнне напоўненае жыццём. Доўгі асветлены калідор: па абодва бакі пакоі — сцены з фанеры, замест дзвярэй — рознакаляровыя шторы. Маскоўскае падзямелле падзеленае паміж таджыкамі і ўзбекамі. Мы трапілі да таджыкаў. У кожным пакоі — сямнаццаць-дваццаць чалавек. Камуна. Нехта пазнаў майго «гіда» — ён прыходзіць сюды ўжо не першы раз — і запрашае нас да сябе. Заходзім у пакой: каля ўваходу гара абутку, дзіцячыя вазочкі. У кутку — пліта, газавы балон, да іх прыціснутыя сталы і крэслы, якія перабраліся сюды з бліжэйшых сметніц. Усю астатнюю прастору займаюць двух'ярусныя самаробныя ложкі.*

*Час вячэраць. Чалавек дзесяць ужо сядзяць за сталом. Знаёмімся: Амір, Хуршыд, Алі... Старэйшыя вучыліся ў савецкай школе, па-руску гавораць без акцэнту. Маладыя рускай мовы не ведаюць. Толькі ўсміхаюцца.*

*Гасцям радыя.*

—Зараз мы трошкі паямо, —*усаджвае нас за стол Амір, у мінулым настаўнік, ён тут за старэйшага.* — Паспытайце таджыкскі плоў. Смачна — мама дарагая! У таджыкаў так: калі ты сустрэў чалавека непадалёк ад свайго дома, ты мусіш паклікаць яго да сябе і даць яму піялу з гарбатай.

*Дыктафон уключыць не магу — баяцца. Дастаю асадку. Тут мне дапамагае іх сялянская павага да таго, хто піша. Адны прыехалі з кішлакоў, іншыя спусціліся з гор. І адразу трапілі ў гіганцкі мегаполіс.*

—Масква — добра, работы — шмат. А жыць увогуле страшна. Я іду па вуліцы адзін... Нават удзень... Я маладым хлопцам у вочы не гляджу — забіць могуць. Маліцца кожны дзень трэба...

—Да мяне падышлі ў электрычцы трое... Я з працы ехаў. «Ты што тут робіш?» — «Дадому еду». — «Дзе твой дом? Хто цябе сюды клікаў?» Пачалі біць. Білі і крычалі: «Расія — для рускіх!

Слава Расіі!» — «Хлопцы, за што? Алах усё бачыць». — «Твой Алах тут цябе не бачыць. У нас свой Бог». Зубы выбілі... рабро зламалі... Поўны вагон людзей, і адна толькі дзяўчына заступілася: «Пакіньце! Ён вас не чапаў». — «Ты чаго? Хача б'ём».

— Рашыда забілі... Трыццаць разоў ударылі нажом. Ты мне скажы, навошта трыццаць разоў?

— На ўсё воля Алаха... Бедняка і на вярблюдзе сабака ўкусіць.

— Мой тата вучыўся ў Маскве. Сёння ён дзень і ноч плача па СССР. Ён марыў, што я таксама буду вучыцца ў Маскве. А мяне тут паліцэйскі б'е, гаспадар б'е... Жыву ў сутарэнні, як котка.

— Мне СССР не шкада... Дзядзька Коля, наш сусед... ён рускі быў... Ён на маю маму крычаў, калі яна адказвала яму па-таджыкску: «Гавары на нармальнай мове. Зямля ваша, улада наша». Мама плакала.

— Я сёння сон бачыў: іду па нашай вуліцы, суседзі кланяюцца: «Салам алейкум»... «Салам алейкум»... У нашых кішлаках засталіся толькі жанчыны, старыя і дзеці.

— Дома мой заробак быў пяць долараў за месяц... Жонка, трое дзяцей... У кішлаках гадамі людзі не бачаць цукру...

— На Чырвонай плошчы не быў. Леніна не бачыў. Праца! Праца! Рыдлёўка, кірка, насілкі. Увесь дзень з мяне, як з кавуна, вада цячэ.

— Заплаціў аднаму маёру за дакументы: «Няхай Алах дасць табе здароўе. Які добры чалавек!» А дакументы аказаліся фальшывыя. У «малпоўнік» пасадзілі. Білі нагамі, білі палкамі.

— Няма дакумента — няма чалавека...

— Чалавек без Радзімы — бяздомны сабака... Кожны можа пакрыўдзіць. Паліцэйскія за дзень дзесяць разоў спыняць: «Пакажы дакументы». Гэтая паперка ёсць, а гэтай няма. Не дасі грошай — б'юць.

— Хто мы? Будаўнікі, грузчыкі, дворнікі, пасудамыйкі... Менеджарамі мы тут не працуем...

—Мама задаволеная, я грошы дасылаю. Знайшла мне прыгожую дзяўчыну, я яе яшчэ не бачыў. Мама выбірала. Прыеду — ажанюся.

—Усё лета працаваў у аднаго багатага пад Масквой, а ўрэшце яны мне не заплацілі: «Пайшоў! Пайшоў! Я цябе карміў».

—Калі ў цябе ёсць сто бараноў — ты маеш рацыю. Ты заўсёды маеш рацыю.

—Мой сябар таксама прасіў у гаспадара грошай за працу. Паліцыя потым яго доўга шукала. Адкапалі ў лесе... Мама труну атрымала з Расіі...

—Выганяць нас... Хто Маскву адбудоўваць будзе? Двары падмятаць? Рускія за тыя грошы, што нам плацяць, гарбаціцца не стануць.

—Заплюшчу вочы — бачу: арык цячэ, бавоўна цвіце, яна цвіце пяшчотна-ружова, як сад.

—А ты ведаеш, што ў нас была вялікая вайна? Пасля падзення СССР адразу сталі страляць... Добра жыў толькі той, у каго быў аўтамат. Я ў школу хадзіў... Кожны дзень я бачыў два-тры трупы. Мама ў школу не пусціла. Я сядзеў дома і чытаў Хаяма. У нас усе чытаюць Хаяма. А ты яго ведаеш? Калі ведаеш, то ты мне сястра.

—Забівалі няверных...

—Алах сам вырашыць — хто верны, а хто няверны. Сам будзе судзіць.

—Маленькі быў... Я не страляў. Мама расказвала, што да вайны жылі так: на адным вяселлі гаварылі па-таджыкску, па-ўзбекску і па-руску. Хто хацеў — маліўся, а хто не хацеў — не маліўся. Скажы, сястра, чаму людзі так хутка навучыліся забіваць адзін аднаго? Яны ўсе Хаяма ў школе чыталі. І Пушкіна.

—Народ — караван вярблюдаў, які гоняць бізуном...

—Вучу рускую мову... Вось паслухайце: красивы дэвушка, хлэб, дэнгі... начальнык плёхой...

—Ужо пяць гадоў я ў Маскве, і са мной ні разу ніхто не павітаўся. Рускім патрэбныя «чорныя», каб яны маглі адчуваць сябе «белымі», глядзець на кагосьці зверху ўніз.

—Як у кожнай ночы ёсць раніца, так у кожнага смутку бывае канец.

—Нашы дзяўчаты ярчэйшыя. Нездарма іх параўноўваюць з гранатам...

—На ўсё воля Алаха...

*З сутарэнняў падымаемся наверх. Цяпер я гляджу на Маскву іншымі вачыма — яе прыгажосць здаецца мне халоднай і трывожнай. Масква, хіба табе ўсё адно — любяць цябе ці не?*

## Пра жыццё-паскудства і сто грамаў лёгкага пясочку ў белым вазончыку

*Тамара Сухавей — афіцыянтка, 29 гадоў*

—Жыццё — паскудства! Вось што я табе скажу... Не падносіць яно падарункаў. Нічога добрага, прыгожага я ў жыцці не бачыла. Не ўспомню... Забі мяне — не ўспомню! І труцілася, і вешалася. У мяне было тры спробы самагубства... Цяпер я вены сабе парэзала... *(Паказвае забінтаваную руку.)* Вось тут... у гэтым месцы... Выратавалі мяне, і я тыдзень спала. Проста сплю і сплю. Такі ў мяне арганізм... Псіхіятр прыйшла... Вось як ты цяпер, яна мяне прасіла: гавары, гавары... Што расказваць? Смерць не страшная мне... Дарэмна ты прыйшла і сядзіш. Дарэмна! *(Адвярнулася да сценкі і маўчыць. Я хачу сысці, але яна спыняе.)* Ну добра, паслухай... Усё праўда...

...Яшчэ я маленькая была... Прыйшла са школы, легла, а раніцай не паднялася з ложка. Павезлі да доктара — няма дыягназу. Тады давай бабку шукаць — знахарку. Далі нам адрас... Бабка раскінула карты і кажа маці: «Вернецеся дадому, распораце падушку, на якой дачка ляжыць. Там знойдзеце кавалак гальштука і курыныя косткі. Гальштук павесьце на

крыжы пры дарозе, а косткі аддайце чорнаму сабаку. Дачка ўстане і пойдзе. Псоту на дзеўку навялі». Нічога добрага, прыгожага я ў жыцці не бачыла… А вены — херня, я проста стамілася змагацца… З дзяцінства жыла так — у лядоўні толькі гарэлка. У нас у вёсцы з дванаццаці гадоў усе п'юць. Добрая гарэлка дарагая, дык самагон п'юць, і адэкалон, і вадкасць для мыцця шкла, і ацэтон. З гуталіну гарэлку гоняць, з клею. Маладыя мужчыны паміраюць, ад гарэлкі, вядома, труцяцца. Сусед, я памятаю, нап'ецца і смаліць шротам па яблынях. Усіх дома паставіць пад ружжо… І наш дзед да старасці піў. У семдзесят гадоў мог выпіць за вечар дзве пляшкі. Хваліўся. Вярнуўся ён з вайны ў медалях. Герой! Доўга хадзіў у шынялі, піў, гуляў, святкаваў. А бабуля працавала. А дзед быў герой… Дзед біў бабулю смяротным боем, я поўзала перад ім на каленях, каб ён яе не чапаў. Ён ганяўся за намі з сякерай… Па суседзях начавалі. У пуні. Сабаку насмерць засек. Пасля дзеда я зненавідзела ўсіх мужчын. Я думала адна жыць.

Прыехала ў горад… Усіх баялася: і машын, і людзей. Але ўсе едуць у горад — і я. Старэйшая сястра тут жыла, яна мяне забрала: «Паступіш у вучылішча, станеш афіцыянткай. Ты прыгожая, Томка. Знойдзеш сабе мужа-вайскоўца. Лётчыка». Ага… лётчыка… Першы муж у мяне быў кульгавы, маленькі. Сяброўкі адгаворвалі: «Навошта ён табе? Да цябе такія хлопцы заляцаюцца!» А я заўсёды любіла фільмы пра вайну, як жанчыны чакаюць сваіх мужоў з фронту, хоць бы які вярнуўся — без ног, без рук, але жывы. Бабуля распавядала: у нашу вёску аднаго прывезлі без абедзвюх ног, дык жонка яго па двары на руках насіла. А ён піў, дурэў. Заваліцца ў канаву, яна яго падбярэ, у ночвах памые і пасадзіць на чысты ложак. Я думала, што гэта і ёсць каханне… Я не разумею, што такое каханне… Пашкадавала яго, прылашчыла. Мы пражылі з ім траіх дзяцей, і ён стаў піць, нажом пагражаў. Не даваў на ложку спаць… валялася на падлозе… У мяне выпрацаваўся рэфлекс, як у сабакі Паўлава: муж — у хату, мы з дзецьмі — з хаты. Ад

усяго, што ўспомню, слёзы коцяцца... Ці на хер усё паслаць! Нічога прыгожага ў мяне ў жыцці не было, а толькі ў кіно. У тэлевізары. Ну, вось... каб сесці і з кім-небудзь разам памарыць... парадавацца...

Ужо другім дзіцём была цяжарная... З вёскі прыйшла тэлеграма: «Прыязджай на пахаванне. Маці». Цыганка мне перад гэтым на вакзале варажыла: «Чакае цябе далёкая дарога. Пахаваеш бацьку і будзеш доўга плакаць». Не паверыла. Бацька быў здаровы, спакойны. Маці піла, з раніцы сабе налівала, а ён і карову падоіць, і бульбы наварыць, усё сам. Ён моцна яе кахаў, яна яго прычаравала: нешта яна такое ведала, нейкае зелле. Прыехала я дадому... Сяджу каля труны, плачу. Суседская дзяўчынка на вуха шэпча: «Баба дзеда чыгунком забіла, а мне сказала, каб я маўчала. Абяцала купіць шакаладных цукерак...» Я знiякавела, мяне пачало муціць, менавіта ад страху... Ад вусцішы... І калі ў хаце нікога не было, усе пайшлі, раздзела бацьку і шукала на ім сінякі. Сінякоў не было, толькі на галаве — вялікая рана. Паказала маці, яна кажа, што гэта ён дровы калоў, палка адляцела, ударыла. Сяджу ў слязах усю ноч... сяджу і адчуваю, што ён хоча мне штосьці сказаць... А маці не адыходзіць, усю ноч цвярозая, так яна мяне адну і не пакінула. Бачу — раніцай у бацькі крывавая сляза з-пад вейкі папаўзла. Адна... другая... Слёзы цяклі, як у жывога... Страшна-а-а! Гэта была зіма. Яму на могілках дзяўблі ломам, грэлі зямлю — распалілі ў яме вогнішча з бярозавага палення і аўтамабільных пакрышак. Мужыкі запатрабавалі скрыню гарэлкі. Як толькі бацьку закапалі, маці напілася. Сядзіць вясёлая. А я плачу... Ад усяго і цяпер слёзы градам... Родная маці... яна мяне нарадзіла... Самы родны чалавек павінен быць... Як толькі я з'ехала, дом яна прадала, а пуню спаліла, каб страхоўку атрымаць, і прыкацiла да мяне ў горад. Тут знайшла сабе іншага... Хутка знайшла... І ён сына з нявесткай прагнаў, а ёй кватэру адпісаў. Яна мужыкоў прынаджвала, нешта ведала... варажыла... *(Гушкае хворую руку, як дзіця.)* А мой ганяўся за

мной з малатком, два разы галаву праламіў. Пляшка гарэлкі, у кішэнях — па гурку, і пайшоў. Куды яго панесла? Дзеці галодныя... Сядзелі мы на адной бульбе, а на свята — бульба з малаком або з кількай. Паспрабуй абурыся, калі ён вернецца: шклянку — у твар, крэсла — у сценку... Уначы ўскочыць на мяне, як звер... Нічога ў жыцці добрага не было, нават малога. Прыйду на працу, пабітая, наплаканая, а трэба ўсміхацца, кланяцца. Дырэктар рэстарана пакліча ў кабінет: «Мне тут тваіх слёз не трэба. У самога жонка спаралізаваная другі год ляжыць». І лезе да мяне пад спадніцу...

Маці з айчымам і два гады не пражыла... Тэлефануе: «Прыходзь... Дапамажы пахаваць. Павязём у крэматорый». Ад спалоху я ледзь не страціла прытомнасць. Апрытомнела — трэба ісці. А ў галаве адна думка: раптам гэта яна яго забіла? Забіла, каб адной у кватэры застацца, піць, гуляць. А-а? Цяпер спяшаецца ў крэматорый адвезці. Спаліць. Пакуль яго дзеці збяруцца... старэйшы сын, ён маёр, з Германіі прыедзе... жменька попелу застанецца... Сто грамаў лёгкага пясочку ў белым вазончыку... Ад усіх гэтых узрушэнняў у мяне спыніліся месячныя, два гады нічога не з'яўлялася. Калі яны зноў пачаліся, я прасіла дактароў: «Выражце мне ўсё жаночае, зрабіце аперацыю, я не хачу быць жанчынай! І каханкай не хачу быць! І жонкай, і маці!» Родная маці... яна мяне нарадзіла... Я хацела яе любіць... Маленькая прасіла: «Мамачка, пацалуй мяне». А яна заўсёды п'яная... Бацька на працу сыдзе — у хаце поўна п'яных мужыкоў. Адзін зацягнуў мяне ў ложак... Гэта мне было адзінаццаць гадоў... Я маці сказала, дык яна толькі накрычала на мяне. Піла... піла... Піла і весялілася праз усё жыццё. І тут — трэба паміраць! Не хацела. Ні за што не хацела яна паміраць. Ёй было пяцьдзясят дзевяць гадоў: аднялі адну цыцку, праз паўтара месяца — другую. А ў яе малады палюбоўнік, завяла сабе палюбоўніка на пятнаццаць гадоў маладзейшага. «Вязіце, — крычыць, — да знахаркі, ратуйце!» Ёй горш і горш... Малады яе даглядае, з-пад яе выносіць, мые. Яна не

думала паміраць… «Але калі, — кажа, — памру, усё пакіну яму. І кватэру, і тэлевізар». Нас з сястрой хацела пакрыўдзіць… Злая была… І жыццё любіла. Прагная была да жыцця. Павезлі яе да бабкі, на руках з машыны вынеслі. Бабка памалілася, адкрыла карты: «Так? — і падымаецца з-за стала. — Забірайце! Я яе лячыць не буду…» Маці нам крыкнула: «Ідзіце. Я хачу адна застацца…» А бабуля: «Чакайце!» Нас не адпусціла… На карты глядзіць: «Я яе лячыць не буду. Яна не аднаго ў зямлю паклала. А як захварэла, пайшла ў царкву і дзве свечкі заламала…» Маці: «За здароўе дзяцей сваіх…» Бабка: «За спачын ты іх паставіла. Смерці дзецям прасіла. Думала, што калі іх Богу аддасі, дык сама застанешся». Я пасля такіх слоў ніколі ўжо адна з маці не заставалася. Трэслася. Ведала, што я слабая, яна мяне пераможа… Брала з сабой сваю старэйшую дзяўчынку, а маці шалела, калі тая прасіла есці: яна памірае, а хтосьці есць, хтосьці будзе жыць. Парэзала нажніцамі новае покрыва на ложку, абрус са стала, каб нікому не засталося, калі яе не будзе. Біла талеркі, усё, што магла, крышыла, нявечыла. У прыбіральню нельга было яе данесці, яна спецыяльна — на падлогу, у ложак… каб я прыбірала… Помсціла за тое, што мы застаемся. Ходзім, размаўляем. Ненавідзела ўсіх! Птушка за акном праляціць — яна б і яе забіла. Ну а гэта была вясна… Кватэра ў яе на першым паверсе… Бэз на ўсю моц пахне… Яна дыхае-дыхае, не надыхаецца. «Прынясі, — папрасіла, — мне галінку з двара». Я прынесла… Яна ўзяла яе ў рукі, і тая ўмомант высахла, лісцікі скруціліся. Тады яна да мяне: «Дай за тваю руку патрымацца…» А мяне тая бабка папярэдзіла, што чалавек, які рабіў зло, доўга памірае, пакутліва. Трэба ці столь разбіраць, ці ўсе вокны ў хаце выняць, па-іншаму душа яго не выйдзе, з цела не вырвецца. А руку ні ў якім разе даваць нельга — хвароба перакінецца. «Навошта табе мая рука?» Замоўкне, стоіцца. Ужо блізка скон… А яна ўсё адно нам не кажа, не паказвае, дзе вопратка яе ляжыць, у якой хаваць. Дзе грошы, якія на смерць сабрала. Я баялася, што яна ўначы нас з дачкою

задушыць падушкамі. Мала што... Вочы прымружу, а сама падглядаю: як душа яе пакіне? Якая яна... гэтая душа? Будзе святло ці воблачка? Па-ўсякаму людзі кажуць і пішуць, але ніхто гэтай душы ні разу не бачыў. Пабегла раніцай у краму, папрасіла суседку пасядзець. Тая ўзяла яе за руку, і тады яна памерла. У апошнюю хвіліну нешта крыкнула незразумелае. Кагосьці паклікала... Паклікала кагосьці па імені... Каго? Суседка не запомніла. Незнаёмае імя. Я сама яе мыла, адзявала, без усялякіх пачуццяў, як рэч. Як рандэлю. Пачуццяў ніякіх, пачуцці схаваліся. Усё праўда... Прыйшлі яе сяброўкі, скралі тэлефон... Прыехалі ўсе сваякі, і наша сярэдняя сястра з вёскі. Маці ляжыць... Яна ёй вочы расплюшчвала. «Навошта ты маці мёртвую чапаеш?» — «А памятаеш, як яна ў дзяцінстве з нас здзекавалася? Любіла, каб мы плакалі. Я яе ненавіджу».

Сабраліся сваякі і сталі сварыцца... Дзяліць рэчы пачалі яшчэ ўначы, яшчэ яна ў труне ляжала. Пакавалі хто тэлевізар, хто швейную машынку... залатыя завушніцы з мёртвай знялі... Грошы шукалі — не знайшлі. Я сядзела і плакала. Мне нават шкада яе зрабілася. Назаўтра крэматорый... Вырашылі, што адвязём вазу ў вёску, закапаем побач з бацькам, хоць яна і не хацела. Наказвала, каб да бацькі не падхоўвалі. Баялася. Ці ёсць той свет ці не? Недзе ж яны з бацькам сустрэнуцца... *(Спынілася.)* Слёз цяпер у мяне мала... Сама дзіўлюся, як абыякава ўсё стала. І смерць, і жыццё. І дрэнныя людзі, і добрыя. Ды мне пляваць... Калі лёс цябе не палюбіў, дык не ўратуешся. Не пазбегнеш таго, што прызначана. Ага... Старэйшая сястра, у якой я жыла, выйшла другі раз замуж і з'ехала ў Казахстан. Я яе любіла... я як адчувала... Маё сэрца падказвала: «Не выходзь за яго замуж», — чамусьці другі яе муж мне не падабаўся. — «Ён добры. Я яго шкадую». У васямнаццаць гадоў ён загрымеў на зону — зарэзалі хлопца ў п'янай бойцы. Далі пяць гадоў, вярнуўся праз тры. Стаў хадзіць да нас у дом, падарункі прыносіў. Ягоная маці сустрэне маю сястру і ўгаворвае. Просіць. Угаворвала яна яе так: «Мужчыну заўсёды

нянька патрэбная. Добрая жонка свайму мужу — крыху маці. На самоце мужчына ваўком стане… і з падлогі будзе есці…» Сястра паверыла! Жаласлівая, як і я: «Ён са мной чалавекам стане». Я з імі на пахаванні ўсю ноч каля матчынай труны праседзела. І ён з сястрой па-добраму так, ласкава, я нават пазайздросціла. Праз дзесяць дзён атрымліваю тэлеграму: «Цётка Тома, прыязджайце. Памерла мама. Аня». Гэта дзяўчынка яе, адзінаццаць гадоў, нам тэлеграму прыслала. Адну труну вынеслі, ужо новая чакае… *(Плача.)* Ён яе п'яны прыраўнаваў. Нагамі таптаў, відэльцам пакалоў. Згвалціў мёртвую… Напіўся або накурыўся… не ведаю… А раніцай на працы сказаў, што жонка памерла, яму далі на пахаванне грошы. Аддаў іх дачцэ, а сам з'явіўся ў міліцыю з пакаяннем. Дзяўчынка цяпер у мяне жыве. Вучыцца яна не хоча, у яе нешта з галавой, нічога не запамінае. Палахлівая… з дому баіцца выйсці… А яму… Яму прысудзілі дзесяць гадоў, ён яшчэ да дачкі вернецца. Татачка!

З першым мужам я развялася і думала, што ніколі больш мужчына ў мой дом не ўвойдзе. Не ўпушчу! Надакучыла плакаць, хадзіць у сіняках. Што міліцыя? Адзін раз прыедуць на званок, а другі: «У вас сямейныя разборкі». На паверх вышэй… у нашым жа доме… Муж забіў жонку, тады яны панаехалі на машынах з мігалкамі, пратакол склалі, у кайданках яго вывелі. А ён дзесяць гадоў з яе здзекаваўся… *(Б'е сябе ў грудзі.)* Не люблю мужчын. Баюся. Як я другі раз выйшла замуж, сама не разумею. Ён вярнуўся з Афганістана, кантужаны, двойчы паранены. Дэсантура! Цяльняшку дагэтуль не здымае. Жыў са сваёй маці ў доме насупраць. У нас агульны двор. Выйдзе і сядзіць з гармонікам, ці магнітафон уключыць. Песні «афганскія», тужлівыя… Я часта думала пра вайну… увесь час баялася гэтага грыба праклятага… атамнага… Мне падабалася, калі маладыя — жаніх і нявеста — пасля ЗАГСу ішлі да Вечнага агню з кветкамі. Любіла гэта! Так урачыста! Адзін раз падсела да яго на лаўку: «Што такое

вайна?» — «Вайна — гэта калі жыць хочацца». Мне стала яго шкада. Бацькі ў яго ніколі не было, маці — інвалід дзяцінства. Быў бы бацька, дык яго б і ў Афганістан не паслалі. Бацька б заступіўся, адкупіў, як іншыя. А ў іх з маці... Зайшла ў кватэру: ложак і крэслы, афганскі медаль на сцяне вісіць. Пашкадавала яго, а пра сябе не падумала. Пачалі мы жыць. Прыйшоў ён да мяне з ручніком і з лыжкай. Медаль свой прынёс. І гармонік.

Я сабе прыдумала... намроіла, што ён герой... абаронца... Я сама надзела на яго карону і пераканала дзяцей, што ён цар. Жывём з героем! Ён выканаў свой салдацкі абавязак, пацярпеў моцна. Абагрэю яго... уратую... Маці Тэрэза! Я не глыбокая верніца, я прашу толькі: «Госпадзе, даруй нам». Каханне — гэта болька такая... Шкадаваць пачынаеш... калі кахаеш, то шкадуеш... Першая справа... У сне ён «бегаў»: ногі самі не рухаліся, а мышцы былі ў руху, як у чалавека, які бяжыць. Часам усю ноч так бегаў. Па начах крычаў: «Душары! Душары!» (Гэта «духі» — афганскія маджахеды.) Гукаў камандзіра, сяброў: «Абыходзь з флангу!», «Гранаты да бою!», «Стаў дымавую заслону...». Аднойчы мяне ледзь не забіў, калі я яго стала будзіць: «Коля! Коля! Прачніся!» Праўда... я нават пакахала яго... Вывучыла шмат афганскіх слоў: зіндан, бачата, дувал... барбухайка... «Худо Хафез!» — «Бывай, Афганістан!» Год добра мы жылі. Гэта — праўда! З'яўляліся грошы, прыносіў тушонку — улюбёную страву. З Афгана. Ішлі яны ў горы, бралі з сабой тушонку і гарэлку. Вучыў нас, як аказваць першую медычную дапамогу, якія расліны ядомыя і як лавіць жывёл. Чарапаха, казаў, салодкая. «Ты што, па людзях страляў?» — «Там выбіраць не прыходзіцца: або ты, або цябе». Усё яму даравала за яго пакуты... Сама прышпіліла сабе гэты горб...

А цяпер... Прыцягнуць сябрукі ноччу і пакладуць каля парога. Без гадзінніка і кашулі... ляжыць да пояса голы... Суседзі тэлефануюць: «Забяры, Тамара! Богу душу ад холаду аддасць». Уцягну ў дом. Плача, раве, качаецца па падлозе.

Ні на адной працы ён не затрымліваецца: ахоўнікам быў, вартаўнікам... Яму то выпіць трэба, то пахмяліцца. Ну ўсё прапіў... Ніколі не ведаеш: ці будзе дома што жэрці ці не? Адхуярыць або сядзе перад тэлевізарам. У суседзяў кватарант, ён армянін... Нешта ён сказаў, і майму не спадабалася. Валяўся той на зямлі ў крыві з выбітымі зубамі і паламаным носам. Усходніх людзей не любіць. На рынак з ім баюся хадзіць, там жа адны ўзбекі й азербайджанцы гандлююць. Як што... адна ў яго прымаўка: «На кожную кручаную задніцу ёсць болт з разьбой». Яны яму зніжкі робяць, не звязваюцца. «А-а... "афганец"... шалёны... Чорт!» Дзяцей б'е. Малы яго любіць, лезе да яго, а ён яго падушкай душыць. Дык той цяпер, калі ён адчыняе дзверы, бяжыць хуценька ў свой ложак і — спаць, вочы заплюшчвае, каб не біў, ці ўсе падушкі пад канапу схавае. Мне ці плакаць... ці... *(Паказвае сваю забінтаваную руку.)* У дзень дэсантніка... збяруцца сябры... усе, як і ён, у цяльняшках... Нап'юцца ў дым! Абсцуць мне ўсё ў прыбіральні. У іх нешта з галавой... Манія велічы: мы былі на вайне! Крутыя! Першы тост: «Увесь свет — гаўно, усе людзі — блядзі, а сонца — ёбаны ліхтар». І так да самай раніцы: «за спачын», «за здароўе», «за ордэн», «каб усе здохлі». Жыццё ў іх не склалася... Я вам не скажу чаму — з-за гарэлкі ці з-за вайны? Злыя, як ваўкі! Каўказцаў усе ненавідзяць і жыдоў. Жыдоў ненавідзяць за тое, што Хрыста забілі і справу Леніна загубілі. Дома ім ужо нявесела: прачнуўся, умыўся, паеў. Нудота! Яны б і цяпер — пакліч толькі! — мігам бы сабраліся ў Чачню. Пагеройстваваць! Нейкая ў іх крыўда засталася, крыўда на ўсіх: на палітыкаў і на генералаў, на тых, хто там не быў. На гэтых асабліва... у першую чаргу... Ніякай спецыяльнасці ў многіх, як і ў майго, няма. У іх ва ўсіх адна спецыяльнасць — хадзіць з пісталетам. Кажуць, што п'юць ад крыўды... Ой-ой! І там яны пілі, не хаваюць гэтага: «Без ста грамаў рускі салдат да перамогі не дажыве», «Кінь нашага чалавека ў пустыню, праз дзве гадзіны ён п'яны, а вады не знойдзе».

Метылавы спірт ужывалі, тармазную вадкасць… Па дурноце, сп'яну падрываліся… Прыехалі дадому: хтосьці павесіўся, кагосьці застрэлілі ў разборках, аднаго так збілі, што стаў інвалідам… яшчэ адзін звар'яцеў, забралі ў псіхушку… Гэта тое, што мне вядома. Хрэн яго ведае, што яшчэ… Капіталісты… ну гэтыя, новыя рускія… іх наймаюць, праплачваюць, каб яны дапамагалі ім адзін у аднаго пазыкі выбіваць. Страляюць яны лёгка, нікога не шкада. Малакасосу дваццаць гадоў, у яго — шалёныя грошы, а ў іх — медалі. Малярыя, гепатыт… Хіба яны будуць яго шкадаваць? Іх жа ніхто не пашкадаваў… Ім страляць хочацца… Ты гэта не запісвай… Я баюся… Размова ў іх кароткая: адразу — да сценкі! У Чачню яны хочуць паехаць, таму што там свабода, там рускіх крыўдзяць… і мараць жонкам футры прывезці. Залатыя пярсцёнкі. І мой хацеў туды, толькі п'яніц не бяруць. Здаровых мужыкоў хапае. Кожны дзень адно чую: «Дай грошай». — «Не дам». — «Стаяць, сука!» І ўрэжа. А потым сядзіць і плача. На шыю вешаецца: «Не кідай мяне!» Я доўга яго шкадавала… *(Плача.)*

Падлюка-шкадоба… Я ўжо не дам ёй ходу… На жаласць не цісні! Сёрбай свае ваніты сваёй лыжкай. Сам расхлёбвай! Даруй мне, Госпадзе, калі ты й напраўду ёсць. Даруй!

Вяртаюся ўвечары з працы… Ягоны голас. Вучыць сына. Я ўжо ўсё напамяць ведаю: «Стоп! Запамінай: ты шпурнеш гранату ў акно — кульбіт сюды. На зямлю. А другі — за калону…» Маць-перамаць! «Чатыры секунды — і ты на прыступках, нагой выбіваеш дзверы — аўтамат налева. Першы падае… Другі прабягае міма… Трэці прыкрывае… Стоп! Стоп!» Стоп… *(Крычыць.)* Страшна мне! Як сына ратаваць? Бягу да сяброўак… Адна: «Трэба табе ў царкву. Маліся». Іншая да знахаркі павяла… А куды яшчэ ісці? Больш няма да каго. Бабка была старая, як Кашчэй Несмяротны. Яна сказала, каб я прыйшла на наступны дзень і прынесла ёй пляшку гарэлкі. Пахадзіла яна па кватэры з гэтай пляшкай, пашаптала над ёй, рукамі павадзіла і аддала мне: «Гарэлка замоўленая.

Будзеш два дні яму па чарцы наліваць, а на трэці ён не захоча». І праўда, месяц не піў. А потым зноў: уваліцца ўначы п'яны ў зюзю, грыміць на кухні рандэлямі, дай яму жэрці... Знайшла іншую знахарку... Тая варажыла мне на картах, ліла расплаўлены свінец у кубак з вадой. Навучыла просценькім замовам — на соль, на жменьку пяску. Нічога не дапамагло! Ад гарэлкі і ад вайны не вылечыш... *(Гушкае хворую руку.)* Ох, як я стамілася! Нікога не шкада... ні дзяцей, ні сябе... Маці не клічу, а яна прыходзіць да мяне ў сне. Маладая, вясёлая. Заўсёды яна маладая і смяецца. Я яе праганяю... А то сястра прысніцца, яна сур'ёзная, заўсёды пытаецца ў мяне адно і тое ж: «Думаеш, што ты сябе можаш выключыць, як лямпачку?» *(Спыняецца.)*

Усё — праўда... Нічога прыгожага я ў жыцці не бачыла. І ўжо не ўбачу. Учора ў бальніцу да мяне заявіўся: «Я дыван прадаў. Дзеці галодныя». Мой любімы дыван. Адна добрая рэч у нас у доме была... заставалася... Цэлы год грошы збірала, назапашвала. Па капейцы. Так хацела гэты дыван... в'етнамскі... А ён з ходу прапіў. Дзяўчаты з маёй працы прыбягалі: «Ой, Томка, вяртайся дадому хутчэй. Надакучыў яму малы — б'е. А старэйшую (дзяўчынка сястры), ёй ужо дванаццаць гадоў... Сама ведаеш... п'яная справа...»

Я ляжу ўначы. Не сплю. А потым як упаду ў яму, кудысьці лячу. І невядома, якая я раніцай прачнуся. У мяне страшныя думкі...

*На развітанне — нечакана абдымае.*

Запомні мяне...

*Праз год яна зрабіла яшчэ адну спробу самагубства. На гэты раз — удалую. У мужа, як я даведалася, неўзабаве з'явілася іншая жанчына. Я патэлефанавала ёй: «Шкадую яго, — сказала яна. — Не кахаю, а шкадую. Адна бяда, што зноў піць пачаў, а абяцаў, што кіне».*

*Вы здагадваецеся, што я пачула далей?*

## Пра негідлівасць мёртвых і цішыню пылу

*Алеся Нікалаева — малодшы сяржант міліцыі, 28 гадоў*

*З аповеду маці*

—Я хутка памру ад сваіх аповедаў… Навошта я распавядаю? Нічым вы мне не дапаможаце. Ну напішаце… надрукуеце… Добрыя людзі прачытаюць і паплачуць, а дрэнныя… галоўныя… яны не будуць чытаць. Ім — навошта?

Я шмат разоў ужо гэта распавядала…

23 лістапада 2006 года…

Перадалі ў тэлевізары… Ужо ўсе суседзі ведалі. Горад гудзеў…

А мы з Настачкай, з унучкай, былі дома. Тэлевізар у нас не працаваў, даўно зламаўся ад старасці. Чакалі: «Вось Алеська прыедзе — новы набудзем». Усчалі прыборку. Мыццё. Нам чамусьці весела-весела, у гэты дзень смяяліся і смяяліся. Прыйшла мая мама… наша бабуля… з агарода: «Ой, дзяўчаты, нешта вы дужа вясёлыя. Глядзіце, каб плакаць не давялося». У мяне ўпала сэрца… Як там Алеська? Але вось толькі ўчора мы ёй тэлефанавалі, было свята — Дзень міліцыі: ёй уручылі значок «За выдатную службу ў МУС». Мы павіншавалі. «Ой, я вас так усіх люблю, — сказала яна. — Хутчэй хачу пабачыць родную зямлю». Палова маёй пенсіі сыходзіла на тэлефонныя званкі: пачую яе голас і неяк пражыву яшчэ два-тры дні. Да наступнага званка… «Мама, ты не плач, — супакойвала яна мяне. — Я нашу зброю, але не страляю. З аднаго боку — вайна, а з другога — спакойная абстаноўка. Раніцай я чула, як мула спявае, гэта ў іх малітва такая. Горы тут жывыя, а не мёртвыя — да самых вяршыняў у траве і ў дрэвах». Другі раз: «Мама, чачэнская зямля ўся насычаная нафтай. Капай у кожным агародзе — усюды нафта».

Навошта іх туды паслалі? Яны там ваявалі не за Радзіму, а за нафтавыя вышкі. Кропля нафты цяпер каштуе, як кропля крыві…

Забегла адна суседка… праз гадзіну другая… «Чаго яны, — думаю, — разбегаліся?» Забягалі ж без справы. Пасядзяць і сыходзяць. А ў тэлевізары ўжо некалькі разоў перадалі…

Да раніцы мы нічога не ведалі. Раніцай патэлефанаваў сын: «Мама, ты дома будзеш?» — «А што ты хочаш? Я збіраюся ў краму». — «Ты пачакай мяне. Я прыеду, калі ты выправіш Насту ў школу». — «Хай дома сядзіць. Кашляе». — «Калі тэмпературы няма, адпраўляй у школу». У мяне ўпала сэрца, мяне ўсю затрэсла. Калатун напаў. Настачка пабегла, а я выйшла на балкон. Бачу: сын ідзе не адзін, а з нявесткай. Я чакаць ужо не магла, яшчэ дзве хвіліны — мне цераз край! Выскачыла на лесвічную пляцоўку і крычу ўніз: «Што з Алеськай?» Відаць, я так крычала… такім нутраным голасам… што і яны мне ў адказ закрычалі: «Мама! Мама!» Выйшлі з ліфта і стаяць. Ні слова. «Яна ў бальніцы?» — «Не». У мяне паплыло ўсё перад вачыма. Закруцілася. Потым дрэнна… мала памятаю… Аднекуль набралася шмат людзей… Усе суседзі паадчынялі дзверы, падымаюць мяне з цэменту, угаворваюць. А я поўзаю па падлозе і хапаю іх за ногі, чаравікі цалую: «Людзі добрыя… міленькія… не магла яна кінуць Настачку… сваё сонейка… святло ў акне… Мі-і-і-ле-енькі-і-і-я…» Я білася лбом аб падлогу. Першыя хвіліны не верыш, хапаешся за паветра. Не памерла, а вернецца калекай. Без ног… сляпая… Нічога, будзем з Настачкай яе за рукі вадзіць. Галоўнае — жывая! Кагосьці хочацца пра гэта папрасіць… на каленях вымаліць…

Шмат-шмат людзей… поўны дом чужых людзей… Наколюць лекамі — я ляжу, ачомаюся — зноўку выклікаюць «хуткую». У мяне ў доме вайна… А ў людзей сваё жыццё. Ніхто чужое гора не разумее, дай Бог сваё зразумець. У-у-у… Усе думалі: я сплю, а я ляжала і слухала. Горка мне, горка…

«…У мяне двое сыноў. Яшчэ ў школе вучацца. Збіраю грошы, каб адкупіць іх ад арміі…»

«…Наш народ цярплівы — гэта дакладна. Чалавек — мяса… вайна — работа…»

«...Еўрарамонт нам уляцеў у капеечку. Добра, што італьянскую плітку раней купілі, яшчэ па старых коштах. Пластыкавыя вокны сабе паставілі. Браняваныя дзверы...»

«...А дзеці растуць... Парадуешся, пакуль яны маленькія...»

«...Там вайна і тут вайна... Кожны дзень страляюць. Падрываюць. Едзеш у аўтобусе — страшна, у метро баішся ўвайсці...»

«...У суседа сын быў беспрацоўны. Піў. Завербаваўся ў кантрактнікі. Праз год вярнуўся з Чачні з чамаданам грошай: машыну купіў, жонцы футра і залаты пярсцёнак. З'ездзілі сям'ёй у Егіпет... Цяпер без грошай ты — нуль. А дзе іх зарабіць?»

«...Раскрадаюць... дзяруць Расію на кавалкі... Вялікі пірог!»

Гэтая вайна паганая! Была яна дзесьці далёка... далёка... І прыйшла да мяне ў дом. Я Алесьцы крыжык павесіла... Не збярог. *(Плача.)*

Праз дзень нам яе прывезлі... Усё цякло... труна мокрая... Абціралі прасцінамі. Начальства: хутчэй... хутчэй... хутчэй трэба хаваць. «Не адчыняйце. Там — халадзец». А мы адчынілі. Усё спадзяваліся, што памылка. У тэлевізары перадалі: Алеся Нікалаева... дваццаць адзін год... Узрост няправільны. Раптам гэта іншая Алеся? Не наша. «Там — халадзец...» Выдалі нам даведку: «...наўмыснае самапашкоджанне стрэлам з табельнай зброі ў правую частку галавы...» Што мне паперка! Я сама хачу паглядзець, памацаць. Пагладзіць сваімі рукамі. Калі адчынілі: твар быў жывы, добры... і маленькая дзірачка на левым баку... Такая маленькая... зусім... ну, аловак увойдзе. Ізноў няпраўда, як і з узростам, дзірачка на левым баку, а пішуць — на правым. Паехала яна ў Чачню са зводным атрадам міліцыянераў з усёй Разані, а дапамагалі нам хаваць з аддзялення міліцыі, дзе яна служыла. Яе таварышы. І ўсе яны ў адзін голас: якое гэта самагубства? Гэта не самагубства, а стрэл прыкладна з двух-трох метраў... Стрэл?!

А начальства прыспешвала. Дапамагалі, штурхалі. Прывезлі яе позна ўвечары, а раніцай наступнага дня, а дванаццатай гадзіне, ужо пахавалі. На могілках... У-у-у... Сіла ў мяне была... у чалавека не можа быць такой сілы... Вечка труны прыб'юць, а я адарву, зубамі б цвікі грызла. Начальства на могілках не было. Адмовіліся ўсе ад нас... дзяржава першая... У царкве не захацелі адпяваць: грэшніца... Бог такую аблудную душу не прыме... Ну як так... Як жа так? Я цяпер у царкву хаджу... свечку пастаўлю... Падышла адзін раз да бацюшкі: «Хіба Бог толькі прыгожыя душы любіць? Калі так, то нашто Ён тады?» Распавяла яму ўсё... Я шмат разоў ужо пра гэта распавядала... *(Маўчыць.)* Бацюшка ў нас малады... Заплакаў: «Як вы яшчэ жывая і не ў вар'яцкім доме? Дай ёй, Госпадзе, Царства нябеснае!» Памаліўся за маю дзяўчынку... А людзі рознае казалі: праз мужыка дзеўка стрэліла. Сп'яну. Усім вядома, што п'юць яны там беспрабудна. І мужыкі, і бабы. Хапанула я гора... поўным ротам...

Алеська... Яна пакавала валізу... А мне хацелася ўсё таптаць, дзерці. Рукі сабе кусала, хоць звяжы рукі. Не магла спаць. Ламіла ўсе косткі, сутаргі па целе. Не сплю... і бачу сны нейкія... Вечны лёд, вечная зіма. Усё ў срабрыста-блакітным колеры... А то быццам яны з Настачкай ідуць і ідуць па вадзе, і ніяк не дабяруцца да берага. Адна вада... Настачку бачу, а Алеська хутка знікла з вачэй... Няма яе і няма... І ў сне я спалохалася: «Алеська! Алеська!» — клічу. З'яўляецца. Але не як жывая, а як партрэт... фотаздымак... і на левым баку ў яе сіняк. Акурат у тым месцы, дзе куля прайшла... *(Маўчыць.)* Гэта яна яшчэ толькі чамадан пакавала... «Мама, я еду. Я ўжо рапарт напісала». — «Ты адна выхоўваеш дзіця. Яны не маюць права цябе пасылаць». — «Мама, мяне звольняць, калі я не паеду. Ты ж ведаеш: у нас усё ў добраахвотна-прымусовым парадку. Але ты не плач... Там ужо не страляюць, а будуюць. А я буду ахоўваць. Паеду і зараблю, як іншыя». Дзяўчаты іхнія ўжо ездзілі, усё было нармальна. «У Егіпет цябе завязу,

піраміды паглядзім» — гэта мара ў яе была. Парадаваць хацела маму. Бедна мы жылі… з капейкі… Выйдзеш у горад — усюды рэклама: купі машыну… вазьмі крэдыт… Купляй! Толькі бяры! У кожнай краме стаіць пасярод залы — стол, а то і два — афармляй крэдыты. Каля сталоў заўсёды чарга. Людзі стаміліся ад галечы, усім захацелася пажыць. А я іншым разам не ведала, чым іх накарміць, бульба — і тая скончыцца. І макарона. На тралейбусны квіток не хапала. Пасля тэхнікума паступіла яна ў педагагічны інстытут на псіхолага, год правучылася — грошай няма плаціць. Адлічылі. У маёй мамы пенсія — сто доляраў, і ў мяне — сто доляраў. Наверсе… яны там нафту пампуюць і газ… але гэта не нам долары цякуць, а ім у кішэню. Простыя людзі, як мы, ходзяць па крамах і толькі глядзяць — як па музеях ходзяць. А з радыё, як шкодніцтва нейкае, спецыяльна, каб народ раззлаваць — любіце багатых! Багатыя нас выратуюць! Дадуць працу… Паказваюць, як яны адпачываюць, што ядуць… Дамы з басейнамі… Свой садоўнік, свой кухар… Як калісьці ў памешчыкаў… за царом… Паглядзіш увечары тэлевізар: якая гадасць — і кладзешся спаць. Раней шмат людзей галасавала за Яўлінскага і за Нямцова… Я грамадскай работніцай была, на ўсе выбары бегала. Патрыётка! Мне Нямцоў падабаўся, што малады і прыгожы. А потым усе ўбачылі — дэмакраты таксама хочуць добра жыць. Пра нас забыліся. Чалавек — пыл… пылінка… Народ зноў павярнуў да камуністаў… Пры іх ніхто мільярдаў не меў, ва ўсіх было патроху, усім гэтага хапала. Кожны адчуваў сябе чалавекам. Я была як усе.

Я — савецкі чалавек, і мая мама — савецкі чалавек. Будавалі сацыялізм з камунізмам. Дзяцей выхоўвалі: гандляваць сорамна, і не ў грашах шчасце. Будзь сумленным, а жыццё аддай Радзіме — гэта найдаражэйшае, што ў нас ёсць. Усё жыццё ганарылася, што я савецкі чалавек, а цяпер нібыта сорамна, быццам бы ты ўжо непаўнавартасная нейкая. Былі ідэалы камунізму — цяпер ідэалы капіталізму: «Не шкадуй нікога, бо

цябе не пашкадуюць». «Мама, — казала Алеська, — ты жывеш у краіне, якой даўно няма. Ты ні ў чым мне не можаш дапамагчы». Што з намі зрабілі? Што з намі… *(Спыняецца.)* Так шмат хачу вам сказаць! Так шмат! Але галоўнае што? Пасля смерці Алеські… Знайшла я ейны школьны сшытак з творам: «Што такое жыццё?». «Я малюю сабе ідэал чалавека… — пісала яна. — Мэта жыцця — гэта тое, што прымушае цябе падымацца ўгору…» Я яе гэтаму вучыла… *(Рыдае.)* Паехала на вайну… яна не здольная была забіць мыш… Усё было не так, як павінна быць, а як было — я не ведаю. Ад мяне хаваюць… *(Крычыць.)* Загінула мая дзяўчынка без следу. Так нельга! Маёй маме ў Айчынную вайну было дванаццаць гадоў, іх эвакуявалі ў Сібір. Дзеці… яны там працавалі на заводзе па шаснаццаць гадзін на суткі… як і дарослыя. За талон у сталоўку, дзе дадуць місу макароны і кавалачак хлеба. Хлебка! Выпускалі снарады для фронту. Паміралі каля сваіх станкоў ад таго, што яшчэ маленькія. Навошта людзі тады забівалі адно аднаго — яна разумела, а навошта цяпер забіваюць — не разумее. Ніхто не разумее. Гэтая вайна паганая! Аргун… Гудэрмес… Ханкала… Пачую — выключаю тэлевізар…

Даведачка ў мяне на руках: «…наўмыснае… стрэлам з табельнай зброі…». І Настачка засталася… дзевяць гадоў Настачцы… Я цяпер і бабуля, і мама. Уся хворая, хірургамі парэзаная. Тры аперацыі. Здароўя няма, ніякага здароўя няма, а адкуль яму быць? Вырасла я ў Хабараўскім краі. Тайга, тайга. Жылі ў бараках. Апельсіны і бананы бачылі толькі на малюнках. Елі макарону… Сухое малако і макарону… зрэдку тушонка ў бляшанках… Мама завербавалася на Далёкі Усход пасля вайны, калі моладзь паклікалі Поўнач асвойваць. Клікалі, як на фронт. На вялікія будоўлі ехалі адны галадранцы, як мы. У каго ні вала, ні кала. «Па туманы і па водары тайгі» — гэта з песень… з кніжак… а мы з голаду пухлі. Голад нас пагнаў на подзвігі. Я крыху падрасла і таксама пайшла на будоўлю… Будавала з мамай БАМ. І я маю медаль «За будаўніцтва

Байкала-Амурскай магістралі» і пачак грамат. *(Маўчыць.)* Узімку маразы пад пяцьдзясят градусаў, зямля прамярзала на метр. Белыя сопкі. Такія белыя пад снегам, што іх ужо не відаць і ў добрае надвор'е. Не адрозніш. Сопкі я ўсім сэрцам палюбіла. У чалавека ёсць вялікая Радзіма і маленькая радзімка. Дык вось там мая радзімка. У бараках сценкі тоненькія, прыбіральня на вуліцы... Але — маладосць! Верылі ў будучыню, заўсёды верылі... Жыццё, і праўда, з кожным годам паляпшалася: то ніхто не меў тэлевізара, ніхто! — і раптам яны з'явіліся. Жылі ў бараках... І раптам сталі даваць асобныя кватэры. Паабяцалі: «цяперашняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізме». Гэта я... я буду жыць пры камунізме?! *(Смяецца.)* Паступіла на завочнае аддзяленне ў інстытут, вывучылася на эканаміста. Грошай за вучобу не трэба было плаціць, як цяпер. Хто б мяне вывучыў? За гэта я ўдзячная савецкай уладзе. Працавала ў райвыканкаме ў фінансавым аддзеле. Набыла сабе мутонавае футра... добрую пуховую хустку... узімку захутаешся — адзін нос тырчыць. Па калгасах ездзіла з праверкамі, у калгасах разводзілі собаляў, пясцоў, норак. Ужо нядрэнна мы жылі. Я маме таксама футра набыла... Тут абвясцілі нам капіталізм... Паабяцалі, што камуністы сыдуць і ўсім будзе добра. Народ у нас недаверлівы. Горам навучаны. Людзі адразу пабеглі купляць соль і запалкі. «Перабудова» гучала, як «вайна». На нашых вачах сталі раскрадаць калгасы... заводы... А потым скупілі іх за капейкі. Мы ўсё жыццё будавалі, а яно пайшло за грош. Народу далі ваўчары... падманулі... Ляжаць яны ў мяне і цяпер у серванце. Даведачка на Алеську... і гэтыя паперкі... Ці гэта капіталізм ці што? На рускіх капіталістаў я нагледзелася, не ўсе яны былі рускія, і армяне былі, і ўкраінцы. Бралі вялікія крэдыты ў дзяржавы і грошай не вярталі. У гэтых людзей блішчалі вочы. Як у зэкаў. Характэрны такі бляск, мне добра вядомы. Там паўсюль лагеры і дрот. Хто Поўнач асвойваў? Зэкі і мы, басота. Пралетарыят. Але мы пра сябе тады так не думалі...

Мая мама вырашыла… Выйсце было адно — вяртаемся ў Разань. Туды, адкуль мы родам. Пад вокнамі ўжо стралялі — СССР дзялілі. Хапалі… рвалі… Бандыты сталі гаспадарамі, а разумныя — дурнямі. Мы ўсё пабудавалі і гэтым бандытам аддалі… Так атрымліваецца? Самі з'ехалі з пустымі рукамі, са сваімі хатнімі манаткамі. А ім заводы пакінулі… руднікі… Ехалі на цягніку два тыдні, везлі з сабой: лядоўню, кніжкі, мэблю… мясарубку, посуд… усё такое… Два тыдні я ў акно глядзела: няма рускай зямлі ні канца, ні краю. Надта «вялікая і багатая» Расія-матухна, каб навесці ў ёй парадак. Гэта было ў дзевяноста чацвёртым годзе… Ужо пры Ельцыне… Што нас чакала дома? Дома настаўнікі ў азербайджанцаў-гандляроў падпрацоўвалі, садавіну прадавалі, пельмені. У Маскве рынак — ад вакзала да Крамля. Жабракі аднекуль адразу з'явіліся. А мы ўсе савецкія! Савецкія! Усім было доўга сорамна. Няёмка.

…На гарадскім рынку я разгаварылася з адным чачэнцам… Пятнаццаць гадоў, як у іх вайна, і яны тут ратуюцца. Распаўзаюцца па Расіі… па розных кутках… А быццам вайна… Расія з імі ваюе… «спецаперацыя»… Што гэта за вайна такая? Малады быў чачэнец: «Я, мамаша, не ваюю. У мяне жонка — руская». А я чула гісторыю… магу і вам расказаць… Чачэнская дзяўчына закахалася ў рускага лётчыка. Прыгожага хлопца. На ўзаемную згоду, яны дамовіліся — выкраў ён яе ў бацькоў. Завёз у Расію. Пабраліся. Усё як мае быць. Нарадзілі хлопчыка. Але яна плакала і плакала, ёй было шкада сваіх бацькоў. І яны напісалі ім ліст: даруйце, маўляў, нам… мы кахаем адно аднаго… Прывітанне ад рускай мамы перадалі. А ўсе гэтыя гады родныя браты гэтую чачэнку шукалі, хацелі забіць, бо яна зганьбіла іх сям'ю — выйшла замуж за рускага, мала, што ён рускі, дык ён яшчэ іх бамбіў. Забіваў. Адрас на канверце яны знайшлі хутка… Адзін брат яе зарэзаў, а другі потым прыехаў, каб дадому забраць. *(Маўчыць.)* Гэтая вайна паганая… гэтая бяда… прыйшла да мяне ў дом. Я цяпер усё

збіраю… усё пра Чачню чытаю, дзе знайду. Распытваю… Я хацела б туды паехаць. І каб мяне там забілі. *(Плача.)* Я была б шчаслівая. Такое маё шчасце матчына… Ведаю адну жанчыну… Ад сына чаравіка не знайшлі, снарад проста ў яго трапіў. «Я была б шчаслівая, — прызналася яна мне, — калі б ён у роднай зямлі ляжаў. Хоць бы кавалачак…» Гэта ўжо для яе было б шчасцем… «Мамаша, ці ў цябе ёсць сын?» — спытаў у мяне гэты чачэнец. — «У мяне сын ёсць, але ў мяне дачка загінула ў Чачні». — «Рускія, я хачу ў вас запытацца, што гэта за вайна? Вы забіваеце нас, калечыце, а потым лечыце ў сваіх бальніцах. Бамбіце і рабуеце нашы дамы, а потым іх будуеце. Угаворваеце, што Расія — наш дом, а мне кожны дзень праз маю чачэнскую фізіяномію трэба даць міліцыі хабар, каб яны мяне не забілі да смерці. Не абрабавалі. Я іх пераконваю, што не прыйшоў сюды забіваць і не хачу падарваць іх дом. Мяне маглі забіць у Грозным… але могуць забіць і тут…»

Пакуль б'ецца маё сэрца… *(У роспачы.)* Я буду шукаць. Хачу ведаць, як загінула мая дачка. Я нікому не веру.

*Адчыняе дзверцы серванта, дзе побач з крышталёвымі чарачкамі ляжаць дакументы і фотаздымкі. Бярэ і раскладвае іх на стале.*

Дзеўка ў мяне была прыгожая… Завадатарка ў школе. Любіла на каньках катацца. Вучылася пасрэдна… нармальна… У дзясятым класе закахалася ў Ромку… Я, вядома, супраць, ён старэйшы за яе на сем гадоў. «Мама, а калі гэта каханне?» Каханне было шалёнае, ён ёй не тэлефануе, дык яна сама… «Навошта ты тэлефануеш?» — «Мама, а калі гэта каханне?» Толькі Ромка, адзін ён у яе ў вачах. Пра маму забылася. Сёння выпускны баль, а назаўтра яны ўжо распісаліся. Ужо дзіцятка. Ромка піў, біўся, а яна плакала. Я яго ненавідзела. Год яны так пажылі. Рэзаў рэчы на ёй добрыя, раўнаваў. Возьме за валасы, наматае на рукі — і галавой аб сценку. Трывала яна, трывала… Маму не слухалася. Пакуль… Усё ж… Не ведаю як… Усё ж яна ўцякла ад яго. Куды? Да мамы… «Мама, ратуй!» Дык

ён узяў і прыйшоў да нас жыць. Уначы прачнулася... усхліпы нейкія... Адчыняю ванны пакой, а ён стаіць над ёй з нажом... Я схапіла гэты нож, парэзала сабе рукі. Іншы раз дастаў нейкі пісталет, газавы, думаю, не сапраўдны. Я ад яго Алеську цягну, а ён на мяне гэты пісталет: «Цяпер ты змоўкнеш!» Плакала і плакала, пакуль яны не разышліся. Я яго выгнала... *(Маўчыць.)* Прайшло... ну, паўгода не прайшло... Вяртаецца з працы: «Ромка ажаніўся». — «А ты адкуль ведаеш?» — «Падвёз мяне ў горадзе». — «І што?» — «А нічога». Ажаніўся ён хутка. А ў яе гэта было дзіцячае каханне. Незабыўнае. *(Бярэ лісток у стосіку дакументаў.)* Судмедэксперт напісаў: стрэл у правую частку галавы, а дзірачка была на левым баку. Маленькая дзірачка... Можа быць, ён яе мёртвую і не бачыў? Яму загадалі так напісаць. Добра заплацілі.

Я спадзявалася... Чакала, калі вернецца ейны атрад. Распытаю іх... аднаўлю карціну... Дзірачка на левым баку, а пішуць — на правым. Мне трэба ведаць... Ужо зіма. Снег. Калісьці я любіла снег. І Алеська мая любіла, дастане загадзя канькі, змажа тлушчам. Калісьці даўно... даўно-даўно гэта было. Горка мне, горка... Гляджу ў акно: людзі рыхтуюцца да Раства, бягуць з падарункамі, цацкамі. Нясуць ялінкі. А ў мяне на кухні ўвесь час працуе прыёмнік. Слухаю нашае радыё. Мясцовыя навіны. Чакаю. Нарэшце, дачакалася паведамлення: «Разанскія міліцыянеры вярнуліся са службовай камандзіроўкі ў Чачню», «нашы землякі з гонарам выканалі свой салдацкі доўг», «не пасаромілі»... Іх урачыста сустрэлі на вакзале. Аркестр, кветкі. Уручылі ўзнагароды і каштоўныя падарункі. Каму тэлевізар, каму наручныя гадзіннікі... Героі... Героі вярнуліся! Пра Алеську ні слова, ніхто не ўспомніў... Я чакаю... трымаю прыёмнік каля самага вуха... Павінны ўспомніць! Пачалася рэклама... рэклама пральнага парашка... *(Заплакала.)* Знікла мая дзяўчынка без следу. Так нельга! Алеська... Яна была першая... першая «чачэнская» труна ў горадзе... Праз месяц прывезлі яшчэ дзве труны — адзін міліцыянер больш сталы, другі

зусім малады. З імі народ развітваўся ў тэатры... у гарадскім тэатры імя Ясеніна. Ганаровая варта. Вянок ад грамадскасці, ад мэра... Прамовы. Пахавалі іх на алеі Герояў, дзе «афганскія» хлопчыкі ляжаць... цяпер і «чачэнскія»... На могілках у нас дзве алеі — алея Герояў і яшчэ адна — людзі яе называюць алеяй бандытаў. Бандыты ваююць паміж сабой, пастрэльваюць. Перастройка — перастрэлка. У бандытаў самыя лепшыя месцы на могілках. Труны з чырвонага дрэва, інкруставаныя пад золата, з электроннай лядоўняй. Не помнікі, а курганы славы. Героям помнікі ставіць дзяржава. Салдацкія — ну, сціплыя помнікі. І тое не ўсім. Кантрактнікам — адмова. Ведаю, што адна маці пайшла ў ваенкамат, ёй адмовілі: «Твой сын за грошы ваяваў». Мая Алеська... яна ляжыць асобна ад усіх, яна ж проста самагубца... У-у-у... *(Не можа гаварыць.)* Наша Настачка... Пенсію за маму ёй прызначылі паўтары тысячы рублёў — пяцьдзясят долараў на месяц. Дзе праўда? Справядлівасць? Пенсія маленькая, бо ейная мама — не герой! Вось калі б мама забіла кагосьці, узарвала гранатай... А мама забіла саму сябе, больш нікога яна не забіла... Не герой! Як гэта растлумачыць дзіцяці? Што я ёй скажу? У адной газеце працытавалі быццам бы Алесьчыны словы: «Маёй дачцэ не будзе сорамна за мяне...» Першыя дні пасля пахавання... Настачка сядзела нібы адсутная, быццам яе няма ці яна не ведае, дзе яна. Ніхто не мог наважыцца... Гэта я ёй сказала: «Алеські... мамачкі тваёй няма...» Яна стаяла і нібы не чула мяне, я плакала, а яна не плакала. І пасля... я згадаю што-небудзь пра Алеську... а яна як не чуе. Доўга так працягвалася, мяне гэта нават пачало злаваць. Вадзіла яе да псіхолага. Сказалі: нармальнае дзіця, але моцна ўзрушанае. Былі мы і ў ейнага таты. Пытаюся ў яго: «Ты забіраеш дзіця?» — «А куды я яе забяру?» У яго ўжо там, у другой сям'і, дзіця. «Тады адмаўляйся». — «Як гэта? А раптам мне ў старасці нешта трэба будзе. Капейка якая...» Такі ў нас татачка... Дапамогі нам ад яго няма. Адны Алесьчыны сябры наведваюць... У дзень нараджэння Настачкі

заўсёды збяруць і прынясуць крыху грошай. Камп'ютар купілі. Сябры памятаюць.

Доўга я чакала званка. Атрад вярнуўся — і камандзір, і тыя хлопцы, з кім яна там была. Патэлефануюць… Абавязкова! Маўчыць тэлефон… І я сама пачала шукаць прозвішчы, нумары тэлефонаў. Камандзір атрада Клімкін… Прачытала ў газеце ягонае прозвішча. Усе! Усе газеты пра іх пісалі — рускія волаты! Разанскія віцязі. І нават у адной газеце была ягоная нататка, што ён дзякуе атраду за добрую службу. Выканалі, маўляў, заданне з гонарам… Яшчэ і з гонарам… Тэлефаную ў аддзел міліцыі, дзе ён працуе: «Запрасіце, калі ласка, маёра Клімкіна» — «Хто яго пытаецца?» — «Людміла Васільеўна Нікалаева… маці Алесі Нікалаевай…» — «Няма на месцы… Заняты… У ад'ездзе». Ты камандзір… Ты сам прыйдзі да маці і раскажы, як там было. Суцеш. Падзякуй. Я так разумею… *(Плача.)* Плачу, але слёзы мае злосныя… Я Алеську не пускала, прасіла не ехаць, а мая мама: «Калі трэба, няхай едзе». Трэба! Я цяпер ненавіджу гэтае слова! Ужо я не тая… А за што мне Радзіму любіць? Нам абяцалі, што дэмакратыя — гэта калі ўсім добра. Паўсюль справядліва. Сумленна. Падман усё гэта… Чалавек — пыл… пылінка… Адно, што цяпер у крамах усяго поўна. Бяры! Бяры! Пры сацыялізме гэтага не было. Вядома, я — простая савецкая жанчына… Ніхто мяне ўжо не слухае, таму што грошай у мяне няма. Былі б грошы — іншая размова. Яны б мяне баяліся… начальнічкі… Цяпер грошы кіруюць…

Алеська з'язджала… Цешылася: «Разам з Кормчай едзем». Яны ўдзвюх былі, дзве жанчыны ў атрадзе. Вольга Кормчая… Я яе бачыла на вакзале, калі развітваліся. «Гэта — мая мама», — сказала Алеська. Быў момант на праводзінах… Можа быць, цяпер я гэтаму надаю значэнне. Пасля ўсяго. Аўтобусы вось-вось скрануцца… Зайгралі гімн — усе заплакалі. Я стаяла з аднаго боку і чагосьці перабегла на другі, нешта Алеська мне праз акно крыкнула, і я зразумела яе так, што яны будуць паварочваць. І я перабегла, каб яшчэ раз яе

ўбачыць. Памахаць рукой. А яны паехалі наўпрост, і я яе не ўбачыла. Зашчымела сэрца. Ручка ад сумкі ў яе адарвалася ў апошні момант... Можа быць, гэта я цяпер так сябе накручваю... Крывіначка мая... *(Плача.)* Знайшла ў даведцы тэлефон Кормчай... Тэлефаную: «Я — мама Алесі... Хачу з вамі сустрэцца». Яна доўга маўчала, а потым нават з нейкай крыўдай, з нейкай злосцю: «Я столькі перажыла... Калі вы ўсе адчэпіцеся ад мяне!» Паклала слухаўку. Другі раз тэлефаную: «Прашу! Мне трэба ведаць... Малю!» — «Хопіць мяне мучыць!» Яшчэ раз патэлефанавала, напэўна, праз месяц... Да тэлефона падышла ейная мама: «Дачкі няма дома. З'ехала ў Чачню». Зноў! У Чачню?! Разумееце, і на вайне нехта можа добра ўладкавацца. Каму як пашанцуе... Чалавек пра смерць не думае, памерці сёння страшна, а калі-небудзь — нічога. Усе яны за тыя паўгода, што там былі, атрымалі па шэсцьдзесят тысяч рублёў. На патрыманы аўтамабіль хопіць. Ну і заробак захаваўся. А Алеська ўзяла перад ад'ездам у крэдыт пральную машыну... мабільнік... «Прыеду і расплачуся», — казала. Цяпер нам плаціць. З чаго? Прыходзяць квітанцыі... складаем... У Настачкі старыя красоўкі, яны ёй маленькія, вернецца са школы і плача, пальчыкі баляць. Складаем, складаем з мамай свае пенсіі, грошы лічым, лічым, і нічога да канца месяца не застаецца. А мёртвага не дагукаешся...

Два чалавекі былі з ёй у апошні момант... Два сведкі. Кантрольна-прапускны пункт... ка-пэ-пэ... будачка — два на два з паловай метры. Начное дзяжурства. Іх было трое. Першы... «Ну, прыйшла яна, — распавёў па тэлефоне, — пагаварылі дзве-тры хвіліны...» І ён нібыта адышоў, ці то па патрэбе, ці то яго нехта паклікаў. Пачуў за дзвярыма — пляск, нават спачатку не падумаў, што стрэл. Вярнуўся, а яна ляжыць. Настрой? Які ў яе быў настрой? Настрой быў добры... нармальны быў настрой... «Прывет». — «Прывет». Пасмяяліся. Хі-хі... ха-ха... Другі сведка... І гэтаму тэлефаную на працу... на асабістую сустрэчу не прыйшоў, а мяне да яго не дапусцілі... Ён быў

побач, калі яна страляла, але быццам бы ў той самы момант адвярнуўся. У тую секунду… Будачка — два на два з паловай метры, а ён нічога не бачыў. Вы паверыце? Я вымольвала ў іх: скажыце… мне трэба ведаць… Я больш нікуды з гэтым не пайду. Заклінаю! Бегалі ад мяне, як абвараныя. Ім загадалі маўчаць. Абараняць пагоны. Заткнулі ім раты доларамі… *(Рыдае.)* З самага пачатку, калі яна пайшла на працу ў міліцыю, мне не падабалася: мая Алеська — міліцыянер? Ну не падабалася! Ніяк не падабалася… Тут такое… Адукацыя ў яе — тэхнікум і адзін курс інстытута. Доўга не магла ўладкавацца на працу. А ў міліцыю яе адразу бралі. Мне было страшна… Міліцыя — гэта бізнэс… мафія… Міліцыянераў людзі баяцца, у кожнай сям'і хтосьці пацярпеў ад міліцыі. І катуюць у нашай міліцыі, і калечаць. Баяцца іх, як бандзюгаў. Не дай бог! У газетах чытаеш: пярэваратні ў пагонах… там згвалцілі… там забілі… Такога… у савецкі час… Вы што? А калі і было… Дык шмат не казалі… не пісалі… І мы адчувалі сябе абароненымі. *(Задумалася.)* Палова міліцыянераў ваявала. Ці ў Афгане, ці ў Чачні. Забівалі. Псіхіка ў іх пашкоджаная. Ваявалі там яны і з мірным насельніцтвам. Цяпер такія войны: салдаты не толькі паміж сабой ваююць, але і з цывільнымі. Са звычайнымі людзьмі. Для іх усе — ворагі: мужчыны, жанчыны, дзеці. І тут, ужо дома, заб'юць чалавека, а потым здзіўляюцца, што гэта трэба тлумачыць. У Чачні тлумачыць не трэба было… «Мама, — спрачалася са мной Алеська, — ты не маеш рацыі. Усё залежыць ад чалавека. Дзяўчына-міліцыянер — гэта прыгожа. Сіняя кашуля, пагоны».

У апошні вечар прыйшлі да яе сябры развітацца… Цяпер успамінаю… усё я цяпер успамінаю… Усю ноч яны прагаварылі…

«…Расія — вялікая краіна, а не газавая труба з кранікам…»

«…Крыму няма… аддалі… Чачня ваюе… Татарстан варушыцца… Я хачу жыць у вялікай краіне. Нашы "МІГі" дойдуць да Рыгі…»

«...Мордай аб стол Расію! А чачэнскія бандыты — героі... Правы чалавека?! А там: прыходзілі ў рускі дом з аўтаматамі — або заб'ём, або сыходзь. Добры чачэнец той, хто спачатку кажа: "Сыходзь!", а потым забівае, дрэнны — забівае адразу. Чамадан, вакзал, Расія. Надпісы на платах: "Не купляйце кватэры ў Машы, яны ўсё адно будуць нашы", "Рускія, не з'язджайце — нам патрэбныя рабы"».

«...Двое рускіх салдат і афіцэр трапілі да чачэнаў у палон. Салдатам адрэзалі галовы, а афіцэра адпусцілі: "Ідзі і вар'яцей". Я на касетах бачыў... Абразаюць вушы, пальцы адсякаюць... У сутарэннях — рускія рабы-палонныя. Звяры!»

«...Паеду! Мне на вяселле грошы патрэбныя. Хачу ажаніцца. Дзяўчына прыгожая... доўга чакаць не будзе...»

«...У мяне сябар... Мы з ім у арміі разам служылі. Жыў ён у Грозным. Сусед — чачэнец. У адзін цудоўны дзень ён яму кажа: "Прашу цябе — з'язджай!" — "Чаму?" — "Таму што мы вас хутка рэзаць будзем". Пакінулі яны там трохпакаёвую кватэру, жывуць цяпер у Саратаве ў інтэрнаце. Нічога не далі ім забраць: "Няхай Расія, — крычалі, — вам усё новае купіць. А гэта — наша!"»

«...Упала на калені Расія, але яшчэ не дабітая. Мы — рускія патрыёты! Трэба доўг Радзіме аддаць! Анекдот: таварышы салдаты і афіцэры, калі вы добра праявілі сябе ў Чачні, то Радзіма пашле вас "на адпачынак" у Югаславію. У Еўропу... тваю маць!»

Сын трываў, трываў і не вытрываў. Стаў на мяне сварыцца: «Мама, нічога ты не даможашся, акрамя інсульту». Адправіў у санаторый. Сіламоц, можна сказаць, са скандалам. У санаторыі я пасябравала з добрай жанчынай, у яе дачка рана памерла ад аборту, мы разам плакалі. Сталі сяброўкамі. Нядаўна патэлефанавала ёй — яна памерла. Заснула і памерла. Я ведаю, што ад тугі яна памерла... Чаму я не паміраю? Я шчаслівая была б памерці, але я не паміраю. *(Плача.)* Вярнулася з санаторыя... «Дзетачка, яны цябе пасадзяць, — першыя маміны словы. — Не даруюць, што праўды дамагаешся».

Што было… Толькі я ад’ехала, ёй тэлефануюць з міліцыі: «Цягам дваццаці чатырох гадзін з’явіцца ў кабінет нумар… За няяўку — штраф… пятнаццаць сутак арышту…» Мама — чалавек напалоханы, у нас усе людзі напалоханыя. Знайдзіце мне старога не напалоханага чалавека. І не толькі гэта… Прыходзілі і апытвалі суседзяў: што мы за людзі… якія паводзіны… Пра Алеську дапытваліся: ці бачыў яе хто-небудзь нападпітку? А наркотыкі… З паліклінікі запатрабавалі нашы медычныя карткі. Правяралі: ці не быў хто на ўліку ў псіхдыспансеры? Мяне крыўда за душу ўзяла! І злосць! Бяру слухаўку… Тэлефаную ў міліцыю: «Хто пагражаў маёй маме… чалавеку дзявяты дзясятак… Па якім пытанні выклікалі?» Скончылася гэта тым, што праз дзень яны мне даслалі позву: «У кабінет нумар… прозвішча следчага…» Мама ў слязах: «Цябе пасадзяць». Мяне ўжо нічога не страшыць. Цьху на іх! Трэба, каб Сталін з труны ўстаў! Я прашу яго ўстаць з труны! Гэта мая малітва… Мала ён нашых начальнічкаў саджаў і расстрэльваў. Мала! Мне іх не шкада. Я хачу іх слёз! *(Плача.)* Прыйшла я ў гэты кабінет… прозвішча Федзін… Рубанула з парога: «Што вы ад мяне хочаце? Дачку ў мокрай труне прывезлі… Мала вам?» — «Вы — непісьменная жанчына. Не разумееце, дзе вы знаходзіцеся. Тут пытанні задаем мы…» Спачатку ён быў адзін… потым выклікаў Алесьчынага камандзіра… Клімкіна… Нарэшце і я яго ўбачу! Ён заходзіць… Я — да яго: «Хто забіў маю дачку? Скажыце мне праўду…» — «Дур-ра ваша дачка… Ненармальная!» Ой, не магу! Не магу… Наліўся ўвесь крывёй… Крычаў, тупаў. Ой! Правакавалі мяне… Дамагаліся, каб я зараўла або драпалася, як котка. Значыць, я — вар’ятка, і дачка ў мяне — вар’ятка. Іх мэта — закрыць мне рот… У-у-у…

Пакуль сэрца маё б’ецца… буду шукаць праўду… Нікога не баюся! Я ўжо не падцірка, не кузурка. Мяне назад у пушачку не загоніш. Мне дачку ў мокрай труне прывезлі…

Ехала ў прыгараднай электрычцы… Сеў насупраць мужчына: «Ну што, маці, едзем? Давай знаёміцца…» Назваўся: «Былы

афіцэр, былы прадпрымальнік-адзіночка, былы “яблычнік”. Цяпер беспрацоўны». А ў мяне пра што хто ні спытае, я пра сваё: «А ў мяне дачка загінула ў Чачні… малодшы сяржант міліцыі…» Ён папрасіў: «Раскажы мне…» Я шмат разоў ужо пра гэта распавядала… *(Маўчыць.)* Паслухаў і пра сваё пачаў…

«…Я сам там быў. Вярнуўся, і жыццё ў мяне тут не атрымліваецца. Не магу запхнуць сябе ў гэтыя рамкі. На працу не хочуць браць: “А-а-а… з Чачні?” Я баюся іншых людзей… мне моташна ад іншых людзей… А сустрэну таго, хто ваяваў у Чачні, — ён мне брат…

…Стаіць стары чачэнец і глядзіць: нас поўная машына дэмбеляў. Глядзіць і думае: нармальныя рускія хлопцы, а толькі што былі аўтаматчыкі, кулямётчыкі… снайперы… Курткі на нас новенькія, джынсы. На што купілі? На тое, што тут зарабілі. Праца якая? Вайна… Страляеш… А там і дзеці, і прыгожыя жанчыны. Але забяры ў салдатаў зброю, пераапрані іх у цывільнае… гэта ўжо трактарысты, кіроўцы аўтобусаў, студэнты…

…Жылі за дротам… Вакол вышкі і мінныя палі. Цесны замкнёны свет. Зона. Выйсці нельга — заб’юць. Смерць акупантам! Пілі ўсе, напіваліся да быдлячага стану. Дзень пры дні бачыш разбітыя дамы, як цягнуць рэчы, забіваюць людзей. І з цябе раптам такое прэ! Пашыраецца ўсё… усё, што ты можаш… Можна шмат што сабе дазволіць… Ты — п’яная скаціна і ў цябе зброя ў руках. У галаве — адзін сперматазоід…

…Работа катаўская… Паміралі за мафію, якая нам яшчэ й не плаціла. Падманвала. Але я ж не тут, не на вуліцы забіваў людзей, а на вайне. Я бачыў рускую дзяўчыну, якую гэтыя шакалы згвалтавалі. Прыпякалі цыгарэтай грудзі, каб мацней стагнала…

…Прывёз грошы… Папіў з сябрамі гарэлкі, купіў патрыманы “мерседэс”…»

*(Ужо не выцірае слёз.)* Дык вось дзе мая Алеська была… Куды трапіла… Гэтая вайна паганая… Была яна недзе далёка-далёка, а цяпер у маім доме. Два гады… Грукаюся ў дзверы,

хаджу па розных інстанцыях. Пішу ў пракуратуру… раённую, абласную… Генеральнаму пракурору… *(Паказвае на стос лістоў.)* Атрымліваю адпіскі… Гара адпісак! «Па факце гібелі вашай дачкі паведамляем…» І ўсе хлусяць: загінула трынаццатага лістапада, а насамрэч адзінаццатага, група крыві першая, а ў яе трэцяя, то яна была ў вайсковым абмундзіраванні, то ў цывільнай сукенцы. Дзірачка з левага боку каля скроні, а яны пішуць — з правага… Напісала запыт нашаму дэпутату ў Дзярждуму — я яго выбірала, я за яго галасавала. Я верыла нашай уладзе! Дамаглася да яго на прыём. Стаю на першым паверсе ў Дзярждуме… І вочы ў мяне робяцца як яблыкі! Бачу ювелірны салон: залатыя пярсцёнкі з дыяментамі, залатыя і срэбныя велікодныя яйкі… і падвескі… За ўсё жыццё я столькі не зарабіла, колькі там каштуе самы меншы пярсцёнак з дыяментам. Адзін пярсцёнак… Нашы дэпутаты… народныя… адкуль у іх такія грошы? Пачак грамат за сумленную працу ў мяне… і ў мамы… А ў іх акцыі Газпрома… У нас — паперкі, а ў іх — грошы. *(Злосна маўчыць.)* Дарэмна я туды хадзіла… дарэмна там плакала… Сталіна вярніце… Народ чакае Сталіна! Забралі ў мяне дачку і прывезлі труну. Мокрую труну… І ніхто не хоча пагаварыць з маці… *(Плача.)* Я цяпер сама ў міліцыі магу працаваць… Агляд здарэння, пратакол злачынства. Калі гэта самагубства, дык на пісталеце застаецца кроў… на руках порах… Я ўсё цяпер ведаю… Навіны ў тэлевізары не люблю. Хлусня! А дэтэктывы… забойствы… ну, такое ўсё… не прапускаю. Раніцай, бывае, падняцца не магу, ногі, рукі адымаюцца — ляжала б… Успомню Алеську… Падымаюся і іду…

Па кавалачках сабрала… па слоўцы… Хтосьці п'яны прагаварыўся, іх жа там было семдзесят чалавек, хтосьці знаёмым нашаптаў. Горад наш невялікі… не Масква… Сёння я ўжо ўяўляю карціну… што там адбывалася… Была ў іх грандыёзная п'янка ў гонар Дня міліцыі. Набухаліся да непрытомнасці і ўчынілі бардак. Калі б Алеська паехала са сваімі хлопцамі… са свайго аддзела, а то ўсе чужыя… Зводны атрад. Трапіла яна

да даішнікаў. Даішнікі — каралі, грошай у іх поўныя кішэні. Стаяць на дарогах з аўтаматамі і здымаюць даніну. Усе ім плацяць. Залатое месца! Хлопчыкі любяць павесяліцца… Забіць, напіцца і трахнуць — тры радасці на вайне. У зюзю яны напіліся, набраліся да калючага дроту ў вачах… азвярэлі… І быццам там усіх дзяўчат гвалцілі. Сваіх дзяўчат. А Алеська ці то не далася, ці то яна іх пасля прыстрашыла: «Я вас усіх пасаджу». І ёй не далі сысці.

Кажуць і іншае… Стаялі яны на пасту, прапускалі машыны. Там усе круцяцца, верцяцца, бегаюць, як ненармальныя, каб зарабіць. Любымі сродкамі. Хтосьці правозіў кантрабанду, што і адкуль — не скажу, хлусіць не буду. Наркотыкі ці… Але ўсё ў іх было дамоўлена. Аплачана. Гэта была машына «Ніва»… усе нейкую «Ніву» ўспамінаюць… А Алеська заўпарцілася… чамусьці яна гэтую машыну не прапускала… І ў яе стрэлілі. Перакрыла яна вялікія грошы, камусьці перашкодзіла. Нібыта да гэтай справы датычны высокі чын…

І маёй маме ў сне «Ніва» прыснілася… Да варажбіткі я пайшла… паклала на стол вось гэты фотаздымак… *(Паказвае.)* «Бачу — сказала яна, — нейкую “Ніву”»…

…Разгаварылася з адной жанчынай… Яна — медсястра. Не ведаю, якая яна была, калі паехала ў Чачню, можа, вясёлая. А цяпер — злосная, як і я, злосная. Цяпер шмат людзей пакрыўджаных, яны маўчаць, але яны пакрыўджаныя. Усе марылі выйграць у новага жыцця, а мала хто выйграў, выцягнуў шчаслівы квіток… Ніхто не рыхтаваўся ўпасці на дно. З крыўдай цяпер людзі жывуць, у многіх крыўда. *(Маўчыць.)* А можа, і Алеська б іншая прыехала… незнаёмая… У-у-у… *(Маўчыць.)* Гэтая жанчына была са мною шчырая…

«…Па рамантыку ехала! З мяне доўга ўсе там хіхікалі. А калі шчыра — праз няшчаснае каханне ўсё дома кінула. Мне было ўсё адно — чачэнец мяне застрэліць ці я ад тугі памру.

…Хто з трупамі не сутыкаўся, думае, што яны маўчаць. Бязгучныя. А там увесь час нейкія гукі. Дзесьці паветра выйшла,

дзесьці костка ўнутры хруснула. Нейкі шоргат. Звар'яцець можна...

...Я не бачыла там мужчын, якія не п'юць і не страляюць. Нап'юцца і страляюць — куды хочаш. Навошта? Ніхто не адкажа.

...Ён быў хірург... Я думала: у нас каханне. Перад тым, як нам вяртацца дадому, ён заявіў мне: "Не тэлефануй і не пішы. Калі дома гуляць, дык з прыгожай жанчынай, з якой не сорамна трапіць на вочы жонцы". Я — не прыгажуня. Але мы з ім па трое сутак у аперацыйнай стаялі. Гэта такое пачуццё... мацнейшае за каханне...

...Я цяпер мужчын баюся... З тымі, хто прыйшоў з вайны, я нічога не магу... Казлы яны! Усе казлы! Збіралася дадому... і тое хачу з сабой узяць, і гэта... Магнітафон, дыван... "А я, — сказаў начальнік шпіталя, — усё тут пакіну. Не хачу везці вайну дадому". Мы вайну не з рэчамі, а ў душы прывезлі...»

Перадалі нам Алесьчыны рэчы: бушлат, спаднічку... Аддалі залатыя завушніцы, ланцужок. У кішэні бушлата ляжалі арэшкі і дзве маленькія шакаладкі. Да Раства, відаць, збірала і хацела з кім-небудзь дадому перадаць. Горка мне, горка...

Ну напішаце вы праўду... А каму ад гэтага страшна? Улада, яна цяпер недаступная... Адно нам засталося: стрэльба і забастоўка. Легчы на рэйкі. Але няма правадыра... людзі даўно падняліся б... Пугачова няма! Калі мне дадуць зброю, я ведаю, у каго страляць... *(Паказвае газету.)* Чыталі? Ёсць турыстычны тур у Чачню. На вайсковых верталётах вязуць і паказваюць разбураны Грозны, спаленыя вёскі. Там вайна і будоўля ідуць адначасна. Страляюць і будуюць. І паказваюць. Мы яшчэ плачам, а хтосьці ўжо гандлюе нашымі слязьмі. Страхам. Гандлююць, як нафтай.

*Праз некалькі дзён мы зноў сустрэліся.*

Раней я разумела наша жыццё... тое, як мы жылі... А цяпер не разумею... не...

## Пра цемру нячыстую і «іншае жыццё, якое можна зрабіць з гэтага»

*Алена Раздуева — рабочая, 37 гадоў*

*Для гэтай гісторыі я доўга не магла знайсці сабе «праваднікá», апавядальніка ці суразмоўцу, — нават не ведаю, як мне называць тых, з чыёй дапамогай падарожнічаю па чалавечых сусветах. Па нашым жыцці. Усе адмаўляліся: «гэты выпадак — для псіхіятра», «праз свае хворыя фантазіі маці кінула траіх дзяцей — тут суд мусіць разбірацца, а не пісьменнік». — «А Медэя? — пыталася я. — Як жа Медэя, якая забіла ўласных дзяцей дзеля кахання?» — «Гэта — міф, а ў вас рэальныя людзі». Але рэальнасць — гэта не гета для мастака. Гэта таксама вольны свет.*

*Потым я даведалася, што пра маю гераіню ўжо зняты фільм «Пакуты» (студыя «Фішка-фільм»). Мы сустрэліся з рэжысёрам фільма Ірынай Васільевай. Размаўлялі, пракручвалі касету з фільмам, зноў размаўлялі.*

*З аповеду кінарэжысёра Ірыны Васільевай*

— Мне расказалі… І мне гэтая гісторыя не спадабалася, я спалохалася. Мяне пераконвалі, што гэта будзе неверагодны фільм пра каханне, трэба ехаць і неадкладна здымаць. Вельмі руская гісторыя! Жанчына, у якой муж і трое дзяцей, закахалася ў зэка, ды яшчэ ў «вечніка», асуджанага за асабліва жорсткае забойства на пажыццёвае зняволенне, дзеля яго яна кінула ўсё — мужа, дзяцей, дом. Але нешта мяне спыняла…

На Русі катаржнікаў спакон веку любяць — яны грэшнікі, але і пакутнікі таксама. Ім неабходныя падтрымка і суцяшэнне. Цэлая культура жаласці, яна дбайна захоўваецца, асабліва ў вёсках і мястэчках. Там жывуць простыя жанчыны, у іх няма

інтэрнэту, але яны карыстаюцца поштай. Старажытным спосабам. Мужыкі п'юць, б'юцца, а яны сядзяць вечарамі і пішуць адна адной лісты, там, у гэтых канвертах, няхітрыя гісторыі жыцця і драбяза ўсялякая — які-небудзь фасончык, рэцэпцік, а пад канец абавязкова будуць адрасы зняволеных. У кагосьці брат сядзіць, паведаміў пра таварышаў, у каго сусед ці аднакласнік. Перадаюць праз сарафаннае радыё... Скраў, пагуляў, сеў у турму — выйшаў і зноў сеў. Звычайная гісторыя! У вёсках, як паслухаеш, палова мужыкоў ці ўжо сядзела, ці яшчэ сядзіць. А мы ж хрысціяне, павінны дапамагаць няшчасным. Ёсць жанчыны, якія выходзяць замуж за гэтых шматразовых сядзельцаў і нават забойцаў. У мяне няма такой амбітнасці, каб узяць і растлумачыць вам, што гэта... Гэта складана... Але ў мужыкоў нюх на такіх паненак. Часцей за ўсё гэта жанчыны з няўдалым лёсам, якія не рэалізавалі сябе. Самотныя. А тут яны адразу становяцца патрэбнымі, кімсьці апякуюцца. Адзін са спосабаў нешта змяніць у сваім жыцці. Лекі нейкія...

Урэшце, мы ўсё ж паехалі здымаць фільм. Мне захацелася расказаць, што ў наш прагматычны век ёсць людзі, у якіх іншая логіка існавання. І якія яны безабаронныя... Мы шмат гаворым пра свой народ. Адны яго ідэалізуюць, іншыя трымаюць за быдла. За савок. А насамрэч мы яго не ведаем. Паміж намі бездань... Я заўсёды здымаю гісторыю, у кожнай гісторыі ёсць усё. Там заўсёды ёсць дзве галоўныя рэчы — каханне і смерць.

Гэта ў Калужскай вобласці, у глухой вёсцы... Едзем туды... Гляджу ў акно: усё бясконцае — і палі, і лес, і неба. На пагорках бялеюць храмы. Сіла і спакой. Нешта старадаўняе. Едзем, едзем... З магістралі збочылі на звычайны гасцінец... О-о-о! Рускія дарогі — эксклюзіў, не кожны танк, бывае, праедзе. Дзве-тры ямы на кожныя тры метры, гэта яшчэ добрая дарога. А з бакоў — вёскі... Крывыя, касыя хаты з паламанымі платамі, на вуліцах куры і сабакі. З раніцы ўжо чарга алкаголікаў каля зачыненай яшчэ крамы. Усё да спазму ў горле знаёмае... У цэнтры як стаяў, так і стаіць гіпсавы помнік Леніну...

*(Маўчыць.)* Быў час… ужо не верыцца, што ён быў, і што мы такія былі… Калі прыйшоў Гарбачоў, усе мы бегалі ашалелыя ад радасці. Жылі ў марах, у ілюзіях. Адводзілі душу на кухнях. Хацелі новую Расію… Праз дваццаць гадоў да нас дайшло: а адкуль ёй узяцца? Яе не было і няма. Нехта дакладна заўважыў: за пяць гадоў у Расіі можа памяняцца ўсё, а за дзвесце — нічога. Прасторы неабсяжныя, і пры гэтым псіхалогія рабоў… На маскоўскіх кухнях Расію не пераробіш. Герб вярнулі царскі, а гімн застаўся сталінскі. Масква руская… капіталістычная… А Расія як была, так і засталася савецкай. Там дэмакратаў у вочы не бачылі, а калі б убачылі, дык разарвалі б. Большасць хоча пайку і правадыра. Танная сурагатная гарэлка цячэ ракой… *(Смяецца.)* Я адчуваю, што мы з вамі з «кухоннага» пакалення… Пачалі гаварыць пра каханне, а праз пяць хвілін ужо абмяркоўваем, як уладкаваць Расію. Ну а Расіі да нас справы няма, яна жыве сваім жыццём…

П'яненькі мужычок паказаў, дзе жыве наша гераіня. Выйшла з хаты… Адразу мне спадабалася. Сінія-сінія вочы, ладная… Можна сказаць, прыгажуня. Руская прыгажуня! Такая жанчына будзе зіхацець і ў беднай сялянскай хаце, і ў шыкоўнай маскоўскай кватэры. І ўявіце сабе, яна нявеста нейкага забойцы, мы яго яшчэ не бачылі, у яго пажыццёвы тэрмін, ён хворы на сухоты. Пачула, навошта мы прыехалі, — смяецца: «Гэта мой серыял». Я хаджу і думаю, як мне сказаць, што мы будзем яе здымаць. Раптам яна баіцца камеры? А яна мне кажа: «Я такая дурніца, што кожнаму сустрэчнаму-папярэчнаму сваю гісторыю расказваю. Адны плачуць, іншыя клянуць. Калі хочаце, я і вам раскажу…» Распавядае…

### *Пра каханне*

—Я не збіралася замуж, але, вядома, марыла. Мне было васямнаццаць гадоў. Ён! Ён! Які будзе ён? Аднойчы прысніў-

ся сон: я іду па лузе да ракі, яна ў нас за вёскай, і наперадзе раптам з'яўляецца высокі прыгожы хлопец. Бярэ мяне за руку і кажа: «Ты — мая нявеста. Мая нявеста перад Богам». Прачнулася і думаю: трэба не забыцца на яго… на ягоны твар… Твар у мяне ў памяці застаўся, як праграма нейкая. Год прамінуў… два… я такога хлопца не сустракаю. А да мяне доўга заляцаўся Лёша, ён быў шавец. Клікаў замуж. Я яму шчыра адказвала, што яго не люблю, а люблю і чакаю таго хлопца, якога бачыла ў сне. Калі-небудзь я яго сустрэну, не можа быць, каб не сустрэла, проста немагчыма. Лёша смяяўся… і тата з мамай смяяліся… Пераканалі мяне, што трэба выйсці замуж, а каханне прыйдзе потым.

Што ўсміхаецеся? Усе з мяне смяюцца, я ведаю… Калі жывеш так, як адчувае тваё сэрца, дык ты ненармальная. Кажаш праўду — табе не вераць, а калі хлусіш — вось гэта так! Ідзе знаёмы хлопец, я якраз у гародзе корпалася: «Ой, слухай, Пеця, я цябе тут нядаўна ў сне бачыла». — «Ой, не трэба! Толькі не гэта!» — Адскочыў ад мяне, як ад халернай. Я не такая як усе, унікаюць мяне… Нікому не хачу падабацца, увагі на шмоткі не звяртаю і не фарбуюся. Не ўмею фліртаваць. Умею толькі размаўляць. Адзін час хацела пайсці ў манастыр, а потым прачытала, што манашкай можна быць і па-за манастыром. Нават дома. Гэта лад жыцця.

Выйшла замуж. Божа мой, які Алёша добры, ён такі дужы, ён браў качаргу і згінаў. Як я яго пакахала! Нарадзіла яму сына. Пасля родаў са мной нешта здарылася, можа, пасляродавы шок, мяне адштурхнула ад мужчын. У мяне ёсць дзіця, навошта мне яшчэ муж? Я магла з ім размаўляць, мыць яму адзенне, варыць ежу, слаць пасцель, але быць з ім я не магла… як з мужчынам… Я крычала! Я білася ў істэрыцы! Так мы прапакутавалі два гады, і я сышла, узяла дзіця на рукі і сышла. А ісці мне не было куды. Мама і тата памерлі. Сястра недзе на Камчатцы… Быў у мяне сябар Юра, ён у мяне яшчэ са школы быў закаханы, але ніколі мне ў сваім каханні не прызнаваўся.

Я — вялікая, высокая, а ён маленькі, нашмат ніжэйшы за мяне. Ён пасвіў каровы і чытаў кніжкі. Ведаў усялякія гісторыі, хутка разгадваў крыжаванкі. Я прыйшла да яго: «Юра, мы з табой сябры. Можна, я пажыву ў цябе? Я буду ў тваім доме, толькі ты не падыходзь да мяне. Калі ласка, не чапай». І ён сказаў: «Добра».

Так мы жылі, жылі... І я сабе думаю: ён мяне кахае, так прыгожа сябе паводзіць, нічога ад мяне не патрабуе — што ж я мучу чалавека? Пайшлі з ім і распісаліся. Ён хацеў, каб мы ў царкве павянчаліся, тады я яму прызналася, што ў царкве не магу... і распавяла пра свой сон, пра тое, што чакаю сваё каханне... Юра таксама з мяне пасмяяўся: «Ты — як дзіця. Верыш у цуд. Але ніхто не будзе цябе кахаць так, як я». Нарадзіла я яму двух сыноў. Пятнаццаць гадоў мы з ім жылі і пятнаццаць гадоў хадзілі, узяўшыся за рукі. Людзі дзівіліся... Многія жывуць без кахання, бачаць каханне толькі ў тэлевізары. Хто чалавек без кахання? Як кветка без вады...

У нас ёсць завядзёнка... Дзяўчаты і маладыя жанчыны пішуць лісты ў турму. Усе мае сяброўкі і я... мы са школы пісалі... Я сотні лістоў такіх напісала і сотні адказаў атрымала. І тым разам... Усё было як заўсёды... Паштарка крычыць: «Ленка, табе казённае». Я бягу... Бяру ліст: турэмны штэмпель, закрыты паштовы адрас. Раптам маё сэрца пачынае моцна-моцна калаціцца. Яшчэ толькі почырк убачыла, але ён такі мне родны — ад хвалявання нічога прачытаць не магу. Я — летуценніца, але рэальнасць таксама разумею. Не першы ж такі ліст... Тэкст просты: сястра, дзякуй табе за добрыя словы... вядома, ты мне не сястра, але як сястра... Адпісваю ў той жа вечар: прышлі фотаздымак, хачу ўбачыць твой твар.

Прыходзіць адказ і фотаздымак. Гляджу: гэта той хлопец... той, каго я бачыла ў сне... Маё каханне. Дваццаць гадоў я яго чакала. Нікому не магу нічога растлумачыць — атрымліваецца казка. Мужу адразу прызналася: «Знайшлося маё каханне». Ён плакаў. Прасіў. Угаворваў: «У нас трое дзяцей. Трэба іх

гадаваць». І я плакала: «Юра, я ведаю, што ты добры чалавек, дзеці не прападуць з табой». Суседзі… сяброўкі… мая сястра… Усе мяне асудзілі. Я цяпер адна.

На вакзале набывала квіток… Стаяла побач са мной жанчына, размаўлялі. Яна ў мяне пытаецца: «Куды едзеш?» — «Да мужа» (ён яшчэ не быў мне мужам, але я ведала, што будзе). — «А дзе твой муж?» — «У турме». — «А што ён зрабіў?» — «Чалавека забіў». — «А-а-а. Надоўга пасадзілі?» — «На ўсё жыццё». — «А-а-а… бедная ты…» — «Не шкадуйце мяне. Я люблю».

Кожнага чалавека хтосьці павінен любіць. Хоць бы адзін чалавек. Каханне — гэта… Я вам раскажу, што гэта такое… Ён хварэе на сухоты, яны ўсе ў турме хварэюць на сухоты. Ад дрэннай ежы, ад тугі. Мне падказалі, што трэба сабачы тлушч. Хадзіла па вёсцы, пыталася. Знайшла. Потым даведалася, што барсучыны тлушч лепш дапамагае. Набыла ў аптэцы. Даражэзны! Патрэбныя яшчэ яму цыгарэты, тушонка… Я ўладкавалася на хлебазавод, там заробак большы за той, што ў мяне на ферме. Праца цяжкая. Старыя печы так напальваюцца, што мы здымаем з сябе ўсё, ходзім у станіках і майтках. Цягаю мяхі з мукой па пяцьдзясят кілаграмаў, насілкі з хлебам па сто кілаграмаў. Пішу яму лісты кожны дзень…

—Вось яна такая… — працягвае Іра Васільева. — Вокамгненны, імклівы чалавек… У яе ўсярэдзіне клякоча, ёй усяго хутчэй хочацца. Усё празмернае, б'е цераз край. Мне суседзі распавядалі… Ішлі праз вёску таджыкскія ўцекачы, у іх вельмі шмат дзяцей, яны галодныя, распранутыя, дык яна вынесла ім з хаты ўсё, што магла: коўдры, падушкі… лыжкі… «У нас задужа ўсё добра, а ў людзей нічога няма». А ў самой у хаце: стол, крэслы… Можна сказаць, галеча. Харчуюцца з агароду — бульба, кабачкі. П'юць малако. «Нічога, — супакойвала яна мужа і дзяцей, — па восені дачнікі з'едуць, пакінуць нам што-небудзь». Там улетку жывуць масквічы, мясціны ж абалдзенныя, шмат мастакоў, артыстаў, усе кінутыя хаты раскупленыя. За дачнікамі падбіраюць усё, аж да поліэтыленавых

пакетаў. Вёска гаротная, пенсіянерская… пітушчая… Яшчэ быў выпадак… У сяброўкі нарадзілася дзіцятка, а лядоўні няма. Лена аддала ім сваю: «У мяне дзеці ўжо выраслі, а тут немаўля». Усё! Забірай! У чалавека нічога няма, а выходзіць — шмат што можна аддаць. Гэта той рускі кшталт… той рускі чалавек, пра якога Дастаеўскі пісаў, што ён шырокі, як руская зямля. Не змяніў яго сацыялізм, не зменіць і капіталізм. Ні багацце, ні беднасць. Сядзяць пад крамай мужыкі, узялі на траіх. За што п'юць? Тост: «Севастопаль — рускі горад! Севастопаль будзе наш!» Ганарацца, што рускі можа выпіць літр гарэлкі і не сп'янець. Пра Сталіна памятаюць адно, што пры ім былі яны пераможцамі…

Усё гэта хацелася зняць… Я сама сябе спыняла, баялася, што куды-небудзь зацягне так, што не выкараскаешся… Кожны лёс — галівудская гісторыя! Гатовы сюжэт для фільма. Напрыклад, пра яе сяброўку Іру… Былая настаўніца матэматыкі, яна пайшла са школы праз жабрацкую зарплату. У яе трое дзяцей, яны прасілі: «Мамачка, пойдзем да хлебазавода. Панюхаем хлебка». Хадзілі ўвечары, каб людзі не бачылі. Цяпер Іра працуе на хлебазаводзе, як і Лена, і яна радая, што яе дзеці хоць бы хлеба ўдосталь паядуць. Крадуць… Усе там крадуць, толькі дзякуючы гэтаму выжываюць. Жыццё пачварнае, нечалавечае, а душа жыве. Паслухалі б вы, пра што гэтыя жанчыны гавораць… Не паверылі б! Яны гавораць пра каханне. Без хлеба можна пражыць, а без кахання — ніяк… канец… Іра чытала лісты, якія прыходзілі Лене ад яе зэка, і сама загарэлася. Знайшла ў бліжэйшай турме нейкага мазурыка. Той хутка вызваліўся… Далей гісторыя развівалася ў трагедыйным жанры… Клятвы ў любові да скону. Вяселле. Неўзабаве гэты Толя… Талян… запіў. У Іры ўжо было трое дзяцей, яна яшчэ дваіх ад яго нарадзіла. Ён звярэе, ганяе яе па вёсцы, а раніцай працверазее і б'е сябе пяткай у грудзі. Каецца. Іра… яна таксама прыгажуня! Разумніца! Але ўсё адно мужык наш так змайстраваны, што ён — цар звяроў…

А цяпер трэба распавесці вам пра Юру… Гэта муж Лены… У вёсцы яго называюць «пастух-чытач», ён пасвіць кароў і чытае. Я бачыла ў яго шмат кніг рускіх філосафаў. З ім можна пагаварыць пра Гарбачова і пра Мікалая Фёдарава, пра перабудову і пра чалавечую несмяротнасць… Іншыя мужчыны п'юць, а ён чытае. Юра — летуценнік… сузіральная натура… Лена ганарыцца, што ён крыжаванкі вокамгненна разгадвае. Але Юра маленькага росту… У дзяцінстве ён вельмі хутка рос… Калі быў у шостым класе, мама павезла яго ў Маскву. Там яму зрабілі нейкі няўдалы ўкол у хрыбетнік. І ён расці зусім перастаў — адзін метр пяцьдзясят сантыметраў. Праўда, прыгожы мужчына. Але побач з жонкай ён — карлік. У фільме мы стараліся, каб гледачы гэтага не заўважылі, я прасіла, умольвала аператара: «Богам прашу, прыдумай што-небудзь!» Нельга было даць абывацелю простую разгадку — ад карліка яна пайшла да прыгажуна-супермэна. Звычайная баба! А Юра… ён мудры, ён ведае, што ў шчасця шмат фарбаў. Ён згодны, каб Лена была побач з ім на любых умовах, няхай яна ўжо не жонка, але сябар. З лістамі з казённага дома да каго яна бяжыць? Да яго… Разам гэтыя лісты чытаюць… У Юры сэрца крывёй абліваецца, але ён слухае… Любоў доўга трывае… любоў не зайздросціць… не наракае і не задумвае злога… Усё, вядома, не так прыгожа, як я цяпер расказваю… Іх жыццё — не ружовая бурбалка… Юра хацеў застрэліцца… сысці куды вочы глядзяць… Там былі рэальныя сцэны з крывёю і плоццю. Але Юра яе любіць…

*Пра сузіранне*

— Я яе заўсёды любіў… Са школы. Яна выйшла замуж і з'ехала ў горад. А я яе любіў.

Гэта было раніцай… Мы з мамай сядзелі за сталом, пілі гарбату. Бачу ў акне: Лена ідзе з немаўлём на руках. І я маме кажу: «Мама, вось мая Лена прыйшла. Мне здаецца, што

яна прыйшла да мяне назаўсёды». З таго дня я стаў вясёлы і шчаслівы, і нават… прыгожы… Калі пабраліся, я быў на сёмым небе ад шчасця. Цалаваў свой заручальны пярсцёнак, які на наступны ж дзень і згубіў. Дзіўна, ён так добра сядзеў на пальцы, але, працуючы, я абтрос рукавіцу, а калі стаў насоўваць яе, дык убачыў, што пярсцёнка няма — шукаў і не знайшоў. А Лена свой заручальны пярсцёнак насіла, ён так лёгка сядзеў, але яна ні разу яго не згубіла, пакуль не зняла…

Паўсюль удваіх… Вось як мы жылі! Любілі да крыніцы хадзіць разам, я нясу вёдры, а яна побач: «Давай я табе пазюзюкаю». І нешта расказвае… З грашыма было не надта, але грошы — гэта грошы, а шчасце — гэта шчасце. Як толькі пачыналася вясна, у нас у доме заўсёды стаялі кветкі, спачатку я адзін насіў, потым дзеці падраслі, мы разам насілі. Усе любілі маму. Мама ў нас была вясёлая. Грала на піяніна (у музычнай школе вучылася). Спявала. Казкі складала. У нас нейкі час быў тэлевізар, нам падарылі. Хлопцы прыліплі да экрана, адарваць немагчыма, і нейкія яны сталі агрэсіўныя, чужыя. Дык яна ўзяла і заліла яго вадой, як акварыум. Тэлевізар згарэў. «Дзеці, глядзіце лепш на кветкі, на дрэвы. З татам і мамай размаўляйце». Нашы дзеці не пакрыўдзіліся, бо мама сказала…

Развод… Суддзя пытаецца: «Чаму разводзіцеся?» — «Розныя погляды на жыццё». — «Муж п’е? Б’е?» — «Не п’е і не б’е. І ўвогуле, мой муж — цудоўны чалавек». — «А чаму разводзіцеся?» — «Кахання няма». — «Гэта не прычына». Далі нам год на роздум, каб мы падумалі…

Мужыкі з мяне смяяліся. Раілі: выгнаць з хаты, здаць у псіхіятрычную бальніцу… І чаго ёй не хапае? З кожным чалавекам такое бывае. Туга, як халера, нападае на ўсіх. Едзеш у цягніку, глядзіш у акно — і туга. Прыгажосць вакол, вачэй не адвесці, а слёзы коцяцца, і не ведаеш, што з сабой рабіць. Так, руская туга… Нават калі ў чалавека нібыта ўсё ёсць, усё адно чагосьці бракуе. І жывуць. Неяк цярпяць усе. А яна: «Юра, ты вельмі добры, ты мне найлепшы сябар. А ён палову жыцця

правёў у турме, але ён мне патрэбны. Я яго люблю. Не адпусціш — памру. Я буду рабіць усё як належыць, але буду мёртвая». Лёс, ён такая штука…

Кінула нас і з'ехала. Дзеці сумавалі, доўга плакалі, асабліва маленькі. Наш Мацвейка… Чакалі ўсё маму і цяпер чакаюць. І я чакаю. Напісала нам: «Не прадавайце толькі піяніна». Адзіная дарагая рэч у нашым доме, ад бацькоў ёй засталося. Улюбёнае піяніна… Усёй сям'ёй сядзем увечары, а яна нам іграе… Хіба ж я магу дзеля грошай яго прадаць? І яна не зможа выкінуць мяне са свайго лёсу, пакінуўшы там пустое месца, гэта ж немагчыма. Пятнаццаць гадоў пражылі разам, у нас дзеці. Яна добрая, але яна іншая. Нейкая незямная… Лёгкая яна… лёгкая… А я чалавек зямны. Я з гэтых… хто на зямлі…

Напісалі пра нас у мясцовай газеце. Потым паклікалі ў Маскву на тэлебачанне. Там так: ты сядзіш, як быццам на сцэне, і распавядаеш пра сябе, а ў зале гледачы. Потым абмеркаванне. Як усе Лену ганілі, асабліва жанчыны: «Маньячка! Сэксаманка!» Гатовыя былі камянямі яе закідаць. «Гэта паталогія, гэта няправільна». Да мяне пытанні… Накаўт за накаўтам… «Гэтая памаўзлівая сука, якая кінула вас і дзяцей, яна не вартая вашага мезенца. Вы — святы. Кланяюся вам у самыя ножкі ад усіх рускіх жанчын…» Я хачу адказаць… пачынаю… А мне: «Ваш час скончыўся». Я заплакаў. Усе вырашылі, што мае слёзы ад крыўды, ад злосці. А я плакаў ад таго, што яны такія разумныя, адукаваныя, жывуць у сталіцы і нічога не разумеюць.

Я буду чакаць яе колькі трэба. Колькі яна захоча… Не магу ўявіць побач іншую жанчыну. А часам… раптам падступіць жаданне…

*З вясковых размоваў*

—Лена — анёл…

—Раней такіх жонак саджалі ў камору або лейцамі…

—Калі б яна пайшла да багатага, усё было б зразумела. У багатых жыццё цікавейшае. А якія могуць быць адносіны з бандытам? Ды яшчэ з «вечнікам». Два спатканні на год — і ўсё. Усё каханне.

—Рамантычная натура. Няхай пакатаецца.

—Гэта ў нас у крыві — шкадаваць няшчасненькіх. Забойцаў і забулдыгаў. Чалавека заб'е, а вочы як у немаўляці. І яго шкада.

—Я наогул не веру мужчынам, а зэкам пагатоў. Ім у турме сумна. Забаўляюцца. Катаюць пад капірку: лебедзь мая белакрылая, мару пра цябе, святло ў акенцы… Якая-небудзь дурніца паверыць і кідаецца яго ратаваць: цягае перадачы ў непад'ёмных пакунках, дасылае грошы. Чакае. Ён вызваляецца, прыязджае да яе — паеў, папіў, грошыкі выдурыў — і ў адзін цудоўны дзень кудысьці выпарыўся. І — чао! Чао!

—Дзяўчаты, гэта такое каханне! Як у кіно!

—Пайшла замуж за забойцу, а добрага мужа пакінула. Потым жа дзеці ў яе… трое хлапцоў… Проста вось квіток узяць, ёй жа на край свету да яго трэба ехаць — дзе яна гэтыя грошы бярэ? Яна ўвесь час у дзяцей кавалак забірае. Зойдзе ў краму, і ў яе праблема: набыць ім булачку ці не набыць?

—Жонка ды ўбаіцца мужа свайго… Яны ўдваіх ідуць да Хрыста. А проста так… так проста — навошта? Калі без гэтай мэты, то навошта?

—Без Мяне, кажа Гасподзь, вы не можаце тварыць. А яна спрабуе тварыць ад свайго розуму. Гардыня гэта. Там, дзе няма пакоры, заўсёды ёсць нейкая іншая сіла. Д'ябал спрыяе.

—Ёй трэба ў манастыр, шукаць шлях да ўратавання. Чалавек ратуецца ў смутку. Смутак трэба нават шукаць…

*Працягваем нашу размову з Ірай Васільевай:*

—Я ў яе таксама пыталася: «Лена, ты разумееш, што ў цябе будуць толькі два спатканні на год?» — «Ну і што? Мне хопіць. Я буду з ім у думках. У пачуццях».

Ехаць да яго трэба далёка на Поўнач. На Вогненны востраў. У чатырнаццатым стагоддзі вучні Сергія Раданежскага ішлі і асвойвалі паўночныя лясы. Прадзіраючыся праз гушчар, яны ўбачылі возера, а пасярэдзіне возера — агнявыя языкі. Гэта дух ім так з'явіўся. Вазілі зямлю на чаўнах... Насыпалі на гэтым месцы выспу і пабудавалі на ёй манастыр. Таўшчыня сцен паўтара метра. У гэтым старажытным манастыры цяпер турма для самых страшных забойцаў. Для «смяротнікаў». На дзвярах кожнай камеры вісіць шыльда са злачынствамі забойцы: зарэзаў нажом Аню, шэсць гадоў... Насту, дванаццаць гадоў... Прачытаеш — вусцішна робіцца, а зойдзеш у камеру — быццам бы звычайны чалавек з табой вітаецца. Цыгарэту просіць, і ты даеш. «Што там на волі? Тут мы не ведаем нават, якое там надвор'е». Жывуць у камені. Вакол лясы і балоты. Ніхто ні разу не ўцёк...

Першы раз Лена прыехала туды, не думаючы пра тое, што спатканне могуць не дазволіць. Пастукала ў акенца, дзе выдаюць пашпарты, ніхто нават слухаць яе не стаў: «Вунь начальнік турмы ідзе. Размаўляйце з ім». Яна кінулася да начальніка: «Дазвольце мне спатканне» — «З кім?» — «Я да Валодзі Падбуцкага прыехала». — «Хіба вам невядома, што тут сядзяць асабліва небяспечныя злачынцы? У іх найстражэйшы рэжым: два спатканні на год па тры дні і тры кароткачасовыя — па дзве гадзіны. Пускаем толькі самых блізкіх сваякоў: маці, жонку, сястру. А вы — хто яму?» — «Я яго люблю». Ну ўсё зразумела, клініка. Начальнік хоча сысці, а яна трымае яго за гузік: «Разумееце, я яго люблю». — «Вы абсалютна чужы яму чалавек». — «Тады дайце мне проста зірнуць на яго». — «А вы што, яго не бачылі?» Ужо ўсім смешна, тут і ахоўнікі падышлі, што за дурніца такая? Ха-ха... А яна давай ім распавядаць пра сон, які ёй прысніўся ў васямнаццаць гадоў, пра мужа і траіх дзяцей і пра тое, што яна ўсё жыццё любіць гэтага чалавека. Яе шчырасць і чысціня якую хочаш сцяну прабіваюць. Побач з ёй чалавек усведамляе, што нешта не так у ягоным

правільным жыцці — ён грубы, і слых яго не тонкі. Начальнік турмы не малады мужык, праца ў яго такая… усяго пабачыў… І ён уваходзіць у яе становішча: «Калі вы прыехалі з такой далечыні, я дам вам шэсць гадзін на сустрэчу, але з вамі будзе ахоўнік». — «Хоць два! Я ўсё адно нікога апроч яго бачыць не буду…»

Усё, што ёсць у ёй празмернага, максімалісцкага, яна абрынула на гэтага Валодзю: «Ты разумееш, якая я шчаслівая… Я ўсё жыццё цябе чакала, і нарэшце мы разам». Той, вядома, быў да гэтага не гатовы. Да яго ўжо прыязджае нейкая баптыстка, у яго з ёй раман. Там усё зразумела — звычайная маладая баба з няўдалым лёсам. Ёй мужык патрэбны, штамп у пашпарце, што яна замужам. Тут жа такі напор, такі парыў! Калі цябе вось так хочуць захапіць, кожны спалохаецца. У яго ў мазгах зашкальвала… «Я прашу цябе, — кажа Лена, — дазволь мне выйсці за цябе замуж. Каб мяне да цябе пускалі, і я магла цябе бачыць. Больш мне нічога не трэба». — «Дык ты ж замужам?» — «А я развядуся. Я аднаго цябе люблю». У яе з сабой была сумка ягоных лістоў, размаляваных верталёцікамі, кветачкамі. Яна ні на хвіліну не магла з імі расстацца. Гэта апагей ейнага шчасця, бо яна хацела ўсё жыццё абсалюту, а абсалют можа існаваць толькі ў пісьме, толькі на паперы можа быць яго поўная рэалізацыя. На зямлі, у ложку гэтага няма. Абсалюту там не знайсці. Усё, што звязана з іншымі людзьмі: сям'я, дзеці — гэта кампраміс…

Як быццам яе нехта вядзе… Што за сіла? Якой прыроды гэты сон?

…Мы таксама пабывалі на Вогненным востраве. Для гэтага спатрэбілася шмат папераў і дазволаў з круглымі пячаткамі. Тэлефанаванняў. Прыехалі… А Валодзя сустрэў нас у штыкі: «Навошта гэтае шоў?» Шмат гадоў ён пражыў у адзіноце, адвык ад людзей. Стаў падазроным, не давяраў нікому. Добра, што з намі была Лена, яна брала яго за руку: «Валодзечка». І ён

рабіўся шаўковым. Разам мы яго ўгаварылі, а можа, ён сам падумаў, хлопец кемлівы: праз дваццаць пяць гадоў у выключных выпадках бывае амністыя, калі зробяць фільм, ён будзе мясцовай знакамітасцю, гэта яму потым дапаможа… Там усе яны хочуць жыць… там не любяць размаўляць пра смерць…

З гэтага і пачалі…

### *Пра Бога*

— Я сядзеў у адзіночцы, чакаў расстрэлу. Шмат думаў… Ну хто табе дапаможа ў чатырох сценах? Час не існаваў, нейкая абстракцыя. Я пераэжыў такую пустату… І аднойчы ў мяне вырвалася: «Калі ты ёсць, Госпадзе, дапамажы! Не пакінь мяне! Я не прашу цудаў, дапамажы разабрацца ва ўсім, што са мной адбылося». Упаў на калені. Маліўся. Гасподзь не прымушае доўга чакаць тых, хто да Яго звяртаецца…

Пачытайце маю справу — я забіў чалавека. Мне было васямнаццаць гадоў. Я толькі скончыў школу, пісаў вершы. Хацеў паехаць у Маскву вучыцца. Вучыцца на паэта. Мы жылі з мамкай удваіх. Грошай у доме не было, на вучобу я мусіў зарабіць. Уладкаваўся ў аўтамайстэрню. Па вечарах у вёсцы танцы… Ну і закахаўся ў адну прыгожую дзяўчыну. Утрэскаўся без памяці. Вяртаемся з танцаў… Зіма… снег… Ужо ялінкі ў вокнах міргаюць, неўзабаве Новы год. П'яны я не быў. Ідзём, размаўляем. Ха-ха… хі-хі… Яна пытаецца: «Ты мяне і сапраўды любіш?» — «Люблю болей за жыццё». — «А што ты можаш дзеля мяне зрабіць?» — «Я магу сябе забіць». — «Сябе, зразумела. А ці можаш ты забіць дзеля мяне першага сустрэчнага чалавека?» Ці гэта жарт у яе быў такі… ці сцерва трапілася… Я яе ўжо не памятаю, нават твар забыў, яна ні разу мне ў турму не напісала. Можаш забіць? Сказала так — і смяецца. А я ж герой! Мне трэба даказаць сваю любоў. Выцягнуў з плоту кол… Ноч. Цемра. Стаю і чакаю. І яна чакае. Доўга

ніхто не з'яўляўся, нарэшце нейкі чалавек ідзе нам насустрач. І я яму — па галаве. Бац! Адзін раз ударыў, другі… Ён упаў. Я яго яшчэ дабіў на зямлі… гэтым калом… А гэта быў наш настаўнік…

Спачатку мяне прысудзілі да расстрэлу… Праз паўгода расстрэльны артыкул замянілі на пажыццёвае зняволенне. Маці ад мяне адмовілася. Сястра нейкі час пісала, пасля кінула. Я даўно адзін… Вось у гэтай камеры пад замком я адседзеў ужо сямнаццаць гадоў. Сямнаццаць гадоў! Дрэва ўзяць або якую жывёліну — яны нічога пра час не ведаюць. За іх Гасподзь думае. Так і я… Паспаў, паеў, вывелі на шпацыр… Неба бачыш толькі праз краты. У камеры — ложак, зэдлік, конаўка, лыжка… Іншыя жывуць успамінамі… А што мне ўспамінаць? У мяне нічога не было, я і пажыць не паспеў. Азірнуся назад — там увесь час цемра, часам дзесьці лямпачка гарыць. Часцей за ўсё мамку бачу… то яна каля пліты, то на кухні каля акна… А далей паўсюль цемра…

Пачаў чытаць Біблію… не мог адарвацца… Мяне ўсяго трэсла. Я з Ім размаўляў: «За што Ты мяне так пакараў?» Чалавек дзякуе Госпаду за радасць, а калі бяда, ён лямантуе: «За што?» Не каб імкнуцца зразумець сэнс пасланай кары. Уручыць сваё жыццё Яму…

І раптам прыехала Лена… Прыехала і кажа: «Я цябе люблю». Перад мною адкрыўся свет… Я мог уявіць сабе ўсё што хочаш… Сям'ю, дзяцей… З поўнай цемры я трапіў у самае яркае святло… я быў ахінуты святлом… Сітуацыя, праўда, ненармальная: у яе муж, трое дзяцей, а яна прызнаецца чужому мужчыну ў каханні, піша лісты. Калі б я быў на месцы ейнага мужа… Ды я б! «Ты што — бажавольная?» — «Любоў не бывае без самаахвярнасці. Якая ж гэта любоў?» Я не ведаў…. Адкуль я мог ведаць, што такія жанчыны ёсць? У турме — як? Ёсць людзі, ёсць сукі — і ўсё. А тут трапіўся чалавек, дзеля якога ноччу не можаш злажыць вачэй… Прыедзе — і плача, і смяецца. І заўсёды прыгожая.

Неўзабаве мы распісаліся. А потым вырашылі павянчацца… у турме ёсць малельны пакой… Раптам анёл-ахоўнік паглядзіць у наш бок…

Да сустрэчы з Ленай я ненавідзеў усіх жанчын, я думаў, што каханне — толькі гармоны. Жаданне цела… А яна не баіцца гэтага слова, часта яго ўжывае: «Кахаю! Кахаю!» Я тады сяджу, не варушуся. А ўсё гэта… як вам сказаць… Я не прывык да шчасця. Часам я ёй веру. Хачу верыць, што гэта праўда — мяне можна пакахаць, розніца паміж мною і астатнімі людзьмі толькі ў тым, што яны лічаць сябе добрымі, але чалавек сябе не ведае, зведаў бы — спалохаўся. Хіба я думаў пра сябе, што я магу… Што з мяне звер можа выскачыць… Ніколі! Я думаў, што я добры. Дзесьці ў мамкі захоўваюцца сшыткі з маімі вершамі, калі не спаліла. Іншым разам… Мне страшна… Занадта доўга я жыў адзін, захрас у гэтым стане. Далёка ад мяне нармальнае жыццё. Я стаў злосны і дзікі… Чаго я баюся? Баюся, што наша гісторыя — гэта кіно, а кіно мне без патрэбы. Я, можа, толькі жыць пачаў… Хацелі дзіцятка… Яна зацяжарала. І быў выкідыш. Гасподзь нагадаў мне пра мае грахі…

Страшна… Так страшна, што я хачу то сябе забіць, то… «Я баюся цябе», — кажа яна. І не сыходзіць… Вось вам кіно! Вось вам…

*З турэмных размоваў*

—Маразм! Кабетку да псіхолага трэба…

—Я пра такіх жанчын раней толькі ў кніжках чытаў, пра жонак дзекабрыстаў… Літаратура! А ў жыцці… Лена адзіны такі чалавек, якога я сустрэў. І натуральна, адразу і я не верыў: «Можа, яна ненармальная?» А потым вось нешта ўва мне перавярнулася… Ісуса таксама лічылі вар'ятам. Ды яна больш нармальная за ўсіх нармальных!

—Аднаго разу ўсю ноч праз яе не спаў. Успомніў, што ў мяне таксама была жанчына, якая мяне моцна кахала…

—Гэта ейны крыж. Яна ўзяла яго і нясе. Сапраўдная руская баба!

—Ведаю я Валодзьку… Жаніха! Такі ж вырадак, як і я. Мне страшна за яе. Яна не той чалавек, які распісаўся і ўсё, а ты там жыві, як хочаш, яна будзе старацца быць жонкай. А што ён можа ёй даць? У нас няма магчымасці штосьці даць. Крывавыя хлопчыкі ў вачах. У нас адзіная магчымасць ёсць — не браць, не прымаць ніякай ахвяры. Увесь сэнс жыцця ў нас цяпер — не браць. Ну а калі ты бярэш, то ты зноў некага рабуеш…

—Ды яна шчаслівы чалавек. І яна не баіцца быць шчаслівай.

—Вось у Бібліі… Бог не названы ні дабрынёй, ні справядлівасцю… Ён названы любоўю…

—Нават бацюшка… Прыходзіць, падае мне руку праз краты і як мага хутчэй яе прыбірае, ён не заўважае, а я гэта бачу. Усё зразумела — на маіх руках кроў… А яна стала жонкай забойцы, даверылася яму, хоча падзяліць з ім усё. І кожны з нас цяпер думае: значыць, не ўсё скончана. Калі б я пра яе не даведаўся, наколькі б мне было цяжэй тут.

—Якая іх чакае будучыня? Ніводная варажбітка не скажа…

—Вычварэнцы! Якія могуць быць цуды? Жыццё — гэта не белы карабель з белымі ветразямі. Гэта гара гаўна ў шакаладзе.

—Тое, што яна шукае, што ёй трэба, ніводны чалавек на зямлі не дасць — толькі Бог.

*Іх вянчалі ў турме. Усё было, як Лена сабе і ўяўляла: бляск свечак, залатыя пярсцёнкі… Царкоўны хор спяваў: «Ісая радуйся…»*

*Святар*: «Ці маеш ты, Уладзімір, свабоднае і добрае жаданне і цвёрды намер узяць сабе за жонку Алену, якую тут бачыш перад сабой?»

*Жаніх*: «Маю, ойча».

*Святар*: «Ці не абяцаўся іншай нявесце?»

*Жаніх*: «Не абяцаўся, ойча».

*Святар*: «Ці маеш ты, Алена, свабоднае і добрае жаданне і цвёрды намер узяць сабе за мужа Уладзіміра, якога бачыш перад сабой?»

*Нявеста*: «Маю, ойча».

*Святар:* «Ці не абяцалася ты іншаму мужу?»

*Нявеста:* «Не абяцалася, ойча».

Госпадзе, злітуйся…

*Праз год мы з Ірай Васільевай зноў сустрэліся.*

*Яе аповед*

—Наш фільм паказалі на цэнтральным тэлебачанні… Прыйшлі лісты ад гледачоў. Я ўзрадавалася, але… Нешта не так са светам, у якім мы жывём. Як у тым анекдоце: людзі ў нас добрыя, толькі народ злы. Запомнілася: «Я — за смяротнае пакаранне, за ўтылізацыю чалавечых адкідаў», «Такіх вырадкаў, як ваш герой, супермен-забойца, публічна чвартаваць трэба на Чырвонай плошчы, а ў перапынках рэкламу снікерса ўстаўляць», «На органы іх… хай на іх новыя лекі і хімію выпрабоўваюць…». Калі зазірнуць у слоўнік Даля, слова «доброта» ад слова «добровать» — жыць у паўнаце, у дабры… гэта калі ёсць трываласць і годнасць… А ўсяго гэтага ў нас няма. Зло не ад Бога. Словы святога Антонія Вялікага: «Бог не ёсць віноўнікам зла. Ён падарыў чалавеку розум, здольнасць адрозніваць дабро і зло…» Праўда, былі… памятаю і цудоўныя лісты, як гэты: «Пасля вашага фільма я паверыла ў каханне. Здаецца, Бог усё ж такі ёсць…»

Дакумент — гэта інтрыга… і пастка… Для мяне ў дакументальным жанры ёсць адна, я б сказала, прыроджаная загана:

фільм зняты, а жыццё працягваецца. Мае героі не выдуманыя, яны жывыя, рэальныя людзі, і яны не залежаць ад мяне — ад маёй волі, маіх уяўленняў або майго прафесіяналізму, мая прысутнасць у іх жыцці выпадковая і часовая. Я не свабодная так, як яны. Калі б магла… Я б усё жыццё здымала аднаго чалавека. Ці адну сям'ю. Дзень пры дні. Вось вядуць дзіця за руку… едуць на лецішча… п'юць гарбату і размаўляюць, сёння пра адно, а заўтра пра іншае… пасварыліся… купілі газеты… зламалася машына… скончылася лета… хтосьці плача… Мы ў гэтым знаходзімся, але шмат што адбываецца без нас. Наўзбоч нас. Злавіць момант ці прасачыць пэўны адрэзак часу — мне гэтага мала. Мала! Я не магу… не ўмею развітвацца… Сябрую са сваімі героямі, пішу ім, тэлефаную. Сустракаемся. Яшчэ доўга я «даздымваю» матэрыял, перад маімі вачыма пракручваюцца новыя карцінкі. Так у мяне «знятыя» дзясяткі фільмаў.

Адзін з гэтых фільмаў пра Лену Раздуеву. Ёсць у мяне нататнік з запісамі. Нешта накшталт сцэнарыя фільма, якога не будзе…

…Яна пакутуе ад таго, што гэта робіць, але не рабіць не можа.

…Прайшло некалькі гадоў, перш чым яна наважылася ўзяць і прачытаць ягоную справу. Але не спалохалася: «Гэта нічога не адмяняе, усё адно я яго люблю. Цяпер я ягоная жонка перад Богам. Ён забіў чалавека, бо тады мяне не было побач з ім. Мне трэба ўзяць яго за руку і вывесці адтуль…»

…Там жа, на Вогненным востраве, сядзіць былы раённы пракурор, які разам з братам сякерай забіў дзвюх жанчын — бухгалтарку і касірку. Піша кнігу пра сябе. Нават на шпацыры не выходзіць, шкада часу. Скралі яны зусім невялікую суму грошай. Навошта? Не ведае… Ці слесар, які забіў жонку і дваіх дзяцей… Нічога, акрамя гаечнага ключа, у руках да гэтага не трымаў, а цяпер уся турма абвешаная ягонымі карцінамі. Кожны з іх абцяжараны сваімі дэманамі, хоча выгаварыцца. Забойства для катаў такая ж таямніца, як і для ахвяраў…

...Падслуханая там размова... «Ты думаеш, што Бог ёсць?» — «Калі Ён ёсць, то смерць — гэта яшчэ не канец. Я не хачу, каб Ён быў».

...Што гэта — каханне? Валодзя — высокі, прыгожы, а Юра — карлік... Прызналася мне, што як мужчына Юра нават больш яе задавальняе... Толькі яна павінна... Вось муж у яе такі, з ім бяда здарылася. Трэба трымаць яго за руку...

...Па першым часе яна жыла ў вёсцы з дзецьмі. Два разы на год ездзіла на спатканне. Ён стаў патрабаваць, каб яна кінула ўсіх і з'ехала да яго: «Ты мне здраджваеш, я адчуваю, што ты мне здраджваеш». — «Валодзечка, як я сыду ад дзяцей? Мацвейка зусім маленькі, я яшчэ фізічна яму патрэбная». — «Ты хрысціянка... Ты павінна быць пакорлівай, слухацца мужа». Павязала чорную хустку і жыве побач з турмой. Працы няма, але яе бацюшка ў мясцовай царкве прытуліў. Прыбірае там. «А Валодзя побач... Я чую... чую, што ён побач... "Ты не бойся, — пішу яму, — я з табой..."» Ужо сем гадоў яна піша яму кожны дзень...

...Як толькі пабраліся, Валодзя стаў патрабаваць, каб яна пісала ва ўсе інстанцыі: ён шматдзетны бацька, яму трэба клапаціцца пра дзяцей. Гэта ягоны шанец вырвацца на волю. А Лена чыстая... Сядзе пісаць, і не можа: «Ён жа чалавека забіў. Цяжэйшага граху няма». Тады ён учыняе дзікія скандалы. Яму іншая жанчына патрэбная. Багацейшая і з сувязямі. Гэтая бажавольная яму ўжо надакучыла...

...Сеў ён у васямнаццаць гадоў... Тады яшчэ быў Савецкі Саюз і савецкае жыццё. І савецкія людзі. Быў сацыялізм. Ён уяўлення не мае, што за краіна цяпер. Калі ён выйдзе, як ён чмякнецца аб гэтае новае жыццё! Як яно яго ўдарыць — прафесіі няма, сваякі адвярнуліся. А ён — злосны. Аднойчы ў турме паспрачаўся з напарнікам і ледзь горла яму не перагрыз. Лена разумее, што ёй трэба будзе павезці яго куды-небудзь далей ад людзей. Яна марыць, што яны будуць працаваць у лясгасе. Жыць у лесе. Як яна кажа, сярод дрэваў і бязмоўных звяроў...

...Не раз яна мне казала: «Вочы ў яго сталі такія халодныя, такія пустыя. Калі-небудзь ён мяне заб'е. Я ведаю, з якімі вачыма ён будзе мяне забіваць». Але яе цягне туды, яе бездань гэтая цягне. Чаму? Хіба я сама не заўважала ў сабе такога? У цемру цягне...

...Апошні раз, калі мы сустрэліся, я пачула ад яе: «Не хачу жыць! Больш не магу!» Яна была нібы ў коме — ні жывая, ні мёртвая...

*Вырашаем паехаць да Лены разам. Але яна раптам знікла. Не адгукаецца. Ходзяць чуткі, што цяпер жыве ў глухім манаскім скіце. З наркаманамі, хворымі на СНІД... Многія там даюць зарок маўчання.*

## Пра мужнасць і пасля яе

*Таня Куляшова — студэнтка, 21 год*

### *Хроніка падзей*

19 снежня ў Беларусі адбыліся прэзідэнцкія выбары. Сумленных выбараў ніхто не чакаў, вынік быў загадзя вядомы: пераможа прэзідэнт Лукашэнка, які кіруе краінай ужо шаснаццаць гадоў. У замежнай прэсе з яго смяюцца: «бульбяны дыктатар», «суседскі моська», але ўласны народ апынуўся ў яго ў закладніках. Апошні дыктатар Еўропы... Ён не хавае сваіх сімпатый да Гітлера, таго таксама доўга не ўспрымалі сур'ёзна і называлі «капральчыкам» і «багемскім яфрэйтарам».

Увечары на Кастрычніцкую плошчу (галоўная плошча Мінска) выйшлі дзясяткі тысяч людзей, пратэстуючы супраць фальсіфікацыі выбараў. Дэманстранты патрабавалі прызнаць несапраўднымі абвешчаныя вынікі і правесці новыя выбары

без Лукашэнкі. Мірная акцыя пратэсту была жорстка разагнаная спецназам і АМАПам. У лясах каля сталіцы стаялі напагатове войскі…

Усяго было арыштавана 700 дэманстрантаў, сярод іх — сем экс-кандыдатаў у прэзідэнты, на якіх яшчэ распаўсюджвалася недатыкальнасць…

Пасля выбараў беларускія спецслужбы надрываюцца дзень і ноч. Па ўсёй краіне пачаліся палітычныя рэпрэсіі: арышты, допыты, ператрусы на кватэрах, у рэдакцыях апазіцыйных газет і офісах праваабарончых арганізацый, канфіскацыя камп'ютараў і іншай аргтэхнікі. Многім з тых, хто сядзіць у ізалятары на Акрэсціна і ў турме КДБ, пагражае ад 4 да 15 гадоў турмы за «арганізацыю масавых беспарадкаў» і «спробу дзяржаўнага перавароту» — так сёння беларуская ўлада класіфікуе ўдзел у мірнай акцыі пратэсту. Баючыся пераследу і ўмацавання дыктатуры, сотні людзей бягуць з краіны…

*Паводле газетных публікацый. Снежань 2010 – сакавік 2011*

## *Хроніка пачуццяў*

*«…ішлі весела, ішлі несур'ёзна»*

— Прозвішча я называю не сваё, а маёй бабулі. Я баюся… вядома… Усе чакаюць нейкіх герояў, а я не гераіня. Я не была да гэтага гатовая. У турме я думала толькі пра маму, пра тое, што ў яе хворае сэрца. Што будзе з ёй? Хай мы пераможам, пра гэта напішуць у падручніках гісторыі… А слёзы нашых блізкіх? Іх пакуты? Ідэі — наймагутнейшая рэч, страшная, гэта сіла нематэрыяльная, яе нельга ўзважыць. Няма вагі… гэта іншая матэрыя… Нешта становіцца важнейшым за маму. Табе трэба выбіраць. А ты не гатовая… Цяпер я ведаю, што такое ўвайсці ў свой пакой, калі кадэбісты пакорпаліся ў тваіх рэчах, кнігах… прачыталі твой дзённік… *(Маўчыць.)* Збіралася сёння

да вас, і ў гэты час патэлефанавала мая мама, я сказала ёй, што сустракаюся з вядомай пісьменніцай, яна стала плакаць: «Маўчы. Нічога не расказвай». Падтрымліваюць мяне незнаёмыя людзі, а родныя, блізкія — не. Але яны любяць мяне…

Перад мітынгам… Збіраліся ўвечары ў інтэрнаце і спрачаліся. Пра жыццё і на гэтую тэму: хто ідзе на мітынг — хто не ідзе? Узгадаць гэта? Пра што гаварылі? Прыкладна так…

—Пойдзеш?

—Не пайду. Адлічаць з інстытута і заграбуць у войска. Буду бегаць з аўтаматам.

—А мяне, калі выганяць, бацька адразу аддасць замуж.

—Досыць балбатаць, пара нешта рабіць. Калі ўсе будуць баяцца…

—Ты хочаш, каб я стаў Чэ Гевapaм? (Гэта словы майго ўжо былога бой-фрэнда, я пра яго таксама скажу.)

—Глыток свабоды…

—Я пайду, бо надакучыла жыць пры дыктатуры. Трымаюць нас за быдла без мазгоў.

—Ну, а я не герой. Хачу вучыцца, кніжкі чытаць.

—Анекдот пра «саўка»: злосны, як сабака, а маўчыць, як рыба.

—Я маленькі чалавек, ад мяне нічога не залежыць. Я ніколі не хаджу на выбары.

—Я рэвалюцыянер… я пайду… Рэвалюцыя — кайф.

—Якія ў цябе рэвалюцыйныя ідэалы? Новая светлая будучыня — капіталізм? Няхай жыве лацінаамерыканская рэвалюцыя!

—У шаснаццаць гадоў я асуджаў бацькоў, яны ўвесь час чагосьці баяліся, бо ў таты кар'ера. Я думаў: яны тупыя, а мы — круцізна такая! Мы выйдзем! Мы скажам! Цяпер я такі ж, як яны, канфарміст. Сапраўдны канфарміст. Паводле тэорыі Дарвіна, выжываюць не дужыя, а найбольш прыстасаваныя да навакольнага асяроддзя. Выжывае пасрэднасць і працягвае род.

—Пайсці туды — значыць быць дурнем, не пайсці — яшчэ горш.

—Хто вам, тупым баранам, сказаў, што рэвалюцыя — гэта прагрэс? Я — за эвалюцыю.

—Мне што «белыя», што «чырвоныя»... Усё пофіг!

—Я — рэвалюцыянер...

—Няма сэнсу! Прыедуць вайсковыя машыны з брытагаловымі мальцамі, і ты атрымаеш па балдзе дубінкай, вось і ўсё. Улада павінна быць жалезнай.

—Пайшоў ён на х..., таварыш маўзер. Я нікому не абяцаў быць рэвалюцыянерам. Хачу скончыць інстытут і пачаць свой бізнэс.

—Выбух мозгу!

—Страх — гэта хвароба...

Ішлі весела, ішлі несур'ёзна. Шмат смяяліся, спявалі песні. Усе страшэнна падабаліся адно аднаму. Прыўзняты быў настрой. Хто з плакатам ідзе, хто з гітарай. Сябры тэлефанавалі нам на мабільнікі і паведамлялі, што пішуць у інтэрнэце. Мы былі ў курсе... Так даведаліся: двары ў цэнтры горада забітыя вайсковай тэхнікай з салдатамі і міліцыяй. Да горада падцягнулі войскі... У гэта верылася і не верылася, настрой вагаўся, але страху ніякага не было. Раптам страх знік. Ну па-першае, вунь колькі людзей... Дзясяткі тысяч! Самыя розныя людзі. Ніколі нас не было так шмат. Я не памятаю... А па-другое, мы ў сябе дома. Урэшце, гэта наш горад. Наша краіна. У Канстытуцыі запісаныя нашы правы: свабода сходаў, мітынгаў, дэманстрацый, шэсцяў... Свабода слова... Ёсць законы! Першае непалоханае пакаленне. Нябітае. Нестралянае. А калі пасадзяць на пятнаццаць сутак? Ну й няхай! Будзе пра што напісаць у ЖЖ. Няхай улада не думае, што мы статак, які бяздумна ідзе за пастухом! Замест мазгоў у нас тэлевізар. На ўсялякі выпадак у мяне была з сабою конаўка, бо я ўжо ведала: у турэмнай камеры адна конаўка на дзесяць чалавек. Яшчэ паклала

ў заплечнік цёплы швэдар і два яблыкі. Ішлі і фатаграфавалі адно аднаго, каб запомніць гэты дзень. У калядных масках, са смешнымі заечымі вушкамі, якія свяціліся… Кітайскія такія цацкі. Каляды вось-вось… Падаў снег… Якая ж красацень! П'яных не бачыла ніводнага. Калі ў каго-небудзь з'яўлялася ў руках бляшанка піва, яе тут жа адбіралі і вылівалі. На даху аднаго дома заўважылі чалавека: «Снайпер! Снайпер!» Усе развесяліліся. Яму махалі: «Давай да нас! Скачы!» Прыкольна так. Раней у мяне апатыя была да палітыкі, я ніколі не думала, што ёсць такія пачуцці, і я змагу іх зведаць. Я такое перажывала, толькі слухаючы музыку. Музыка — гэта для мяне ўсё, гэта рэч незаменная. Было шалёна цікава. Са мной побач ішла жанчына… Чаму я не спытала ейнае прозвішча? Вы б пра яе напісалі. Я была занятая іншым — вакол весела, усё новае для мяне. Гэтая жанчына ішла з сынам, яму на выгляд гадоў дванаццаць. Школьнік. Міліцэйскі палкоўнік яе ўбачыў і аблаяў у мегафон ледзь не мацюкамі, што яна дрэнная маці. Вар'ятка. А ўсе сталі ёй і сыну пляскаць у далоні. Спантанна атрымалася, ніхто не дамаўляўся. Гэта так важна… так важна ведаць… Бо нам увесь час сорамна. Ва ўкраінцаў быў Майдан, у грузінаў — «рэвалюцыя ружаў». А з нас смяюцца: Мінск — камуністычная сталіца, апошняя дыктатура Еўропы. Цяпер я жыву з іншым пачуццём: мы выйшлі. Не пабаяліся. Гэта галоўнае… гэта самае галоўнае…

Вось сталі: мы і яны. Тут адзін народ, там іншы. Гэта дзіўна выглядала… Адны з плакатамі і партрэтамі, а іншыя — у баявым шэрагу і ў поўнай экіпіроўцы, са шчытамі і дубінкамі. Сталі плячыстыя хлопцы. Прыгажуны рэальныя! Ну як гэта яны пачнуць нас біць? Мяне біць? Мае аднагодкі, кавалеры. Факт! Сярод іх ёсць знаёмыя хлопчыкі з маёй вёскі, яны, вядома, тут. У нас шмат хто з'ехаў у Мінск і служыць у міліцыі: Колька Латушка, Алік Казначэеў… Нармальныя хлопцы. Такія ж, як і мы, толькі з пагонамі. І яны пойдуць на нас? Не верылася… Ну ніяк… Смяяліся, пад'юджвалі іх. Агітавалі: «Што, хлопцы,

будзеце з народам ваяваць?» А снег ідзе й ідзе. І тут… Ну, быццам як на парадзе… Пачулася вайсковая каманда: «Рассякайце натоўп! Трымайце шыхт!» Мазгі не ўключаліся ў рэальнасць, не адразу… бо такога не можа быць… «Рассякайце натоўп…» На нейкі момант цішыня. І тут жа грукат шчытоў… рытмічны грукат шчытоў… Яны пайшлі… шэрагамі ішлі і грукалі дубінкамі па шчытах, як паляўнічыя гоняць звера. Здабычу. Ішлі, ішлі й ішлі. Ніколі я не бачыла такой колькасці вайскоўцаў, толькі ў тэлевізары. Я потым даведалася ад сваіх вясковых хлопцаў… Іх вучаць: «Самае страшнае, калі вы ўбачыце ў дэманстрантах людзей». Нацкоўваюць, як сабак. *(Маўчыць.)* Крыкі… плач… Крыкі: «Б'юць! Б'юць!» Я ўбачыла — б'юць. Ведаеце, яны з азартам білі. З задавальненнем. Я запомніла, што білі з задавальненнем… як быццам на трэніроўцы… Дзявочы віск: «Што ты робіш, вырадак!» Высокі-высокі голас. Сарваўся. Было так страшна, што я на нейкі момант заплюшчыла вочы. На мне белая куртка, белая шапачка. Стаю ўся ў белым.

*«Мордай у снег, сука!»*

Аўтазак… Цуд-машына. Я ўпершыню яе там убачыла. Гэта спецыяльны фургон для перавозкі зняволеных. Усё абшытае сталлю. «Мордай у снег, сука! Адзін рух — заб'ю!» Я ляжу на асфальце… Я ляжу не адна, усе нашы тут… пустата ў галаве… думак няма… Адзінае рэальнае адчуванне — холад. Штуршкамі і дубінкамі нас падымаюць і запіхваюць у аўтазакі. Цяжэй за ўсё хлопцам, іх стараюцца біць паміж ног: «Ты па яйцах яго бі, па яйцах! Па ябалу!», «Бі ў косць!», «Мачы іх!». Білі і філасофствавалі: «Піздзец вашай рэвалюцыі!», «За колькі долараў ты прадаў Радзіму, гад?». Аўтазак — два на пяць метраў — разлічаны на дваццаць чалавек, сказалі дасведчаныя людзі, нас утрамбавалі больш за пяцьдзясят. Трымайцеся, сардэчнікі і астматыкі! «У вокны не глядзець! Галовы ўніз!» Мат… мат… Праз нас, «прыдуркаў недаробленых», якія «прадаліся амеры-

косам», яны сёння не паспелі на футбол. Іх цэлы дзень трымалі ў крытых машынах. Пад брызентам. Мачыліся ў цэлафанавыя пакеты і прэзерватывы. Выскачылі галодныя, злыя. Можа, яны самі па сабе неблагія людзі, але яны працуюць катамі. Нармальныя з выгляду хлопцы. Маленькія шрубкі сістэмы. Біць — не біць, вырашаюць не яны, але б'юць яны… Спачатку б'юць, а потым думаюць, а можа, і не думаюць. *(Маўчыць.)* Доўга некуды ехалі, то наперад, то разварочваемся назад. Куды? Поўная невядомасць. Калі адчынілі дзверы, на пытанне: «Куды нас вязуць?» — атрымалі адказ: «У Курапаты» (месца масавых пахаванняў ахвяраў сталінскіх рэпрэсій). Такія ў іх садысцкія жартачкі. Нас доўга вазілі па горадзе, бо ўсе турмы былі перапоўненыя. Начавалі ў аўтазаку. На вуліцы дваццаць градусаў ніжэй за нуль, а мы ў жалезнай скрыні. *(Маўчыць.)* Я павінна іх ненавідзець. А я нікога не хачу ненавідзець. Я да гэтага не гатовая.

За ноч ахова некалькі разоў змянялася. Твараў не памятаю, яны ў форме ўсе аднолькавыя. А аднаго… Я яго і цяпер пазнала б на вуліцы, я пазнала б яго па вачах. Не стары і не малады, мужчына як мужчына, нічога асаблівага. Што ён рабіў? Ён расчыняў дзверы аўтазака насцеж і доўга трымаў іх адчыненымі, яму падабалася, калі мы пачыналі калаціцца ад холаду. Усе ў куртачках, боты танныя, мех штучны. Глядзеў на нас і ўсміхаўся. У яго не было такога загаду, ён сам дзейнічаў. Па сваёй ініцыятыве. А іншы міліцыянер сунуў мне «снікерс»: «На, вазьмі. І чаго ты паперлася на гэтую плошчу?» Кажуць, каб гэта зразумець, трэба чытаць Салжаніцына. Калі я вучылася ў школе, я брала ў бібліятэцы «Архіпелаг ГУЛАГ», але ён мяне тады не захапіў. Тоўстая і нудная кніга. Старонак пяцьдзясят прачытала і кінула… Нешта далёкае-далёкае, як Траянская вайна. Сталін — пройдзеная тэма. Я, мае сябры — мы мала ім цікавіліся…

Першае, што з табой адбываецца ў турме… З тваёй сумачкі вывальваюць на стол усе рэчы. Адчуванне? Нібы цябе

раздзяваюць… І ў літаральным сэнсе раздзяваюць таксама: «Зняць ніжнюю бялізну. Рассунуць ногі на шырыню плячэй. Прысесці». Што яны шукалі ў мяне ў анусе? Абыходзіліся з намі, як з зэкамі. «Тварам да сценкі! Глядзець уніз!» Увесь час загадвалі глядзець у падлогу. Ім страшна не падабалася, калі глядзіш у вочы: «Тварам да сценкі! Я ска-а-за-а-ў — тварам да сценкі!» Усюды строем… І ў прыбіральню вадзілі строем: «Пастроіцца ў патыліцу адзін аднаму». Каб усё гэта вытрымаць, я паставіла бар'ер: тут — мы, а тут — яны. Допыт, следчы, пакаранні… На допыце: «Ты павінна напісаць: "Цалкам прызнаю сваю віну"». — «А ў чым я вінаватая?» — «Ты што! Не разумееш? Ты ўдзельнічала ў масавых беспарадках…» — «Гэта была мірная акцыя пратэсту». Пачынаецца прэсуха: выключаць з інстытута, маму звольняць з працы. Як яна можа працаваць настаўніцай, калі ў яе такая дачка? Мама! Я ўвесь час думала пра маму… Яны гэта зразумелі, і кожны допыт пачынаўся са слоў: «Мама плача», «Мама ў бальніцы». І зноў: назаві прозвішчы… Хто ішоў з табой побач? Хто раздаваў улёткі? Падпішы… назаві… Абяцаюць, што ніхто не будзе пра гэта ведаць і адразу адпусцяць дадому. Трэба выбіраць… «Я нічога вам не падпішу». А начамі я плакала. Мама ў бальніцы… *(Маўчыць.)* Здраднікам стаць лёгка, бо маму любіш… Не ведаю, ці вытрымала б яшчэ месяц. Яны смяяліся: «Ну што, Зоя Касмадзям'янская?» Маладыя хлопцы, вясёлыя. *(Маўчыць.)* Мне страшна… Мы з імі ходзім у тыя самыя крамы, сядзім у тых самых кавярнях, ездзім у адным метро. Паўсюль разам. У звычайным жыцці няма выразнай мяжы паміж «намі» і «імі». Як іх пазнаць? *(Маўчыць.)* Раней я жыла ў добрым свеце, яго ўжо няма, і яго не будзе.

Цэлы месяц у камеры… За ўвесь гэты час ні разу не бачыла люстэрка. У мяне было маленькае, але яно пасля дагляду рэчаў знікла з сумачкі. І кашалёк з грашыма знік. Піць увесь час хацелася. Невыносная смага! Піць давалі толькі разам з ежай, а ў астатні час: «Піце з прыбіральні». Іржуць. Самі п'юць

фанту. Мне здавалася, што я ніколі не нап'юся, на волі заб'ю лядоўню мінералкай. Мы ўсе смярдзючыя... памыцца няма дзе... У кагосьці знайшоўся маленькі флакончык парфумы, перадавалі адна адной і нюхалі. А дзесьці нашы сябры пішуць канспекты, сядзяць у бібліятэцы. Здаюць залікі. Успаміналася чамусьці розная лухта... Новая сукенка, якую я ні разу не надзела... *(Засмяялася.)* Даведалася, што радасць прыносіць такая дробязь, як цукар ці кавалачак мыла. У камеры на пяць чалавек — трыццаць два квадратныя метры, нас сядзела сямнаццаць. Трэба было навучыцца жыць на двух метрах. Асабліва цяжка было ўначы, дыхаць няма чым. Доўга не спалі. Размаўлялі. Першыя дні пра палітыку, а потым толькі пра каханне.

*«...не хочацца думаць, што яны робяць гэта добраахвотна»*
*(размовы ў камеры)*

«...Усё адбываецца паводле таго самага сцэнара... Па коле ўсё круціцца. Народ — гэта статак. Статак антылоп. А ўлада — ільвіца. Ільвіца выбірае са статку ахвяру і забівае яе. Астатнія скубуць сваю траву, азіраючыся на ільвіцу, якая адсочвае чарговую ахвяру, усе з палёгкай уздыхаюць, калі ільвіца ахвяру заваліць: "Не мяне! Не мяне! Можна жыць далей"».

«...Я любіла рэвалюцыю ў музеі... Рамантычна была настроеная. Гуляла ў казку. Мяне ніхто не клікаў, я сама пайшла на плошчу. Цікава было ўбачыць, як рэвалюцыя робіцца. Атрымала за гэта дубінкай па мазгах і па нырках. На вуліцу выйшла моладзь, гэта была "рэвалюцыя дзяцей" — так яе назвалі. Так цяпер кажуць. А бацькі нашыя засталіся дома. Сядзелі на кухнях і гаварылі пра тое, што мы пайшлі. Перажывалі. Ім страшна, а ў нас няма савецкіх успамінаў. Мы пра камуністаў толькі ў кніжках чыталі, у нас страху не было. У Мінску жыве два мільёны чалавек, колькі нас выйшла? Тысяч трыццаць... А тых, хто глядзеў, як мы ішлі, было больш:

стаялі на балконах, сігналілі з машын, падбадзёрвалі: давайце, маўляў, хлопцы! Давайце! Заўсёды больш тых, хто сядзіць з бляшанкай піва пры тэлевізары. Дык вось і ўсе... Пакуль на вуліцах толькі мы, інтэлігентныя рамантыкі, гэта не рэвалюцыя...»

«...Думаеце, што на страху ўсё трымаецца? На міліцыі і дубінках? Памыляецеся. Кат з ахвярай можа дамовіцца. Гэта засталося ў нас з камуністычных часоў. Існуе маўклівая згода. Кантракт. Вялікая здзелка. Людзі ўсё разумеюць, але маўчаць. За гэта яны хочуць атрымліваць прыстойны заробак, купіць хоць бы патрыманую "Аўдзі" і адпачываць у Турцыі. Паспрабуй загавары з імі пра дэмакратыю, правы чалавека... Кітайская грамата! Тыя, хто жыў у савецкі час, адразу пачынаюць успамінаць: "Нашыя дзеці думалі, што бананы растуць у Маскве. А паглядзі, што цяпер... Сто гатункаў каўбасы! Якая яшчэ свабода патрэбная?" Многія і сёння хочуць у Савецкі Саюз, але каб каўбасы было навалам».

«...А я выпадкова сюды трапіла... Апынулася на плошчы з сябрамі за кампанію, захацелася патусавацца сярод плакатаў і шарыкаў. А калі шчыра... мне адзін хлопец там спадабаўся. Насамрэч, я абыякавы глядач. Выкінула з галавы ўсякую палітыку. Блін, надакучыла гэтае змаганне дабра і зла...»

«...Прыгналі нас у нейкі барак. Ноч стаялі на нагах тварам да сцяны. Раніцай: "На калені станавіся!" Стаялі на каленях. Каманда: "Устаць! Рукі ўгору!" То рукі за галаву, то сто прысяданняў. То стаяць на адной назе... Навошта яны гэта рабілі? Для чаго? Спытайся ў іх — не адкажуць. Ім дазволілі... яны адчулі ўладу... Дзяўчат ванітавала, прытомнасць гублялі. Першы раз выклікалі на допыт, я смяялася следчаму ў твар, пакуль ён не сказаў: "Я цябе зараз, дзетка, адтрахаю ва ўсе дзіркі і кіну ў камеру да крымінальнікаў". Я не чытала Салжаніцына, і следчы, думаю, яго не чытаў. Але мы ўсе ведалі...»

«...Мой следчы — адукаваны чалавек, скончыў той жа ўніверсітэт, што і я. Высветлілася, што мы адны кніжкі любім:

Акунін, Умберта Эка… “Адкуль, — кажа ён, — ты ўзялася на маю галаву? Я займаўся карупцыянерамі. Мілая справа! З імі ўсё зразумела. А з вамі…” Нехаця ён робіць сваю справу, з сорамам, але робіць. Такіх тысячы, як ён: чыноўнікі, следчыя, суддзі. Адны б'юць, іншыя хлусяць у газетах, трэція арыштоўваюць, выносяць прысуды. Так мала трэба для запуску сталінскай машыны».

«…У нашай сям'і захоўваецца стары агульны сшытак. Дзед напісаў для дзяцей і ўнукаў гісторыю свайго жыцця. Распавёў, як перажыў сталінскі час. Яго пасадзілі ў турму і каталі: надзявалі адгазнік на галаву і перакрывалі кісларод. Раздзявалі і жалезным прэнтам ці дзвярной ручкай у анус… Я вучылася ў дзясятым класе, калі мама дала мне гэты сшытак: “Ты ўжо дарослая. Мусіш гэта ведаць”. А я не разумела — навошта?»

«…Калі вернуцца лагеры, вертухаі знойдуцца. Ды іх будзе навалам! Аднаго добра памятаю… Гляджу яму ў вочы — нармальны хлопец, а ў яго пена з рота. Як у сне яны рухаліся, у трансе. Малацілі налева-направа. Адзін мужчына ўпаў, яны накрылі яго шчытом і танчылі на ім. Амбалы… пад два метры… Восемдзесят ці сто кілаграм у кожным, іх адкормліваюць да баявой вагі. АМАП і спецназ — гэта адмысловыя хлопцы… як апрычнікі Івана Жахлівага… Не хочацца думаць, што яны робяць гэта добраахвотна, з усіх сіл не хочацца так думаць. З самых апошніх сіл. Ім есці трэба. Хлопец… У яго за плячыма толькі школа і войска, а ён атрымлівае больш за ўніверсітэцкага выкладчыка. Потым… гэта будзе, як заўсёды… гэта абавязкова… Потым яны будуць казаць, што выконвалі загад, нічога не ведалі, яны ні пры чым. Яны і сёння знаходзяць тысячу апраўданняў: “А хто маю сям'ю будзе карміць?”, “Я даваў прысягу”, “Я ж не мог выйсці з шыхту, нават калі б хацеў”. З кожным чалавекам можна гэта зрабіць. У кожным разе, з многімі…»

«…Мне толькі дваццаць гадоў. Як жыць далей? Мне здаецца, што я выйду ў горад і буду баяцца падняць вочы…»

### *«...гэта ў вас там рэвалюцыя, а ў нас савецкая ўлада»*

Выпусцілі нас уначы. Журналісты, сябры — усе чакалі каля турмы, а нас вывезлі ў аўтазаку і раскідалі па ўскраінах горада. Мяне пакінулі дзесьці ў Шабанах. Каля нейкіх камянёў, каля новабудоўляў. Рэальна было страшна. Пастаяла ў разгубленасці і пайшла на агні. Грошай няма, мабільнік даўно разрадзіўся. У кашальку ляжала толькі квітанцыя, нам усім выдалі такія квітанцыі, каб мы аплацілі сваё ўтрыманне ў турме. Гэта мая месячная стыпендыя... Нават не ведаю... Мы з мамай ледзь перабіваемся з грашыма. Тата памёр, калі я вучылася ў шостым класе, мне было дванаццаць гадоў. Айчым свой заробак прапівае-прагульвае з поспехам. Алкаш. Я яго ненавіджу, ён сапсаваў нам з мамай жыццё. Я ўвесь час стараюся падзарабіць: разношу па паштовых скрынках усялякія рэкламкі, улетку садавінoй з латка гандлюю або марозівам. Ішла з гэтымі думкамі... Нейкія сабакі бегалі... людзей нідзе не відаць... Страшэнна ўзрадавалася, калі побач спынілася таксі. Назвала адрас свайго інтэрната, але кажу: «У мяне грошай няма». Таксіст чамусьці адразу здагадаўся: «А-а-а, дзекабрыстка! (Арыштавалі нас у снежні.) Сядай. Ужо адну такую падабраў і адвёз дадому. І чаго гэта вас ноччу выпускаюць?» Вёз і вучыў розуму: «Дурнота ўсё гэта! Лухта! Я ў дзевяноста першым вучыўся ў Маскве і таксама бегаў на дэманстрацыі. Нас было болей, чым вас. Мы перамаглі. Марылі, што кожны адкрые фірму і стане багатым. І — што? Пры камуністах я працаваў інжынерам, а цяпер баранку кручу. Адных свалачэй прагналі, іншыя прыйшлі. Чорныя, шэрыя, аранжавыя — усе яны аднолькавыя. У нас улада кожнага чалавека псуе. Я — рэаліст. Веру толькі ў сябе і ў сваю сям'ю. Пакуль чарговыя ідыёты ладзяць чарговую рэвалюцыю, я батрачу. У гэтым месяцы трэба дочкам на курткі зарабіць, а ў наступным — жонцы на боты. Ты — дзяўчына прыгожая. Знайдзі добрага хлопца і выходзь

лепей замуж». Заехалі ў горад. Музыка. Смех. Парачкі цалуюцца. Горад жыў, як быццам нас не было.

Мне карцела пагаварыць са сваім сябрам. Не магла дачакацца. Мы ўжо тры гады былі разам. Рабілі планы. *(Маўчыць.)* Ён абяцаў мне, што будзе на мітынгу, але не прыйшоў. Я чакала тлумачэння. Ну вось з'явіўся — не запыліўся. Прыбег. Дзяўчаты пакінулі нас удваіх у пакоі. Якія тлумачэнні!? Смешна! Я, аказваецца, «проста дурніца», «яскравы экземпляр», «наіўная рэвалюцыянерка». Ён мяне папярэджваў — забылася? Ён мяне вучыў, што не рацыянальна парыцца пра рэчы, на якія не можаш паўплываць. Ёсць такая пазіцыя — жыць дзеля іншых, але яму яна не блізкая, ён не хоча паміраць на барыкадах. Не ягонае гэта пакліканне. У яго галоўная мэта — кар'ера. Ён хоча шмат грошай. Дом з басейнам. Трэба жыць і ўсміхацца. Сёння столькі магчымасцяў… вочы разбягаюцца… Можаш падарожнічаць па свеце, афігенныя круізы, але яны каштуюць дорага, набывай хоць палац, але ён каштуе дорага, можаш замовіць у рэстаране чарапашы суп… Толькі плаці за ўсё. Грошыкі! Грошыкі! Як вучыў нас выкладчык фізікі: «Дарагія студэнты! Памятайце, што грошы рашаюць усё, нават дыферэнцыяльныя ўраўненні». Суровая праўда жыцця. *(Маўчыць.)* Ну а ідэалы? Нічога такога, выходзіць, няма? Можа, вы мне што-небудзь падкажаце? Вы ж кнігі пішаце… *(Маўчыць.)* На агульным сходзе мяне адлічылі з інстытута. Усе паднялі руку «за», акрамя майго ўлюбёнага старога прафесара. З інстытута яго звезлі ў гэты дзень на «хуткай». Сяброўкі суцяшалі ў інтэрнаце, калі ніхто не бачыў: «Ты, маўляў, не крыўдуй, дэкан застрашыў, што выганіць з інтэрната, калі што… А-а-а-а!» Гераіні!

Узяла квіток дадому. У горадзе я сумую па сваёй вёсцы. Праўда, я не ведаю, па якой вёсцы сумую, напэўна, я сумую па сваёй «дзіцячай» вёсцы. Па той вёсцы, дзе тата браў мяне з сабой, калі даставаў з вуллёў цяжэзныя рамкі з мёдам. Спачатку ён абкурваў іх дымам, каб пчолы адляцелі і нас не

джалілі. Маленькая, я была смешная… Я думала, што пчолы — гэта таксама птушачкі… *(Маўчыць.)* Ці люблю я вёску цяпер? Жывуць тут як раней, з году ў год. Капаюць рыдлёўкай бульбу на сваіх гародах, поўзаюць на каленьках. Гоняць гарэлку. Увечары цвярозага мужыка не сустрэнеш, яны п'юць кожны дзень. Галасуюць за Лукашэнку і шкадуюць аб Савецкім Саюзе. Аб непераможнай Савецкай арміі. У аўтобусе побач са мною сеў наш сусед. П'яны. Гаварыў пра палітыку: «Кожнаму вылюдку-дэмакрату я сам бы морду набіў. Мала вам далі. Ну напраўду! Страляць такіх трэба. У мяне б рука не схібіла. Амерыка за ўсё плаціць… Хілары Клінтан… Але мы народ моцны. Перажылі перабудову, перажывём і рэвалюцыю. Я ад аднаго разумнага чалавека чуў, што рэвалюцыю прыдумалі жыды». Увесь аўтобус яго падтрымліваў: «Не было б горай, чым цяпер. Уключыш тэлевізар — усюды бамбяць, страляюць».

Вось і дом. Адчыніла дзверы. Мама сядзела на кухні і чысціла клубні вяргіні, яны падмерзлі і загнілі ў склепе, бо капрызлівыя. Баяцца марозу. Я стала дапамагаць. Як у дзяцінстве. «Што там у вас у сталіцы? — першае пытанне мамы. — У тэлевізары паказалі мора людзей, усе крычалі супраць улады. Божачка мілы! Страх! Мы тут баяліся, што вайна пачнецца: у адных сыны ў АМАПе служаць, у іншых — студэнты, выйшлі на плошчу і крычалі. У газетах пішуць, што гэта "тэрарысты" і "бандыты". Нашы людзі газетам вераць. Гэта ў вас там рэвалюцыя, а ў нас савецкая ўлада». У доме пахла валяр'янкай.

Я даведалася пра вясковыя навіны… Па Юрку Шведа, фермера, уначы прыехала машына і двое ў цывільным, як у трыццаць сёмым па нашага дзеда. Увесь дом перавярнулі. Камп'ютар забралі. Звольнілі медсястру, Аню Н. — яна ездзіла ў Мінск на мітынг, запісалася ў апазіцыйную партыю. У яе дзіцятка маленькае. Мужык напіўся і пабіў: апазіцыянерка! А маці хлопцаў, якія служаць у мінскай міліцыі, выхваляюцца, што

іх сыны вялікія прэміі атрымалі. Прывезлі падарункі. *(Маўчыць.)* Падзялілі народ на дзве паловы... Я пайшла ў клуб на танцы, за ўвесь вечар мяне ніхто не запрасіў танцаваць. Бо... тэрарыстка... Мяне баяліся...

*«...ён можа ператварыцца ў чырвоны колер»*

*Сустрэліся выпадкова праз год у цягніку «Масква — Мінск». Усе ўжо даўно спалі, а мы размаўлялі.*

— Вучуся ў Маскве. Хаджу на маскоўскія мітынгі з сябрамі. Клёва так! Мне падабаюцца твары людзей, якія я бачу там. Я памятаю такія твары ў нас, калі мы выйшлі на плошчу ў Мінску. Я не пазнавала свой горад, людзей не пазнавала. Гэта былі іншыя людзі. Сумую па доме, моцна сумую па доме.

Сяду ў беларускі цягнік і ніяк не магу заснуць. Паўсон... паўява... То я ў турме, то ў інтэрнаце, то... Усё ўспамінаецца... Мужчынскія і жаночыя галасы...

«...Ставілі на расцяжку, ногі заводзілі за галаву...»

«...Паклалі аркуш паперы на ныркі, каб не засталося слядоў, і білі пластыкавай бутэлькай з вадой...»

«...Ён надзяваў мне на галаву цэлафанавы пакет або адгазнік. Ну, а далей... самі разумееце, праз пару хвілін я губляў прытомнасць... А ў яго дома жонка і дзеці. Добры муж. Добры бацька...».

«...Б'юць, б'юць, б'юць, б'юць... ботамі, чаравікамі, красоўкамі...»

«...Ты думаеш, што іх вучаць толькі скакаць з парашутам, дэсантавацца па канаце з верталёта? Іх вучаць па тых жа падручніках, што і пры Сталіне...»

«...У школе нам казалі: "Чытайце Буніна, Талстога, гэтыя кнігі ратуюць людзей". У каго спытаць: чаму гэта не перадаецца, а дзвярная ручка ў анус і цэлафанавы пакет на галаву — перадаецца?»

«...Ім падвысяць заробак у два-тры разы... Баюся, яны будуць страляць...»

«...У войску я зразумеў, што люблю зброю. Прафесарскі хлопчык, які вырас сярод кніг. Я хачу мець пісталет. Прыгожая рэч! За сотні гадоў яго добра прыстасавалі да рукі. Трымаць прыемна. Мне падабалася б яго даставаць, чысціць. Змазваць. Люблю гэты пах».

«...Як ты думаеш, ці рэвалюцыя будзе?»

«...Аранжавы — гэта колер сабачай мачы на снезе. Але ён можа ператварыцца ў чырвоны...»

«...Мы ідзём...»

# ЗАЎВАГА АБЫВАЦЕЛЯ

—Што ўспомніць? Жыву як усе. Была перабудова… Гарбачоў… Паштарка адчыніла весніцы: «Чула, камуністаў ужо няма?» — «Як няма?» — «Партыю закрылі». Ніхто не страляў, нічога. Цяпер кажуць, што была вялікая дзяржава і ўсё знікла. А што ў мяне знікла? Як жыла я ў доміку без усялякіх выгодаў — без вады, без каналізацыі, без газу — так і жыву. Сумленна працавала ўсё жыццё. Надрывалася, надрывалася, прывыкла працаваць. І заўсёды атрымлівала капейкі. Як ела макарону і бульбу, так і ем. Футра даношваю савецкае. У нас тут — снегу!

Найлепшы ў мяне ўспамін, як я замуж выходзіла. Каханне было. Памятаю, вярталіся з ЗАГСу, і буяў бэз. Бэз буяў! У ім, вы паверыце, спявалі салаўі… Я так памятаю… Дружна пажылі мы пару гадоў, дзяўчынку нарадзілі… А потым Вадзік запіў і згарэў ад гарэлкі. Малады мужык, сорак два гады. Так і жыву адна. Дачка ўжо вырасла, выйшла замуж і з'ехала.

Узімку нас засыпае снегам, увесь пасёлак у снезе — і дамы, і машыны. Бывае, што тыднямі не ходзяць аўтобусы. Што там у сталіцы? Ад нас да Масквы — тысяча кіламетраў. Глядзім маскоўскае жыццё ў тэлевізары, як кіно. Пуціна і Алу Пугачову ведаю… астатніх нікога… Мітынгі, дэманстрацыі… А мы тут — як жылі, так і жывём. І пры сацыялізме, і пры капіталізме. Нам што «белыя», што «чырвоныя» — аднолькава. Трэба дачакацца вясны. Бульбу пасадзіць… *(Доўга маўчыць.)* Мне шэсцьдзесят гадоў… Я ў царкву не хаджу, а пагаварыць з кім-небудзь трэба. Пагаварыць пра іншае… Пра тое, што старэць неахвота, старэць зусім не хочацца. А паміраць будзе шкада. Бачылі, які ў мяне бэз? Выйду ноччу — ён ззяе. Пастаю, пагляджу. Давайце я вам наламлю букет…

# СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ:
# «САЦЫЯЛІЗМ СКОНЧЫЎСЯ. А МЫ ЗАСТАЛІСЯ»

*Гутарыць Наталля Ігрунова*

*Цыкл кніг пра вялікую Утопію і народжанага ёю чалавека Святлана Алексіевіч задумала амаль тры дзясяткі гадоў таму. Як згадваюць студэнцкія сябры — пазычыла ў Васіля Быкава, Янкі Брыля і Алеся Адамовіча пяць тысяч рублёў (вялізныя па тых часах грошы), узяла ў часопісе, дзе працавала, творчы адпачынак, набыла шпулевы магнітафон (іншых тады не было) і паехала па гарадах і весях Савецкага Саюза запісваць успаміны франтавічак. Так з'явілася кніга, назва якой стала ідыёмай: «У вайны не жаночы твар». З тых часоў былі напісаныя «Апошнія сведкі», «Цынкавыя хлопчыкі», «Чарнобыльская малітва». Святлана Алексіевіч стала вядомым пісьменнікам, лаўрэатам найбольш прэстыжных расійскіх, еўрапейскіх і амерыканскіх літаратурных прэмій. А краіны, якая паспрабавала Утопію ажыццявіць, больш няма. Новая праца, якая завяршае «пяцікніжжа»: «Час сэканд хэнд» — развітанне з эпохай.*

*Вось ужо дваццаць гадоў мы вядзём са Святланай гутарку пра яе кнігі і пра тое, як мяняецца свет і мяняемся мы.*

Н. І.: Ты сваёй кнігай трапляеш у галоўны нерв сённяшняй светапогляднай палемікі. Мінула больш за дваццаць гадоў пасля СССР, а расійскае грамадства па-ранейшаму дзеліцца паводле гэтага разлому: «за» ці «супраць». Самыя жарсныя дыскусіі на палітычных ток-шоў, увогуле ў СМІ, новыя заканадаўчыя ініцыятывы думскіх дэпутатаў — пра тое, ці трэба выносіць Леніна з маўзалея, пра Сталіна, пераацэнку падзеяў Вялікай Айчыннай вайны, пра ролю Гарбачова і Ельцына, пра тое, як

новая і найноўшая гісторыя павінна трактавацца ў школьных падручніках.

С. А.: Гэта ад страху. Ад страху перад новай рэальнасцю, якая нам адкрылася, да якой мы не гатовыя і перад якой бездапаможныя. І таму найлепшая абарона, як нам уяўляецца, — скласці кубікі не з падзеяў мінулага нават, а з нашых міфаў. Нас выкінула з уласнай гісторыі ў агульны час. Спачатку нам здавалася, што мы лёгка ўбудуемся ў гэты свет. Масавая свядомасць спадзявалася: у нас будуць такія самыя вітрыны, такія самыя крамы. Інтэлектуалы думалі, што яны вось так, з ходу, акажуцца на ўзроўні сусветнай эліты. А высветлілася, што ўсё не так проста. Што гэта вялізная праца, гэта патрабуе свабодных людзей, якімі мы не былі, і свабоднага мыслення, якім мы не валодалі. І мы пайшлі не ў свет, а ад свету.

Н. І.: Нядаўна апублікаванае свежае «лявадаўскае» сацыялагічнае апытанне пра стаўленне да лідараў краіны. Лепш за ўсё ставяцца да Брэжнева (56%), Леніна (55%), Сталіна (50%). Да Гарбачова і Ельцына стаўленне адмоўнае (66 і 64% адпаведна).

С. А.: Расчараванне ў тым, што адбылося, велізарнае. Гэта сведчыць пра тое, што эліты не зрабілі сваю работу.

Н. І.: У цябе адзін з герояў кнігі наракае: «Нічога яшчэ не зразумелі пра наш нядаўні свет, а жывём у новым. Цэлая цывілізацыя — на сметніку». Можа, праблема якраз у тым, што мы спрабуем не разабрацца, што адбылося, а ацаніць — добра ці дрэнна? Твае кнігі, даючы выказацца самым розным людзям, апісваюць час.

С. А.: Я апісваю не ўласна ідэю, а метафізічную трагедыю чалавечага жыцця, якое апынулася ў гэтых жорнах. І нікога не

суджу. Гэтая ўтапічная ідэя пажырала найлепшых, найпрыгажэйшых людзей, якія кінуліся у новае жыццё з верай, што яны ашчасліваць чалавецтва, пабудуюць жыццё правільна, добра. Я сустракала яшчэ такіх людзей. Хоць ніколі, ужо тысячы гадоў на развалінах нічога добрага не атрымліваецца, а заўсёды трэба настройвацца на марудную, доўгую працу.

Н. І.: Дык праблема ў ідэі ці ў яе ўвасабленні і «выканаўцах»?

С. А.: Аб адказнасці ідэі таксама варта казаць. Я ўпэўненая: трэба не людзей забіваць, а змагацца з ідэямі. Я доўга жыла ў Еўропе — нідзе пісьменнікі, тэатралы, мастакі не замыкаюцца ў сваіх вышэйшых сферах ці гламурных гульнях. Ідзе няспынная дыскусія пра тое, што адбываецца ў грамадстве. Асабліва ў нямецкім, якое ў гэтай сітуацыі найбольш падобнае да нашага. Там выразна зразумелі, што чалавечай прыроды трэба баяцца: аграмадны звер забіты, але монстрыкі, якія апаноўваюць чалавека, аказаліся яшчэ больш страшнымі, чым тая пачвара. А практыкі змагання з гэтымі монстрыкамі чалавечымі не маюць ні літаратура, ні інтэлектуалы.

Н. І.: Як ты сама ацэньваеш апошнія семдзесят гадоў нашай гісторыі — які гэта быў досвед? Што такое камунізм, сацыялізм? Ты ў сваёй кнізе кажаш пра «вірус», «заразу». Ці было гэта нейкае масавае «захворванне», ці светлы, недасяжны ідэал, ці, можа быць, нешта трэцяе?

С. А.: На сённяшні момант гэта, вядома, недасяжны ідэал. Чалавецтва на шляху да справядлівага грамадства, але дзесьці ў аддаленай перспектыве.

Н. І.: Большасць «простых» людзей усё, што адбылося пасля развалу Савецкага Саюза, успрымаюць як велізарную несправядлівасць.

С. А.: А тое, што адбылося ў Расіі, і ёсць велізарная несправядлівасць. Я апошнім часам аб'ехала з дзясятак расійскіх гарадоў, апытала сотні людзей. Яны не адмаўляюць жорсткасці Сталіна, рэпрэсій, але кажуць, што савецкая ўлада была больш справядлівай да простага чалавека, што чалавек з грашыма не быў такім нахабным, як сённяшнія «капіталісты» ў першым пакаленні, не было такой карупцыі. Для старэйшага пакалення галоўнай была страта чалавека добрага, з нейкім агульным жыццём, роўным для ўсіх, з апекай дзяржавы. Многія з майго пакалення, асабліва інтэлігенты, па-ранейшаму выкінутыя з жыцця, абрынутыя ў галечу. Маладыя людзі больш моцныя, многія здолелі ўладкавацца. Але гэта ў буйных гарадах, у правінцыі праблема моладзі не вырашаная, больш за ўсё яны пакутуюць ад таго, што адукацыя стала фактычна платнай. Адсюль настрой зноў усё пачаць спачатку — асабліва ў маладых.

Калі б мы тады выбралі сацыял-дэмакратычны шлях, магчыма, усё пайшло б інакш. Але што цяпер варажыць. А ў 90-я быў вельмі моцны ўдар, якога мы не чакалі. Інтэлігенцыі здавалася: мы ведаем, чаго хочам, мы клікалі новы час. Мы прагнулі перамен. А людзі ўсяго толькі хацелі лепшага жыцця. Дарэчы, мае героі на гэтыя пытанні нашмат цікавей адказваюць.

Я не гатовая разважаць як палітык ці эканаміст. Я проста хацела арганізаваць увесь гэты хаос. Грамадства распалася, атамізавалася, мноства розных ідэй працуе на гэтай прасторы. Мая задача была выбраць галоўныя кірункі жыццёвых энергетычных плыняў і неяк аформіць іх літаратурна, зрабіць гэта мастацтвам. Мне хацелася, каб кожны агучыў сваю праўду. У мяне ўсе гавораць — і каты, і ахвяры. Мы прызвычаіліся адчуваць сябе грамадствам ахвяраў. А мяне заўсёды цікавіла: чаму маўчаць каты? Чаму ўраўнаважыліся дабро і зло?

Н. І.: Ты лічыш, наша грамадства палярызаванае менавіта так: каты і ахвяры?

С. А.: Падзел, вядома, значна больш складаны. У «хоры» ёсць сюжэт пра тое, што мы раслі сярод катаў і ахвяр і бачылі, як усё перамяшалася і наколькі гэта небяспечна. Перамены патрабавалі чысціні і нейкага іншага светапогляду, але нечакана яго не знайшлося. Усё размытае, усё ў нейкіх зачатках, накідах, ружовых летуценнях, толькі раней марылі на кухні, а цяпер на плошчах. Дзейнічаць пачалі канкрэтныя дзецюкі, якія сталі дзяліць гэтую аграмадную краіну. Дзяліць, пілаваць і вывозіць.

Н. І.: Хтосьці з тваіх герояў кажа: «Сацыялізм паміраў на нашых вачах. І прыйшлі гэтыя хлопчыкі жалезныя». Глядзі, як дзіўна сышліся два вобразы: твае «цынкавыя хлопчыкі» савецкія, што былі пасланыя ў Афган і там загінулі, і такія вось «жалезныя» — бязлітасныя «браткі» з постсавецкіх 90-х — гатовыя дзеля грошай на замоўныя забойствы… Пераадрасую табе з тваёй жа кніжкі пытанне: Хіба ўжо трэба распавядаць пра сацыялізм? Каму? Яшчэ ўсе — сведкі».

С. А.: Хтосьці пражыў у той краіне большую частку жыцця, хтосьці з дзяцінства штосьці запомніў і вучыўся ў людзей, якія жылі пры сацыялізме, і з тымі падручнікамі, якія пісалі людзі з сацыялізму. Сацыялізм яшчэ ва ўсіх нас, ён паўсюль, ім усё нашпігаванае.

Н. І.: Паводле сацыялагічных апытанняў нейкі вельмі вялікі працэнт моладзі, у тым ліку народжанай пасля СССР, шкадуе пра ягоны развал. Баюся памыліцца, але, помніцца, Марыэта Чудакова вельмі жорстка сфармулявала: маўляў, так будзе, пакуль не вымруць савецкія бабулі, якія распавядаюць унукам пра сваё жыццё.

С. А.: Я б не была такой жорсткай да бабуль, яны маюць пэўную рацыю. Шмат з таго, што мы згубілі, шкада. Годнасці

перадусім. Вось гэтая годнасць маленькага чалавека. Я не лічу, што трэба вярнуць усё так, як было, але тое, у якім выглядзе ўсё атрымалася, мне, як і многім маім героям, не так ужо і падабаецца. Мары не збыліся.

Н. І.: А якую мэту ты ставіла перад сабой, калі задумвала цыкл кніг пра Утопію? Як выбірала болевыя, апорныя кропкі? Як увогуле выпрацаваліся гэты жанр і гэтая ўнутраная канструкцыя — маналогі-споведзі, што вырываюцца з безыменнага шматгалосся, перакрываюць хор?

С. А.: Я трыццаць з лішкам гадоў пісала гэтую «чырвоную» энцыклапедыю. Усё пачалося з сустрэчы з Алесем Адамовічам. Я доўга шукала свой жанр — каб пісаць так, як чуе маё вуха. І калі прачытала кнігу «Я з вогненнай вёскі», зразумела, што гэта магчыма. Мяне заўсёды мучыла, што праўда не змяшчаецца ў адно сэрца, у адзін розум. Што яна нейкая раздробленая, яе шмат і яна рассыпаная ў свеце. Як гэта сабраць? І тут я ўбачыла, што гэта можна сабраць. Так нарадзілася кніга «У вайны не жаночы твар». А вайна заўсёды чамусьці стаіць у цэнтры нашага жыцця. Тады, у 80-я, кнігу не друкавалі — існавала табу: можна толькі ўсхваляць гэтых людзей, ад генералісімуса да шарагоўцаў, і іх дзеянні, іншае — толькі эўфемізмы. І ваенная літаратура, ты ведаеш не горш за мяне, ціхенька прабівала гэтую сцяну, спрабавала расказаць пра вайну іншай мовай. Хоць бачыш, як атрымліваецца: мы няшмат дамагліся, тыя ж стэрэатыпы і страхі засталіся і сёння, і не толькі ў палітыкаў наверсе. Усе гэтыя ўзаемныя абвінавачанні ў скажэнні праўды пра вайну ўзнікаюць таму, што грамадства баіцца праўды пра сябе, баіцца ўнутранай работы. Калі б у нас была асэнсаваная будучыня, калі б мы дакладна ведалі, чаго хочам, калі б мы сапраўды будавалі новае грамадства, ішлі б у адкрыты свет, мы б так не баяліся свайго мінулага.

Н. І.: А нас чакае хтосьці ў гэтым адкрытым свеце? Такое адчуванне, што прынамсі Еўропа пачынае «капсулявацца».

С. А.: Ніхто нідзе нікога не чакае. Але існуюць пэўная агульная інтэлектуальная і палітычная прастора, логіка развіцця, агульны кірунак, ну акрамя ісламскага свету, пра які складана штосьці казаць, і мы павінны былі б ісці туды, напружыць свой патэнцыял, свае магчымасці. Новыя людзі падрастаюць, яны ездзяць і бачаць свет, гавораць на многіх мовах, яны больш адкрытыя, больш мабільныя, яны маглі б упарадкаваць гэтую новую эпоху. Але яны не запатрабаваныя. Сацыяльныя ліфты не працуюць. А што значыць дзесяць-пятнаццаць гадоў для інтэлектуальнага чалавека, калі ён бяздзейнічае, не запатрабаваны, спаралізаваны ў сваёй галоўнай спецыяльнасці… Прыехаўшы праз дзесяць гадоў у Мінск, я была ўражаная тым, колькі сяброў памерла. Яны памерлі ад таго, што ў іх скралі час. Закансервавалі ў мінулым. Спачатку скралі ўвогуле Час, а потым і іх асабісты час.

Н. І.: Памятаеш, табе нейкая старая кажа: сацыялізм скончыўся, а мы засталіся. Прычым незапатрабаванымі аказаліся тыя, хто прызвычаіўся штосьці значыць у грамадстве.

С. А.: Вядома. Гэта падсілкоўвала нейкай энергіяй. А так людзі проста пагружаліся ў пустату. У мяне ў кнізе другая частка якраз называецца «Прывабнасць пустаты». Нас спрабавалі пераканаць, што галоўнае ў жыцці — валоданне і гламур. Але, дзякуй богу, многія хутка зразумелі, што гэта пустая справа, пустата, за гэтым нічога не стаіць.

Н. І.: А пустату чымсьці трэба запоўніць.

С. А.: Усе крычаць, што патрэбная нацыянальная ідэя, а запаўняюць барахлом. У сумленнага чалавека з'явіліся новыя

магчымасці. У мяне адзін з герояў прызнаецца: калі ўпала жалезная заслона, мы думалі, усе кінуцца чытаць Салжаніцына, а людзі кінуліся есці featured рознае, чаго не каштавалі ніколі, ездзіць у тыя месцы, якія маглі пабачыць толькі ў тэлевізары…

Н. І.: У паездках па краіне пэўне ж сустракаеш людзей, якія не зламаліся, дзейных, паспяховых, з пазітыўнай устаноўкай, іх усё ж нямала і ў сярэднім пакаленні, і сярод маладых. Ці не думала ўключыць такія гісторыі ў кнігу?

С. А.: Атрымалася б чыстая журналістыка, «станоўчы прыклад». Я прайшла ў гэтай кнізе па самым балючым і паказала, што за ўсім гэтым стаіць.

Н. І.: Ты не раз казала, што мы людзі бяды і пакутаў. Можа, пакуль мы не перастанем так пра сябе думаць, нічога і не зменіцца?

С. А.: Я не ведаю, як будзе. Тое, што мы людзі бяды і пакутаў — глыбокая, даўняя руская культура. Паедзь у вёску і паразмаўляй у любой хаце: пра што будуць казаць? — толькі пра бяду.

Уся справа ў тым, якая людзям даецца ўстаноўка. У нас яна на тое, што ты і павінен ахвяраваць сабой у імя чагосьці, як у нядаўнім мінулым, ці, як цяпер — жыві адным днём, выжывай, як можаш. А ўстаноўка павінна быць, як я разумею, такая чалавечая: на асэнсаванне таго, навошта ты гэты шлях праходзіш… Гэта нашмат больш складана, чым адмоўны ці станоўчы пасыл. У нас няма культуры шчасця, радаснага жыцця. Культуры кахання. Наступная кніга, якую я буду пісаць — пра каханне: аповеды пра каханне соцень людзей. Я не магу знайсці ў рускіх пісьменнікаў кніг пра шчаслівае каханне, усё сканчаецца або смерцю, або нічым, вельмі рэдка — замуствам. У нас не было такога жыцця — адкуль жа ўзяцца такой

літаратуры, такому кіно? Пакуты, барацьба і вайна — досвед нашага жыцця і нашага мастацтва.

У мяне няма лёгкіх адказаў на твае пытанні. Я сама перад гэтай шмат'яруснасцю, перад гэтым шматгалоссем жыцця замерла, і ёсць адчуванне, што мы не кіруем гэтай плынню — куды ж нас вынесе? Адчуванне, што — гэта ў Аверынцава добра сказана — мы будавалі масты над рэкамі невуцтва, а яны змянілі рэчышча. Будучыня стала зусім непрагназаванай, як мы гаварылі з табой у адным з мінулых інтэрв'ю. Мы тут корпаемся ў сваіх праблемах, а чалавецтва, свет настолькі змяніліся, што, па-мойму, усе ў поўным здзіўленні перад гэтым мноствам жыццяў, якое раптам адкрылася.

Я лічыла сваёй задачай паставіць пытанні.

Н. І.: У гэтай кнізе заўважна, што сёння людзі ўжо распавядаюць па-іншаму і шмат у чым пра іншае, чым трыццаць, дваццаць гадоў назад.

С. А.: Яны больш шчыра расказваюць пра свае пачуцці, светаадчуванне, нашмат шырэйшы ахоп таго, што адбываецца. Знік канон, паводле якога прынята расказваць. Калі я пісала «У вайны не жаночы твар», быў канон вайны. А ўжо з чарнобыльскай кніжкай — сітуацыя цалкам іншая, канону не было, і чалавек вымушаны быў вырашаць сам, што і як ён будзе расказваць. Таксама і цяпер, пры стварэнні кнігі «Час сэканд хэнд».

Н. І.: А дарэчы — адкуль, чаму гэты б/у час у назве?

С. А.: Бо ўсе ідэі, словы — усё з чужога пляча, быццам учорашняе, ношанае. Ніхто не ведае, як мусіць быць, што нам дапаможа, і ўсе карыстаюцца тым, што ведалі калісьці, што было пражытае кімсьці, ранейшым досведам. Пакуль, на жаль, час сэканд хэнд. Але мы патроху ачуньваем і пачынаем

асэнсоўваць сябе ў свеце. Нікому ж не хочацца вечна жыць на развалінах, хочацца штосьці з гэтых абломкаў пабудаваць.

Н. І.: Пытанне — што пабудаваць і чаму менавіта гэта. Я не лічыла, але такое адчуваньне, што чалавек дзесяць нядобрым словам згадваюць у кнізе гэтую няшчасную каўбасу, сімвал капіталістычнага дабрабыту, дзеля якой адмовіліся і ад ідэі, і, у выніку, ад краіны. Вобраз магутны — перш за ўсё ў сілу прастаты жаданняў.

С. А.: У той краіне быў іншы досьвед. Калісьці Шаламаў казаў, што лагерны досвед патрэбны толькі ў лагеры. Мы апынуліся менавіта ў такой сітуацыі.

Н. І.: Многія пакаленні абапіраліся на літаратуру, на рускую класіку. Цяпер гэты навык таксама перастае працаваць, сыходзіць, чытанне перастае быць галоўным параметрам культурнага ўзроўню чалавека — і гэта якасная перамена. Вось на твой погляд — ці можна лічыць культурным чалавека, які не чытае?

С. А.: Чалавек нашага кола адкажа — нельга. Але ў паняцця высокай культуры напаўненне таксама можа быць вельмі розным. Я аднойчы была сведкай такой сцэнкі: гаспадар дома, масквіч, вельмі вядомы чалавек, які займаўся космасам, душа кампаніі, увесь вечар сыпле прыкладамі з рускай класікі, вершы напамяць чытае — і да яго падыходзіць адзін з гасцей, ягоны заходні калега, і пытаецца: вы спецыяльна вывучылі вершы напамяць? Таксама вучоны з сусветным імем. Вось гэта мяне больш за ўсё ўражвала на Захадзе — гуманітарны дыяпазон неабавязковы. Прафесійная глыбіня ёсць, а шырыні няма.

Н. І.: Можа, вінаватыя самі пісьменнікі, якія сышлі ў 90-я ад размовы пра праблемы, што хвалююць людзей? Ты чыта-

ла апошнім часам нешта, пра што сказала б: «О! Гэта нельга прамінуць»?

С. А.: Ну вось Вольгу Седакову чытала шмат. У такі цёмны час, як цяпер, нам вельмі патрэбныя прапаведнікі, і яе прысутнасць у сучасным жыцці для мяне — як ліхтарык.

Н. І.: Ты кажаш — цёмны час. У 80-я гады, у перабудову, Ліхачоў прарочыў: XX стагоддзе прынесла страшны досвед таталітарызму і прарыўны досвед навуковых ведаў, а новае стагоддзе будзе стагоддзем культуры.

С. А.: Думаю, гэта ў нас ужо не атрымаецца, як не атрымалася ў XX стагоддзі жыць паводле законаў XIX-га. Будзе штосьці іншае.

Н. І.: Той сінтэз літаратуры дакументальнай і мастацкай, які ты калісьці адкрыла для сябе, сёння ператварыўся літаральна ў трэнд. Квітнее жанр дакументальнага рамана, з'яўляюцца аўтабіяграфічныя кнігі пад прыдуманым імем, ці, наадварот, чалавек піша пад уласным імем і нібыта мемуары, але гэта «маска», імітацыя, і там могуць сутыкацца рэальныя людзі і выдуманыя персанажы, ці літаратурныя персанажы абмяркоўваюць гісторыі людзей, якія існуюць у рэальнасці…

С. А.: Гэта спробы падступіцца да рэальнасці.

Н. І.: Вядома. Прычым у сітуацыі, калі чалавек давярае дакументу і факту, а не іх інтэрпрэтацыі.

С. А.: У дакуменце і факце аказалася нашмат больш таямніц і нечаканасцяў, чым мы думалі. Нам здавалася, дакумент — простая, прамалінейная, голая рэч. А ён гэтаксама свеціцца эпохай, асобай. Сёння пашырыліся межы дачынення

з дакументам. Раней раз-пораз абсякалі: гэта чапаць нельга, туды не хадзі… Мяне заўсёды здзіўляла: чаму нельга пісаць пра асабістае, патаемнае маіх герояў?.. Проста трэба іх добра абараніць.

Н. І.: Святлана, а чым адрознівалася ўспрыманне тваіх кніг у нас і на Захадзе?

С. А.: У мяне ўжо выйшла 125 кніг на розных мовах. Цікавасць да гэтай краіны, да гэтай ідэі велізарная, і, відаць, мне ўдалося знайсці тую форму, якая дазваляе іх лепей данесці, раскрыць. Рэч не ў тым, што гэта, як нехта тут сказаў, калекцыі жахаў; пачытайце кнігі пра тое, што было ў Руандзе, на заходнім рынку ўвогуле мноства кніг пра такія жахі сучаснага жыцця, што мае побач з імі — дзіцячыя казкі. Ёсць яшчэ адна прычына, з якой мае кнігі былі прынятыя адразу. Скажам, «Цынкавыя хлопчыкі» ў Францыі — яны праз маю кнігу пра Афган загаварылі пра сваю алжырскую вайну. У «Чарнобыльскай малітвы» ў Францыі быў наклад тысяч трыста ці чатырыста, пастаўленыя дзясяткі спектакляў. І гэта звязана не толькі з тым, што на іх тэрыторыі шмат атамных станцый — штосьці ў нашым светапоглядзе, у нашым разуменні кахання, ахвяры ў імя кахання ў экстрэмальных абставінах было ім блізкае і зразумелае.

Н. І.: А ў Японіі пасля Фукусімы?

С. А.: Пасля Фукусімы перавыдалі «Чарнобыльскую малітву». У іх на востраве Хакайда ёсць атамная электрастанцыя, яна называецца «Тамара». Помню, я прыехала, калі там упершыню выйшла кніга, зірнула з акна — яна такая прыгожая, як нейкі незямны касмічны аб'ект. І на сустрэчы з чытачамі работнікі гэтай станцыі былі абсалютна ўпэўненыя, што такая аварыя магла здарыцца толькі ў нядбайлаў рускіх, а ў іх нішто падобнае немагчымае, у іх усё пралічанае. І вось раптам

землятрус усяго на бал мацнейшы, чым было закладзена для сейсмабяспекі — і ўсё, ад усяго гэтага прагрэсу застаўся сметнік... Пасля 11 верасня «Чарнобыльскую малітву» і «Цынкавых хлопчыкаў» сталі больш чытаць амерыканцы. Нам усё часцей даводзіцца задумвацца над тым, што мы не ўладныя над гэтым светам, як нам здавалася, што ёсць нейкія іншыя законы, нейкія іншыя сілы...

Н. І.: А чаму ты ўсё ж не завершыла кнігу пра каханне, над якой столькі гадоў працавала? Мне здаецца, без яе гэты цыкл пра савецкага чалавека няпоўны. Гэта ж быў і час нейкіх вельмі рамантычных парыванняў, светлага кахання...

С. А.: Не, гэты цыкл на сённяшні дзень завершаны. У яго ўвайшло пяць кніг: «У вайны не жаночы твар», «Апошнія сведкі», «Цынкавыя хлопчыкі», «Чарнобыльская малітва» і «Час сэканд хэнд». «Чырвоны» цыкл. Усё. А кнігі пра каханне і пра старасць і смерць — гэта ўжо зусім іншыя кнігі. Іх будзе пісаць крыху іншы чалавек.

Н. І.: Які?

С. А.: Я пакуль не ведаю. Але іншы. Чалавек, які цяпер больш здзіўляецца жыццю, чым раней. Раней мяне больш цікавілі агульныя ідэі і непадуладныя чалавеку стыхіі: вайна, Чарнобыль. Сёння мяне найперш цікавіць тое, што адбываецца ў прасторы самотнай чалавечай душы. Мне здаецца, што свет рухаецца сюды.

# ЗМЕСТ

ЗАНАТОЎКІ САЎДЗЕЛЬНІКА ........ 5

Частка першая
СУЦЯШЭННЕ АПАКАЛІПСІСАМ | 15

З ВУЛІЧНАЙ ГАМАНЫ
І РАЗМОВАЎ НА КУХНІ (1991–2001) ........ 17
Пра Іванушку-дурачка і залатую рыбку ........ 17
Пра тое, як мы палюбілі і разлюбілі Горбі ........ 20
Пра тое, як прыйшло каханне, а пад вокнамі — танкі ........ 23
Пра тое, як рэчы зраўняліся з ідэямі і словамі ........ 26
Пра тое, што мы выраслі сярод катаў і ахвяр ........ 31
Пра тое, што нам трэба выбіраць: вялікую гісторыю
ці банальнае жыццё ........ 34
Пра ўсё ........ 35
ДЗЕСЯЦЬ ГІСТОРЫЙ У ЧЫРВОНЫМ ІНТЭР'ЕРЫ ........ 38
Пра красу дыктатуры і таямніцу матылька ў цэменце ........ 38
Пра братоў і сясцёр, катаў і ахвяраў… і электарат ........ 74
Пра шэпт і крык… і экстаз ........ 86
Пра самотнага чырвонага маршала і тры дні
забытай рэвалюцыі ........ 101
З аповеду N. ........ 114
Пра міласціну ўспамінаў і пажаднасць сэнсу ........ 136
З аповеду мамы ........ 136
З размоваў з сябрамі ........ 150
Пра іншую біблію і іншых вернікаў ........ 160

Пра жорсткасць полымя і выратаванне вышынёй ..............181
Пра асалоду пакуты і фокус рускага духу ..............204
Гісторыя аднаго кахання ..............204
Гісторыя аднаго дзяцінства ..............221
Пра час, калі ўсякі, хто забівае, думае, што ён служыць Богу ..............231
Пра маленькі чырвоны сцяжок і ўсмешку сякеры ..............244

Частка другая
ПРЫВАБНАСЦЬ ПУСТАТЫ | 279

З ВУЛІЧНАЙ ГАМАНЫ І РАЗМОВАЎ НА КУХНІ (2002–2012) ..............281
Пра мінулае ..............281
Пра сучаснасць ..............286
Пра будучыню ..............290
ДЗЕСЯЦЬ ГІСТОРЫЙ БЕЗ ІНТЭР'ЕРУ ..............296
Пра Рамэа і Джульету... толькі звалі іх Маргарыта і Абульфаз ..............296
Пра людзей, якія адразу сталі іншымі пасля камунізму ..............311
Пра час, калі ўсе жылі аднолькава ..............311
Пра час, калі бандыты хадзілі па вуліцах і нават не хавалі пісталеты ..............316
Пра час, калі чалавек — гэта гучыць не горда, а гучыць па-рознаму ..............320
Пра адзіноту, якая вельмі падобная да шчасця ..............328
Пра жаданне іх усіх забіць, а потым пра страх, што табе гэтага хацелася ..............342
Пра каргу з касой і прыгожую дзяўчыну ..............358
Пра чужое гора, якое Бог паклаў на парог вашага дома ..............381
Пра жыццё-паскудства і сто грамаў лёгкага пясочку ў белым вазончыку ..............395

Пра негідлівасць мёртвых і цішыню пылу ............................406
Пра цемру нячыстую і «іншае жыццё,
якое можна зрабіць з гэтага» ................................................426
Пра мужнасць і пасля яе .......................................................446
Хроніка падзей .......................................................................446
Хроніка пачуццяў ...................................................................447

ЗАЎВАГА АБЫВАЦЕЛЯ .............................................................462

Святлана Алексіевіч:
«Сацыялізм скончыўся. А мы засталіся» ...................................463

16+

Алексіевіч Святлана Аляксандраўна

галасы утопіі | кніга пятая

ЧАС СЭКАНД ХЭНД

Рэдактар Валянцін Акудовіч
Карэктар Сяргей Сматрычэнка
Дызайн вокладкі Арцём Масюкевіч

Падпісана да друку 19.04.2018. Фармат 60×100/32.
Аб'ём 21,2 умоўн. друк. арк. Папера афсетная. Друк афсетны.
Гарнітура Charter ITC, Aeroport. Наклад 5 300. Заказ 3429/18.

Выдавец Logvino literatūros namai
J. Savickio g. 4, LT-01108 Vilnius
lohvinau.by

Друк ООО «ИПК Парето-Принт»

ISBN 978-609-8213-34-8

9 786098 213348

Ніводзін пісьменнік не прыдумае такіх сюжэтаў, якія закручвае само жыццё. Кніга Святланы Алексіевіч складзеная з такіх непрыдуманых гісторый. Аб'яднаныя адной адметнай аўтарскай інтанацыяй, яны становяцца тым, што Алесь Адамовіч назваў звышлітаратурай. Гэтая беларуская вынаходка была нарэшце адзначаная літаратурнай звышпрэміяй — Нобелеўскай.

Жанрава «Час сэканд-хэнд» — гэта эпас, «Калевала» савецкай эпохі, ад якой так шмат яшчэ засталося ў думках, паводзінах і словах людзей. Гэтая кніга — люстэрка, у якім кожны чытач пабачыць сябе (ці часцінку сябе), а ў сабе (ці часцінцы сябе) пабачыць раба.

**СЯРГЕЙ ДУБАВЕЦ**

ulej

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

ЛОГВІНАЎ

ЧАС СЭКАНД-ХЭНД

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ